МАРЫЯ
ВАЙЦЯШОНАК

АЛЬБОМ ДЛЯ ЦЕТКІ МАРЫЛІ

МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК

•

А Л Ь Б О М

ДЛЯ ЦЁТКІ МАРЫЛІ

Марыя
ВАЙЦЯШОНАК

•

АЛЬБОМ
ДЛЯ ЦЁТКІ МАРЫЛІ

Выбраныя творы

Логвінаў

Марыя Вайцяшонак (Вайцяшонак Марыя Антонаўна, 1 снежня 1940 года) – вядомая пісьменніца і паэтка (сябра СБП з 1990 года) з'яўляецца аўтарам дзесяці кніг публіцыстыкі, казак для дзяцей, мастацкай прозы і паэзіі: «Сярод блізкіх людзей», «Жанчына каля люстэрка», «Сад нявіннасці», «Кола», «Каму расказваюць казкі на два вушкі», «Серпень», «Асадніца», «Сонцаварот», «Гняздо агню», «Тварам да зімы». Гэтая кніга выбраных твораў ёсць зборам лепшых узораў яе арыгінальнай прозы і паэзіі. Чытач знойдзе тут душэўны прытул і спагаду, а таксама злагаду і людскую гасціннасць – крэўную памяць бацькаўшчыны. Своеасаблівы і натхнёны голас Марыі ўзвысіць і зачаруе вас. І вы станеце апантаным прыхільнікам яе творчасці.

ISBN 978-609-8213-58-4

© Марыя Вайцяшонак, 2019
© Logvino literatūros namai, 2019

ИСТОРИЯ ОДНОГО ДЕТСТВА

— Я — осадница. Я родилась в семье ссыльного польского офицера-осадника (osadnik — по-польски «поселенец», получивший земли на Восточных Кресах после окончания советско-польской войны в 1921-м году). А в 1939-м году (секретный протокол пакта Молотова—Риббентропа) Западную Беларусь присоединили к СССР, и тысячи осадников-колонистов вместе со своими семьями были сосланы в Сибирь как «опасный политический элемент» (из записки Берии — Сталину). Но это большая история, а у меня своя... маленькая...

Не знаю дня своего рождения... и даже года... Все у меня приблизительное. Не нашла никаких документов. Я есть, и меня нет. Не помню ничего и помню все. Я думаю, что мама уезжала беременная мной. Почему? Меня всегда волнуют паровозные гудки... и запах шпал... и плач людей на станциях... Могу ехать хорошим, фирменным поездом, но прогрохочет рядом товарняк, и у меня слезы. Не в силах видеть вагоны для скота, слышать рев животных... Нас увозили в этих вагонах. Меня еще не было. И я была. У меня в снах нет лиц... сюжетов... все мои видения из звуков... запахов...

Алтайский край. Город Змеиногорск, река Змеевка... Ссыльных сгрузили за городом. У озера. Жить стали в земле, в землянках. Я родилась под землей, выросла там. Земля мне с детства пахнет домом. Течет с потолка, отрывается ком земли, упал и скачет ко мне. Это — лягушка. Но я маленькая, я еще не знаю, кого надо бояться. Сплю з двумя козочками, на теплой подстилке из козьего «горошка»... Первое слово «ме-е-е»... первые звуки... а не «ма»... «мама». Старшая сестра Владя вспоминала, как я удивлялась, что козочки не говорят, как мы. Мое

недоумение. Они казались мне равными. Мир был целостный, неразделенный. Я и сейчас не чувствую этой разницы между нами, между людьми и животными. Всегда разговариваю с ними... и они меня понимают... А жучки, паучки... они тоже были рядом... такие цветные, такие раскрашенные жучки. Мои игрушки. Весной мы вместе выбирались на солнце, ползали по земле, искали еду. Грелись. А зимой обмирали, как деревья, впадали в спячку от голода. У меня своя школа, меня учили не только люди. Я слышу и деревья, и траву. Больше всего в жизни мне интересны животные, действительно интересны. Как мне отделиться от того мира... от тех запахов... Не могу. Вот наконец солнце! Лето! Я — наверху... вокруг красота ослепительная, и никто никому не готовит никакой еды. И еще все звучит, все в красках. Я пробую на вкус каждую травинку, листок... цветок... все корешки... белены раз наелась, чуть не умерла. Целые картины в памяти... Помню гору «Синяя борода» и синий свет на этой горе... освещение... Свет шел именно с левой стороны, со склона. Шел он сверху вниз... Какие это были зрелища! Боюсь, что у меня не хватит таланта это передать. Воскресить. Слова — это только дополнение к состоянию. К нашим чувствам. Красные маки, лилии-саранки, марьин корень... Все это расстилалось перед глазами. Под ногами. Или другая картина... я сижу возле какого-то дома. По стене ползет солнечное пятно... и оно разных цветов... все время меняется. Долго-долго сижу на том месте. Если бы не эти краски, я бы, наверное, умерла. Не выжила. Не помню, что мы ели... была ли у нас какая-нибудь человеческая еда...

Вечером я видела, как шли черные люди. Черные одежды, черные лица. Это ссыльные возвращались с рудников... они все были похожи на моего отца. Я не знаю, любил ли меня отец. Любил ли меня кто-нибудь?

У меня очень мало воспоминаний... Мне их не хватает. Ищу в темноте, стараюсь больше оттуда вытащить. Редко... очень редко вдруг что-то вспомнится, чего я не помнила. Мне горько, но я счастлива. Я тогда страшно счастлива.

Ничего не могу вспомнить про зиму... Зимой я сидела в землянке весь день. День был похож на вечер. Все в сумерках. Ни одного цветного пятна... Были ли у нас какие-то вещи, кроме мисок и ложек? Никаких одежд... чтобы что-то из одежды...

обкручивались какими-то тряпками. Ни одного цветного пятна. Обувь... Что из обуви? Галоши... помню галоши... у меня тоже галоши, большие и старые, как у мамы. Наверное, мамины... Первое пальто мне выдали в детдоме, и первые рукавицы. Шапочку. Помню: в темноте едва-едва белеет лицо Влади... Целыми днями она лежит и кашляет, она заболела на рудниках, у нее туберкулез. Я уже знаю это слово... Мама не плачет... Не помню, чтобы мама плакала, она мало говорила, а потом, видимо, вообще перестала говорить. Когда кашель отступает, Владя зовет меня: «Повторяй за мной... Это — Пушкин». Я повторяю: «Мороз и солнце, день чудесный! Еще ты дремлешь, друг прелестный!» и представляю себе зиму. Как у Пушкина.

Я раба слова... я слову верю абсолютно... Всегда жду слов от человека, и от незнакомого человека тоже, от незнакомого даже больше жду. На незнакомого человека еще можно надеяться. Как будто и самой хочется сказать... и я решаюсь... Готова. Когда я начинаю кому-то рассказывать, потом на том месте, о котором я говорила, я ничего уже не нахожу. Там пустота, я теряю эти воспоминания. Там мгновенно — дыра. И нужно долго ждать, чтобы они вернулись. Поэтому я молчу. Я все обрабатываю в себе. Ходы, лабиринты, норки...

Лоскутки... Откуда у меня взялись эти лоскутки и обрезки? Разноцветные, много малинового цвета. Кто-то мне их принес. Из этих лоскутков я шила маленьких человечков, стригла себе волосы, делала им прически. Это были мои подружки... Кукол я не видела, ничего не знала о куклах. Жили мы уже в городе, но не в доме, а в подвале. Одно слепое окошко. Но у нас уже появился адрес: улица Сталина, дом семнадцать. Как и у других... как и у всех... у нас уже был адрес. Там я играла с одной девочкой... девочка была не из подвала, а из дома. Ходила в платьях и в ботиночках. А я — в маминых галошах... я принесла ей показать эти лоскутки, на улице они смотрелись еще красивее, чем в подвале. Девочка стала их у меня просить, на что-то хотела выменять эти лоскутки. Я — ни за что! Пришел ее папа: «Не дружи с этой нищенкой», — сказал он. Я поняла, что меня взяли и отодвинули. Мне надо тихо уйти, скорее уйти с этого места. Конечно, это уже взрослые слова, не детские. Но чувство... то чувство я помню... Тебе так больно, что уже нет обиды и нет жалости к себе, у тебя вдруг много-много свободы. А жалости

к себе нет... Когда жалость есть, то человек еще не так глубоко заглянул, он еще не ушел от людей. А если он ушел, люди ему совсем не нужны, ему хватает того, что в нем самом. Я слишком глубоко заглянула... Меня трудно обидеть. Я редко плачу. Мне смешны все обычные беды, женские обиды... Для меня это шоу... шоу жизни... Но если я услышу, что плачет ребенок... никогда не пройду мимо нищего... Никогда не пройду мимо. Запах этот я помню, запах беды... Какие-то волны идут, я до сих пор к ним подключена. Это запах моего детства. Моих пеленок.

Я иду с Владей... мы несем пуховую шаль... Красивую вещь для какого-то другого мира. Готовый заказ. Владя умела вязать, на эти деньги мы жили. Женщина рассчиталась с нами, а потом говорит: «Давайте я вам нарежу цветов». Как — нам букет? Стоим две попрошайки, в какой-то мешковине... голодные, холодные... и нам — цветы! Мы всегда думали только о хлебе, а этот человек догадался, что мы способны думать еще о чем-то. Ты был заперт, замурован, а тебе открыли форточку... окно распахнули... Оказывается, кроме хлеба... кроме еды... нам можно дать и букет цветов! Значит, мы ничем от других не отличаемся. Мы... такие же... Это было нарушением правил: «Давайте я вам нарежу цветов». Не нарву, не соберу, а нарежу в своем саду. С этого момента... Возможно, это был мой ключ... мне дали ключ... Меня это перевернуло... я помню тот букет... большой букет космей... Всегда их теперь сажаю у себя на даче. (*Мы сидим как раз у нее на даче. Растут тут одни цветы и деревья.*) Я недавно ездила в Сибирь... Город Змеиногорск... вернулась туда... Искала нашу улицу... наш дом... наш подвал... Но дома уже нет, дом снесли. У всех спрашивала: «А вы помните?» Один старик вспомнил, что да, в подвале жила красивая девушка, она болела. Люди больше запоминают красоту, чем страдание. И букет нам подарили, потому что Владя была красивая.

Я пошла на кладбище... у самых ворот стояла сторожка с заколоченными окнами. Долго стучала. Вышел сторож, он был слепой... Что за знак? «Не скажете, где хоронили ссыльных?» — «А... та-а-ам...» — и махнул рукой то ли вниз, то ли вверх. Какие-то люди повели меня в самый дальний угол... Одна трава там... одна трава... Ночью не спала, потому что задыхалась. Спазм... такое чувство, что кто-то меня душит... Убежала из гостиницы на станцию. Пешком через весь пустой город. Станция была

закрыта. Села на рельсы и до утра ждала. На откосе сидели парень с девушкой. Целовались. Рассвело. Пришел поезд. Пустой вагон... Входим: я и четверо мужчин в кожаных куртках, бритые, похожи на уголовников. Стали угощать меня огурцами и хлебом. «Бум в карты играть?» Мне не было страшно.

Недавно вспомнила... Ехала и вспомнила... в троллейбусе ехала... Как Владя пела: «Я могилу милой искал / Но найти ее нелегко...» А оказывается, любимая песня Сталина... когда ее пели, он плакал... и я ее сразу разлюбила, эту песню. К Владе приходили подружки, звали на танцы. Я все это помню... Мне было уже шесть или семь лет... я видела, как в трусы вместо резинки они зашивали проволоку. Чтобы нельзя было сорвать... Там же одни ссыльные... зэки... Убивали часто. Про любовь я тоже уже знала. К Владе приходил красивый парень, когда она болела — лежала в каких-то тряпках, кашляла. А он так на нее смотрел...

Мне больно, но это — мое. Я никуда от него не бегу... Не могу сказать, что я все приняла, благодарна за боль, тут нужно какое-то другое слово. Сейчас я его не найду. Знаю, что в этом состоянии я далеко от всех. Я одна. Взять страдание в свои руки, обладать им полностью и выйти из него, что-то оттуда вынести. Это такая победа, только в этом есть смысл. Ты не с пустыми руками... А иначе зачем было спускаться в ад?

Вот кто-то подводит меня к окну: «Посмотри, вон везут твоего отца...» Незнакомая женщина тянула что-то на санках. Кого-то или что-то... закутанное в одеяло и перевязанное веревкой... Потом мы с сестрой хоронили нашу маму. Остались одни. Владя уже плохо ходила, у нее отказывали ноги. Кожа отслаивалась, как бумага. Ей принесли бутылочку... я думала, что это лекарство, а это была какая-то кислота. Яд. «Не бойся...» — позвала она меня и дает эту бутылочку... Она хотела, чтобы мы вместе отравились. Я беру эту бутылочку... Бегу и бросаю ее в печь. Стекло разбивается... Печь была холодная, там давно ничего не варилось. Владя заплакала: «Ты вся в отца». Кто-то нас нашел... Может, ее подружки? Владя лежала уже в беспамятстве... Ее в больницу, меня — в детдом. Отец... я хочу его вспомнить, но как ни стараюсь, не вижу его лица, нет в моей памяти его лица. Потом я увидела его, молодого, на фотографии у тети. Правда... я на него похожа... Это наша с ним связь.

Отец женился на красивой крестьянской девушке. Из бедной семьи. Хотел сделать из нее барыню, а мама всегда носила платок, надвинув его низко-низко на брови. Не барыня. В Сибири отец недолго жил с нами... он ушел к другой женщине... А я уже родилась... я была наказанием! Проклятием! Ни у кого не было сил любить меня. И у мамы тоже не было этих сил. Это запрограммировалось в моих клетках: ее отчаяние, ее обида... и нелюбовь... Мне всегда не хватает любви, даже когда меня любят, я не верю, мне постоянно требуются доказательства. Знаки. Они нужны мне каждый день. Каждую минуту. Меня трудно любить... я знаю... (*Долго молчит.*) Я люблю свои воспоминания... Люблю свои воспоминания за то, что там все живы. У меня там все есть: мама... папа... Владя... Мне обязательно надо сидеть за длинным столом. С белой скатертью. Я живу одна, но у меня на кухне стоит большой стол. Может, они все со мной... я могу идти и вдруг повторю чей-то жест. Не мой... Владин жест... или мамин... Мне кажется, мы прикасаемся руками...

Я — в детдоме... В детдоме сирот-осадников воспитывали до четырнадцати лет, а потом отправляли на рудники. И в восемнадцать лет — туберкулез... как у Влади... Это судьба. Где-то далеко, говорила Владя, у нас есть дом. Но очень далеко. Там осталась тетя Марыля, мамина сестра... Безграмотная крестьянка. Она ходила, просила. Чужие люди писали письма. Не понимаю и сейчас... ну как? Как она добилась? в детдом пришло распоряжение: отправить меня вместе с сестрою по такому-то адресу. В Беларусь. В первый раз до Минска мы не доехали, в Москве нас ссадили с поезда. Все повторилось: Владю — у нее начался жар — в больницу, меня — в изолятор. Из изолятора — в приемник-распределитель. Подвальное помещение, пахло хлоркой. Чужие люди... я все время живу среди чужих людей... Всю жизнь. А тетя писала... писала... Через полгода нашла меня в приемнике. Снова я слышу слова «дом», «тетя»... Меня ведут к поезду... Темный вагон, только освещен проход. Тени людей. Со мной — воспитательница. Доехали до Минска и взяли билет в Поставы... я все эти названия знаю... Владя просила: «Ты запоминай. Запомни: наше поместье Совчино». Из Постав идем пешком в Гридьки... в тетину деревню... Сели возле моста передохнуть. А в это время сосед ехал с ночной смены на велосипеде. Спросил, кто мы. Ответили, что приехали к тете Марыле.

«Да, – сказал он, – правильно идете». И, видно, передал тете, что видел нас... она побежала навстречу... я увидела ее и говорю: «А вот эта тетя похожа на мою маму». И все.

Стриженая «под нулевку» сижу на длинной лавке в хате дяди Стаха, маминого брата. Дверь открыта, и через проем видно, что люди идут и идут... останавливаются и молча смотрят на меня... Живопись полная! Никто друг с другом не разговаривает. Стоят и плачут. Абсолютная тишина. Вся деревня пришла... и они перекрыли мой поток слез, каждый плакал со мной. Все они знали отца, кто-то у него работал. Не раз я потом услышу: «В колхозе нам «палочки» начисляют, а Антэк (отец) всегда рассчитывался». Вот оно – мое наследство. Наш дом перевезли с хутора на центральную усадьбу колхоза, в нем до сих пор сельсовет. Я все знаю про людей, знаю больше, чем хотелось бы. В тот же день, когда красноармейцы погрузили нашу семью на телегу и повезли на станцию, эти же люди... тетя Ажбета... Юзэфа... дядя Матей... разнесли из нашего дома все по своим хатам. Мелкие постройки разобрали. Раскатали по бревнышку. И молодой сад выкопали. Яблоньки. Тетя прибежала... и унесла только вазон с окна на память... Не хочу я это помнить. Гоню из памяти. Я помню, как деревня меня нянчила, носила на руках. «Идем, Манечка, к нам, мы грибов наварили...», «Давай молочка тебе налью...» Сегодня я приехала, а назавтра у меня все лицо покрылось волдырями. Жгло глаза. Не могла поднять веки. Меня за руки водили умываться. Во мне выбаливало все, выжигалось, чтобы я посмотрела на мир другими глазами. Это был переход из той жизни к этой... Теперь я шла по улице, и меня каждый останавливал: «Какая девочка! Ай, какая девочка!» Без этих слов у меня глаза были бы как у собаки, которую вытащили из проруби. Я не знаю, как я смотрела бы на людей...

Жили тетя с дядей в кладовке. Хата в войну сгорела. Поставили кладовку, думали, на первое время, и там остались. Соломенная крыша, маленькое окошко. в одном углу бульбочка (тетины слова) – не «бульба», а «бульбочка», а в другом – поросенок визжит. Никаких досок на полу – земля накрыта аиром и соломой. Скоро сюда же привезли Владю. Пожила она немного и умерла. Радовалась, что умирает дома. Последние ее слова: «А что будет с Манечкой?»

Все, что я узнала о любви, я знаю из тетиной кладовки...

«Мая ты птушачка... — звала меня тетя. — Мая жужалка... пчолка...» Я все время лопотала, теребила ее. Я не могла поверить... Меня любили! Любили! Ты растешь, а тобой любуются — это такая роскошь. У тебя все косточки распрямляются, все мышцы. Я танцевала ей «русского» и «яблочко». Меня научили этим танцам в ссылке... Пела песни... «Есть по Чуйскому тракту дорога. / Много ездит по ней шоферов...», «Умру, в чужой земле зароют, / Заплачет мамочка моя, / Жена найдет себе другого, / А мать сыночка — никогда...» Набегаешся за день так, что ноги все синие-синие, ободранные — обуви же не было никакой. Ляжешь вечером спать, а тетя твои ножки закрутит в подол своей ночной сорочки, согреет. Она меня пеленала. Лежишь где-то возле живота... как в утробе... Поэтому я не помню зла... я зло забыла... где-то далеко оно у меня спрятано... Утром просыпаюсь от тетиного голоса: «Я драники испекла. Поешь». — «Тетя, я спать хочу». — «А ты поешь и спи». Она понимала, что еда... блины... для меня как лекарство. Блины и любовь. А дядя наш Виталик был пастух, носил на плече кнут и длинную берестяную трубу. Ходил в военном кителе и галифе. Приносил нам с пастбища «торбу» — там и сыр, и кусочек сала — все то, чем его угощали хозяйки. Святая бедность! Она для них ничего не значила, не обижала, не оскорбляла. Как для меня важно все это... драгоценно... Одна подруга жалуется: «Нет денег на новую машину...», другая: «Всю жизнь мечтала, а так и не купила себе норковую шубу...» Как через стекло слышу... Единственное, о чем я жалею, что не могу уже носить короткую юбку... (*Вместе смеемся.*)

У тети был необычный голос... дрожащий, как у Эдит Пиаф... Ее звали петь на свадьбах. И если кто-то умирал. Я всегда с ней... рядом бегу... Помню... Вот она стоит-стоит возле гроба... долго стоит... в какой-то момент отлучается как-то от всех, подходит ближе. Медленно подходит... она видит, что никто не может сказать этому человеку последних слов. Люди хотят, но не все умеют. И вот она начинает: «И куда ты, Анечка, от нас пошла... светлый день и ночку оставила... кто теперь будет ходить по твоему двору... кто деток твоих поцелует... кто вечером коровку встретит...» Тихо-тихо подбирает слова... Все бытовое, простое, и оно же высокое. Печальное. Какая-то самая

последняя правда в этом простом. Окончательная. Голос дрожит... и все за ней начинают плакать. Уже забыто, что корова не подоена, муж пьяный дома остался. Меняются лица, уходит суета, на лицах проступает свет. Все плачут. Я стесняюсь... и жалею тетю... Вернется она домой больная: «Ой, Манечка, головка шумит». Но такое было у тети сердце... Из школы прибегу... Маленькое окошко, иголка с палец... Тетя зашивае наши тряпочки и поет: «Огонь зальешь водою / Любовь ничем нельзя...» я озарена этими воспоминаниями...

От нашего поместья... От нашего дома остались одни камни. Но я слышу их тепло, меня тянет к ним. Приезжаю туда, как на могилу. Я могу там заночевать в поле. Хожу осторожно, боюсь ступить. Человека нет, а жизнь есть. Гул жизни... разных живых существ... Хожу и боюсь разрушить чей-то дом. Я и сама могу обустроиться где угодно, как мурашка. У меня культ дома. Чтобы росли цветы... было красиво... я помню, как в детдоме, меня ведут в мою комнату, где я буду жить. Белые кровати... Ищу глазами: не занята ли кровать у окна? Будет ли у меня своя тумбочка? Я ищу, где будет мой дом.

Сейчас... Сколько это мы сидим и говорим? За это время отгремела гроза... соседка приходила... телефон звонил... Все это влияло на меня, на все это я откликалась. А на бумаге останутся только слова... Другого ничего не будет: соседки не будет, телефонных звонков... того, что я не сказала, но оно мелькало в памяти, присутствовало. Завтра вообще я обо всем, может быть, расскажу иначе. Слова остались, а я встану и пойду дальше. Я научилась с этим жить. Умею. Иду и иду.

Кто это мне дал? Все это... Бог дал или люди? Если Бог дал, то он знал, кому давать. Страдание меня вырастило... Это мое творчество... Моя молитва. Сколько раз я хотела кому-нибудь все рассказать. Проговаривалась. Но никто меня ни разу не попросил: «А дальше что... дальше?» А я все время ждала хороших или плохих людей, не знаю, но все время ждала людей. Всю жизнь жду, что меня кто-то найдет. И я все ему расскажу... и он спросит: «Ну, а дальше что?» Сейчас стали говорить: социализм виноват... Сталин... Как будто у Сталина была власть, как у Бога. У каждого был свой Бог. Почему он молчал? Моя тетя... наша деревня... я помню еще Марию Петровну Аристову, заслуженную учительницу, которая навещала нашу Владю

в больнице в Москве. Чужая женщина... Она и привезла ее к нам в деревню, внесла на руках... Владя уже совсем не ходила... Мария Петровна присылала мне карандаши, конфеты. Писала письма. А в детприемнике-распределителе, где меня мыли, дезинфицировали... я на высокой лаве... вся в пене... могу соскользнуть, разбиться о цемент. Скольжу... сползаю... Чужая женщина... нянечка... подхватывает меня и прижимает к себе: «Мой ты птенчик».

Я видела Бога.

ПРОЗА

ДВА ГАДЫ ДА ВЯСНЫ

Сабакі забрахалі, пачуўшы чужыя крокі на лесвічнай пляцоўцы, яна адчыніла адразу, не чакаючы званка. Заўсёды збіралася ў дарогу загадзя, якая б тая дарога ні выпадала: кароткая ці доўгая. Чакала па-вясковаму, седзячы, каленькі разам, быццам ужо сядзіць на людзях, далёка глядзела перад сабой, пільнуючыся, бо варта толькі адхінуцца, адысціся ўбок, да люстэрка, як скранецца пад нагамі, не ўстоіш. Яна амаль адчувала пачатак сваёй дарогі пад сабой тут, у гарадской кватэры, выкінуты адным канцом, як цяжкі скрутак. І вось зараз сама пераступіла парог насустрач і, ледзьве прывітаўшыся, ужо бралася за вандзэлкі, мальберт, падрамнік, выстаўленыя за дзверы. Мужчына адхіліў яе няўлоўна, сабраў усё ў абедзве рукі гірляндамі, панёс уніз, да машыны. Юля яшчэ пастаяла нейкае імгненне разгубленая, сагнуўшы плечы, як пад каромыслам, гатовая цягаць на сабе, натурачыся, што можа абысціся — і павінна — без чужой дапамогі. «Няхай ж бы я хоць кубак кавы прапанавала, — слаба падумалася. — А, незнаёмы чалавек... Ну, прыяцель сяброўкі, што яму бавіцца, час марнаваць на госці... Казала, мусі, лётчык... Шкада, імя не памятаю...»

Не любіла адлучацца, але трэба пачынаць дачны сезон — матчына хата пустуе ўсю зіму.

Мужчына яшчэ раз адчыніў дзверцы, калі яна ўжо сядзела ззаду, нахіліўся блізка пад нізкай столлю машыны, каб паправіць ейную покладзь: адно — пацягнуў да сябе, другое — вышэй падняў; нагам стала слабадней. Не паспела адхіліцца (ледзь на калені не апёрся!), збянтэжыцца — і чужога духу не пачула, — бы анёл парадкаваўся побач. У люстэрку насупраць бачыла ўсю дарогу, ягоныя ціхія галубовыя вочы, без зрэнак, усё роўна як пасля лёгкага сну з галавой пад шызым скрыллем.

«Вельмі ўжо тыповы лётчык... каб чорт на форму не знёс, часам...»

— Не дзьме? — адчыніў акно. — Можа, печку ўключыць?

— Не, не, не, дзякую.

Так звыкла зняў увесь клопат, як галаўны боль, ні аб чым не думалася. Нешта гаварыў, нязначнае, можна было не адказваць, і дрэнна чувалася, нічога потым не магла ўспомніць. Толькі стомлена заўважала іншы раз, як ён ускідваў галаву, гледзячы ў высокае люстэрка ў машыне. Выдавала, нібы яны стаяць вельмі блізка насупраць адзін аднаго, зазіраючы ў твар пры нейкай надта крэўнай размове... Вандзэлкі на выбоінах — «паветраных ямах» — краталіся з усіх бакоў, як на возе. «Каб хаця фарбы не патаўчы... — Ужо брала дасада, што, пэўна, не ўпаліш дровы, дым будзе паўзці на хату, пакуль трапіць у сыры комін. — Занадта прыгожы мужчына...» — думала яна як не з дакорам. Не, такія ёй не падабаліся. Яна магла б змоўчыць яму, каб і невядома што-якое, не азвацца, — сядзела, як баба кірмашовая, укуліўшыся, абы даехаць, абы не пехатой.

...Што гэта быў сёлета за год ці, можа, два? Якая пара? Даўно атрэсла з рук пярсцёнкі, пацеркі ў пеляну, падазвала да сябе дачку, цацкалася разам з ёй. Недзе зшарылася дарагая завушніца — не шкадавала. Устане, шморгне з падала ўбок, страсе з сябе залатыя пырскі. Адарваўся верхні гузік у блузцы, паляцеў далоў, як спелая ягадзіна, — не падымала. Зачэсвалася густым грэбнем, валасок да валаска, бы ўвесь час на вялікім ветры стаяла, падцінала кучары, усё вясёлае, гулёнае ад чужога вока, каб нічога прываблівага, нічога прыкметнага. Так лягчэй увайсці ў натоўп, уціснуцца — як знікнуць. Ад роду сарамлівая, цяпер сустракалася вачыма з мужчынамі й нічога ўжо яе не кранала, не палохала. Нават падабалася гэтая незалежнасць — ужо спэўнілася яна, што няма ейнага, адзінага на свеце чалавека, нечага прыглядацца, прыхарошвацца. І сэрца не балела, калі ўспаміналася няўдалае замужжа. Толькі сціплая няёмкасць, бы занадта падрабязна ведае нейкую чужую любоўную гісторыю. Спахоплівалася: на яе ўжо ніхто не азіраецца, як раней, быццам і не ходзіць побач з людзьмі, а можа, і зусім не існуе? Толькі на момант. І зноў гэтая вялікая вада, гэтая павольная плынь жыцця несла, праносіла паблізу людзей, вясёлых, сумных, гаманкіх, а яна сама, як у дзяцінстве,

ляжала на спіне, утрымліваючыся на адным месцы, і ёй да дарослых з іх сустрэчамі, каханнем, не было аніякай справы. Любіла глядзець у неба, на аблокі. Яны плылі, рухаліся, кожную хвіліну мянялі выгляд. Вось дурона, укуліўшыся ў сабачую запрэжку, строячы пыхі, едзе з разяўленым ротам стары вылюдак. Санкі — набок, вываліўся, ляжыць дагары, перабірае нагамі, як дзіця... Вось усё неба ў ружовых пялёстках — аблятаюць яблыні ў райскім садзе... Ейны чалавек, пэўна, таксама павінен быў з'явіцца не з боку людскога натоўпу, а адтуль — з-пад аблокаў... «Чые гушкалкі?» — пыталіся людзі ў яе, ужо немаладой жанчыны, ведаючы, што і дачка вырасла. Вісяць, зачапіўшыся вяроўкамі за сукі дрэва, заляцеўшы бязмерна высока. «Гэта ж і забіцца можна...» Яна задзірала галаву, дзівячыся разам з усімі: вядома, ейныя, яшчэ дзявочыя арэлі, спыніліся, яшчэ гойдаюцца на ветры...

Пыталіся сябры, што зараз малюе, яна палохалася, бралася тлумачыць: маўляў, хоча пейзаж... хаты... дрэва... птушкі... і зеляніна першая, каб як пушок на вербных катках...

Што за пара? Выдавалася, што ўжо і не загаворыць ні да кога, як нямко.

Прыехалі, знеслі клункі, ужо развіталіся, калі раптам ускочыла суседка з вёскі, Кацярына (яна глядзела за хатай) адчыніла падполак, бясконца дзівячыся:

— Глядзіце, людцы, Юльча! Драбіна скінута ўніз, і дзежка з мачонымі яблыкамі ўверх дном!

І сцены быццам цалыя, а вада тут, пэўна, аж кіпела, падышоўшы. Хіба што з самага мора яе прынесла з белай кучаравай хваляй па пяты. Веснавая, шалёная, яна і ў шклянцы бабскай бяды наробіць.

— Хоць ты яе было замаўляй! І насос спусцілі, і вёдрамі выносілі, — расказвала гаваркая Кацярына, а сама празрыста так паглядала ў вочы, маючы другое наўмя, выпытвала, у вёсцы абы мужчына — нагой у хату, то ўжо і жаніх.

Не паспелі агледзецца, як той ужо быў у падполку, падымаў драбіну, ставіў усё на месца, лёгенька, звыкла так. Выскачыў, рукі насаткай выцер і... паехаў. Не даспелі й рушніка падаць.

Суседка не магла апамятацца. Прызвычаеная да свары, матаў, век як праз голаў той ейны мужык куляецца, усю работу робіць нехаця, і яна яго коціць гэткага, папіхаючы, узалапкі

ходзяць, бораюцца ўсё жыццё. Чалавек як зломак. А калі што і зробіць, то хоць ты яму бутэльку стаў, бы які прыхадзяка ў хаце. Калі б ён калі захінуў яе, забег наперад, як гэты чужы мужчына! Стаіць сама на ўвесь панадворак, як ліпа, днюе і начуе, правіць гаспадарку, жыляецца, вымагаючыся. Пройдзе з рэзьгінамі, а за ёй аж след на камяні мокры.

Яна яшчэ доўга пыталася пра лётчыка, пэўна, часта быў на памяці. Юля нешта адказвала, амаль нічога болей не ведаючы, сяброўка, праўда, неяк гаварыла, што ён ваяваў у Афганістане. «Божа, няўжо гэты анёл там страляў?!. Пэўна, стаяў недзе каля брамы, сустракаў душы загінуўшых, вытрабоўваў, каб усе трапілі ў рай... Такі добры чалавек...» — дзівілася Кацярына.

Воблакі над вёскай так нізка, лятуць хутчэй, цень адкідваецца на зямлю, бы ад вялікага птушынага крыла. Адусюль чуюцца ў полі танюткія, дробныя гукі. Не выводзячы аніякай мелодыі, у захапленні, кожны сам па сабе, адным строем, бы толькі яшчэ спрабуючы смычок, пяюць-іграюць самавукам вясновы баль вясковыя музыкі-жаўрукі. Сумна, быццам чуеш самую ўлюбёную песню сваёй маці, якой ужо даўно няма на свеце. І табе ўжо да скону не далучыцца да вяселля пад гэтую музыку, як калісьці было ў дзяцінстве... А спадзявалася, што ў вёсцы акрыяе. Натрапіла, ідучы ў лес, на старую таполю, тая стаяла, абчапаўшыся цветам — чырвонымі кутасамі, бы нявесела абхінуўшыся старым шалем, нетрывушчыя брынды тлелі й пад нагамі. Бела пад дубамі ў Кудрах ад пралесак, а наўмя, як на тое, даўнейшае. Некалі, расказвалі старыя людзі, забілі тутака вясной у вайну млынара, тут недзе і закапаны. І цяпер грыміць увушшу ягоны млын. Сцёрся камень на жорнах, трашчыць жвірам. Укіне птушка дзікае зярнятка — увесь свет белы ад вальцаванай мукі, як на радаўніцу заслана пад дубамі.

Пакарацелі ейныя сцежкі, лес зрабіўся непрыхілкі. Стаіць удзень і ўночы, блізка каля хаты, стаіць з нейкай незаўважанай дагэтуль сумнай урачыстасцю, хоць і ты сам спаць не кладзіся, агонь не гасі, бы ў вёсцы нябожчык начуе. Знарочыста вярталася на змроку, і ўжо быццам весялей, цемра не пужала, бы ўдвух прыйшоў, прывёўшы некага з лесу. Адной хадой (толькі каб не бегчы!), той самай глухой сцежкай і праз лес, і праз панадворак, і праз хату. Нешта прыручанае, амаль

свойскае ў гэтым пераходзе на змроку. Лясны страх пасля ўжо не тоіцца, не стаіць пад вокнамі, ён, як дзікае кацяня, толькі во што не прылашчыш. І жаба рудая ідзе да парогу на змроку, яна ўлюбіла халадацца пад гумовым дыванком, ідзе прысадзіста, марудна адставіўшы ззаду лапу, бы на сагнутых нагах з вялікай ступнёй ад самага калена. Ідзе пільнуючыся, каб ніхто не бачыў; зараз, выдавалася, рэзка азірнецца, перад самым парогам — і сэрца пакоіцца, пазнаўшы пагляд бабкі-варажбіткі з таго канца вёскі. Дом, як нежылы.

Прачнулася яна ў тую ноч перад самым світаннем. Не тое, каб не спалася. Што гэта, хіба — птушкі?! Але ж надта яшчэ зарана, можа, хто спудзіў? Галасы не пеўчыя, птушкі, прачнуўшыся, яшчэ проста перагаворваліся паміж сабой, коратка так, дзелавіта, звыкла. Галасоў большала, ужо, пэўна, цэлы птушыны натоўп. Зусім незнаёмае асвятленне ў пакоі, ноч увачавідкі перакідвала свае ўборы, спяшалася, яшчэ зіхацела юлёвая зорка — самая дарагая начная пацерка. Выдавалася, што чуе, як адляцеўся кажаном пад бэльку ўстрывожаны сон. Чула, як чуюць сляпыя атожылкі хмелю высокую апору, — аднекуль набліжаўся магутны рух. Жывое навокал падымалася, паварочвалася насустрач яму тварам, чакала. Незвычайная цішыня. Усё быццам прачытвалася, як на паперыне, моўчкі, аднымі вуснамі. Так чытаюць лісты кахання. Магутны рух набліжаўся, гул ішоў па самай зямлі, нізка, бы пешшу, пад гару. Бліснуў першы прамень, быццам паказаўся, нарэшце, з-за пагурка хрэсны ход, урачыста несучы наперадзе пазалачоны абраз. Зіхацелі пратэсы. Узыходзіла сонца.

Нешта ўсё-ткі здарылася... Ляжала нерухома, ранішні водар запоўніў пакой. Спахапілася, калі змерзла, ложак, лапнула, халодны, бы й не начавала, толькі што вярнуўшыся са спаткання. Няўжо пакахала таго анёла?!. Божа, навошта? Жанаты чалавек, дзеці, нічога больш пра яго не ведае... Жарт — у машыне правёз, драбіну з падполку дастаў... Не было ж аніякага знаку... І наогул, усё вельмі звычайна...

Лётала па ваду, мыла бялізну, фіранкі з зімы на свежае. Голас зязюлі, як у пустым памяшканні: усё вынесена з хаты, ператрасаецца, мыецца, сохне, пустыя пакоі, чыстыя, толькі два галасы жаночых: «Ку-ку! Ку-ку!», а можа — мужчынскі й жаночы, ад сцяны да сцяны, ад акна да акна. Падушкі — на лаву,

посцілкі, сяннік узбіць на пяро, польты — з шафы! Будзённа так, аб нечым учарашнім, звычайным, аднаслоўна: «Ку-ку, ку-ку, ку-ку!» А слухаць хочацца. Ад адной сцяны пустога лесу — да другой, з аднаго канца пустога поля — да другога! Заляцелі дзве сініцы на веранду, ледзь выправадзіла, і сёння, бачыць, былі: абтрэсены аберуч букет чаромхі на стале. Жарптушанём сядзіць на кусце, зацвітае кветка чырвонага бухматага маку, па яйку ягоная лопнутая шалупайка бутона долах. Ужо і кароў выганяюць да ракі. «Ого-го-о! у поле! у поле!» — знарок аднастайна, працягла, зыкам, берасцяным рогам выпрастаўшы ўсё сваё нутро, ходзіць каля статка стары Вінечка. Быццам тут, перад ім, поле, воля і табун бясконца вялікі. Нараджаецца даўнейшы голас гону, вялікага перагону, каб не спынілася каторая, не змарылася, не адлучылася каб. А сам, забываючыся, стаіць на адным месцы, круціцца з ранку да вечара — няма пашы, не выдзелілі вясковым каровам. І ўвесь статак на вачах, рабымі фасолінамі ў жменьцы. Пастухова вясенняе мроіва...

Учора чула раніцай салаўя. Хадзіла каля ягонага кустоўя, не заўважала, што мокрыя ногі. Вярталася дамоў — і ўжо суха, нехта, як вяршок лыжкай, зняў з травы расу. Пужалася гэтай вясновай радасці, весялосці, ужо, думалася, не дазволена табе такое вось чыстае шчасце. Так пакаянна, са слязьмі радуешся ў храме, прымаючы прычасце, калі побач з табой у адной чарзе бязгрэшныя дзеці. І няўжо праўда лятуць да нас птушкі з цёплай стараны за тысячы вёрст, каб толькі напіцца таючай вады, адмыслова патрэбнай ім дзеля прадаўжэння свайго роду?

Такой ціхай, амаль непрыкметнай, з мелкімі беражкамі, дзе-небудзь у полі ці каля лесу, пастаіць дзень-два на адным месцы — і ўжо малочная трава адскочыцца. Густая вада, яе і вецер не калыша, аж выдаецца, салажавая, бы нектар, сабраны па кроплі на паверсе чорных сот зямлі.

І яна сама прыляцела-такі, нарэшце, з свайго краю — два гады няспыннага смутнага пералёту. «Цэлы падполак заспела цудоўнай вады ў хаце!..» — смяялася сама сабе.

— Не ведаеш, Юльча, чаго Зінка старая ў лес пайшла: можа, па елачку комін чысціць? у лесе ж яшчэ пуста, — пераймае даходная да ўсяго на свеце Кацярына. — І жарт — такая здаровая — узяла і пайшла бадзяцца!.. Ты, сама, Юльча, адмянілася,

як была прыехаўшы. Думала, што хворая. Аж пераборала сябе, вясёлая, бачу... Зіна састарэла, як мужыка пахавала. Баба цікавая. Як узлуецца на сябе, конскі шчавук карчуе каля плоту, а так — сядзіць, утравеўшы, аніяк не абароніцца. А трэба б упільнавацца, каб семя ягонае не саспела, не насеялася... Так і маркота бабская... Я, калі надумаюся вазьму, аж у грудзях займіцца, дык звару сабе што-небудзь смачное — і палягчэе.

Не далей, як учора старая Зіна казала, па-змоўніцку блізка падышоўшы, як дзеўка:

— Ён, салавей, пад лістом сядзіць, перакуліцца і — пяе. А яшчэ ж ліст малы. Слабая пакуль песня, але пайду сёння да ракі слухаць...

Перасаджвала кветкі, мяркуючы дзе каторую, а самой раптам падумалася, аж работу з рук спусціла: «Бог, пэўна, паслаў гэтае неспадзяванае, як у юнацтве, кароткае каханне...» Але перабірала ўсё ў памяці, зайшоўшы ўжо задалёка збоку. Жыва будзеш і па гэтым, як сказала б суседка Кацярына. ...Шчодра адкінула ад сябе ўсе магчымасці бачыць таго анёла. Думалася, цяжка, удзячна — па-сялянску, — як зямля набрынялая пасля доўгачаканага ліўня.

Мусова было б ехаць у горад па харчы, але не хацелася адлучацца: рупіць да астатняга дабыць тут, даглядзець, як цвітуць сады. Бо кожны дзень, як вялікая навіна, — трэба брацца за эцюднік. Вось і сёння з раніцы ішоў буйны, рабы дождж. Куры высыпалі на вуліцу, як толькі ён перастаў, ходзяць рухава, спяшаюцца адна перад адной, бы ім тут толькі што падсыпалі свежую жменю. Клён насупраць акна ўжо сёння ў шырокім, расхрыстаным адзенні, цені ад лісця ляніва кратаюцца на вечку студні, гарачае сонца — скрозь бліскаўкамі, быццам вада стаіць блізка, як у пасудзіне, з беражкамі, калыхаецца і зіхаціць на сонцы. Раптам далёка ўбок, сарваўшы з пяцелек, аднесла лёгкім дыхам фіранку на адчыненым акне. Зляцела з падаконніка блакітнае птушынае яйка, знойдзенае ў лесе, і не пабілася. Яна амаль бачыла, як лёгка, гулёна, толькі што веснічкі не ляпнулі, зайшло на панадворак... Лета. «Трэба будзе букет змяніць...» — падумалася, быццам толькі што адцвіла ў стаўбуне вясновая лотаць, кветкі ўнікліва слаліся па днішчы стала, шукаючы ручаіну талай вады.

МЕСЯЧНАЯ КАМЕЯ
(Святочнае апавяданне)

Час у горадзе гэтай зімой ідзе супраць гадзіннікавай стралы. Снегу амаль няма, змэнчана чарнеюць дарогі, аніколькі не варожачы ў налецці на багатае зерне грэчкі, пшаніцы. І гэта на пост перад Калядамі. Праз акно, пераходзячы з пакоя ў пакой, раптам убачыш маладзік, спынішся, як ад выразнага, уніклівага позірку праз акно: ён — на цябе, ты — на яго. І наогул, здзіўляе, таямніча хвалюе, як іншы раз на вуліцы ўвечары хацелася неспадзявана азірнуцца, паглядзець якраз у той бок неба, дзе зіхацела камеяй поўня. Калі яна і хавалася за хмарамі, заўсёды адным позіркам знаходзіш яе ў ейных нават самых далёкіх пакоях. Звычайна з прыцемкамі ўжо анікога. Можа, каму ў гэтай пустэльні й адкрываўся Бог і выпрабоўваў каторага.

— Я сёння цэлы дзень шчыра пасціла і нават да нікога не загаварыла, — звоніць сяброўка Лена. — Але надта хачу табе расказаць... Аліна ж да мяне прыходзіла ўчора...

Забірае грэшны смех: а ці не высявала яна ўжо сабе ў пасцелю, варожачы перад Калядамі, насенне канапель, ці не спявала яна: «Святы Андрэй, дай мне знаць, з кім буду іх ірваць?»

Лена паспяхова займалася бізнесам, без грахоў не абыходзілася. Пачуўшы пра маю знаёмую з дзяцінства Аліну з трыма дзецьмі ды амаль без бацькі, дакляравала аддаць ёй кажушок сваёй дачкі, як кажуць, ахвяравала на ўбогія. Кажушок амаль новы, зазначыла тады мне крыху ніякавата, маўляў, няхай бы Аліна прынесла ёй наўзамен хаця б варэння ці так чаго свойскага. Аліна жыла з таго, што гандлявала на Камароўцы гароднінай, ягадамі, грыбамі. На ўсё лета кідала горад, ехала з дзецьмі ў вёску, у матчыну хату, засявала соткі, запасілася з лесу. Ну, прыходзіла Аліна, добра, але чаму такі ўзрушаны, багабойзны голас у маёй гараджанкі? Яна ж такая справядловая мінчанка, што і вёскі ніколі ў вочы не бачыла. А тут — да яе сама Аліна! Уяўляецца, як зайшоўшы ў кватэру да Лены, Аліна распранулася не адразу. Доўга звычайна стаіць у парозе, азіраецца па кутах, як на кароткім прыпынку, абы нага да нагі — і ўся ейная аддуха, заўсёды быццам увесь час і дзень

і ноч у доўгай дарозе. Сціпла падцісне вусны, а вочы пільныя, чаплістыя, во, маўляў, як людцы жывуць – у Лены паркет, гарнітуры скрозь! Без зайздрасці, з нейкім глыбокім сумам ці то па сабе, ці то па ёй, пакаёўцы, на ўсім гатовым. Але ніколі не блытаючы свой лёс з чужым. Разуецца, блішчаць шкарпэткі рознага колеру, абы цэлыя – не саромеецца. Доўга маўчыць, галаву набок, прыслухоўваецца да сцен, да рэчаў, як да мелодыі, каб жа не даць фальшу ў гаворцы. Гэта той чалавек, які доўга сам-насам бывае ў полі, у лесе, на зямлі. Акрыяе, загаворыць толькі тады, калі пачне павольна расхінаць пакункі, даставаць, як з кустоўя ўсё роўна, шклянкі з варэннем: вось чарніцы, маліны, вось грыбы. А сёння дачка Юлечка, самая меншая, адразу пайшла па пакоях. Стук-стук-стук, зазіраючы ва ўсе вуглы, быццам шукае дзірку, каб уцячы, як вожык з лесу – стук-стук. Дзякавала, пэўна, за кажушок без уніжэння, брала, як ад Бога: маўляў, ён лепей за яе ведае, каму што патрэбней. Папросіць гаспадыня да столу крыху пачаставацца. Пасядуць, і будзе Аліна даваць знакі Юльцы, каб бралася есці. Дзяўчо насцярожана пазірае на піццу, дома ніколі не модзіліся з ежай, кавалак хлеба ў адну руку, кілбасу – у другую, вось і ўвесь сэрвіс. Яшчэ раз, адыходзячы, паглядзіць Аліна вакол сябе з сумам, як на беразе вялікай стаячай вады, ёй, рухаваму чалавеку, гэта не жызня.

– Але ўсё гэта не галоўнае, – ужо амаль жалілася Лена. – Раніцай б'ю на патэльню ейныя яйкі – сапсаваныя! Грыбы праз ноч паплылі на падлогу – слоік, аказалася, быў пабіты... Муж сеў піць чай, паклала яму Алініных малін. «Ну і не смачнае ж тваё варэнне...» – кажа. А я ўжо маўчу... Усё, каб ты ведала, такое на смак не нашае, такое яно нічогае...

Сэрца стоілася, пачуўшы так блізка знак боскай кары, як перад відавочным здарэннем: ад Аліны няволле нічога браць узамен, тым больш перад Калядамі – не спажывеш, не разгавеешся, не задапаможышся ейным. Даць чыстай рукой, шчыра, як пакласці на ахвярнік у храме...

А выдавалася, што па гэтым смутным часе ў горадзе аніякія прыкметы не збываюцца, ніколі не спраўдзіцца добры сон і грэху няма. Нарэшце-такі адчыніліся, бы ад ветру, гарадскія вароты, упусціўшы да людзей сваіх чараўнікоў, варажбітак, красналюдкаў! Дзеўкі, спахапіўшыся, пякуць какорку на

адной солі, ядуць яе перад ноччу, кладучыся спаць, каб прыйшоў у сне жаніх, падаў сасмяглай нявесце вады. Сеялі каноплі ў пасцелю. Раніцай, на ўскрайку горада, дзе яшчэ жылі па-вясковаму, сваёй хатай, прачнуўшыся, гаспадар, пэўна, ішоў у хляўчук, падымаў на ногі з начы казу ці свінчо, паварочваў галавой да варот. Кратаў лапату, граблі, абы з месца зрушыць. Мяшаў такое-сякое зерне, насенне, каб павярнуць усё на спрыяючае лета. Бо дзень пабольшаў ужо, як кажуць, на казіны скок. На таго, хто пасціўся, каяўся, спавядаў свае грахі, накладалася эпіцімія з благачынных спраў і нават пазбаўлення волі, каб чалавек мог пераадолець свае благія звычкі. Ружанцам блішчалі густыя зоркі, варожачы на мароз. Нарэшце, зіма знялася з белага гнязда.

Апошняй у адчыненыя гарадскія вароты ўвойдзе Аліна, крыху кульгаючы, — з дзяцінства сталася, маці не дагледзела, упусціла з рук, нага зраслася, як дрэўца. Ніхто не заўважаў ейнай знявечанасці — рэдкая прыгажосць сляпіла вочы й мужчын і жанчын. Яна цягнула на сабе цялежку з гароднінай, ягадамі, грыбамі — перад гадавым святам звычайна ўдалы торг. Паліто на ёй старое, вясковага крою, недапасаванае, толькі што вяроўкай не падперазаўшыся. Боты-гумовікі па такой слабай зіме, хустка-крыпанка — так звычайна ідзе вясковы чалавек з хаты ў поле, у лес, да работы. Яна перавезла сюды, у горад, разам з сваёй цяжкой покладдзю свае строі, свае парадкі. Ні на кога не звяртае ўвагі, ідзе павольна, вачыма перад сабой, на дарогу, як цёмным лесам, каб аглобляй не зачапіцца за дрэва, за нізкі сук, галаву паспець прыгнуць. Як не перабірае лейцы ў руках, кіруецца раздумляючыся... Мужу, бачыш, не падабаецца ейная работа, заве яе шпікулянткай. Свекрыве ў вёсцы таксама яна непанараўная, кожны раз упікне пры сустрэчы, маўляў, таргоўля — нетрудавыя даходы. А што яна — перапрадае?.. Такія ласі сядзяць у камерцыйных будках, яны, бачыш, у законе, а яна са сваімі буракамі й сваёй бульбай — шпікулянтка?!. Другая маладая баба і ў бізнес, як той казаў, і пад бізнес, ці грэх ці не... Скрыпіць левае кола, каб як дацягнуцца хаця да Камароўкі. Сёння будзе ўдалы торг.

Але што гэтыя гараджане ведаюць пра сапраўдны смак, сапраўдны пах свойскіх ягад, грыбоў, увесь час седзючы на крамным?..

У вёсцы Аліне не вельмі спагадаюць, маўляў, надта ж сквапная: жыве ў горадзе і соткі матчыны засявае.

– Чаго ты ўбілася ў маё сена? – выгаворвае суседцы, калі тая скасіла ейны ўзмежак.

– А нашто яно табе без каровы?

– Расце трава, дык хай будзе і сена!.. – адказвае Аліна, маўляў, усё ёй спатрэбіцца, не чапайце.

Ды каб жа яна сама спажыла тое, што вырасце, як яны кажуць, гэтая шпікулянтка. Надта нязвыкла вёсцы, далёкай ад горада, зразумець, што можна прадаць тое-сёе з зямлі, мець дабаўку да пенсіі. Бы яно табе крэўнае тое, што народзіцца на сваёй спрадвечнай дзялцы. Старыя людзі ганьбавалі таргаваць. Калі хто крычыць на вуліцы, то гэта ўжо ў Алінін адрас. Возьме каня, адзін дзень паробіць, а людзі: «Назаўтра яго на лісіцы ў звярынец здалі, гэтак уездзіла скаціну!» І ніхто адзін аднаму не ўспомніць, што даўно меліся таго старога каня збываць. Усе пры калгасе, а яна ўжо тут як прымака, як прысцябай кабыле хвост. Стараецца ўхапіць, спарадкавацца, аж тэтар бярэ на яе гледзячы. Быццам парушаецца Алінай даўнейшы вясковы рытм, маўляў, пары хопіць: гэты жаліцца – хворы, той – бы прысмерці, але кожны, злуецца Аліна, да глыбокай старасці дакалышацца, жывучы абы дзень да вечара. Сядзіць, шануецца каторая баба, за гэты час можна было б, ці грэх, ці не, і памерці! «Ты мае грыбы сабрала», – сапе суседка, сустрэўшы на вуліцы. Пакуль яна, каторая, карову выгнала, пакуль нашлэпалася, людзей зводзячы па вёсцы, Аліна ўжо ў лесе. Адна зязюлька яе пераймае. Едзе ў лес з дзецьмі на ровары. Як можна размінуцца з грыбамі, калі іх як касой касі, ды ўсё дармавое! Назад цягнецца абчапаўшыся кашамі, вёдрамі. Сабака з таго канца вёскі не пазнаў – укусіў за хворую нагу. «Сваіх не чапае, а ты прыехала тут!» – накрычала і гаспадыня. А сама з-за свету, нядаўна пабудаваўшыся. «Гультайка! Во такія грудзі, а малака ані кроплі пасля родаў...» – падумала Аліна памсліва з вялікай злосці й супакоілася.

Шмат у вёсцы новых хат, наезджых людзей. Зайдзіцца, ідучы з ягад, на могілкі, адразу за возерам. Такія блізкія твары на здымках на помніках, такія родныя, што і дамоў ісці не хочацца. Цвіце язмен – спакой, раскоша, як у вёсцы калісьці, толькі дзікія пчолы лётаюць, гудуць. Тут памятаюць ейных

дзядоў і прадзедаў. Тут і не пытаючыся, усё ведаюць, што замуж ейны ў горадзе не ўдаўся. Мужык п'е, гуляе, прыйшоў неяк з «танцаў», кажучы па-вясковаму, не пусціла начаваць, да суседзей прасіўся. На рабоце яе скарацілі, добра што хоць далі групу, ідзе такая-сякая пенсія па інваліднасці. Жывым не пажалішся, што збіраецца кідаць мужыка, яе ж і абвінавацяць... Возера каля могілак поўнае, як вочка, вада чыстая, відаць, як вялікая рыба ходзіць, гуляючы. Вёска на тым беразе, пасачкам паміж небам і вадой. Некалі стаяць, любавацца, тады толькі й нагледзілася на гэтую прыгажосць, калі яшчэ жывучы ў вёсцы, радоўку адбывала за карову...

Людзі абселі, ягады абсыпалі – ужо ёсць чарніцы. Усё кідае, ляціць з дзецьмі ў Царкоўе, бліжэйшы лес. Бабы абшчэбаюць, хадзі тады, шукай, а то ж можна на месцы вядро сабраць, як вады зачэрпнуць. Па кавалку хлеба з саланінай у хустцы – да паясніцы, чатыры крыжыкі на зямлю перад лесам, каб з гадыняй размінуцца.

Цвіркуны – гарачым прысакам пад нагамі. Спякота, упаўдні лес душкуецца, цякуць як са свечак, смолы, пахне лампадным алеем. За дзень даспяваюць ягады ў цёмных кутках, схаваных ад сонца, ад людзей – птушыныя ласункі. Гадыні, разамлеўшы, ляжаць кружалкамі. Сіпла азавецца каторая з кустоўя. А такі ж якраз тут ягаднік харошы, лісту не відаць за ягадамі! Сляпні абступяць ейны маладзенькі табун – некалі абараняцца, трэба й назбіраць з коптарам і наесціся ў лесе, каб дома не хацелася ўкрасці з кошыка – ягады ж на продаж. Але ёсць такая хвіліна ўпаўдні, калі лес змірыць чалавека са зверам, палягуць у адзін бок галовамі, паснуць, скруціўшыся, і страх адляціць ад іх шэрай птушкай на высокае дрэва ў дупло. Кідаюцца ноччу малыя ў ложку, віўкаюць, снючы гадыню, смыліць на руках, на твары ейны нерухомы, пільны пагляд. «Дзеці, уставайце... Сонца высока... Вецер ужо расу абтрос!..» – будзіць Аліна. «Во, каб даў Бог дождж, – думае кожны з іх сам сабе. – Тады ягады пахаваюцца, там-сям таямніча блісне вочка красналюдка...» Куляюцца дзеці з ложка, ножкі нягнуткія, як калкі.

Ніколі не купляю чарніцы на кірмашы, яны мяне смажаць, гэтыя чорныя ягады й майго дзяцінства. Солана ў роце ад поту, ад слёз. Вусцішна есці, бы яны сабраны ў цёмным ягадніку на

кінутых могілках. А варэнне, калі пачастуе Аліна, хоць ты на куце стаў, пад абразамі, дзеля прычасця – такое яно дарагое, з такіх дарагіх да болю мясцін...

Чарніцы, потым – маліны, ягады, як сухоты: нічога не баліць, а чалавек на іх як хварэе. А тут ужо і бульбу трэба капаць, сусед барозны разагнаў за бутэльку. Аліна – зноў у лес, па грыбы, адна, дзяцей адправіла ў горад да бацькі, да школы. Прыедзе на сокавы завод у Паставы здаваць, запозніцца: «Ну, людзінка, ну прыміце грыбы... Маю дзяцей малых трое, паспагадайце», – гэтак просіць. За другім разам устыдаецца, нялоўка жаліцца, тады ідзе ўнаначкі да сяброўкі, каб раніцай першай быць у чарзе. Падхопіцца ноччу – абразы бачыць, не на тым месцы, не пазнае, дзе заначавала. Чуе праз ноч, праз лес, праз Царкоўе і Забаладдзе, як людзі смяюцца ў вёсцы несцішоным смехам: «Бульбу кінула, не спарадкавала, зелянее на сонцы... Сама бадзяецца па горадзе з грыбамі!» Прыехаўшы з Пастаў папацёмках, калі ўсе паснулі, крадучыся, ішла на соткі, на каленьках выбірала бульбу. Ды раптам узышла поўня! Бульба ляжыць белая, відаецца добра! Дапаўначы пераглядаліся з той поўняй, як змоўшчыцы. Смяялася сама сабе, цешылася – вось і дзень надтачыла, залатала, ніхто не пазнае, як яно было! З галадоўкі ўзбілася на яблык з хлебам – і жыва па гэтым. Раніцай усе беглі глядзець, хто толькі быў на хаду, дзівіліся – чыстае бульбянішча, пэўна, чэрці ёй дапамагаюць.

Усё сабрала, пасеяла лубін на заворку. Выкапала моркву, ды такая яна спелая, у руках трэскалася, як выбірала. Прыехала ў горад – дома непарадкі: адно дзіця згубіла акуляры, другое – прапусціла ўрокі музыкі, трэцяе, самае большае, – грыўку адрэзала! Вось табе і хвалёныя дзеці! Як новая настаўніца казала: «Такія яны прыхілкія, такія ліпкія, што ўжо там за бацькі?!.» – дзівілася. Строгая Аліна матка, а ў вёсцы лічаць – благая, маўляў, малыя за работай свету не бачаць.

І мужык той, бы кот, шусь! праз парог, пад ногі выслізнуў, як толькі дзверы ў кватэру адчыніла.

– Мой запатрабаваў, каб спраўку ўзяла... Будзе на развод падаваць, – сказала Аліна замест прывітання на гэты раз.

З самага рання зайшлася да мяне, бы гэта начная бяда, з начы сталася. Каб далучыліся да ейнага гора, прыйшла

ў хату. Як па нябожчыку наказала. Стаіць у парозе, вочы падняла ўгару, стрымліваючы слёзы. Набегла аж пад вечка, глянула перад сабой — перакуліліся вёдры, плача не хаваючыся. Не, развод яна яму не дасць, маўляў, няхай будзе мужык, які ёсць, дзеля людзей, дзеля вёскі. Толькі мелася пажаліцца на мужа адной жанчыне, тая ўжо, можна сказаць, пры смерці была, такая старая, — назаўтра ўся вёска галавой ківала, маўляў сама вінаватая, што не ўжываюцца. Не, няхай ужо мужычок на гэта выбачае! Кідаецца ў хітрыкі, смяецца з сябе: спраўку дасць, калі той падлогу ў кватэры пафарбуе! Вось і ўсё! Дык жа зіма на двары, пярэчу?! Яму будзе лета, і яшчэ лета, ён ніколі не адважыцца што-небудзь зрабіць у сям'і, адказвае. І дзеці дубка пасталі: ты, мама, замуж ішла, нас не было, — трэба было глядзець, а цяпер — жыві! Дасталася Аліна і да варажбіткі. Насядае на мужа твая знаёмая, кажа тая, яны разам працуюць. Адкуль? З Калодзішчаў! Не па любасці сышлася, ад зайздрасці, што ты ў пары, а яна дзявуе. Грошы запрасіла за нагаворнае зелле немалыя, яно сабе. А яшчэ трэба шэсць дзесяткаў яек, на могілкі чарцей карміць. І шэсць метраў палатна, любой матэрыі, бо чэрці ўсё роўна яго ў балота завалакуць. Тады падробіць так, каб у яго, брыдка казаць, не стаяў. Начорта такі й ёй самой, адказала Аліна! Не да спадобы ёй старая варажбітка, мала што ўгадала. «Усё ведаю, але гавару мала», — паўтарае і маўчыць. Аддала ёй грошы, каб не думала, што яна ёй павінна. Зелле, праўда, і сама п'е і мужыку ў кампот падлівае.

Няма аніякага пазнатку — муж усё роўна звер зверам. «Што ты такая вясёлая, глядзі, каб не галасіла!.. Не лашчыся, я яшчэ зарплату не атрымаў!» — і ўся ягоная гаворка. Тады яна адважылася, ішла да яго на работу. Не, не жаліцца, вядома. Хто чужы збоку паверыць, што мужык ейны п'яніца? Ён жа не валяецца. Другі пад сталом ужо ў бяседзе, а ён яшчэ сядзіць, бо яму конская доза патрэбна, каб адужаць. Ішла пагаварыць. Што дома — толькі свара і свара, там, на людзях, можа, хоць стрымаецца. Дабірала час, апранала абавязкова што-небудзь доўгае, лічыла, надта па модзе. Ішла павольна, пагляд — паверх галоў, як пастыр у барме з кіем. Муляла ўсю дарогу словы сухімі, жорсткімі вуснамі, рыхтавалася. Рэдкая хвіліна, калі яна, нарэшце, «пасціла» сваю сям'ю.

Дзень у дзень – Камароўка, торг.

Заедзе на кірмаш, не спаўшы, не еўшы, сядзіць, разглядаецца. Ужо яна і разгаварылася, ужо і засмяялася. «Во, Камароўка мяне і адкалыхала...» – скажа сама да сябе. Малады мужчына спыніўся насупраць.

– А я тут учора буракі купляў! – стаіць, смяецца ўзрадавана.

Жонка пацягнула за рукаво, той, схамянуўшыся, адышоўся. І невядома ці дасць сабе рады здагадацца, чаму спыніўся. Гэткая ж падзея – ён тут буракі купляў! Але якраз жа тымі днямі па тэлебачанні ішла рэклама дарагога французскага мыла «камея». Памятаеце, жанчына ў чырвоным, павольна паварочваецца праз плячо да вас тварам, пазірае, як поўня ноччу ў акно, па-сялянску круглатварая, прывабная. Зноў адвярнулася, віхурыць у танцы па вялікай нябеснай зале, таямніча ўсміхаецца, усіх спадманваючы, нікому не належачы. І нават калі на ейнай галаве ўжо толькі ружовая істужка, каб не запэцкаць мыльнай пенай валасы, глядзіць на вас з даверлівай і цнатлівай бессаромнасцю, бы мыючыся ў агульнай лазні разам з вамі. Рыхтык Аліна!

Толькі тая і розніца, што Аліна за ўвесь дзень не зірнула ў люстэрка, укінуўшы з раніцы расчоску ў вядро, якім прадае бульбу. «Ну, ты сваё прадасі, такая жанчына прыгожая...» – скажа іншы раз баба, стоячы з ёй побач на кірмашы. Падышоў неяк палкоўнік, у форме, зорачкі на пагонах. «Шкада, у мяне, – кажа, – няма ўжо болей грошай на вашу моркву». «У вас ды няма грошай?! А мы так на вас раўняліся! – дзівіцца Аліна. – Прыходзьце пасля палучкі...» «Як вас завуць?» – пытае афіцэр. Ну, палкоўнік яшчэ ніколі ў яе мення не пытаўся. Пэўна, гэта ўжо знаёмства?! Адкажа што-небудзь вясёлае, не ўзвей вецер.

«Камароўка на маё бязмужжа, на маю бязроднасць! Яна і паспагадае, і пасмяецца. І схітруе, і выручку дасць у руку...» – як не галосіць.

Пачуўшы, што Аліна разводзіцца, мужчына адзін, таксама таргуе гароднінай, так і сказаў: «Ай, гэта не ты сама вінаватая, па табе бачу. Я ж не п'ю і не куру. Як толькі муж твой апошнюю нагу забраў праз парог, то і я да цябе ў хату, калі захочаш...» Гэта ўжо сватаўство... Каторая гараджанка доўга цацкае ейны

тавар, адкіне ўбок, абы на моркве плямку заўважыла. Аліна ніколі не пярэчыць. Адыдзецца пераборлівая пакупніца, яна зноў пакладзе выбракаванае на вагі, спадзеючыся неяк жа збыць на кірмашы ўсё, што прывезла. Глядзіць табе ў вочы, як замаўляючы, каб чалавек не перабіраў, мнецца, аж хварэе. Гэтак цяжка яно ёй далося. Яшчэ яно ёй буяе бацьвіннем. Яшчэ, здэйся, толькі з зямлі. Рукамі перабранае, кратаецца, пясочак ад карэньчыка адсыпаецца, як ад жывога. А ўжо яго зямелька назад да сябе забірае, ужо яно сапсавалася, гіне. Глядзіць пакутніцай, не даючы гараджанцы слова сказаць, маўляў — бяры й з канцом! Не любіць аддаваць зямлі, ніколі нічога не выкідае.

Сёння, перад самым Новым годам Аліна запазнілася, як ніколі. Камароўку ўжо закрылі, тады яна стала з дзецьмі за варотамі, прадала, што было. Ішлі дамоў, нідзе ані чалавечка, вуліцы пустыя, светла. Усе людзі ўжо недзе каля святочных сталоў, прыбраўшыся. А ёй і так добра. А што тут крыўдаваць, на каго? Дзеці з ёй, усе пры дзеле, усё з ёй, што нажыла. Нечый мужчына забадзяўся, дапамог сесці з цялежкай у аўтобус. І тут — пуста, ніхто не зыркае, не сварыцца, што баба з сваімі калясьмі ў гарадскім транспарце. І дзякуй Богу. Ехала, глядзела на прыбраны горад як з свайго вясёлага, вясковага акна, дзівілася, цешылася — і тутака ўдалося дзень надтачыць, пакуль людзі гуляюць. Вось якая яна ўпраўная.

Вернецца з таго торгу, завядзе руку з грабеньчыкам над галавой і забудзецца, што збіралася прычасацца. Падайце, дзеці, табурэт сесці, падайце талерку, так змарылася. Лыжку толькі што памочыць ва ўчарашнюю капусту і пойдзе спаць. Вецер прагрукоча над дахамі новага мікрараёна, як скоры цягнік — ні дрэўца, ні куста каля дамоў — няма жывой гамонкі. Успомніла наастатак, як адна баптыстка, разам стаяла з гароднінай, таксама таргавала, раптам сказала: «Я думала, што ты... святая... А бачу: у цябе завушніцы...» Усміхнулася, так і заснула.

Усмешка далёкай поўні не сыходзіла з твару. Была гэта надта відная ноч усім, хто святкаваў...

АД ХАЛОДНАГА БОКУ СОНЦА

На панадворку анікога. Ужо здалёк ад варотцаў відаць, што дзверы ў хату пазачыняныя, але звыкла, недавяркам, гоніш пад самы парог, ветрам заварочваешся назад. Толькі кружалкамі за табой слабка віхурыцца свежае сена. Сенам выслана вуліца, усе двары, бы стол на калядную куццю. Лугавы ветрык заходзіцца ў адзін двор, у другі, як не аберучкі, растрасе тугія каслаўкі, – раўнуе сянны настольнік. Неспадзявана павее святам. «А-а-а, – здагадваешся, – гэта ж Сенакос!»

Сонца гарыць, патрэсквае пад нагамі яго вялікае шаламя.

Анікога, пустыя двары. Раней за ўсіх упільнуеш суседку Стасю. Ідзе па той бок ракі за возам сена. Ідзе іншы раз за козамі, вядзецца наважаць да лесу, ланцуг на плячы, ідзе сама за імі, як на тым жывым ланцугу ўсё роўна, занялася на ўсю вуліцу, ступае спорна, прастуючы дарогай, гледзячы не перад сабой, а намнога далей сваёй сцежкі. І калі адна ідзе, выдаецца, бы век за козамі ходзіць. Толькі вочы надта далёкія адгэтуль. «Адна ў адзін бок, другая – у другі, каб звязаў, хай бы бораліся», – смяецца, абы загаварыць... Свежы загар чырвоным закальцам – занадта, пэўна, блізка стаяла каля сонца, найперш ад усіх. Яшчэ раніцай, толькі ўстаўшы, бачыла, ішла яна з мужам Пётрам з косамі ў руках ужо дамоў. Ішла крыху адлучыўшыся ад яго, ззаду, нага за нагу, гуляючы, галава высока, бы п'ючы асалоду. Такая вялікая работа ўжо зроблена, а яшчэ ж надта рана, быццам і расходу не было – увесь дзень наперадзе! Мокрая ідзе ад расы, аж патанела, здаецца, сукенка да ног лісне, хустка на плячы сохне, памаладзела з твару – адцягвае раніца стому, лёгка робіцца.

Няздобрацца, ведаю, ёй гэтыя выперадкі.

Стася, калісьці яшчэ дзеўкай, ад'ехала з Бараўкоў у горад, вярнулася з мужам у матчыну пустую хату, пайшоўшы ўжо на пенсію (гарадскую кватэру адпісала жанатаму сыну). Сядзеў на лаўцы пад сваімі вокнамі напроці яе хаты, скаваны цяжкай хваробай, родны брат Рыгор, паліў вачыма і хату ейную, і хлеў, і агарод, і сад, і во гэты воз сена. Труднаваў.

– Хадзі пасядзі, – зваў мяне да сябе, каб выгаварыцца, і пачынаў у каторы раз то пра Стасю, то пра яе мужыка.

– От гадкі чалавек, гэты Пецька Лешчык!

– Чаму, дзядзька?

– Жабрак! у мяне і плуг, і барана, і хамут, у яго – анічога! у мяне ўсё ёсць, я ж жыць збіраўся!..

– Дык ён жа ў горадзе жыў, навошта яму было гэта мець? Круціць галавой, як з пахмелля, не, маўляў, усё роўна ён не гаспадар, вымяраў свайго швагра старой меркай і ўдоўжкі, і ўшыркі, даўнейшай мужыцкай сялянскай меркай. А той яе перарос, увачавідкі вырабіўся і без свайго плуга, і без свайго хамута – на пазыцы. Мелі ўжо Лешчыкі карову, стаялі клетухі з трусамі, хадзілі па двары куры, гусі, козы, буяў агарод. Чаму б не любіць, што родная сястра разжывацца стала?

З чаго яно, варожае, пачалося, каб жа ўспомніць... Як толькі перабіраліся Лешчыкі ў Бараўкі, адразу ўзяліся рамантаваць старую хату. Даўно яна, пасля смерці бацькоў, служыла ўжо абы цыбулю абсушыць, выцягнуўшы з зямлі, паставіць штонебудзь узіму на расоле. І мышы за сабой, ведама, дзверы не зачынялі, здзіркаваўшы на рэшата падлогу. Пазвалі да сябе, праўду кажучы, бадзялага чалавека Аляксея аднекуль з Расіі, хваліўся, умее сталярку рабіць, абмылі яго, пасадзілі разам да столу. Зацыравала Стася ягоную адзежу. Блізка нахінулася да кашулі, адкусваючы нітку. Глядзь: стаіць Аляксей з мужыкамі вясковымі, рукі ўбокі, нагу адставіў, смяецца, усё на ім свіціцца, а костка моцная, маладая, што ты на яго ні ўскінь – не брыдка. «Стася!» – пазваў яе, яна ішла з хлева, дзверы зачыняла. Крута павярнулася да яго, лёгка скранулася застоенае ў сямейным катуху цела, абазначыўся стан, ускалыхнуліся грудзі, туга перацятыя станікам...

Вось і ўся іхняя інтымная размова паміж сабой, і то на маіх вачах.

Паехалі з Аляксеем у лес, разам – падрубы, разам – слупы на плот, абабілі шчыт, пераставілі печ у другі бок чалеснікам, разгарадзілі хату па-гарадскому. Сядуць на вялікай верандзе, як на пароме, і плывуць, смеючыся, пасярод зялёнай завадзі бульбоўніку з белымі пеністымі грабеньчыкамі квецені. Засталося толькі хату ашаляваць. Знаходзіла яму работу і знаходзіла, сама з ім камандавалася, як валкам прыціскаючы, качала яго ў рабоце па двары, па хаце, па хлявах, прастала ўсю на рубцах ягоную басяцкую, як кажуць, жызню, каб прывык,

асмакаваўся на адным месцы, прыжаніўся ў вёсцы, – на вачах будзе. А сядуць есці, ды яшчэ калі пры гасцях, настольнік пакладзе белы-белы, ражкі ўверх падымаюцца, выгінаюцца лёгкай перыной. Сама сядзе задалёка ад яго, на вугле, Аляксей – на другім, хаця ўвесь бок стала слабодны. Каб было відацца, што ён тутака пастаялец, чужы, лішні. Усё жыццё на вугле, на рагу. І яна, бы на рагу, у сваёй хаце...

Дзядзька Рыгор выйшаў, трымаючыся за вушак, на панадворак, па сцяне – на лаву. Хата Стасіна стаяла насупраць навюткая, бы толькі што прыдбаная на кірмашы. Падысці бліжэй, паглядзець не мог. Сядзіць іншы раз, глядзіць перад сабой на сцежку да ракі, аж узмокне, так глядзіць, ківаецца, бы тую сцежку, як вяроўку на цэўку, зматвае, падцягвае да сябе бліжэй, каб убачыць, што там далей, каб усю сабе на вочы, аж за раку, за лес, на той луг, дзе ягоная сівая трава каторы год дзявуе някошанай. Анікога ззаду за ім, каб узяў, касой залажыў – адныя дочкі, а зяці гарадскога заводу, і кала каторы дарэчы не зачэша.

Дом Стасін, бачыць, як новы. Дык ён жа сам столяр добры, і ён мог бы паднавіць бацькаву хату і прадаць, не такія прадаюцца за грошы, дачніку абы пляц. Што тая карова, якую бацька даў яму (Стасі адпісаў хату), каровы даўно няма. Ашуканцы! І сястра і... бацька, калі так! Свая, праўда, хата неблагая, але будавалася за бедным часам і яшчэ рамонту не мела – не паспеў за хваробай. Верандачка тая малая, бы дзіцячая калыска-зыбаўка, унукі там гуляюць, пісклюкі ад дажджу хаваюцца. Старая вагонка выгінаецца, высахла на трэску, павыцягвала цвікі абцугамі, пашчапалася. Аж, здаецца, чуваць у хаце, як закладаюцца тыя абцугі, сыплюцца далоў іржавыя цвікі, разыходзіцца шво. І чорны ход ёсць, і чысты ход, але ўсё жыццё праз адзін чорны ўдалося. Чысты завалены старымі валёнкамі, восы летась завяліся ці чмялі. Каля хаты з усіх бакоў – сюды торк, туды торк – стаялі то палка, то калок, то лясіна, усё, што траплялася, падымала жонка Агата, несла да вугла, несвядома, як бусліха, мацавала гняздо. Вось і ўвесь паратунак. Нічога ўжо ён сам не можа ў хаце паправіць. І, здаецца, не памёр, і жызні няма – на парозе стаіць, ні туды, ні сюды, не размінуцца, яшчэ толькі кіем можа паківаць.

Калі раптам абступілі яго пчолы, вуллі Лешчыкавы стаялі ў агародзе, блізка. Біў сябе па грудзях, на твары лапаў, выбіраў

у валасах, а рукі не слухаліся, толькі ўверх-уніз, уверх-уніз – не завядзеш убок, цяжкія рукі, валяцца на каленькі. Можа, ужо тыя пчолы й адляцеліся, але закрычаў малы ўнук у садзе, пэўна, і да яго дасталіся. Галасок спужаны, тоненькі, балюча віўся ўвушшу, аж засмылела. Зноў заторгаліся рукі ўверх-уніз. Пётра ўбачыў, падбег, схапіў Рыгора на рукі, панёс у хату.

«Во, як малога... са двара... са свайго... а ім, халера, мёд?!»

Дабавілася злосці.

Каб і не хвароба, ці забіў бы Рыгор цвіка? Вунь, да каго ні зазірнеш, не зайдзішся – высыпаўся кош, паваліўся плот, асоўвалася цымбравіна ў студні, пырснула дошка з-пад нагі на ганку. Старэлі й самі вочы, не заўважалі. Асядала хата, асядалі й ногі – столь быццам і не ніжэла. Нікога з мужыкоў рух не браў. А можа, усё яно на памяці, як новае, бо надта доўга, надта цяжка нажывалася. На памяці й трымаецца і выдаецца нязбытным, трывушчым само па сабе, уваччу стаіць зданню.

Лешчыкі ўносілі ў філасофію дзядзькі Рыгора, усёй вёскі блытаніну, трывогу: нешта ўсё будуюцца і майструюць!

Далей – болей. Бараўкі абляцела навіна: Лешчыкі будуць купляць карову, кажуць – у калгасе.

Сабраліся ісці.

– З хлебам трэба, гэта ж карміцелька... Хлеб у руку вазьміце, – падказала Агата, жонка Рыгора, і свайго прынесла, у Стасі якраз быў хлеб выйшаўшы.

Зойдзе заўсёды ў хату да Стасі, як праз шыбу, нячутна, асвеціць табе вочы нейкім патаемным сэнсам, быццам на кладзежы закапаным жывеш... А! Марудзіцца з ёй! Але хлеб такі ўзялі.

«Карову?!.» У самога Рыгора такая старая, хоць ты кашай кармі – ні зубоў, ні капытоў, а не выходзіць пусціць цялушку ўзамен, – то скіне, носячы, то грошы пільна спатрэбяцца – вядуць здаваць. Скуль? З чаго? Агата нічога не разумела, як разжылася залоўка на новым месцы. І не ўглядалася ў іх бок. Калі й падзівіцца, то ўсё роўна зробіць па-свойму, у яе рукі наламаныя адзін раз, ужо не будзе перавучвацца жыць. Курыца заквохча, яна яе – жыватом у ваду. Жывот у чалавека забаліць – няма, кажа, лепшага лякарства, як паўкубка гарэлкі з соллю. А каб жа запытацца, хто навучыў? Не ведае. Асядае, кальцуецца ў ёй векавое, бы на немаладым моцным дрэве. Пойдзе

ў камору, там мяшок стаіць з мукой, — ай, як добра жывецца, усяго поўна! Зніме з мукі мышку, сытую, нерухомую, і ўцячы ўжо тая ад ката не здужае, так наеўшыся. Засмяецца. Во, каб мышы ды не было ў хаце, яна ўсюды дастанецца, няма чаго і бараніцца, пасткі купляць, ставіць. Жарт?!. Абы з вачэй далоў. Крот парыў сенажаць? Ну, дык жа некалі зморыцца і перастане... Увосень зловіць каторую маладую курыцу, курыца рабая-рабая, да дзікасці, бы ў лесе з дрэва знятая птушка, паважыць на руках, пагушкае, як не на язык возьме прывес, зморшчыцца, калі выдаецца залёгкай. Штодня будзе мацаць, не здагадваючыся кінуць лішку, жменю круп ці зерня, маўляў, па волі ж ходзяць, хай самі стараюцца. Увесну зноў спусціць на зямлю поўны падол, стоячы на ганку, здэйся, і з рукавоў пісклюкі пасыпяцца, рукамі палопае, пастрашыць — ляціце сабе, жыруйце! Аніякая гаспадыня, падумаецца збоку. Але ж пускае во гэтак сваіх птушанят і бусел, і варона, і ластаўка, маўляў, на даверы ўсё трымаецца. І не лічыць Агата, колькі іх, інкубатарскіх, назаўтра застанецца — хай ратуюцца.

Пацягне ад яе панадворка халадком, халадок вясновы, блізкі да сэрца, а ногі студзіць.

Во, калі ўжо Агата пайшла ўборкі з усімі, калі здумала авечак завесці. У Стасі нагледзела, адзін раз пазайздросціла, і сваю гаспадарку наважылася трохі перайначыць. Як ужо хавалася, як украдалася ад усіх у хаце, чаго паехала да Ракава на кірмаш! Гэта ж якое дзіва! Народзіцца маленькі й ужо стаіць, нагой тупае, і ўсё разумее, не трэба яму ні гаварыць, ні чытаць. І прасці яна ўмее, і пруткамі рабіць, і шыць яшчэ з дзявоцтва, толькі, во, за работай, за гаспадаркай не пасядзіш, не пазабаўляешся. Швэдру, праўда, сваю, як адзене, дык яна не тое што цёплая, а жывая да цела.

Толькі чаму гэта Агаце ўсё помніцца, не забываецца, як свякроўка адразу пасля вяселля загадала яшчэ чыстыя цюлі на вокнах памыць? Усім з ягонай радні ўспамінаецца... «Манька, — папрасіла ўпотайкі суседку, — памажы мне, я не патраплю...» Здагадвалася, што свякрова мацае яе на зуб, ці ўмее яна рабіць далікатную работу — надта ж з беднай хаты была браная... Цяперака толькі здыме іх з вяроўкі — і падпаху, нясе, не шманаючы, белае воблака па зямлі — абы ваду бачылі.

Спыніць на дарозе, запытаецца знянацку:

– Як ты тварог робіш? Га?

Стаіць, слухае, ды раптам, як хто яе за рукаво пацягнуў, галавой круць – і пайшла ў другі бок. І яшчэ раз запытаецца (пэўна ж, дочкі данімалі, бо такі сыр кіслы, часта вала, аж за вушамі пішчыць), і зноў кіне гаворку, каб не парушыць у сабе нешта сваё, цалнае. Быццам ёй дазволу не было вышэйшага перарабляць, іначыць свае звычкі, работу, навуку мацеркі. Аж, выдаецца, кішэні пераверне, вытрасе тое, што трапіла туды, як кастру, вытрасе чужую параду, чужую навуку. Завяжа хустку, рублёвую, на тры рагі, дробныя рудыя кветачкі на ёй. Хоць якой парой кветкі, і сонца не бярэ іх, і не змываюцца вадой не зносіць. Рукой лапнеш ад печы – няма пазнатку, бо рабенькая. Вочы цёмныя, нізкія, падымае іх на цябе, падымае, прывыкаючы як не кожан дзень. Цёмная ўся, летам счарнее, сасмагне на смуродзіну.

Прыслухоўвалася Агата да мужавай гаворкі пра Лешчыкаў, а сабе думалася, што выбалела ў ягонай галаве, у целе, добрага ўжо ніколі ні да кога не скажа. Не, без гаспадаркі, разумела, якая жызня? Гэта ж розны смак пазнаеш: то з мясам вада, то з цыбуляй – усё ж перамены. А ў магазіне ж батон адным смакам...

Але няма на свеце нічога найбольш едкага, як бабская прыглядка. Вой, што гэта мне холадна і холадна?!. Я і целагрэйку, я і хустку на галаву, цёплую, валёнку, а мяне калоціць! А Стася, паглядзіш, ногі голыя, сукенка з кароткім рукавом – лётае! І ёй цёпла?! Не-е-е. Тутака нешта ёсць... Як прыйдзе чаго ў хату прасіць – дык жа ўсё да мяне і да мяне! – і проста з рук вырывае, калі падаеш ці рэшата, ці касу... Па што прыходзіць?.. Сілу забірае... Вусцішна робіцца... Яна ж, Агата, куды ні йдзе, ніколі нічога не баіцца – перахрысціцца, крыжыка на сябе наложыць, бо не заўсёды ж носіш на целе – і йдзе сабе смела што днём, што ноччу, што полем, што лесам. А тутака ў сваёй хаце ні тое, ні сёе...

Але гэта ўжо іхняя свара ўвабралася ў добрую сярэдзіну. Сенакос! Мужчыны, ім ці сенакос, ці не – усе на адзін твар.

– Во, каб знаў, што гэта ты там, у Чорным лагу, уварваў маё – даў бы!

– А я бачу чужыя пракосы й сабе думаю: добра, што мне нехта памог, аднаму не ўходаць...

Размова толькі пра сена. То там воз рыпіць, то там, едзе каторы, кружаняе, як аб'ездчык, быццам усюды той самы чалавек тырчыць камлём з воза. Бабы – не. Усё пакідана ў хаце, як зачыніць, нагой папіхнуўшы тое, што не тоўпіцца. Некалі, пагоду трэба ўхапіць! Затое сукенка – абавязкова лёгенькая, з шафы, чыстая, бо чыстая і работа, быццам святочная. Як гэта – ад печы, у тым самым? Сонейка свеціць, весела! Хустку ў рукі – і цераз парог! На ляту перад сабой выпрастаць за рагі – дзе тут найніца, дзе добрыца? – тузануць, прасуючы, і мах! на галаву. Абы выскачыць скарэй з дамашняга пекла. За вёскай ужо крок павольней, шырэйшы, грабелькі на плячо лёгкім вёселкам. Вяслуе ад раніцы да вечара, свежыя пракосы бягуць рачнымі хвалямі. А то такая гушча, як вір, трава, касі, дзе хочаш – лясы! Толькі мільгане раптам рабы лубін у далёкіх кустах, выдасца, бы мужчынская кашуля ў шклянкі, можа, хто гарадскі брындае? Спыніцца на хвіліну, торгнецца, бы на асцюк колкі ўступіла. Блісь вачыма ўбакі – а ці блізка свой мужык? Ведама, кусты.

Агата гразкі хвартух з сябе – далоў, набок. Сенакос! Першай выйдзе з хаты, за ёй – дачка Тася выскачыла, пэўна, нядаўна прачнулася, пачуўшы, як ужо за маткай ляпнулі дзверы. Выйшла і адразу не можа патрапіць на матчыну сцежку, туды, сюды па двары, як у поцемках, заспаная, бы з калыскі, стала шырока, зірк-зірк вачыма – ага-а-а, сена ж сённяка! І – за граблі. За ёй на ганак – унучка Валечка. Абедзве наязджаюць з Мінска, калі ў бацькоў пільніца. Унучка падобна на бабу. Бораецца ўвесь час у яе на твары тое падабенства, гоняць бабіны бровы цёмным скрыллем прэч прыдбанае набаку, ад бацькавай радні. А вочы схаваюцца і зноў блішчаць, гуляюць з вамі ў вясёлыя схованкі.

– Граблі браць? – пытаецца яна. – Га?

Таксама ногі адразу шырока паставіла, на ўвесь пракос каб.

– Вілы бяры, хмарыцца, можа, мама загадае ў капешкі складваць!

Вісяць нажуткі на цвіках, на хаце, пад рукой, каб хоп – і пайшоў скоранька.

– Рэзгіны вазьміце! – крычыць Агата здалёк.

Зморацца. Агата пакоціцца першай на сене, сцішыцца, тварам да неба. Во, калі толькі адвалілася баба, як на ложку,

і сяніна ў руцэ каля вуснаў, па-дзявоцку. Свята! Загаворыць да дачкі пра што-небудзь, пра тое, што доўга мелася сказаць. Пра што нікому не здагадацца, пра Лешчыкаў, вядома.

Зайдзішся да яе ў хату, так нехаця адварочваецца на дзверы, хоць ты яе за плечы бяры, паварочвай. Стане, глядзіць табе ў ногі – прывыкае да чужога. Напроці ў печы паліцца, агонь – бліскавіцай на цёмнай кухні. Маўчыць, абірае ваўчкі з падала хвартуха. Пад нагамі склізка, выдаецца, што маснічыны плывуць, душна, аж па сценах цячэ, гразь тонкая, чорная, бы яе ластаўкі ў дзюбах нанасілі Агаце на гняздо. Пах чалавечага стойла. Ні табе дзе сесці. Выедзена дрэва на лавах, выкачана. Бярвенне на столі цёмнае, цяжкое, на грудзях ляжыць. Загавэльвай рукой праз акно і выцягвай, выбірай усё вон, як з пераспелага гарбуза, – склізкае жытло. Ведама, болей тутака гатуецца скаціне, чым сабе. Век рукі ў першай вадзе не памые: то з бульбы, калі адцэдзіць, то калі даёнку спаласне. Злівае ў церніцу. Павернецца – рукі памочыць. За кацёл улепіцца – і зноў да вады. Цальны дзень мачае, атрасаючы на падлогу, бы якая варажба на вадзе, замова. Яе свянцоная чаша... Шух! праз дзверы памыі на бульбоўнік – і пазнатку няма. Як пасля балю, носяць на панадворак са стала посуд з хаты й носяць – вялікая сям'я летам, дочкі, зяці, кожны з малымі дзецьмі.

Толькі хто б адкуль ні прыехаў (і сястра гарадская наведваецца), і жывуць доўга, а ўсё неяк па-ейнаму, па-агацінаму выходзіць, і нічога не перарабляецца. Ідзе ад ракі, ногі мыла, ідзе па траве, сушыць, нечым цёмным на ганку выцерла, абулася – дзюб! анучу на калок. І там рызінка, і там ветрае шкуток, бы касцы на траве разуліся, раскруцілі анучы, зайшліся да Рыгора павітацца. Яшчэ стаіць тонкі звон па кустах, менцяць казельчыкі ў траве іхнія косы. Валюх-валюх катлы на панадворку, цяжкія, ненажэрлыя, стоўпіліся перад ганкам, блішчаць чорным аксамітам сытыя бакі. Замочана ў балеі адзежа на сонцы, а там, на сенажаці сохне памытае проста на траве, можа, і чысцейшае і бялейшае, калі на траве. Ружавеюць па бураках, па цыбулі, па агурках вянкі паўружыкаў. Пад вокнамі чыстай палавіны цвіце невыводная чырвоная ружачка, бы на куст ускінута, сушыцца Агаціна святочная хустка-кашміроўка. Жоўтымі вузкімі ручаямі разліліся на двары ейныя сцежкі, усе па іх ходзяць, сваіх не маючы, бо за адно лета не

вытапчаш. Здалёк відацца, што тут старая гаспадыня правіць. Усё тут па-даўнейшаму. Доўга цепліцца печ.

Ніхто з маладых не здужае выпратаць хату. Як квактуха, топчацца Агата на адным месцы, пераступае з нагі на нагу, ну, можа, толькі, во, прыедуць — вокны паадчыняюць. Ветраюць фіранкі, а выдаецца, што гэта яна б'е, лопае скрыллем па вокнах, не даецца нікому.

Цяжка да яе заходзіцца, як праз галаву перакідвае кожнае слова. Хата мая побач, гады разам зжываюцца, а яна і аднаго кроку насустрач не зрабіла. І да сябе не пускае, маўляў, ты гарадская, нашай жызні не панімаеш.

Са Стасяй, як на тое, і ў грыбы, і ў ягады, і ў кмен — Стася дружбістая.

Ёй чалавек не замінае, а то і весялей пасля гарадской звычкі ўсюды табуном хадзіць. Ідзем з кмену, снапы на плячах. Падол мокры да паясніцы, выбрыдалі ранішні луг, бы па днішчу ішлі. З вады выйшлі й няма розніцы, нават не ўздрыгнеш — цёплы дзень, парыць — што вада, што паветра, у адным кацялку гатуецца. Уходае Стася каго хочаш. Ідзеш па вёсцы, вяслуеш рукамі, целам, бы ўсё расхінаючы й расхінаючы высокую плынь травы, павалішся на каменны ганак, сцягваеш боты — вось ён, нарэшце, бераг! Доўга сядзіш, выцягнуўшы ногі, баючыся скінуць з плячэй, як абдымак, салодкі спакой. Валкам нешта коціцца па табе, бы ветрык на траве.

Ну, зрабіў работу, ну, добра, можна і пасядзець. А Стася ўжо далёка. Сцякае сонца па дрэўку грабель на шыю. Ідзе насустрач Аляксей, ён ужо «падрабляецца» у другой гаспадыні. Галава высока, ледзь-ледзь сам сабе ўсміхаецца, чорны твар ад работы. Ідзе лёгка, ідзе наперадзе вясковых мужчын, яго быццам выносіць наперад, як самага лёгкага на нагу, самага моцнага — так бывае ў доўгай хадзе, у доўгай дарозе сярод равеснікаў: заўсёды ёсць нехта ды маладзейшы. Мужчыны йшлі за возам, пільнаваліся, каб бервяно не зачапіла хвастом плот ці слуп.

Стася — блісь! — і ўжо з унукам па грыбах.

— Чаму ж твая краля не прыйшла ў лес? — пытаецца, сустрэўшы суседа Ўладзюка.

— Зараз будзе! — адказвае.

— Уладзюк! — крычыць, шукае яго жонка Манька.

– Ён недзе тут, у той бок пасунуўся! – размінаецца з ёй Стася.

– А-а-а! Ты ўжо і тутака?! За табой нічога не суберыш! Усюды ты даляціш! А-а-а! Нідзе за табой і ў лесе першым не будзеш! Першую маліну агледзіш! Струк! Траву! От – сквапная! у бульбе калгаснай сядзіш і цябе ніколі не зловяць! От – хітрая! А я на адным разе папалася! Ці нажарэшся калі? Няўжо цябе не парвець?!

Цётка Манька ішла ў той бок, куды паказала Стася, крык адносіла назад, здавалася, яна яшчэ тут, блізка, данесла сваю злосць аж во куды, во дзе развязаўся матуз. Манька малаціла ў вёсцы ўсё спарадку. Ідзе звычайна па вуліцы, галавой круціць, як пілінгатар усё роўна: што там у каго нарабілася, каб усчапіць на вілы? «Я ўжо нічога не ўмею рабіць, зжылася...» – паківае на сябе галавой, выбачаючы, і адпэйтае кожнага, хто тут, у вёсцы, яшчэ кратаецца. Сядзяць за ёй зломкамі на лаўцы каля хаты й дачка з унучкамі. Не тое, што ў Стасі.

Што яны ўсе ў вёсцы да яе маюць?

Во, і сёння раніцай, выганяючы кароў, перакінулася Стася словам з суседкай, пахвалілася, што паркалю купіла ў краме, а тая, смеючыся, – неяк бокам: «За табой нічога не купіш, нічога і не ўкрадзеш... Казалі бабы: прывезлі тавар, а ты ўжо стаіш, пільнуеш... Праўда ці не?» Адлучылася і пайшла, распінаючыся за кароўскім крупам, нага ў нагу з ёй, каб тая не саступіла ў чужы агарод ці двор.

Дзіва брала, што Стася ні на кога не крыўдзілася. Абатрэ пот і пайшла. Засмяецца кароткім смехам, натурыста сцісне вусны, бы яе за руку лапнулі, калі яна сваё ў сваёй, як кажуць, каморы дабро брала – не злодзей! Абмывалі Стасю, блоцілі такога працавітага чалавека. За што?

– Хадзі сюды! – падзывае мяне да сябе дзядзька Рыгор. – Да мяне ж ніхто не заходзіцца...

– А Лешчык і сёння, бачыла, быў.

Махнуў рукой, каб і не ўспамінала. Той прыйдзе наведаць, дык толькі ту ды гу, ту ды гу – Рыгор на яго, як на ваўка. «Ну што? Усё пчол сваіх калавурыш? Вунь, глядзі, ужо адна некуды падалася, ляці даганяй!» Усё з падкусам да яго, з падкусам.

– От, у нас суседзі благія...

— Кожнага на добрае можна павярнуць, не трэба толькі самому благому патураць, — не саступаю.

— А-а-а-а. Адкрыты чалавек адкрыта благое зробіць, а ваш добры — спадцішка!

— А чыста добрых хіба няма!

— Няма! Каб ён каторы добры з'еў тое, што думае, дык бы здох!

Агата сядзіць на панадворку, перабірае чарніцы. Адвярнулася спіной да сонца, прыпякае, грэецца, дай, кажа да Бога, аддыхну трохі. Знойдзе парушынку, пырх-пырх рукой — і выкінула на ветрык. Слабкую ягадзіну ў рот кіне, чорна ўваччу, чорныя думкі збіраюцца, хоць вядром, хоць кашом цягай пад Лешчыкаву хату. «А ў іх ужо трусоў паўсотні, а то і болей... а яна кур заводных прывезла аднекуль, яйкі малыя нясуць... цьфу!.. Агарод ейны расце, аж зямлю дзярэ... А ім сена ўжо прывезлі хлопцы на трактары, — маюць чым пачаставаць, — пэўна, і калгаснага скінулі — дварышча ўсё затоплена. А нам дык і каня не напаткаць...» Рыгор сядзеў, аберуч учапіўшыся, на лаўцы, ківаецца. «Во табе, во табе!» — торкала яму ў думках фігі, і ад сябе, і ад калгаса. Не будзеш мець чаго даць механізатарам і застанешся без сена, згноіш у лесе! Шчыра злавалася, зайздросна, тонкім голасам, да плачу шкадуючы сябе — калі ўжо такая нячэсная жызня пайшла, дык каб жа не застацца ад яе, таксама трэба хітраваць, падманваць. Усе цягнуць, а ты сядзі?!. Чакай ад калгаса павагі, не патрэбен ты цяперака анікому! Спажылі чалавека, адно шалупінне засталося! Печ трэба было б падправіць — цэглы няма, кожан дзень свежы дым у хаце... Цымбравіны ў сельсавеце былі дакленраваўшы, студня абсунулася — а цяпер, кажуць, няма цэменту. Усё, пэўна, пайшло на гэтую перастройку...

Раптам быццам паселі вакол вялікія птушкі й лушчаць сланечнік — лусь-лусь па шыбах, па страсе шалупіннем, і скрыллем лопаюць, адна адну адганяючы. Падняла галаву — гарыць! Склеп ейны гарэў. Агонь на сонцы слаба быў і відаць, і дыму не чуваць, полымя ў гарачым паветры плямінай апаўзала, цякло, як па шкле.

Бразгалі вёдры, аблівалі страху, каб не загарэўся шыфер, і пажарная прыехала. Агонь перакінуўся ўжо і на Лешчыкаў склеп, загарэлася салома — рады не дасі.

– Хадзі пасядзі, – дзіка азіраючыся, нічога не разумеючы ад спужання, клікаў да сябе дзядзька Рыгор то таго, то другога чалавека, што беглі каля яго да студні. Казаў, пэўна, яму самому найпільнейшае: хворы, амаль нерухомы, а людзям век то пільніца, то рупніца, то пажар, усё некалі й некалі да яго зайсціся. Тыя і цяпер памінаюць, што гэта ён думаў, седзючы, можна сказаць, каля агню?!. Агата, тая была ў хаце, абціскаючы перапужаных унукаў, і ў вокны не глядзела – схапіла сэрца. Злодзей прыйдзе, то хоць вуглы пакіне, а агонь усё забярэ... Ведала яна, што нешта будзе благое. Толькі што? Сястра снілася родная... Блізка гэтак да яе падышла, выдаецца, а потым круць – і пабегла на могілкі, у сасоннік. «Пачакай, я ж цябе тамака не знайду, густы сасоннік!..» І прачнулася. Вось яно і ёсць амярцвенне. Вёска ўжо ведала прычыну пажару – унук запаліў, – гуляў, падпаліў кудзелю.

Абтушылі неяк, людзі разышліся, а поўная хата свары, як дыму. Раніцай Агата ўстала: «Дачушка, – кажа старэйшай, – каб нікому папроку не было за тое, што ў нас адбылося, ні ўнуку, ні ягоным бацькам. На ўсіх трэба падзяліць... Калі што якое, паміж сабой перагаварыцеся, але каб я не чула... За сябе баюся... слабка мне робіцца...» Скажа, як са сланечніка вылушчыць – поўнае зярнятка, усе наядуцца, будуць сыты. Возьме жменю гарбузікаў, сядзіць, лушчыць – і палягчэе. Гарбузы не садзіла б, на сенажатку паўзуць, касіць цяжка, але ж увосень вечары даўгія, і бядуецца з імі весялей.

На чорнай жардзіне вісеў абгарэлы стары кажух, высока, як не на неба ўскінуты, звалілася настольніца са старога стала, расцягалі за нагамі кудзелю, цыгарэтай віўся тонкі дымок. А Лешчыкі назаўтра ўсё расчысцілі, адзін пах ад бяды застаўся. Такі самы склеп стаяў, які й быў да пажару, на тым самым месцы, толькі, можа, во, венікам яго, старога, абвіхнула Стася, апратала вуглы.

Чаму ў іх усё ёсць і збытку не відаць? Хай сабе і склеп. Такое яно яшчэ балючае месца, такое яшчэ гарачае, а яны на яго плясь! – і гатова! І не адбедавалі як след, і не аббыліся хоць трохі. Як гэта?! Яны з Рыгорам б'юцца ўсю жызню, ніяк не могуць разжыцца, а Лешчыкі за адзін год усё маюць! І шалёўка вунь аж блішчыць, і карову задумалі трымаць. Не-е-е, тутака нешта ёсць! Хітрыя яны, Лешчыкі! Абышла сястрыца, абманам

усё тут! А сам Лешчык, дык, глянь, стаіць, граблі толькі круць-круць у руцэ, кашуля, халера, галубовая!

– Я сорак пяць гадоў жыву тут, у вёсцы, і меней маю! – крычала на ўсю вёску і цётка Манька, седзючы на лаўцы ля вуліцы, выцягнуўшы перад сабой хворыя ногі, злосць яе, як раўгеня, перабродзіць – і гатова, спажывай, не пашкодзіць.

– Ідзе Сташка з козамі, гляджу – ейнай сівой няма, – пераймае яна кожнага, пачынае каторы раз спарадку. – А дзе ж, пытаюся, сівая? Што, яна мне хіба адказала? Звярнула рот набок: у хлеве, кажа, стаіць! А я ж ведала, што прадала... От мне не панаравілася! Ая-я-яй! От благая, ані на дух!

Сварылася, як матка на дачку. А равесніцы ж! Што ж, можа, хацелася Маньцы зачапіць Стасю, загаварыць, як гэта было даўней, калі Стася жыла ў горадзе. Вымкнулася неспадзявана тое колісьняе. Век бачыла яе: бы пані, ідзе звычайна ад аўтобуса, завіўка ветрае харошая, сукенка чыстая, хочаш не хочаш, а першай павітаешся. Жыве ж, падумаецца, чалавек, ну і добра, наш чалавек і таксама выбіўся ў людзі – хай усе ведаюць. Бокам заносіла гонарам і на яе самую, калгасную даярку... Ая-я-яй! Яна ж, Манька, так тутака цяжка жыла, жылячыся, зблоцілася за работай – і павагі няма?!. На чыім ты, прыехаўшы, разжываешся? А ці гаспадыня тутака? А ці ты калгасніца? Ці ты зарабіла? Што б ты тады, з майго трудадня мела? Чым бы грэбла да сябе, каб твае рукі, ногі ад работы апруцянелі! Выгулялася тамака! А мы ж цябе ў горад па розум адпраўлялі, а ты – якая была, такая і ёсцека! І гаворку гаварыць не навучылася! «У хле-е-ве стаіць», каб цябе... Гэткая ты, праз-гэткая!

Я затрымалася каля цёткі Манькі даўжэй, чым патрабавалі гэтага мае шчырыя, амаль сяброўскія адносіны да Стасі.

– Ну, Стася, ты б трохі далікатней, ты ж добрая, харошая, нашто табе вёску цкаваць? – прасіла я потым, здагадваючыся, чым яна замінала бабам. – І Рыгор... выбачай ты яму, змоўчы, няма з кім сварыцца, ледзь чалавек хліпае...

– Вой, хворы! Да старасці дакалышацца! А хай хоць на тым свеце будзе знаць, што няможна сястры роднай на благое думаць! Гультаі, зайздроснікі! Агата ўсё сцеражэцца. Гэта яна цяпер трохі абламалася! А то ж сядзе з курамі, пасядзіць, то стане, стаіць абапіраючыся на венік, нечага разглядаецца,

то цянёк знойдзе, сядзе, ногі выцягнуўшы, фасолю лушчыць. Век бокам да работы! – порскала Стася, абы скарэй агрызнуцца; круць перад сабой граблі – і паляцела, ходка лятучая, напрасткі, толькі платы ўбакі лажацца.

Мне дык і Рыгор з Агатай, і тая Манька, злосніца Стасіна, сядзелі недзе незадалёка ад самога Бога, таксама, можна сказаць, стварыўшы й зямлю і ваду. Толькі што адзежа ў іх другая, не белая. Агата то ў сукенцы, чатырохклінка ці шасціклінка, усё ў талію, з паскам каб. Плюшаўка ў яе амаль новая, не знасіла ад той маладой пары, мала давялося святкаваць, а гэта ж адзежа святочная. Ці на ёй паліто вішнёвае, па-дзявоцку ў талію, кароткае, лытка таўстая з-пад яго відаецца, на крыжы напята, бы баба не іначай, як цяжарная. У нечым чыстым сядзіць, яшчэ не абношаным, нягнуткія рукавы, як заверчаная ў адзежыну. Манька дык крыху і модзіцца, у яе ўжо рукаў у сукенцы адразаны, якраз, каб локця не было відаць. Рыгору нядаўна купілі двое штаноў. «Абое малыя!» – не то жаліцца, не то цешыцца дзядзька, маўляў, калі патаўсцеў, то, пэўна, і паздаравее. Сядзяць старыя на пагорку, усё жыццё быццам радоўку адбываюць, кароў пасучы, людзей пільнуючы, парадкі, адзін аднаго. Рабыя каровы хмарамі распаўзаюцца па лузе. Сядзяць старыя, хворыя, не дапускаюць Стасю да сваіх здабыткаў. Пільнуюцца, дзе яна косіць, што нясе, куды ідзе. Перагаворацъ кожнае ейнае слова, маўляў, чыё яна тутака спаганяе, свайго не зарабіўшы? Бацькава? То трэба было не ехаць у прочкі! І самі яны, вядома, не гідзіліся зайсціся ў калгасную свежую бульбу ці струкі, але ж гэта, лічылі, іхняе поле, іхняя і шкода... Не, каб пацешыцца, што работнік, нарэшце, прыйшоў на зямлю... Працавіты, увішны, здаровы, не дасць ёй зарасці дзірваном.

Але, як я дазналася пазней, была яшчэ адна прычына, даўно яны яе чулі, і не слыхам, вядома.

Дождж пачаўся з начы. Раптам так круга сцішылася, быццам нехта, захінуўшыся ад ветру, настроіўся запаліць сярніка. Бліснула маланка. Ліло і дзень, і два, і тры. Пахінуліся да зямлі глечыкі напярсцянкі, крутабярозкі, званочкаў, паўружыкаў. Увесь посуд, здавалася, які быў, перакуліўся, адусюль ліло, дрыжэлі ў хаце шыбы, паліцы. Ужо можна, нарэшце, во гэтак стаяць на ганку, як перачакаць, і стаяць сабе. Агата выйшла, узяўшыся рукой за драбіну, надоўга абаперлася, марудзіць

вяртацца ў хату. «Макрыядзі наробіць, усё ён без меры», – гавораць з дачкой. Унучка з цёмнага праёму дзвярэй ловіць цурубалкі са страхі, збярэ жменю, – страсе, зноў збірае шкляныя вясковыя пацеркі. Унук падышоў з конаўкай, назбіраў дажджу, выпіў. Высокі дэльфініум прагнаў у паветры цэлую прошву буйным сінім шклярусам, якраз каторай хоць на рукаво, хоць на падол. Камар над вухам цягнуў тую самую ноту, што і на двары.

Потым дождж пайшоў пераходамі, плісне з сіняга глечыка – і ходу, толькі каб яшчэ рушніка хто падаў абцерціся, – завысока вісіць у сем нітоў рог вясёлкі. Вунь там, дзе елкі, нехта падымае тонкую газавую фіранку, падымае вышэй, вышэй, ужо адна елка добра відацца, ужо другая, і птушкі заспявалі. А ў тым канцы накідвае на елчыны вочы тую самую газоўку, пакуль не прымусіць іх спыніцца, пастаяць ціха, паслушна, дачакацца дажджу. Узляцеў з-пад ног матыль, пляма на скрыллях дваіцца ўваччу, як пад кропляй дажджу, вось-вось саслізне каляровай пацеркай. Неба сіняе, цёмнае, едка цёмна-зялёнае, і чорна-белы бусел ляціць, вяртаецца ў сваё гняздо – густы вясковы малюнак, якраз жа Агаціна посцілка-набіванка каля ложка.

Стася, як толькі крыху парадзее, нябеснае дно пакажацца, ужо бульбу панесла на каромысле са склепа. Быццам увесь час у сенцах стаіць, перажыдаючы, каб хаця хутчэй пільную работу парабіць. Скочыла ў хлевушок, выпіхнула парасят, каб подсцілку ім памяняць. Аніяк назад свінку не загоніць. Хвастала дзеля прыліку дубцом, а потым ухапілася за добры кій.

– А каб ты апраглася! А каб ты сасмагла! А каб цябе паляруш! А каб ты галавой налажыла! А каб ты астатні дзень, халера на цябе! – гаварыла ціха, клялася, і сама, здавалася, разбітая тым палярушам, клалася разам.

Ці пры сваёй яна памяці гэтак казаць? Яшчэ зусім нядаўна, бачачы, як хутка прыбывае, расце Лешчыкава гаспадарка (каза прывяла, карова ацялілася, рознае птаства), як захлынаецца Стася работай, я стала раіць ёй патрохі збываць сёетое, каб, часам, не падарвацца. Стася выслухала, блізка села, нахінулася, каб нашую гаворку не падслухаў злы дух, сказала:

– Няволле гэтак гаварыць, што трэба скаціну збываць, бо весціся перастане... Ужо як яно ёсць, хай так і будзе. Да

кароўськай смерці не разыдземся... Дзеці тут... прыедуць з горада, адной нашай бабе ўсё казалі, казалі, каб трохі паменшыла гаспадарку – і карова, на табе, захварэла... На стол сабе маю, і дзецям у кішэнь дам... Кіну, калі ўжо не буду магчы...

– Стася, твой Лешчык жаліцца, што цяжка робіць...

– А мужыку воля шкодзіць, няхай лепей будзе заняты...

Парася чула блізка карані, кідалася пад ногі гаспадыні ўзяць зямлю на лычык, пакрыўджана вісчэла, атрымаўшы па баку. Безабаронна станавілася на каленькі, каб схаваць вушы пад нізкую прыступку. Нарэшце неяк жа скіравалася, пайшло ў хлевушок.

Такое ж яно ўшанаванае, дагледжанае, жывое... Клясці скаціну?..

Няўжо адлучылі Стасю тыя, што на пагорку: Агата, Манька, Рыгор, тыя, што незадалёка ад Бога, адлучылі ад сваёй «паствы»? Сама ж Агата, памятаю: вырвалі дзеўкі гарбуза, той яшчэ быў з цветам на макаўцы, зялёны, – і пасварыліся. «Я не магу есці, каб яно яшчэ з вачыма было – не паравое!..» – злавалася Агата, ёй усіх шкада, усё ёй жывое. Няўжо-такі адлучылі?

Тузаецца Стася адна ад усіх на ўсю вёску, правіць гаспадарку, і гэта ў такі час, калі ў маладых і здаровых на вёсцы рукі абабітыя, мала ахвоты калупацца ў зямлі. А Стасі ўсюды жывы прыбытак, пад нагамі, трэба толькі не ленавацца, нахінуцца, каб падняць. На заводзе жыла ад зарплаты да зарплаты, а тут, у вёсцы, на кожным кроку рубель. Шчыра закідвала на плечы цяжкую посцілку з ахрап'ем і паддаць нікога не прасіла. З раніцы да вечара, з раніцы да вечара. Вымые ўжо ў поцемках ногі, уключыць тэлевізар, выспіцца да ночы, на адну хвіліну вочы спусціўшы. Ноч кароткая, як царкоўны венчык з малітвай, на лоб толькі палажыць – і ўжо ўставаць пара. Не паспееш і на другі бок перавярнуцца. З раніцы да вечара з мокрым каркам, сцёрлася з твару хусткай з галавы ўсё гарадское, даўно раскруцілася завіўка, толькі, можа, во, перад вачыма – аніяк ужо не саступіш убок, не аслабанішся – бо ідзе ейны завадскі канвеер, праз агарод, праз хлеў, праз поле, праз лес, – торгаецца нерв, не адпускае, як хвароба. Вернецца з горада (калі-нікалі наведвае сваю кватэру), толькі яна прыехала, толькі сумкі занесла, а ўжо на ганку, у благой сукенцы, ужо ў садзе, ідзе наўгад, кругамі, усё шырэй забірае, шырэй, прыглядаецца да

работы. Лешчык ззаду, а потым – напрасткі да яе, наперарэз: што скажа жонка рабіць?

Дождж штодня. Налушчыў жвіру на сцежках – босай нагой не ступіш. Увечары падымаюцца ад зямлі густыя туманы. Ідуць па вуліцы клубамі, быццам каровы пыл паднялі, нічога за ім не відаецца. Дагоніць – пачуеш блізка ў твар чыстае старэчае дыханне зямлі, і не адвернешся, не адхінешся, быццам на тваім плячы – маці пасля доўгага няўцішнага плачу. На золку ад акна цягне халадком, бялёсае святло, нацягвае раніца праз рукі на голыя плечы свежую халаднаватую кашульку – спавівае, як малога. Рыгор радзей выходзіць на вуліцу. Слабей вочы бачаць, свет ягоны меншае, толькі што не на выцягнутую руку, белы, хвароба, абжаргаўшы, сядзіць ужо на карку. І пчолы злыя, бо няма работы дажджом – баіцца, каб не аступілі. Сядзіць у сенцах. Тутака пахне вымытымі яшчэ сырымі лавамі, чадзіць галавешка з печы ў памыях, сінім пацягнута – свенцяцца сені, ціха, прыцемкі, тлее на падлозе першы чырвоны ліст. Адымае Рыгору іншы раз і мову. Але што яно вакол да нас гаворыць мовай? А зразумець жа можна і траву, і дрэва, і скаціну і без гаворкі. Нахіліцца да яго Агата, ціха скажа што-небудзь, каб не парушыць ягоную цішыню, бы на магільніку. Ужо што яна наважыць, тое і будзе, адзіная ейная ў хаце папраўка, і дзвярыма мужык не ляпне, не тое што. Каб гэтая воля ды ў маладосці, у свекрыві! Разводдзем, нідзе зямлі не відацца, сышла была з дзіцем з хаты, падалася дамоў, да маткі. Дзе ты тут вытрываеш? Мыюць, грабуць, мятуць, скрабуць, палошчуцца, а хіба ад зямлі адцураешся? То схаваецца ад усіх, дзень, два няма, бацькоў ейных паклічуць шукаць. «Дачушка, акажыся, – заве бацька. – Тутака толькі жыць!» – «Вам парабак патрэбен, каб усю работу парабіць...» – скажа свякроўцы ў вочы. І цяпер спіць на капе, паўгода не перасцілаючы.

– І дзе ты адзежы гэтай набіраеш? Мые і мые! Увесь свет боскі завесіла бялізнай, кожан дзень на драціне поўна рыззя! А сёння ж Пятро! – не асцерагаючыся, крычыць Агата на Стасю.

– Чаму ж ты мне ўчора не сказала, калі ведала?

– Пара ўжо самой знаць усе святы й прысвяткі! Цябе ж і на Ўшэсце, казалі, бабы з буракоў прагналі былі. Што гэта, скажы, робіцца?!.

І праўда, і ў хаце ж мужык Пятро (усё Лешчык ды Лешчык!), і ён не ведаў, паласкацца памог на рацэ.

— На Пятра ж заўсягды дождж, хіба не ў памяці табе? І што гэта ты круцішся, круцішся, няма табе перадыху? Да вады, глядзі, дастанеш! — смяялася Агата.

— А як ты век час маеш? А паглядзі — работа стаіць! Усё знішчыш, стопчаш пад сябе! Ці ж бы я да гэтай пары была моркву не прарваўшы! Ці ж бы так папусцілася, каб за лебядой бульбоўніка не было відацца? Ці ж бы я пер'е выкінула на шуметнік, курыцу засекшы? Каб вы з Манькай ведалі, што ўжо дзевяць падушак маю, дык палопаліся б са злосці! Усю зімку скубла, смагла, а вы семкі грызлі! Гультай ты несусветны! Усё жалішся: ой, не магу, ой, не магу. А я магу? Ці я ад шчырасці, ці з патрэбы раблю, ці з хваробы — нікому не кажу. У грудзях гарыць, на цябе гледзячы!

— І ты надта не перарабілася, калі сілы мела ў агрэсце з Аляксеем качацца, за шалёўку адбываючы!

Жах у вочы! Стася як стаяла так і стаяла. І крыжыкам не налажылася, маўляў, нічогачкі паміж імі не было! І не бажылася, толькі засмяялася далёкім глухім смехам, каб дакаціцца да той пары (а ўсяго ж прайшло месяцы са тры — лета!), калі падабаўся Аляксей. Ёй горача зрабілася ад бабскага навету, нешта маладое штурханула ў грудзі, ногі палягчэлі. А адыходзіцца ад Агаты не хацелася — хай бы ж яшчэ што сказала.

Агата сцішылася, адышлася. Пабрахалі й досыць... Восьвось пшаніца перастоіць, што каля хаты, у агародзе, і летась пад касу пусцілі. Шкода, добрая пшаніца, харошая, густая, хоць ты нажом рэж. Калі дождж зноў пойдзе, яна ж, скошаная, у траве прарасце. Трэба было б сярпом зняць. Але сыходзіць пара, Бог не дае паратунку. Хай будзе па-ягонаму, не парвешся ж, яшчэ ж сена неспарадкаванае. Павярнулася круга, пайшла святкаваць, да Бога. Усё тутака навокал ягонае, што дасць, тое і добра — на ўсё боская воля. Ага, юргіня ўжо расцвітае, каторая ж гэта будзе: юлёвая, жоўтая, чырвоная? Ледзь-ледзь абазначыўся, нараджаўся самы ўлюбёны, самы невыводны то на сукенцы, то на блузцы, то на хустцы, то ў гародчыку, — малінковы колер. Стаіць і любуе.

Цёпла, сонца ўжо не струменіцца, залаты, гарачы ягоны пылок церушыцца, сыплецца скрозь дрэвы, скрозь пальцы,

тут ёсць, тут не, нехта цярэбіць сонца — вялікі спелы сланечнік. Маладыя буслы навучыліся лётаць. Але яшчэ няма сабе веры. Разверне каторы скрылле, а ляцець — не ляціць. Стаіць, забыўшыся, кратаецца на ветры. Ледзь-ледзь заламанае крыло, свежае белае пер'е падпашкамі — выслана, як у анёла, стаіць, распяўшыся, над Агацінай хатай.

Недалёка ад гнязда ляжала свежаспілаванная арабіна, і яшчэ адна побач. Спілавана высока, нават чалавек і не сагнуўся да камля — як рукой заламаная, у пояс стаіць пень.

— Стася, што там нарабілася, буры ж не было?.. Арабіны ляжаць каля гнязда. Чыя шкода? — пытаюся ў кожнага, хто натрапіцца.

— Я спілавала... бо ягады няможна дастаць, завысока надта. Хачу ў віно дабавіць... Кажуць, смачна з арабінамі.

— Гэта ж не каліва, не зёлка, каб заламаць, у дрэва ж зусім накшы век?!.

Стася апраўдвалася з нейкім адчаем у голасе, быццам нешта даўно боралася ў ёй і вось, неспадзявана для яе самой, перамагло. Стаяла, шырока расставіўшы ногі, выслабаніўшыся ад сумненняў, ад розных перашкод. Прыспусціўшы вочы, сцішана смяялася з мяне, маўляў, хавацца не будзе, вось захацела і спілавала!

Крычу, заву яе, як у благім сне, — няма голасу. А яна ўсё далей і далей, з поўным падалом арабін ходзіць па зямлі ад халоднага боку сонца, чыніць запас на зіму.

«Наш са Стасяй бацька ніколі дрэва з пня не зняў, век у хаце дровы гнілыя былі, сухастой валіў...» — малітвай успомніліся Рыгоравы словы.

Пераступаю парог Агацінай хаты, гразка занесены жыццёвым глеем.

Яна цадзіла малако, гаварыла сама да сябе:

— Каня брыгадзір даў... дзеці прыехалі, пшаніцу ў ток звазілі... камбайнам памалоцяць... мужчыны гной кінулі з хлева, жыжу выбралі, падлілі пад атаву...

Гаварыла надзіва роўным голасам, пералічвала работы, толькі што не на пальцах. Рыгор сядзеў ля стала. Цурчэла малако белым ручаём. Усё ішло як мае быць. Была ўпраўка ў яе гаспадарцы, такая рэдкая госця... Мы ўсе глядзелі, слухалі, як шуміць у даёнцы пена.

І ніхто не пытаўся, чаго, па што-якое зайшоў у хату чужы чалавек...

КАЦІЎСЯ ПЯРСЦЁНАК

Хата цёткі Барбары каля самай ракі, павярнуўшыся да яе якраз тым бокам, дзе печ. Турчаком не сціхае вада. У непагадзь вецер коціць з блізкага лесу шум дрэў па садзе хвалямі, валам. Іншы раз туман падымаецца па сходках на ганак, потым аж пад вокны. Тады хата скранаецца з месца, і не пазнаць, на гэтым беразе яна ці на тым. Старая жанчына ходзіць па хаце, як па пароме, круціцца галава – падняўся ціск.

Цётка Барбара не любіла благіх вестак, звадак. Зноў цукар падаражаў, мука, крупы, хоць ты на вуліцу да баб не выходзь. Калі выпадала чарга каровы пасвіць, пільнавалася, каб першай у вёску вярталася ўвечары ейная сівая, варожачы на заўтрашні светлы дзень. Ідзе тая, бакі калышуцца, клубы блішчаць, аж галубовым заносіць. І белая галава, бы ўвесь час пад самым ліхтаром вялікага летняга поўдня. За ёй лясныя птушкі лятуць, садзяцца на высокія рогі, пераплываючы, як на чаўне, з лесу ў вёску – доўгі шлях прыручэння да чалавека. Раніцай Барбара зноў пачуе незнаёмы голас у сваім старым садзе. Будзе дзівіцца таму, які вакол яе бясконцы свет. І гэтай навіны хопіць у ейнай хаце. Надта не залюбіла апошнім часам такой работы: пасядуць дзеці, прыехаўшы з горада, глядзяць тэлевізар, а там – зноў вайна, Чачня. Нашто глядзяць, злуецца, ці каб галава потым балела? Ёй спакайней, калі пра благое не чуе, ціск не падымаецца.

– Мама, вось пачнецца ў нас тая самая вайна, дык мы, пакуль Шырчыха не скажа, і ведаць не будзем, – смяюцца з яе.

На Вербніцу не знайшла каляровай паперы, каб прыбраць вярбу, тады зрабіла кветкі з таго, што мелася. Пялёсткі – з абгорткі ад цукерак, з старой цюлевай фіранкі, з каснічка, з сіняга пер'я вутачча. Як не ўсю хату пасвенціла ў царкве, гэтак удалося, абараніла ад усяго благога ейныя куты. Не трудзіце яе, не чапайце, не рушце. Яшчэ яна гора сваё не зжыла, году няма,

як мужа Петрыка пахавала. Яшчэ ён прыходзіць унаначкі, сніцца. І днём, выдаецца, увесь час недзе побач. Прыляжа яна: «Ты спіш?» — пытаецца. Сядзе: «Што ты робіш?» — зноў ягоны голас. Ён ёй і прадказвае, папярэджвае, каб не пужалася, калі што благое натрапіцца. Сніць нядаўна: ходзіць Петрык па аўсе, у чорным капелюшы. А авёс жа, здагадалася раніцай, — слёзы. Скора на тым разе і спраўдзілася.

Ад гэтай навіны ёй ужо не ўдалося схавацца: сын жэніцца, бярэ сабе бабу з горада, развядзёнку, з двума дзецьмі! Выйшла з хаты, якраз жа сусед помнік прывёз па мужу. Не, ставіць яна яго цяпер не будзе, схавае да часу ў паветцы, пакуль сама не памрэ. Ёй асобны не патрэбен, каб на галаву не ціснуў, пасярэдзіне паміж імі гэты няхай дзеці паставяць, ёй толькі, калі спатрэбіцца, крыж лоўкі. Хутка ейная чарга, маўляў. Паклікала сына да сябе: «Паўла!» Той з суседам размаўляў, хацела лепей распытацца пра навіну. А голас збочыў, ніхто яе не пачуў, і яна адвярнула твар ад людзей, зайшоўшыся ад плачу, ідзе, не разбіраючы дарогі.

Ці плакаў бы, ужаліўшыся, так шчыра чалавек сам-насам, каб не адчуваў у адчайную хвіліну побач з сабой Бога?

Колькі жыла, цуралася чужых людзей, няўжо гэтым ухваліла Багародзіцу? Калі й пазычала каму што-небудзь, дык наўздагон трэба было аддаць, усе ведалі. Ад смерці не адкупілася б, каб хто кубачак малака папрасіў. «Сваім трэба», — адкажа, не прызнаючы суседства. І той пойдзе з двара чужынцам, на момант адчуваючы сябе адлучаным ад чалавечага роду, як ад царквы. Кош бульбы-сямянкі папросіць Шырчыха, але з чым прыйшла ў двор, з тым і пойдзе. Гэта не з-пад каровы, што калі раніцай аддасі, дык увечары надоіш. А як сабе не хопіць пасадзіць? Скора знаходзіла апраўданне, доўга не пакутавала. Ніколі ні ў кога ў вочы не спытала: як чалавек жыве, як здароўе. Лепей не ведаць, а то яшчэ прыйдзецца спагадаць ці пазычаць. Суседзі век па людзях, а ў яе ўсяго свайго хапае, няхай і яны самі ратуюцца. А тут раптоўна адразу двое дзяцей чужых у хату ўкінулася! Сын перастарак, за сорак гадоў мае. Прыедзе з горада на выхадныя, — кім ён там працуе, не можа яна здумаць, — адразу за касу, за матычку — і ў агарод. Не, каб гэта на вечарыну ў клуб ці так — у вёску да дзяўчат; не п'е і не курыць. Сэрца матчына балела. Але і выгаду мела

вялікую — сын ужо ёй і за бацьку, і за мужа, усю мужчынскую работу паробіць. Хай сабе будзе як яно ёсць, раздумлялася.

— Не вытрымаю, пайду скажу: кідай, пляменнічак, матычку, ідзі жызню сваю парадкавай, бабылём застанешся!

Прыляціць у двор сястра Петрыка Клаўдзя, жыве насупраць, пасміхнецца:

— Кажаш, зямлю надта любіць?!. Гэта не любоў! Ён у цябе з маленства ў зямлю глядзіць, ён яе і робіць. Пануры чалавек, паніклівыя вочы, ён нічога іншага не бачыць, толькі тое, што пад нагамі! А ты, матка, яшчэ і патураеш! Гані ты яго з агарода!

Па злосці гаворыць Клаўдзя, пужаецца цётка Барбара, не мае яна ласкі да Петрыкавай сям'і. У сына ў горадзе і кватэра, і дзве вязальныя машыны, і чатыры вярблюджыя коўдры, шмат чаго дэфіцытнага назапасіў яшчэ пры былой уладзе. А дзеўкі, праўда, чамусьці не квапяцца на ягонае багацце. А каб жа яны яго бачылі за плугам! Ім, гарадскім, каб мужчына век на кані...

Не, Клаўдзя па злосці кажа на яго.

І Петрык сястры адтуль, з таго свету, не спрыяе, на маладняк, бачыш, падае ягонае. І цялушку не датрымалі, як меліся, трэба было прырэзаць, і труска акацілася мёртвым, і агуркі — толькі завяжуцца, як нехта іх есць, псуе. Карова маладая захварэла, гуз каля вымя знайшоўся. Яна хадзіла да мужа і на могілкі, прасіла: «Петрык, адпусціся, надта шкода Клаўдзіну кароўку...» Адкінулася яму старая крыўда, як хвароба, а за што пасварыліся брат з сястрой, і не памятаецца. Да году гэтак будзе, а пасля году ўжо сіла ягоная прападзе, усё мінецца.

Хадзіла, людзей баялася, будуць пытацца пра сынаву жаніцьбу, што ім адказваць. Спадзявалася: а можа, яно яшчэ разладзіцца. Сын усё жыццё запасіўся, скупіўся, будуючы свой дом, а атрымалася — паветка. Налятуць, як вераб'і, чужыя дзеці, усё расцягнуць, папсуюць. Ад Шырчыхі толькі не схаваешся. Ідзе тая, яшчэ здалёк глядзіць, прыглядаецца з-за вугла, з-за хлявоў, каб заспець Барбару на двары, убачыць, куды яна паляціць хавацца. Цоп! — убачыла! І цяпер ужо не спускае вачэй, ідзе, спатыкаецца, як на вяроўцы наважаная. Пабыўшы, сунецца аж з таго канца стары Пэндзаль, астатні п'яніца, глядзіць на вокны хаты, як у вочы вясёлай бабе пры дарозе, таксама ўжо ўчуў, спадзяецца на чарку. Толькі зачыніла за імі

дзверы, стукнуў нехта ў шыбіну. Стук не пачуты, бы за плечы нехта павярнуў да акна. Падняла галаву... стаіць ейны Петрык, на нешта, во, выдаўся. Гадзіна якая мінулася — і Клаўдзя прыйшла, быццам сырніцу прасіць. А яна б ужо і забылася на тое, што ён казаў паміраючы, дык жа, як напомніў, во, пад вокнамі варожачы. Казаў: нічога ягонай работы Клаўдзі не давай — ні калёс, ні бараны, ні гэтай сырніцы. Цётка Барбара аж узлавалася. Што ён усё сваё правіць? Увесь час яе пільнуе! Не так ужо яны й маладымі любіліся, каб не разлучацца і пасля смерці! Хіба ёй зараз па сырніцы галава баліць?

І адзін раз прывёз Паўла нявестку з дзецьмі, і другі, а яна ў думках сваіх яе не прымала. Выляціць насустрач, хустка расхрыстана, ногі ў розным абутку, сама ў твары, як з-пад мяльніцы. Як нервы разыдуцца, не можа сабе рады даць, кіне ўсё, пойдзе ў паветку быццам дровы складаць. Сядзе, сціснецца ў камячок, пазірае здалёк бежанкай, не пазнаючы ні хату, ні мясціны. Абы пераседзець як непагадзь, пакуль зноў у горад ад'едуць. Нявестка выйдзе на ганак у пляжным камбінезоне, Барбарыны замужнія дочкі кажуць, што надта дарагі. Белыя шкарпэткі, белыя красоўкі, рукі ззаду ў кішэнях — не памочніца, думае цётка Барбара. А трэба агарод сеяць, самая пара.

— Паглядзі, як спіну трымае, бы ўвесь час у крэсле сядзіць! — перагаворваліся дочкі, разглядаючы сваячку, маўляў, надта «дзелавая» гараджанка, хлопца адхапіла, нежанаціка.

Паўла адмяніўся, зморшчыўся, вочы без зрэнак, як у народжанага дзіцяці, светлыя, нявінныя, ходзіць спавіты сваімі думкамі, нічога не гаворыць ні да кога, рукі аж да долу дастаюць. Бы вялікае вогнішча, лом расклала нявестка сярод двара блізка каля жытла. Уся радня спалохана глядзіць на агонь, засланяючы гарачыя твары. Не, гэта не ён, яна яго ўзяла, на сабе жаніла, думала цётка Барбара. Вазьме семя ў руку, хоча на ветры ўзвеяць — няма ветру. Глуха вакол яе, лясны гушчар абступіў, зацісну́ў, голы, восеньскі, каб табе дзе хто птушкай азваўся. Пойдзе да ракі бульбу-паранку мыць, стаіць у поцемках, уся ў чорным. І гадзіна, і другая мінецца, ужо яе ад чорнай вольхі не адрозніш. Ужо і вада па нагах бяжыць, да сярэдзіны камля падымаецца. А гэта туман халодны выкінуўся, трэба ў хату ісці.

Гляне на нявестчыных дзяцей, ёй выдаецца, што паміж імі чэрці гуляюць. Бо пры жывым бацьку маці замуж ідзе.

Дзяўчынка гадоў шасці, першы раз яе ўбачыла, тая сядзела на траве каля Паўлавых ног. Падняла галаву, пагляд на дзіва сталы, разумны, глядзела карліцай. Дзіця ад нараджэння абцяжарана ці то заганай, ці то нейкім талентам, як гарбом. Неяк уначы цётка Барбара пачула на панадворку клік дзяўчынкі: «Та-та!» Ускочыла, сэрца калацілася – гэта быў ейны голас, ейны адчай, што даўно быццам заглушылі муж, дзеці, унукі. Яна сама вельмі рана пахавала бацьку, якога любіла болей за ўсіх, і маркоцілася па ім усё жыццё. Дзяўчынка адна на ганку, ноч, цёмна. І стрымалася, не падышла, не пазвала да сябе. А была ж такая хвіліна, такая шчырая, такая едная, болей ці ўдасца. Пабаялася дакрануцца, як да птушаняці ў лесе на зямлі, якое вывалілася з гнязда. Ні ўссадзіць на дрэва, ні з сабой забраць, адно спадзяванне, што сама птушка знойдзе, уратуе.

З хлопчыкам, той старэйшы, намнога прасцей. Дзяўчынка ўвесь час верадзіла ейную непрыхілкую душу. Вернецца Паўла з поля ці з пасты, калі радоўку адбывае, ніхто і не вучыць, а дзіця выляціць з хаты, яго ўбачыўшы, на высокі ганак, зловіць, калі ён толькі падыдзе да сходак. Ашчалепіцца каля шыі, павісне. Паўла збянтэжыцца, ледзь рукі ўзложыць на цельца, быццам абдыме, і зноў яны цяжка асунуцца ўздоўж свайго як нежывога цела. Нязвыкла, няма ў іхняй сям'і моды, каб лашчыцца адзін да аднаго. Паўла кожны раз аж усхліпне ад нечаканасці. А можа, ад сірочай расчуленасці. Бо ўсё часцей сам прытуліць дзіця. Возьмуцца за рукі, ідуць. Павольна, як двое дзяцей, без патрэбы, без дарогі, абы ісці, вучачыся хадзіць разам. Моўчкі ідуць, сцішаныя нязвыклай адзін для аднаго блізкасцю. Глядзела ўслед, зайздросціла. Ніколі яе мамай не назваў, пакуль яна на яго свае вочы не падыме, не загаварыць. Калі што якое і пільна трэба – не азавецца. Ніколі, каб і яна, маці, пагладзіла па плечуку, запыталася, як жыве, баялася, што зазлуецца, мужчына ж. А ён, можа, і чакаў...

Не было ніводнай начы, каб не плакала, каб заснуць удалося. Тады толькі вочы спусціла перад раніцай – і Петрык во гэтак перад ёй, як Паўла ці каторая з дачок. «Матка, уставай... Строй есці, кармі сям'ю». І яна зразумела: муж наказваў змірыцца, прыняць у душу ўсё, як яно ёсць.

Лёгка стала, дала, нарэшце, сабе раду. Выйшла на ганак, рукі ўбокі, калі яна яшчэ гэтак стаяла?!. Ну, усё, дзеці ў парадку!

«Божа, твая воля...» – прамовіла, адчуўшы, нарэшце, над сабой уладу, вышэйшую за сваю.

Раз-пораз клікала да сябе дачок, унучак, усе павінны быць пад рукой, нікуды далёка не адыходзіцца – трэба хату да вяселля рыхтаваць! Падцепліла печ, яшчэ не развіднелася, дым з коміна падымаўся высока, ішоў па цёмным небе над вёскай белым Млечным шляхам. Пільнае, штодзённае ўжо адышло ўбок. Паздымалі фіранкі. Удзень вокны напроці саду зелянелі цёмнымі глыбокімі вірамі. Скранулася жыццё, шырокім рэчышчам захапіла ўвесь падворак. Нешта складалася ў мяхі, выносілася да часу на гарышча. Ужо яно тамака і забудзецца, і прападзе. Посцілкі ваду ўбачылі. Сувоямі скручвалася чыстая бялізна. Падкасілі, прыбралі вакол, хата адразу бы на новае месца перасела. Во калі толькі вынесла на сонца з-пад пахаванага мужа пярыну, на адну хвіліну, каб не зжыўся ягоны дух. Увечары, калі запальвалася святло, віднеліся праз вокны пасярод вялікага пакоя, як на ўзгорку, адны сталы і лавы.

– Адбіце, адчыніце чысты ганак! – крычыць, а сама думае: «Праз яго Петрыка выносілі на могілкі, няхай і маладая праз тыя самыя дзверы на вяселлі пераступіць парог, бо гэта ён, ейны муж, загадаў яе прыняць, ягоная воля, што боская.

Ужо цётка Барбара мела што сказаць людзям, калі пыталіся пра Паўлаву жаніцьбу. Маўляў, лепей падабраць чужых дзяцей, чым сваіх кінуць. Нечага былі засварыліся паміж сабой дочкі, нявестка спалохана выйшла з хаты. Цётка Барбара стоцьма кінулася яе ўшчуваць: «Ты ў вялікай сям'і не жыла. А ў вялікай сям'і пасварацца – і тут жа добра гавораць. Гамонка ў нас, вясковых, такая: надта не асцерагайся, многа яе, гаворкі, у нас адно да аднаго, як шуму ў густым лесе».

Узад-уперад на панадворку, цалны дзень. Нясе яна нешта ў маленькіх начовачках, далікатна захінёнае белай марлёўкай, як зыбаўку. Старыя вольхі каля ракі з птушынымі гнёздамі, лазенька, хлявы, хата, яблыні, вецер гойдаў, калыхаў ад плоту да плоту. Над ёй, як на абразах пад самай рамай, пэўна, віліся анёлы. Карункавым капусным лістом скручваўся, спавіваўся ў агародзе маладзенькі качанок. Усё навокал згадвалася, усё ёй варажыла на малое. «А ці будзе тая баба яму ўжо раджаць, маючы сваіх двое?..» – гаварылі на вёсцы, даходзіла і да яе, Шырчыха даносіла. Спынялася, глядзела далёка, ёй

відалася і тое, што на рацэ, там малако адстойваецца ў бляшанцы, стронгі віюцца, студзяць ваду, і тое, што на агародзе, і нават на сотках, за лесам, — і ў снах, і на памяці. Ад ракі ішлі Паўла з дзяўчынкай, узяўшыся за рукі. Штодзень так, абы сустрэліся.

Дзіця быццам вучыла яго хадзіць у пары.

Нявестка чакала іх на ганку, усміхалася. Ледзь чутна даносіліся грымоты далёкай навальніцы. Маланка бліскала па небе, у вачах маладых залатым кольцам.

Каціўся па панадворку пярсцёнак...

Не можа быць, каб маладая разбіла хату на два канцы, паставіўшы пераборку: у адным пяюць, у другім — галосяць. З гэтымі перадумкамі яна і йшла запрашаць на вяселле. Загінала пальцы, лічыла. Як бацюшку пазваць, гэтак найперш Клаўдзю трэба запрасіць, родная ж цётка. Няхай Петрык выбачае на яе. Пазбіраецца толькі радня. Шырчыху пакліча апасля вяселля, пасядзяць удваёх, нагаворацца — гэта ўжо як справаздача якая. Шырчысе адмыслова трэба ўсё ведаць.

Дарэмна тая строілася падпяяць Паўлу за сталом, чыста па-жаноцку, не даруючы старому дзецюку такое доўгае халасцяцтва:

Дзе ж ты, хмэлю, зімку зімаваў,
Што й не развіваўся?..

Нервова лапнула па кішэнях, нічога не знайшла, каб рукі чым-небудзь заняць, засяродзіцца. Хай сабе хоць наастатак удасца паспытаць тую свойскасць да чужых, чаго не мела, век баронячыся. Ні галінкі як на тое, ні ліста на вочы не трапілася. Падняла каменьчык на дарозе — гару несла перад сабой.

АСЕННІЯ ПТАХІ

Яна выходзіла з пад'езда, сумкі ў абедзвюх руках — звялым скрыллем да самай зямлі. Ідзе ўкрадаючыся, бы з чужога дома, стала, азіраецца — ці бачыў яе хто. Прыгнуўшыся, ступіла ў цемру, як пад абложанае неба.

— Ніна! — заву, ідучы дадому.

Куды гэта стары чалавек пайшоў унаначкі? Добра ведаю, яна пачула, пэўна, спынілася — зусім жа блізка. Але не азвалася. Стаіць, пэўна, смяецца з мяне недзе на мяжы святла і цемры. І як заўсёды ў спрэчках скажа аднымі вуснамі, запэўніваючы: «Маўчы, маўчы, ты жызні не ведаеш...»

Позні вечар насупіўся, непрылюдна мільгне зрэнкай адзіная лямпачка. Сквер, куды пайшла Ніна, не асветлены, як той лес, цёмным гушчаром — адразу за нашым домам. Недзе побач, а можа, якраз і на гэтым самым месцы, горад калісьці пахаваў хутар Мядзьвежына, паклаўшы яму пад голаў вехаць цыкоры. Улетку цыкора ўзыходзіць, падымаецца высока, але мала хто ведае ейную назву. Блакітныя зіхатлівыя кветкі сярод цёмнай травы, пылу невядомым, густым сузор'ем. Першы снег увосень, абы да яго дакранулася сонца — толькі трэба лучыць, заспець — на імгненне запахне вялымі кветкамі. Тут, кажуць, быў Вялікі белы сад. Калі палягуць снягі, такія вузкія сцежкі ад дому да дому, хоць ты вітайся з незнаёмым чалавекам, цесна размінаючыся, як не абхапіўшы адзін аднаго рукамі, каб не паваліцца.

Позна ўвечары гэтым чорным часам ідзеш насустрач незнаёмаму сцяўшыся, як на мядзведзя.

Яшчэ раз удалося ёй схавацца ад людзей. Усё ж меней будуць ведаць, што яна гандлюе на вакзале півам, гарэлкай, цыгарэтамі... Уся ў цёмным, ужо яна плячо ў плячо з ноччу, нічога не баіцца, усё роўна, калі што якое, то і рукой не адпіхнеш — рукі занятыя. Ужо яна адной парой з тымі, хто пакідае цемрай, як пацук, падвалы, цёплыя вуглы кацельні, ідзе «на паляванне». А варта стаць побач з бабамі на вакзале, абавязкова каторая адцісне яе з бойкага месца, як не прызнае ад учарашняга. Усё яна тут ім новенькая быццам. Можа таму, што так пужліва азіралася, калі хто перацягне мацюком. Драбніўся позірк на дробныя шкельцы. Тады яшчэ ніжэй насоўвала хустку на лоб і паліто апранала пушчэйшае. Ёй цяпер і бутэльку пустую могуць аддаць у рукі, спагадаючы. Але ж і міліцыя забірае без следства, раз бабка ноччу на вакзале. Круціш галавой, як пеленгатарам, каб не папасціся, каб паспець уцячы за вугол. Апранулася неяк чысцей, вусны намалявала, да такой, вядома, маёр міліцыі не падыдзе, не западозрыць, што таргуе. Але ж і п'яніца не спыніцца. Вось і згадай, што лепей. Спасцігалася хітрая навука малога бізнеса. Што, хіба вунь тая, на

вугле, Мышкай завуць, худзізна, уся цыгарэтамі абверчана, а не пазнаеш – нарадзілася і адразу ў торг?!. Тая, дзе мацюкамі, а дзе – на каленьках перад міліцыянерам, каб не забраў, кожнага дагоніць на вакзале, прымусіць купіць. Выручку мае зайздросную, Ніне такое і не сніцца.

Ледзь-ледзь затрымлівалася пад бяздоннем вакзальнага гвалту, бязбожжа. «Тамара, – сказала неяк сяброўцы, – давай крыжыкі надзенем на шыю, інакш – прападзём...» Гудок цягніка глушыў галасы. Яна разам з ад'язджаючымі бегла па пероне, спадзеючыся добра ўтаргаваць. На нейкі момант выдавалася, што гэта якраз ейны вагон. Здэйся, усё б кінула, села б і паехала адсюль у сваю вёску, да пляменніцы, жыла б у катушку, абы на зямлі, сярод сваіх. І адведаць хацелася б. Вось толькі шкада, што новую газавую пліту яшчэ не атрымала, абяцалі ў домаўпраўстве памяняць. Штодзённыя клопаты мелі вялікую сілу, каторы ўжо раз заміналі на дарозе да вёскі, затрымлівалі. І вазоны на вокнах без яе пасохнуць. Слаба і цвітуць, яна пачапляла на іх чырвоныя ліхтарыкі сухога фізаліса, усё ж весялей. Калі ў доме адныя свары, у ім пасяляецца нячыстая сіла, чула па радыё. Нават умывальнік ніхто з сантэхнікай не можа адрамантаваць, слініцца вада і слініцца. Маўляў, не кватэра, а неспрыяльная зона...

Адышоў цягнік, разышліся людзі. На пустым пероне па свежаму павольна ішла нейкая старая, кіем падымала, пераварочвала скамечаную паперу, шматкі імпартных упаковак. І другая за ёй – асеннія людзі, як птушкі, па полю ўслед за віруючым жыццём.

– Ого-го-го!.. – калоціцца Ніна ад радасці, смяецца, сустрэўшыся ў калідоры. – Я знайшла сёння харошую хустку на вакзале!

Глядзі, дзівіся, і людзі ішлі ўперадзе, і не заўважылі! Такая неспадзяванка! Яна заўсёды нешта знаходзіць. Мы разам з ёй не думаем аб тым, хто згубіў, хто панёс страту. Можа, каму і не вядома гэтае дзіцячае пачуццё: заціснуты босай нагой толькі што ўпушчаны некім рубель у краме. Тым больш, калі ты ад нараджэння ясі, сілкуешся не са стала, як людзі, а з зямлі, з шуметнікаў. І цяпер яшчэ поўнае валлё каменьчыкаў, жвіру ад той пары. Тая радасць заўсёднай перашкодай паміж табой і людзьмі, якія маюць што згубіць, зблоціць ці проста выкінуць.

У доме асцерагаліся Нінінай шчырасці. Перахопіць каго ў калідоры й трымае як не з паўгадзіны. Той ужо просіць змілавацца, каб карацей гаварыла, маўляў, надта спяшаецца, няма часу бавіцца.

– Не магу табе карацей! Ну, во, такі хлеба кавалачак ці так чаго адрэзаць, – паказвае на дзвярах пальцам, – а гэта ж разгавор, як адрэжаш?.. Во, здумала, што мяса ейнае з балкона ўкралі! А там балкон – толькі кату перайсці! – злавіла яшчэ гарачую плётку адной старой суседкі на другую, кінула аб зямлю, і больш няма чаго гаварыць.

Вось яна ўжо некаму і злосніца! Спяшаліся абысці, калі яна, стоячы ў калідоры, жалілася ўсім спарадку на свайго Андрука: зноў, маўляў, напіўся, падлай абазваў:

– Я трыц-цаць гадоў толькі гэта чую!

Слёзы раптоўныя, з сухіх вачэй, быццам гэта ўпершыню чутае – першым дажджом пасля спёкі на сухую дарогу, людзям пад ногі. Рукі да твару, уся сцінецца, плача ціхенька, па-сіроцку, бы дзіця ў кутку чужога дому. Нехта з маладых суседак раіць ёй зрабіць завіўку, падмодзіцца, маўляў, можа б мужчына палепшаў да яе.

– Аніколі! Ён не бабнік! – злуецца Ніна. – Мая завіўка, мая ўся харашба, гэта тое, што я яму смачна ежу строю!

І бярэцца тачыць нож аб прыступку лесвіцы. Не памятае, каб яна калі была свайму Андруку за жонку. О, мужчына пад чаркай! Дзікім хмелем завіваюцца ягоныя кучары. Які ён вольны й вясёлы, як блізка, увесь час наўмя, ягоныя моцныя жаданні! Хмелевай лазой выцінаецца побач... Такога Ніна не зведала. Андрук чайнік з кіпенем на пліце забудзецца выключыць, спаліць дашчэнту, затое ўспомніць ёй п'яны найдрабнейшую нікчымніцу, абы толькі пасварыцца. Цела ейнае асядала пустой, халоднай мураванкай, адныя блакітныя вочы блішчэлі нясцерпна чыста, ніколі не хаваліся за аканіцамі, бы сонца навылёт ад усходу да захаду.

Пустазеллем цвіла навокал ясная цыкора, ёй таксама невыносны цень...

Не злучана яна з Андруком, не ейная гэта палавіна, да крыку даходзіць, гвалтам крычыць у калідоры, аж на вуліцы. Ідуць людзі, азіраюцца, стыдаючыся. А яна знаходзіць усё новыя і новыя доказы супраць мужчыны, быццам ён злодзеем

праз акно залез у ейнае жыццё. І яна сама не ў сваю долю трапіла. Ратуйце, лавіце яго! Не прызнае Ніна гэтыя гарадскія сцены, гэтыя дзверы, скрозь праходзіць ейнае асабістае, жаночае. А калі ў вас і ціха, нічога не чуваецца, то гэта вы проста стаіліся са сваёй нядоляй. «І ты няшчасная...» — скажа суседцы знянацку, спачуваючы ёй, як сабе. Тая потым далёка будзе яе абыходзіць, баючыся адназначнасці. Чалавек звычайна падумае так аб сваёй долі толькі ў горкую гадзіну, у гадзіну адчаю. А не штодня.

— Чулі? Чыталі? Паліцыянт забіў учора дзяўчынку з аўчаркай! — пераймае.

Навошта, Ніна, увесь час пра благое ды яшчэ з самай раніцы? Век у брыдоце, адкажа, колькі жыве. Ёй, маўляў, лягчэй, калі й іншыя ў горы, у няшчасці. Ёй тады свайго жыцця не так шкада, калі разам з усімі. Як у вайну ўсё роўна.

Шчаслівых яна не бачыла.

Хоць ты запытайся: ці заўважаў хто з суседзей, што ходзяць каля ейнай кватэры надзіва лёгка, не адчуваючы адчужанасці? Быццам увесь час адчынены ейныя вокны, дзверы, у пакоях заўсёды чыста, і толькі скразняк гойдае фіранкі, як у той песні. Выкрычыцца, выплачацца, справіць абедню па ўсіх, хто курчыцца ў адзіноце. І мы, сустрэўшыся ў калідоры, лягчэй загаворваем адзін да аднаго. Не пра сябе, вядома, — пра Ніну: зноў, маўляў, напіўся ейны. Але ж хоць гаворым, хоць вітаемся. Іншы раз выдаецца, што яна ўвесь час на парозе. Здалёк пачуўшы Ніну, ужо ў калідоры быццам скідаеш з сябе цяжкую барму. Як бывае, калі йдзеш з аўтобуса да сваёй вёскі. За ліпамі ў лагу заплача кнігаўка. Адразу падумаецца: вось ты й дома.

Сумная птушка пры тваёй дарозе.

Але няма ёй куды зайсціся, перасядзець, пакуль Андрук заціхне, абасне. Тады яна аднойчы ўзяла ў рукі сумачку, паклала бутэльку гарэлкі — і на вакзал. І ўжо ёй быццам прычына: і работа, і капейка. Абы сысці. Цяпер яна сама хавалася ад людзей, бо набыла тое, што лічыла найбрыдчэй за ўсё на свеце. «Маўчы! Маўчы!..» — скажа, пужаючыся самой сябе, варта толькі запытальна паглядзець ёй у вочы.

Вернецца з вакзала звычайна паўначой, у доме ціха — якая пара, адныя павукі начным страхам кратаюцца на дне ванны, спусціўшыся па ваду.

Піў мужык заўсёды, але цяпер не хапала ейнай пенсіі на закусь, на ежу. Праўда, п'яны быццам меней есць і што толькі трапіцца на вочы, і бульбай у мундзірах не пагрэбуе. Абляціць Ніна ўсе крамы, прыцэніцца, каб выгадаць капейку. На двары бура, завея, а Ніна ідзе дамоў вясёлая, коцяцца слёзы на твары ад марозу. О! У непагадзь, маўляў, людзей на кірмашы меней, можна дзешавей купіць тое-сёе. І дзеля самой сябе стараецца. Не, яна апошняе не з'есць, лепей хай прападзе, сапсуецца і выкіне, але каб было, каб у людзей не прасіць.

— Калі халадзільнік няпоўны, тады ў мяне во тутака пачынае балець, — паказвае на галаву, на самое цемя. — Я ў вайну так галадавала, уся спухшы была, пальцам не поркнеш — скура на мне лопалася...

Глядзіць на маладых суседак вачыма бежанкі, якая ўвесь свой век у дарозе, уцякаючы ад ваеннага голаду.

Гэтак любіла штодня, каб бутэрброд з'есці: масла, сыр і соллю пасыпаць, каб солька ў роце чувалася — так ёй смачна. Ад вайны цярпець не можа ні крапівы, ні лебяды, ні бурака. Цяперашнім часам не да выгодаў. Але ж нехта, во, смажыць катлеты, пэўна, з дарагога любовага мяса. Так смачна пахне! Высока падымае грудзі, убіраючы паветра, слабка смяецца, бы не ў калідоры, а пад квітнеючым бэзам стоячы. Спахопіцца — і пабегла здаваць то слоікі, то бутэлькі. У мужа знойдзе пад ложкам пустую пляшку, усцешыцца, бы на вуліцы ёй пашэнціла. І спужаецца сваёй радасці. Абы не спыніцца, дзень пусты, калі няма набытай капейкі. Так-сяк рухае жыццё, усё бліжэй ссоўвае яго да краю. Ёй жа, як яна кажа, і пахавацца на могілках самой трэба. Дзяцей не нажылі, яна ж адна, і на гэты выпадак нешта ўжо запасіцца. А хавацца хоць пад гармонік, але каб усім чутно было — іншы чалавек хоць і не спыніцца каля ейнай труны, але хоць азірнецца на яе, ідучы па сваіх справах.

Забывалася на крыжык нацельны.

Выдавалася, няма на свеце нічога, што магло б змяніць накірунак ейных пошукаў здабытку, няхай сабе і проста на дарозе, за людзьмі йдучы, ейных думак, як дзешавей пражыць. Праўда, неяк узялася чытаць Біблію, пэўна, вакзал усё болей змушаў ісці да Бога, шукаць суцяшэння. І вярнулася на паўдарозе. Чытала, чытала, а там усё кругамі: і зноў аб тым самым, і зноў новы круг, аніякага ёй сэнсу. Быццам пісаў, дзівілася,

малапісьменны чалавек. Ці, можа, яшчэ горш – па п'янцы?!. Але ж даўней быццам і п'яніц не было, спахоплівалася, разважаючы. Дык жа можна было да гэтай пары ўжо і паправіць, перапісаць! Колькі ж, маўляў, часу прайшло! Гэтак сама, калі перадаюць па радыё сімфанічную музыку. Жах! У яе ціск падымаецца, у галаве шуміць. Сімфонію ідуць слухаць у тэатр, лічыць упэўнена, каму дома не спіцца, як на гіпноз. Сама бачыла па тэлевізары: сядзяць, вочы заплюснуўшы. І Біблія, і музыка – казкі! Яна ж разумее толькі канкрэтна тое, што бачыць на свае вочы: дзверы, дык дзверы, талерка, дык талерка. Жыццё жорсткае, грубае, не любіць выдумляць таго, чаго няма.

Пэўна, вера ў Бога не можа існаваць без веры ў чалавека...

Бясстрашна вырашала жыць толькі ў сваім маленькім свеце рэальных рэчаў, сварак. Маўляў, яна не двуручная: ёй калі маліцца, дык маліцца, калі мацюкацца, дык мацюкацца. Старой цыганкай хавалася ў цемры начэй. Так і мроіцца ейны асцярожны крок вакол нашага дому быццам і не па зямлі – па багне: прапасці, трапіць у міліцыю, забіцца, але каб толькі не папасціся на вочы суседзяў. «Змарылася я... Як я змарылася...» – пажаліцца. І ніхто не паверыць, не ведаючы ейных начных ходак.

Чаму ж не, раней людзям пенсіі хапала на пражыццё. І ёй марылася сціпла, а пра што – як яшчэ можа думаць, уяўляць сабе адпачынак (так Ніна сама кажа) ішак, які ўсё жыццё на заводзе, на канвейеры ды яшчэ і ўдарніца? За грыбамі будзе ездзіць у лес, у кіно хадзіць, гэтаксама, як недзе ў свеце людзі жывуць. Начную кашулю хацелася пашыць сабе прыгожую. Корпалася б, сядзела, шыла. Яна так змарылася. Шкада, не вучылася пруткамі рабіць, маладая была поўная, баялася сядзець доўга на адным месцы, каб не растаўсцець. Думалася сціпла, але і гэта не збылося. Жыве цяпер чалавек недавяркам.

І раптам самымі маразамі сузор'е цыкоры зазіхацела ў небе! Колькі хадзіла ноччу, а першы раз бачыла гэтак густа блакітных зорак – якраз над былым Мядзвежыным хутарам.

– Ці верыш, пра што гавораць знакі задыяка? На гэтым тыдні мне варажылася на перамену работы. І спраўдзілася – я семкамі цяпер таргую... Трэба ж жыць...

Не хавае балючых вачэй, гэта, маўляў, ужо быццам «сваё дзела». Закупіць зерне, перабраць, памыць, папражыць з але-

ем – уга колькі трудоў! Няма ганьбы, калі яно трудавое. Праўда, міліцыя ганяе. І вось жа нядоля: усе людныя месцы пазайманыя ўжо. «Я інвалідка, і жыву ў гэтым доме, тутака торгу на аднаго чалавека!..» – злуецца на яе старая з кіем. Тады Ніна стала пільнавацца: калі тая выходзіць раніцай, яна ўжо ідзе з семкамі вечарам. Побач зусім малады мужчына з паламанымі пашчэнкамі прадае крадзеную з калгасных буртоў бульбу. Яшчэ адзін алкаголік – тэлефонны апарат збывае за бутэльку. Ага, ужо ўчастковы прыйшоў, дапытваецца, дзе той браў тавар, пэўна, кватэру абрабаваў. Ая-я-яй, што робіцца! Яна стаіць, збірае людское гора, дакладае да свайго. І яно робіцца ўсё меншым, з мышку, што ўчора злавіла ў кішэні. Стаіць на марозе, на ветры, лузгае семкі – і есці меней хочацца. Галубы садзяцца зусім блізка. Тады яна высока ўзмахвае рукамі, распінаючыся пудзілам, страшыць – не крычаць жа на вуліцы.

Купіце шклянку сланечнікаў – ёй будзе весялей. Высыпце галубам, калі не любіце лузгаць.

Я сама дрэнна разбіраюся гэтай халоднай парой, не адрозніваю: дзе старыя жанчыны, дзе летуценныя птушкі...

СУХІЯ НАВАЛЬНІЦЫ

Вёска мая, чараўніца,
Што сэрца ўкрала?
Цётка

Калі ж гэта яшчэ было. Зямля толькі што ўзарана, ідзе цёплая пара, бы нарэшце адчынілі вечка. Поле на пагорку, як на стале. Ціха навокал, благачынна, так бывае ў хаце на першы дзень пасля Запустаў. Торгнешся ступіць крок, не адчуваючы гэтай хвіліны, і спынішся з незразумелай дзіцячай паслухмянасцю, бы нехта побач з табой, намнога старэйшы й мудрэйшы, падымае руку да ілба – хрысціцца. Не перайсці – у вёсцы ў кожным кутку намоленае месца.

І раптам спёка. Яшчэ з вечара бачыла, як маладое сонца не ў пару сабе прымярала карону. Ззянне разыходзілася кароткімі шылаватымі зубцамі – зіхаценне дарагіх халодных

каменняў. Рэдкі птушыны голас, кожны гук у паветры шчапаўся на трэску. «Сухаветрыца, як на сенакосе, – спарней за ўсіх скажа Броня на вёсцы. Ідзе па вуліцы, як заўсёды, подбегам. – Я шчаслівая, да старасці дажылася, а ніколі ні рукі, ні нагі не зламала. Птушка, тая на скрыллях і то, бывае, ударыцца ў шыбіну, не скіраваўшыся...» Прырода пільнавала ейныя таропкія крокі, бы пусціўшы сярод нас, людзей, на завод. У дзяцінстве, праўда, два пальцы ў сячкарні адрэзала. Па гэтым фальшы не мела, як і ў дзеўках хадзіла. Век рукі ў руху, у рабоце, аж у вачах мігціць, бы ў паветры, як птушка. Калі й згубіцца пёрка, не заўважыш. Ідзе, ветрае парваным падалом, няма часу зашыць, гуляюць скразнякі каля ног – халадок! Стаіць, пераймае яе Тамара, сяброўка з дзяцінства, прыехала стараваць у вёску, аддае ёй грошы за малако.

– Чаму гэтак робіш, у хату да мяне не зойдзешся? – злуецца Броня.

– Ты ж якраз дарогай ідзеш... За адным разам, во...

– І ты дарогай да мяне прыйдзі, не полем...

Злуецца, а сама сабе ўжо не можа рады даць, улёгшы ў работу. Не да сяброўства. «Як калі дзе пасяджу ці пастаю з кім на вуліцы, пагавару, дык мне гэтай мінуты шкода. Шкадую, бы што згубіла...» – шчыра прызнаецца. Людзі ўсё бачаць, абходзяць яе. І дзеці быццам адракаюцца. Якраз жа каля маіх вокнаў ішоў ейны зяць з сынамі, былі прыехаўшы з горада на выхадны дзень. Апошнім часам ён неспадзявана разбагацеў, займаючыся нейкім бізнесам.

– Бацька, паедзем адсюль, паставім у лесе палатку, вогнішча раскладзем, га? Хоць адпачнем, – ціха, па-змоўніцку настойваў старэйшы.

– Мае раптам падхапіліся, нешта ўспомніўшы, і паехалі, нейкая ў іх пільнасць... Запрасілі сала, цыбулі, хлеба... што да чаго... – тлумачыла Броня потым мужу Мікалаю мімаходзь.

Не, не здагадваецца. А мне шчыміць іхняя таямніца, бы ў маёй хаце нейкая няўдача. Ці то хлеб у печы ад моцнай гарачыні разламаўся на дзве паловы, на два акрайцы, пашчапаўся – і абодва сырцом, комам. Ці то... і здумаць няможна, што яшчэ благое. Яшчэ стаіць Броня сярод двара, прыбраўшыся, усклала на сябе, як толькі зяць прыехаў, сівы сарафан. І рубцы відаюцца на ім, як быў зложаны ў шафе, не адвісеўся яшчэ на

ёй. Паправіла новую хустку, абвяла рукой па самым брыжыку, акрэсліўшы рэдкую на вёсцы прыгажосць: вытанчаныя рысы твару, бы за мроівам стагоддзяў. Так старэюць святыя жанчыны на вясковых абразах. Мікалай у новай блакітнай кашулі. Быццам і ў іх ужо другая жызня за багатым зяцем. Сарафан шарсцяны, горача, твар гарачы, позірк аж кіпіць, але ж дзеля дачкі, тая стала сварыцца, што бацькі ходзяць у карэлым, як заключонікі. Толькі — блісь на мужа вачыма, маўляў, наробіць ён мыцця, вось і ўсё! Трэба ісці пераапранацца, раз ад'ехалі.

І дагэтуль, па-ейнаму, зяцёк не вельмі ляпіўся за работу, ведама, мужык гарадскога заводу. Во, нясе салому! Глядзі! Мала ўзяў, мне не хопіць! У цялушкі капыт задраўся, кроў цячэ. Падлога ў хлеве гнілая, можа, цвік загнала, трэба ёй падаслаць. Глянь, колькі ўзяў! Гультай! Ці ў цябе сілы няма?.. Паробіць паўгадзіны якой і кладзецца спаць! А трэба ж рабіць!.. Выгаворвала яму здалёк, у вочы не адважвалася. Нечага было дзівіць, ён працаваў недзе ў будаўніцтве, хапала, пэўна, клопатаў. Гэта не конь, што ўсё ў грыву і ў грыву, чалавеку трэба і аддыхнуць. Але ж трэба, прыехаўшы, і адрабляць цешчы за харч, адбываць павіннасць, як умее, без ейнай дапамогі дзяцей цяжка гадаваць. Не хапала ў зяцька звычкі працаваць без аддухі ўвесь тыдзень запар. У цешчы зусім іншы дзень, іншы год. Часам збяруцца з хаты раней, чым меркаваліся быць, і паехалі дамоў, не дабыўшы да вечара.

— Няхай сабе едуць... Бачу, як ён усё ўкладаецца і ўкладаецца... Дашчэнту, бачыш, спрацаваўся ў канторы седзячы, — махне ўслед рукой, маўляў, такая з іх дапамога, яны ёй болей заміналі.

Затое цяпер, спадзяваліся маладыя, пажывуць па-людску — справы ў бізнесе ішлі вельмі паспяхова. І дачка стала прасіцца:

— Мама, я ўсё магу купіць і сабе, і табе. Паспагадай, мне хочацца, прыехаўшы, каля рэчкі пасядзець, а я свету не бачу за работай... З табой некалі пагаварыць.

Ведала Броня ейную гаворку: една тое, мама, трэба меней трымаць скаціны, толькі калі трохі дзеля сябе, ім ужо дапамога непатрэбна.

— А што я загадаю рабіць, калі не буду занятая? Вазьму аднаго гусачка на рукі да грудзей і буду лашчыць?! Што я з гэтага

буду мець?.. Трэба дзеля спажывы трымаць, а не дзеля строю ці ўцехі! — бараніла сваю вялікую гаспадарку.

Нарэшце, волю далі — скаціны трымай колькі адужаеш, зямлі выкупленай поўна, аж да ракі. Дачка, шкадуючы матку, з граблямі ішла на сена. Зяць, насупіўшыся, з дзецьмі — у грыбы, маўляў, ён ужо зарабіў на ўсіх, можа і адпачыць. Ішлі ў розныя бакі, бы з розных хат, з розных сем'яў. Дачка не кажа ў банку, дзе працуе, што яна з вёскі, што кожную суботу едзе туды сеяць ці сенаваць. Каб не ганьбавалі ёю «новыя» беларусы. У нядзелю ўжо вёска не святкавала. Амаль да ўсіх дзеці прыязджалі з горада толькі на выхадныя. Як упусціць такую дапамогу? Не было калі чалавеку спыніцца, не труднаваць дзеля зямнога, а падумаць аб сваёй душы. Адмяняліся і гадавыя святы. Прыехалі былі дачка з зяцем на Тройцу — і зноў няўпраўка. «Якубіха сказала, што можна работу рабіць», — з палёгкай абвясціла Броня. Маўляў, старая суседка ў царкву ходзіць, яна бліжэй да Бога, лепей ведае. Сама ж бывае ў храме толькі калі як выпадае вяселле ці хаўтуры. Убачыла ў лесе неяк, па нешта ж хадзіла, цвіце жменька ветраніцы дуброўнай, курганком, і дрэўца побач, якраз як у галавах магілкі дзіцячай. Войкнула, спужаўшыся — гэта ж скора Радаўніца! А яна і запамятавала — трэба ж да бацькоў схадзіць на кладоўе. Адмяніла старая Якубіха Тройцу надоўга, а можа, і назаўсёды. Адлучыла і сваё пакаленне ад Бога, якраз жа і да яе прыехалі дзеці. Не заламаўся ў лесе бярозавы май, голыя бэлькі ў хаце, голая брамка. Свята ўжо не заходзілася ў вёску. Стаялі пасвянцоныя за даўнім часам старыя хаты, бы закінутыя пастуховы буданы на стойбішчы. І зямля не аддыхнула.

Два вяслы ў вясковага чалавека: работа і малітва — казаў нехта. Толькі, пэўна, цяпер дні карацейшыя, калі пасталелі. «Ці я пераборaю, ці яно мяне», — скажа Броня з адчаем Якубісе пры сустрэчы. «Пра што ты?» — перапытае тая. «Ну ці захварэю і памру ад такой работы, ці вазьму ў рукі й яно пойдзе ў мяне ладам...» — «Як зіма мінулася, дык і не памятаю. Каб не карова, не свіння, я памерла б, а так... ветрык мяне абвее на агародзе — і мне лягчэй. Так бы я зляжалася, як гнілая салома ў полі...» — спяшаецца ўлучыць у шчырую размову Якубіха.

Вядома, не толькі дзеля дзяцей у горадзе распачата вялікая гаспадарка, але і дзеля саміх сябе, адчуваючы спрадвечную

магнасць да зямлі. Запозна ўволю яна ім дасталася. Якубіха ўжо і мужа пахавала, дзеці ў горадзе.

Было голасу па вёсцы, калі зяць купіў адну імпартную машыну, потым — другую. Ужо меў вялікую ўласную кватэру, будаваў маёнтак і дзецям. Броня быццам і не чула, што дачка разбагацела. Няўцямна замоўчвала пра іхнія даходы, як не гавораць услых аб нечым недазволеным. Адкуль яно, багацце? Нечыё ж было. Не трудом, а хітрыкай, лічыла, дасталося. А калі не ўдасца схітраваць другі раз?!. Зноў гаворку заводзяць, каб цялушку збывала, не пускала ў зіму другую карову. Адпіхвалі яе ад гаспадаркі, шкадавалі ейную старасць. Яна, як сляпы за поручні, хапалася за граблі, за вілы, за лапату. Не забыцца ўжо ёй на тое, як прыехала была аднойчы дачка-багацейка: «Мама, у мяне ні капейкі... падкінь што-небудзь...» Сала і раней ніколі не бралі, калі жылі, як прыйдзецца, а цяпер узяла. Трэба ехаць купляць у Ракаў, у яе самой адзін радок у кубле, да новага году не хопіць. Стары Мікалай, калі ўжо і машыну завялі, нёс наўздагон у руцэ, зняўшы з гнязда, і покладзь. Надточваў канцы, бы з гэтага дачка толькі й жыла. Дзіва што малая ўнучка, ледзь навучыўшыся гаварыць, казала: «І я буду бізнесменам». А што гэта такое, запыталіся. «Гэта рулетка такая, круці й грошы будуць», — адказала. Маўляў, як удасца. «Во каб усе так жылі!..» — хітала галавой Броня, пабыўшы неяк у дачкі ў гасцях. Цяпер ужо не падзяляла іхняе багацце на ўсіх, як раней. «Каб яны ўсягды так жылі...» — бедавала, маўляў, нічога пэўнага, нічога і завіднага, часовае яно. Не, Броня лічыла, ейная гаспадарка больш надзейная за іхнюю.

І гэта пад такім спякотным небам гэтай сёлетняй вясной. Суха, зямля звініць, не ўмінаецца пад нагамі. Няма следу, бы па каменні ходзім. Усё пахавалася, як у непагадзь. Такая здыхата. Не развіхнуць кветку, пражылася насенне, няспелае зерне. Ішлі аблокі, міналі сад, агарод, хату, недзе, пэўна, бокам ішоў дождж. Хмары, спяшаючыся, куляліся праз галаву: то блісне белым падбрушшам, то спіной з чорнай поўсцю. Ішла пад імі Броня з пустымі вёдрамі, паліла ўжо агарод, не спадзявалася на Бога. Марыў сон. Ледзь адзываўся далёкі гром. А выдавалася, што гэта яна шпульку нітак з пеляны ўпусціла, задрамаўшы, кацяня качае яе на падлозе, маскоча. Не памятаецца, калі гэта брала іголку ў рукі, вышывала ці ткала, хоць

і ўмела. Мацерыны посцілкі, рушнікі каля абразоў. У яе і вазоны перасталі цвісці. Што такое? Думалася аб тым, што дзеці настойваюць, каб на дзень нараджэння мужа сабраць гасцей — юбіляр, семдзесят гадоў ужо. Дзецям лёгка прыехаць, ім коні не заварочваць. А гэта ж столькі руху! Не выходзіць баляваць, якраз у той дзень пісклюкі павінны вылупіцца, трэба пільнаваць. Няма ахвоты да таго балю. Сёння сядзела пад каровай, даіла і плакала, так змарылася. Яна ўжо і есці не варыць, некалі за работай. Мікалайка злуецца. Не бяда, неяк жа з зімы выйшаў, смяецца сама сабе. Румянец вунь на твары густы, цёмны, як закалец, валасы з-пад шапкі тырчком, выпетраныя ветрам, бы трава-сенажатка на самым пагорку. Чаму ж не сесці б, пасядзець, злажыўшы рукі, як у гасцях, — усяго ў іх поўна, хлеў трашчыць ад скаціны, грошы ёсць. Даўно не збіраліся за доўгім сталом. За ім яна і замуж ішла. Каб жа ёй, як штатнай, падмену хто даў. А то: мама аддыхні, а назаўтра ў яе ў два разы болей работы будзе. У хаце, як у хляве, ледзьве дошкі віднеюцца. Іншы раз дабярэцца дачка, выпратае з большага і дзверы зачыніць — хай хоць крыху пабудзе чыста. Адна сцежка: з хаты — у хлявы, з хлявоў — у хату, некалі разувацца, модзіцца ў хатнія пантоплі. Хоць ты на вілы бяры, цягні з хаты ўтаптаныя дарожкі.

«Сто разоў на дзень нагінацца! — злуецца на дачку. — Лепш я раз у тыдзень нагнуся і памыю». — «Мама, нашто мы печ белім, ці хіба надоі ў нашых кароў павялічацца?» Маўляў, ужо табе самой парадак гэты не патрэбен стаў. Вечка ў студні храснула, адвалілася. Адстаўлены ўбок адарваныя ў веснічках дзверы. Ледачкамі на сонцы вылузгваюцца шкельцы з аконных рам... «Броня! Але ж дзверы ў жылой хаце могуць быць адарваны толькі часова!» — хочацца закрычаць на яе, не ўтрымаўшыся, як узбудзіць ад нейкага цяжкага сну. Завядзеш гаворку здалёк. Маўляў, Якубіха не гаспадыня, гэтак гразка ў хаце, у гумовых ботах не перайсці, пылам занесена, як завеяй праз выбітыя вокны. Жыве начлежніцай, ні свёнткаў, ні пёнткаў. «А ці ведаем, колькі яна за год свіней выгадуе!» — запярэчыць, ухваляючы суседку.

Успаміналася, гледзячы на іх, некалі чутая прытча... Мужыку амерыканец даў работу з той умовай, каб ён не стрыгся, не мыўся і рукавом нават не адважыўся абцерціся. Толькі адна

работа. За ім будуць сачыць і ўдзень, і ўночы. Калі ён парушыць дагавор, усё ад яго адымуць. Праз кароткі час мужык разбагацеў... Даўно было парушана і маё кволае ўяўленне аб сялянскай працы. Яшчэ летась з восені неяк, навозілі яны сушыць з далёкага сенакосу сена. Ужо яно і высахла. Назаўтра — дождж. Толькі ледзь віднелася. Броня з Мікалайкам посцілкай носяць сена ў хлеў. Твар у яе напяты, цяжкі, пот цырубалкамі — праз сілу набірае на плечы. Не гавораць адзін да аднаго, моўчкі крадуць у сябе самы сон. Яшчэ і дзень не пачынаўся, а яна так напрацавалася. Золак мне тады падаўся невясёлым, цьмяным, бы святло ў галавах цяжка хворага чалавека. І сумнелася: ці на добрае ўжо гэткая праца, ці благачынная яна, калі на згуб душы?.. Зноў я падкацілася да яе з сваімі меркамі, з сваімі парадамі: «Бронечка, глядзі, якія ёсць твае сёстры стрыечныя! Чыста апранутыя кожан дзень, з твару гладкія, аж блішчаць! — Тыя наязджаюць на лета з горада да Бронінага брата ў хату, дапамагчы ў гаспадарцы й тое-сёе спажыць, што выпадзе, з агарода, з саду, не маючы сваёй зямлі, дачы. — Ты ж іхняя равесніца, а хіба скажаш...»

Броня толькі назаўтра вярнулася да гэтай размовы:

— Я ўвесь час думала сабе, што ты сказала... Сёстры ж — парабчанкі тут, у брата, а я — гаспадыня! Карэлая хаджу? У мяне толькі зверху гэтак, бо работа такая, а падыспадам, глядзі, якое на мне!

Стаіць на вуліцы, адкасвае сукенку ля шыі, расшпілілася — бліснуў станік, падняла спадніцу — бліснулі рэйтузы. Ва ўсім белым, ва ўсім чыстым, што найбліжэй да целы, да душы. Чыста, бялютка гэтаксама, як у старым вясновым лесе, калі зацвітаюць першыя кветкі кісліцы, анемонаў — самае танюткае, самае далікатнае — маладое споднее адзенне.

Пэўна, на Пятра нейкі бязбожнік гарадзіўся, кол глыбока загнаў — аніяк дождж не распачынаецца. Зірнеш ноччу ў акно, як у кузню: цёмна, толькі сполахі гарачай бліскавіцы, у два молаты яе куюць. Раз-пораз асвецяцца збялелыя вокны суседскай хаты. А сэрца і не зварухнецца. Звыклася ўжо сухая навальніца. Гэтым днём таксама зусім не варажылася на дождж. Ластаўкі будаваліся пад страхой. Адна за адной, узмахвалі чорным рукавом, бы манашка з напёрсткам перад акном седзячы. Пярун ляскаў над самай галавой. Раптоўна падхапіўся

віхор, мёў нізка, збіраў венікам след чалавечы, след скаціны, падымаў угору. Дарога ўжо тая ішла над хатамі, вілася шэрым шляхам да лесу. Ляскаў пярун па баках сытых коней, ірвалася вупраж, далёка ззаду ўжо кацілася адламанае ад вазка кола. Пэўна, ехаў нехта багаты, хацеў паспець да дажджу — нічога не шкадаваў.

— Едзьце, збірайцеся, неба дужа замурзалася! — заспяшалася Броня, зносячы напакаваныя сумкі ў багажнік, дачка з зяцем была зноў прыехаўшы.

— Мама, я павязу мыць тваё пасцельнае ў горад, паласкацца тут, у халоднай рацэ надта ж нязручна, такія доўгія прасцірадлы...

— Дык жа і рака доўгая, — адкажа, смеючыся.

Мае давер, як да сваёй зямлі, так і да сваёй вады.

«Няхай сабе едуць, — гаварыла сама да сябе потым. Едзьце, не замінайце, нечага час бавіць, ейную ахвоту да работы не зводзьце, не квяліце ейную больку. — Няхай яны сабе едуць...» — паўтарала. Кацілася, накочвалася даўняя крыўда, яна адганяла яе ўслых, супакойвалася. Як не пры сваёй памяці, засяваючы вялікія соткі, няўцямна спадзявалася на іхнюю дапамогу, бы й дачка і ўнукі яшчэ побач, у хаце. Яшчэ яна лашчыць іх па галаве, падымае руку вышэй і вышэй — ужо і не дастаць. Прыехаў быў неяк большы ўнук: «Вось тут, у садзе, будзе стаяць тэніс!» І паехаў. Памятае, як толькі першы раз яго былі прывёзшы ў вёску, узяла на рукі, вынесла з хаты. Нідзе не спынялася, як не затуляючы яму вочы, мінала панадворак, сад, няўцямна ішла да ракі, дзе пасвіўся конь. Каб першае, што ўбачыў, зацьменнем засланіла гарадскі свет. Яму было раней ягад з куста агрэсту, як вады напіцца, — толькі з аўтобуса, адразу ў агарод. Цяпер банан аблупіць — і ўвесь пачастунак. Перарвана ўжо даўно сялянскае пупаўё.

Рыкала калгасная карова за ракой. Два дні й дзве ночы не сыходзіць з месца, дзе была прывёўшы цяля. Яго адразу забралі, а яна аніяк не зразумее, дзе яно магло ад яе дзецца, жывое, цёплае, толькі, во, паспела пысу яму аблізаць. Набракала вымя, цякло па нагах малодзіва. Каровы збіраліся вакол яе, рылі капытамі: чуючы пах крыві, пах пасцелі з улоння, трубілі, склаўшы галовы. Дзікі ваяўнічы рык ахопліваў вёску. Трудныючы грудзьмі, Броня бегла да яе і раз, і другі, каб хаця на

зямлю крыху здаіць, малако перагарыць. Пайшлі б дажджы, змылі б тое месца... «Няхай сабе едуць...» І на гэты раз не ўзяла ад дачкі грошы, скаціне — на муку, курам — на крупы. Ніколі не брала, атумысла. А калі яна сама занядужыць, і ёй прыйдзецца за дзецьмі стараваць? Запасіла, складаючы ім у сумкі масла, сыры, гародніну, на сваю будучую доўгую зіму. Гэтак сама як збірае ўсё лета, гатуе надалей варэнне, ніколі не ўзяўшы ў рот свежай ягадзіны. Няхай будзе чысты ўклад, нечапаны, як у банку. Няма ў яе надзеі на гэты свет: невядома, ці надоўга гэты дазвол трымаць скаціны колькі хочаш, урабляць сваю зямлю. Трэба спяшацца, трэба запасіцца: «Будзем рабіць, пакуль ногі не скінем».

Дождж пайшоў буйны, нізкі, бы з куста ў лесе стрэсены на плечы. Але ніколі не бывае доўгага дажджу, калі гром. Гусі Броніны пасталі на вуліцы, высока падняўшы галовы насустрач струменям, толькі што лапкамі не вяслуюць супраць цячэння. Гэтай ноччу Броня не паспела ўжо і ў хлеў іх зачыніць. А хваліцца, што лёгка іх глядзець, маўляў, пусціў на траву і ўсё. Гусі навобмацак пераходзілі з месца на месца, качаліся да раніцы па вуліцы белымі клубкамі — дзікай чарадой, што, высіліўшыся, асела на зямлю пераначаваць. Неяк рана заспявалі салаўі, далучыўшыся да дзённых птушак. Выходзіш на вуліцу, як на тое свята. Малыя жабы з-пад ног — празрыстымі зеленкаватымі пацеркамі з тваёй шыі.

І Броня якраз ідзе насустрач, карова захварэла, пэўна, прыпасвала яе каля лесу. Вяроўку ўскінула ёй на спіну, маўляў, ідзі сама дамоў, дай хоць рукам аддуху. Круп шырокі, на ім вяроўка — як на лаве. Броню пазнаеш здалёк, постаць прыкметная ад усіх баб. Людзі толькі ў поле — яна ўжо там, усе — дамоў, а ёй — хоць бы што. Галаву заўсёды трымае высока, пагляд з прыкідам на дзень, на год, на ўвесь наш цьмяны век.

Я не ейная сяброўка Тамара, што ўжо і ў хату не заходзіцца, баючыся трапіць у гарачую, як вар, пільніцу. Варта ўбачыць яе на вуліцы ці на другім полі, абы трапілася на вочы, — іду, бягу да яе, замінаю, пад ногі, пад рукі, перадкуюся спатыкачом. Не ўсё разумеючы ў ейным жыцці, нешта асуджаючы, дзівячыся і брыдзячыся іншы раз, стараюся лучыць у ейны спорны крок, прайсці побач, стаўшы на ейную несканчоную спрадвечную сцежку. Ляту на голас. Каб скрозь тусоўкі, войны, бязбожжа,

безуладдзе пачуць адзіны пэўны покліч, як да непаслухмяных дзяцей, што чула яшчэ ў дзяцінстве: «Да работы!» Ратуюся, заблытаўшыся ў чалавечым тлуме, спаталяю асабістую бяду, як у мацярынскім зацішку...

Толькі шум дажджу з пераходамі, бы на старым млыне часу.

САД НЯВІННАСЦІ

Весткі з гор, як вятры, выхаладалі дом. Тэлевізар глядзіш толькі тады, калі перадаюць «Навіны»... Асцюкамі тырчаць сцены разбураных хат, яшчэ нечая печ курыцца, умомант здзічэў сад. І раптам: ідуць дадому белыя качкі. Павольна, важка, пэўна, добра пажыраваўшы, тым жа, як заўсёды, парадкам, пільнуючыся, адна за адной, на зямлі. Ні двара, ні хлева, ні табе дзе чалавек, няма дзе спыніцца, як у небе. І гэта ўжо мне велічныя птушкі, боскім знакам, з моцнай памяццю, з непарушным пачуццём спакою, гнязда, вечара, калі патрэбна вярнуцца з ракі, з лугоў пад страху — не збадзяцца...

Кадр з Харвацкай вёскі не выходзіў з галавы. Ці можна Богу прызнацца, менавіта, што крыху ратавала твой розум ад дзічэння? Гаворка вояў была чужая, незнаёмая, гэта быццам аддаляла крывавыя падзеі на неверагодную адлегласць — у небыццё. Вось толькі тыя белыя Птушкі... А ўжо стаіць рускі танк за плотам чачэнскай станіцы. Такі звычайны, знаёмы паркан вакол агарода, як і ў тваіх вёсках, загарадка ад чужой курыцы, ад скаціны, ад свавольных дзяцей.

Такі самы паркан, які кожны з нас маляваў у дзяцінстве вакол хаты: некалькі калкоў, перацягнутых паскам. О, якая гарачая свара бушавала паміж суседзямі, калі пераляціць курыца праз плот, здратуе лехі! І мова вояў ужо знаёмая, руская, бы з таго канца тваёй вёскі... Над усімі войнамі, руінамі, вогнішчамі хат успамінаецца цяпер, вымаўляецца як не ўголас, некалі выпадкова пачутае ў вёсцы ад старога суседа-гаспадара: «Я дзіўлюся на цябе, як гэта ты дазваляеш сваім дзецям самім яблыкі ў садзе ірваць?!. Я дык сцярпець не магу, калі хто і траву

патопча, не тое што!..» Такая звычайная, такая патрэбная чалавеку мера дазволу, каб пазначыць непарушнасць сваіх звычаяў, сваіх правоў, сваіх трудоў у садзе. Што да мяне самой, то я не навучылася маляваць і стаўшы дарослай: і на палях канспектаў, дзённікаў ці так, бавячы час, марудзячы, абы аловак у руцэ, адразу — дом, паркан, сад. І нязменна, амаль набожна лічу, што нават калі чалавек проста пераязджае з месца на месца, ён павінен забраць з сабой не тое, што скаціну, сабаку, катка, але і сад. Усё, што дзічэе без гаспадара.

Каб не парушыўся чалавечы код.

Зноў «Навіны». Зноў расейскія танкі падмінаюць пад сябе ўсё жывое. Тым часам каля ног блытаецца, гуляе сын, чуе стрэлы, выхоплівае цацачны пісталет і спрабуе цэліць у люстру. Ужо зброя і ў тваім доме. А тым часам немалады чачэнец, выправіўшы сям'ю ў надзейнае месца, застаецца пільнаваць сваё жытло, не разумеючы, як тая птушка, небяспекі: «Я за скацінай гляджу... А загарыцца дом, ён чакаць мяне не будзе, пакуль вярнуся, трэба будзе гасіць...» Яго забіла асколкам снарада, бядуе рэпарцёр, наведаўшы знаёмую сядзібу. Скрозь выбухі гармат выразна чуўся спеў пеўня. Пэўна, дух гаспадара ўсё яшчэ абараняў дом, хлявы, сад... Чачэнка з плачам кідаецца, тлумачыць, што не можа бегчы ад сваёй хаты, ратавацца — на руках у яе дачка-калека: «Пакуль я дабягу з ёю, мяне дзесяць разоў заб'юць!..»

Гарыць Грозны. У шпіталях не хапае лекаў, ніхто не ведае дакладна, колькі салдат загінула, хто трапіў у палон. Адныя мацеркі, галосячы, кладуцца на рэйкі ў Сібіры, каб не пусціць цягнік у Чачню з салдатамі асенняга прызыву. Мацеркі едуць забіраць з палону, выкрадаюць сыноў з войска. Кожная — сам-насам з горам, бы маці-адзіночка. Не чувалася, каб хто-каторы з мужчын спыніў завод, шахту, а хоць бы й сячкарню ў паветцы, пратэстуючы супраць распачатай вайны, як гэта неаднойчы рабілася проста дзеля павелічэння заробкаў. Хоць на момант не спыніўся будзённы рух на зямлі, каб прымусіць кожнага скалануцца ад навіны: пайшло на гарады й вёскі войска зусім маладых мужчын, акурат банда, сваім одумам, сярод белага дня. Няўжо ніводзін царкоўны служка на ўсяночную перад Калядамі, стоячы найбліжэй за нас ля калыскі Хрыста, не сарваў з сябе ў роспачы багатую святочную

рызу, не запатрабаваў хаваць кожнага салдата гэтай вайны не па-хрысціянскаму звычаю, а – за агароджай могілак, як самагубца ці цяжкага злачынца – без адпявання?!. Хіба не яго-каторага справа рабіць веру вобразам жыцця? Ці, можа, для нас гэтае свята проста як прыход у наш дом чужога дзіцяці, якога абавязкова трэба пачаставаць, аказаць увагу, ласку і праводзіць з хаты? Віншаванні, падарункі, радасць на Каляды – абрад і больш нічога?

«Радуйся зямля – Сын Божы нарадзіўся...» У скверы, якраз напроці вокан, дзеці кідаюць у вогнішча бутэлькі з вадкасцю, чуюцца выбухі, кідаюць моўчкі, метадычна, з нейкай памслівай асалодай вярэдзячы ціхае наваколле. І няма ў дарослых сёння бацькоўскага права забараніць ім гуляць у вайну... Мароз маскоча па голай зямлі. Каб хоць жменю снегу на скроні. Няможна даць рады сваёй галаве. Адзіным паратункам – успомніць, бы паклікаць да сябе на бяседу, на чэсць, Зосю з вёскі Барок. Ветрам, як слабае полымя свечак, павярнула тады ў наш бок пагляды старых жанчын, ейных таварышак, – хліпкае святло ці то бабскай спагады, ці то знявагі.

– Хай бы ты да мяне зайшлася, я хоць бы сваё гора табе расказала, га? – пераймала яна мяне на вуліцы іншы раз.

Спыніцца на момант, усміхаецца, глядзіць табе ў твар, нахіліўшы галаву, як да малога дзіцяці, якога ёй не хацелася б нечым прывеціць, як толькі па кішэнях сябе не лапае, але нічога не мае, вось толькі – гора.

– Трэба пагаварыць, але, во, часу няма, – крычыць ужо здалёк, адыходзячыся. – Можа, прыйдзеш, калі дождж будзе? Га?..

«Якое ў Зосі гора? Што здарылася, ці чулі?» – пытаюся ў баб.

«Аніякай навіны! На вайну з немцам усё яшчэ хварэе!..» – адказваюць абыякава. А Зося ўжо далёка, ейныя сцежкі ні з кім не перакрыжоўваюцца, зжывае свой век на восьмым дзесятку адна, у дзявоцтве. Кажуць, сваталіся да яе, а як жа, але ні за кога не пайшла. Чаму?!. І цёткай ніхто ў вёсцы яе не называе.

Блісне ейная постаць то ў полі, то на ферму ляціць калавурыць, то каля ракі з касой. Першы пракос, бы валасы ў сталай дзеўкі на прабор, прамы, разважлівы. Але хутка зняможыцца і дзяўбе траву, абы рукамі не ірваць, спяшаецца,

добра ведаючы: калі не ўхопіш сёння, то заўтра, калі не дождж, мужык чужы скосіць. Не бяда, што да касы не хапае клінка, а ў граблях — некалькі зубоў. Спыніцца, узбіўшыся на чалавека, загаворыць амаль шэптам, усё цішэй і цішэй, ужо, выдаецца, адныя вусны кратаюцца. Слоў не распазнаеш, а стаіш і слухаеш, бы над вадой бягучай, сцюдзёнай, па дробных каменнях. І ты ўжо бачыш у ёй свой адбітак. «Табе, — кажа, — каб свежыя кветкі, краскі ў хаце кожны дзень, а мне, край меры, каб — буракі былі чыстыя! Край меры, каб — салома з поля звезена!.. Ты — дачніца...» А шчаслівая хвіліна ёй тая, калі натрапіцца сын суседскі, паможа з канём — яму меней гарэлкі трэба, чым ягонаму бацьку.

Слабка азіраешся па баках і раптам чуеш шчэбет, хоры птушыныя, бы яны таксама з ейных вуснаў. Глядзіць услед, сама ва ўсім цёмным, хустка на галаве чыстая паверх учарашняй — адзін рог з-пад аднаго, як на ахвярным крыжы пры дарозе. Вецер сіні павее надвячоркам, нахіляцца каласы травы ў адзін бок, блісне маладзік, нізка, як з-пад ног, з ейных рук упушчаны. Тады яна ляціць дахаты, хвалюецца, ці не забылася суседка карову пераняць, хлеў зачыніць. Адважыцца і ўкосіць посцілку на калгасным белым полі. Цвіце дзяцельніца, нізенькая, кучаравая, маладзенькая. Поле прыбрана, як на хрэсьбінах, дзе-нідзе купінамі пракінуліся незабудкі — галубовымі матузкамі паверх карункавай коўдры. Укосіць і не надта ўкрадаецца, бо з цёмным выйшла з хаты, з цёмным і вярнулася, захінуўшыся начным покрывам ад вачэй. Неяк была пажалілася: «Гарох з бабамі сушылі на складзе, дамоў, бачыла, кожная сабе ў вядро ўзяла, а мне сказалі: «Высып, бо пападзешся!» Гэтак я пакрыўдзілася! На той дзень каліва пры людзях не вазьму, баюся, што ўдадуць начальству, аднымачкай, калі што якое надарыцца — укасіць ці бульбы сабраць пераворанай. І ў грыбы ходзіць адна, адшчапенцам.

Вёска невялікая, старая, кароў нямнога, часта даводзіцца радоўку адбываць. Ці непагадзь, ці так якая золь, ідзе на пасту ў тым самым, быццам і дадому ўсе дні не заходзілася, быццам і не тутэйшая, здалёку людзіна. Паша за лесам. Разыходзяцца выбітыя скацінай дзень у дзень сцежкі, вяроўкамі віюцца, за рогі закінулася каторай, самай панаўзлівай, каб у жыта не ўбілася, шкоды не нарабіла. Карэнне старых ялін павыбівалася

з зямлі, лягло пругка, моцнымі цэўкамі. Выдаецца, сашчапілі бабы рукі, парамі пабраўшыся ўздоўж сцежкі, ідзе па іх Зося дзяўчынкай у вянку, нечапанай мужчынам, ідзе да поля, каб яно багата радзіла. Правіцца даўнейшая варажба на багатае каласаванне збажыны...

І што гэта іншы раз надарыцца? Зморыць неспадзяваная аддуха, ногі самлеюць, ці сонца распесціцца ў ейнай пеляне, галава да галавы – і засне на хвіліну – не ўпільнуецца, пагубляе кароў. Ці раззыгуюцца ўпаўдні – не ўтрымаеш адной пугай. Ходзіць тады да паўначы, ліхтар запаліўшы. Выйдзе з лесу да вёскі, хістаючыся, куляецца, узбіўшыся на дарогу з цемры, як па галбанах. Ногі калкамі, жыватом уперад, бы яе нехта ззаду з лесу папіхае. Выдавалася іншы раз, як падумаеш, што і не вернецца Зося, сыдзе ад людзей, нікому з мужчын не даўшы даверу, не пусціўшы дзіця ў племя. Сыдзе з гэтай вёскі, жорсткай, непрыхілкай да наезджых. Зося пасялілася тут пасля вайны – ды яшчэ з ганьбай, маўляў, замужам не была, дзявуе. Ведама, лясныя людзі. Неяк распавядала, ездзіў сюды некалі ейны дзядзька карову сабе купляць. А каб капыты не пазбівала, не спяклася на сонцы, вёў яе дарогамі глухімі, па лясных вёсках. Ішоў гэтак, ішоў, карова змаглася, сам змарыўся, стаў прасіцца, – ніхто не пускае ўнаначкі. «Ідзі адсюль, – кажуць у адзін голас, – мы цябе не ведаем і знаць не хочам, нам бяды не трэба». І даёнкі не далі, здаіў малако ў пыл, карова палягчэла... Сабралася ехаць сюды, хату напытаўшы, дзядзька дуба стаў: «Не едзь у лясы, там людзі нядобрыя!..» Ноч, туман сунецца з гары, бы табун блудных белых авечак з апушчанымі галовамі ў час перагону. Каля ракі, каля агародаў збунтуюцца, палягуць да раніцы. Ідзе Зося з туманом, басанож, невідушчым крокам, што ноч, што дзень, у руках ахапак калгаснага турнэпсу.

І сабакі не чуюць, калі што ўдасца ўкрасці.

Вось і дажджы пайшлі, самая тая пара наведацца да Зосі. Яна ўхапіла з плоту сноп буракоў з насеннем, кінула на голую падлогу сярод хаты, як на зямлю, абы суха. На стале лустачкі сала, хлеб, самагонка ў алюміневым кубку – сусед прывозіў дровы, частаваўся. Дзверцы ў шафе рассохліся, адлушчыліся стручком, шпалеры пакруціліся габлюшкамі, усё тут абвалілася, абламалася, як позняй восенню пад небам у агародзе, у полі,

на лугах. Фіранка на акне на панадворак крыху адсунута, бо нечага брэша сабака, трэба паглядаць – мужыкі, як восы, чуюць, абы корак у бутэльцы адторкнуў.

– Зося, ці ты дома? А ці прыйшла твая карова? – пытаецца суседка праз дзверы.

– Я карову здала, а ты не ведала, га? – крычыць услед. – Не, не плачу па ёй. Яна ўжо мне і малако не аддавала, старая. З хлебам свянцоным развіталіся з ёй. І купляла з хлебам. Памятаецца, заве-е-я, узялі хлеба, гарэлкі, сала, як у сваты, ехалі па карову.

Хата ў Зосі пустая, ужо і хлеў апусцеў, нават куры зводзяцца. Учора, сама бачыла, бабы пыталіся, ці не ейную курыцу, белую, п'яны трактарыст затаптаў. «Мая ты мілая...» – прызнала Зося. Галаву жалобна – набок, загаварыла, як да нябожчыцы. І пайшла ў поле да работы, на цэлы дзень. І не закапала – некалі.

– Іншы раз прыйду ўвечары дамоў, дык выдасца – пахне смажаным, варанай капустай, быццам хто ў хаце, поўна хата, восем душ, як даўней... Во, дзівіся, пахі памятаю, як котка ўсё роўна... я за бацькам бегала ззаду, гэтак любіла, ён аж хаваўся ад мяне... Яго немцы забілі на першы дзень, як у вёску ўвайшлі, бо старшынёй быў... І братоў, пад самы корань. Людцаў з суседняга сяла патапілі ў студні. І нашых ужо заганяюць. Паўначой, у свіран, бабы дык без спадніц каторая. Бягу з усімі, ногі не ідуць, як не паўзу, поўны рот пяску. Віхнула ўбок, у канаву, – суседка, бачу, хаваецца з дзецьмі. «А ці ўмееш хрысціцца?» – пытаецца, маўляў, бацька ж камуніст, Божанька не захоча ратаваць... Татка, бывалася, паставіць нас і кажа: «Хрыстос – гэта чалавек такі быў, хадзіў па свеце, людзей лячыў, вучыў добрае рабіць. А Бог, ён ёсць, але гэта – дух. Яго ніхто блізка не бачыў. Можа, і сонца Бог...» Перахрысцілася я, тады суседка піхнула мяне да сваіх дзяцей, я лягла ў ямку і... адразу заснула. Прачнулася – вёска згарэла, людзі, хто не ўратаваўся, папякліся. Два кіламетры кроў ішла ад таго свірна. Мамка, бачу, ідзе па вуліцы. Я да яе. Селі во так, толькі тое ў нас, што на целе, у цёплы попел, каб сагрэцца. Яна мне ногі сваім падалом накрывае: «Дачушка, твае ногі такія халодныя». Гэта ж твае, кажу. Яна ўжо не чула сябе, здранцвеўшы была, як дрэва. І есці ніколі не папрасіла, колькі жыла...

Вайну тую Зося яшчэ не закапала, як, не раўняючы, птушку белую, забітую трактарам. Стаіць ейная вайна труной пасярод хаты. Абы свежы чалавек на парог, будзе хадзіць вакол яе, кожны раз крыху перайначваючы перажытае, бы папраўляючы адзежу на нябожчыку. Абы дакрануцца сваёй рукой, пакуль не зачынілася вечка, не забілі апошні цвік. Гаворыць цішэй і цішэй, ужо толькі дождж за вокнамі шапоча. Голас без жалю. І цябе падбадзёрвае позіркам, маўляў, яна лёгка плача, упэўненая, як нявеста Хрыстова, што спакой і радасць не на гэтым свеце, дзе войны.

Дзе і цяпер страляюць мужчыны адзін у аднаго. І ва ўласным доме...

Дождж мацнее, ужо топчыцца пад вокнамі, на ганку. Няма ў агародзе ні дрэўца, ні смуродзінавага куста, каб адысціся яму ад хаты, пагуляць, пазабаўляцца. Гаспадыня, як бежанка, абы перабыць жыццё, як непагадзь. Праўда, сядзе іншы раз во гэткім дажджом, і вышывае наўлечку ці рушнік. Кветкі з памяці, як яна сама кажа, з таго даўнейшага жыцця за вузкай брамай, дзе яна набыла вопыт смерці.

— У мяне валасы былі, дзівіся, во па гэтуль! — правяла рукой па каленьках. — Пайду на танцы, ніхто з дзевак ці баб болей за мяне не натанцаваўся. Адна на мне кофтачка, босая, а хлопцы бяруць і бяруць! Адзін прыйшоў у сваты на багатую Каляду. Мамка на яго ганенне несла: казалі, што гэта ён удаў татку немцам. І другі, ды на белай кабыле, а красівы, каб ты бачыла! А ці ён ведаў, што той прыйдзе... Хата яшчэ без вокан, кругляком, голад, адзін кусанак хлеба і той напалам. Які там замуж... Сядзяць, памятаю, во гэтак, абодва маладыя, смяюцца. А мяне нейкі страх бярэ, немцы наўмя... Ці казала я табе: як мы закопвалі сваіх абгарэлых людцаў, дык немцы плакаць не дазвалялі. Ці паверыш, стаялі ўбаку і смяяліся... Ад той пары стала баяцца маладых мужчын, дзіцячым страхам баюся... А тут яшчэ вярталіся з Германіі нашыя дзяўчаты. Адна з іх як пазнала, што панесла ад немца. «Ну, фрыца я не павязу дамоў», — сказала і... павесілася. Во які шлюб бралі мае таварышкі... у мяне ж быў і свой хлопец, якраз войска адбываў, ягонага бацьку немцы вылегчалі. Ну, вярнуўся мой Васіль. Я ж як з розуму не ішла, гэтак яго любіла. Прыйшоў да нас. Ён сеў на ложак, мне не панаравілася: што гэта ён! Толькі, во, заслала, ды перад людзьмі!

А штаны шыро-о-кія! Узяў танцаваць, арэхі ў руцэ, я стукнула пад руку — арэхі рассыпаліся. Тады бабы на мяне: «Зоська, што ты штукуешся! Ён жа толькі з войска, чаго ты, адумайся!..» Сышла мая любоў... Мне, пэўна, было падчаравана... Ідзём з Васілём да маёй суседкі, Васіль трохі карагодзіўся з ёй да войска, і рука ягоная яшчэ на маім плячы, і разам у дзверы гэтак, ага. А матка той дзеўкі якраз — торк! нож, з касы роблены, у бервяно над дзвярыма, над намі. Я тады нічога не падумала. А пасля, як у нас з Васільком усё папсавалася і прычыны на тое не было, то я стала сабе раздумляцца. І ўспомніла пра нож... Ніколі нож не падавай з рук у рукі, пакладзі, каб чалавек сам яго ўзяў, бо пасварыцеся... Сышла любоў... Той Васіль у Маскве цяпер ёсць...

— Ты яшчэ, Зося, такая спрытная, дужая...

— Бо цяжкую работу раблю!

— Колькі ж табе гадоў?

Доўга мнецца, муляе вуснамі, бы прыпамінаючы, а потым:

— Калі праўду табе сказаць, дык і не ведаю!

Адкажа з такой палёгкай, што і на гэты раз не вымкнулася, не ўдалося чужому чалавеку дазнацца пра ейны ўзрост.

Ужо яна быццам і перастарак, і сонца ўжо ў акне садзіцца, а хлопцы ідуць ды ідуць да яе ў сваты. Алёша дамаўляецца правесці з вечарыны, яна ціхенька збегла дамоў адна. І танцы без яе разышліся. «Цётачка, мамулька, кукулька, буду ў вас жыць!» — прыляцеў Алёша ззаду, просіцца ў прымы. «А яна ж — старэйшая!..» — загаласіла маці. «А ніхто не ведае, калі памрэ!» — «Мне ж ганьба!» — злуецца Зося. «А чаго Мішка са старэйшай за сябе Тацянкай жыве? І добра жывуць, і дзеці ё! Чаго ты? Які цябе пуд бярэ?!» Напіўся і пайшоў іграць вечарыны ў суседнюю вёску.

— Тамака мая таварышка жыла... Дзеўка як стаяла і... пахінулася да Алёшы. І замуж пайшла за яго...

І тут не выпаў лёс, надта малады быў Алёшка, надта вясёлы, смяяўся замнога.

— Во, бачыш, і засталела... у складзе неяк гарох перабіралі... Стаў адзін удавец сватацца. Ды не пры тым разгаворы ён падкаціўся, трэба было па-людску, у хату прыйсці... Потым неяк пераняла матка жанілы з другой вёскі: «Можа, — кажа, — пойдзеш за майго Шуру?» Я ведала яго, раз неяк барозны мне

разганяў, гарбаценькі такі... Цяпер у Мінску, жонка ягоная харошая, нізенькага росту...

«Мне, пэўна, падчаравана...» — скажа часам яна, запэўніваючы каторы раз. Водзіць па далоні пальцам, паказвае, як у паперу, не здагадваючыся, што гэта ейная прырода пратэстуе супраць мужчынскай жорсткасці, ваяўнічасці, бунтуе ў адзіночку, не даруючы, праз усё жыццё ні чужым, ні сваім... Хачу зрабіць ёй фотаздымак, ды каб сядзела яна на сваім, скрозь у вышыванках ложку. Прашу паправіць крыху падушкі, пакласці адна на адну, пад столь, як звыкла бачыць у вясковых хатах.

— Не, я па-дзявоцку іх пастаўлю! — пярэчыць.

Бярэ кожную, узбівае, адцягвае за вушкі, рукамі вакол абціскае, бы ўсаджваючы малых дзяцей, якія яшчэ і сядзець адны не ўмеюць. Ставіць уздоўж сцяны. Кожная паасобку — на доўгую ночку, на невясёлыя перадумкі, на кароткі сон. Куляешся ўслед, стоцьма ляціш, як за руку хто пацягнуў, ва ўладанні старых вякоў, дзе кожная рэч гаварыла да цябе, варажыла, папярэджвала. Дзе зняць дзявочы вянок з галавы жанчыны мог толькі муж. Няўжо праўда, кажуць у вёсцы, што Зося цяпер ужо ніколі не спіць на гэтым прыгожым ложку, сцелецца проста на падлозе, пэўна, уступіўшы яго сваім дзявочым мроям.

— Чакай, я пераапрануся! — спяшаецца, адчыняе шафу. — Глядзі, колькі ўбораў маю! Во гэтую сукенку — на першы дзень Вялікадня! Гэтую — на другі, гэтую — на трэці... Якая харашэйшая?

Пустая хата. Радня толькі на фотаздымках на сцяне, людзі рэдка заходзяцца, і Бога вачам не відаць. Анікога, котка ейная рабая, як толькі хто чужы дзверы адчыніць, ляціць хавацца ў падпечак. А яна села, усыпаўшы ў падол спелыя яблыкі, строіць вясёлыя вочы, жартуе, смяецца — святкуе сваю восень. Пасцігае сусвет у невядомым нам вымярэнні.

Выйшлі мы на ганак. Дождж цёплы напроці восені, дробны, можа, праз тое рэшата, якім дзеўкі ў старажытным Рыме насілі ваду, каб даказаць пляткаркам сваю нявіннасць.

— Во, падзівіся, я садок пасадзіла! — крычыць яна мне праз плот, паказваючы на тры кволыя дубцы ў агародзе, якіх ад зямлі не адразу і заўважыш.

Не дзецям сваім, вядома, гэты сад, і ўжо, пэўна, не сабе. Можа, вясёлай, белай птушцы на гняздо, калі адляціць ейная душа.

«Я дык сцярпець не магу, калі хто і траву ў садзе патопча, не тое што!..» — увесь час чую, грыміць з вышынь ейнага непарушнага сялянскага свету, як з тых чачэнскіх гор...

КОНІ

Дождж ішоў нялюдска, высокімі светлымі слупамі, і быццам не з неба, а нейкай сваёй хадой, па зямлі, з поля, як з мора, да лесу і там знікаў, бы ў цёмных адчыненых вокнах багны. Каторы дзень запар. Вечарам іншы раз спыніцца на момант, сцішыцца. Тады ад зямлі падымаецца гарачая пара, як ад каня, бы яна на сабе гэты дождж цягнула, упрогшыся, круга хадзіла, наважаная на срэбныя ланцугі. Во стала, нарэшце — і дождж спыніўся. Вільготна, пахне росным дзіцячым потам. Вось, выдавалася, і наўлечкі ўжо выкруцілі насуха — цяпер нарэшце распагодзіцца. Але перад ноччу, яшчэ на шэрай гадзіне плыткае неба зноў дыхала цяжкімі туманамі. Пачуццё блізкасці вялікай вады, жывой, рухомай, як бяда, варочала чалавека з поля, з лесу дамоў.

Ганна, спяшаючыся, падпіхала пад галаву жарэбцы Ляльцы вехаць сухой саломы, ставіла долах побач кош дзяцельніцы нанач, пераважвала кабылу Глашу, ішла дахаты.

Валіліся на страху яблыкі старой дзічкі, зрэдку так, стукне і адкоціцца на зямлю, быццам нехта ўсю ноч бяссонна, маркотна іграў у більярд.

Не спалася. Падсвядома разумела: трэба браць нейкі рух, клікаць ветурача, бо ўжо скора тыдзень, як жарабя закульгала. Казала старому Юзючку, яму даручылі былі ў калгасе даглядаць жарэбную кабылу падвозчыка Бабра. Той толькі хуценька так, як самае пэўнае і добра ў хаце з жонкай Настасяй абмеркаванае: «Не-не, я добра ведаю, не трэба!» Маўляў, пройдзе само, павінна прайсці. Сам маленькі, вушкі тырчаць адтатурыўшыся, бы чалавек ніводнай шапкі не знасіў, ні салдацкай,

ні мужыцкай, не абціснуў дзіцячую галаву, вочы блізка каля носа, бы ў акулярах, чыстыя, блакітныя, век на пагоду варожаць. Юзючок пільнаваў, каб Бабёр і на гэта раз не забіў малое, як толькі народзіцца, бо яму, падвозчыку, – адкрыта ўсім казаў, – патрэбен на ферме конь рабочы, а цяля замінае, блытаецца пад нагамі, трэба пільнавацца – яму няўпраўка. Дый ці ўпільнуешся, скарэй скалечыш. Малады Бабёр ні з чым не хаваўся, і кабылу ягоную звалі ў вёсцы Глаша ад той пары, як ён яшчэ з вечара паставіў быў яе каля варот наезджай дачніцы Глашы, і ад'ехаўся ажно раніцай. Толькі калі зрэдку цверазеў. Людзі дапаміналіся, што ён не такі ўжо вараўны чалавек, і нават заікаецца як цвярозы, бы нязвыклы да гаворкі вясковы маладзёнак. Але ж, маўляў, гарэлка зводзіць. «Прамаргалі», – дасадаваў Бабёр, пачуўшы, што кабыла даўно ажарабілася. «Ну што, прывяла сучку?» – быў наведаўшыся да яе.

Само павінна прайсці... Конь, кажа Юзючок, не баіцца дажджу, сцюжы. А хворае, малое? Можа, і праўда. Тут, у вёсцы, век са скацінай, спраканалыя людзі, як не верыць. Хіба яна, гараджанка, калі каня гадавала? Яна і падысці да іх першыя дні не адважвалася. Кабыла стаяла, як на палатне Рубенса. Калені, клубы – усё вывараччана магутнай сілай родаў, вывараччана схваткамі, пакутамі, боль штуршкамі ішоў, хвалямі. Расхіненае ўбакі пасляродавае цела ільснілася, бы ў дарагім уборы, з яго яшчэ не сышла тая раптоўная палёгка, калі нарадзілася жарабя, цела з той высокай амаль боскай прыгажосцю саміцы. Непадалёк ад іх некалькі раскідзістых старых дубоў. Быццам і задалёка адзін ад аднаго, але выдавалі гаем. І з якога боку на іх ні зірнуў, усё роўна яны стаялі не паасобку, быццам кожны з іх увесь час, увесь век памятаў пра астатнія, паварочваўся тварам, пільнаваўся, бы ў нейкай сур'ёзнай мужчынскай гульні. А можа, гэтая блізкасць ад рэдкай дасканаласці волатаў напроці іншых дрэў. Ніводнай лішняй галіны ці лістка, і нават заламаны навальніцай сук не калечыў. Сухі, паваленны дуб абапіраўся аб зямлю моцнымі сукамі, стаяў сярод жывых высокім урачыстым саркафагам. Падысці асцярожна, пачаставаць кабылу ласункам і зноў сесці пад дубамі, глядзець збоку, сцяўшы вусны ад захаплення. Доўга не знаходзіла да яе слоў пяшчоты, ласкі, бы перад вачыма велічная высечаная статуя. Жарэбка Лялька, нагойсаўшыся, іншы раз клалася

каля самых матчыных ног, каля капытоў, цяжкіх, каменных, перавязаных путам, нязграбных. Якраз жа галавой, і вочы заплюшчвала, спала, без усялякай асцярогі, бы спушчанае з рук, нізка, у прыпол. Няўжо не зачэпіць?!. Кабыла аднойчы сама першай пазвала жанчыну да сябе, ціхім, як да жарэбкі, іржаннем, нават і не іржаннем, а быццам проста па клавішах прабеглі лёгкай рукой. Убачыла, высока падняла галаву і пайшла насустрач, да рук, крок далікатны, на абцасах. Захапленне, страх згаслі, асвяціліся сінія — па вядру, разумныя вочы жывой істоты, якой звычайна патрэбна чыстая вада, бульба, бурак, абмешаны мукой, нялішне і кош травы, яблык, каб не прапала малако.

А дождж амаль не пераціхаў. Спрабавала напытаць, каб хто ў вёсцы пусціў жарэбку, пакуль хварэе, у свой хлеў. У адказ една тое: коні, маўляў, сцюжы не баяцца, дождж ім не шкодзіць, не бядуй, вучыцелька!

У тую ноч надышла бура. Хату накрывала цяжкой хваляй, не паспееш адсапсціся, як за ёй ішла другая, трэцяя. Захлынула вокны, шум, плёскат, гойданне дрэў укалыхвалі да ванітаў. Страх заснуць, бы ты яшчэ можаш сваім розумам даць якую раду, упільнавацца, каб цябе не сарвала з месца, не аднесла далёка ад людзей. Назаўтра, ступіўшы на зямлю з таго начнога каўчэга, ледзь пазнаеш наваколле. Мокрая, шэрая, як мыша, птушка на клёне. Суседка на ганку ў хустцы нанайніцу, ступае асцярожна, каб не паваліцца, ідзе ў сад да вывараченых яблынь, да затопленай бульбы. Рукі вісяць уздоўж цела, ужо яна, выдавалася, доўга не змусіць нічога імі рабіць, наглытаўшыся гэтай цёмнай вады — бяды. Рака затапіла хлявы, лазню, ідзе перакатамі, шуміць дажджом, бы кожная кропля ў ёй яшчэ жыве асобна, гамоніць сваім голасам. Праехала па вуліцы пустая падвода, а падалося, што зноў варочаецца навальніца. Галасы ў вёсцы над вадой чыстыя, званчэйшыя, далёка чувацца. Жанчыны клічуць да сябе дзяцей, пабыўшы, зноў клічуць — надта блізка бяда. Нават паспускалі з ланцугоў сабак. Скрышаныя зёлкі, кветкі, водараслямі матляецца лісце дрэў, чорная зямля пад нагой, ані следу, бы й не было дагэтуль жыцця твайго, працы. І самае нязвыклае пасля — мыць ганак, ставіць чайнік, трымаць запалены сярнік, бачыць агонь, бо ты ўжо на самым дне затопленага сусвету.

Раптоўна ўспомніцца, што на тых днях, якраз перад бурай, бачыла жанчыну ў чорным. Ішла яна ў поле да лесу ад вёскі, не зразумець толькі, ад чыёй хаты, хто. За плячыма высока каса і граблі. Ідзе, крокаў не відаць, а рухаецца, перамяшчаецца хутка, быццам і не на сваіх нагах, а па ветры, зачапіўшыся грабавідлам за хмару. Лёгка, краем лесу, зайшлася ў кусты, дастала свой грыб, пэўна, зазначаны надоечы. І зноў яе бачыш ужо на гэтым баку пералеску. Ідзе нетаропка, не тое што каб да нейкай работы. А здалёк дык быццам ходзіць пракосамі: узад-уперад, узад-уперад. Граблі высока над галавой — пэўна, зграбала, ссоўвала да вёскі хмары. І сонца свяціла, і відно, што не старая, а яна выйшла сенаваць у чорным... Назаўтра — бура, разводдзе, бяда.

Нехта каля ракі сказаў і забыўся на тое: маўляў, загінула народжанае гэтай ноччу жарабя, набрала вады ў вушкі. «Як гэта?!» — перапытвала Ганна ў людзей. «А, ведама, калгаснае...» — адказвалі абыякава, бы яно, калгаснае, нетрывушчае, асуджанае на пагібель, нечага і дзівіць.

І Ляльцы з начы пагоршала. Кабыла нервавалася, ускідвала азадкам, ляскала ў паветры капытамі, шугала мачой, як з вядра, ці то баронячыся ад двух жарабцоў, ці то штукуючыся перад імі; тыя, пэўна, недзе адарваліся ноччу, табуніліся каля яе. Лялька ўжо не здужала нават падняцца з зямлі. У храпах стаялі буйныя кроплі расы, цельца як мачонік, а яна нетаропка, па-жабрацку, бы са стала старэчай рукой, падбірала губой крошкі хлеба. Во калі парвала ўсе зашчапы, забароны вясковыя — трэба самой браць раду, нікога болей не пытаючыся! Гэта скачаная бурай трава, гэтае мокрае поле не выцягнеш з-пад жарэбкі, не перасушыш, як посцілку, не перакінеш. І самой табе не будзе спакою, што б там ні казаў Юзючок, чаго б ні маўчала абыякава вёска, бы й ты ўвесь час на ейнай сырой хворай ложы. Ні з кім не радзячыся, фуфайку на сябе — пабегла ў суседнюю вёску па ветурача.

Ішла, злавалася на сябе, выгаворвала некаму як не ўголас. Бурым заносіла паабгрызеныя каровамі пагоркі. «Хапае кабыле травы», — пярэчыў Юзючок. А жарэбцы? Чаму ніхто з вёскі не падышоў, не параіў ёй, гараджанцы, даваць яйка з сахарам, яшчэ ж на памяці ў старых людзей, як выхаджвалі немцы сваіх знямоглых у дарозе жарабят? Лялька ўсё ж радзей

падыходзіла да вымя. «Калгаснае...» — як яны кажуць. Сама вінавата, не звярнула ўвагі, думалася, што сп'яна выгаворваў ёй сусед Паўла: «Каб гэта сваё, а так спасіба ніхто не скажа! Я во быў узяўшы з фермы ў кішэню, можна сказаць, смецця, прадсядацель мяне пасля гэтага на кожным сабранні спавядае. Дык я пасля буду ягонае жарабя падымаць?!.» Але ж гэта не мёртвы калгасны інвентар, не кола ці плуг, каб ісці й перажаргаць. Гэта ж не старшынёва, а жывая, боская істота, як душа трывае? Вось няхай, маўляў, Бог і пільнуецца, і ратуе жарэбку? І ты пяклуйся, калі табе трэба... Ці не спазнілася яна? Ці не позна пайшла перак вёскі? Перак старога гаспадара Юзючка, ухвалёнага дзедам Ляксеем: «Во, Юзюк! Ён хадзяін! У яго, каб ты паглядзела, якія сві-і-нні!» Чаму ж не — свінні ж свае, не калгасныя! Цяпер, ідучы па склізкай дарозе, разумела, чаму не хінуліся да яе Юзючок з Настасяй, як бы й не заўважалі ейнай дапамогі, быццам чакалі, калі нацешыцца гараджанка, надакучыць ёй забаўляцца з коньмі. Паздароўкаецца каторы — і прэч, не пастаіць, не загаворыць. «Можа, проста некалі ім, старыя ж людзі, а бульба яшчэ на полі, а свая скаціна ў хлеве, восень, — разважала раней. — Як у злосці ўсё роўна ходзім...» Тады, успомнілася, дашчэнту збедаваўшыся па Ляльцы, адчула патрэбу нарэшце сустрэцца са старымі, пара надышла пабедаваць разам, як парадніцца на момант, — адну ж бяду маюць. Пайшла ў хату. Падсвядома жадаючы ўдзячнасці ад старых, сама ўзяла з сабой гасцінец, панесла. Настася сустрэла на панадворку, несла поўнае вядро сырадою. О, якім знакам, якой дарагой узнагародай быў бы ёй кубак малака! Яна, як чараўніца, напаіла б ім усіх зняверaных у сялянскай добразычлівасці, у сялянскай высакароднасці, акрыяла б сама, амаль пакутуючы каля хворай Лялькі. Але Настася, як заўсёды, спяшалася.

Вярнуўшыся да сябе ў хату, Ганна стала тады перад Адзігітрыяй. Не ведаючы пацераў, прасіла дапамогі, звярталася чамусьці да ейнага дзіцяці, пэўна, не адважваючыся трывожыць засмучоную чалавечым лёсам Багародзіцу. А можа, яно, маленькае, народжанае ў хлеве, каля жывёлы, само распытвала ў жанчыны пра жарэбку? Чужыя ў гэтай вёсцы й калгасныя коні, і яна, гараджанка, каму ж яшчэ да іх справа?..

Там-сям у лесе падымаліся з нізін, спяшаючыся, надзявалі аберуч шапкі на самыя вочы, беглі на пагорак апёнкі. Зарана,

праўда, але ж такая сёлета сырызна. Зусім побач храснула, павалілася надламанае бурай уначы дрэва. Медзвядзём роў, выдавалася, у самыя вушы дзед Ляксей, неяк ведучы кабылу да работы. А заўсёды ж быццам такі прыветны чалавек: «Няхай ро-о-біць, нагуля-я-лася, халера яе не возьме!..» Успомнілася, як помсліва тузаў за аброць, спаганяў тое, што жарабя прывяла, што гуляе, а ў вёсцы такая пільніца – якраз жа салому калгас дзяліў. Пакуль усе навазілі... Доўгая была Ляльцы тая дарога, тады й закульгала...

– Ну, што, цётка, маеш? Чаго прыйшла? – запытаўся ветурач, калі знайшла яго ў канторы.

Ганна тлумачыла, збівалася, зноў гаварыла, а самой аж у твары стала горача. Цётка... Думаў, што нейкая калгасніца... Ён жа не такі ўжо і малады гэты «пляменнік». Можа, і аднагодак... Пэўна ж, абшушкаўся, у фуфайцы, боты гумовыя ў гразі па халяву, твар збедаваны. Не, каб напудравацца, намаляваць вусны!.. Адным словам, бясполая істота перад мужчынай – «цётка!» Не, не ўмее яна сябе паставіць у вёсцы! Трэба было з'явіцца амаль афіцыйна, патрабаваць, а не прасіць хуткай дапамогі, ведаючы ад людзей, што ветурач аніякі ў калгасе, што гіне маладняк на ферме. Ён жа і сам быў павінен даўно наведацца і сачыць за здароўем малой... «Падыду, калі буду час мець», – адказаў, з гэтым і вярталася. Грэбліва адмінаючы лужы, ішла з фермы, як на тое, жанчына... у лакірках на босую нагу. Во, пэўна ж з вясковай інтэлігенцыі, не іначай. А яна, адным словам – цётка, аніякая не настаўніца...

Каго цяпер дакараць, каго вінаваціць? Ну як нельга было зразумець, здагадацца, што меў на ўвазе Юзючок, калі казаў: «Што будзе, тое будзе, а бульбу то ўжо выкапаем!..» Марудзіў клікаць на дапамогу, бо прыедзе ветурач, мусіць забраць кабылу з жарэбкай лячыць на канюшню – нечым будзе разагнаць барозны. Вось і ўся прычына! Мокрая сёлетняя восень. Бачыла, неяк зайшоўшы: ляжыць баба Стэпка ў халоднай хаце, увярцеўшыся ў коўдру: «Ай, гэтак да дажджу спяшалася ўхапіць бульбу! Ухапіла... Але ж, во, печ яшчэ не цеплілася, сагрэцца не здужаю, усё цела ахлудзела...» «Задаўленне» як яна кажа, паднялося ад такой работы... Лятуць людзі навыперадкі да Юзючка, просяць каня – ратуюць бульбу.

Той потым толькі сядзіць узапечку, счапіўшы галаву рукамі, маленькі, вушы тырчаць, сіні ад гарэлкі, як лятучая мыш. Прастаўляюць яму за кабылу — дармавізна! Хіба зарачэшся ад дармавога, хоць яна яму надта шкодзіць. Зямля цяжкая, прыводзілі ўвечары кабылу, сама бачыла, мокрую да сподніцы, віўкае, злуецца на Ляльку, калі тая прагна, балюча ўлепіцца за пустое вымя. «Паспрабуй ты не даць катораму каня! Ого! А як на лета не мне самому даручаць кабылу даглядаць, то ўжо не дапросішся, не-не», — апраўдваўся звычайна Юзючок. І ўся ягоная палітыка.

Цяпер, калі ветурач, наведаўшыся, сказаў, што позна, жарэбка загіне, Ганна адчувала сябе ў гэтай вясковай суполцы раўнёй, амаль сужыцелькай падвозчыка Бабра, як тая дачніца. Толькі што не каля ейнай брамы начуе ягоны жарабец з калясьмі, скінуўшы пад ногі палюбоўніцы п'янага гаспадара. Не, яна не вытрывае болей, кіне школу, з'едзе адсюль — і не ўспомніць...

Як ніводзін год раскашавалі гусі, вады хапала, вёска якраз на злому ракі плыла птушыным востравам, засланым белым пер'ем. Раз-пораз гусі заляталі праз плот у сад па яблыкі. Днём змрочна, як увечары на шэрай гадзіне. Сонца не відалася, але ледзь улоўна ружавелі белыя крылы. Невідушча, аберуч гарнула яно іх да сваіх румяных шчок, лашчыла, клікала ў далёкі вырай, як на вячэру. Нізка над хатай лятуць дзікія гусі, чамусьці выходзіш за веснічкі, каб праводзіць, бы яны адлятаюць з твайго дому, з твайго саду.

Дзень у дзень хадзіла да жарэбкі — яе, нарэшце, Юзючок пусціў у хлеў, натурыста цягала кашамі траву, карміла з рук усім чым. Слабая была ўжо і тая трава, і ў садзе пуста, дзе-нідзе па яблыку, як на сірочы новы год. Ветурач больш не прыходзіў, сама старалася лекаў, сама змазвала рану (пухліну прарвала-такі), доўга, каб хто бачыў, як варажбітка, глядзела на балючае месца, бы дапамагаючы яго выбалець. Млечны шлях якраз над галавой выдаваўся пустым гасцінцам, глухі асенні гром — цяжкім тупатам позніх коней. Занадта блізка гарызонт пад лясістым пагоркам, зоркі скрозь дрэвы блукаюць воўчымі вачыма. І кабыла ноччу так храпла, некага чуючы, што хоць ты бяры бляху ў рукі й бі ў яе, баронячы хворую жарэбку. Ізноў дождж, раніцай на момант пераціхне, збяжыць

з мокрай страхі ў вадасцёкавую трубу тонкі струмень, цягучай слінай падберыцца ўверх спрасонку і зноў аслабне. Дождж і дождж, халодны, ужо асенні. А то выдасца і цёплы дзень, аж яшчэ з раніцы, лежачы ў ложку, пачуеш яго — дыхае хата, зусім накшы дух. Выскачыць суседскі ўнук у адной кашульцы, стане на высокіх сходках і цымбурыць уніз. Не азіраецца, ці хто бачыць, не стыдаецца, стаіць нерухома, цнотна, рыхтык фантан у гарадскім садзе — дождж дажджом. Адзін раз расхінулася надвечар неба, якраз напроці ейных вокан, ружовы з пазалачаным праём, вузкі, высокі, бы адчыніліся дзверы. І нехта, пэўна, выйшаў нябачны, бо якраз у гэтым месцы прывідам узнік стромкі пагорак — Ганна яго раней і не заўважала — ён, бы трап падагнаны ці сходкі пад чыесьці ступні, каб сысці на зямлю. Плечы, душу агарнула, сціснула тая неспадзяваная хвіліна, калі ўтрапёна спыняешся перад абразом, раптам адчуваючы, што і сам стаіш на святым месцы.

Усё навокал: вёска, людзі — падалося адзіным кутком на ўсёй зямлі, ціхім, блаславёным, як накут у хаце, абхінуты блакітным рушнікам ракі. Тут займаюцца праведнай працай, усё рукамі, навобмацкі: якое сена сырое, якое сухое. Нясе каторая баба ўзапечкі з вечара дровы ў печ, перацятыя мужавай дзягай, сагнецца, як пад крыжам несканчоных марных клопатаў. Тут у паўдні, у спёку гавораць, дзівячыся, пра тое, якая цяперака халодная зямля, басанож не ступіш, забываючыся, што гэта проста падціскае холадам старасць. Тут п'яны конюх з суседняга калгаса, ідучы ў вёску па самагонку, раптам рэкнуў, шчыра зажалеўшы жарэбку: «Такое дзяцятка...». Надта глыбока ў душы, падыме са дна толькі сівы хмель, носяць людзі жальбу па калісьці ўласных конях. Тут толькі адна бярозка ў светлым — парафіянкай. Тут амаль без сцябла, бы донцам стаіць на зямлі, царкоўнымі чашамі цвіце ў ейным садзе сіні познацвет...

Ганна доўга пасля не магла аслабаніцца, пазбавіцца ад пачуцця, што перад ёй у гэтым зацішку ўвесь час расчынены малітвеннік, а ёй некалі пацеры мовіць — трэба бегчы да коней.

Каля хлявоў яе пераняла Настася.

— Ты ж капусты не маеш... — і кладзе ў ейнае вядро белыя качаны.

— Колькі я вам за іх павінна?

— Бронь, Божа! Мы ж з табой дружым, — бароніцца Настася і ўсміхаецца, слабка так, бы толькі што замарозка адышла.

«Дружым?!.» — ледзь не ўсхліпнула расчуленая Ганна. Значыць, нарэшце-такі прыняла Настася і ейную дапамогу калгаснай жарэбцы, як сваёй уласнай, прыняла і яе, гараджанку. І ейныя нязвыклыя адносіны да чужых на гэтай зямлі коней.

— А куды, баба Стэпка, маркоўнік зносіце? — пытаецца праз плот, спадзеючыся выпрасіць Ляльцы, бо трава ўжо слабая.

— Жарэбцы, — адказвае старая, і сама панесла.

Нехта скінуў каля хлявоў посцілку бурачніку. Настася хлеба булку раскроіла, морквы накрышыла.

— Хай сабе, я жарэбцы, як той казаў, чужая, дык жа, жарт, ніхто са сваякоў, з калхознага начальства, не прыйдзе, не папытаецца, не выпіша мукі! — сварылася яна, паварочваючы твар у бок цэнтральнай сядзібы.

Вёска, нарэшце, субожылася, і вяскоўцы, як дзеці, забываліся на сваю віну, непамятліва шукалі адзін перад адным прычыну, быццам толькі зараз, гледзячы, як жыляецца гараджанка, усвядомілі тое, што здарылася. Лёгка вінаваціли адзін аднаго. І салома была звезена, і бульба выкапана, і сена ўжо хопіць, можна пачынаць зімаваць. Другая пара на двары, другі клопат. Дажджамі змыла той летні саланаваты пот, тую горыч, аж памяць адбірала, калі выпадала каня папасці... Адзін п'яны Бабёр цвяроза прыпамінаў кожнаму, каго сустракаў на вуліцы, пільнуючы свайго маладога жарабца, якога яму далі замест кабылы:

— Людзі! Ого, людзі! Абы, дай каня на дзень, то ўжо і канец! Даў Алёшку лес на лазню вывезці, дык праз дзень капыты паляцелі! Ён жа ішоў — я любаваўся! А цяпер, як цэлка, толькі тэп-тэп-тэп! Я ж за ім гляджу: важу буракі — і яму даю бурак, бульбу — яму бульбу, зерне — дык зерне. А ў людзей дзень галодны!.. Мой жарабец бяшчоту харошы! Ехаў нядаўна, зваліўся ў лесе, ён мяне не кінуў, стаяў, пакуль я не працверазіўся...

Мала прыслухоўваліся да яго. Казалі ў вочы: ён, Бабёр, болей за ўсіх вінаваты. Ён першым парушыў запавет сялянскі, калі пільнаваў жарэбную кабылу, каб забіць ейнае дзіця, ён, маўляў, увёў у грэх. Скачаны, збіты на горкі яблык, Бабёр не бараніўся, больш выдаючы на пакутніка, чым на злодзея. Піў, гуляў, і не

было весялосці ў ягоных гулях. Ніколі не зманіў, ні з чым не схаваўся, пэўна, ведаў, што ходзіць увесь час на боскіх вачах...

Раніцай, ледзь развіднелася, прыбегла Настася, каб наказаць: Ляльку выпраўляюць на канюшню, а потым, вядомая справа ў такіх выпадках, і не вымавіць, куды павязуць... Трымцела ў голасе. Выхадзіць жарэбку то выхадзілі, жывой галавы, як той казаў, не згубілі. Але ж гэта не чалавек. Жыць будзе, толькі які з яе рабочы конь. На нагу Лялька так і не стала, адным словам, пакаёўка, не давала надзеі на лепшае... Ганна як не сваімі рукамі схапіла пакет, сабрала ўвесь хлеб, які быў на той час. І Настася потым дабавіць акраец. І стары Ляксей вынясе з хаты кавалак, укіне. Хто яе астатнія дні там на канюшні будзе песціць? А жарэбка, во, са сваім хлебам, як з роднага дому.

Са сваёй торбай у цяжкую дарогу. У дарогу на бойню, па якой каровы, дык тыя ўпіраюцца, равуць. Свінні пішчом пішчаць, адзін аднаго з ног валяць, кідаюцца ўбакі. Коні ж ідуць памаленьку, моўчкі...

«Не кажыце мне пра коней...» — папросіць Ганна сяброў аднойчы ў бяседзе так, бы размова ішла пра кагосьці ёй вельмі блізкага, па кім яна носіць жалобу. Ніколі ўжо не магла любавацца іхнім хараством. Пасля Лялькі кожны конь ёй бы кінуты, бяздомны сабака. Толькі калі пашкадаваць і... адвярнуцца...

НА ПЛЫВУНЕ

Яшчэ дзень такі зімовы, з марозам, блішчыць, лопаецца пад нагамі, бы спакаваны, загорнуты ў фольгу. А ёй ужо нехта даў знак на цяпло. Прыйшла ўся ў белым, лёгка па-вясноваму, і з кветкамі. З кветкамі Ірына прыходзіць да Чэсі заўсёды, нават калі няма ў краме зрэзаных, ёй наламаюць з вазонаў на вокнах, крохкія дудачкі, кволыя кветкі-пакаёўкі. На нейкі момант не падымаючы вачэй, Чэся пужаецца, што так нізка, цесна абступае іх змрочнае скляпенне прыхожай, што сама апранута так звычайна, быццам усю зіму не распраналася на калавуры. І наогул, яна ўжо спазнілася туды, дзе вельмі было пільна быць усім жанчынам на свеце. Ледзь дазваліся,

дабудзіліся яе людзі, птушкі. Лепей сказаць, як вясковая баба, задрамаўшы на паставе ў полі, раптам падхапілася – сонца высока, скаціна сышла ў шкоду! А яна выцірае салодкую слініку з вуснаў – і не разумее, якая цяпер пара!

Няўжо вясна?

– Я табе дзіўлюся – ты дома і дома, не любіш збораў. А мне выйсці на людзі – адзін момант! Што кубак чаю выпіць... я да цябе на хвіліну, потым – у басейн. Жэня павінен туды падысці... Чамусьці выдаецца заўсёды, што ён спозніцца ці зусім не прыйдзе...

– Чаму?..

Чэся звычайна не распытвала пра Ірынінага каханка, пра тое, як ім удаецца так часта бачыцца. Ірына была намнога маладзейшая, высокая, прыгожая, з лёгкім характарам, яна стаяла наводдаль ад іншых жанчын, пэўней сказаць, навідавоку. І розныя любоўныя гісторыі, заляцанкі, палкія прызнанні былі гэткім жа звычайным антуражам, як біжутэрыя, яе Ірына мяняла амаль кожны дзень. Толькі мастак Жэнечка маляваў яе заўсёды чамусьці з адным і тым жа ўпрыгожваннем – кулон з цёмна-юлёвым каменем на грудзях. І жаліўся, што ніяк не ўдаецца падабраць фон на партрэце, змушаны распінаць плюшавае прасцірадла, як у дарагім футляры.

Сёння хацелася спыніць Ірыну, пагаварыць, распытацца. Як у Венеры Мілоскай: ці не шкодзяць ёй чужыя пагляды? Ці не баіцца яна, што жонка Жэнечкі плісне варам у твар? А дзеці? У самой Ірыны – двойня.

Нешта ляснула ў суседнім пакоі. Не, ніхто не прыйшоў, дом стаіць на высокім месцы, гуляюць скразнякі. Чэся ўстала, каб упэўніцца. Не, гэта фортка. Такім часам іншы раз прыходзіў дадому муж, разы тры-чатыры на тыдзень. Аб тым, што ён болей жыве ў другой жанчыны, Чэся нікому яшчэ не гаварыла. Часта вецер уздымаўся нанач, грукаў, будзіў, яна ўставала і спрасонку ішла... да дзвярэй. Схамянуўшыся, падыходзіла да акна. Далёка ўнізе бакенамі свяціліся рэдкія агні горада, глыбокай плыняй чарнела Кальварыя, буяла цемра могілак. Неба нізка нахілялася, як над вадой. Выдавалася, няма куды саступіць нагой, ніколі не сысці з гэтай стромкай вышыні.

– Пасля ўчарашняга, баюся, Жэня можа і не прыйсці... – спавядалася Ірына. – Учора мы з мужам былі ў гасцях,

у Курловічаў. Ужо селі за стол, як раптам заходзіць ён з жонкай. Аказалася, яны таксама былі запрошаны... Уяўляеш: мы сядзелі з ёй якраз насупраць... я так прагна разглядала яе, як ніколі... Такая швэдра на ёй, чорная, каўнерык з люрыксам, карацей кажучы, – даўнейшым строем, напятая швэдра, як панчоха, жывот не схаваеш... Мне хацелася крычаць: глядзі на мяне, якая я!.. Ён павінен быў за табой мяне пакахаць! Павінен!.. Мне і раней карцела пабачыць яе, паказацца ёй... Яна ведае пра нашу сувязь...

Чэся ніколі яшчэ не бачыла маладую сяброўку такой узрушанай. Тая, як не аберуч, несла высока перад сабой сваю прыгажосць. Маўляў, глядзіце на яе, яна прыгожая, маладая, усім падабаецца, усе любуюцца ёю, як на партрэце, на выставе! Любуйцеся, яна дазваляе! Што, хіба хто-небудзь з вас адважыцца за гэта даць ёй, па простаму кажучы, па мордзе?!. Непазбежна тое, што ён закахаўся! Вы не здолееце яе за гэта абразіць!.. І чуўся іншы голас, ціхі, малітоўны, каб нехта з людзей ці з багоў усё-ткі жорстка апраўдаў яе побач з немаладой, у чорнай нямоднай швэдры жонкай мастака. І дараваў ёй.

– Не, я праўду не скажу: прыгожая яна ці не... Іншы раз раптам бачу: такая яна ядраная, шыя высокая, белая. Сядзіць, і такі спакой у сініх вачах, што хоць ты каменем кінь, як у ваду, каб узрушыць...

Зноў грукнула фортка. Чэся рэзка паднялася, абы хутчэй схаваць ад Ірыны сваю роспач.

Ці ведае яна, што такое пусты дом?.. Вось прыйшоў муж, і дзень і два дома, – усё як звычайна. Раптам – тэлефонны званок. Ён збіраецца, ідзе да дзвярэй. І сама пачынаеш мітусіцца, спяшацца, быццам і табе трэба ісці, з'ехаць з гэтага месца, адкуль увесь час з'язджаюць. Калываецца тут усё пад нагамі, як на плывуне, трэба саскочыць на цвёрдае. Яе зацягвае, засмоктвае ветрам у ягоную дарогу. Але яна застаецца. Яна проста не паспее сабрацца. У што і як загарнуць гэты дзевяціпавярховы дом на гары, дом на дваіх – старую хрушчоўскую шпакоўню? Яшчэ чувацца скрозь у пакоях, б'юцца птушкамі ў вокны крыкі, воклічы галасоў, гірляндамі, рознакаляровымі стужкамі звісаюць, уюцца іхнія доўгія згодныя размовы па начах. Не пераступіць, не зачыніць за сабой дзверы, колькі тут сяброўскай споркі! Як усё гэта забраць, нічога не пакінуць? Нават зямля,

стары патрушчаны асфальт, як грыбніца, свяшчэннае месца, на якім родзіць шчасце...

Пайшоў... Раптам здрадзілі рэчы, адчужана, недарэчна пастаўшы адзін каля аднаго. Яна яшчэ тады не разумела, што ўвайшла ў адзіноту, як у зусім іншы, незнаёмы дагэтуль пакой. Час цёк без напрамку, так ідзе па гарачым пыле дажджавы паток, іртутнымі кроплямі скурчваецца вада і знікае, толькі ззаду — крохкі след сухой ручаіны. Ля парога наўмысна не прыбірала ягоныя хатнія пантоплі, каб заставаўся ў доме свежы, будзённы знак прысутнасці. Даражыла менавіта будзённым, непрыкметным, тым, што дзень у дзень, як няспынны ход гадзінніка. Прыйшоў... Пужалася самой сябе, калі раптам пачынала настойліва, раздражнёна дапытвацца ў яго: «Дзе мой грэбень? Ён жа тут заўсёды ляжаў!..» Ужо падсвядома ўзнікала звычка адзінокага жытла, дзе ўсё на тваім воку, адзіным парадкам і непарушнае. Губляліся, як кажуць, навыкі хадзіць у парцы. У прыпадку горычы хацелася скінуць з сябе, як аброць, гэтую сувязь, залежнасць адзін ад аднаго... На лесвіцы па сходках ішла старая жанчына, кіем далёка занесла, аж ёй пад ногі. Божа! Колькі ў доме старых адзінокіх жанчын! Ніколі раней не заўважала, не чула, не разумела іхнія думкі. Яны павольна соваліся ўздоўж высокага дома, асядалі на лаўках каля пад'езда і, выдавалася, нерухома, сведкамі глядзелі на яе, у вочы, маўляў, ведаем, усё ведаем — і ты ўжо тут адна. У цёмнай адзежы, кружанялі вакол зграямі, на ноч, пэўна, усе разам падымаліся пад самы дах.

Вечарам яна падсоўвала да канапы, на якой спала, вялікае старое крэсла. Каб толькі што-небудзь было побач, блізка. Яно нерухомай сядзелкай начавала каля яе з дня ў дзень. Раней ёй здавалася, што адзіноту адчуваюць, пужаюцца яе толькі слабыя, бездапаможныя людзі. Цяпер Чэся разумела, што гэта такое: быццам у дом без дазволу зайшла, жыве старая набожная жабрачка, увесь час жаліцца, шкадуе сябе. І сваё жыццё, успаміны раптам выдаліся побач з ёй таксама ўбогімі, бы й табе разам з ёй нехта змілаваўся, паклаў у руку. І горыч неспадзяваная, што меней, бядней падарылі, чым тваім сяброўкам — не жыццё, а посны праснак. Непрыхілкія рэчы ў доме, чужы горад, на ўсё вакол адкінулася непамерна вялікая мужава цень здрады. Нехта ноччу, як на тое, падпілаваў пад вокнамі

маладыя таполі, яны доўга ляжалі непрыбранымі, як бязродныя ў труперні.. Усё наганяла жалю... Яна ведала: не, нельга па жывым чалавеку так труднаваць...

Ірына заклапочана хадзіла па пакоі, мяркуючы, дзе б лепей паставіць кветкі. Спынялася то каля камода, то каля пісьмовага стала. З суседняй кватэры данесліся гукі фартэпіяна.

– Мы з Жэнем неяк на нядзелі былі ў філармоніі, слухалі Моцарта... Такое, скажу, задавальненне...

– Вы ўжо адкрыта ходзіце ўдвух? У філармоніі шмат нашых агульных знаёмых... Надта віднае месца... Скажуць ягонай жонцы...

– Пра такое звычайна ў вочы не гаворыцца... Паміж сабой перабяруць і кінуць...

Маўляў, рэдка да жонак даходзіць праўда, толькі ворагі адважацца данесці, ці варта катораму чалавеку мяшацца ў чужую сям'ю. І ўсё гэта Ірына гаварыла шчырым, амаль дзіцячым голасам, як дзяўчо, абсыпаўшыся буйным вясновым рабацінем, бы толькі што была нізка нахіліўшыся пад кветкамі, падняла твар, запэцканы пылком. Адкуль у яе, маладой жанчыны, такі жорсткі вопыт? Чэсі выдаваўся доўгі, маўклівы, як калідор, шлях, скрозь натоўпы людзей, скрозь дрэвы – усе ў змове. І Ірына з Жэнем ідуць па ім поруч, моўчкі. Але варта толькі палюбоўнікам знікнуць з вачэй, як адразу ўслед адчыняліся вокны, шумела лісце, краталіся, кідаліся ў гаворку людзі...

Па такім самым маўклівым калідоры, пэўна, і яна сама ходзіць амаль нічога не ведаючы ад людзей пра мужа, пра ягоную каханку. Казалі, вельмі маладая... Хутка павінен зноў прыйсці дамоў... Яна падасць, як заўсёды, яму свежую бялізну, выжме кашулю, усё перамые лёгка, без дасады, быццам здыме пот з ягонага гарачага ілба. І адчуе сябе найбліжэй да яго за ўсіх.

– Не дзівіся, але больш не хачу хаваць сваё каханне, як нешта крадзенае... Нядаўна было, убачыла: ён стаіць з жонкай каля машыны, пэўна, толькі з дачы вярнуліся, слоікі памідораў у руках... Сваячка з імі разам... Такая ўжо сямейная ідылія... Што мне рабіць? Падышла да іх і давай гаварыць з Жэнем... пра палітыку. Няхай усе бачаць: гэта вельмі й вельмі маё!

Няўжо Ірына ўвайшла ў правы, жорсткія правы законнай палюбоўніцы? І чым болей перашкод, тым весялей яна

рызыкуе, амаль адчуваючы патрэбу пераадольвання, як у спорце? Пярэчыць Ірыне, павучаць? У яе становішчы? Чэся маўчала.

Госця заспяшалася, хутка пайшла, маладая, уся ў белым, недаткняльная. Як толькі зачыніліся дзверы, Чэсю ахапіла невядомае дагэтуль пачуццё ўзрушанасці, нават цуд, быццам свежы вецер сарваў на людзях з ейнай сівой галавы хустку. Кідалася па пакоях, сілілася нешта сабе, як нямко, растлумачыць. Хацелася кінуць гэты калавур у высокім доме на пагорку, як на маяку, уціснуцца ў жыццё, бы ў лясны гушчар, з Ірынінай блытанінай, суперніцтвам, спрэчкамі, выперадкамі, смехам, сварай... І каб з кветкамі ў руках... Свежы вецер у пакоях расчыняў шафу з нямодным адзеннем жанчыны, якая прыняла сваю сталасць дасціпна, пакорна, бы пострыг у манашкі. Не хапала толькі, каб ляснуў першы пярун і вясновая навальніца, разбіўшы падвойнае шкло на акне, вынесла з дому праз парог зімовую шуму.

Нарэшце Чэся зразумела, што мае нешта пільна зрабіць — і старанна працерла ў пакоях люстэркі. Супакоіўшыся, падышла да акна. Вакол ляжаў снег, на пагорку ён заўсёды як свежы, бо тут намнога халадней, чым унізе, на вуліцах. І нават калі ўдзень крыху раставала пад нагамі, то за ноч лужыны высмагалі, заставаліся адны пустыя сподачкі. На кроне старой яблыні гойдаліся, галёкалі малыя дзеці, яны заўсёда асядаюць на ёй перад самым прылётам птушак. Ужо ружавела, цвіла кара на вербах. Яна адчувала цеснату дрэў у скверы насупраць, быццам расхінала іх сваім плячом, стоячы разам. Ужо вечар спускаўся да людзей з неспадзявана галубовымі крыламі, праседзеўшы ў чаканні ўвесь дзень на правадах чыста белым галубком.

Вакол панавала вясна чакання.

ХАННА МУРЗА

Уставала раніца. Праз летнія ейныя ўборы ўжо віднеліся ў вялікіх вокнах натоўпы дрэў. Яны падыходзілі да дому

з цемры, іх большала ўвачавідкі. Ужо можна і начное святло выключаць. Стаяў на верандзе засланы стол. Сёстры то разам, то паасобку садзіліся да яго, быццам спрабавалі снедаць, гаварылі ціхімі ранішнімі галасамі. Уставалі, хадзілі круга, па пакоях, і зноў вярталіся, і зноў аб тым самым гаворка: «...Разумееш, я б цяперака любыя роды прыняла... Жарт, ножкамі двое ішло, я так спужалася, каб ты не закрычала на мяне... Марта сама ўжо вымаглася, не мінулі б асфіпсіі... Ледзь знайшла простыя ніткі для пупавіны...»

Нешта ўсё свежае бралася ў рукі з халадзільніка, стол быў ужо застаўлены, бы ў доме поўна гасцей. Праз ноч едуць сюды, ідуць, стаяць пад вокнамі з нейкай вялікай урачыстай нагоды, ціха частуюцца, як у адведзінах. Доўга са стала ніхто не прымае, быццам яшчэ не ўсе дасталіся, хто меўся быць.

Сёстры вярталіся да Марты. Сучка са шчанюкамі ляжала на баку, падымала галаву, глядзела на сваіх гаспадынь вільготным, мігатлівым позіркам, як з зорнага неба пасля доўгага дажджу. Плюшчылася, ківала прывітальна аднымі вейкамі. Яшчэ футра на ёй скамечана, ускінута абы-як, бы з чужога пляча. Шчаняты краталіся, згубіўшы сіську, ці ў сне, запаволена пластаваўся каторы ўсім цельцам, цесна адзін каля аднаго, як у мацярынскім лоне, у водах каляплодных. Старэйшая сястра садзілася на падлогу крыху наводдаль ад іх, яе клікалі іншы раз, злаваліся, яна не азывалася. Магнэзам вабіла ўбіраць у сябе вачыма невідоныя дагэтуль чыстыя, свежыя фарбы, адценні, блікі на поўсці нованароджаных — так зіхацяць раніцай першыя кветкі анемонаў. Любавалася і несвядома для самой сябе ўжо бараніла іх зрокам ад едкага з дымам лясных пажараў паветра, ад сонца вісакоснага лета, атручанай ежы й чужых людзей. Як замаўляла. Як ведала, што знікне хутка маціцовы бляск на пысе і вушках у Мірты й Макуша, бы на створках выкінутай нагой з вады, расчыненай перлавіцы. Ханна Мурза згубіць цёмную праз усю спіну воўчую дзягу. Памяльчэе глыбіня чорнага колеру ў Марцініка і Мальты. Кожны з пяцёх ужо меў імя.

Дом адмяніўся. Не гулялі, не стукалі скразнякі — малым зашкодзіць, марфенамі распаўсюджваўся па пакоях ледзь улоўны, можа, улоўны толькі зверам і жанчынай, малодзіўны пах малой істоты.

— А можна паглядзець? — пыталіся дзеці каля веснічак, даведаўшыся, што Марта прывялася.

— Не, яны яшчэ сляпыя...

— Што, хіба шчанюкі нараджаюцца... у акулярах?!.

Сёстры смяюцца надзіва шчырымі моцнымі галасамі, як дзеці, раз-пораз успамінаюць пра акуляры — і зноў у смех. І нават ноччу зусім накшы дом, ледзь пазнаеш, што гэта з кошыка: «У-у-оў-у! У-у-оў!» Коратка так, патрабавальна, як на калавуры каторы, нехта самы пільны шчанюк правяраў, ці спіць чалавек. Кошык стаяў, вядома, у пакоі старэйшай.

Раптам пачула — кугае сава, дзіцячым голасам, зусім блізка. Нейкая трывожная начная зверка. Хацелася ўскочыць, праверыць пакоі, усіх, хто спіць: ці ўсё добра ў доме і ў свеце з блізкімі людзьмі. І не адважвалася падысці да акна: можа, можна прыкінуцца, не прызнацца, што чуеш, што табе крычыць, табе варожыць. Абхінулася вялікай хусткай, пайшла з хаты. Поўня гуляла па небе сярод маціцовых кучаравых воблакаў, бы на пагорку па яблыневым садзе ў кветках. На зямлі пахла дымам, каторы дзень гарэў лес у Наваселлі, аўтобусам, казалі, не праехаць. І ніхто ж не гасіць. Абышла круга, падняла свой згублены пасак ад начной кашулі, схамянулася, здзівіўшыся, што доўга ходзіць. Зачапіла куст напёрстаўкі, чувалася ўначы, як сыпалася насенне, бы з сухой жмені — расы ані кроплі, стаялі адныя гарачыя дні.

Назаўтра, казалі ў вёсцы, загарэўся лес, і гэта каля Лісаўшчыны, зусім побач. Сава ж ведала, будзіла ноччу. Выдавалася, вось-вось з'явіцца на парозе дрэва, ахопленае жахам. Спуджаная птушка каля Белага поля, дзе цвіла дзяцельніца, доўга кружаняла над гняздом, пятля за пятлёй, бы на некалькі вузлоў па-вясковаму завязвала сваё жытло, адлятала не адразу. Пахла ўжо яловым гарам, смаляком на распалку. Марта трывожна кідалася, брахала без дай прычыны.

Шчаняты ўжо адкрылі вочы. А першая ад усіх — Мірта. Што б ні рабіла: ловіць, гуляючы, хвост, смакуе нешта на зуб — вочы з цябе не зводзіць, быццам усё гэта знарок, наўмысна, каб гаспадыню забавіць. Усе спяць, а яна ляжа паверх іх і глядзіць, стоіўшыся. То загаралася, то гасла святло трохстворчатага акна. Змрок хаваўся ў поўсці авячча скур на сценах. Пад столлю нізка, як у чыіхсьці далонях трымалася, свяцілася скрозь

пальцы гліняная люстра. Ляжалі, можа, ад вясны, не меней, зложаныя дровы ў каміне, накуця вісеў сухі вехаць заламаных у полі зёлак, жменя багунніку. Сюды не заходзіў пражаны дух сонца, пахла нагрэтай імшарай. Апаўдні маленькі вітражык на фотцы пэцкаў бляклы твар гаспадыні рознымі фарбамі, тады яна выглядала маладой свавольнай дзікункай, зачыненай у чужым доме... Злавіла сябе ў люстэрку, засмяялася, агледзелася — гэта ж вось такім шчанюкі будуць разумець сабе свой дом?!. І няўцемна выйшла ў сад, прынесла ў пакой букет рутбекіяў. Цалавала толькі што расплюшчаныя вочкі кожнаму, прычашчаючы да радаснага, ласкавага жыцця навокал, якое сама адчувала амаль вуснамі. Малодшая сястра блыталася, замінала рукам, закідвала чорныя валасы за плечы, падбягаючы да кошыка, каб нізка нахіліцца да іх тварам — усім чыста. Макуш самы калматы, круглыя вочы блізка каля носа, рыхтык — белае медзведзяня! Кінецца на падлогу ніцма, бы ўпаў, а каб ямчэй улегчыся, з нейкай проста асалодай крутанецца яшчэ на ляту, хваляй віхнецца, сышоўшы крывулькай на канцы хваста. Дзяркаты Марцінік — той, выйшаўшы з каша, сядзіць ціха, капешачкай, а варта вярнуцца з прагулянкі ў гняздо, чэпіцца да кожнага, ходзіць узалапкі. І ўсё — каб пасярэдзіне, каб цесна было, тады не здагадацца, хто каго ўварваў за хвост ці вуха, любіць цесную гульню-бойку. Мальта трымалася асобна, без даверу ішла на рукі, пужаючыся вышыні, чаплялася кіпцюрамі за адзежу, бы седзючы на дрэве.

Пятае рудое шчаня бянтэжыла сясцёр ад самай першай хвіліны свайго з'яўлення. Так звычайна глядзіш на парадны партрэт дзіцяці, каралевы ці герцагіні, прыбраны па-жаноцку ў багатае, складанага строю, адзенне, уладарнай рукой адхіленае ад чалавечага роду, яно ўжо адчувае сябе выбранніцай. Тут жа рука была ласкавая, мацярынская, — самой прыроды. Яшчэ закрытыя вочы шчанюка абведзены да вушка танюткім пэндзалем. Сурмяныя малёўкі йгралі блікамі, выдавалася, што на яго аднекуль увесь час падала святло. На ілбе высвечана — высокая пярына, дзеля прыгажосці, як на шапцы татарскага хана. Па спіне цягнуўся сурмяны пасак. Шчаня было пазначана, пэўна, успомнілася тут далёкае сваяцтва, далёкая знаць сабачай пароды, адным словам, воўчы акрас. Ханна Мурза не надта любіла гуляць, непрыхілкая, ласку прымала стрымана,

бянтэжылася, расчулена пакусваючы лапу. Возьмеш на рукі, неспадзявана аслабне, абмякне, ніводнай костачкі.

Ужо яны гуляюць па пакоі не ўразброд, зграяй, пільнуюцца адзін аднаго, нячутна лётаюць за гаспадыняй, як матылі, толькі вушы ветраюць. Ужо сёстры выносяць кош у сад, самі, выцягнуўшы ногі, садзяцца на траву. Забывалася на тое, што пахне гарам, што ўсё лета стаіць спякота, вылінялі фарбы, усё вакол высвечана да стрыжня, да слепаты, танюткае, босыя ногі, рукі, як сцябло, дрэвы, травы – усё белае на белым сонцы.

Дом стаяў крыху наводдаль, звонку быццам і новы – жоўтая шалёўка, вялікія вокны – а сам прысадзісты, па-дзядоўску ўседзючкі месціцца каля самага лесу, бо на старым падмурку. Тут будзіць гаспадыню не матка і не бацька – падымае сонца. Раніцай гукаюць адзін да аднаго лясныя галубы. Галасы глухія, нетутэйшыя, і лес дзічае ад іх: вузламі звязваецца над чалавечым следам трава, захінаючы свежыя сцежкі. Птушкі пырхаюць так блізка, аж рукавом захінаешся. Знерухомееш, бы ў даўнейшым лесе-гнездзішчы. Старэйшая любіла снедаць асобна, каб яшчэ ні з кім не прамовіць і слова, не словам пранашчыцца – хлебам. Адчыніць акно – за сталом адны галасы птушак і шэпт дрэў. Тут рэдка апранаюцца ў святочнае, можа, толькі дзеля гасцей, бо любяць, каб адразу ў работу. Скаціцца з ганка гарашыной, блізенька да зямлі й не баяцца запэцкацца. Толькі апоўдні атрэсці падол у баразне, адазвацца даўкім ад стомы голасам. Тут перашываліся леташнія сукенкі, гаспадыні пільнаваліся сучасных строяў, але абавязкова, каб шырокія, на какетцы, абы цела халадала, як у цяньку. А калі ўжо каторай пашэнціць выкленчыць у сяброўкі вынашаную матчыну сукенку з крэпдэшыну, перабіралася кожнае вочка, цыравалася, дзіркаватае сціналася ў зборачку, каб спажыць сабе хоць полачку, хоць шкуток. Старэйшай падабаліся халодныя, празрыстыя ўборы. «...І ваду любіш... упэўнена, што ты па гараскопу Рак...» – гаварыла ёй малодшая, абедзве не ведалі дня, года свайго нараджэння, трапіўшы зусім малымі ў дзіцячы прыёмнік. Тут увечары не запіналіся фіранкамі вокны, як не зачыняліся з пакоя ў пакой і дзверы. Каб анідзе табе ні клямкі, ні засуўня, аніякіх перашкод перад вачыма. Вось сонца села, але нехта яшчэ ішоў, спяшаючыся, бокам лесу з свечкай, захінаючы рукой святло.

І знік. І ўсё на момант, як спужаўшыся цемры, панікла, сцішылася. Адна такая хвіліна перад ноччу. Апошні раз высока пад столь гойкнула зыбаўка – засынае, усхліпнуўшы, як дзіця, змораны спёкай, чадам, летні дзень. Тут зрэдку вячэралі каля распаленага каміна. Тады падавала на стол малодшая. Бліскі агню пырхалі ў ейных яшчэ цямнейшых напроці ночы валасах, таямніча стаялі ззаду, краталіся каля сцяны іхнія цені. Каторы год запар прыязджаў да старэйшай знаёмы геолаг, прывозіў торт, невыводная звычка развядзёніка хадзіць у госці па-сямейнаму. Садзіўся і амаль увесь той торт і з'ядаў, бо надта любіў салодкае, саладзіў кашу і нават рыбную кансерву. Сёстры хадзілі каля стала, можа, і спрытней, можа, і лягчэй, далікатна падтрымліваючы ягоныя спадзяванні, як вясковую гульню ці забаўку. Яго прасілі спілаваць сухі сук на яблыні, перавесіць люстру ў пакоі. І ён зноў ехаў дамоў. Што зробіш, каханне ўжо было спазнана. Як розум адымала, калі ўбачыла тады вясной квітнеючае дрэўца. Нават старая ігруша, седзючы каля дому, нявесцілася, спраўляла вяселле, якраз тая пара, калі неспадзявана атрымала вестку пра жаніцьбу свайго чалавека... Па начах тут сніўся кожнай адзін і той жа самы страшны, як яны называлі, сон. Быццам, зноў дзіцячы дом, у цесны пакой уносяць яшчэ адзін жалезны ложак. Скрозь ложкі. Ты чамусьці бачыш усё гэта зверху, па-птушынаму зняможана шукаеш сабе месца, куток набаку ці каля сцяны, каб хаця спіну абараніць ад чаплістага, здзічэлага ў сіроцтве позірка. І не знаходзіш, усё пазаймана – твой ложак пад белай капай пасярэдзіне, як на віры...

У гэтым маленькім доме, як той казаў, храме быцця, усё лета шчодра маліліся, каб нагнала хмару. Нават вярнуўшыся з малін, забываешся на момант, што рукі, ногі апечаны крапівой, выдавалася, гэта сячэ, нарэшце, дробны, калючы дождж. Сёстры будавалі дом самі, адрамантаваўшы старую сялянскую хату, і пільна вартавалі ўсіх, хто сяліўся побач: ластаўчына гняздо, шпакоў, нават злодзейку сароку на дзічцы. І кветкі, тут кожная кветка дабывала да пары, красавала на сваім карані, спяліла семя. Першыя гады ніхто не рваў іх на букеты, і цяпер толькі калі зрэдку. Зачынялі дом позняй восенню, ехалі ў сваю гарадскую кватэру.

А шчанюкі ўжо селі на парозе.

Калі ў вырай, гэта, быццам, звыкла, гэта зразумела, а тут... да чужых людзей? З дому?!. Першай адчула незразумелую дагэтуль трывогу старэйшая. На момант спыніўся позірк, быццам трымала перад сабой, падняўшы з зямлі, зрубленую людзьмі старадаўнюю грамату на бяросце, звестку, з першых рук самага дамавітага на свеце чалавека, стваральніка храма быцця: дом павінен быць повен гукамі, нямымі галасамі малых істот, а падол гаспадыні хай топчуць дзеці... Горача. Прыскам вылятаюць з-пад страхі над ганкам чорныя восы. Недзе блізка шугае шаламя, ідзе да галубінага лесу. Нехта ж запаліў. Нехта кідае і кідае ламачча ў раку. То спіхне старое кола з пагорка, то дзіравы кацёл, прэнт, абы з свайго двара, абы далоў з вачэй. Бяжыць тая рака басанож па жалеззі з халоднай стронгай у плыткіх кішэнях затокаў, шукаючы па свеце чысты прытулак далёка ад вёскі. Суседзі, сама бачыла, сякуць трускам маладыя арабіны, не збіраючыся доўга жыць... Каму з іх аддаць шчанюка? Хто будзе надта даглядаць, пільнавацца? А ў горадзе хіба лепей?

— Ты калі-небудзь бачыла аб'яву ў «Вячэрнім Мінску», каб шукалі згубленага дварняка? — дапытвалася ў малодшай.

Тая маўчала. Так, амаль на кожным двары ў горадзе сустрэнеш беспароднага сабаку: выбракавалі, выгналі або звычайна не дагледзелі і не вельмі турбаваліся, каб знайсці.

— Надта шчыруеш... у цябе размыта граніца паміж чалавекам і... жывёлай, — спрабавала ўсміхнуцца малодшая.

— Пачакай, ты не разумееш... Неяк зімой бачыла бяздомную сучку з двума шчанюкамі. Яна ішла па снезе, ні на кога не звяртаючы ўвагі, нізка апусціўшы галаву, шукала ежу, зазірала ў пусты чалавечы след... Ішла роўна, не збочваючы, яе пільнаваў, вёў на повадзе голад... Ты не памятаеш, цябе мама несла на руках, мы йшлі некуды, без напрамку, як ходзяць па свеце жабракі... галодныя... сібірскія маразы. Заначавалі, забіўшыся ў чужы хлеў, сытна пахла саломай, моцным кароўскім духам, з храп ішла пара. Я, пэўна, па-звярынаму чула пах ейных гарачых, як варыва, вантробаў... Цемра звісала адусюль космамі поўсці, быццам сядзіш пад падбрушшам... Морыць сон, бы ты ўжо і павячэраўшы... І зноў — дарога, вочы долу, уніклива, каб падняць што-небудзь з'есці. Да людзей не прасіліся, людзі ссыльных не пускалі... А як у хлеў зачынены трапілі, хіба,

па-воўчы страху дзёрлі, пачуўшы жывёльнае цяпло?.. І цяпер я ступаю ў хлеў, як у боскія сені... І цяпер люблю раптам, як прыпадак, збедніўшыся знайсці капейку... адчуць тую радасць ссыльнога дзіцяці, асалоду ахвяры... Люблю перайначыць чужыя сукенкі...

— Абавязкова, каб у кветкі, празрыстыя, бляклыя, бы пялёсткі сібірскай шыпшыны... — па-змоўніцку дабавіла малодшая.

Хто гэта зразумее, акрамя выбракаванага чалавекам дварняка?..

Згортваўся ў камячок яшчэ зялёны ліст на дрэве. Птушкі не памяталі дажджу, ягоных шляхоў, ходак, будавалі гнёзды ў вадасцёкавых конаўках, выводзілі птушанят. Іх потым, малых, бездапаможных, змывала. Празрыстыя цельцы, свяцілася наскрозь блакітным загубленая душа. Насцярожвае ў лесе нават сухі трэск страказінага скрылля, усё выдаецца, ляціць угору ад вялікага вогнішча, лопаецца, пырскае дробнае сучча. Выцягнулі з ямы, некім выкапанай на дзіка, ледзь жывога вожыка. Не прыходзіць болей, казалі, на суседні хутар лось, недзе, пэўна, ужо ўлажылі ягоную прыгожую галаву, закідаўшы ад лесніка ломам. Усюды, як на тое, дурныя знакі нічогага чалавека, быццам ён, гэты чалавек, і не тутэйшы, і наогул — не жылец. Сядзіць старая суседка на панадворку, лушчыць фасолю:

— А ці будзе яна мець для жызні на лета ўсё патрэбнае? — пытаецца ў Бога. — Не паравое, не набрала сабе сілы зерне...

Старэйшая, дабраўшы часу, садзілася за стол і пісала суправадзілаўкі кожнаму шчанюку, ужо былі напытаўшы людзей, якія возьмуць гадаваць. «Марцінік нарадзіўся ў 4 гадзіны раніцы 17 ліпеня»... Чым карміць, як даглядаць, лячыць, калі захварэе, характар... Каб знайсці такую паперыну аб сабе, ездзіла неяк у Сібір, падымала дакументы, — і следу няма... сярод людзей... Сама сваёй рукой (рука, ведала, лёгкая) брала шчанюка з кошыка, каб замовіць, загадаць на добры лёс, адхінуўшы малога ад дому, дзе нарадзіўся. Яшчэ ўчора:

«Марцік, слухайся, каб цябе там ніхто не біў, не наказваў...» І ў слёзы, як не ўголас, хаваючыся адна ад адной, стыдаючыся. І сёння:

«Ты едзеш... да сябе дамоў...» Сказала і адхілілася ўбок, каб не сцебанула па вачах, бы йдучы за некім ззаду па гушчары.

Каб аддаць не шкадуючы. Божа, а нялюдскае, ну якая тут жальба, добрых гаспадароў знайшлі, ды й сярод сваіх знаёмых!.

Тут не любілі адлучацца ад дому, не любілі й адлучаць. Забралі Мальту і Макуша. Аддаўшы Мірту, старэйшая хадзіла ад сцяны да сцяны, дом расхістала, быццам ірваліся путы пачуццяў, якія звязваюць з сусветам. «Як ціха навокал, ці я памерла ўжо?» – падумалася.

– Хопіць, я зачыняю гэты дзетпрыёмнік! Ханна Мурза застаецца!

– Як ты будзеш весціся з імі па горадзе – кожны ў розныя бакі?!. А выгульваць? Адныя мэнкі!.. Людзі падумаюць: ідзеш раніцай з начной варты!.. А ездзіць сюды ў набітым аўтобусе? у нас жа няма машыны!.. – спужалася малодшая, і было чаго, халадамі яны жылі ў гарадской хрушчоўцы, наведвалі вёску толькі па суботах.

– Супакойцеся! Гэта проста... паталогія... трымаць двух сабак! – не разгубіўшыся, зазначыла знаёмая ўрач з суседняга хутара.

Каб не пасварыцца, старэйшая звычайна выходзіла з дому, ішла да ракі. Вада загусла ад гарачыні, рака быццам не давала сабе ходу, стаяла на месцы. Пасадзілі былі на тым голым беразе вярбу – не ўседзела, выцягнулі, заламалі на дубцы, праганяючы кароў на выган. Мільгануў у траве нехта ў галубовым – калыхалася, уратаваўшыся каля самай вады, высокая сінюха. Побач у кустах круцілі ручку прыёмніка. Зноў пра тэракты ў Ізраілі, у Таджыкістане, у Гаграх. Ваююць, змагаюцца... за што? Няма на свеце такой прычыны, каб хадзіць узакладкі з жыццём. Усё гэта ёй было падобна на жахлівую азартную гульню маладых мужчын, як карыда ці гонкі на аўтамабілях. Як толькі жанчына адважваецца пусціць на свет сваё дзіця?.. І яна павінна слухаць гэтых людзей, раіцца з імі пускаць шчанюка ці не?!. Сарвала ў садзе яблык, скура на ім нязвыкла цвёрдая. Усё жывое баранілася, хавалася ад пагібелі. Нават Ханна Мурза. Дзікая прывабная сіла заўсёды затрымлівала на ёй позірк даўжэй, чым на іншых.

Цела пруткае, не прытуліш да сябе, надта не прылашчыш. І вышыні не разумее, страху не баіцца, пырхне з рук неспадзявана, ледзь зловіш ужо ў паветры. Як з караня ўсё есь.

Ханна Мурза засталася. Сёстры дзівіліся самі сабе, што завуць яе, лашчаць тымі ж словамі, што і Марту. «Няўжо, нават сабаку магу любіць толькі аднаго?» — смяялася сама сабе старэйшая.

Яны абедзве былі адналюбамі.

Парадзеў дым, недзе спыніўся агонь. Пэўна, ластаўка без памяці нізка нахілілася над зямлёй, растапырыўшы скрылле каромыслам, насіла з ракі ваду.

Пэўна, спраўдзілася тое, што нават пярун не запаліць ТВОЙ ДОМ, калі побач пад страхой лесу жывуць галубы...

НА ЗЯЛЁНЫМ ЧАЎНЕ ХАРОНА

Хіба шчаслівае жыццё павінна канчацца смерцю?

Л. Галубовіч

Яшчэ, памятаецца, пазалетась ці што, трапіўшы на гэтую сцежку, Данута ўбачыла чалавечы след, здзівілася — чалавек тут хадзіў звярыным крокам. Вытаптана дзень у дзень, але бы за першым разам, нанова, і не думаючы вяртацца назад. Перак карчы, багністыя луміны, галлё нізкае па твары з расой, з дажджом, і ніводнага скранутага з месца сука, ніводнай заламанай ці адхінутай галіны — чутка, старожка ходзіць. Сцежка сырая, каля самай вады. Хіба што сцягвала чалавека плынь вады, як топельніка, на глыбейшае. «Дурны Імполік?!.» — і злякацца не паспела. Ледзь заўважыла, шэрым ценем ад дрэва зварухнуўся на ветры. Зімовая шапка сярод лета, у паліто. «Мяне нешта, во, сцюжа бярэ...» — сказаў, бы перапрошваючы за недарэчнасць свайго адзення. Адно імгненне — і зноў, як заўсёды, вочы без пагляду, невідушчыя, бы адкрытыя ў сне. І пайшоў, як па паветры, высока падымаючы ногі, адчуваючы перашкоду аднымі ступнямі. Як можна зноў патрапіць на ранейшае месца, калі не трымаеш у галаве аніякай здумкі, мэты.

Тады здагадаўшыся, што гэта Імполікава сцежка, ледзь не войкнула, бы ўступіўшы на гадыню. Трохі вышэй, па сушэй-

шым беразе сярод чорных ствалоў, хадзіла яна сама — ейны ўлюбёны шпацыр у часы адзіноты.

Але хіба сцежкі вар'ята і мастака не ідуць побач?..

Людзі казалі, сталася з ім, адняло розум пасля смерці маладой жонкі. Казалі, была звычайная жанчына, аніякай харашбы, дробненькая з твару, такіх, як гароху ў гарохаўі, жаніся другі раз, і трэці, маўляў, няма прычыны, от блазната, не болей. Ніхто не заўважаў іхняй вялікай любосці. Ніхто надта не суцяшаў, ніхто, хай сабе і моўчкі, не выслухаў, не выгарнуў з яго да сябе абедзьвума рукамі пад ногі ягоны сум, як жар, як пякотку. Не вывеў за руку з таго смяротнага шляху. Чалавек іншы раз не можа сам сысці з яго, збочыць. Імполік і ўдзень і ўночы, і год і два ўсё ішоў за жончынай труной, ззаду, дапытваючыся: навошта... куды дзелася... як без яе жыць... Старое паліто на ім — пала за палу, без кашулі, на голае цела, выгнілі гузікі. «Здраства і толькі вам...» — скажа пры сустрэчы. Натрапіцца якраз, ідзе праз вуліцу з агарода з рыдлёўкай у руцэ, крок падламаны, хісткі, паглядзіш услед — пуста вакол яго, ні людзей, ні скаціны, і паветра быццам няма. Шкляная пераборка, чалавек кратаўся за ёй злоўленай істотай, тая пустэльня навокал, у якой ужо не зробіш ад знямогі аніводнага пэўнага руху. Трапіўшы ў ягоную паветраную яму, сэрца на момант праваліцца, адчуўшы накшую вагу свайго цела. Разрэджаная прастора, зжыта вакол усё чалавечае, але надзіва не крануты, не скажоны вар'яцтвам твар: прыгожы, смуглявы не ад сонца, смуга і ў вачах, кучары густым сівым дымам. Казалі, бабка ягоная шляхцянка. Пэўна, у ім іграла перад зводам ейная апошняя кропля крыві, ашчадна захоўвалася фамільнае падабенства. Яшчэ вісела распяццем на сцяне бацькава скрыпка.

Паўзла праз парог трава ў хату.

Чалавек зламаўся, слабы, не пераадолеў страту, не адужаў, зганьбілі людзі. А што, калі яны самі проста не заходзяць да глыбіні ўсведамлення смерці, не пасцігаючы ўсяго жалю расстання. Спыняюцца, лечачыся часам, суцяшаюць сябе вечным жыццём, дзе яны яшчэ змогуць сустрэцца з роднай душой, убачыцца, пакорліва ссылаюцца на боскую волю. Абы толькі заціснуць рану, загаіць нясцерпнае. І з палёгкай вярнуцца да ранейшага жыцця, як з цяжкай дарогі: выпратаць у хаце, схаваць ад напамінку тое-сёе, плакаць няволле, бо пакойніку

будзе там мокра ляжаць... І жыць далей. Сама Данута нічым гэтым не ратавалася, пахаваўшы адзіную дарослую дачку.

Па нешта трэба было падняцца ў верхні пакой. Адчыніла дзверы – дыхнула сцятым паветрам, тым духам ад самага пачатку здарэння, калі бяда ўвайшла ў дом. Спынілася ў нерашучасці. Бы заспела тут згараванага чалавека, які седзячы задрамаў у крэсле, і прачнуўся, калі рыпнулі дзверы. І слёзы ягоныя яшчэ не высахлі. А яна глядзіць на гэты пакой, на чалавека ў крэсле неяк, бы збоку, – і адчула сваю здраду. Няўжо стала забывацца? Тут яшчэ не стаяць свежыя кветкі, яна прыносіць іх у пакоі без радасці, як пад прымусам. І наогул жыла па нечай чужой звычцы. Нешта перастаўляла, перабірала на пісьмовым стале, забыўшыся, па што сюды прыйшла. Траплялі на вочы запісы на кожны дзень. «Падняць з падполку драбіну, прасушыць ад зімы на сонцы... адрамантаваць вароцейкі ў лес». А вось рэцэпт: «...кожны агурок загарнуць у смуродзінавы ліст, усё перасыпаць астрагонам...» Такія будзённыя знакі, цяпер як улікі апазнання, што тут дагэтуль, да нядаўняга часу жыла зусім другая жанчына. Амаль бянтэжачыся, бы чужое без дазволу, разгарнула свой дзённік. «Хмарная раніца, і так да вечара, не згадаць, якая пара. І раптам на самым захадзе – сонца! Блізка пырхнула і знікла. Не пайдзі я гуляць з сабакам на пагорак, не знайшла б сённяшні дзень, маленькі, асенні, злоўленай жоўтай птушкай з маёй кішэні...» Шмат шчаслівых запісаў, без колераў смутку, без аднастайнасці будзённага. Почырк то дрыготкі, рабаціннем па вадзе, то буйны, круглявы, вінаградзінамі ад прыліву пачуццяў. У куфэрку рознакаляровыя стужкі, матузкі, рабыя каменьчыкі, пёрка птушынае – усё прыхавана любоўна, як нацельны амулет пад далоняй ад чужога вока.

І гэтым можна было цешыцца? Гэтым можна было жыць?.. Чым далей, тым асцярожней дакраналася да рэчаў, да рознай дробязі, пачуваючыся ў сваім доме пастаяльцам, які зняў чужое жытло, пэўней было сказаць, чалядніцай. Тут ёй ужо анічога не належала, анішто не супадала з ейным настроем. Іншы раз такая сцятасць, цесната, такая патрэба вярнуцца назад, да ранейшага жыцця, як у гадзіну скону, калі доўга пакутуе, паміраючы, вядзьмарка. Парушце столь! Адарвіце бэльку! Душа не можа сама адысці!..

Стук у акно ад панадворку. Яна ўскочыла, увесь час пільнуючыся бяды. Што ў каго здарылася, яшчэ ж добра і не развіднелася? Вось, выдавалася, нехта закрычыць на вуліцы, рвучы на сабе валасы.

– Імполік?!.

– Дайце закурыць...

Такой парой турбаваць людзей, злуецца яна.

– Хіба раніца? Каб я тое ведаў, не прыйшоў бы, – шчыра, памяркоўна гэтак гаворыць, маўляў, уважыў бы, а як жа.

Яна хавае сумную ўсмешку, забаўляючыся тым, як лёгка сама трапляе ў ягоную пустэльню, дзе скасаваны тычкі пазнатку на дзень, на пары году. Толькі, во, пільна ўспомніць, дзе хвілю назад пакінула свае цыгарэты, каб хутчэй развітацца з Імполікам. Вясной ён галадаваў. Па-воўчы шукаў сабе есці, рабіў патраву ў чалавечым статку. Да відніцы, крадучыся, абходзіў вёску: дзе што блага ляжыць, хто спіць, не зачыніўшыся. Яна сама яшчэ не клалася ад учарашняга.

Ноч была светлая, не хацелася нічога запальваць. Святло ад поўні ішло густым зеленькаватым патокам. У ім рухацца, хадзіць па доме лягчэй, бяздумней, бы па беразе страхі.

– Ты ўжо ўстала? – прачнуўся муж.

Даўно не заўважае ейнай адсутнасці, калі сядзіць побач, калі рукі знаходзяць ейнае цела. «Скажы мне што-небудзь...» – папросіць укленчыўшы. Словы кахання даўно выгнаны з ейных вуснаў, з ейнай мовы яшчэ напачатку замужжа... Вядомы хірург, у яго тэрміновая камандзіроўка па хуткай дапамозе, начным цягнікам. У Гародню. Поўнач... адна гадзіна... дзве з чвэрцю... дзве з паловай. Ёй крэўная патрэба суправаджаць яго ў думках, не спаць, нічога не рабіць, быццам таксама з ім у дарозе, патрэба ўвесь час трымаць ягоны шлях на памяці, нічым сабе не замінаючы. Аберагаць, ахоўваць, і тады з ім нічога не здарыцца... Ён – у Брэст.

«Бюро даведак? Скажыце, ці даляцеў самалёт да Брэста?» – пыталася ўслед, пужаючыся самой сябе. У адказ абыякавы механічны голас, якраз тое, што трэба, калі даюць збой нервы... Вяртаўся амаль заўсёды пазней, без папярэджання, пад прыгнётам ейнай штохвіліннай аховы, любові. Вадалей, пад легкадумным знакам паветра, аніводнай парушынкі ў вачах, што здрадзіў ёй, прыйшоўшы дадому ад каханкі. Сорамна

гаварыць да яго аб каханні, як брыдка было б, да прыкладу, адчуваць пажаданасць да хлопчыка з царкоўнага хору, у каторага яшчэ і пол не абазначыўся. Адчувала сябе намнога старэйшай у сваіх пачуццях. Вучылася кахаць украдаючыся, нябачна, як з атрутай, і сама ж атручвалася, любячы жыць усёй душой. Ужо яна і да акна не падыходзіць, калі ён ад'язджае. «Скажы мне што-небудзь...» Заўсёды запросіць нечакана, з той гаворкі, з таго даўнейшага, на самым кароткім пачатку. Яму патрэбна было ўпэўніцца ў ейным каханні. Яму патрэбна стаянка, пэўней кажучы, стойбішча, дзе заўсёды можна было б перачакаць непагадзь, свае любоўныя няўдачы, глынуць чыстай вады й зрэзаць заламаны капыт, і каб ніхто не дапытаўся, адкуль ён і куды зараз. Ніякавата адварочвалася, пераводзячы размову. А ён зноў стоцьма ляцеў у невядомым ёй напрамку, шаўковым ветрам абдымаў нечыя каленькі. Ён не ўмеў пакутаваць. Што яе цяпер з ім аб'ядноўвала? Адзін з нямногіх, а можа, адзіны, суседства якога раскрывала ейную асобу: прымушала ўвесь час напружана шукаць сілы, дабываць сэнс, перажываючы здраду, здзекі, нават натхненне. Умацоўвалася каля яго, як ля выбранага назаўсёды бажка, які пасылаў ёй усё новыя і новыя выпрабаванні. І не адчувала сябе пакутніцай. Менавіта бажок, жорсткі, таленавіты, не па-чалавечы заблізка да свайго сузор'я — супадала па гараскопу ўсё ягонае жыццё, і нават парадак і настрой дня.

Хіба па гэтым можна быць шчаслівай, каб не дачка... А ёй жа ўдавалася.

У хвіліны адчаю садзілася ў падараваную ім «Шкоду», ехала ў Мінск да найлепшай сяброўкі Алены, анідзе не збаўляла ход, не звяртаючыся на святлафоры. Пераступіўшы ейны парог, адчувала палёгку і ад самой дарогі, ад рызыкі быць затрыманай. Размова набывала вясёлы, бесклапотны характар пра літаратурныя навіны, моды, ні слова пра мужа... На хаўтурах дачкі Алена стаяла з ёй быццам побач. І адышла за парог разам з усімі, хто прыходзіў на пахаванне, разам са спачувальнай хваляй, не даючы ёй аніякага права папрасіць застацца. У мужа быў твар незаконна затрыманага на гэты раз злосніка, ён збіраўся ў тэрміновую камандзіроўку.

Якраз учора Алена наведалася з яшчэ адной сяброўкай. Учора быў не па-вясновому надта цёплы дзень. Алена ў сала-

мяным капелюшы, перавязаным каля брыля істужкай. Пагляд блізарукі, стойка збочаная, бы ўвесь час перад камерай, як манекеншчыца. Круглявы твар без адзінага следу жыцця. Падышла да вады, пачала мыцца. Мокрай даланёй па шчацэ да падбароддзя, ледзь дакранаючыся, бы амывала хрускі ружовы кітайскі ліхтар. Гэтыя сяброўкі толькі дзеля весялосці, яны, вядома, не да яе, а да той гаспадыні, што жыла раней.

Якая нярупная сёлетняя вясна, бавіцца недзе за гарамі, за марамі. Зязюля і тая кукуе нязвыкла блізка. Няўжо ў вёсцы? Сярод драўляных хат, хлявоў, платоў, гук азваўся ўжо і ў хаце. Як у пустым кубле – выбраны, спажыты за зіму крупы, зерне, мука, няшчыльна зачынена вечка ад мышэй, каб выветрыўся затхлы дух. Іншы раз яе спыняла знаёмая мелодыя, білася ў шкло, знікала. Толькі шоргат скрылля матыля, і на руках рознакаляровы пылок. Чым мацней веснавыя галасы, ярчэй краскі, тым мацней глухата, немагчымасць адазвацца, загаварыць. А кропля дажджу са страхі разбівалася аб камень, як вялікая шкляная пасудзіна. Няўпэўненымі крокамі па хаце, з хаты за парог. На панадворку, заціснуўшы маркоўнік, шчавук, узышла нізенькая трава, густая, донная. Доўга спалі зернюкі, чакаючы во такой маруднай вясны, і хутка закрасавалі. На ёй, па зялёным днішчы, зіхацелі ўпаўшымі зорамі кветкі маргарытак. І па межах, дзе было не ўзарана, скрозь. Не памятаецца, каб гэтак калі яшчэ цвілі.

Гойдаўся пад ёй дрыготкі зялёны човен Харона. Яшчэ самае разводдзе, вады ў рацэ за ноч пабольшала. На тым беразе стаіць наважаны ад учарашняга па каленькі ў вадзе нечы конь. Няўцямна ступіла на мост, мацае нагой, ці ён яшчэ прыбіты, ці ўжо гойдаецца, як плыт. Каламутная плынь накідваецца на вочы, падварочвае сэрца, увесь сыходзіш разам з ёй пад бярвенне. Конь застаўся на адным месцы, заграз, як тарантас, ледзь зрушыла. А што калі за гэты час знясе мост і яна не паспее вярнуцца? Толькі перайшла, насустрач Імполік, з вядром – куды і па што? Складаецца самае неверагоднае: «Пэўна, у маліны...» А ён:

– Што, у маліны хадзіла?

Гэтак мы думаем адзін аб адным. На момант аж у вочы ўесца, патыхне ад яго жывым, гадамі не змытым нацельным духам.

— Калі б не перайшла, я вядром бы раку вычарпаў! — крычыць наўздагон.

А што яму варта, царкву за вёскай ён ужо будуе, выкапаў цэлы кар'ер. Назад з лесу будзе несці адну, не болей, лясіну на дровы. Ніколі не запасіцца, каб і падкінуць у печ спатрэбілася, то зноў у лес пойдзе. З куста на панадворку вылецела птушка, юркнула за вугал, пэўна, чужая, хавалася ад дажджу, спяшалася ў сваё гняздо. Вільготна, холадна, сонца, як у печы, за заслонкай. «А што, калі не вярнуся назад... да ранейшага жыцця?..» Але яна не хоча супраціўляцца болю. Хто гэта казаў, маўляў, пасля музыкі, жывапісу, паэзіі — боль чацвёртае з мастацтваў. Мартын Вальзер? Хіба адзін чалавек мог зведаць усе шляхі чалавечага смутку?

Па нечыяй чужой звычцы ішла ў лес адразу за домам. Учора бачыла сляды дзіка, і сёння падрыта, зусім свежая ралля на дзірване. Калісьці любіла паспытаць той першародны страх перад другой дзікай істотай. Страх, гранічны з павагай да невядомага табе, страх, які звязвае тваю волю. Лес выдасца чужынцам, ніводнага знаёмага куста, ні сцежкі, дрэвы сышлі з месца, загарадзіліся, лес здзічэў. Ужо ён належыць толькі гэтаму зверу, быццам нарэшце вярнуўся сюды стары гаспадар і ўсё пераставіў, як мэблю, па-свойму. Толькі на першы момант. Потым страх асядае, як пад рукі вядуць цябе, знямоглага, сцішанага. Напоўніцу заглынеш ляснога духу. І слова лішняга не прамовіш. А іншы раз лес да цябе толькі што не гаворыць. Стоена чуеш яго свежы подых. Спакойна і ўтульна, бы мы нагаварыліся калісьці, склаўшы галовы, там, уверсе, даўно ведаем адзін аб адным усё патаемнае. Ступіўшы за ягоны парог, можна і не вітацца, бы жывеш тут разам заўсёды, і начуеш. Елкі тутака, як нідзе болей не бачыла, калісьці заламаныя бурай, разгаліноўваюцца на два вярхі, а то і на тры, стаяць кандэлябрамі, як у нетутэйшым палацы. Лес — палац. Туманы ад ракі заносяцца да самай высокай елкі на пагорку, дзе дарала б убачыць даўгі стол. Карункамі да долу, падзорам ветраніца дубраўная, скрозь шалупінне арэхаў, шышак пасля начнога балю.

— Белая пані! Маленькая пані ў белым! — крычаў неяк у гарачцы Імполік, летучы праз ноч да лесу.

Якраз у гэтым месцы ўзыходзіць поўня, падымаецца з-за столу паўначой, стросшы з пеляны шалупінне. Якраз самая

тая пара, калі мужчына можа ўбачыць, пазнаць у ёй на момант жанчыну, начную палюбоўніцу, таямнічую пані ў белым, якая зводзіць маладых і старых, вясёлых і засмучоных. «Я польскі кавалер...» — гаворыць сам да сябе Імполік, доўга ходзіць за агародамі, супакойваецца, склаўшы як нябожчык рукі ў рукавы паліто.

І зараз цвітуць анемоны — ветраніца дубраўная. Карчэўе, пні — скрозь адным бялюткім колерам. Чыстыя пялёсткі, без адцення, без пражылак. Абы прыгрэла сонца, ападуць на зямлю яшчэ да вечара з дзіцячым тварыкам. А ёй усё самота. Усё ёй часовае навокал, напамінак аб кароткім жыцці. Ніхто тут не сеяў, не даглядаў, не прыбіраў, нічога тут не належыць чалавеку. Уваходзіла ў квітнеючы вясновы лес, як у чужы сад. І пара ўжо вяртацца?!. Ейнае асабістае жыццё скараціласяда імгнення, дагэтуль быццам і не ўсведамляла сваёй смерці. Паветра вечнасці, вядома, надае гэтаму свету бясконцасць. Але яе не суцяшае магчымасць яшчэ аднаго жыцця. Яна сумуе па нязменнасці, па пастаянстве месца, вось гэтага, каля лесу, пастаянстве гэтаму дому, мужавай вернасці. Яна абцяжарана патрэбай пастаянства. Будаваць дом — назаўсёды, кахаць — назаўсёды, а не на нейкі тэрмін. Каб стукнуў па бервяне дома, казала суседка, то пэўна б кроў выступіла, гэтак цяжка мужык будаваўся, яго самога ўжо і на свеце няма. «А што, каб мы не сустрэліся?» — іншы раз дапытваўся ў Дануты муж. Яна ніколі не сумнявалася ў сваім выбары, давярала выпадку, любіла ўсёй душой, што толькі ёй ні траплялася, радасна абжывала самыя няўклюдныя куткі быцця. Шкатулкі з істужкамі, яркія пушачкі ад падарункаў, скарбонкі, напамінкі кожнага дня, бы пялёсткі калісьці падараваных кветак. Ніколі не здымала з рукі дарагі заручальны пярсцёнак, калі й рабіла чорную работу, сцёрся да срэбнай ніткі, вось-вось разломіцца, згубіцца. Адну такую палавінку, залатую, знайшла ў зямлі, калі толькі купілі гэтую сялібу. Дакранулася да далоні незнаёмай жанчыны, пераняўшы ад яе веравызначэнне — не разлучацца.

Неяк трапіўшы з дачкой на могілкі, хадзіла, разглядалася, шуткуючы, выбірала сабе месца. Каб на пагорку, каб сонца доўга не заходзіла, быццам з акна будзе ўсё гэта бачыць ці з высокага ганка. І раптам фотаздымак на помніку. Жанчына глядзела ў паўабарота, бы азірнуўшыся на яе, насміхалася

і страшыла, не падпускала блізка падысці занадта вясёлую, шчаслівую. Так, яна будзе жыць да глыбокай старасці, якая ўяўлялася таямніча. Як бывае ўлетку за вячэрнім чаем, на змроку, калі не хочацца запальваць святло. І толькі залатыя сполахі бліскавіцы на ўскраі неба, ледзь чутны гром далёкай навальніцы ўзбуджаюць дзіцячы страх, амаль тэатральна, лёгкай трывогай агучваюць ейнае вясёлае застолле.

Ёй наканавана іншае: знікнуць пахі, гукі, колеры, як пры канцы свету, яна будзе доўга-доўга плыць у зялёным чаўне на той бераг.

У вёсцы стаяў голас, аж у лесе чувалася. Людзі йшлі біць Імполіка, не вытрымліваючы выпрабавання, спасланага Богам. Дапільнаваўся-такі, калі суседка адвярнулася ад хаты, украў бутэльку гарэлкі. Сядзе іншы раз напроці, нерухомы, шэры, як воўк, вачэй не спускае з акна, пакуль агонь не пагасне. У адным канцы вёскі ўкрадзе, у другім пахваліцца ўдачай. Сама бачыла, як сёння нешта хаваў на дрывотні за суседскім хлевам. Хітра паходзіць некаторы час наводдаль з пустымі рукамі, каб трапіць каму-небудзь на вочы паражняком, і забраць крадзенае ўжо тады, калі сыдуць пошукі злодзея. Білі, паваліўшы на зямлю, палкамі, нагамі. Імполік бараніў рукамі твар, енчыў, не прызнаваўся. Білі за тое, што праз яго даверу не маюць адзін да аднаго, што трэба хату пільнаваць, думаючы на благое, а тут сяўба, тут касавіца, тут і жніво. Білі, каб не абсеў, не адужаў іх, старых, гэты малады дурань. Кідалася заўсёды бараніць, цяпер во не дабегла. Першымі за мужчын адваліліся ад яго бабы.

— Можа, і ўпраўду, не ён, — перагаворваліся на вуліцы астыглымі галасамі, маўляў, у вёсцы поўна алкаголікаў.

Няхай лепей сумняваюцца, думала сабе. Пра тое, пра сёе, і забыліся пра Імполіка. Стаялі, варажылі, ці прыляціць сёлета бусел на старое гняздо. Абшушкаўшыся, цёплая хустка-валёнка ў каторай на галаве ад зімы. Паўночныя людзі, старыя жанчыны. Не на поўную веру тварам да цяпла. Як лёгка, да плачу лёгка падлічыць свае вёсны, гады! Гэта не на поўдні, дзе цвіце лімоннае дрэва, а побач з кветкай вісіць спелы плод. Бы на навагодняй елцы: і пернік, і пеўнік, і анёл з воску. Там, пэўна, чалавек не так заўважае свае гады, жыццё, пэўна, як навагодняе свята, яркае, апавітае бліскучай сонечнай мішурой. Мае бабкі,

мае зязюлькі, мае гаротніцы, гэтак пяклуюцца ўсё жыццё, ураблюючы зямлю, некаторыя даўно кукуюць без мужыкоў і без коней! Вунь і найлепшая ад усіх Надзя. Хочацца даць уголас, гэтак хутка сышла ейная прыгажосць, адны вочы, сінія, чыстыя, бы ўвесь час глядзяць на анёлаў у небе, што плятуць вянкі. Хутка Вялікдзень... Старыя жанчыны ўжо ў тонкіх празрыстых сукенках. Наскрозь віднеецца скрыўленае цела, шэрая скура, ногі апавітыя венамі, як дзікім хмелем. Кожная напроці сваёй хаты. Стаяць нерухома, як старыя вясновыя дрэвы, апладнёныя цяплом сонца, ветраюць падалы квеценню... Данута схамянулася, бы апрытомнеўшы: гэта ж сад! Як жа яна яшчэ не дасталася да такой пары да старога панскага саду? Не затрымлівалася доўга каля баб, як раней. «Ты прыходзь да нас начаваць, хоць нагаворыцеся», — смяяўся сусед. Незлічона, колькі на дзень прыбягала звычайна да Надзі пагаварыць. Цяпер заходзілася, калі толькі трэба стрэмку з пальца выцягнуць.

Пад вечар адну з тых баб як не аблажыў паляруш, здранцвела цела, адымала мову. І не хацелася на тым разе бегчы да яе, ратаваць, шукаць лекі, як звычайна рабіла, жывучы ў вёсцы, марудзіла. Бы там над хворай вяршыўся вышэйшы за людскі суд. Няхай — трохі патруднуе, няволле да такога загубленага чалавека, як Імполік, прыкладаць руку.

У сад ісці трэба дабраць час, ён за ракой, за пагоркамі. Пагоркі высокія, лабатыя, пакрытыя свежай травой і самі выдаюцца свежымі, бы толькі што ў гэтым месцы спыніўся рух гарачай зямлі й ты заспеў іхняе нараджэнне. Яшчэ ў вёсцы каля сваёй хаты стаіць, пераймае кожнага Імполік, адкупіце, кажа, у яго талоны на святло, бо яму няма за што вярнуць украдзеную гарэлку. Апантаны прыродным пачуццём гонару (бабка ж шляхцянка), ён іншы раз праз ноч лезе праз плот, яму нясцерпна пільна аддаць пазычаныя грошы ці пушку сярнікоў. Патрэбна вызваліцца ад чужога.

— Ці ж хораша красці, Імполік...

— Я, можа, хацеў пазычыць. Трэба было дома быць! — адкажа, што і разумны не здумае, вось, маўляў, які ён ёсць, вясёлы рызыкант, свойскі чалавек, а вы тутака злодзея шукалі.

Нешта зачаста ён на ейнай дарозе.

Сад таксама на пагорку, яблыні-векавухі па-жаночы прысадзістыя. Яблыкі не здзічэлі, смак з кіслага на салодкае,

маладой рошчыны з дзяжы, — свежая раўгеня. Не заўсёды, прыйшоўшы сюды, трапіш у ягоны настрой. Як не адразу можаш далучыцца да мелодыі, не падбярэш голас, чуючы побач нечый спеў, што зводзіць цябе падпяяць. Бывалі разы, бы прыйшоўшы, нікога тут не заспеў, сад маўчыць, не адзываецца, ходзіш, як пад завешанымі вокнамі, і клямка зашчэплена, закладзена на сучок, даючы знаць, што недалёка гаспадар адышоўшыся, садзіся на ганку, чакай. Сцежкі хутка губляюць памяць, зарастаюць лясными бальзамінкамі, маладым малінікам. Улетку ў алеях скрозь лісце калышуцца празрыстыя цені, нехта ідзе ў белых адзеннях, вяртаецца, зноў адыходзіць, гуляючы. Заіржэ наважаны конь, ускалыхне ўспамін, чаго і ў вочы не бачыў. І гэты шум, і гэты гоман, калі толькі адныя дрэвы паміж сабой ці з птушкамі — без чалавека. Як у манастыры, дзе абы зайшоў за агароджу, моцна не загаворыш, тут толькі птушкі галасней за чалавека. Сад сам па сабе.

Паднялася ад ракі на пагорак... сад ляжаў на зямлі. На момант апанавала такая глухая ціша, бы на тваіх вачах заламвала зімовая бура дрэвы. Яны павольна нахіляюцца долу, абапіраючыся на расахатае галлё, трашчаць напятыя вены, сасуды. Падбягала да аднаго дрэва, да другога, а можа, яшчэ магчыма нешта зрабіць, катораму дапамагчы. Уверсе без голасу хадзіў вецер. Ніколі не ведалі, ніхто ў вёсцы ўжо не памятаў, колькі яны маюць гадоў. Цяпер відаць, што адналеткі. Сівыя мёртвыя галіны пераплецены з жывымі. Раптам пасярод разлому відушчае вока, кара лупатымі вуснамі вакол чорнага роту. То голае цела з дуплом запалага жывата, старэчая нявінная плоць кучаравіцца сівым мохам. Некаторыя яблыні яшчэ трымаліся на адным тонкім раменьчыку скуры.

Сюды ўжо нельга зайсціся без смутку, гуляючы, як у юнацтве на могілкі.

Хацелася ці то плакаць, ці то спяваць, далучаючыся да знямоглых дрэў:

Выйду я ў сад белым маем.
Абыйду сад смутным краем...

Суцяшалася сваім захмялелым голасам. Даўно нязведаная раўнавага, палёгка, ужо быццам і не так цяжка, і не так

жалобна. Як на памінках пасля другой, трэцяй чаркі, калі загавораць усе разам, мацней, абдымуцца, каб захінуць пустое месца за сталом.

Ніхто з людзей ёй так не патрапіць.

Вярталася, хадзіла на панадворку, не зводзячы вачэй з маргарытак пад нагамі. Маленькія кветкі то гусцелі нябеснымі бегамі, то рассыпаліся рэдкімі зоркамі, зырка свяціліся ў цемры. Гэтым часам прыляцеў бусел, пэўна, ён прынёс з-за мора напамінак аб старажытнай грэчаскай легендзе: маргарыткі ўзыходзяць па слядах Дзевы Марыі. На момант перад цудам даверліва, звыкла ўзрадавалася ачахлае сэрца.

— Вой, як у цябе, Дануся, хораша! — дзівіліся людзі. — Дзе ты брала гэтулькі насення?

— Па маім панадворку гэтай вясной хадзіла Багародзіца... — адказвала.

— Што яна гаворыць?!. Што гэта яна гаворыць?!. — дапытваліся адзін у аднаго розуму, чуючы нячутае.

Перагаворваліся, пераглядаліся паміж сабой, успудзіўшыся, ужо быцам стоячы за ейнай спіной. І яна сама была задалёка ад іх. Душа перасялілася на незнаёмае месца. Скрозь чысты шэры камень, падстрэшшам нізкае неба. Вызваленая ад усіх пачуццяў — сяброўства, кахання, ад усіх абавязкаў, анічога нажытага, хоць ты з пальца вазьмі выламі. Толькі адзінота творцы.

...Тым летам на выставе шмат гаварылі аб ейнай новай карціне.

АЗЯРОД

Ад аўтобуснага прыпынку нейкіх крокаў з пяток нашу Зіну падвозіў ужо, едучы дадому на кані, сусед ляснік Хведар. Сядзела з ім на возе плячо ў плячо, па-свойску, быццам закалыханая доўгай няроўнай дарогай, глядзела перад сабой моўчкі, бы ўжо і нагаварыліся, і насядзеліся, і ногі зацяклі, здранцвеўшы. Не памятаецца, каб дзякавала, што падвёз, злезла з воза як да сябе ў двор, як на сваім кані. Спадніца-бантоўка пругка разбеглася гармонікам.

Гледзячы на яе, брала нейкая весялосць. Стаяла вясна. У блізкім лесе кукавала зязюля, потым засакатала курыцай, сагнанай з шаста, засмяялася. Адчыніш дзверы й замінешся на момант: упускаць ці не – ляціць у веснічкі рознакаляровы матыль, пэўна, самы першы гэтай вясной, як госць.

Праз якую хвіліну, не болей, ветрам, бурай праз вокны, праз дзверы на кустах шыпшыны, на плоце віселі, ляжалі посцілкі, падушкі, коўдры, розныя транты, ахапкамі, па-вясковаму, проста на траве. Нічога не пытаючыся, Зіна мяла, мыла дом. Яе нараілі з горада, маўляў, бярэ нядорага і вельмі ўвішная. На дачы да нас чакаліся неспадзяваныя госці, а тут такая няўпраўка пасля зімы, і малое дзіця на руках. Я стаяла пасярод хаты, як у віры, не маючы ні сілы, ні волі нешта зрабіць сама ці падказаць Зіне, параіць. Дом паступова пераходзіў пад ейную ўладу.

– Я ж на самай справе чарнявая. Але сёлета ў модзе колер чырвонага цюльпана! – крычала яна з суседняга пакоя. – Не чула? Бо на Камароўцы гэтая фарба ў шпікулянтаў самая дарагая!

У буфеце старчаком, навідавоку ўжо стаяла ўсё тое, што мае бляск. Наш любімы гліняны посуд схаваны за дзверцамі, не відаўся. Паліваныя латкі, церніцы, збаны кочма пакаціліся назад у мінулае стагоддзе, а можа, яшчэ і далей. Нешта білася, трашчала пад нагамі чарэп'ем. Затое крышталь, як блакітны агонь, Зіна несла ў абедзвюх руках, захінаючы ад ветру. Выдавалася, вось-вось нарве гэтая жанчына буру. І праўда, раптоўна падняўся вецер, блізка, якраз над хатай, пэўна, ляжаў раскінуўшы полы скрылля ў нашай паветцы, адкуль толькі што выбегла Зіна. Узвярэдзіўшыся, бура падхапіла клён над студняй, круціла яму галаву, а яблыні маладыя ў садзе і не чулі, як нешта рэкнула старая дзічка, адвалілася галіна ад камля. І зноў ціха. Цвіце сад, развязваюцца вянкі на дрэвах.

– Каб мне не наследавала, няхай падлога высахне! – ляцела Зіна насустрач, варта мне было скрануцца з месца. – У аднаго банкіра ў залецці я прыглядала за ягонай дачай. Дык прыедуць на якую хвіліну з гасцямі, насмецяць – і паехалі! А ты зноў прыбірай! Што? У ваду нашатырнага спірту, каб шкло блішчала? Не-не! Я крэпка разбіраюся ў гэтым дзеле!

Апошняе яна паўтарала кожны раз, як толькі я збіралася запярэчыць ці параіць. Хутка я ведала пра Зіну амаль усё. Муж ейны, цясляр і сантэхнік, узяў яе яшчэ да арміі, гадамі ў вайсковым хадзіў, пакуль штаны не купіў. Робіць без аддухі, каб грошы не зводзіліся. Што, маўляў, цяпер чалавек без грошай. Усё каб як у людзей было. А што як у людзей? Каб і кватэра, і машына, і дача! Здыме целагрэйку, прыйшоўшы з работы, кажа, на! пасушы, а яна пытаецца: хіба там дождж быў?! Адзежа ад поту мокрая. Хто дык краў, а яму ўсё трэба было зарабіць. Зіна спачатку смяялася з гэтах дач. Людзям давалі на балоце, скрозь лаза сядзіць, а яны тут дом ставяць. Аж далі й ім кавалак, паехалі глядзець. Зірк – грыб сядзіць, падасінавік, ступілі яшчэ – баравік! Не, тут далёка і хадзіць не трэба, падабалася месца. Усё цяпер ёсць, хопіць, але вось скарацілі яе на складзе, дзе працавала, вымушана была даць аб'яву ў газеце, маўляў, выконвае розныя паслугі, мые вокны, прыбірае. Часцяком выпадае наймацца разам з мужам. Але ён як раб божы, выслугоўваецца, кожнай гаспадыні хоча патрапіць, злуецца Зіна. Яна не любіць двудушнасці, маўляў, якая ёсць, такая і добра. У людзях ён такі культурны, такі памяркоўны, што гаспадар ні скажа, усё моўчкі выконвае, і абутак здыме ў чужым доме без напамінку, і попел з цыгарэты не страсе на падлогу, бронь божа! «Дык ён жа за грошы працуе, не за ласку, трэба і гадзіць...» – моўчкі пярэчу сваёй служанцы, як сябе называе Зіна, баючыся, каб гэтая бура ненарокам і пер'е з падушак не пусціла па ветры.

– Дагэтуль я наймалася ў адной бізнесменшы. І гатавала ёй ежу, і сама купляла прадукты, вымяркоўвала, як сабе, каб дзешавей было. Вядома, гэта сапсуецца, тое скісне, тады яна: «Я сама – варона на кухні, нашто мне яшчэ адна такая самая?..» І разышліся. Зараз у тым доме служанка з дамешкам вышэйшай адукацыі, – смяялася Зіна. – А мне ж гэтае ўменне служыць па людзях перайшло, можна сказаць, у спадчыну, ад мамы, каб ты ведала. Яна вярнулася з Германіі, немец быў звёзшы ў вайну. Ні хаты, ні бацькоў жывых. А тут і я знайшлася, ужо ёй ганьба. Узяла яе да сябе на гаспадарку дакторка Стэфанія, палячка, сама гарбаценькая, некрасівая. А муж ейны напроці надта пекны, намнога быў маладзейшы, з простых, пэўна, паквапіўся, што добра жыла, пані. Штоноч па

бабах гойсаў. Дзяцей у іх не было. Стэфанія, як цяпер бачу, возьме мяне да сябе ў ложак, я прачнуся сярод начы ўся мокрая ад ейных слёз. Гэтак кахала таго бадзіню. Людзі не спагадалі, маўляў, брыдка сохнуць немаладой бабе, якая там ужо ў яе любоў... Скора і памерла. А перад смерцю: «Гэльця, на маму, ты дом мой не кідай, яго не кідай, ён, маўляў, толькі дзеля забавы, за яго чужая жанчына не пойдзе, спіўся, разбадзяўся. Ты яго дагледзь», — прасіла. Апошняя ейная воля... І мама не аслухалася... Распісалася... Але ж ніколі да сябе не пусціла, добра ведаю...

Гудзела галава ад нязвыкла голаснай гаворкі, Зіна гукала па пакоях, як у лесе. Спаслаўшыся на тэрміновую працу над кандыдацкай, я схавалася ў кабінеце. Як ужо яна парадкавала побач:

— Хачу бліжэй быць, каб пагаварыць...

Зіна расказвала пра сябе без асаблівага даверу, так палошчыцца на нашай рацэ каторыя баба: твар, ногі пасля бялізны толькі памочыць — і лёгенька ёй, вернецца дамоў, бы ўся скупянулася.

Толькі, на жаль, Зіна мала што памятала пра Стэфанію. Нешта ўнутры мяне дапытвалася ўвесь час, хацелася яшчэ і яшчэ раз бясконца слухаць пра яе, як чароўнае паданне, як сумную, страшную казку ў дзяцінстве на ноч... у якой у змрочным палацы і ўдзень не адвешваліся вокны, каб сонца не ўбачыла непрыгожую гаспадыню, не паказала яе людзям. Употайкі ад усіх плакала яна па сваім каханні, купала ў слязах чужое дзіця. Казку, у якой служанкам давяралі не тое, што дом, гаспадарку, але і мужа-каханка... Пэўна, ейны патрывожаны ўспамінамі дух вітаў недзе блізка. Адшліфаванае зламанае грабавідла ў садзе выдалася кіем Стэфаніі, ейнымі парушанымі астанкамі. Бліскавіцы дзвюх стыхій чалавечай прыгажосці й выродства раз-пораз водбліскамі адсвечваліся на Зініным твары, у ейным прываблівым позірку.

Але што гэта ёсць? Едуць каля хаты мужчыны ў дровы, як паверне каторы галаву ў наш двор, дык хоць ты багром адварочвай, глядзіць, пакуль не схаваецца за вуглом фурманка. Сусед, стары дзяцюк, адлучыўшы кабылу ад жарабя, мяркуецца запрэгчы. Тая кідаецца, не даецца, высока задраўшы галаву, водзіць яго па вуліцы ўзад-уперад, як у карагодзе. Сусед звычайна ходзіць, сцяўшы пашчэнкі, вочы ў зямлю, ужо такі пячурнік,

а то, бачу, кінуўшы кабылу, пайшоў дахаты, рукі слабка вісяць, усміхаецца, як вырабіўшыся нарэшце з палону, гладзіць свайго сабаку, а можа, сам лашчыцца. У таго ўжо і поўсць халодная, як перад смерцю, такі здзічэлы. Нязвыкла, аж баішся глядзець, каб не спудзіць такую кароткую хвіліну даверу гэтаму свету. Хведар заганяе цяля, яно тузаецца на вяроўцы, брыкаецца, дурэючы, а ён смяецца. Ніколі быццам і сяброўства вялікага не мелі, а тут зайшоўся і раз, і другі, хваліцца Зіне, што надта ажына ў ягоным садзе сартавая. «Хлопчык ты мой, дзе ж ты гэтак укрыпаўся!» — здымае яна з ягонага пляча старое павучынне. Ужо яна трымае ў руках маладыя парасткі, павязе да сябе на дачу, якраз тыя, што быў дакляраваўшы нам.

І цяпер яшчэ леснікова жонка Лідзя не выпалала тыя атожылкі ажыны начыста. Вышэй плоту, вышэй коміна ўзняліся тады над ейнай старой хатай, пад ейным бабскім зацішкам тыя сакавітыя, юлёвыя ягады надта сартавога заводу.

Зіна лётала з хаты ў двор, з двара ў хату. Ужо мяла вуліцу насупраць. Буйныя кучары на плячах, глыбокае дэкальтэ, спадніца вышэй калена. Зіна не маладзёнак. Але гэта не той апошні ўбор, не той апошні шанец, калі жанчына ва ўзросце, раптам спахапіўшыся, апранае вясной адкрытую сукенку, адчайна здымае панчохі пасля зімы, раней за маладых, самай першай. Ужо зусім не прыкрытая сарамлівасцю, ловіць на сабе мужчынскі пагляд, каб упэўніцца: яшчэ яна жанчына, яшчэ яна мае час. Высвеціцца каторая ўся на вачах, як зямля на пагорку, першай і зазелянее. Зіна апраналася так, ні на кога і ні на што не шманаючы. Яна хадзіла каля мужчын, як ідуць да чужых рук свойскія, цікаўныя да ўсяго дзеці. Аніякай позы. Вось падбегла да маёй дачкі, ідзе з ёй побач, нізка нахіляецца, патрапляючы ейнаму малому росту, дробным крокам, нешта шчабеча. Пасадзіла на руку, другой паказвае, цягнецца, бы хоча памацаць, дастаць да птушкі на галіне яблыні, кратае пальцамі — вунь сарока, а вунь — пятух! І зноў перабірае нябачныя канцы, звязваючы вузельчыкам дзіцячую свядомасць з птушкай, з дрэвам. І дачка, дзіўлюся, не кідаецца ў плач у чужой цёткі.

Я сама стаю, як збяднелы кутнік.

— Не, мне не такі мужык патрэбен, як мой муж! — ужо крычыць да мяне Зіна на ўвесь агарод.

А трапляла, пэўна, у вушы й лесніку Хведару, і суседу перастарку. І кожны падцінаўся, як на агледзінах, ідучы па вуліцы каля нашай хаты, чуючы вольны бабскі дух.

Веснавы вецер гуляў па вёсцы, сыпаліся пялёсткі ў садзе — і ўсё пад ногі лесніковай Лідзе. Сцюдзёныя сцежкі, бы йдзеш па снезе, як напамінак, што вось-вось вясна скончыцца, а ты й не пераапранулася ў лёгенькае за работай. Назаўтра Лідзя ішла ў белай блюзцы. Запозненым цветам блішчэла хустка з ружовым шлячком, якраз як на нашай старой яблыні, якая ўжо не радзіла: толькі некалькі кветак на адной галіне. Блюзка туга і каля шыі, і ў рукавах, пэўна, яшчэ дзявоцкая. Няўжо ўжо малая, зусім жа новая... І валасы закасміліся, як пасля лазні, грэбень не ўсадзіш, век бы мачонік у дзежцы, пот градам. І мужчына ў хаце даўно проста бацька ды бацька, ад той пары, калі дзеці пайшлі. Ідзе ўжо з ім Лідзя побач, як па асеннім садзе. Ён падыме яблык, закусіць адзін — кіне, другі, трэці, пакуль на смачны не ўзаб'ецца. Гучна цягне спелы сок. І яна патрэ яблык аб швэдру і таксама грызе, які трапіцца. Няма калі каб гэта спыніцца, сабраць кошык на стол. Як ягадзіну ў лесе, — усё на хаду. І ўсё іхняе каханне. З аднаго яблыка даўно ўжо не ядуць...

— Ці ведаеш, у тваёй служанкі, бабы кажуць, пэўна... шаленства маткі, — даверліва шэпча мне Лідзя.

Спрабую ёй нешта тлумачыць, разупэўніваць, але зірнуўшы ў ейны змарнелы, разгарачаны твар, палохаюся таго, што тут нарабілася пасля Зінінага прыезду.

— Не хацелася гаварыць, але скажу: тэлефон ейны знайшла ў Хведара...

Я і з твару сышла. Бягу дамоў і раптам бачу: хата быццам адмянілася. На вокнах ад вуліцы стаялі вазоны, на кожным па пары, Зіна іх занесла з веранды, цюлевая фіранка сарамліва запінала свет. Ну проста маладое дзявочае акно ў вэлюме! Мы ж усе ў сям'і любілі, каб сонца слалася на падлогу, каб пасля горада не ўпусціць ніводнага імгнення за акном, на зямлі й на небе.

— Зіна! я ж прасіла нічога не перастаўляць, не перарабляць па-сваему! — злуюся канчаткова.

— Дзе калі ні ішла, дзе калі ні ехала — ва ўсіх людзей так вокны прыбраныя, — адказвае нявінна. — Я табе параю: паса-

дзі ты каля ганка на высадкі бурака ў вазу! Гэтак пахне, як цвіце, ну справядловы мёд!

Усё, хопіць! Трэба развітвацца, пакуль бабы тыя вокны шлюбныя не пабілі. Што ты ёй паправіш? Ні яна мяне слухаецца, ні яна сама прыглядаецца да нашага ладу ў доме. Усё робіць, як ёй выдаецца, усё нацягвае на свой капыл. З такім чалавекам дурняў поўная хата.

Зіна ад'ехала. Тыдзень – не меней – трэба было ўсё перастаўляць на сваё ранейшае месца, адшукваць патрэбныя рэчы, перамываць, як пасля якой непагадзі. Вясновая бура не пераціхала і ў хаце лесніка. Хведар не раз ішоў на работу не паснедаўшы. Але маўчаў. Лідзя ляпала дзвярыма, засланкай, лыжкамі. Не-не дый спынялася, ідучы каля сваіх вокан, углядалася ў цёмную шыбіну, бы ў люстэрка, папраўляла хустку. Дык гэта ён яшчэ будзе яе, матку, сарамаціць перад дзецьмі?!. Намуляла яму шыю сямейная вупраж! Вартаўнейшую знайшоў, маладую?!. Гэтак усё жыццё цаляла яму! Каб жа яна калі да каго з мужыкоў засмяялася? Гэтак пільнавалася сям'і! Стары ж ужо чалавек!

– Не маю да чаго прычапіцца, каб усё яму высказаць у вочы. Усё робіць, як на тое, псіна старая! – выносіла Лідзя да мяне свой жар з хаты. – Валасы ёй павыдзіраю, калі яшчэ раз убачу!

І калёсы паправіў, дзівілася, і гной з-пад каровы выкінуў. Ага, во што яна яму загадае, во калі згоніць ахвоту, пасварыцца нарэшце! Колькі гадоў прасіла збіць з жэрдзя такое прыстасаванне, каб зручна было сушыць позняе сена, збажыну, бульбоўнік. Адзін адказ: парой будзе ды парой. Не можа быць, каб тут не сарвалася!

Назаўтра азярод ужо стаяў на высокім пагорку. Быццам і запамятавалі ўжо ў вёсцы старыя мужчыны, як яго рабіць. А Хведару, во, успомнілася. Некалькі слупоў, а перак – рэбрамі жэрдзе. Павернуты бокам да сонца, на пагоду. Здалёк азярод нагадваў нябачны дагэтуль даўнейшы сялянскі інструмент. Садзілася птушка, спявала, прылятаў музыка вецер, перабіраў трапяткое жэрдзе. О, мой цудны свет! Усялякі раз спынішся напроці пад пагоркам, прыслухоўваючыся ці то да сябе, ці то да мелодыі. Сохнуць травы, млее сэрца.

Пэўна, музыка тая пра каханне на свеце, не зжытае сівымі гадамі...

ДОМ НА ЗАХАДЗЕ ДНЯ

Жанчына прыходзіла сюды, у былы маёнтак Хамінскіх, амаль кожную вясну.

Здалёк выдавалася, што ён сядзіць на высокім, дрогкім месцы. З пагорка на пагорак хваляй выносіла чалавека якраз пад самую браму. Ад брамы захаваліся два слупы, яны ляжалі напроць адзін аднаго, каменнымі галовамі ў адзін бок, захоўваючы нейкі смутны парадак, бы на могілках. Старыя яблыні часцей з чорнымі, апаленымі часам галінамі, некаторыя дрэвы сыходзіліся парамі блізка, пабраўшыся высока ўверсе, нагадвалі сілуэт далёкай, як на графічным малюнку, касцельнай сцяны, фасаду. Некаторыя паваліліся ўжо набок, бура нахіліла ці старасць, аберуч абапіраючыся на зямлю, яны яшчэ жылі, іншыя стаялі амаль укленчыўшы, цёмнае да бляску мармуровае цела не захінута нічым — кара да яго не бралася, заламаныя вятрамі галіны ўскінуты за голаў...

Але ні жалю, ні скрухі ў старым садзе, дрэвы быццам у доўгім задуменні, кветкі на іх галовах віліся мроямі, і яблыкі, кожная самой сабе ў пеляну быццам дзеля ціхай уцехі. Скульптурны, дзіўны сад...

Цвіў бэз. Жанчына адчувала проста патрэбу бачыць гэты вялікі вясновы куст на пагорку. Не заўсёды выпадала ў час, тады, баючыся, што ён адцвіце, кідала ўсё і бегла, быццам магла не паспець, не трапіць на нейкае невядомае нікому, акрамя яе самой, свята. Спяшалася, бегла без дарогі напрасткі, як на голас, мінаючы пагоркі, раку, вал, гэтыя адвечныя забароны гаспадароў, без дазволу ўваходзіла за жывую таямнічую агароджу. Бэз звычайна найбліжэй садзяць да дому, каля ганку, і тут таксама грузалле падмурка ляжала побач. Сярод саду, сярод адзічэлых дрэў галубовы бэз блішчэў здалёк смутнымі вокнамі пакояў. Адцвітаў бэз — зачыняліся аканіцы.

З людзьмі ў яе быццам усё ўжо было перагаворана, няма чаго новага ўспомніць, каб расказаць: ну, жылі ейныя бацькі таксама ў маёнтку, саслалі іх, палякаў, саветы на Алтай, усе

там загінулі, яна адна вярнулася... Усё перабрана... Затое з гэтымі, пакінутымі гаспадаром, дрэвамі – жывасіллем пакінуў, ратуючыся, ад'ехаў з сям'ёй у Польшчу – можна было бясконца маўчаць аб тым, чаго і не памятаеш. Нямыя рэчышчы памяці запаўняліся птушынымі галасамі, шэптам вуснаў у сутоннях лістоты... Не ўспомніць, чаму, жывучы ў такім-сякім дастатку, не любіш, стыдаешся апрануць на сябе, ідучы ў госці ці тэатр, усё новае, асабліва бяда з абуткам, быццам ніяк не могуць збочыць ногі з той сцежкі, на якую цябе басанож на зямлю спусцілі з рук бацькі. «Хоць ты вазьмі й спалі твае старыя чаравікі», – злуюцца на цябе дома. Чамусьці не любіш, пужаешся свежых белых прасцірадлаў на ноч, табе ўтульней вяртацца ва ўчарашняе, назапашанае целам цяпло, звыклае, з пахамі свайго прытулку-дому, старое кочава, пасланае як не на зямлі. Амаль не памятаеш, як памерлі бацькі, апошнімі зачыніліся дзверы за старэйшай сястрой Уладзяй. Яны ўсе выходзілі з дому, не развітваючыся, і больш не вярталіся, гінулі ў дарозе, замярзалі на алтайскіх маразах, як птушкі, не даляцеўшы да зацішнай страхі. Толькі цяпер ніколі не ходзіш на хаўтуры да сяброў, па-дзіцячы крыўдуючы, што дарагі табе чалавек пакідае гэты свет сам, па сваёй ахвоце, так табе выдаецца, занатурыўся і пайшоў упрочкі. Зрэдку прыязджае з вёскі далёкая радня, гойдаюць аберуч, аж пад столь, ейную калыску, успамінаючы, як прывезла яе з ссылкі выхавацелька, як гадавалася па чужых людзях.

І стаяў увушшу незразумелы гул – адзывалася кроў, чуючы блізка, побач, сваё племя, аж нездаровілася.

Ад бацькавага маёнтка нічога не засталося, яго лёгка было скасаваць калгаснымі трактарамі. Прыязджала неяк, стала на пагорку ў полі, ціха зрабілася, вецер высока абыходзіў гэтае месца, можа, памятаў яшчэ тут высокі дом, высокія дрэвы. Убачыла пад нагамі камень – можа, ад падмурка? – адвярнула да сябе, быццам ён ляжаў уніз тварам, – аніякага пазнатку чалавечага жылля, хацішча.

А гэты маёнтак ахоўвала рака амаль з усіх бакоў, цяпер яна абмялела, месцамі разбітая кароўскімі капытамі ў брады, але з жывучай вадой. Дно далікатна высцілалася белым пяском, бы на чыстым сподку, па-польску мовячы, проста да столу. Вадзіліся тут і стронгі, даўнейшыя людзі кажуць, іх было

процьма, рукамі лавілі, маўляў рыбіна любіла, каб яе пад жабрамі пачухалі.

Баранілі маёнтак і дрэвы. Здавалася, некаторыя з іх паляглі на зямлю ў адну ноч, адным разам, каб загарадзіць, зачыніць дарогу, па якой назаўсёды ад'ехаў з дому гаспадар. Крыж-накрыж складзена сухое галлё, не пераехаць, не пераржаргаць, быццам тут жыве вялікая птушка — гняздо непрылюднага чорнага бусла на баране. Адно з нетутэйшых дрэў скідала на зямлю валоскія арэхі, заўсёды як дзіцячы навагодні падарунак у панчосе пад падушкай. Другое, галубовы ствол піхты, заўсёды нечакана трапляючы на вочы, стаяла фосфаравым слупам на саракавы дзень. Акацыя рассоўвала камяні, цэглу, жыла на самым падмурку. Пачне чалавек капаць сабе куст і кідае: карані жоўтыя, пакручастыя ад натугі, бы жывыя пахаванцы, цяжка зробіцца ў грудзях, хоць ты тутака агароджу стаў, як на могілках, не чапай гэтае месца.

Надвячоркам мышкавала лісіца, крычалі совы, тут яшчэ так-сяк правіла праўнучка той багатай прыроды, што раскашавала пры былых гаспадарах. Тут яшчэ, калі добра ўгледзецца, існавала магія садоўніка. Старыя дрэвы захоўвалі ягоны парадак, стаялі адно за адным класічнымі алеямі. Глядзіш, быццам у гэтым кутку яны тоўпяцца абы-як, а назаўтра, пераступаючы цяжкімі крокамі, ужо таксама пастануць у рад. Будзе замінаць табе густы самасейка-маладняк, чапляючыся за адзежу, балюча ўджгне шыпшына, толькі высока над галавой, дзеля адной птушкі, свіціцца наскрозь прагалак — хіба што на крыллях можна праляцець па старых прысадах.

Зрэдку прыходзяць у маёнтак немаладыя бабы, сядзяць тут адны, не баючыся аніякіх прывідаў ці пачвар, да трэціх пеўняў. Нагаворацца праз усю ноч пра сваіх нядбайлых мужыкоў, паспавядаюцца адна адной, лёгка, без крыўды, даверліва, як нідзе болей. Бо тут яшчэ пэўна, нешта прыветна тлее, сагравае-цца некім гэтае месца здалёк у думках успамінамі без праклёнаў.

Яшчэ, можа, не прастыў улюбёны ў свае мясціны позірк далёкага адгэтуль гаспадара.

Сёлета жанчына хадзіла ў маёнтак амаль кожны дзень. Якраз напроці яе дачы праклалі дарогу машыны — яны звозілі з поля на ток ячмень, і цяпер маёнтак быццам наблізіўся да яе. Нечая неспадзяваная змова.

У той вечар ішла пад сонца, на пагорак. Сонца на захадзе нізкае, колецца ў вочы, промні даўгія, тырчком, бы з-пад нізкай саламянай страхі, хоць ты прыгінайся, ідучы. Блішчыць палеглае пад калясьмі свежае ржышча. На самым пагорку раптам патыхнула цяплом, бы толькі зараз, на вачах выслабанілася поле, адхінула вольную цяжкую палу збажыны, вее цяплом зямнога цела. Ступіш некалькі крокаў уніз, у лагчыну, бы спусцішся па сходках у скляпенне з глухімі мураванымі сценамі – сыра, холадна. Зноў хваляй на пагорак, зноў блізкае цяпло, проста ў твар, шчака да шчакі. Клубамі ходзяць пахі – дыханне свежага жніва, дыханне блізкага лесу, хат. Нізкае неба. Нехта перасцілаў і перасцілаў перад ноччу, ці то ганьбуючы фарбы, ці ўжо занадта модзячыся, і ружовым, і малінковым, і зусім нешта накшае ўскіне, па-дзявоцку гарэзліва, маладымі рукамі. Ціха на дарозе і няўцямна запавольваюцца крокі, спыняешся і раз, і другі. Усё навокал спынілася, чуваць толькі, як шугае твая кроў. Ціша ахоўная, патайная, можа, беражоная вякамі, выстаяная ў полі.

Пэўна, у такі час слабеюць запоры, зашчапы паміж гэтым і тым светам, неба, бы далечыня, адчыняюцца самі па сабе тайнікі, клады, успаміны, размыкаюцца маўклівыя вусны.

Непадалёк цёмныя елкі, галубовыя прасветы паміж імі выдаюцца каменнымі цяснінамі, месцішчам вадаспадаў. Самога патоку не відаць, толькі дробная сліна ў паветры, пырскі, пахне вільгаццю – гэта падымаюцца з зямлі, струменяць туманы. Шуміць кроў у вушах. Па нябеснай далечыні ў той бок, дзе схавалася сонца, якраз над маёнткам, цягнуліся доўгія дарогі. Быццам ехалі па іх, ішлі цыганы, ружовым пылам падымаўся за імі шлях, дымы вогнішчаў, чырвоныя шалі віліся шлейфамі. Ішлі й ішлі ўслед за сонцам ззаду, каб надтачыць дзень, пазычыўшы ў ночы, – каб хоць што ды ўкрасці. Яны ўжо даўно мінулі маёнтак. Цяжка падняўся з зямлі, бы з цыганскай стаянкі, паляцеў за імі, даганяючы чорны каршун... Шум крыві да непрытомнасці й неспакой, бы нехта вельмі знаёмы, блізкі, мяняючы сваё аблічча, пільна ўглядаўся ў яе твар, пытаючыся: ці пазнаеш?!. Бліснула пад нагамі, як ад апошняга серніка, і згасла ржышча, горача ступіць, быццам жар ягоны, сыпучы, тоіцца недзе, пад попелам...

Пазнала! Успомніла! І цыганы на захадзе, і скорагаворка вадаспадаў, і цішыня, быццам у поўнай з берагамі чашы, магло быць толькі там, у гарах! Гэта ейны Алтай! Жанчына аглядала ўсё вакол сябе шчаслівымі дзіцячымі вачыма. Ёю зноў валодала моцная ўладарная сіла дзікага хараства, знаёмая з малых гадоў. Яна смяялася сама сабе, зноў, як у дзяцінстве, стоячы недзе каля дарогі, басанож, таксама чорная ад гарачага цыганскага пылу, і забываючыся, як свярбяць, смыляць струпы на целе. Зноў бегла, скакала з каменя на камень, ледзь паспяваючы знайсці вачыма пад сабой гладкае месца, каб ступіць нагой, не саслізнуць са скалы. Захопленая вышынёй, лётам, не разумела, што гэтая нечалавечая лёгкасць не ад вялікага спрыту, — лёгкасць галоднай істоты, што шукае ў гарах сабе белую тлустую цыбуліну лілеі саранкі, бадылле «ўшывіка», скочку, згорнутую качанчыкамі. А знайшоўшы рэдкую кветку дзікай півоні, мар'інага кораня, закалоціцца ад радасці й пабяжыць уніз, да людзей, дамоў у склеп. І без дакору поўнымі вялікімі вачыма нежаданага ў сям'і ў гэтым горы дзіцяці, будзе крычаць усім: мяне нехта, нарэшце, заўважыў! нехта знайшоў сярод вас! вылучыў!.. Мяне нехта любіць!.. Бо во якую прыгожую кветку даў у руку!..

Яна ўсё стаяла, смяялася. Ужо схаваліся цыганы, толькі матлялася згубленае адно цыганскае кола, захад сонца мяняў і мяняў сваё аблічча ўвачавідкі. Неба палала так блізка, што міжволі падумалася: гэтае відовішча можа зашкодзіць чалавеку — надта вялікае шаламя агню, яно перапаліць у душы ўсё кволае, слабае — хіба заўважыш пасля ледзь прыкметнае хараство лесу, поля — будзе цяпер жадацца толькі вялікіх відовішчаў, вялікіх палотнішчаў, будзе захапляць толькі стыхія?!.

Ахапкамі клаўся на зямлю змрок, а маёнтак на захадзе яшчэ свяціўся. Пэўна, некалі якраз жа адгэтуль, з ейнага боку, вяртаўся дамоў і гаспадар. Дом, казалі, быў такі белы, аж, выдавалася, празрысты наскрозь. Сонца на захадзе абходзіла пакоі пехатой. Цішыня на дарозе. Разамкнулася рама на люстэрку поўні, у ім відаць чыйсьці непрыгожы твар, нехта пільна ўглядаецца перад ноччу. Пэўна, Юзюня, дачка гаспадара, яна і замуж, казалі, не пайшла, дзевавала. А можа, гэта малодшая прыгажуня Зося пасля таго, як яе коні з пагорка разнеслі, вельмі, казалі, быў твар пашкоджаны? Тут недзе, каля маёнтка,

блукае ў сваіх думках і стары дзед Мікалайка, адзіны жывы сведка, але ў яго не дапытацца... На небе ўжо толькі малінковы жар, без галавешкі, без вуголля, бы сена капа згарэла ці сноп... пшаніцы?.. І раптам жанчына заплакала, плач уголас, наўзрыд, быццам душа труднавала доўга — даўно была ўплакаўшыся. Дарога... яна зноў стаіць на той жа дарозе, што і ў дзяцінстве, і ніхто яе дамоў не кліча. Чаму ўспомнілася? Што змусіла? Яна адчула яе фізічна, як пры набліжэнні да нечага гарачага, небяспечнага, цела сціснулася, торгнулася — адчыніўся яшчэ адзін клапан у цемры бяспамяцтва. Успомніла навобмацак: пад нагамі цёплае ржышча, пах саломы, бляск. Зярняты гарачыя каля вогнішча... Начлежнічалі вазніцы, перавозячы некуды збожжа, палілі снапы, жмені пражанага зерня з зямлёй разам, — ежа... Успомніла ротам, трашчала на зубах, і каб толькі раней за птушак, за звяроў дабегчы да пакінутага вогнішча і выграбаць, выграбаць з попелу, не чуючы гарачыні...

І цешылася, і плакала, бы пры сустрэчы з некім вельмі родным.

Ніколі нікому не распавядала, што бачыла ў дзяцінстве. І голад, і холад, і нежаданае дзіця, а ўсё быццам невясёлы, адчужаны матчын твар (яна і памятае яго толькі па фотаздымку) засланяла нечае іншае аблічча, аблічча горнай прыроды. Вяртаючыся са школы амаль заўсёды як на тое раптам зноў адчуць неверагодную здраду: раскруцілася ануча і цягнецца ззаду, высунуўшыся праз дзіравы валёнак, знойдзены на чужым шуметніку. Не даць рады, каб спыніцца і паправіць абутак, бо скрэплі рукі, і варта іх выцягнуць з-за пазухі, пальцы адваляцца на марозе, абламаюцца, як ледакі. Але не ўстоіш, каб не падняць на дарозе шалупінку ад мандарына. Завея і мароз, абы хутчэй кульнуць у свой падвал (пасля рэабілітацыі ўлады дазволілі палякам выйсці з зямлянак) праз парог і ляжаць качулкай, пакуль іголкі не прашыюць цела да самага сэрца — пачнеш сагравацца. Некаму сустрэць, расшпіліць — маці на рудніку. Дапільнавацца, калі зарыпіць над галавой лесвіца, вынесуць карове памыі й раней за яе вылавіць з цабэрка кавалкі хлеба, бульбіну. Потым залезці на цёплую ад учарашняга пліту і не сваім голасам крычаць выратавальныя словы: «Буря мглою небо кроет, вихри снежные крутя...» Нехта дыктаваў і дыктаваў ёй па-руску. Хто?

Бо чытанка самой не даецца, асабліва забываецца літара «с», пакуль не ўзаб'ешся на неверагодна салодкае: с-с-са-хар! Ледзь-ледзь, квола, пад бацькавым прымусам спявалася польскае: «На падоле бялы камень, подолянка седзі на нім...» І гналі тады, падалянку, ужо дзетдомаўку, па беразе возера: «Бей белых поляков!» — крычалі дзеці. Усе аднолькавыя, усе ў чорнай адзежы, бераг камяністы, адны камяні. Б'юць наўздагон камянямі. Наперарэз дзецям — выхавацелька. І... непрытомнасць. Ні крыўды, ні злосці, ні страху ад людзей пасля, а толькі — чыстае возера, усё, як у тваіх прыгаршчах, і гуляюць на дне самі па сабе зялёныя каменьчыкі, і неба нізкае над ёй, ляжачай дагары, і глядзецца ў яго можна, як у ваду...

Адымала памяць, лячыла болькі прыгажосць, раскоша, моц зямлі, вады, неба. Нехта падымаў і падымаў падпашкі вышэй сваёй галавы, — пэўна, горы. І нават сам горад ссылкі насіў іхняе імя — Змяінагорск. Чаму яны не выратавалі бацькоў? Чаму самі бацькі, сталыя людзі, не адужалі маразы, голад? Няўжо таму, што яна нарадзілася ў тым небе, у гарах, у цяснінах, а ў іх — другая зямля, другая калыска?

Ім не даваў дазволу на тое, каб зачапіцца карэннем за чужую камяністую глебу пакінуты дом, маёнтак, — жыццё выдавалася часовым, без моцы чалавечай.

Жанчына праз дзесяцігоддзі памятае колер шклянак на матчынай сукенцы, — маці была ўжо без прытомнасці, — зялёнае з чорнай дужкай, летняе ў люты мароз, шаўковыя крылы матыля, замерзлага каля вады, каля студні. І час ад часу лавіла сябе на тым, як нешта змушае яе спыніцца, варта ўбачыць які-небудзь чужы стары падмурак. Чыймі вачыма прагна глядзіць на разбуранае? Няўжо гэта матчына? Разглядае, як нешта ўжо знаёмае, яе трывожаць, хвалююць пахі паламанай цэглы, вапны, пахі сгаслага жытла, гатова сядзець, перабіраць рукамі, як дзіця. Няўжо пашкоджана яшчэ ў чрэве?

Яна, як і маці, жыве ў разбураным свеце на грузаллі, на абломках, на чорным падмурку?!

Так адбыўся там, на Алтаі, як бы адбор паміж блізкімі людзьмі, жорсткі, натуральны, — яна адна пакінута на жыццё.

Дзень у дзень жанчына выходзіла з дому, ішла ў маёнтак. Гаварыць ні з кім не хацелася, цяпер яна бліжэй была да дрэў, да травы, чым да людзей. Тут, сярод старых прысад, яна

адчувала ў сабе з усіх, што навокал, нарэшце, такую вялікую згоду. Маўклівае сумнае месца, бэз, стары сад, дарога па ржышчы, тут яна трапляла ў тую плынь, дзе лёгка было са сваім цяжарам, скарбам памяці. Згадка гарчыла на вуснах: яна заўсёды хадзіла па гэтай дарозе, адна, пад сонцам, па ржышчы калючым, звыкла па ім ісці, не балюча, тая ж дарога, што і на Алтаі. Толькі яна быццам недзе ўнутры была пад голымі ступнямі. Цяпер абазначылася, як хвароба, даўняя, цяжкая, выйшла вонкі, пайшла па твары.

Ніхто раней не здагадваўся, не бачыў ейнай хады.

Каму раскажаш, хто зразумее? Вакол амаль бесперастанку сварыліся з-за дробязей, хітравалі адзін з адным, здраджвалі, мітусіліся, усе быццам былі даўно перасварыўшыся, страцілі давер і не мелі рады прыйсці да згоды. Жанчына пакутліва стаяла ўбаку ад гэтага няскладнага жыцця, тлуму, дапытваючыся: за што? навошта нішчыце адзін аднаго? Там, на Алтаі, — ссылка, катарга, а тут хіба жыццё? Паміж тым і гэтым светам толькі й розніцы, што на Алтаі маразы мацнейшыя? Ніхто не здагадваўся, што жанчына ведае нешта большае: яны ўсе смяротныя, чалавек вельмі кволая істота, яго лёгка загубіць, згнаіць, парваць сэрца.

Яна спасцігла мяжу чалавечай свары, варожасці, за якой нішчыцца дом, лёс.

«Чаму ты ніколі ні з кім не сварышся? А ты б таксама... А ты б яму катораму адрабіла... А ты б яму не пазычыла, а ты адказала б... — павучалі. — Жывеш, як праз шкло. Ты наіўная, — казалі, усё ўсім выбачаеш, спадзяешся на лепшае, ты людзей не ведаеш...» А ёй — каб толькі хоць у адным месцы не парваць сувязь паміж імі, не адпіхнуць чужую няверную руку. «Вы мяне працягваеце катаваць... мне мулка, балюча ісці па гэтай этапнай дарозе... я вам растлумачу, навучу...» Ніхто не слухаў. Які яна, маўляў, мае вопыт? Без мужыка, без дзяцей...

Ніхто не здагадваўся, што ў яе вопыт чалавека, яшчэ ў дзяцінстве асуджанага людзьмі на вышэйшую кару — марудную смерць.

Зноў і зноў ішла, мінала браму, калыхаліся вышэй галавы дзікія травы; дзікая герань, бы праз адчыненае акно, аддавала дамашнім духам; хваравіта, лекамі дыхаў у твар фенхель — моцныя пахі старога жытла. Там-сям трапляў пад ногі белы,

чысты сук таполі, бы паламаны Юзюнін кій, ці Зосін? Не зарастала вялікая паляна, якраз перад вокнамі дома, пад пагоркам, улюбёнае месца, не іначай як і цяпер яно на вачах гаспадароў.

Скуль жа тады гэты лёгкі, як дотык, страх за плячыма на пакінутых сялібах, бы ты ў чужых пакоях без дазволу?

Тут, на паляне, жанчына неспадзявана знайшла зуброўку, свяшчэнную траву. У вёсцы дужа дзівіліся, бо, казалі, немцы вывозілі з маёнтка лекавыя зёлкі, кветкі, дрэвы машынамі. Пэўна, ёй, казалі, спрыяе гаспадар. І праўда, як сярод незлічоных пераблытаных карэньчыкаў пустазелля, у дзірване, самому ні знай, ні ведай, натрапіць на такі цуд! «Павінен быў гаспадар даць нейкі знак, адазвацца», — цешылася яна. Вунь, раптам лёгкая, як подых, пара над бродам, дзе пераходзіла заўсёды. Яшчэ цёпла, яшчэ далёка да вечара, але ж так даўно сюды, у маёнтак, ніхто не заходзіў, ды яшчэ адмыслова, каб толькі праведаць, хіба магчыма вытрымаць, сцяўшы каменне на падмурку, і не сустрэць! А пад яблыняй праз ноч — два яблыкі, чысценькія на траве, побач ляжаць, як рукой пакладзеныя, з кішэні... Схавала зуброўку пад падушку — нясвойскі лясны пах, з-пад капытоў звера, аддае танюткім мускусам, таямніча прыручаная да жылля трава.

Ноччу скрозь сон пачула плач. Ці то жаночы голас, ці то мужчынскі, вызвалены з цела чалавека, бесцялесны. Чыясьці душа? Плач, каля самай галавы — так плачуць, жаляцца, бядуюць, склаўшы галовы...

Яно ўсё там, і зуброўка пад падушкай, аплакана, хоць ты нічога адтуль дамоў не нясі. «Рабіць работу, як перад дажджом! — так, успамінаюць, любіў дамаўляцца Хамінскі з новым работнікам. Столькі гадоў гіне маёнтак, і не знайшлося ні работніка, ні гаспадара, грэх сказаць, акрамя немцаў, тыя хоць нешта выратавалі, вывезшы да сябе дамоў. Выцягнулі калгасныя дзеці піяніна ў кусты, расказваюць людзі, і йгралі на ім палкамі. Ніхто з новых жыльцоў-камунараў не ведаў, як коміны чысціць, угарэлася сажа, загінуў і будынак. На могілках і сёння садзяць буракі, перабіраюць матычкай чалавечыя косткі. Запякліся на кветніку без догляду пупышкі чырвоных руж, дзе-нідзе па кветцы. Тады вецер ухапіў у жменю семя маргарытак і панёс па полі, па лесе, пусціў па вадзе. Усюды цяпер вышыванкамі

блішчаць дробныя белыя кветкі, заплюснуцца на ноч — і зноў пад ногі, пад кола.

Даўно абрушыліся сцены панскага дома, дзённым святлом, бы лагчыны, лугі, запоўніліся былыя пакоі. Дом цяпер, выдавалася ёй, скрозь, усюды, як кінуць вокам, бо калісьці чалавек будаваўся тут невыпадкова. Доўга перабіраў, а ўлюбіўшы менавіта гэтыя мясціны, ставіў дом так, каб ён упісваўся ў наваколле.

І нават неба над дахам было абрана — захад сонца, пэўна, найлепшая ягоная гадзіна.

Жанчына абхадзіла ўсё навокал, з пагорка на пагорак, колькі разоў падымалася і бачыла іх, але кожны раз нанова, не пазнавала, быццам учарашняе змывалася моцнай хваляй. Ніколі не змагла б паўтарыць іх рукой, немагчыма адной нерухомай лініяй, як нельга заспець неспакойнае мора. О, бясконцасць прыгажосці!

Сонца адвярнулася патыліцай, было лягчэй глядзець яму ўслед. Воблакі над маёнткам пырхалі чарадой сівых галубоў. Часта сюды наведвацца... жанчына пужалася ўжо, каб не вычытаць да канца, не завучыць на памяць усё, што навокал, не спасцігнуць. Вось і зноў на дарозе цішыня, але зусім інакшая, сярод звыклага: дрэў, травы, кветак — чаканне і нават урачыстасць, як за даўгім дамашнім сталом, на свята, перад чыёйсьці прадмовай, а можа, — перад новай працай у полі, ці каля піяніна? «Не уходи, побудь со мною...» — спявалася, вымаўлялася так, быццам яна сама складала гэтыя словы, павольна, не ведаючы, што скажа далей, аднымі вуснамі, як у рэдкую хвіліну прызнання. Нідзе, ніколі раней не адчувала ў сабе такі лёгкі да спеваў голас, не іначай, як трапіла ў самае гняздоўе рамансаў, дзе яны, можа, і нараджаліся. Высокае тут месца, як у небе пабудзеш. Раптам павеяла свежым, нібы перайшла ў другі пакой з адчыненымі вокнамі. О, як знаёма! Так ужо на змроку рыхтуючы ў дзяцінстве ўрокі, гартаючы старонкі ўніклівай чытанкі, убачыш яркі малюнак: крыху наводдаль, сярод поля з дробным шрыфтам іржышча стаялі дубы. Вольна, адзін каля аднаго, мудра калісьці разлічыўшыся на свой вялікі рост, на вечнасць. Неспадзяванае пачуццё маладосці побач з імі, бо ў іх інакшы адлік часу, чым у іншых дрэў. Тут надзвычай светла, як каля даўно і надоўга абжытай сялібы

з раннімі па вечары агнямі. Сцямнела ўвачавідкі, быццам падышлі й апусцілі цяжкую штору.

Ці не запазнілася трохі. Ужо была мінула пералесак, як на ўскраі выступіла чыясьці постаць. Маленькая, усохлая, бы злежаная на цвёрдым, галава, здавалася, вочы пільнуюцца, сочаць цябе, але сам чалавек нерухомы, жывасіллем падняты на ногі, і ў вачах смяротная засяроджанасць. Вусны самкнуты, адна рука на грудзях, завысока, нягнутка, бы не сама па сабе, а закладзеная чужымі рукамі. Боты высокія, можа, у паляўнічым убранні, але з эпалетамі на плячы, яны вісяць беспарадкава, шышачкамі хмелю.

Адзежа пабіта зелянькамі, пацягнута сырым магільным марозівам...

Вось-вось зараз ці яна, ці ён, адваліцца, як стой, бразне дагары. Ледзь здужала ўхапіцца за нітку свядомасці, пазнаўшы высокі куст дзядоўніка з цёмнымі ланцугамі хмелю. Агледзелася, — хоць ты хрысціся, — вось і дазвалася, нарэшце, гаспадара!

Няўжо пачало ад стомы ўваччу здавацца, самая пара — вечар! А гэта восень разбаўляла скрозь зялёную фарбу лета, дурэючы, пэцкала малявідлам па кустах, дрэвах. Залатыя блікі, барвовыя, сонечным промнем праз акно ў цёмным памяшканні высвечваліся кожны дзень новыя постаці, цэлая галерэя роду Хамінскіх. Фамільным гербам блішчэла здалёк аплікацыя з дубовага лісця. Вунь пані, немаладая, трымае свае цудоўныя даўгія кучаравыя валасы ў руках, як якую адзежыну, нехта з ёй побач прыпыніўшыся, добра не разгледзець. Назаўтра крыху далей ужо стаяла нянька, напаўпаварота, рукі на жываце: ці то прыслухоўваецца да болю ўнутры, ці то ад немачы старэчай прытрымлівае сябе аберуч. Яшчэ жаночы партрэт — адзін твар, напроць яго, як на карце, віновы знак, дама віновая. І ледзь згадвалася постаць кагосьці з дзяўчат, пэўна, Юзюня. Твару не відаць, а каля шыі, на плячах нятленны карункавы каўнер, толькі-толькі ўскладзены, і некалькі разоў на дзень — свежая сукенка. Трывога ішла ад яе неўвядальных убораў.

Нарэшце пералесак, лес, кожнае дрэва ля маёнтку ўбралася астатні раз, ні каслаўкі лішняй, ні рабаціння — скрозь светла і ўрачыста. Фарбы на холадзе быццам ужо не разбаўляліся — чыста сіні, чыста галубовы, пластамі, вышэй і вышэй, як падушкі пад самую столь. Кожнае дрэўца ў густым лесе бачна здалёк,

стаіць асобна, як у садзе, танютка ўсё распісана пэндзлем аж да гарызонта. Спыніся і глядзі, колькі хочаш, і ніхто не папросіць зачыніць дзверы, выйсці з гэтай вялікай цудоўнай залы.

Потым ліст ужо не затрымліваўся, пацёк-пацёк далоў. Праз адну марозную ноч асыпаліся дрэвы. Толькі маладзенькія дубы стаялі, як ёсць. Выйшлі, пабраўшыся, уздоўж пералеска, усе аднаго багатага заводу, лісце пакручастае, калянае, чырвонага золата, быццам яно і не леташняе, а даўнейшае дарагое ўбранне палеглых побач волатаў бацькоў.

Пара было закрываць дачу, ад'язджаць у горад. Ужо і машына каля ганку, а нешта яшчэ быццам было не зроблена, нешта не пускала. Як жа... не развіталася да вясны...

Над маёнткам стаяў гул. Верхавы магутны голас, з той вышыні, з якой нідзе болей, акрамя, можа, гор, вецер не гаворыць да чалавека. Самыя высокія ў акрузе дрэвы. Раптам старая таполя змоўкла, бы нехта яшчэ большы за яе самую абняў ейную галаву, сцішыў. Крокі па лісці выдаваліся незнаёмымі, чужымі. Усюды было прыбрана, як на беднае свята, з астатняга. На ламачча, на густое кустоўе, на дзікую траву ўскінуты лёгка, ветрам ці крыламі, сурвэткі, выцінанкі кляновага лісця. Усё чысценькае, ледзь свіціцца, пахне свежым тленам, быццам перад святам яно ўсё лішні раз і апошні памытае — абы абысціся адным светлым днём. Заўтра пад дажджамі ад убрання застанецца толькі сівы кужаль. Крыху ўбаку чорнай капліцай стаяў стары сухі дуб. Калісьці тонкае, порсткае галлё не варушылася, ніводнага гуку каля яго, як пры шчыльна зачыненых дзвярах.

«Сёння ж Пакровы», — успомніла жанчына.

На ўсёй зямлі вакол ішла шчырая служба. Ахвярным агнём ледзь свяціўся над маёнткам захад.

ДОМ ПАД ЛЕСАМ

Куплёная хата стаяла ў канцы вёскі пустым вуллём: на падлозе, паміж рамамі насыпана вос, чмялёў, леташнія матылі — сухімі кветкамі пад бэлькамі, на печы. Дзесьці чытала, ці гэта

сваё, вынашанае гадамі, бадзяючыся па чужых кутках у горадзе: увайсці ў сялянскі дом, як уваходзіш у лес ці ў раку, нічога не перарабляць, не парушаць, знайсці пад печчу кінутую гаспадаром патэльню, чапялу ў памяльніку, прас на вугалях, падцепліць печ — і жыць. Дом не тое, што з бярвення, дошак, каменння; дом — як гняздзечка, каб і рукой не дакрануцца, не спудзіць птушку, не звесці сялянскі дух. Пакоі глуха адзываліся рэхам: выдавалася, вось-вось дрэву вернецца ягоная лясная мова — не хацелася нічога ўносіць, — шафу, ложкі. Душа ўвесь час супраціўлялася, але трэба перасцілаць з'едзеную грыбам, падзіркаваную мышамі падлогу, перарабляць, бы перуном пашчапаную на палову, печ; цячэ страха. Адны вокны — на лес, іншыя — на панадворак цёткі Анці, — вясёлая сяліба. І што б ні рабіў, куды б ні ішоў — нехта ўвесь час глядзеў сюды з высокіх нябесных вокан, спрыяючы, цешачыся.

Яшчэ ў аўтобусе з Менска Ядзя лавіла сябе на думцы, што твары людскія выдаюцца знаёмымі, прыхілкімі, вачыма лёгка было адшукаць, знайсці на іх тое дарагое падабенства, што родніць усіх вяскоўцаў. Дарога да вёскі праз лес з кожным разам карацейшая. Яе не вымяраеш, не параўноўваеш ні з якімі сцежкамі, шляхамі, бо яна — да дому. Некалькі хвілін, каб скочыўшы з падножкі на зямлю, прызвычаіцца да поля, да лесу, да неба, асвойтацца. Стаіш нясмелы, разгублены, як на беразе, перад вялікай вадой, такі недарэчны, і не ў той адзежы, неба блізка і глыбока. Якраз некалькі хвілін на тое, каб адчуць цяжар паклажы ў руках, стому ад гарадскога тлуму, скінуць усё ля парога разам з абуткам — і лёгка, утрапёна ступіць пад шаты квяцістых фіранак, бярозавага маю пад бэлькамі. Якраз некалькі хвілін той дарогі, абы аднойчы, перад сконам, паспець вярнуцца смяротна атручаным, як тое мышаня, што знайшла ў падполлі: ружовыя лапы, пыса, ляжыць на бачку, як спіць, ляжыць у туга, утульна скручаным саламяным гняздзе. І гэтак па сабе яно падагнанае, што ў ім, як у саване, і закапала... З пагорка на пагорак, незнаёмы дзядзька асадзіў белага каня, едзе павольна, бы й сам пехатой, сваім ходам да чалавека, як з павозкі ўсё роўна злез — насустрач, павітаўся — і зноў ірвануў лейцы. Пагляд запытальны, што ўжо не змоўчыш, азавешся. Глядзіць крыху саромячыся, але ўладарна, як законнік. Гэтае старадаўняе права, старадаўняя патрабавальнасць адзін

да аднаго: мы тут, на гары, на гэтай дарозе адны, ты – мой напатканы падарожнік у вялікім сусвеце, дак будзь жа здаровы.

– Адкуль ідзяце? Дзе былі? – крычыць цётка Анця. – Або-о-о, што гэта я кажу, га?!. – смяецца з сябе, спахапіўшыся.

І ты ёй бязмерна ўдзячны, што яна ўжо лічыць цябе сваім чалавекам, мясцовым жыхаром, які быў адлучыўшыся некуды – не наезджым.

Уторкнуць на варажбу нанач у бэльку галінку багатак, а назаўтрае дзіцячымі вачыма разгадаць таямніцу свайго лёсу: калі трава за ноч расцвіце, жыццё будзе багатым. Чаму ж не: купіць хату ў вёсцы, пасяліцца тут, гэта як увайсці ў сям'ю, даўно пахаваўшы вясковых сваякоў, зноў набыць вялікую радню. Рад палення, рад камення – і ступу наверх! Нарэшце, можна скінуць далоў свой заплечнік, здарожыўшыся, спыніцца – ты дома! Пачуць птушак, гукі бягучай вады, галасы працінаюць наскрозь як шчаслівыя слёзы. Адзываешся нясмела, бы маўклівы да гэтага часу інструмент, што трапіў у рукі таленавітаму майстру і ён спрабуе цябе на дасканаласць.

Жаўрук пяе, пакуль ляціць уверх.

Выпраталі з гарышча салому, сена з хлявоў, аддалі суседзям на падсціл скаціне, цэглу старую – у таго под у печы паправіць, праваліўся, у гэтага – комін, дзверы, вокны, хто хацеў, той і браў. І каб аніякай платы – гэта ж цяпер свае людзі, трэба меркавацца. Ад'язджаючы ў горад, Ядзя клала ў кішэню цэлы спіс, каб не запамятаць: каму – пігулкі ад удушша, каму – сіньку цюлі падстроіць на свята, каму – пахадайнічаць наконт даведкі ў архіве, каб атрымаць інваліднасць, падлячыцца ў шпіталі. Быццам бы ва ўсіх старых ёсць дзеці, таксама жывуць у горадзе, але яна лічыла за ахвяру ўсе гэтыя чужыя турботы. Мужу, дзецям хацелася крыху падняць дом, надта нізкі падмурак. Не-не, нядобра ў старой вёсцы сярод старых людзей выдзяляцца, каб хоць не трапіць на благое вока, не ўзверадзіць якога зайздроснага суседа. Вада-верхаводка затапляла падполак. Вёска штовесну цярпліва цягала наверх бульбу, вурыла ваду, не шукала вінавайцаў, лёгка тлумачыла няўдачу: маўляў, снегу было многа, а вясна надта руплівая. А цыбуля зімовая не ўзышла, бо трава заціснула. А пісклюкоў мала ў лета пусціла каторая баба, бо крумкач пахапаў, вунь сядзіць на елцы, крумкае, бы арэхі лоцкія сулотае ў дзюбе, забаўляючыся. Слабка

бараніліся ад бяды, быццам няволле было бараніцца. І ты цяпер век вяслуйся ў сырой хаце седзючы, патрапляючы ім...

Трэба было падняць падмурак.

Тут людзі часцей саступалі дарогу і вадзе, і птушцы, і звяру. Лясны ручай цячэ вясной у вёску, нячутны, зеленькаваты, таямнічы, як лясныя думкі, нясе лясное насенне. Пазней каля самага парога ўзыдзе яно дзікай кветкай лабазніку ці ветраніцы. У сад заляціць сойка, дрозд, салавей.

Лес загаворыць да чалавека на сваёй мове. І ты ўжо, як пабраўшыся, будзеш з ім увесь час хадзіць упоплечкі, не адчуваючы адзіноты.

Але чаму так лёгка да плачу? Быццам ейны анёл-ахоўнік за плячыма ўвесь час заліты слязьмі. Ён, пэўна, яе і зводзіць...

Цётка Анця абатрэ вехцем саломы запэцканыя цэўкі, боты, выйшаўшы з хлява, паправіць хустку і па нешта ж ідзе да яе ў двор.

— Можа, замок купіла б? — пытаецца. Цёмныя ейныя вочы пасвятлелі — сочыць, пільнуе, каб не здагадаліся, што ёй трэба збыць няўдалую рэч.

Запамятавала, яшчэ летась жалілася: купіла во, ключ ледзь паварочваецца. Моўчкі ўпрошвае і злуецца, што тая марудзіць, маўляў, што табе, багатырцы, варта купіць, а мне ўбытак. Вунь якую будоўлю распачала, плот новы паставіла, веранду, печ новая — свежы дым у хаце. Цётка Анця не надта і хавалася, узяўшы некалькі цаглін, падлажыла на рацэ пад кладку, бо не пільнуецца новая гаспадыня, не дорага, значыцца, ён ёй абходзіцца, не ўгоніш яе гэтым у кошт... Нельга не купіць, нельга даць зразумець, што заспеў, як малога ашуканца. Толькі гэты візіт крыху насцярожыў: а ці не залішне яна тут, у вёсцы, добрыцца з людзьмі, можа, варта было б хоць дзеля прыліку таргавацца з імі? Але ўдзячна давяраючы жыццю, Ядзя выбачала, забываючыся на хітрыкі старой жанчыны. Можа, толькі яшчэ больш шчыра адорвала яе гасцінцамі, вяртаючыся з горада, быццам хацела яе закалыхаць, як малое дзіця, прылашчыць.

Цётка Анця мела тую сілу, што мае глыбокае карэнне лясных нагаворных гаркавых зёлак, якіх і назву ніхто яшчэ не ведае.

Рэдка тая заходзілася ў хату, хаця ўвесь час на вачах, у акне ўвесь ейны панадворак. «А кыш вон! А кыш вон, га?» — ганяе кур з лех, пытаецца, чаму не слухаюцца, карціць слова

сказаць, а ў хаце няма да каго і загаварыць – дзеці, унукі ў горадзе. Толькі на ўсю моц уключанае радыё. Штогод праз усю бульбу – ляха квяцістага маку, як дзяркаты каснік у сівых валасах. Во яна толькі яшчэ робіць пад той мак ляху. Качае граблямі зямлю, пляскае, як бы гэта цеста на стале. Узбівала, мяла грузалкі, дабаўляючы нюшок таго, нюшок гэтага, як толькі не каштуючы на смак. Не спяшаючыся, неяк па-святочнаму. Барозны няроўныя, бакі абсыпаюцца – на строй не глядзіць. І з языка не спускае, што цяжка, і сок ёй бярозавы вялы, смагу не праганяе, што дзеці не падскочылі, не кожны раз лучаць у пагоду пад'ехаць, памагчы.

І раптам загадвае разагнаць плугам лужок каля ракі, дабавіць зямлі. І жаліцца, і стагнаць, як у любосці, але не разлучацца. Не тое, што яна, Ядзя. Садзілі садок, прыкра ўспомніць, наняты дзядзька з горада спяшаўся. «Дзе сонца ўзыходзіць? – пытаецца. – Ага, ага!» Круць-верць галавой, паторкаў дрэўцы – і ў машыну. Чужы сад, ён і ёй як чужы – не запамятавала назву яблынь. Цётка Анця звычайна ў сініх штанах, запэцкае, выцягнуцца каленькі, спераду ўжо свіцяцца, тады яна, каб крыху харашэй, нацягне іх задам наперад, а можа, каб зношваліся, рваліся не да дзірак. Ніколі, каб заспяшалася, калі пойдзе дождж. Нічым не захінецца, быццам не чуе і невядома ці схавалася б пад страху, каб ночы не было на свеце.

А тут прыязджае Ларыса, афіцэрава жонка, яны з мужам будуюць сабе напроці цёткі Анці дачу.

–Вой, як Ларыса была прыбраўшыся! Як яе па бацьку? Сукенка ў кветкі, а строю-ю-ю: тут зашчапы на грудзях, тут фальбонка! І спадніца такая шырокая, можа, і сонца-клёш! Ну якраз па мне была яна змодзілася! – і рукамі, пакручанымі ад работы пальцамі, перабірае на сабе, як труднуе ад жадання ўскласці такую сукенку, надта ўспадабаўшы.

І ў будзен дзень! Ярка, светла ёй уваччу, глядзіць прыжмурыўшыся з далёкага пагорка сваёй маладосці. Як Ларысу па бацьку? – во ўшанавала! Ядзя міжволі сумелася: старасць, гразкая работа не закітавала старой жанчыне вочы, а ты тут ходзіш абы ў чым, па-простаму, цягаючы на сабе і дошкі, і цэглу, і зямлю лапатай урабляючы – толькі каб не выдзяляцца!

Што ўжо тычыцца афіцэрыхі, то, на першы погляд, і не заўважыш: прыгожая яна ці не. Яе быццам трэба некаторы час

рэстаўраваць у сваёй памяці, успамінаць, як згублены, зашораны дзе-небудзь на жыццёвым гарышчы дарагі партрэт. Быццам ціхая і непрыкметная, яна магла б быць і белашвачкай, марудная, пагляд даўгі, як за пяльцамі ці за дробным шыццём дзе-небудзь у акне дзевятнаццатага стагоддзя. Каб не густыя рыжыя, пафарбаваныя хной валасы, што цяжкім царскім турбаном велічна ўздымалі галаву. Яркі макіяж напроці сонца надзіва не вульгарны. Жывапісалася нешта нетутэйшае, неспадзяванае, знаёмае толькі па паданнях гарачых паўднёвых краін. Ну праўдзівая Клеапатра! Не, Клеапатру нельга браць да работы. Аднаго разу толькі ўдалося ёй, бачыла, пераносіць з мужам шыфер, пацяклі густыя малёўкі, на скронях ад напружання выступілі вены. Не, гэты шэдэўр жывапісу, думалася амаль здзекліва, патрабуе шаноўнага абыходжання, пэўнай тэмпературы, як у музеі.

Атрымаў афіцэр пляц на чыста чырвонай гліне, а жадалася пасадзіць дзецям хоць агурок. Цётка Анця, калі папрасілі, вымеркавала ім ляху ў сваім агародзе.

— А можа, яны мне мяшок мукі дастануць! — і стук кулачком па лаве, на якой сядзела. — А можа, прадсядацель — яны з ім добра — жыта выпіша!.. А можа, так што-якое маюць даць! — стук, стук, стук.

Зямлю шкадавала, а тут адважылася на пазыку, як у рулетку згуляць захацелася. Ужо яна тутака, маўляў, не прагадае, усё абдумала. Сам-насам абрадзіла. Але не засцераглася Клеапатра ад бабінага гневу. Тая, не хаваючыся, што брыдзіцца, пазначыла шклянку на малако, каб цётка Анця не пераблытала і ў сваю карэлую не наліла. І грошы пакінула наперад, не дагадзіўшыся, — не ў рукі, а праз унучку ейную.

— Што яна мне, як на вочы ўскінула! я торт куплю ў горадзе — і ўсе ейныя грошы! Жарт! А я ўсё летца буду за іх у кабале душыцца на гэтае малако! — бліснула на Ядзю вачыма.

Ядзя, праўда, разумела старую: ёй звыкла зарабляць па рубяльку, дакладаючы капейку да капейкі. І каб душа была на волі, не заходзячы ні ў які доўг.

У тую ноч нарваў-такі вецер навальніцу. Грымоты каціліся з аднаго канца ў другі. Выдавалася праз сон, што гэта цётка Анця мые падлогу перад вялікім гадавым святам. Ідзе, не разгібаючыся па хаце, падол у зубах, перасоўвае з карэлай

палавіны на чыстае, шоргае лавы, шафа паехала, ужо баба ў сенях, на ганку, ужо вурыць на панадворку, вось і калёсы піхнула на памост у хату, аглоблі забарабанілі на чыстых дошках у розныя бакі, як кляшні ў рака. Назаўтра, сустрэўшыся, кінула праз плячо быццам незнарок, грымнула так блізка, шаравой маланкай аглушыла – і зямля ці адцягне:

– Аднясі каменне, што брала... Сын казаў – яму самому яны патрэбныя...

«Нядобра, калі зязюля кукуе пасля захаду сонца», – тут жа ўспомніліся ейныя ўчарашнія словы. Надта скора спраўдзіліся...

Ядзя ўжо не чула, як за плячыма плакаў уголас анёлахоўнік. Аднесці каменне?! А хіба гэта пазыка?! Гэта як выгнанне. Пасля чаго чалавек павінен сабрацца і пайсці ад людзей. Так зганяе з абжытага месца пярун, калі паліць дом...

Яшчэ і тыдня не прайшло, як цётка Анця сказала: бяры, ляжаць камяні, замінаюць, уросшы ў траву... Чаму аднесці? Не было паміж імі ні свары, ні прычыны. Добра, што хоць яшчэ не заліла падмурак пад прыстройку... Цяпер Ядзя хадзіла, быццам збілася з дарогі на зямлі, згубіла час, пару. Увечары перад ноччу няўцямна падышла да ложка і стала складаць толькі што пасланую пасцелю. «А што гэта я раблю?» – спахапілася. Уначы брахаў глухі бабін сабака Букет, цяжкім безгалосным брэхам, нешта трывожыла яго па старой памяці, яго ўжо ў вёсцы, суверыўшыся, ніхто не падтрымліваў, адзін лес адзываўся, але сабака і яго не чуў – ён даўно ў адзіноце.

Уставала на досвітку, ішла ў лес. Быццам і не пужалі свежыя разоры дзікоў, незнаёмыя галасы ранішніх птушак. А тут, ужо вяртаючыся, раптам нешта выдалася: азірнулася – на ўскрайку ад дарогі стаяла... здань. Малое дзяўчо, якое зарана пабудзілі, ногі нягнуткія, тырчком, гэткі спатыкач спрасонку. Ці то ў старым адзенні, ці то пакрыта карой. У мурзатай руцэ, пэўна, ад учарашняга заціснуты зялёныя арэхі. Пакуль паспелі вочы ўбачыць – страх ужо скочыў на плечы, пэўна, ён пільнаваў яе ў лесе ўвесь час. Здань пагражальна знерухомела, каб счакаць, калі, нарэшце, пакіне чалавек лес.

«Аднясі каменне!..»

Вярнулася, у хаце ўжо былі ўсе ўстаўшы – і муж, і дарослыя дзеці, рыхтуюць сняданак, смяюцца, шуткуюць. Ядзя стаяла ў парозе ўся мокрая ад расы. Ніхто не звярнуў на гэта

ўвагі, не сказаў, каб хутчэй пераапранулася ў сухое. Мы, думала пра сябе Ядзя, інтэлігенты сельскія, народжаныя пад дажджом, пад снегам, на зямлі. Сапраўднаму гараджаніну тут лягчэй прызвычаіцца, яму патрэбен пляц і больш нічога. Яму звыкла жыць, як на лесвічнай пляцоўцы, абасоблена, адчужана, абы было дзе купіць малако, гідліва пазначыўшы свой посуд, як Клеапатра. Бо ён не зведаў шчаслівых вярыгаў вясковай сямейнасці. Яна ж будзе няўцямна шукаць тут сваю пакінутую калісьці, згубленую радзіму, будзе жадаць вярнуцца ў вясковую сям'ю. Але ж ці прымуць?..

Душа лёгка ашукваецца, абы заляцела пад страху хаты...

Неўзабаве пачаўся першы сенакос. Яшчэ адно ейнае лета зажата. Такая ўлюбёная пара, а цяпер... Цяпер яна паўсюдна шукала адказы на свае пытанні, бачыла ўсё перад сабой без замілавання, жорстка. І можа, праўдзівей, увесь час адчуваючы, як муляе каромысел, шыю не павярнуць, на якім старыя жанчыны носяць ваду з ракі, бульбу-паранку. Увесь дзень, бы замкнёнае ярмо на рабочых валах. Галавой наперад, крок павольны, шырокі, пагойдваюцца ўбакі ўсім целам — цяглавая хада. Здыме баба каромысел, посцілку пушчэйшую сцягне з ложка, пусціць на горшае — носіць на сабе ўзаплечкі траву, ахрап'е свінням, сена. Во, як казала неяк цётка Анця, косткі павыпіраліся на нагах, перак становяцца, не можа знайсці абутку, у крыжы баліць, «палец на руцэ з начы не магу адхінуць, паглядзі, верхніх зубоў няма». Стаіць, лыжкай агурок выкалупвае, жалубае, есць семя, бы салодкі кавун. А трэба спяшацца сена ўхапіць — пагода ж стаіць, чакаць не будзе, пакуль аддыхнеш.

Спёка. Кожная баба, калі толькі мае, ідзе сенаваць з мужыком. Той каторы не вытрымае, сцягне кашулю праз галаву, а яна ідзе побач, прыбраўшыся, сукенка толькі што з шафы, колецца сенажатка ў ногі, ступае, як на абцасах. Нічым не парушыць адвечнага парадку, калі ўжо на людзях, хустку з галавы толькі скіне ажно ў паўдні — фэст! І старыя ў нечым дзяркатым здалёк, сагнуўшыся — спалавелым, заламаным макам у полі, — фэст!

Віхор падхопіць каслаўку сена і доўга трымае яе ў паветры, круціць над галовамі, бы хлапчук, скачучы на адной назе з граблямі. Паглядаюць на неба, як на кут, каб хаця не захма-

рылася. Без аддухі грабуць, пласцяць. Рыкае ўпаўдні ў вёсцы, не загнаная ў хлеў нечая карова. Ці сыдзецца ўжо цётка Анця з маладзейшымі? Паходка ейная ў пільніцу, як у смерча, ідзе пасярод дарогі, выпрастаўшыся, у думках яна ўжо далёка, на сваёй дзялцы. Быццам ні грудзей ужо, ні бядра, адзежа адным строем, абы цела ў чыстае захінуць. Але ж ніколі пры сваім мужыку, калі быў жывы, і ў старасці не пераапранулася, саромячыся, толькі калі станік папросіць зашпіліць. Неяк у лазні, мыючыся разам з цёткай Анцяй, Ядзя сумелася, убачыўшы тут, у вёсцы пад лесам, зблочаную працай, састарэлую... Венеру — учыненае ненаўмысля блюзнерства. Той самы ў яе схіл плячэй, і пена марской хвалі яшчэ не сышла з кволых сцёгнаў...

Вазы рыпяць, капытоў не чуваць, такая збітая дарога, адзін гарачы пыл. Сонца ўвесь дзень свяціла пільна, без аддухі, і пакідала поле апошнім, каціласся на захад нязвыкла цяжка, як не ў той бок проста пад конскія капыты, блытаючыся спіцамі ў калёсах. Не, пэўна, яшчэ заставаўся ў полі стары дзед, кульгавы, былы паліцай, недзе з-за свету чалавек, казалі. Ніхто не падышоў да яго, не памог злажыць у капешкі, яго і цяпер баяліся, нават што добрае асцерагаліся зрабіць. І ён пэўна, да смерці так і будзе сабе думаць, маўляў, мала я вас немцу ўдаваў, свалату калгасную. Сціналася сэрца: не яго шкада, а ягоную старасць. Душа вон, так гроб, торба з ежай на ровары ўвесь дзень вісела нечапаная. Ішоў дамоў, ровар побач, як апірышча. Спіна мокрая, а там, дзе крыху ачахла, высахла — соль рагазамі, буйная, бы жарства, на пустой, мёртвай зямлі.

І так дзень — адодня. Выйшла ўвечары за вёску, яшчэ стаяў гарачы дух, пахла агарачкам першай падкапанай бульбы, спечанай тут, у сонечным попеле, пахла вячэрай. І пустое поле, і вёска здалёк падаліся незнаёмымі. І такі жаль забраў, як бывае, калі ты адлучышся ад людзей, а душа запатрабуе шчырасці. Тады ўжо ад сябе праўду не схаваеш, як на споведзі. «Збадзялася я па свеце, на чужыне...» — вымаўлялася не сваім голасам. Здэйся б, паднялася як стой з гэтага чужога гарачага камення і паляцела б на сваё зарослае, як пакінуты магільнік, селішча. Ніколі ты не будзеш у чужой вёсцы за свайго, звякуеш злоснікам з-за свету ці непамыслай нявесткай. «Ты добрая, калі багатая, — сказала неяк цётка Анця. Маўляў, лішку маеш, а жыць не ўмееш — раскідаешся, блазната!

«Аднясі каменне...»

А хіба хто лепшым быў да яе?! Адзін толькі хворы на галаву Тонік, сустрэнецца: «Здрасце і толькі вам, — скажа. А нап'ецца, б'е нагамі па веснічках дачнікаў: — Спалю, усю свалату спалю!» — як жыватом крычыць. Каб хто запытаўся: як маешся, скуль, чыя ты ёсць? Вымкнешся сам у гаворцы іншы раз, не ўтрываеш, аж горача, так хочацца сваіх успомніць. Няма з кім, ніхто іх тут не ведае. Толькі ў царкве, даўшы на памінанне, адным імем: Волька... Антык... Уладзя... Лёня, Бронік, Марыля... Толькі з Богам успомніш.

Неяк незнарок пачула бабіну размову з суседкай: «Дрэнь гэтыя наезджыя, пра што з імі пагаворыш? Таварышы нам — тыя, з кім дзеці гадавалі, з кім на работу хадзілі...» Казала яна гэтак, быццам смуткуючы па роўні. І праўда, дачнікаў — ужо амаль палова вёскі, паміраюць старыя, прадаюцца хаты.

Заспяшалася дамоў, успомніўшы, быццам можна было нешта паправіць: яна ж так і не падала цётцы Анці вады?! Тая заходзілася ў паўдні. Ядзя пазбягала сустрэч, адчуваючы перад ёй страх, як перад стыхіяй, якая можа цябе зраўнаваць з зямлёй, так сабе, без дай-прычыны разгневаўшыся. Не магу пракаўтнуць, у роце сухата, жалілася Анця. «Ні ты калі што добрае з'еў, ні ты што добрае знасіў, без палудня, во, самы гіль, — як ухапілі раніцай па яйку, то і цяпер сыты...» Забавілася на хвіліну — і зноў у поле.

Не падала на тым разе, як папрасіла, конаўку...

Можа, і не даравала б пасля ўсяго, пасля «каменння» гэтага, але карцела зайсціся да цёткі Анці па старой звычцы хоць на хвілінку. Хто вячэраў, хто мыў нанач ногі. Стол ужо стаяў перак, сям'я пабольшала — прыехалі памагчы сенаваць з горада сыны. Нізкая лямпачка над сталом высвечвала толькі схіленыя галовы, ціхія стомленыя твары. Малы ўнук нахіляецца над місай на падлозе, як над бягучай вадой, мые твар, потым залазіць з ножкамі, пялёскаецца. Баба стаіць над ім, трымае рушнік. Зачарэпнула з вываркі на падлозе вады, пліснула ў слоік, дзе было варэнне, п'е стоячы, прагна, да смаку, упусціла з рук чарпалку, бы незнарок, ды ведае, што трапіць. Кожны рух увечары надта дарагі. Малы, сеўшы на самы брыжок, можа, і заснуў, раптам кулікнуў бабе пад ногі, як птушаня з белага ўлоння місы. Тая крыкнула, засварылася, шкаматнула

за каўнер, падняла. І зноў ціха. Яна яшчэ не выпусціла лейцы з рук, толькі, во, на момант паслабіла. А бывае, што ўсе пасядуць вячэраць напроці тэлевізара, на лепшай палавіне, і Анця сядзе разам і засне. Яе не чапаюць, сцішана гавораць, смяюцца, бы званочкі на мяжы каля яе ў галавах. Ускінецца, абвядзе невідушчымі вачыма хату, як не пазнаючы месца. «Вады...» — папросіць. Прынясуць, а яна зноў спіць. Яшчэ, пэўна, дзьме ёй у твар сухаветрыца, яшчэ не выйшаў з яе, як з вячэрняга поля, вялікі паўдзённы пал...

Усюды на вёсцы вячэралі.

І на небе запальваюцца ціхія агні, нізкія, пэўна, вячэрае ўседзючкі за свечкай у царстве нябесным Ядзіна мацерына, сялянская радня. А што калі й там яны не пазавуць да сябе вячэраць, угневаўшыся, што не прала, не ткала разам, не сенавала? Што здрадзіла свайму? Ці прабачаць, што зарасло травой-сенажаткай роднае селішча, зямля пустуе?..

Неяк ідучы з сяброўкай праз суседнюю вёску ў лесе да крамы па хлеб, Ядзя раптам спынілася каля хаты на пагорку. Галубовая фарба на сценах, пашчапаўшыся месцамі, абсыпалася, старыя дошкі зніціліся, аж свіцяцца. Вокны без фіранак, адно напроці другога, чыста, празрыста праз усю хату, нават панадворак відзён на тым баку, чапяла, патэльня на прыпечку, саганы... «Нежылы дом?!.» — узрушана прагаварыла. Сяброўка пацягнула за рукаў, усцішваючы, а можа, анёл-ахоўнік незалюбіў. Бо каля хаты нерухома стаяла, склаўшы рукі, старая жанчына таксама ў нечым зніцелым, выцвілым. Галубовыя вочы, набожна ўшчуваючы, пазіралі на незнаёмых людзей. І голасу не падала, так і стаяла, бы вынесены з пакінутага жылля стары абраз... Ядзя сумелася: няўжо гэта яшчэ жыве ў ёй падсвядома пачуццё бяздомнага чалавека, які слепа месціцца пад чужой страхой, век шукае сабе прытулак? Няўжо гатова зграбсці сваю сям'ю і пераехаць?!.

Позняй восенню, ад'язджаючы на зіму ў горад, Ядзя, як заўсёды, развітвалася з домам, з цёткай Анцяй. Ужо яна і за парогам. Тая, стоячы каля веснічак, сказала, быццам незнарок:

— Я ўсё хачу ў цябе, Ядзечка, запытацца: ці відаліся ўлетку з твайго акна мае макі?

Няўжо наўмысна была пасеяўшы якраз насупраць?!. І цяпер, выдаецца, трапечацца святло поўдня на кончыках

рознакаляровых пялёсткаў. Праз несканчоныя затокі бульбы, праз платы, перакінула яна да Ядзі вясёлку сваёй кароткай, як макаў цвет на адзін дзень, сялянскай уцехі. Ядзя адчула на момант, што яна, як у першыя дні тут, у вёсцы, шчымліва любіць гэты складаны свет.

Вярнулася, зноў таропка пайшла па садзе, абышла ўсю сялібу.

Каб паспець абнесці сабой, як любоўнай чашай, кожны куток свайго засмучонага апошнім часам Дома пад лесам.

ДОМ ВОКНАМІ Ў САД

Валянціну Акудовічу

Між зоркай і бяссонніцай крыніц
цяжэй за ўсё адкрыцца чалавеку.
В. Ярац

Ад вясны да позняй восені Хрысціна ў вёсцы. Ступіць за парог давідна, першым увайсці ў свет, як у касцёл, калі яшчэ і пеўчых няма. Птушка адна, другая, нізка, пстрычкай праляцела пад нябеснай столлю, раз-пораз пужліва мяняючы кірунак. І не палёт гэта, а проста сослепу нехта паніклива блукаў у цёмных калідорах паветра, шукаючы выйсця. Вяртаюцца з палявання, запазніўшыся, лятучыя мышы? Колкая згадка ў самыя босыя пяты, бы раптам убачыў нечый свежы след. Ноч адыходзіць. Ускалыхнулася на момант бялявае палатнянае святло, вецер сцягваў, складаў у чатыры столкі прасцірадла з твайго яшчэ цёплага ложка. Хутчэй на вышэйшае мейсца, на першы рад амфітэатра, каб быць найбліжэй, добра ўсё бачыць!

Першая аблачына слаба асвяцілася, паружавела на вачах, налілася малінковым, спела, як тугая набрынялая пупышка кветкі. І варта перавесці зрок, як пялёсткамі ўжо ірдзела паўнеба – лопнуў бутон і адавіў, не ўпільнуешся. Спелыя аўсы недзе пасярэдзіне закраталіся пад ветрам, поўсць – дыба, як на сытых клубах, бы там кідалася ўбакі буйваліца ў ахвоце,

наважаная на ўсю ноч на доўгі ланцуг. Поле, лес, неба — усё ўбачанае ўпершыню гэтым днём, набрынялае, вядром зачэрпнеш расу. Шчасліва круціш галавой, як у натоўпе, не ведаючы, да каго найперш павярнуцца, да каго найперш загаварыць. І дзень учарашні такі далёкі, як мінулы год ці нават чалавечы век.

Вяртаешся праз лес. Вавёрка перабегла дарогу, ускочыла на елку, зацокала, дражнячыся. Ты адазвалася ёй гэтаксама. Тая нечакана стала спускацца. Усё бліжэй і бліжэй. І раптам невядомы дагэтуль страх не патрапіць што зрабіць, што сказаць, калі спусціцца, падыдзе блізка. Ты ведала толькі тыя словы, якія звычайна гавораць дзіцяці ці лашчачы сабаку. Зніякавеўшы, заспяшаешся дамоў.

Вёска, выдавалася, не спала. Гэта быў не сон на досвітку, да сонца, салодкі й млосны, калі ўпушчаны з рук на кароткі час ночы сякера, лапата ці лейцы, а захінутыя фіранкі на вокнах бы на дзіцячай зыбаўцы пад нябеснай столлю. Дзяркач прыціснуты ў кутку панадворка, ад вясны да зімы ў тым самым, і бронь Божа, каб каму спатрэбілася яго назаўтрая шукаць. Анідзе каб якая парушына, толькі калі начная птушка праляціць...

А гэтае жытло быццам бы даўно і назаўсёды было пакінута чалавекам. Расчынены стары хлевушок, шэры няроўны паркан, не знятая праз усё лета лесвіца на страсе, калі правілі комін. І бульбоўнік даўно адцвіў. Зжываецца мейсца. Наўдачу, ці дабудзіцца калі сонца да тутэйшага гаспадара. Спынілася на сваім панадворку пад маладым клёнам, пасаджаным калісьці, калі перабудоўвалі хату пад дачу. Кожны раз тут, пад дрэвам, бы чакаючы, калі ён нарэшце падрасце. А ўгары над галавамі, убачыла, ужо сёння распялены цёмныя шаты — вось ён і дарослы! Як далёка ўчарашні дзень...

На ганку тэрасы ляжалі два жоўтыя лісты дзявочага вінаграду, роўненька, разгладжаныя рукой, якраз, каб трапіць на вочы, умоўным знакам, што нехта прыходзіў і не заспеў. Хто той сябра, які ведае тваю мову? Здаецца, увесь час чакала вось такой размовы, як у японскім «хайку».

Гляжу — опавший лист
Опять взлетел на ветку.

То бабочка была.
Няўжо восень? Калі было?..

Вось-вось зараз праз адчыненае акно пазаве яе старая жанчына (бабуля? маці?) увесці нітку ў сляпое вушка іголкі, каб стачыць ейнае жыццё, зрабіць падобнае на людское, на жаноцкае. Не, ніхто ніколі з дарослых не дакучаў парадамі, маўляў, абавязкова патрэбна сям'я, якая яна ні ёсць, дзеці. Маці, перавязаўшы яе крыж-накрыж хусткай-раблёнкай, пайшла з дому і не вярнулася. Потым нехта падняў падпахі, уссадзіў на лаву каля труны ў той самай хустцы. Маці ў старой сукенцы, каб людзям не відалася, накрыта да падбародка марлёўкай – зніцелым, змарнелым на сібірскіх ссылках калісьці дарагім вэлюмам, падараваным прыгожай сялянцы неспадзяваным жаніхом, польскім асаднікам.

І цяпер у сцюжу карціць змодзіцца, абвязацца хусткай крыж-накрыж – ахоўным матчыным знакам.

Неяк будучы ў Каіры, бачыла, як маладая, з бедных, егіпцянка паіла ў прыбіральні з крана дзіця. Адной рукой кубачкам да вуснаў малога, другую падстаўляла пад падбародкам, лавіла пацеркі кропель, каб не замачыць белую кашульку. Сачылася вада праз тонкія чорныя пальцы, як скрозь чорны мармур. З чашы ў чашу высечанага свяшчэннага фантана дзе-небудзь у Сахары. Стоіўшыся, пустэльняй назірала за імі, адчуваючы, што ніколі не зможа прагнаць смагу, не тое каб напіцца.

Бацькі, брат, сёстры, спяшаючыся, сыходзілі некуды па сходках кінутых разбураных падмуркаў, занесеных зямлёй. Можа, таму любіла хадзіць на старое панскае памесце за вёскай. Легчы, стаміўшыся, на пагорку, каля бэзавага куста, закрыць вочы. Трава над ёй, трава ўжо скрозь яе самую. Нехта ідзе, ідзе нячутна, толькі зусім блізка пах дарагой выраблена скуры, высокія лёгкія боты з адваротамі. Вяртаўся з паляванння былы гаспадар?

Пэўна, у гэтым месцы некалі была брама, тут наследавана – не размінешся. Лёгка падняцца з зямлі, не спужаўшыся памерці. Толькі, галоўнае, варта выбраць вось такое высокае месца, дзе прывідамі ходзяць летуценныя людзі, паэты. Толькі паспець самой надзець на руку срэбны пярсцёнак, падараваны мужчынам, на ім кветкі за дзвюма ахоўна перакрыжаванымі дзідамі.

Сярод знаёмых і сяброў яна адчувала сябе найбліжэй да таго незямнога свету.

Можа таму кожная хвіліна, як у шчаслівым падарожжы. Выдавалася, адчувае, бачыць, як рухаецца зямля. Перамена надвор'я — гэта проста новая прастора неба, куды яна час ад часу трапляе, вандруючы. Вось у хмары ўвайшлі, вось набліжаемся да ўсходу, як да новай краіны, дзе аблокі колераў кволых паўднёвых кветак, што цвітуць адно імгненне, да сонца. Можа таму лёгшы спаць, не адважвалася павярнуцца да сцяны. Да апошняй хвіліны забыцця тварам да ўсяго, што відаецца ў ейным акне! Той самы клён якраз насупраць. Арганічны жэст кожнай галіны. Сок ішоў па ствале не расплёскваючыся, моцным струменем, як вада ў вялікай рацэ, уверсе плаўна выгінаўся, разыходзіўся па рукавах. Тонкая кара пульсавала, дыхала. Малюнак галін не запамінаўся, быццам ён час ад часу змяняўся без ветру, з раніцы да вечара, праз ноч. Гэтае дрэва, пэўна, ведала, што яно стаіць пад акном, навідавоку. Вочы шкада заплюшчыць. А калі й заснуць, то як у абдымках, — не адварочваючыся.

Насустрач ёй выбеглі два сабакі, Марта і ейнае шчаня Мурза. Хрысціна любіла шуткаваць, маўляў, жыве ў сабачай чарадзе, у сабачай сям'і. Марта, абы адчыніў дзверы, кумільгам ляцела з прыступак на паляну перад домам. Нізка пластуючыся, кружаняла, набірала хуткасць, пятляючы, быццам блытала свой след ці йшла па чужым следзе. Усё гэта з маляўнічай усходняй плаўнасцю, неспадзяванай для яе невялічкай асобы. Спынялася раптоўна, бы сціхла ейная нікому, акрамя яе, нячутная старадаўняя музыка. Спынялася каля самых ног, хлёстка ўскідвалася ўсім целам, месцячыся, каб адпачыць. Жаданне легчы як мага лягчэй, як мага бліжэй да зямлі, жыватом, усёй істотай, ішло хвалямі па поўсці, скочвалася рабаціннем, саслізгвала з хваста. Гэта быў ейны заўсёдны пры сустрэчы паляўнічы танец. Іншы раз таньчыла проста ад нечакана напатканай радасці. Было нават месца на пагорку, за вёскай, ідучы на старое памесце, дзе Марта танцавала амаль заўсёды, пэўна, каб пазначыць чалавеку спрыяльную зону на зямлі. Хрысціна ўскаціла туды камень — у падмурак свайго летуценнага дому. А ў ім — доўгі стол, не засланы, як калісьці ў ейным сірочым прытулку: звычайна ён змяшчаўся дзе-небудзь у былым панскім маёнтку. Дубовае дрэва

стальніцы – сонечным промнем у глыбокай вадзе. І ўся ейная вялікая сям'я напроці. Застанецца толькі апазнаць кожнага ў твар па старых пажоўклых фотаздымках, – яна сама ўжо намнога старэйшая за маці...

Тады аднекуль паяўляўся і Мурза, яна аніяк не магла патрапіць. Як у час небяспекі, залазіла ў густы куст, каб перачакаць матчыну радасць. Марта высока падымала чорную галаву, зазіраючы ў вочы. Пад самай шыяй, прыхаваны ад сонечнага святла, танюткія разводы загадкавага малюнка з маціцовым бляскам. Так можна зазірнуць на самае марское дно, знайшоўшы на беразе пасля буры недзе каля Пафаса выцяты вякамі размаляваны каменьчык. Зблытаўшы невядомыя пароды, Творца паставіў свой знак, каб спыніць чалавека перад дзвярыма таямніцы ніколі непадобных адзін да аднаго непаўторных дварнякоў. Радаслоўная Марты, пэўна, вядзецца ад сабакі, што ў легендзе індзейцаў... Бог, стварыўшы людзей і звяроў, паставіў іх па розныя бакі глыбокай прорвы, каб нічога не пераблыталася. Яшчэ цёплая зямля краталася, прорва шырэла, зяўрала бездань, усё больш і больш раздзяляючы жывых істот. Калі, здавалася, ужо было не пераадолець боскую мяжу, сабака адлучыўся ад звяр'я і пераскочыў да чалавека...

Ясная раніца – гэта ўсё роўна як вельмі шмат цвітучых сланечнікаў. А калі падлога ў хаце чыста вымытая, то і ў небе хмар не відаецца. Дом вокнамі ў сад. Лясныя галасы ў свойскіх дрэвах: прыляталі з блізкага лесу дразды, сойкі, стаяў нескончоны гул на тэрасе, дзе жылі пад страхой чорныя восы.

– Як ты тут сядзіш, ходзіш? – пыталіся суседзі. – Яны ж такія смылючыя!

Восы садзіліся на салодкія яблыкі на стале, лезлі пад рукі. Яна слабка баранілася, бы разводзіла рукамі танюткае скрыпанае прадзіва. Мерна трымцела шаўковая ніць, ссукваючыся, наматвалася на сонечную шпулю. На старой дзічцы гнездзішча сарокі, тая крала яйкі з суседніх хлявоў. Аніяк не ўдавалася людзям высачыць, дзе злодзейка селіцца, бы ў ейным рукаве. Ураблялася шкода і ёй самой, птушкі абіралі чарэшню, клубніцы. Ноччу, абы вочы спусціў, будзіла, трывожыла крыкам немаўляці сава, зеленькаватым вокам поўні ўсю ноч глядзела ў акно праз шчыліну фіранак, высочваючы чалавека, як мышу. І мела душа невытлумачальную на словах уцеху, калі нехта

ціснуўся, будаваўся побач. Як ты парушыш той давер, спорыш гняздо вельмі рэдкіх цяпер, як казаў пчаляр, земляных чырвоных чмялёў у агародзе? Век у цябе на сцежцы ўчарашняе вогнішча, бы прыхаванае попелам, жывое, абы толькі ўзбіўся на яго незнарок.

Невядома, хто тут з іх усіх гаспадар, а хто госць, бо дом калісьці будаваўся сярод карчоўя высечанага лесу.

Мурза надта не дапытвалася, утварала разборкі з кратамі, з птушкамі, абы толькі хто дзе закратаўся. Увесь дзень у пошуках, каб каго заспець. Марта, тая гадзінамі сядзела дзе-небудзь у садзе на пні ці на лаўцы, часцей познім вечарам, у цемры, у поўнай цішы, калі толькі ў твар — пахучы подых траў, начных кветак. Паклічаш — не адразу і галаву паверне. Збянтэжышся, бы парушыў глыбокі засяродак разумнейшай істоты.

— Чаго вы там забавіліся, ідзіце вячэраць! — пазаве хто-небудзь з дому.

— Цішэй... ноч на двары... — адзавешся не сваім паслухмяным голасам, бы нехта падасць табе знак маўчання.

У розныя бакі разыходзіліся хвалі спакою...

Для Мурзы сонца — гэта ўладар, паслухмяна сцюцюрыцца на прыпёку, заплюшчыўшыся. Марта, лежачы на сходках, на цёплым мейсцы, з асалодай паварочваецца з боку на бок, адчуваючы сонечны прамень, як ласкавую руку, яшчэ і голас млосны да яго падасць, грацыёзна пацягваючыся — патанае ў сваёй чароўнасці. Ёсць у прыроды дасканалыя формы — ніколі не нагледзішся. Успыхне іссіня-чорным блікам, падхопіцца, калі пройдзеш побач, у вачах столькі таго задавальнення, што на мове чалавечай называецца шчасцем. Глядзіць адна душа на другую. Біблейскае аб звярах «прах хадзячы», пэўна, дзеля таго, каб успомніць Творцу. У такія хвіліны Хрысціна спяшалася падабраць да яе ласкавыя словы, імёны, жадаючы патрапіць, жадаючы даць знаць, што адчувае ейную радасць. Паміж імі ўзнікала пяшчотная дзіцячая мова.

Добрая трэць зносін і паміж людзьмі не ў словах, а ў жэстах, рухах. Сабака ж чуе чалавека амаль заўсёды знутры.

Яна сама часта трапляла ў такі стан, калі яе агортвала пачуццё істоты, якая толькі што знайшла, нарэшце, ступіла на знаёмы зямны парог, перажываючы яшчэ адно жыццё на гэтым свеце — радасць вяртання.

Кім жа Марта была дагэтуль?..

Прыбягае Мурза, спыняецца, павольна асядае, як пад прымусам, не спускаючы вачэй з чалавека, каб не перарваць свой уважлівы пагляд. Што рэдка ўдаецца. Морду палажыла на лапы, рыхтуючыся да доўгай размовы. І... засынае. Дурэючы, сіллю перавернеш на спіну, яна пругка ўскочыць, услончыкам расставіць лапы, каб зноў не кульнуць, павядзе скамэршчаным носам, бы не пазнаючы гаспадыню. Смеючыся з яе, падхопіш на рукі, яна мякка асядае, галава схіліцца набок, як у птушкі, абміраючай ад страху, нават поўсць мякчэе, робіцца нежывой. Мурза напамінала аб адчужанасці, жыла ў доме выпадкова прыручаным прышэльцам з блізкага лесу. Загаворыш да яе, а іншы раз ад аднаго пагляду, патуліцца, пачне расчулена церці абедзвюма лапамі мордачку, вушы — адным словам, удзячная, сарамлівая сіротка. Сцены, дом ёй — цесная замкнёная прастора, мілая няволя, дзе добра кормяць.

— Марта! Мурза! Есці! — нясецца па садзе.

Мурза ўжо тут, Марта абавязкова запозніцца. Нарэшце, з'явіцца на сцежцы да ганка, бяжыць, быццам спяшаючыся, дробным уборыстым крокам, бы даўно ў дарозе. Відаць, што добра чула гаспадыню, кліч заціснуты ў зубах вясёлым птушыным пёркам. Спыніцца раптоўна за колькі крокаў, глядзіць у вочы, стаіць паслухмяным ашуканцам, якому так лёгка паверыць, што ёсць у яе справы больш пільныя, чым сняданак ці вячэра. Ніколі галопам, ніколі з прагавітасцю да сваёй міскі, ейная далікатнасць здзіўляла, прырода ўвесь час клапацілася, пільнавала сваё ўдалае стварэнне. Мурза, тая акуратна, па-звярынаму, як ля вадапоя ў джунглях, маўляў, пакуль не нап'ецца слон, нават леў чакае сваёй чаргі, не падыходзіла першай да накрытага стала чалавека.

Прыязджаў такі-сякі госць. Убачыўшы сабак, прасіў даць лапу. Аніводная не разумела, чаго ад яе патрабуюць. Марта паслухмяна разглядаецца, шукае гэтую самую лапу вакол сябе, потым гарэзліва падскоквае, цалуе госця і ўцякае. Ніколі не паспееш адхінуцца, запярэчыць ейнай ласцы, у адно імгненне ветрам раптоўным сарваны яблыневы цвет проста ў твар, — ледзь чутны дотык. Ніхто з іх не падаваў пантофлі ў вітальні ці газету, чым звычайна ганарацца гаспадары сабак. Кожны з гэтых сабак выбіраў сабе тыя звычкі, якія

больш падабаліся, аніякай дрэсуры. Госць хадзіў па садзе, захапляўся кветкамі, усякі раз нанова пытаўся іх назву, блытаўся: дэльфініум? Душыца? Зуброўка? І зноў вяртаўся да размовы аб палітыцы, пра вайну ў Чачні, грабяжы і разбоі, пра гібель тысяч людзей, як статыстычны факт, голасна, на ўвесь сад. Прасіў нарваць кветак і забываўся забраць букет. Госці прыязджалі заўсёды з незразумелага ёй, варожага асяродка.

Не аб тым хацелася гаварыць, не аб тым. Такая дасада бярэ, бы апаў, запэцкаўся падкасаны рукаў, а ў цябе ўсе рукі ў зямлі. Нахілялася паправіць падвязаны куст кіпрскай вяргіні, хавала твар. Кветка невялічкая, як у нашых зімовых, тугая, пэўна, каб здужаць, не спячыся на паўднёвым сонцы. Не звярнуў бы ўвагі, каб не колер, густы, глыбокі, вабіў позірк, доўга не адпускаў і чалавека і пчалу, колер прагі завязаць насенне, не вырадзіцца.

Госць ад'язджаў. Яна гаварыла яму, што шкадуе аб ягоным ад'ездзе, яшчэ аб нечым, узрушана, палка. Яна яшчэ спадзявалася неяк наблізіцца душой, прыхінуцца ў самы апошні момант, на парозе. Вінаваціла сябе, спрабавала згладзіць сваю невясёласць, тады яшчэ не здагадваючыся, што згладжвала, хавала свой адыход ад людзей. Гэта былі развітальныя сустрэчы.

Госці, як прышэльцы, пакідалі трывогу.

Падзывала да сябе Марту, Мурзу, ішлі ў поле ці ў лес. Раптам вылеціць з-пад ног арлан, драпежная, злая птушка. Як рукой адпіхнуць, так блізка. Галавой уніз, высока падняты плечы, выразны малюнак пер'я на нерухомых шэрых скрыллях, як высечаны на камяні. Павісае прыгожай пагрозай, уступае сваё месца нехаця, сціскае кіпцюры, нарэшце адлягаючы. І адразу лягчэй, бы гэта ён дратаваў душу.

Яна жыла ў краіне сваёй душы, дзе час не супадаў з часам сённяшняга веку.

Любіла рыхтаваць ежу на жывым агні. Языкі патухаючага полымя на вуголлі — юлёвымі гіяцынтамі. Танюткая ножка вырастае на вачах, успыхвае дзікая кветка, трапечуцца празрыстыя пялёсткі ад гарачага подыху, кветка без лісця, на адно імгненне, калі зацвітае камень дзе-небудзь у Міжземнамор'і, напоены з птушынай дзюбы. Не любіла сустракаць былых сяброў, асабліва сяброў дзяцінства, былых каханых. Пачуцці маюць свой тэрмін, сваю адлегласць. Ніхто не павінен,

калі раптам пад нагамі — адно сухое рэчышча на месцы кароткай веснавой ручаіны. І нечага прыходзіць сюды, вяртацца, як бы ты ні быў знепрытомлены ад смагі. Любіла чытаць толькі што напісаныя ад рукі вершы, неапрацаваныя, як асабістыя да цябе лісты — ёй іх прывозіў дзеля парады малады паэт. У іх яшчэ адчуваецца свежае дыханне, напісана спехам, парывіста, пад дыктоўку з нябёсаў — і тут жа адасланае. Любіла старыя дрэвы, высока, магутна разгаліноўваюцца над галавой вякі, шум лісця водгуллем, ты быццам сведка іх доўгага жыцця. І як жа марудна падымаецца, расце пасаджаны табой дуб. «Я памру маладой...» — весела падумаецца адносна ягонага бясконцага века.

Ужо чакала праца ў садзе, штодня, чакала і напятае на падрамнік палатно даўно задуманай карціны. Але паміж мастацтвам і жыццём брала ў яе перавагу жыццё. Трэба было ратаваць яблыні. Надта блізка па каранях ішлі халодныя падземныя воды, дрэвы хварэлі на чорны рак. У вёсцы не было амаль ніводнага салодкага яблыка. Ёсць летнія, але іх ядуць толькі дзеці, стары чалавек не ўкусіць, не ўесць. Прыходзіла да яе на Спаса старая жанчына, суседка, па чырвоны сапкі яблык, каб адправіць унукаў да споведзі, да прычасця. Перад гэтым памые іх, прычэша, просяць дзеці адзін у аднаго прабачэння, мірацца паміж сабой. Потым — у бабулі, у маці. І толькі пасля — у Бога.

Бы па сходках, усё вышэй і вышэй падымаюцца, несучы ў руках галінку мірта.

Найбліжэй да яе бязгрэшныя звяры, дзеці. І старыя людзі, няўжо толькі таму, што яны ўжо слабыя, бездапаможныя — не маюць сіл зрабіць шкоду ці злачынства?!.

Кожную вясну хто-небудзь з вяскоўцаў зноў і зноў прасіў адкапаць корч зімовых кветак геленіума ці перэтрума, жалячыся, што ў яго слаба нешта прыжываюцца. І ёй раіў, маўляў, пасадзіла б ты лепей болей ягадніку, кветку ж не з'ясі. Ніцелі ў чужых глухіх садах ейныя зёлкі, прападалі, даеш катораму, як на звод, на згуб сваёй душы. Раскашуе толькі бульба з буракамі, квітнее адным паганскім цветам. І дзіця неразумнае яго ў букет не збярэ.

Ейны сад квітнеў да позняй восені. Сад — любой парой сад. Ён яшчэ такі малады, што не чуваць шуму лістоты, вецце яшчэ

не развілося. І птушкі яшчэ не селяцца, толькі прылятаюць залётнікам. Як няма мовы. Хай сабе і позняя восень. Такая пара, калі вячэрняя зара не разліваецца млосна па ўсім наваколлі, як летам, святло падае фіранкамі, бліжэй і бліжэй, на самыя вочы. Стаіш, як пад вянцом, капае ружовы воск на рукаво. Ледзь абазначыцца поўня срэбным пярсцёнкам. На дрэвах ніводнага ліста, галлё ахутана адным ружовым святлом, бы цвіце абрыкос. Зара гасне, ужо толькі свеціцца вузенькі авал на гарызонце. Лясная птушка на тым, далёкім дрэве, відаецца наскрозь, графічна выведзеная тонкім пэндзалем на самым краі нябеснага блюда.

Часта наязджалі найбліжэйшыя сяброўкі, мастачкі. Гледзячы на гаспадыню, не ўседзіш, таксама працавалі ў садзе. Неяк перад самым ад'ездам у горад адна з іх раптам сказала:

— Буду ўспамінаць аб тваім садзе, як аб катарзе. Мне ўсё думалася, што некалі ж гэта твая шараварка ды скончыцца, прыедзем, будзем гуляць па лесе, маляваць, чытаць. А як аказалася, гэты сад не для цябе, а дзеля яго самога?!. Кветкі самазадаволена-злыя істоты, яны адабралі тваю прыгажосць, змарнавалі! Трэба нешта рабіць, ратавацца!

Хрысціна адчула неспадзяваную небяспеку: сяброўка рашучая, упарыстая, шкадуючы яе, вось зараз возьме высеча дрэвы, заарэ кветнікі, затопча! «Хутчэй бы да аўтобуса, а я тут... неяк жа яно будзе...» — і рукой, выдаецца, паказала ў той бок, да горада, далёка адсюль, каб не вісела над садам пагроза хмарай з градам. Лёгка, як ніколі, бегала, збірала ў дарогу, адводзіла ад свайго гнязда. Усё навокал сцішылася, маўчала, быццам таксама пільнуючыся, калі ж ад'едуць. Адзін толькі голас скрозь чэзлыя сады, ледзь чутны, зняможаны, як над вадой, з другога далёкага берага ракі. Ці то спявала, ушчувала сябе, ужаліўшыся, родная па маці цётка Марыля, яна садзіла ружачку пад адзіным акном сляпой хаты, ёй кветкі, што сонца. А можа, адзывалася баба Настуля? Ніколі не бачыліся, але ведае ад людзей: яна разводзіла настуркі нават ля сваёй студні, з якой браў ваду ўвесь канец... Стаяць уваччу жанчыны ейнага сялянскага роду, ні зямлі, ні вады, адным словам — палянцы. Вось і маці, твар не памятае, толькі вось гэта: дастае скрэплымі на ссыльных вятрах рукамі з-за пазухі (хадзіла ў горы па дровы) сон-траву, а жадалася толькі аднаго — скарынку

хлеба. Расхінаецца ў цяпле касматае апярэнне, точыцца цёмна-юлёвая дзюбка кветкі-птушаняці. Капае са столі зямлянкі, упаў пад ногі адталы ком гліны. Раптам ён скрануўся з месца, выпрастаўся, скочыў у лужыну — ажыла жаба? Заходзіцца ад здзіўлення душа. І цяпер, убачыўшы пад ейным хаднічком ля парога жабу, суседка брыдзіцца: «Ты б яе прагнала, гэтую паскудніцу!» Хрысціна патаемна ўсміхаецца.

Хто там адвярнуў камень, не чапайце, пад ім разам з жабінай ці з мышынай і мая нара...

Вернешся ад ракі — на руцэ сядзіць слімак, вінаградніца. Няўжо так доўга бавілася, абвіваючы любоўнай лазой увесь белы свет... Людзі хіба што не ведаюць: жыццё на зямлі суцэльнае, як вытканы святочны габелен: аніводнага спушчанага вочка, аніводнай брыдкай шэрай ніці.

Ад'язджалі сяброўкі. Ніколі яшчэ так не развітваліся, а гэтак чакалася сустрэчы. Як трывожны сон у дарозе: няўжо задрамала, няўжо гэта саснілася? Цяпер яна перад людзьмі такая, якая яна ёсць. Зараз пазаве да сябе сабак. Трэба жыць, трэба зрушыць ейны «каўчэг» пасярод маркотнага разводдзя бульбоўніка, уратаваць кожную зёлку, салодкую яблыню дзеля Спаса, кожны зярнюк заводнай кветкі.

Хіба не чулі, што Бог пасе коней апакаліпсіса там, дзе раскашуе дзікая трава...

Позні вечар, трэба мыць лапы. Марта, як заўсёды, недзе бавіцца. Пачуўшы незадаволены голас гаспадыні, кідаецца лашчыцца, просіць прабачэння, каб аніводнай хвіліны ў разладзе, у няміласці. Мурза, тая доўга штукуецца, не любіць вады. Хітруючы, агінае кусты, кветнікі, ідзе завулкамі, абы не напрасткі, каб неяк адцягнуць надалей непамыслае купанне. «Мы ніколі не разлучымся... Будзем жыць разам доўга-доўга, пакуль не надакучыць...» — гаварыла да іх, супакойвалася. Шчасліва блытала тэрміны іхняга і свайго жыцця.

Будзем жыць доўга. Гэта колькі?

...Марты не стала зімой, калі былі пераехаўшы з дачы ў горад, ноччу.

Знікла, аніводнага гуку, ні стогну, толькі ціха выбірала сабе месца, асцерагаючыся настрашыць, бы ў доме на ейны час адныя малыя дзеці. І першае імгненне, калі толькі адышла ад яе, ужо нерухомай, заплюшчыла вочы, адчула ледзь улоўны

дотык — ветрам сарваны яблыневы цвет пацалункамі проста ў твар, на рукі. Яна скрозь сон пакорліва ўсведамляла: гэта развітваецца Марта. Сёння яна сама разамкнула іхняе шчаслівае кулечка. Раней, чым гэта быў вырашыў сам Бог. Дашчэнту стомленая бяссоннымі начамі, сёння ноччу перастала верыць, што ўратуе, перастала пільнаваць ейнае кволае жыццё. Бы дала згоду. Далучылася да ўсіх зняверaных, ужо народжаных стомленымі, не здатных зберагчы побач з сабой дрэва, птушку, звера, — адзін інстынкт самаабароны. Спаць, толькі адно — спаць... Стаміліся, паснулі, пэўна, усе німфы. Ці можа, перад зімой яны разам з птушкамі адлятаюць у цёплыя краіны?

Ноч якраз перад каталіцкімі Калядамі. Калі перад вялікім святам памірае чалавек, з яго здымаюцца ўсе грэхі. А калі бязгрэшная істота? Падносіла да газавай гарэлкі сернік і забывалася, што хацела рабіць, агонь гас. У акне, бы ад ейнай запалкі, успыхваў кароткі зімовы захад і таксама хутка гас. Чорны сярнік яшчэ ў руцэ. Няўжо ўжо вечар? Толькі што бачыла раніцай свежы снег, толькі што нанова была пераслана зямля.

Яшчэ адзін дзень, перажыты паасобку. Ранейшае жыццё аддалялася ўсё болей і болей ад ейнага берага, як вясёлы шчаслівы параход. У адзін час, амаль аўтаматычна загараліся вокны насупраць. Гукі з вуліцы, гукі дома разладжаныя, незразумелыя, бы на чужой мове, на незнаёмым месцы. Вячэрняе святло ліхтара ці проста яшчэ не пагашанае ад учарашняга, ранішняе? Мурза не пазнавала ў горадзе голас ветру, пужалася, і нават вада з крана губляла свой прыродны гук. Варта ляпнуць вечкам ці лыжкай, уздрыгвала, ішла з кухні, напружана цікаючыся, на адных пазногцях, на дыбачках, каб той, варожы ёй дух, не заўважыў яе, не дагнаў. Цяпер, як аказалася, яны тут дзве малазнаёмыя адна адной істоты: чалавек і сабака.

Цяпер нельга сказаць, што яна жыве ў сабачай сям'і. Гаспадыня нечакана выявіла, што зусім мала размаўляла з Мурзай, і тая ўвесь час, пільнуючыся толькі маткі, цяпер жыла, бы згубіўшы павадыра. Дом апусцеў, аглох. Нясцерпная патрэба, невымоўная, як у нямка, гаварыць некаму ласкавыя словы, перш-наперш ад самага рання, звыклае на кожны дзень, як адсунуць начныя фіранкі на вокнах. Мурза не выклікала пяшчоты. Дом калеў. У ейным доме цяпер зачынены самы светлы, вясёлы пакой, дзіцячы, і згублены ключ. Марта адчувала,

куды паварочваецца сонца, абы яно яшчэ толькі абапрэцца адной пяцярнёй на падваконне, яна ўжо тут, дапільнавалася, злавіла. Ужо галаву падставіла, млосна заплюшчылася, сонечны прамень ужо ў тваіх руках, клубком, перакінутым ёю ў вясёлай гульні.

У доме павінна быць радасная боская істота, хай сабе і божая кароўка, якая раптам прачнецца сярод зімы, на раме, і адлегласць да вясны намнога робіцца карацейшай. Радасная істота найбліжэй да Бога.

Стукалася, турбавала звонкавае жыццё, нікога не пазнаць.

— Хто там? — пыталася, перасцярожліва не адчыняючы дзвярэй, горад жыў па жорсткіх крымінальных законах.

Прыйшоў выклік ад сяброў з Германіі, на выставу, дзе павінны быць і некалькі ейных карцін. Даўно аб гэтым марылася. Але цяпер яна не паедзе.

— Чаму?! Што ў цябе такога здарылася? Паглядзі «Времечко», навіны, у свеце скрозь войны, забойствы, грабяжы, а ў цябе ўсёй бяды, што сабака прапаў! Гэта проста ненармальна! — дзівіліся сяброўкі.

Калі яшчэ, маўляў, здарыцца такая магчымасць, такі рэдкі выпадак трэба скарыстаць. Тым больш якраз у пару ад'ехаць з дому, адхіліцца ад дробязяў. Але хіба яе, калі прыедзе з Германіі, нехта з іх забярэ ў сваю сям'ю, у шчаслівы дом, без супярэчнасцяў, да скону, як сабачая зграя? Няма куды перасяляцца, усё навокал цесна занята другімі людзьмі. І ці здольны сучасны чалавек, з вострым розумам, здзеклівы, прадпрыемец, даць адзін аднаму шчаслівы прытулак нават у каханні, радавацца кожны раз, калі ты проста пераступаеш парог не толькі знадворку, а з аднаго пакоя ў другі, праходзіш побач, як гэта ўмее кожны сабака. Ёй усё роўна трэба будзе вярнуцца на гэтае пустое месца. Астыгне, зусім выдзьмецца жылы дух за час ад'езду. Ёй трэба зараз, з першай хвіліны, ад парога пачаць абжывацца нанова, раздзьмухваць вугаллё. З гэтага самага, з паламанага, як пасля навальніцы, сярод разбою і грабяжа, скласці цёплае гняздо. У яе толькі вось гэты кавалак зямлі пад нагамі, яго трэба ўрабляць, як сад у вёсцы.

На зжытым месцы душы не селяцца.

Званіў тэлефон. Гатова прасіць: пагаварыце са мной, распытайце мяне. У бягучай мове, як рацэ на схіле, лягчэй знайсці

выйсце, супакоіцца, разбурыць грэблю перадумак. Маўчанне сам-насам шкодзіць. Але ніхто з сяброў не ведаў, што ёй сказаць, толькі адно тое: хопіць, кінь, сабака таго не варты. Тады проста пабудзьце разам, моўчкі даўшы сваю згоду на спачуванне: плач, я тут, з табой побач, плач, я разумею. «Заходзьцеся, мне будзе весялей...» — хацелася сказаць, і не было каму. Усплывалі на памяць гэтыя словы, якіх быццам і не ведала ніколі, так кажуць адна адной, труднуючы ў адзіноце, простыя вясковыя жанчыны, калі нехта дарагі сыходзіў з хаты назаўсёды.

Хтосьці пужаўся за ейны розум, хтосьці саромеўся аб ейнай бядзе гаварыць, каб не выглядаць дзіваком. Яна раптам адчула адзіноту, як у дзяцінстве, калі тваё гора для дарослых проста дробязь. Маўляў, жыццё яшчэ не наследавала табе, не пакінула горкага вопыту, забаўляйся пакуль, чым маеш. Самі дарослыя ўжо прызвычаіліся да бед. Мэнкі іхнія, пакуты — сапраўдны тэатр, дзе ёсць жалобныя песні, смутак выражаецца ў танцы. Можна апрануць рытуальнае чорнае адзенне — і тады кожны жывы чалавек пачціва дасць табе дарогу, каб не ўгнявіць вышняга.

Дзеці ў бядзе безабаронныя, яны не «ўмеюць» пакутаваць, — нічога акрамя адчаю.

Цяпер яна ні з кім пра Марту болей не загаворвала, адварочвалася, плячыма захінаючы свой свет, даўно забыты, занядбаны людзьмі. Цяпер ёй успомнілася, як пры сустрэчы, ці прыйшоўшы ў госці, шаснаццацігадовая дачка сяброўкі купляла ёй шакаладку: ты, маўляў, у нас дзяўчынка, смяялася.

Зазірала ў вочы набожная суседка:

— Засталася была свянцоная вада, калі поп адпяваў майго бацьку. Глядзіце, наказваў, не дайце яе сабаку, каб ён і канаў ад смагі, лепш кветкі паліце...

Няволле, казала, плакаць па сабаку, перажываць, грэх гэта, бо чалавек найвышэй за ўсіх звяроў, ён павінен над усімі панаваць... Ужо ўсе роўныя, пярэчыла яна суседчынаму Богу, бо ўсе ў небяспецы, пад пагрозай, — атручана зямля, вада, — усе, як на Ноевым каўчэгу. Усіх шкада, хто гіне, і можа, найбольш бязгрэшнага звера. У чалавека ёсць радня, блізкія, яго абараняюць законы, ён мае розум, мову. Звер безабаронны. Бяздомны сабака не віе сабе гнязда, не рые нару, спіць холадам у горадзе

на незамярзаючым вечку вадасцёкавай трубы, бы гэтая ягоная бяздомнасць часовая. Абы неяк перабыць, неяк перачакаць, пакуль чалавек нарэшце злітуецца, забярэ яго да сябе. А чалавеку дварняк як ганьба, «новы беларус», упадабаўшы моднага шчанюка, праз некаторы час прывязе яго ў ветлячэбніцу ўсыпіць, маўляў, псуе абіўку дарагой машыны або не падыходзіць да яе па колеру... Частка інтэр'еру, не болей.

Пасля размовы з суседкай яшчэ тужэй сціналася кола адзіноты.

Кім жа Марта была раней? А яна сама? Хіба магчыма прывязацца гэтак адзін да аднаго на працягу кароткага жыцця?

Дрэвы за вокнамі стаялі ўначы высокімі чорнымі кандэлябрамі да самых зорак, трашчалі агаркі. Вецер яшчэ раз завядзе рукавом — і раніца. Сляды халоднага полымя на шкле віхрамі. Усё прыгожае ў прыродзе цяпер выклікала сум. Як не можаш у поўнай меры, сэрцам, цешыцца прыгажосцю дзяўчынкі-калекі. Ніколі не любіла зіму, цяпер ёй гэтая злавесная белата скрозь рассыпанай атрутай. Вокны не завешвала. Агні таксовак на тым баку сквера па-вясковаму нізкія, падслепаватыя, як у лазні. Штовечар да самай раніцы спыняўся пад вокнамі аўтобус, гразкі, зморары, у кабіне спаў чалавек. І ёй ужо весялей, бы нехта ўлёгся ў нагах, праводзячы з ёй разам бяздомную ноч. Батарэі грэлі слаба, дом прамярзаў на трэску, выдавалася, мароз хадзіў па падлозе, перабіраў масніцы.

Нечакана згасла святло. Свечку не запальвала, цемра ахінала як забыццё, супакойвала. Засынала на хаду, седзячы, звесіўшы галаву, бы на вечку вадасцёкавай трубы, увесь час пільнуючыся, каб ніхто не наступіў, не ўз'ехаў. Гэтаксама раптоўна і прачыналася сярод начы, у хустцы крыж-накрыж, завязанай падпахі. Мурза стаяла на парозе ў ейны пакой. Пераступала з лапы на лапу, вытарашчыла вочы, бы дзіця ў начной кашулі, разбуджанае знянацку. Вось-вось не пазнае, дзе яна ёсць спрасонку, і заплача. Яна сама толькі што крыху агледзелася. Трапіў на вочы, сам выйшаўшы з цемры, плецены падножны табурэцік каля крэсла, вугал пляцёнага куфэрка на кухні, дзе хавала сухія зёлкі. У люстэрку насупраць — секцыя з кнігамі. У той дзень пасля Марты была сплюшчылася на ейных вачах на пустую пушку ад сярнікоў у сціснутай руцэ. Усё паасобку, бы толькі завезенае ў дом.

Дзень на дзень нагрувашчваўся гурбамі. Якраз насупраць чарнела пустое варонне гняздо. Пазірала на яго, як у акно свайго пустога дома. Яна магла б жыць і ў птушынай зграі, самага нізкага птушынага сану, абы сям'я. Пакідала на балконе зерне, але вялікімі маразамі сініцы не далятали да ейнага паверха — зусім гублялася сувязь з сусветам. Голас згас, нічога не магло ўзбудзіць гаварыць да некага, нечым захапляцца, мова перасыхала. Горача рукам, бы вось толькі што спусціла хворую Марту на падлогу. Выходзячы з дому па такой-сякой патрэбе, спяшалася вярнуцца, каб заспець яшчэ тое, што толькі тут, у ейных сценах. Хутчэй вярнуцца на тое месца, дзе разышліся. Іншы раз туга, адчувальная на дотык, з абодвух бакоў, ад Марты.

Гэта калі ведаеш, што нехта ў дарозе дадому і дарога тая здоўжылася абедзвюм. Тады йдзеш адчыняць загадзя засувень у сенях, не закладаеш клямку нанач. Або выходзіш насустрач, каб забіць дарогу таму, хто да цябе ідзе, карацейшай. А можа, проста сесці, склаўшы рукі, і толькі — чакаць... Мурза таксама, варта было спытацца, дзе Марта, бегла на акно, глядзела на вуліцу, яхкала. Пачуўшы яе, бяздомныя сабакі спыняліся, глядзелі на яе, задраўшы галаву, утрапёна, аж на трэці паверх, як на каменнага бажка.

Яшчэ яны не разлучаны, пакуль паміж імі смутак.

Перажывала прагна, як нешта апошняе, падараванае пры жыцці пазнанне. Ніколі раней не думаючы пра смерць, адчула сябе на апошнім схіле круга — цвяроза, жорстка, без шкадавання. Смерць, наведаўшыся ў ейны дом, закранула і яе самую, высвеціўшы сівыя валасы, крыху згорбленую постаць далёка немаладой жанчыны. Зачынены дзіцячы пакой у ейным доме, у якім хацелася заўсёды смяяцца, радавацца, весяліцца, летуценна схавацца ад лёсу, ад людзей, якія нават у вочы лічылі яе няшчаснай. Зажылася яна сярод дарослых. Быццам зазірнула ў радавое скляпенне — усе сваякі даўно там і нікога з жывых побач, хто б яе разумеў. Рвала, нішчыла паштоўкі, лісты, фотаздымкі, якія берагла, даражыла, прыбіралася ў доме, як пасля нечыяй чужой смерці, калі табе самой ягонага нічога не трэба на памяць — хавала ад зняважлівых вачэй. Марта цяпер выдавалася далёкім мроівам. Як галюцынацыя ад скрыжавання промняў святла, вясёлкавае, радаснае да слёз — не ўтрымаць рукамі, не ўберагчы.

Прычына знікнення ў ёй самой — змяніўся зрок, надышла старасць.

Жыццё кароткае і тленнае.

У сне ці яўна звязвала ўсё нажытае ў невялічкую вязку, каб толькі ў адну руку, звала да сябе ўсіх сабак і бегла з імі да той прорвы, што паміж людзьмі й звяр'ём, вяртаючы іх назад. І сама хацела яе пераскочыць. Нехта паблажліва ўсміхаўся, нехта здзекліва, а каторы й баяўся сустрэцца вачыма, як з вар'яткай. «Маеш, што заслужыла, мілачка! Молішся мала!» — крычала ўслед багамольная суседка з помслівым захапленнем. Ейная праўда, не турбавала Бога просьбамі, узяўшы сабе найменшае, тое, што не надта людзям абходзіць. Толькі, во, у першую хвіліну, калі не стала Марты, прасіла перад абразамі: «Вазьмі яе, Божа, сабе ў ахову... Паклапаціся, упусці яе ў дом вокнамі ў сад...» Бегла. Ніхто не затрымліваў. Як раптам на ейнай дарозе стаў манах у беднай рабіце, стомлены ад доўгай пешай хады. Незнаёмец ушчувальна ўсміхаўся, ля ягоных ног ляжаў уціхаміраны воўк. Дзікія галубы сядзелі на плячах манаха, пырхне каторы, пад ягоных, цёмным скрыллем, як пад габітай, асвеціцца чыстае танюткае пер'е. Яна яго дагэтуль не ведала, вось толькі што, пэўна, перад сном перагарнула нейкую кніжку. Каталіцкі святы Францыск Асізскі? Які чытаў пропаведзь «сёстрам ластаўкам і братам кветкам», адухаўляў прыроду? Якое стагоддзе? Пачатак трынаццатага. Які доўгі ягоны шлях...

Якое доўгае жыццё... І нятленнае, падумалася, і толькі гэта. Як нехта здымае з пляча ейную ношку, каб аслабаніць. Нехта кладзе на плячо белае крыло адзення першых хрысціян, яго павінны былі насіць пасля хрышчэння цэлы тыдзень — знак чысціні. І перад ёй ужо не манах, а ксёндз Ян з прыгожым аскетычным тварам, як з фільмаў шведа Бергмана. Хлопчык у белай комжы падносіць пад падбароддзе срэбны сподак. Падаюць у яго хрусталёвыя кроплі свянцонай вады.

— Яна хоча ўзяць другое імя — Францішка... — кажа нехта.

— Цяпер у цябе, Хрысціна-Францішка, яшчэ адзін апякун, — тлумачыць ксёндз.

Нікога не было побач, а тут — вакол цэлы натоўп радасных людзей, усе абдымалі яе, віншуючы...

Вядома, што сон, але які праўдзівы.

У ейных скрэплых руках ляжаў чорны францішканскі ружанец, бы ўкладзены некім ёй, памерлай, у труну.

У двары выў сабака. Мароз, позні вечар, і ходзяць людзі. Ён засяроджана, нічога не бачачы, падымае ўгору галаву і нават ледзь-ледзь ківаецца ўбакі, упаўшы ў экстаз, вые. Сёння ягоны гаспадар, бачыла на свае вочы, пераехаў у дом са знесенага жытла. Знесена і сабачча будка. Прыйшоў ён сюды за гаспадаром, пэўна, сам. Але ў гарадскую кватэру яго не збіраліся браць. Голас сабачы нязвыклы, лясны пасярод горада, якраз бы з ейнага лесу каля ейнага дома вокнамі ў сад... І надзіва не сумна было слухаць яго, не на бяду ён вые.

Няхай галосіць, абы хоць хто-небудзь з двух, чалавек ці сабака, яшчэ не згубіў прывязанасці, любові адзін да аднаго...

Раніцай прыляцелі пад акно сініцы ў вясёлых навагодніх масках. Пэўна, адваліўся мароз...

СВЕДКА

Цяпер тут, у цэнтры, мой час толькі той, калі ў горадзе пануе кароткая вясковая відніца.

Каля ракі анікога. І раптам наперадзе — хлопец з парасонам, парасон непамерна вялікі, старамодны, і ён сам хлыстка гойдаўся ў паветры ўсім лядашчым целам. Парасон падымаўся вышэй і вышэй, чалавек знікаў, як на шкле, апошняй цурубалкай.

Дождж перастаў. Яшчэ вельмі рана, яшчэ не зніклі начныя прывіды.

Дзве маладыя дзяўчыны, адна ў капелюшы, абедзве ў цёмных нетутэйшых строях, ішлі па вузкім парапеце ракі адна за адной, па-дзіцячы лавіруючы рукамі. Вяртаюцца з нейкага дзівоснага касцюміраванага балю?! І раптам заўважаеш, як туга сцягнуты пад самым падбароддзем матузы капелюша, гэта калі паміраюць заўчасна... з крыкам... ужо не маючы жывога часу самому сцяць вусны. Не падымаючы вачэй, моўчкі, то набліжаючыся адна да адной, то аддаляючыся, быццам і не разам, як выпадковыя птушкі ў небе. І недзе высока ў небе быў пазначаны іхні шлях...

Спахопліваешся кожны раз, распавядаючы: можа, няволле і ўспамінаць пра тое, што бачылася.

Ты яшчэ адна, ты, вядома, зусім адна тут, на ўзбярэжжы. Крыху пазней будзе сядзець на камені, нага за нагу, малады бомж і мяшаць лыжкай у кубку, — можа, і каву, чаму не? Ідзеш каля яго і няёмка павярнуць галаву, паглядзець у твар, як у чужое адчыненае акно ці наскрозь зашклёную веранду. І наогул, перад ім унізе рака, ціша, дрэвы яшчэ спяць белым квяцістым сном (тут якраз некалькі старых яблынь), а ты швэндаеш з сабакам па ягоных уладаннях.

Горад за раніцу пераходзіць з рук у рукі некалькі разоў.

Бомж, упэўнена чамусьці, з дому насупраць, цераз вуліцу; дом на рамонце, у суботу і нядзелю, калі яго пакідаюць будаўнікі, загараецца, украдаючыся, адно акно, загараецца амаль апоўначы, калі ў дамах побач ужо кладуцца спаць. Акно далёкім пакінутым вогнішчам дзе-небудзь каля лесу, куды я спяшаюся амаль кожны раз перад сном. Гэтая невыводная вясковая звычка ўпэўніцца, што кладзешся не апошні, што нехта яшчэ застаецца вартаваць ноч, хай сабе агонь або зорка ў небе. Калі дом насупраць заселіцца, вокны будуць загарацца без аніякай маёй увагі.

Нас вабяць адзінокія агні і адзінокія дзеці.

Ісці і ісці ўздоўж ракі, знайсці незамураваны бераг, нізкі, скрылёк намытага пяску, пена як у несцішонай гаворцы хваль праз усю ноч. Чайкі над табой бы гойдаючыся на неспакойнай цяжкой вадзе.

І горад не тое што прачынаўся, а быццам стойма стаяў усю ноч на заправачнай станцыі і драмаў, не выпускаючы з рук руля: торгнецца, скранецца з месца, – дасць газы.

Вернешся ў кватэру, будзеш «узвышаць сабой зямное»: збіраць па вялікай, як поле, кватэры шкарпэткі, кашулі мужавы ад учарашняга, збіраць сняданак, падаваць «сотавы» ў ванну, калі ён прымае душ, выпраўляць на ягоную фірму. Нарэшце зачыніць дзверы і некаторы час пастаяць, распяўшыся, каб не прамарудзіць – ён можа вярнуцца па што-небудзь, – быць напагатове. Прыслухацца да прыёмніка – муж пакінуў уключаным – і з жахам пачуць па радыёпасрэдніку ягоны голас – ён даваў абвестку: «Мне патрэбна патрыманая машына, для жонкі, бо новую яна ўсё роўна разаб'е. Сам маю шасцісоты «Мерсэдэс»...

Уключаю тэлевізар напярэймы ўспамінам: памятаецца, рыхтаваліся да роспісу, купілі сукенку, лодачкі. «Неяк тут, каля шыі, пуста, патрэбен шалік, вось гэты», – сказала. «Я не магу патраціць столькі грошай у адзін дзень, купім пасля...» – адвярнуўся. Колькі ж год мінула з таго часу?!

Уключыць тэлевізар і ўбачыць па рэкламе свой белы дом каля ракі з прапановай наведаць краму «Мэбля». І кожны раз, пачуўшы, так ніякавата, бы сама даю свой адрас кожнаму чалавеку ў свеце. Але ніхто не напіша.

Прыходзілі сяброўкі паглядзець нядаўна прыдбаную кватэру, еўрарамонт. «Ну як? Што казалі?» – дапытваўся

ўвечары муж. Што казалі? Адна з іх амаль канвульсіўна ўчапіўшыся за фіранку ў зале, быццам траціла прытомнасць, нешта казала, здаецца, пра тканіну: не моцная фарба, выгарыць на сонцы, маўляў, сонечны бок — нешта ж трэба было казаць. Другая з парога: «А ў Якубовічаў дык во як!» І гадзіну распавядала ў захапленні пра наведванне знаёмага бізнесмена, адводзячы вочы, адводзячы гаворку ў другі, чужы бок, чужы дом. Трэцяя прынесла з кілою сланечнікаў у падарунак, казала, такія во буйныя трапіліся, такія спелыя, бы яна іх збірала недзе сама, па-птушынаму, у чыстым полі, па зернюку, сухаветрыцай несла іх на тваю нішчымніцу. «У цябе ўсё ёсць, табе больш нічога не трэба», — абрабавана глядзела ў вочы, абрабаваная, канечне, мною.

Яны развітваліся, выносячы з дому нешта самае каштоўнае, яны мяне пакідалі.

Адымалі тое, што належала толькі мне самой: майму густу, уменню падабраць колер, расставіць утульна рэчы. Той самы «італьянец» у гасцёўні суседскай стаіць гэтаксама, як на продажы, у мэблевай краме. Яна мне каторая ўжо не сяброўка і не проста добрая знаёмая — яна мне быццам сястрыца, якая не атрымала сваёй долі, калі быў бацькоўскі раздзел маёмасці, спадчыны — усё, бачыш, засталося адной мне. Яны выходзілі, вярталіся ў свае хрушчоўкі пагарэльцамі, мне чуўся голас каторай з іх голасам сварлівай Сцепучыхі (з роднай вёскі), калі загарэўся ейны хляўчук: «А-а-а, гэта ты нам гора прывезла! Усё было добра, пакуль ты да нас не дасталася!» — крычала на пажары ў вочы заможнай суседцы, тая, прыехаўшы з забітай Чарнобылем вёскі, разжылася сваёй працай за адзін год.

Яны не здагадваліся, што цэнтр горада не можа быць Домам, немагчыма прысвоіць сабе месца — плошчу з натоўпам, дзе кожную хвіліну свежы чалавек побач.

Дзівіцца толькі, як не запамінаюцца ў твар нават людзі з аднаго пад'езда. Чаму?! Чалавечая шэрая плынь цэнтра адбівалася і на іх, нараджала падабенства? Людзі ніцавокія, каб ні з кім не сустрэцца поглядам і таксама анікога не запомніць? Да белага дома, да ракі прыходзілі адусюль гуляць, на шпацыр. Апоўначы збіраліся маладзёны, на чыстае месца, як да стала, разыходзячыся, сцягвалі сметніцы ў ваду, пераварочвалі лаўкі — помсцілі цэнтру, што трэба вяртацца ў Малінаўку ці

Зялёны Луг. Цэнтр не можа быць Домам, як і звычайны гарадскі блок, дзе б ён ні знаходзіўся. «У блоку ў розных кватэрах на адной пляцоўцы адначасова, у адзін дзень, могуць быць і слёзы, і гора, і радасць, і шчасце. У сапраўдным Доме гэта немагчыма», — успомніліся нечыя развагі ў «Нашай Ніве». Сапраўды, гора, шчасце займаюць вакол сябе вялікую прастору, як паводка, іх нельга абмежаваць адным пакоем, кватэрай, пераборкамі. Ці не адсюль адчужанасць гараджан паміж сабой, каб захінуцца, схаваць галаву, зрабіць выгляд, што жывеш далёка адзін ад аднаго, не бачыш суседа, не ведаеш? Чалавек будуе блок, не звяртаючы ўвагі на месца, на характар зямлі пад нагой, — ейную сілу, ейную прыгажосць, не абмінаючы дрэва, раўчука, пагорка.

Нават папалуднаваць на сенакосе ці проста адпачыць на некалькі хвілін вясковец садзіцца, як сонца: павольна, урачыста, прыглядаецца, выбірае месца, куды, у які бок тварам, да чаго спіной, пад вецер ці ў цяньку, каб засяродзіцца, каб паўсвядома супасці з рытмамі мясцовасці, а не хадзіць уборкі.

Усё навокал у прыродзе да мяне аблюбавана, пазначана, прызвычаена даўно і для звера, і для птушкі.

У акне, бачу, якраз насупраць, збіраюцца на вадзе чайкі, зімой па снезе, бы нехта іх сюды кліча, нечым частуе. Тутака яны паводзяць сябе зусім інакш. Звычайна крыклівыя без меры, тут птушкі цішэюць, асядаюць цесна, пакалыхваюцца галубовым востравам, хвалістае скрылле стулена, пэўна, пераляцелі нейкі нябачны чалавеку парог, парог празрыстага Дому. Гэтаксама, як нядаўна бачыла ўсю ў рыштаваннях новую дачу. Яшчэ без вокан і дзвярэй, лесвіцы ўверх-уніз і бэлькі крыж-накрыж, вісіць столь, дах яшчэ без шыферу, абы пазначыць свае межы ў небе. Ужо немаладыя гаспадар з гаспадыняй, наведаўшыся на будоўлю, хадзілі па лесвіцах, пабраўшыся за рукі, — уверх-уніз, уверх-уніз.

Пэўна, так выглядае і гатовы дом — празрысты, увесь наскрозь, калі людзі шчаслівыя. Дом шчасця.

А як бы выглядаў Дом бяды?!

І гэты белы, на беразе ракі, мне таксама яшчэ зусім нядаўна здаваўся празрыстым. О, пяць пакояў! Ведаеш, адзін з іх я зраблю па-вясковаму: ложак з падзорам, падушкі вялікія адна на адну да столі, вышытыя, маміны, макаткі на сценах!

Дзесяты паверх! Раніца! Амаль побач ружовыя аблокі па ўсім небе! Быццам прачнуўся ў вялікай спальні, упоперак ложка, як у дзяцінстве, калі сон раскідаў цела! Менавіта ў дзяцінстве, калі не важна куды прачнуцца галавой! На стале ахапак півоняў, рэдкага колеру — ледзь дакрануўшыся ружовым да белага!.. Пакой па-вясковаму? Ты смяешся?! — адказваў муж. Ён смяяўся.

Першыя дні хадзіла вакол белага дома, па вуліцах: о! тут хацелася б нарадзіцца! Тут шмат да чаго можна прывязацца! Была зіма, кожны раз, выгульваючы Мурзу, карцела трапіць туды, дзе вецер дыхаў жывым дымам — цеплілі ў сінагозе. Усходні малюнак сціплай будовы, бы рэдкая брошка на звычайным гарадскім адзенні. Пахі пякарні, пах падгарэлай скарыначкі, карціць адчыніць засланку, узяўшы чапялу, пакратаць бохан, павярнуць другім бокам — а! многа духу ў печы, сёння ў горадзе хлеб-закалец! Побач царква святой Магдаліны, з якога боку ні наблізішся да яе, заўсёды яна адасоблена, зрок не заўважае будынкаў побач, бы ўваччу засвечваюцца, знікаюць, як на сапсаванай фотастужцы. Ты будзеш ужо адрозніваць ейны голас са званіцы сярод другіх, ён, дальбог, весялейшы за іншыя. Але душа не заўсёды гатовая да споведзі — да царквы раіла б ісці доўга, доўга рыхтавацца.

Шкодзіць чалавеку будзённа мінаць храм з дня ў дзень, тое самае, што павесіць абраз у парозе, дзе надоўга не спыняешся, не засяроджваешся — як на лятку ў пчаліным вуллі.

Натоўп зносіў першыя ўражанні, услед выходзіла войска дворнікаў у аранжавых камізэльках, збірала смецце, бутэлькі, мяло, яно ішло па праезджай частцы дарогі, стыхійна віравала з пагорка ўніз да Траецкага.

Не, тутака можна адчуваць сябе дома толькі ў час кароткай вясковай відніцы. Адчыніць акно — тады з дзесятага паверха, як з пагорка, усё пачуеш, усё заспееш, тое самае, што самым першым на кірмаш прыехаць. Там, дзе звычайна стаянка машын перад Палацам спорту, яшчэ анікога. За ўсю ноч, у адзіноце, пагорак быццам варочаецца да свайго першаснага выгляду, як адстойваецца з часам у цішы замутнёная вада. Зямля выгнулася светлай палянай, поўнай сунічнага ягадніку, ягадніку нечапанага, дзе-небудзь у лесе, калі ўзыдзеш на цальнік. Зімой Палац спорту, з тылу, выглядае глухім хутарам,

занесеным снегам па самую страху, чайкі, галубы каля яго, як звычайна каля хлявоў, дзе нацярушана зерня, мякіны. Дрэвы нізкія, з шырокай кронай пад нізкай столлю гарадскога неба.

Духі мінулага не трывожылі, не палохалі, нават начны тапелец на рацэ якраз напроці вокан. Ён з'явіўся ноччу (першай? дзесятай?), калі чакала дамоў мужа. «У вас што-небудзь здарылася?» – запыталася старэйшая сястра ў гасцях, калі муж паехаў на працу. «Чаму пытаешся? Усё як звычайна. Чаму?» – «Ты такая напружаная...»

Я разгубілася, мяне заспелі на нечым недазволеным, бы я ўбралася ў чужую скурку абыякавага да ўсяго чалавека.

Я сапраўды не адчувала гэтай перамены ў сабе. Я што, ужо не чую болю?! Трэба было пагаварыць. «Пагаварыць? Пагаворым дома», – адказваў муж па тэлефоне. Дома – падай, прымі і – спаць, ён стаміўся, і наогул, што за праблемы? у цябе ўсё ёсць, ты ні ў чым не маеш патрэбы! Часта тэлефанавала ягоная сакратарка, пыталася, дзё ён. Не ведаю. Сакратарка лаялася па-ангельску, хмыкала, выявіўшы мяжу маіх захапленняў, выходзіла, я існую па-за межамі мужавых інтарэсаў. Ён вяртаўся дамоў з сябрам, чула з кухні, гаварылі пра замежжа. «Немкі падабаюцца? Не, не і не! Яны невысокія, нявёрткія, толькі туп-туп-туп! Во італьянкі – сапраўдныя жанчыны італьянкі!» – пярэчыў муж, захапляючыся. Рогат пасля, як на іпадроме. «Во! глядзі, глядзі, – крычаў мужаў сябра, уключыўшы тэлевізар. – Во жанчына новай маркі!»

Я глядзела, стоячы ў дзвярах. Жанчына на экране не была прыгожай, яна паведамляла мне нейкую звестку, новую звестку пра жаночае цела, як паданне. Спіна не прамая, а адкінута назад. Тонкія рукі, вострыя плечы і ўся ейная постаць ледзь пазначаны густым чорным малюнкам. Усмешка выклікала жах, яна не ажыўляла вачэй, твару, нешта трупнае ў ёй, як пасля лёгкай смерці, рухалася самнамбулай! О! О! О! – ухвалялі мужчыны.

З маёй постацю і з кухні не адважышся выйсці, не тое што: туп-туп-туп. Я перакладчыца са славянскіх моў, я трохі літаратар, я здужаю паглядзець на сябе збоку, прафесійна – я не ягоная гераіня, не!

І да ўсяго гэты ранні клімакс, пра што жанчыны пазбягаюць гаварыць нават паміж сабой, не тое што з мужам.

Прылівы, раптоўная чырвань у твары білі, як злоўленую жыўцом рыбіну, галавой аб зямлю, каб аглушыць, — умярцвенне плоці, прырода адымала права красаваць, прываблівацъ да сябе мужчыну, нараджаць. Шум увушшу, пераходзіш з пакоя ў пакой, пужаешся цішыні, спускаеш у ванне ваду, каб аб'яднацца ў вадаспад, а потым выслізнуць, зачыніць дзверы — быццам адпусціла. Сесці за стол, перачытваць учарашні пераклад і не разбіраць свайго почырку: незнаёмая рука — ты ўжо не тая, што ўчора. Думка палахлівая мільгане, як мыш. Не, трэба засяродзіцца, трэба рабіць толькі самае звыклае, каб намацаць, натрапіць на свой след — прэч пераклад! Уключыць пыласос, згатаваць што-небудзь, прыбраць, вось слоік з мёдам, пасля снядання трэба паставіць на месца, у буфет і... адчыняеш зусім іншыя дзверы. «Вецер-лістагон, са ўсіх мораў і лясоў! Ты не чапай майго следу, майго твару!» я яшчэ не навучылася хадзіць, каб гэта выглядала прыгожа: нага за нагу, па адной дошчачцы, віруючы спадніцай. Я яшчэ хвалююся, нават выходзячы штодня ў краму. Толькі гэта не той неспакой адзінокай жанчыны-сышчыцы, не, проста мне яшчэ патрэбна ўпэўніцца, што я падабаюся іншым, патрэбна адчуваць свой пол. Вось юнак адчыніў перада мной дзверы ў краму, запыніўся на момант, схіліў галаву, бы запрашаючы на кароткі паядынак, ледзь прымружаны вочы. Я таксама глядзела на яго, як звычайна не адважваешся глядзець проста ў твар на таго, хто падабаецца — на момант бы ў ягонай маладой засені ў спёку...

Ноччу прачынаешся раптоўна — вада стаіць у ямцы каля шыі, паміж грудзьмі, як у лагчынах на талай зямлі — бы змярцвелае цела вытайвалася з-пад снегу.

Падымаешся, ідзеш да акна — тапелец ужо на рацэ, значыцца, цяпер самая поўнач. Заўсёды на адным і тым жа месцы, на сярэдзіне. Спачатку прымала яго за цень дрэва з берага, але постаць прасвечвалася наскрозь, рухі пэўныя, асэнсаваныя чалавечым клопатам, — нахіляўся, мацаючы багром дно, пад ім гойдалася нешта накшталт пласкадонкі. Адзін тапелец шукаў другога, ягоная самота штоноч сцякала да Траецкага...

Мужа яшчэ няма. Што ў нас здарылася?

Я цяпер глядзела на сябе да замужжа, як на дачку. Ты мяне выхапіў з натоўпу не па любасці, табе была патрэбна, як казала свацця, прыстойная жанчына. Цяпер гэта для мяне гучыць

як тое самае, што чыстая белашвейка для паніча – ты быў багаты разводнік. Ісці не ісці?! Вакол мяне ўжо ўзнікла, моцна замацавалася тая прастора, якая ахінае закаханых жанчын, мужчыны іх пазбягаюць. Закаханая ў «беззямельнага», як лічылі па даўнейшым часе, чалавека, а мне адгукнулася – студэнт, жыве ў інтэрнаце, як і я сама. «Такі непамыслы, бронь Божа, і табе не пара», – сталі перак бацькі. І сама я мела «загану», як разумела цяпер: прыродная дабультовасць – усё павінна быць у сваю чаргу, нішто, лічыла, не павінна перашкаджаць навуцы ў інстытуце.

У «беззямельнага» даўно сям'я, дзеці, пасада... Я адзінокая прыстойная жанчына, мы з мужам сышліся і жывем. «Сышліся» – нешта зганьбаванае ў гэтым слове, уцэненае, быццам торг са скідкай – ударылі па руках, кожны з нас заняў чужое месца, вось і ўсё «здарэнне» – гаворым не сваім голасам, даруем адзін аднаму зманлівыя словы, «здарэнне», якое цягнецца дзесяць гадоў.

Гул у выцяжцы, побач голас адзінокага ў начы ветру адасабляе твой свет. Колькі не бачыліся з тым «беззямельным» студэнтам? Ёсць адносіны, якія доўжацца гадамі, хаця на самай справе быццам і не існуюць. Прачыналася ўся ў расе ягонага пажаднага цела – але ж мы ніколі ў жыцці не былі гэтак блізка! Тады што такое сон? Ён прыходзіў каханкам, маладым студэнтам. Вось быццам падымаюся на ўслон, чапляю фіранкі на вокны ў нейкай вясковай хаце... услон ківаецца... ён падыходзіць, каб падтрымаць... раптам ягоная рука... на калене! Прачнуцца! Вызваліцца! Свядомы страх скрозь тоўшчу сну: у мяне баляць ногі... абутак толькі на нізкіх абцасах... вены... малюнак галубовым, як непрыстойная юначая татуіроўка... Божа... што гэта ён... за калена, як у цёмным кінатэатры... Я такая ўжо немаладая, і ты гэтага не бачыш?! Быццам мы разам з табой з дня ў дзень і кожную ноч... не заўважыў, што я пастарэла, я змянілася... І я не стыдаюся, бо гэта на мне знакі нашага сумеснага жыцця, сляды бед і непаразуменняў... Не прачнуцца, не вызваліцца, фіранка выслізгвае з рук... Я адказваю на тваё жаданне... «Я больш не баюся ні звыкласці, ні старасці...» Сон паўтараўся.

Прачнуўся сабака, ляпнулі дзверы – вярнуўся нарэшце муж. Якраз на тое пачаліся мае пакуты. Ён глядзеў на мяне

з суседняга пакоя, падглядаючы, чужымі вачыма, не разумеючы майго стану. Сышліся... пабраліся... У горы і радасці, у хваробе і ў здароўі... Тут звычайныя прыродныя катаклізмы разам не пераадолець! «Паглядзі ў вакно, на раку, там тапелец», — адварочваюся, хаваю твар. «Што? Прабач, табе падаецца... Там анікога... Я стаміўся, быў у лазні. Ледзьве расслабіўся... прабач». Падаецца? Штоноч? Мне падаецца толькі тое, што я замужам, хочацца адказаць, але...

Але мне конча трэба ў царкву, да Магдаліны, да ейных бажніц і алтароў.

Зайшла: у царкве стаялі двое, ішло вянчанне. Яна ў чорным, і на галаве чорная хустка. У чорным? — нешта нязвыклае, нетутэйшае кінулася ў вочы, і толькі на момант. Гэта, пэўна, калі ідзеш насуперак абставінам, спяшаючыся, з адной надзеі, з аднаго здарэння пераступаеш у другое, не строячыся, не пераапранаючыся. Як у дарозе, калі гэта дарога — маладое жыццё. Бачу ў профіль: нявеста вельмі маладая, ледзь калыхалася гнуткае сцябло постаці. І ва ўсім, як ставіла ногі, трымала рукі, ледзь схіляла галаву, — тая зграбнасць, тая адпаведнасць моманту, калі нават не заглядаючы ў твар, здагадваешся аб прыродзе чыста жаноцкай. Калі любыя строі на ёй узаконьваюцца, узаконьваецца дзеянне такім, якой яна ў яго ўваходзіць, змяняючы векавыя традыцыі — такая жанчына ўладарыць над усім, яна законатворца. Расхінецца натоўп, людзі расступяцца, адмяніўшы свае погляды, абы пачулі ейную волю.

Пэўна, гэта адчуваў і святар, бо голас ягоны надзвычай урачысты, чулася моц унушэння, разлічаная на натоўп, на мноства сведкаў, хаця ў царкве, акрамя мяне і яшчэ адной бабулі, нікога не было.

Ззаду ў маладых замест шафера і шаферкі сведчылі служкі царквы: хлопец і немаладая жанчына, яна ў хатніх пантофлях і цёплых панчохах, — амаль інтымна — па-хатняму, па-вясковаму на свяце, бо пэўна ж баляць ногі, і не першае вянчанне трэба адстояць. Нябесныя анёлы пераляталі з месца на месца пад купалам, каб лепш бачыць. Вось ужо маладыя разам са святаром ходзяць круга аналоя, уступаючы ў круг вечнасці, Ён — залаты пярсцёнак, Ён сонца, яна — срэбра, Яна гатовая адлюстроўваць ягонае святло, як поўня. П'юць з агульнай чашы...

Што за чым не ўспомніць, бы асвечанае раптоўнай бліскавіцай – усё разам. Мне яшчэ было б доўга не выйсці з забыцця, назіраючы незвычайнае вянчанне, а ўжо маладая далікатна саступіла ўбок з дыванка пад нагамі, жанчына-служка спяшаецца згарнуць яго, прыбраць, служка-хлопец запыніў, пэўна, таксама асвечаны энергетычнай магутай маладых. Так і застаўся па-хатняму заламаны ражок.

У царкву ўваходзіла новая пара, нявеста, вядома, у белым, ззаду натоўп радні, сведак, як і належыць быць.

– А хто жэніцца? – не адыходзілася ад мяне старая.

– Не ведаю...

– Не ведаеш, хто жэніцца? – узрушана, аж заружавелася, як пад кропельніцай. – Тады хачу запытацца, чаму плачаш?

Старая глядзела суха, прымружыўшы вочы, так звычайна азіраюцца назад. Ну, такая непамысліца! Не хацелася ні аб чым гаварыць, нікога бачыць. Дзівачка бабуля, як можна ведаць, бы гэта адзін прыход на ўсю вясковую аколіцу? І якія б мы з ёй старыя ні былі, колькі вякоў ні мелі, ні я, ні яна не здужаем успомніць, чые яны ёсць – маладая, малады, у гэтым здзічэлым гарадскім натоўпе, дзе наогул ніхто нікога не ведае?

Але нас абедзвюх ужо нешта аб'ядноўвала, нешта значнае: мы з ёй былі адзіныя сведкі той, першай пары, нас, вясковых жанчын, аб'ядноўвала таямнічая повязь, занядбаная гарадскім чалавекам.

А потым па памяці мы будзем з ёй ціснуцца да адчыненага акна, дзе гуляюць вясковае вяселле, бабуля, яшчэ, можа, у дзеўках, падыме мяне, малую, падпашкі, каб лепей бачыць. Потым жывым плыткім касяком, як у вадзе, толькі ледзьве кратаючы рукамі, бы плаўнікамі, рушыць праз гаць адчыненых дзвярэй, гадзінамі стаяць нерухома, паклаўшы адзін аднаму рукі на плечы – сведчыць. Жанчыны глядзелі вачыма саміц: малады, маўляў, невялічкі, хіленькі, яму б дзеўку мажнейшую, шырэйшую ў крыжах, быццам тая маладая прывядзецца дзіцем ей каторай у хату. І толькі калі пачнуць танчыць, касяк закратаецца, закалышацца, пырсне ў бакі – дасць круга.

– «Не калышся, асінка, у ціхім лузе стоячы...» – пяюць даўней маладой, то і замужнія плачуць, – чую скрозь мроіва сваіх дзіцячых успамінаў. – Э-э-э, сукенка ў маладой, бачыш,

з кароткім рукавом — не дараіць... У нашай Ніны была харашэйшая...

Не перапытваю, развітваюся са старой, нашая таямнічая еднасць разамкнулася — спяшаючыся дамоў, каб хутчэй данесці ў сабе нейкае новае непаразуменне, нешта важнае для мяне асабіста.

На трамвайным прыпынку (і здумаць няможна!) ізноў яны, тая маладая пара. Ён прытрымлівае яе за талію, нешта гаворыць, смеючыся, потым адыходзіцца, купляе «Снікерс», развіхнуў абгортку, корміць яе з рук, па-птушынаму. Ізноў я тут напроці за адзіную сведку. Падыходзіць трамвай, нумар дзесяты, чамусьці хочацца запомніць — дзесяць, дзесяць. Трамвай ад'язджае, па сённяшні дзень ён мне надзвычайным вясельным картэжам уваччу.

Нарэшце ліхаманкава вылушчваецца з усяго ўбачанага: так, менавіта так трэба выходзіць замуж! Ісці да вянца, абы ён выхапіў цябе з натоўпу — на фэсце, на гулянцы ў інтэрнаце ці з жалобнай працэсіі, як запрасіў да танца — і да скону! І не пытацца, што змусіла яго назваць цябе жонкай, не сумнявацца ў сабе, у тым самым, не пераапранаючыся, не строячыся, аніякіх рахункаў, бо ёсць твая пара, ёсць твой час.

А пасля — купіць «Снікерс», сесці ў трамвай, і больш анічога!

За плячыма ў маладога быў рукзак.

Трэба нешта купіць, на полудзень, трэба «доўжыць, узвышаць сабой будзённае». Заняла чаргу, жанчына ззаду заблізка, стала цесна, не павярнуцца.

— Што вы гэтак, я аж пахіснулася...

— Гэта вас вецер хістае, — зазірнула мне проста ў твар.

— Ужо, хто пад ветрам, дык гэта вы сама! — не хаваючы роспачы, кідаю ёй абразліва і... пужаюся — жанчына амаль бабуля.

Яна памкнулася бы зазлавацца і раптам рассмяялася, бы я яе здзівіла, гуляючы ў жмуркі. Мы як на гушкалках смеху: то яна на мяне гледзячы смяецца, то я на яе. Жанчына ў нечым старамодным, лядачым напроці мяне, багацейкі. Я зазірнула скрозь яе далёка, у глыбіню свайго веку: у такім узросце, у такіх строях можна гэтак лёгка смяяцца з сябе, не звяртаючы ні на што ўвагі?! Разыходзімся амаль сяброўкамі.

Цэлы дзень вецер. Увечары сцішылася, дзе-нідзе раскіданы шматкі аблокаў, цёмнымі кавалкамі на чыстым небе, як

на вадзе пасля вялікага крушэння. Кожны вечар над белым домам кружлялі гарадскія птахі, вароны. Цэлай зграяй, кружалкамі, роем, пільнуючыся адна адной, гілялі ўніз матком, утомна спушчаным з рук, то ізноў падхопленым на рукі, каб нарэшце знайсці той канец – любоўныя сеці. Ноччу тапелец з багром блытаўся амаль у мяне пад нагамі – мы ўжо разам з ім углядаліся ў дно. «Жанчына – павойная расліна», «шкельцы, шкельцы... вар'яцтва ад гарадскога жыцця...», не, пані Забужка і Наталка Бабіна, задужа начыталася я вас, хопіць! я хачу вярнуцца да змыслаў, не трапіўшы ў Навінкі. Я збіраю рэчы, самае неабходнае, а, можа, менавіта толькі вось так, толькі гэтулькі і патрэбна чалавеку – можна ўзяць у дзве рукі, як у час навальніцы, звязаць вандзэлкі. Сядаю ў старую «Шкоду», што па аб'яве напытаў мне муж. А пэўней, – бягу праз... лес, апоўначы, разам са старэйшай сястрой – яна ўцякае ад свайго мужа, вараўнога чалавека. Я яшчэ зусім малая, я за ёй не паспяваю, чапляюся за карэнне, падаю, страх, што ўзаб'юся на гадыню, падымае на ногі. Мы бяжым напрасткі дамоў (я ў яе гасціла). Раптам сястра вяртаецца назад – згубіла грэбень з галавы. І мы шукаем яго, шукаем свой след, ідучы па месяцы, па ягоных светлых лумінах.

Нас ніхто не даганяў, тады чаму ж так спяшаліся? Сястра баялася, я цяпер зразумела, упусціць тую рашучую хвіліну – ёсць свая пара ісці замуж і ёсць свая пара разыходзіцца.

Я сядаю ў старую «Шкоду», пакідаю белы дом – еду жыць у вёску.

Я не разбіваюся ў дарозе, хаця дарога дамоў заўсёды лесам, заўсёды напрасткі.

Згубленым срэбным грэбенем зіхаціць месяц...

МЫ З АДНАГО ПОЛЯ

Прадчуванне радавога гнязда, вёскі Грыдзек, нарастае навальніцай: бунтуецца кроў, з дзікай сілай пераплятае ногі крутабярозка, мышыны гарошак – клубамі аж да паясніцы, як у маленстве, калі мяне заспела бура ў полі. І цяпер,

успамінаючы, няможна адрозніць, ці гэта кветкі, трава вакол былі пасінелі ад хмары, ці гэта акрайчык навальніцы агаркам быў зваліўшыся на зямлю. Але ніколі не ўспамінаюцца грымоты ці пошум ветру – навальніца ў полі ідзе звычайна пехатой, сапучы, сціхаюць нават конікі – гучней за ўсё шуміць кроў увушшу. Прадчуванне радавога гнязда нарастае плёскатам халодных ручаёў, спрадвечным пытаннем: а ці разліліся? А ці сышлі? Пільнуешся, бо трэ будзе пераходзіць, скінуўшы абутак, – вада са скрылямі лёду, ногі чырвонымі дракамі на снезе.

Сляды маленства свецяцца і ў цемры, мы ходзім па іх, злізваючы слёзы, усё жыццё.

Збочваю з гасцінца, іду напрасткі.

– Куды ідзеш? – пытаецца, сустрэўшыся, малады мужчына з сякерай – пэўна, вяртаецца з далёкага лесу.

– Дамоў! – адгукнулася з тае скрухі, што век бадзяешся па чужым завуголлі, з тае весялосці й палёгкі, што першы раз магу сказаць гэтае слова ўзапраўду – дамоў!

Ён стаіць, ня можа даўмецца: калі ў Соўкі, дык трэба па гасцінцы, калі ў Ваўкі, дык налева, а я паказваю ў чыстае поле, анідзе ні дамоў, ні агнёў. Ён зусім малады, ён ня ведае, што вунь там, на пагорку, дом стаяў. Цяпер нават камяні з падмурку сцягнулі ў лагчыну. Ужо я сама не намацаю зарослага ганку, дзвярэй, прайду скрозь сцены, як у даўнім сваім сне... У хаце прыбрана свежай рукой, святло ня з вокнаў і не ад лямпы, усё праменіцца само на сябе, кароткім святлом, як старое асінавае дрэва ў цемры. Раптам заўважаю рабую котку на ўслоне, добра памятаецца, што ў доме ўжо даўно анікога – хрышчуся на абразы, але прывіды не знікаюць. І поўны катух прарослай бульбы ля парогу, юлёвыя храсткі аж да столі.

Сон ня гасне, набывае новую рэальнасць – тая прарослая бульба потым рупіць мне ўвесь час. Мне ў горадзе сніцца нашае неўзаранае поле, асот з малачаем, як пачучынне на вакне. І нараніцу пачуццё невытлумачальнага разладу, няўпраўкі. Калі ўдалося гэтак моцна заснавацца, жыла ж у вёсцы ўсяго некалькі гадоў? Па слядах маленства ляту, лезу цераз плот і... узбіваюся босай нагой на адкінутую дагары шылаватым зуб'ём барану. Дзядзька Стах запрагае каня, якраз сабраўся баранаваць, кладзе мне лейцы ў рукі, каб ня плакала. Конь лёгка ходзіць, хто хоч патрапіць ззаду за ім. Лейцы слабка ў руках,

перабіраеш, як аснову, седзячы за матчынымі кроснамі, пасма да пасмы, ззаду цябе пільнуюцца птушкі, уплятаючыся ў малюнак. Пах разгорнутай, паруючай зямлі казыча храпы і каню, і чалавеку, яго чуе, пэўна, і прарослая бульба ў катуху. Дыхаеш, амаль усхліпваючы, і не ад болю — умомант загойваецца балючая пята. Не заўважаеш, як дзядзька Стах даганяе, лагодна адымае лейцы. «Досыць, — кажа, — табе досыць», — каб не захлынулася.

Ён ведае сілу духаў зямлі.

Вымурзаўшыся, прыняўшы сялянскае прычасце, як той казаў, ляту ў лазню. І толькі распранаешся: «Выходзь! Выходзь! Воўк ідзе!» — і ўсе, хто мыецца, і дзеўкі, і дзеці (акрамя старых, ім, маўляў, ужо анічога не зашкодзіць) — усе вон. Бо ў дзвярах стаіць баба, у яе наход на бялізне, яна павінна ўвайсці ў пустую лазню, каб анікога голага, іначай перакінецца табе ейнае кругамі, рабаціннем на твар. Выслізгваеш на холад прылазніка, саступаючы дарогу сталай бабе. І зноў трэба выходзіць: прыйшла Глікера. Нядаўна скінула, не хацела дзіцяці, наўмысля скочыла з высокага возу. Аж прысела да зямлі, казалі бабы, казалі сцішана, не перамываючы дужа ейнага парожняга, грэшнага цела. Злосная Глікера, і ня з нашай вёскі прыйшла замуж. Урачыста размінаемся з ёй у парозе, і ніхто ані слова дакору, ані касога вока на яе. Сталыя жанчыны баранілі нас, малых дзяўчат, і ад знявагі, грэблівасці, пагарды грэшным чалавекам, ня тое што... Пэўна, улада цемры над ейнай душою ўжо і ёсць прысуд. Толькі потым прыціскаеш блізка да сябе ўсё жыццё адну таямнічую навуку: «крыві не павінна быць відна».

Лазня, Чысты Чацвер, Вялікдзень, прыбраная хата — прывіды ўнутранага свету. Святло ад тонкага палатна ручнікоў, настольнікаў, як ад плашчаніцы. І вызваленне рук, рухі павольныя: доўга, не спяшаючыся, выціраць талерку, церніцу, здымаць парушынкі, каб аж блішчала, і раптам пачуць з вуліцы: «Сонца грае! глядзіце, людцы, сонца грае!» На сёння ўся работа паробленая, нават хату месці няволле. І ўсё, што нацерушылася за святочны дзень, ужо не прыбіраецца і не замінае воку, быццам гэта пажухлыя пялёсткі ў садзе, — сад адцвітае пад вечар. Пахне прасам на вугалях, прасавацца можна, гэта, маўляў, не работа, гэта як твар яйкам памыць ці косы расчасаць...

«Куды ідзеш?» – пытаецца чалавек на дарозе. Ён мяне быццам пабудзіў – гэта пароль людзей з нашай вёскі. Чаго? да каго? што? дзе? як жывеш? – у каго хоч могуць запытацца, гэта быццам голас іншых сфер напроці ўсяго чалавецтва. Вось і ў мяне проста на дарозе запыталіся, але я спадзяюся, што маладзён пазнаў мяне, незнаёмку, па нейкіх выхілках, характэрных толькі для нашых бабаў. І наогул, мы з ім «з аднаго поля», як у нас кажуць, і радняцца паміж сабой толькі во з гэтае нагоды. І нават калі іншы раз іду па чужой, незнаёмай вёсцы, мне, як у маленстве, хаты выдаюцца вялікімі, дрэвы высокімі, дол апускаецца, я спадаю са сваіх ног, са сваіх гадоў. Нешта змушае разглядацца, паварочвацца да вокнаў, круціць галавой, як сярод знаёмых, хай сабе на вуліцы анікога. І як мне лёгка прывітацца! Бы ступіўшы на вясковую вуліцу, ступаеш на тую дарогу, якая вядзе ў Грыдзькі.

Вёскі ўсе на свеце звязаныя дарогамі-стужкамі, і адзін канец у маіх руках – я як наважаная ўвесь час на шаўковую аброць, бы біблійная авечка.

З духамі зямлі я і не разлучалася.

Нарэшце іду па сваіх Грыдзьках. Старая вёска: бярвенне адно да аднаго ўкладалася гадамі, месцілася, нешта ўсыхала, тачылі мышы, пацукі, шашаль, нешта падгнівала, на тое месца ссоўваліся іншыя бёрны, ціснуліся – змяніліся абрысы вокнаў, абрысы дзвярэй. Іду па Грыдзьках, быццам я не мела дагэтуль глебы пад сабой: ногі падымаеш высока, ідзеш хістка, целяпаешся, як сядун-гадаванец. Пачуццё, што я першая ад людзей бачу зямлю, першая каштую ваду, чую ейны смак.

– Згубіла пуцінку да нас... – кажа адна сястра.

– У мяне раптоўна на вокнах вазоны расцвілі, на нейкую вялікую навіну варожаць, падумалася, аж во ты дасталася... – кажа другая.

– А мая ж ты сястрыца, а што адчуралася, а ня едзеш, а не паказваешся, – трэцяя сястра бы вершык прачытае па памяці і зараз жа адвернецца – яна мне ніколі нічога не выбачала.

– Ну як там Лукашэнка ў Менску маецца? – пытаецца суседка Гроня і раптам аж зайшлася. – А-а-ай! Во як! Ляцела да цябе пагаварыць, а гавару пра палітыку! Калі ж устаеш? Калі ж спаць кладзешся? – амаль галосячы. – А ці цёплая ж твая гэтая кажутка?

Падымае палу курткі, мацае, углядаючыся, яна мне шыла калісьці каптан у школу, і цяпер выдаецца заціснуты гаплік у ейных вуснах, каб стачыць фастрыгу. А ў мяне ж і лепшая засталася ў Менску, і ніхто там з мяне не пацешыцца. Шкадую сама сябе, што не апранулася харашэй.

І сцішыліся. Углядаюцца, позірк невідушчы, доўгі, бы глядзяць перад сабой у цемры, лежачы на печы, калі сон не бярэ, глядзяць ці то прыпамінаючы, ці то забываючыся.

— Так цяперака ў вёсцы маркотна — усе разам пастарэлі... — кажа адна сястра.

Суседка Лідзя Васілёва падышла да мяне, узяла маю галаву ў абедзве рукі, паварочвае да вакна:

— Дрэнна, — кажа, — бачу, а ці змянілася ж ты, хачу паглядзець...

Мы старэем сярод чужых людзей, на чужым месцы, дзе ніхто не памятае нас дзецьмі...

Во што ў іхных старых галовах, здівіўся бы чужы чалавек: не пра хлеб, не пра кілбасы гаворка, ім яшчэ весялосць наўмя. Яшчэ яны збіраюцца на Купалле ў паджыцці. Дзе б яны сабе ні былі ўдзень, што б ні рабілі пільнае і ўтомнае, увечары, пабраўшыся западрукі, ідуць у поле. Увесь май пазбіраюць, што на Тройцу пад бэлькі торкалі, — і на карчашку. Шугае полымя, спяваюць: «Сёння Іван, заўтра Ян». Ходзяць сівыя жанчыны каля маладога жыта па сваіх дзявоцкіх сцежках. Дрыготкія белыя постаці, бы сышлі яны з белага месяца, што пустым чоўнам гойдаецца ў небе далёка ад берага.

Сястра разбірае мне нанач на лепшай палове хаты пасцелю, нечапаную, можа, ад той восені. Зімой старыя людзі быццам адыходзяць у нябыт, гурбамі ляжаць падушкі на дзявочым ложку, замятаюцца завеямі сцежкі з гораду — дзеці рэдка прыязджаюць. Завея ходзіць па нашым полі, гуляючы, спыняецца ў вёсцы, укладаецца адпачыць, брывом пад самыя стрэхі. І вось нарэшце — да яе вясна ў хату, кажа. Куляюся ў сцюдзёнае ад зімы кочава, чую праз сон ейны голас.

— Я жыла як вялікая грэшніца, такі ўжо быў мой мужык благі да мяне... вараўны чалавек без меры... ну памёр... во, думаю, хоць пажыву... ды раптам мае ногі сталі адказваць. І тут, бачу, ён мяне даганяе... Што такое лёс, як ты думаеш?..

Лёс? Хачу адазвацца, а словы то запякаюцца на вуснах, то стыгнуць, зляцеўшы, – токі крыві, пэўна, маюць зусім іншую мову, якая не перакладаецца.

Мне гэты начны зацішак – самы надзейны прытулак, куды вяртае лёс за руку самых шчаслівых.

Слабкае святло выхоплівае з цемры рэальныя рэчы, насычаючы іх ранішнім галубовым колерам: вугал стала, услон на ўсіх чатырох, фіранка ў буйныя кветкі замест пераборкі, прасніца за шафай. Хутка сястра і ўстане, можа, так і не прыснуўшы, падцепліць печ, бразне вечка на вядры з чыстай вадой, грукне чапяла, кожны гук размеркаваны, усё па сваім часе – па сонцы, па зорах, па месяцы. Штодзённае шэрае покрыва расхінецца, і мне пакажацца іхняе нібыта марнае жыццё жыціем.

Ледзь расчапляю, адымаю ад сябе іхныя рукі – стрыечных сёстраў, суседак, – іду да сваёй сям'і, на могілкі.

– Наведай і майго чалавека, – кажа сястра, – во цукерак занясі, бяры, бяры, я ўжо салодкага не люблю і смаку ня чую.

«Не забудзься, табе ж трэба яшчэ кветак купіць», – напаміналі мне ў Менску перад дарогай. Маўляў, кветкі абавязкова. Але сарваныя кветкі мяне засмучаюць. Вы яго не любілі, хочацца сказаць у вочы, калі жывы чалавек, успамінаючы роднага, побач з ягоным імем ставіць змярцвелае слова – нябожчык. Гэта ўжо калі памерламу няма побач з вамі месца, калі вы змірыліся са стратай. На людзях, успамінаючы, кажаце гэтае слова ўголас, бы той яшчэ стаіць за вашымі дзвярыма, і гэта яму напамінак, каб не трывожыў, не пераступаў жывога парогу. І фарбуюць помнікі алюміневым пазасветным колерам. Не магу вымавіць, успамінаючы: няхай зямля яму катораму будзе пухам. Я з імі ўвесь час, я ня маю ім замены. А калі і жаль бярэ іншы раз, дык толькі з тае прычыны, што, адышоўшы заўчасна, яны гэтым самым былі адлучаныя злым рокам ад святочнага стала на гэтым свеце, ад шумнай, вясёлай бяседы.

Сонца праз туман, буйныя кроплі падымаюцца да зямлі ўверх, бы нехта марудна падхоплівае спушчаныя вочкі ценькіх карункаў. Гай яшчэ празрысты, дрэвы яшчэ не сышліся галовамі: віднеецца наскрозь, бы ў пустым памяшканні, калі вокны адно напроці другога і сонца свеціць праз усю хату

навылёт. Скрозь галлё, скрозь небыццё — птушыным поглядам — пералётам. У нас на Асяніны, прыкладаючы свежае захаванне, кладак да могілак не кладуць — мы палянцы, — цёпкаешся па талай вадзе, крок запавольваеш, як яно і дарала б.

Думалася, прыйдзеш нечакана, незаўважаным, давядзецца будзіць, аж усе твары павернутыя якраз да дарогі — помнікі стаяць, бы сыходзячы з пагорку, толькі калі хвоі катораму замінаюць.

Тут надзіва зямлю не сціскае параза нематы.

— Во калі аказалася... — чую ад даўняй пары голас дзядзькі Антося, цяпер ён ужо тутака.

Здавалася б, чужы чалавек, аж з таго канца вёскі, але і ён цешыць мяне сваім правам на папрок, маўляў, яны клікалі, а я не адзывалася. Быццам аніхто ў Грыдзьках усе гэтыя гады не зашчапаў дзвераў нават на ноч, спадзяваліся, што вернешся, што парой яшчэ, ня позна, што не ўзлаваліся на цябе — яшчэ чакаюць, як з вечарын пад раніцу.

Да кожнага трэба падысці, дакрануцца да агароджы з сухімі кветкамі, як да гародчыка перад хатай. Цётка Кленя... Клеапатра?! — напісана на помніку. Мы паблажліва з ёй перасміхаемся — жарт, царскае імя! А я і ня ведала, і ў вёсцы ці хто чуў. Цётка Гірына... «А гэтых старых пара ўжо ў сасоннік халадацца!» — увесь час смяялася са сваёй старасці. Глікера... дзед Мацейка, дзядзька Імполік, дзед Валерык, нідзе болей ня чула, каб так ласкава клікалі старых... Франя? у цёмнай хустцы, але ж ты ніколі хусткі не насіла? Ты ж намнога маладзейшая за мяне! Жалобным покрывам ахінуўся на момант сасоннік. Гэтыя твары... Па іх я жыла, як па аракуле, і далёка адсюль вызначала сваіх прыяцеляў, сяброў па родных позірках, і давярала толькі падабенству. Лавіла па свеце інтанацыю іхніх галасоў і толькі тады адзывалася. Паўтараю іхныя рухі, хай сабе і ня тку абыдзённага намётку: гэта калі за адзін дзень і намяць ільну, і спрасці, і выткаць, каб абнесці яго каля скаціны, першы дзень выганяючы ў поле. Хай сабе і не кладу ў рот журавіны, каб сліны прыбавіла, прадучы воўну.

І спыну ня маю ў горадзе: «нібыта ля млына завозна — няма каня паставіць дзе», як сказаў адзін паэт.

Падыходжу да сваіх. Цётка Марылька, дзядзька Стах... Раптам, быццам зусім побач адымаюць, вось ужо адшчапілі ад

зімы падвойную раму ў акне ці то торгнулі ўмерзлыя за ноч дзверы, тыя, што ад ганку, — гэта запрацаваў на хваіне дзяцел, зацерушыў вочы. Матыль прачнуўся, абляцеў круга і вярнуўся. Прыбіраю, хаджу вакол, не заўважаючы, што сонца звярнулася, цені пасталі з другога боку, бы змянілася варта. Затрашчала запаленая свечка, весела, ярка, бы ў камін нехта падкінуў свежыя дровы і сеў побач — пацягнула цялесным духам.

— А ці ведаеш ты, жанчынка, чыю магілку прыбіраеш, га? — голас моцны, лёгкі, падымаю вочы...

Цётка Адэля? Пра яе казалі: нешта з ёй сталася на маладзіку, мяне не пазнае.

— Гэта ж асадніцкая дачка пахавана... жонку асаднік узяў з нашых, вясковых... сям'ю саслалі... бацькі тамака згінулі, а дзяўчаты вярнуліся з таго пекла, з тых маразоў... мароз што скаціна, адзін куст абыдзе, другі затопча, ага-ага-ага... старэйшая доўга не пажыла, во гэтая... а меншая і цяпер жывая, недзе ў горадзе, палякі, тыя і дзялоў не мелі, ня сыскавалі малой, во як, ага-ага-ага... гадавалася ў беднай матчынай радні, сярод нас, у вёсцы... рэдка наведваецца, я б яе ўжо і не пазнала... а што ўжо жонка асадніка была добрая людзіна... і ён чалавек справядлівы, грэх сказаць... але задужа ганарысты, бясконца... як жаніўся Стах, родны жончын брат, дык на каленьках ледзьве дапрасіўся асадніка прыйсці на ягонае вяселле... ага-ага-ага...

Адэля адыходзілася, зноў вярталася, прыносіла мае цукеркі, сабраныя па могілках: «На, пасаладзі ў роце».

Во калі я даўмелася, успомніўшы словы старога Антося, калі была наведаўшыся некалькі гадоў таму назад: «Дзякуй, што зайшліся, дзякуй, што не паганьбавалі...» Не паганьбавалі?! І на «вы»? Гэта, пэўна, ужо ён не да мяне, пэўна, дзед бачыў побач са мной тое, што не ўспрымаецца зрокам — майго бацьку, польскага асадніка. А мне дык хапае таго гонару роўна па гэтулькі, каб ні ад чога не адрачыся, ня зганьбіць, ня страціць, пабраўшы крошкі ня тое што з сялянскага стала, але і пад сталом...

Намацаўшы радавое карэнне, ногі амаль не ішлі. Свет вельмі вялікі, жыццё ўтрапёна кароткае, навошта прывучацца да чужога дому, навошта спробы палюбіць яго. Калісьці гэта былі чыесьці чужыя словы, але зараз яны ўжо сталі маімі — маім сумневам...

КОЛА

Толькі памятай:
калі ня любіш,
спусташаеш свет.
Ксёндз Ян Сохань

Сава праляцела нізка паміж густымі дрэвамі і па пацёмках, не зачапіўшы вялікім скрыллем ніводнага ліста, бы нехта таропка перайшоў на другім паверсе дома, падабраўшы начную кашулю. Мы з Мурзай павярнулі з лесу, з гэтых начных пакояў назад, у вёску. А раніцай яшчэ лепей: заляцелі на веранду дзве сініцы, доўга назалялі, абтрасаючы букет на стале, сухія зёлкі, не ўдавалася выправіць — і забылася на іх. Зайшлася і чую, што птушак ужо няма — веранда бы птушынае пустое гняздо.

Выдасца час, дзень, што і чалавека ў вёсцы не сустрэнеш — адныя птушкі — сенакос!

Бразнулі дзверы — баба стаіць на парозе, незнаёмая, далёкая, пэўна. Хустка нізка на лоб, рагамі сцягнута на патыліцу. Кола, кажа, на дарозе рассыпалася ў тарантасе, сена вязла, у людзей тут колы не драўляныя, не задапамагліся, во толькі ў вас убачыла на сцяне ад вуліцы. Баба стаіць, маўчыць, чакае... Мы ўжо ўдзвюх на ейнай дарозе. Нават выпадкова ўзышоўшы на палявую дарогу калясьмі, чую ейную цягу, сілу, іду па ёй доўга, не саступаючы, іду лягчэй, як конь, без паганятага, вяртаючыся дамоў — яна мне вечным напрамкам — Млечным шляхам. Іду, абчапаўшыся вялікай хусткай-апінанкай у шклянкі, пэўна, я яе зняла з матчыных плеч, калі яна, сялянка, выходзіла за майго бацьку, польскага асадніка. Іду басанож, лодачкі ў руках, і ў снах я заўсёды босая, мне карціць зняць абутак з нагі гэтаксама, бы нарэшце саскочыць на зямлю з доўгай вузкай кладкі-зыбаўкі. Але... Яшчэ добра памятаю, што кола гэтае, згледжанае бабай, ледзьве адмылі ад дзёгцю, адкалупаўшы яго ў суседа за хлявамі. Што пафарбавалі. Што цяперака яно як бы стылізуе наша вясковае жытло. Мне шкада яго аддаць і не адважуся пярэчыць: вочы ў бабы, як у тапельніцы, стаячыя, залітыя потам — кола павінна быць, калі яно вартае, на мейсцы, у тарантасе!

Пераход у ейнае жыццё карацейшы, чым ад пісьменніцкага стала на панадворак, каб зняць тое кола са сцяны.

– Навошта аддала? – выводзіць мяне з трансу пляменніца. – Кажаш, баба абяцала прывезці вечарам?! Паглядзім! І наогул, ты б бачыла свой твар, абы толькі хто з вясковых цябе зачапіў, загаварыў!

У ейных вачох я хаджу па вёсцы, жыву тут у блазенскім каптуры: адпэйтаюць, зняважаць – выбачаю, рада пазычыць, хутчэй аддаць што якое, быццам і зямля, і неба, і кола – усё іхняе. І праўда, ці адчуваю я тутака сябе ўдома?! Хоць і зямля выкупленая, і жывеш гадоў з дзесятак – дача не дача – загарадны дом. Яны тутака карчавалі лес, смаглі, вунь у суседа яшчэ сівы дым у валасах, будаваліся, тутака скрозь іхнія сцежкі. Вось глыбака ўзаруць, засеюць калгаснымі аўсамі ці жытам, а сцежкі, бачу, бы па возеры, па вадзе, на доўгі ціхі дождж варожачы, выступяць зноў. Бягуць тамсама, што і летась, і пазалетась, у розныя бакі. І пазнаць няможна, па што якое ходзіць чалавек: то да дубоў у Кудры, то ў Каменны Лог, то ў балота, калі яшчэ ані тых грыбоў, ані ягад, ані сенакосу. І хто ён ёсць – у вёсцы адныя старыя і тыя лічоныя. І не на аднаго чалавека сцежка, густая, нага ў нагу – дзедавы? прадзедавы? – і след мокры. І па лесе гэтаксама. «А я ўжо і па тваіх хаджу!» – скажа мне, можа, на ўцеху найлюбшая суседка Надзя, бы толькі што адклаўшы кнігу на калені, перакладаючы Ананіяшвілі: маўляў, след твайго дыхання ў кнізе свету ні вечнасць не сатрэ, ні забыццё...

Вось табе і маеш: як з пажару, з чужога гора выхапіць тое кола і схаваць – а ў людзей самая пільніца.

Сенакос! Ужо ў нашай старой вёсцы няма такога свята, зязюля толькі кувае – лясныя званы ад аднаго лесу да другога. Сусед Хведар крыкам крычыць на ўсё поле, што не прыехаў абяцаны зяць з дачкой памагці.

– Ужо калі ты ім у сумку што-якое дасі ў горад – пасяку! – спавядае жонку.

Тая ідзе за возам, як упрогшыся – галавой уперад, ногі ззаду, упрэўшы, укарэўшы. Мошкі хмарай. Надзя з поля нешта скора вярнулася, ага, грабавідла пашчапалася, ногі падымае высока, каб не паваліцца – за потам дарогі не бачыць.

– Надзя?! – і казаць ня маю чаго, абы вывесці яе з непрытомнасці. – Пэўна, удалося добра ўкасіць, возіце сёння і возіце.

— Я ўжо толькі адну капу здужаю на воз падаць, — вінавацціца. — Трэццюю сукенку ад раніцы змяніла, усё мне цесна, усё намульвае, гэтак цела набракае, як дзяжа на печы. Неба мурзаецца, гром недзе кратаецца. Баішся грому? Падымі, як пачуеш першы гром, што-небудзь надта цяжкое. Што? Хоць бы і печ у хаце! І болей не забаішся!

І не смяецца! На момант, абы яна загаварыла да мяне, ні тваіх гадоў, ні тваёй навукі, толькі дзіцячае пачуццё шчаслівага выкармака «млекам мовы».

— А мы яшчэ не снедалі! Мы так: снедаем, абедаем — раз, палудневаем, вячэраем — два! — расстаўляе тычкі, размеркаваўшы свой сенакосны дзень.

Гаворыць, а рот западае, вусны падцінаюцца, бы сёрбае надта гарачае. Тутака жывучы, век карціць уціснуцца, уставіць, як палку ў ейнае кола, паклікаць на дапамогу багіню Імізіду, каб вызначыць меру рэчаў, меру працы, меру сялянскага здабытку. Ледзьве стрымаешся іншы раз. Яна з хаты выходзіць, уцякае, калі дзеці крыку наробяць, з горада прыехаўшы, каб свіней не трымала, карову, страшаць, маўляў, будуць прадаваць. Дык яна тады хітрыкамі давай рабіць: насеяла быдловых буракоў ціхенька, маўляў, нідзе ня дзенецеся, будзеце палоць! Хацелі ляху ля хаты запусціць травой, каб было дзе гуляць малым унукам, дык як раззлавалася і есці разам не пайшла: дзеці растуць, яны ж не на ўсё жыццё дзеці, кажа, а зямля запускаецца, дзічэе! Было што і падзяліла быццам зямлю паміж дачок, а кожную вясну пераменьвала іхнія дзялянкі, перакідвала з рук у рукі кавалкі, не даючы ўкараніцца — не чула іхняга духу, не па-ейнаму робяць, няма даверу. Ад'язджаючы на зіму ў горад, хацела я ей вазон занесці, каб не замёрз. «Не-не-не, яны ў мяне не вядуцца, — кажа, — а я ўжо баюся іх, бо ўсё роўна гінуць, дык лепш ня мець, ня ведаць, што я гаўняная гаспадыня!»

Не давайце ей анічога жывога ў хату, бо яна дамоў толькі ўнаначкі прыходзіць!

Зямля, зямля, яна і на зубах трашчыць і парог у хаце заносіць. Не павязу дзяцей у вёску, збычыцца гарадскі зяць, бо баба есці не рыхтуе, не варыць — толькі свінням і курам! Якая чорта ежа, калі век пільніца: агурок у адну руку, хлеб у другую — і ў поле! Затое суберыць у ахапак бялізну, вымые,

выпалашчыць на рацэ, яно аж галубовае, укладаецца на ноч у чысцюткі ложак — пажыць не выходзіць, дык хоць паспаць, тут яна яшчэ з астатняга трымае абарону. «Вой, карова хвастом запэцкала!» — схамянецца, убачыўшы мае вочы, поўныя жаху, і не суберыцца пераапрануцца да вечара, і не збіралася. Скіне з нагі гумовікі ў гнаі перад маімі веснічкамі яшчэ на вуліцы, ідзе да мяне па падворку ў адных шкарпэтках. «У цябе чыста, як у небе!» — скажа.

А мне хоць ты праваліся, быццам пакінула роднай сястры, падзяліўшы матчыну хату, толькі глухі запечак, сама раскашую ў лепшых пакоях... «Табе яечню і суседка спячэ, яна якраз дома, а мне трэба ляцець сена варочаць!» — скажа мне дваюрадная сястра, таксама, як на тое, Надзяй завецца, і паляціць, размінаючыся на вуліцы, у поле. Я наведалася да яе праз доўгія гады наездам, на хвіліну. Прыляцела з таго сена, пабыўшы: «Здымі з мяне граху, прабач!» Сама чорная ў твары ад стомы, спякоты, глядзіць невідушча каменнай багавіцай у пустэльні, да якой я аніяк не дабяру адмысловага часу не толькі што прыехаць, а прыйсці да яе пешшу — паломніцай...

Кола... Хто яна такая, гэтая мая суседка Надзя? Чаму павага да яе каторай не збываецца? Чаму ўсё змоўчыш і не ад страху, што можа і жвірам жахнуць у вочы, калі што якое не па-ейнаму. Яна найбліжэй у вёсцы каля таго вечнага КОЛА, за ўсіх нас бліжэй. На яе ляціць і кастра, і пыл ад таго вечнага рухавіка. У яе самае рупнае мейсца — яна штатная, і ніхто ей замены не дае.

Бачу, нешта шчэпаецца, ключы кладзе пад камень ля майго плоту, каб не згубіць у полі — няма каму іх пакідаць, замкнуўшы хату, і мужык ейны на цалны дзень пайшоў касіць. Хто кінуў даўно тое Кола. Хто толькі ўляпіўся, целяпаецца. Гэты надта пільнуецца пагоды, выглядае ў акно, наракае на дождж, маразы. Той спадзяецца на дармавізну, аніякага руху ў руках, маўляў, «усё роўна начальнікі крадуць, а каровы запускаюцца», як той казаў. Надзя не адыходзіцца! Адзін раз я пачула, як, пілуючы дровы, муж загаварыўся і ей незнарок пілой па пальцах, і яе як узарвала: і бервяно ён упусціў учора, несучы! і бутэльку знайшла ў запечку недапітую! і ніводных яна туфель не знасіла за цёплым часам! і пяклуецца век за ім! Спавядала, выгаворвала лепей дарала б як няўдалага напарніка

на калгасным кароўніку. І ледзьве дапомнілася наастатку: а быў жа ў яе ў дзеўках хлопец удалы, вывучыўся на лётчыка, а можа і касманавец, жыве ў горадзе, дык жа не пайшла за яго! Хоць бы пажыла! А ў тым горадзе, нядаўна была, ніводнага беднага не бачыла — усе добра апранутыя. Адна, праўда, дзевачка ў мятро, з маткай, просценька, сціпла была прыбрана. Але яна, і сказаць баіцца, можа якая хворая, такіх маткі апранаюць самі, абы ў што, абы-як. Няхай не едуць да яе, крычала, ні дзеці, ні ўнукі, каб не прывыкалі да вёскі, каб потым не марнаваліся, не труднавалі цягай да яе, магнэзам, як яна сама!..

І такі жах, слухаючы, што яна кіне, упусціць тое Кола з рук і яно паляціць, зямля паляціць без напрамку, пагрозліва, як метэарыт. Скора і адпускаецца: у горадзе, кажа, — пахадзіў, пахадзіў і зноў сеў — гэта ўжо хвароба, не жызня!

Надзя крычыць, бунтуецца, яно сабе. Найстрашней было другім разам. Зяць, прыехаўшы, стаў хваліцца, што ў яго, у загарадным доме, вінаград сіні саспеў, цэлых два кашы сабраў. Тады ўсе стаялі, слухалі, распытвалі, дзівіліся. А Надзя, бачу, неяк бокам, ціха адышлася, як адпаўзла. Хай жа ба хоць са жменю прывёз — паглядзець, пакаштаваць, сказала мне. Стаяла знерухомеўшы, на галаве, па самым краёчку хусткі над самым брывом, ратуючыся, поўз вусень. Яна не чула, як адышоўшы ў іншы свет. І яшчэ некалькі разоў успомніць пра той сіні вінаград, неяк заўсёды паніклива, пакорліва, быццам яе, Работніцу, Матку, за што якое невядома абмінулі, не дапусцілі дзеці да прычасця. Няўжо яна ўсё жыццё, пастаўляючы ім у горад бульбу з салам, выкладася дзеля таго сіняга вінаграду ў іхным садзе? «Маці павіншаваць трэба? ды ну, ён ёй нядаўна даваў мільёна (на старыя) на крупы курам — сам сабе на свежыя яйкі!» — пра другога зяця яна распавядала ўжо смеючыся. А дочкі... што дочкі, яна часцей за іх і праз іх. І адразу наўмя знакам амярцвення той вусень. Я і сама скаланулася ад ейнай глыбокай крыўды, часцей мяркуючы, што ёй найцікавей толькі бульба з буракамі, а што далікатнейшае і не зразумець — адны мадырункі. Нясу цяпер іншы раз ей то памідор непаравы з кірмашу, то банан — як адкупнога.

Мала гаворым з Надзяй, мала бачу нашых баб у твар. Усё са спіны, здалёк: грабавідла праз плячо над галовамі, высока, летуценна блукаюць, разганяючы хмары, сяноючы на нябесным

полі, на вялікім ветры. Увесь час раней за мяне выйшаўшы з дому, можа, на цэлае стагоддзе ці болей. Постаці, як на карцінах старадаўніх майстроў: бабы-векавухі, сукенка на каторай цесная, даўнейшымі дзявочымі строямі, і каб жа ў талію, струменіцца пот, ледзьве знаходзячы лагчыну паміж мураваных грудзей. А я ўсё ззаду целяпаюся, каб хоць след не згубіць, — тую палявую дарогу калясьмі.

Пагода сённяка ёсць, заўтра няма — птушкай пераляціць. А каб жа каня! А каб жа прыехалі з горада памагці! Бягуць, азіраюцца на дарогу: а можа каторы з аўтобуса, а можа... Ззаду анікога, толькі пыл. Праўда, адзін наезджы, малады яшчэ, хату купіў. Гарэлка яму не шкодзіць ад самай раніцы, голы жывот, кашуля не сыходзіцца. Ідзе іншы раз з лесу, нясе на плячы ланцуг хмелю, шышкавінне вакол шыі да самога долу — чыста Лесавік, блішчыць сыты жывот, набіты жалудамі. І ён з касой, пасак па самае прычындалле, вантробы целяпаюцца, маты асцём. Поле вакол яго дзічэе, там ужо, дзе ён «пасвіўся», нічога, пэўна, не родзіць. Б'е ў званы зязюля.

Божа мой, Божа,
Дзе цябе болей,
Як ня ў гэтым полі...

Адчайна, як на хаўтурах, хочацца яго перабіць, перакрычаць, пераспяваць: «Хмелю ты мой, хмелю, хмелю зеляненькі...» Знаёмая, старая песня, а ноты рассыпаюцца, не складаюцца ў мелодыю, удушша хапае, голас ня йдзе далей працягнутай рукі — тугая сцяна нераспетага, як не распавітага, поля. Чалавек ужо тут не спявае за работай, толькі птушкі, поле счуралася чалавечага голасу. Я адлучана ад поля, як ад мора ўсё роўна.

А ў маёй хаце «палепшала» — свежая навіна: стары сусед Макавей дакошваў нашу дзялку напроці дому, добра ведаючы, — штолета аддаем траву Надзі, бо купляем у яе малако. Пляменніца ходзіць пераможцай: маўляў, вось табе і маеш, нічога тут твайго! Сядзім у хаце на той час, як у атачэнні, каб перачакаць, пакуль Макавей сыдзе з вачэй. Колькі разоў прачыналася на досвітку, бы не ў сваім ложку — трэба пакавацца, думалася, трэба з'язджаць адсюль, пакуль не астыгла сэрца. Не, ня гэтак: вось і добра, вось і добра мне думалася,

нарэшце пажыву дома, сама з сабою, зачынюся, а то век у пошуках, як у вандроўцы: хаджу па вёсцы, заглядаю ў вочы, шукаючы ідэал, век на дыбачках перад імі, з сябе віну спаганяючы. Хачу нарэшце пажыць без сваёй падучай любові. Побач лес, рака, поле, красуе адна прырода, а чалавек тут жыве толькі дзеля карысці, ну і хай сабе! На кожным кроку зямля накшым строем. Квяцісты змрок, вунь пагорак, маладая зеляніна, мяккі авал, амаль пяшчотны, рухомай хваляй ладкуецца на ноч, хочацца ступіць – не адважышся. Але Вадзянікі і Лесавікі не дапусцілі да сяброўства, адвярнуліся – прырода патрабуе чыстага сэрца. Памятаецца, калі прыехала з горада ў студзені наведаць хату, зімовы лес, купка лесу выдалася скоцкімі могілкамі сярод поля. «І гэтым убоствам можна жыць?! – дзівілася з сябе. Раптоўна тады паніжэў, наблізіўся гарызонт, як бывае на захадзе сонца, запаволіўся рух, адчула сябе на развароце, калі паварочваеш на другую дарогу – на другое жыццё без любові. Ледзьве спынілася... «Вой, як вас няма на дачы, дык быццам паўвёскі выехаўшы!» – пераняў быў той самы сусед Макавей, бы дарогу зваротную кветкамі засыпаў – чыста царыцынскі шлях!..

Гэтым часам дастаўся з Менску майстра рамантаваць антэну. І стары Макавей падышоў, дакасіўшы, павітаўся, глядзіць, цікавіцца: а што тут яны парабляюць, як тут у іх і навошта? – па-свойску, цнатліва, вочы чыстыя, амаль без колеру. І нічога ў яго за душой, адна во каса-літоўка ў руках і кароўка ў хляве. А ён гаспадар. І трэба расстарацца сена ўкасіць, каб зімку перазімаваць. А вы ж скаціны не маеце. Вось і ўсё! «Ён нявінны!» – адлягае ад сэрца.

– І гэта ўсё, што ім ад цябе трэба, і не пытаючыся! – пытлявала пляменніца. – Ну во яшчэ парнік на расаду сёлета ўспадабалі, жарт, чатыры дошкі збіць, за векам жывучы на зямлі, самі не дапетралі! Лічыш, што мы, сялянскія дзеці, счураліся свайго роду? Нічым вёсцы не дапамагаем? Сканцэнтравалі навуку, культуру – тэатры, музеі – па гарадах? Што людзі тут як бязродныя? А ці папытаўся хто з іх калі ў цябе, у пісьменніцы, што ты пішаш, ці пацікавіўся? У іх свядомасць, патрабаванні на ўзроўні грабавідла! І гэтага невука сам прэзідэнт западруку вядзе на падараванай за працу машыны на дзень калгасніка?! А настаўнік, урач, што, яны меней за яго вартыя? Такім

чынам мы святкуем сваю адсталасць: жыве вёска без аніякіх высілак, намаганняў духу. Толькі пільная работа наўмя: бульба, буракі, скаціна! І ў гэтай іхнай нерухомасці, застыгласці іхнай ты бачыш унікальнасць, нават праведнасць? Колькі разоў табе тэлефанавалі наконт перакладу апавяданняў, а ты лічыш, што твая белмова дасканала не перакладаецца, яе, маўляў, трэба разам з глебай – на чужой зямлі яна не прыжываецца, бы нейкае рэліктавае дрэва! Ну проста боскае паходжанне мовы, і над усімі! Ты быццам увесь свой век пацеры мовіш, маўляў, душа павінна быць высокай, а жаль скіраваны ўніз, да простага чалавека. А ад іх трэба ратавацца, абараняць свой свет, трымацца на адлегласці, каб вочы не зацерушылі сваімі прымхамі! Не баішся іхняй прастаты, сама апранаешся, каб хаця не выдзяляцца, а вёска мысліць катэгорыямі беднасці ці поспеху і скарэй зняважыць цябе за тваё скаромнае. Памятаеш, посцілку даматканую, сялянскую ўбачылі на ложку – і пайшло па вёсцы, маўляў, во як яшчэ бедна людзі жывуць!.. Прабач, ты розумам усё гэта не абмяркоўваеш, толькі левы жалудачак сэрца працуе. І паспрабуй табе што параіць ці запярэчыць, ты една тое: «Я не бязродная – яны з майго гора, яны з майго гора». У табе памірае інтэлігент!

– А можа толькі нараджаецца?

– І наогул, чакаю, каб хутчэй скончыўся век гэтых старых, пакалечаных войнамі, панамі, калгасамі людзей!

– А далей што?

– На іхнае мейсца, можа, прыйдуць накшыя, без гэтай прагавітасці, залежнасці ад зямлі і нешта лепшае пабудуюць. Калі хочаш ведаць, мне таксама зразумелая агіда Акутагавы да глухамені, як і нашаму Глёбусу!

– Агіда?! Усё, што набыла твая «цывілізацыя», на жаль, не ад маці сваёй, а сабрана па чужых, па свеце, не забывайся. І за тваімі новымі будаўнікамі, аб якіх гаворыш, няма легенды: ні звычаяў, ні абычаяў...

– Затое «легенда» ёсць у маёй цёткі, у цябе!

Не хачу адзывацца, зараз пляменніца ўспомніць мне самае крэўнае, як вывозілі па начы на Алтайскія руднікі з асады Соўчына маіх бацькоў... Пакуль дазналася маміна сястра, сялянка, усё ужо было разрабавана, толькі вазоны на вокнах засталіся. Узяла сабе адзін на памяць. І яблыні вясной,

хаваючыся, павыкопвалі, а яна нічога не магла зачапіць — жаль брала. Ніхто не паасцярогся, што яна самая бедная ў вёсцы, і асаднік Антэк быў надта хвалёны... І будзе потым сёння сніцца бацькаў сад, уся вёска ў зімовай квецені, а вуліца скрозь заросшы густым, высокім гарохаўем — нагі не пераставіць. І нясу быццам той вазон ужо сама, і няма яго каму пакінуць, каб не засох, ад'язджаючы ў горад...

Не, не паспела пляменніца ўспомніць: ляпнулі дзверы — на парозе тая самая баба. Адвезла нашае кола, толькі кажа, дзве спіцы ў ім паламаліся, бо не змазанае было.

— Дык што, я павінна была тое кола ей змазаным трымаць?! — раптам весела засмяялася пляменніца, расчуленая бездапаможнасцю перад сваёй непамслівай прыродай.

І яшчэ нехта з суседзяў заходзіў, з поля ідучы, ага, Надзя.

— А ці чулі, людцы, — прыпынілася, — у тым канцы вёскі град усё чыста пабіў, а ў нас анічагуткі не зачапіў. Пэўна, што тутака ваш такі ўжо харошы дом стаіць!

І яшчэ нехта заходзіўся, звыкла, будзённа, і не ўспомніць па што, бы за пакінутым ключом, ідучы раніцай у поле. Толькі заўсёды, за кожным разам нейкая самотная трывога на хвіліну: а дзе ён, той ключ, ці то запамятавала, ці зусім не ведаю, дзе схаваны...

Выходжу на ганак, ужо шарэецца, ужо якраз над галавой раскрыўся, развіхнуўся зорны купал паднябення. Абазначыліся іншыя міры — заўсёды здаецца, што жыву ў самым цэнтры, пад самым высокім небам...

ВОСТРАЎ

Леаніду Галубовічу

Вялікая вада, мора... Каля яго я заўсёды баялася нечаканасці, выпадковасці, яно ўвесь час у руху, яно ненадзейнае, з ім патрэбна тая ж асцярога, як у дзяцінстве з талеркай супу да краёў, — гэтак жа лёгка яго кульнуць сабе пад ногі ці на настольнік, несучы ў абедзвюх руках. А цяпер бегла да яго — толькі

б паспець зняць пальчатку, пакуль хваля прывітальна дойдзе да берага. Высокая вада раптоўна акочвае да паясніцы. Як недарэчна! Трэба вярнуцца ў гатэль пераапранацца.

Але на адзежы аніводнай кроплі, вада скацілася, як з тугога лісця?!

Зноў хваля ідзе, з белым грэбнем. Каля самага берага вымае грэбень, дробныя кучары рассыпаюцца па каменнях. Я болей не рызыкую, стаю наводдаль — цуды не паўтараюцца.

Мае новыя прыяцелькі, астравіцянкі Гуніла з Эльзай, гаспадыні ўласнага гатэля, запытальна глядзяць на мяне, калі я асалавела вяртаюся да машыны. Адводжу позірк, па-змоўніцку азіраюся на мора, абяцаючы маўчаць, бо яно можа незалюбіць пагалоскі.

Мы адлучаныя ад мора, ад ягонай стыхіі ціхімі балатамі, лясамі, як у прыродным кляштары ўсё роўна — вось там, дома, і паспавядаюся.

Валасы ў Эльзы то за адно плячо, то за другое, то сцякаюць на грудзі ручайкамі, высветленымі на канцах, выпетраныя, вылашчаныя. У іх заўсёды жыве вецер, яна заўсёды недзе на вяршыні і сярод нас, стрыжаных жанчын. Твары ў абедзвюх пасівераныя, вочы з чырванню, бы ўвесь час каля агню, блікамі сярэднявечных вогнішчаў гараць шыбы ў вокнах дамоў на захадзе. Востраў. «Іх бін гойтэ орднунг!» — крычу ім раз-пораз. Яны смяюцца, разумеючы, што я толькі вось гэта і ведаю на іншай мове са школьнай праграмы, шведскага — ані слова.

Але ці патрэбна тут, на востраве, мова?! Паўсюль знаходжу знакі прыветнага гаспадара. Накрытыя спецыяльнай адзежынай пад дажджом коні, прывітальнае «хей» ля мора, на вуліцах, у крамах, — хай сабе і каперцыйнае. Адрэжце мне во такі, паказваю, кавалак рыбіны, і раптам чую голас з радзімы: «А хвост каму? Бяры ўсё, калі хочаш!» Адразаюць з прыхілкай усмешкай, бо я найважнейшая асоба, пакупнік, маю права на густ, на выбар.

Вядома, востраў.

Я тут госця, але сабакі не брэшуць на чужых, спыняешся каля іх на вуліцы, каб падзівіцца, гаспадар затрымліваецца, абое ўслухоўваюцца ў маю мову, як у мову немаўляці. Ніхто не пільнуе тваіх крокаў. Ноч. Ціша. Сабакі недзе побач. Яны кладуцца блізка каля чалавека, прыхінаюцца, прымаючы формы

твайго цела, — то клубком у прыполе, то ўздоўж спіны. Ляжыш, бы на цёплай, нагрэтай за дзень скале, не адчуваючы сцен, клямак, запораў, — абмежаваны ўсе разам, увесь востраў, толькі блізкімі берагамі мора. Я чую праз сон, як, можа, за вярсту ад мяне жаліцца Гуніла: дом, які яна калісьці набыла на востраве, доўга яе не прымаў: ламала на сходках ногі, збівала локці, пакуль не знайшла ў падполку вялікую іголку, якой былы гаспадар рамантаваў рыбацкі невад. Эльза яшчэ днём паказвала, у якім баку жыве ейная сям'я. Паварочваюся туды тварам. Хто з іх расказваў: «Я прачынаюся іншы раз у захапленні, але анічога не памятаю, гэтага нельга ўспомніць, бо такога не бывае...» Можа, у сне яна каторая адчувала бязмоўнае шчасце цвітучай архідэі, іх тут на востраве трыццаць тры віды. Няўжо ўсё сапраўднае адбываецца з намі ў сне?

Мы ніколі не гаворым пра сваіх мужчын.

Кладзешся спаць толькі дзеля таго, каб устаць, узысці разам з сонцам, а то і раней. Мокрыя вуліцы, жвір, пясок, як свежыя, бы толькі што занесеныя хваляй, — можа, мора заходзіць ноччу ў горад, ціха, сонна, адным грабеньчыкам? Горад Сярэднявечча, другая даўгата жыцця, усё, што ні робіш, набывае значны сэнс, нават веліч, рухі міжволі запавольваюцца, бы нехта хоча зафіксваць звесткі аб табе. Людзі тут, пэўна, не паміраюць, а адміраюць, як галіны на спрадвечным дрэве. На вуліцах лёгка зблудзіць, дамы натоўпам, цесным натоўпам, які ўвесь час рухаецца, перамяшчаецца, і каб знайсці знаёмы дом, трэба яго шукаць ужо на новым месцы. І аніякай упэўненасці, што трапіш. Тут, пэўна, трэба ведаць гаспадароў, быць тутэйшым.

З чужынцам горад гуляе ў хованкі.

Вуліцы быццам будаваліся адвольна, без агульнага плана. І толькі пазней заўважыш, як яны ўсе сцякаюць ручаямі, вадаспадамі па сходках — уніз, да мора. І сама ўвесь час, дашчэнту сцёгаўшыся, выходзіш да мора.

Рака ўнутры нас, мора нас абдымае, як сказаў паэт.

Чуеш за спіной шоргат, паварочваеш ад мора блажэнны твар: едзе на веласіпедзе старая рыбачка, прывіталася, паглядзела пільна, бы я ўсміхалася ейнаму мужу, а дакладней — адразу пазнаўшы іншаземку, бо тут нязвыкла выказваць свае эмоцыі. Самае жаданае і нязбыўнае: узяць з дому веласіпед

з поўным кашом рыбы, прымацаваным да сядла, і выехаць ёй насустрач і павітацца першай, добра засвоіўшы: ты павінна абнадзейваць сваёй ветласцю ўсіх вакол сябе.

Вяртаешся дамоў, у гатэль, як той казаў, па зорах, пільнуючыся высокай готыкі царквы Дзевы Марыі — яна над усім. І як жыхар вострава недзе ў Інданезіі, таксама прымаеш Млечны Шлях за нябесную раку і нават чуеш ейны шум, калі маўчыць само мора.

Вада, камень, ветракі, старыя сцены — пейзаж, у якім нешта абсалютнае, і дом чалавечы, захаваны некалькі вякоў ужо як правобраз храма.

Іншы раз, ідучы па начным горадзе, адчуваеш сябе... прывідам. Палохаюць нават створкі адчыненага вакна. Вярнуўшыся, няўцямна разуваешся адразу ля парога, у агульным калідоры, парасон — на поручні лесвіцы, плашч. Раздваіцца, растраіцца, распаўсюдзіцца па ўсіх кутках старога дома, пакінуць аб сабе знакі, каб цябе не зачыніла, не замуравала выпадкова сярэднявечча плітой у тваім пакоі нумар сем. Суцяшае толькі тое, што лічба гэта біблейская.

Дамы на востраве жывуць асобным ад чалавека жыццём.

Адчыніла вакно — вецер сарваў сухі ліст герані.

Тут мне дом, можа, толькі дзеля таго, каб змяніць вопратку, і зноў уніз, да мора, — рака ўнутры нас. Здалёк сёння яно надзвычай сіняе, пэўна, шчоўкнулі створкі, як у кішэнным гадзінніку, расчыніліся на нейкі момант на дне самыя сінія ракавіны. Ізноў ляснуў зашчап. Ходзіш па самым беразе, каб быць найбліжэй за ўсё, ходзіш, нахіліўшыся, нешта шукаючы, але што?! Раскрываеш далонь з назбіранымі каменьчыкамі і дзівішся — колер бляклы, малюнкі зніклі, кідаеш назад, у ваду — мора вяртае іх сабе, абы толькі высахла вільгаць. Ходзіш бясконца, па-птушынаму азіраешся, каб цябе не ўбачыў, не спудзіў чалавек.

Ля мора можна быць толькі птушкай ці дзіцем.

Ціхая затока цёплай, бы талай вады. Блікі сонца па мелкім дне, ідзеш, як з цацачным ліхтаром. Далей і далей, а потым азірнуцца, каб убачыць, ці далёка бераг, і зноў ісці вадой. Тут зямля спускае цябе з рук, з падолу і сочыць за тваімі дуронымі крокамі — вяртае назад. Тут пазнаеш самотную ад людзей ласку, пяшчоту немаўляці.

Магчыма, ты трапіў у завадзі боскай любові.

Магчыма, сюды выраем злятаюцца душы.

Няўжо даравана пражыць тут, на востраве, яшчэ адно кароткае жыццё і з'ехаць адсюль назаўсёды, як памерці?! Ад'ехаць? Толькі навучышся хадзіць на нізкіх абцасах, у апранасе, абы не сцюдзёна, і каб аніводнага маруднага гузіка ці апліка. Тут давяраешся сабе, свайму целу, не пільнуеш, углядаючыся ў незнаёмыя твары, як цябе ўспрымаюць, ці добра выглядаеш, ці дарэчы ўсё на табе. Ад'ехаць, толькі навучыўшыся абыходзіцца без мовы?! Крычу Гуніле, Эльзе: «Іх бін гойтэ орднунг», а болей жэстыкулюю, малюнак скупы, як на скале. Але хіба магчыма перакласці, перавесці на мову, што хочаш сказаць?! Мы паведамляем адно аднаму моўчкі больш і дакладней. Чалавек неперакладальны. Колер вачэй, колер валасоў, рухі, позірк, ад нас ідзе інфармацыя бясконца і счытаць яе магчыма толькі на ўзроўні падсвядомасці.

Скульптура чалавека таксама маўчыць, але да яе прыходзяць, як прыходзяць да маўклівага мора, гор, лесу.

Гётэ лічыў, што аналізаваць колер вясёлкі — шкодзіць «сэрцу прыроды».

Ці не таму мы болей маўчым, лёгка маўчым з блізкімі нам людзьмі, з каханымі.

Эльза дастае з кішэні ключы, каб адчыніць дзверы старадаўняй паўразбуранай царквы, нешта тлумачыць, падымае руку, крыху наводдаль ад сябе, далонь чашай, быццам трымае ў ёй тое, аб чым гаворыць. І так зразумела: тут старанна пільнуюць кожны рух, нават шоргат стомленага каменя ў сцяне, каб падтрымаць, замацаваць, даць рады, але ж храмы пачатку вякоў, камень рассыпаецца жвірам. У Эльзы аніводнага ненатуральнага руху, яна як у сне. Цяжкое паліто бы толькі ўскінута чужой рукой, плечы ўвесь час выслізгваюць, яна раз-пораз папраўляе яго, адчуўшы дотык халоднага ветру. Перапыняю, прашу ў яе ключ, каб самой адчыніць дзверы.

І ў гэты момант, пэўна, перадалася боская воля: хачу ісці да пагашаных храмаў, ставіць запаленыя свечкі.

Ад аднаго да другога, па пустых вуліцах, паглядаючы толькі на шпіль Святой Марыі, каб не зблудзіць канчаткова. Вунь ужо і дзве дзяўчыны звярнулі да храма, убачыўшы

наш агеньчык. Твае першыя прыхаджане. Яшчэ і яшчэ храмы, паўразбураныя часам, храмы-калекі, з пустымі цёмнымі вачніцамі, з ненакрытымі дахамі. Кружацяць і кружацяць сярод іх, як у шпіталі, чуючы слабыя галасы і не ведаючы, да каго трэба найперш. О, свечка! Таксама нехта запаліў! Падыходзіш бліжэй і раптам пазнаеш, што гэта твая, ты сама, зблудзіўшы, вярнулася сюды ўжо прыхаджанкай — у дзеючы храм.

Так, Эльза казала, што гэта руская царква, праваслаўная.

І ноч была якраз перад Вялікаднем.

Хіба не цуд?! Усяночная... Галасамі дзікіх галубоў мяне пазвала да сябе мая грыдзькаўская радня, галасамі глухімі, таямнічымі нават, можа, для самога Бога. Цяпер толькі б лодачкі ў рукі і па матчыных сцежках з Пастаў да вёскі, кіламетраў з дзесятак, несучы перад сабой свянцоныя яйкі, булкі — хрэсным ходам. А ўся вёска, прачнуўшыся, чакае цябе, не снедае, каб пранашчыцца свячоным. Або яшчэ дзеўчынёхай выглядаць дзевак, баб з Усяночнай, каб памыцца, паклаўшы ў ваду яйка — тады будзеш круглявая ў твары, харошая...

Быў момант, калі хацелася раптам кінуць-рынуць усё і як стой — ходу, дамоў, ледзьве не галосячы: а ў людцаў парадак і ў будзень, і ў свята, а ў маёй хаце век гармідар, мая ты родзінка, чаму такая горкая, такая ніякая... Дамоў! Да работы! Успомнілася, як мая сяброўка жалілася свекрыві, прыйшоўшы ад багатых суседзяў: «Мама, у іх так прыгожа, так хораша ўсё!» — «А ты не хадзі туды, дзе лепей, чым у нас», — адказала тая. Ці не галоўная прычына людзей з маёй стараны: мы не разглядаемся, не вучымся ў другіх, нам абы каня дастаць і бульбу пасадзіць, а потым уздыхнуць з палёгкай, што пасаджана — і на гэтым усё свята. Дратаваць зямлю без аддухі — хай сабе чаго і нясмачнага, але каб многа. Нам скрозь вінавайцы: то маразы палі на цвет, то сонца выпаліла. А тут у людзей той зямлі сярод камення — як у вазонах усё роўна, вільгаці — як міра на святых абразах, і — парадак...

Хопіць! у мяне ўжо ўвайшоў Дух Вострава, дух адзіноты і самадастатковасці.

Салёны вецер адусюль, дзе б ні знахозіўся, увесь час жывеш, бы вандруеш на вялікім чаўне. На плыткім месцы зноў і зноў шукаеш цікавыя каменьчыкі — патаемныя пісьмёны з марскога дна, звесткі, і толькі паспееш угледзецца — пісьмо

знікае, камень мярцвее без вады, як вырваны з каранём. Гойдаюцца абапал пялёсткамі скамянелыя рапаны. Шум мора чуецца нават на могілках, але тут у кожнага яно сваё, асабістае: у галовах ля помнікаў раструбай уніз ляжаць вялікія ракавіны.

Жывыя і мёртвыя, мы вандруем у адзіноце.

У шторм мора падымаецца вышэй зямлі, не ўстаяць на месцы, здаецца, ляціш ад аднаго берага да другога. І аніяк не можаш, апранаючыся, трапіць у рукаво. Ліхаманкава б'ецца сэрца, у поцемках памяці адзін напамінак, што ты ўсяго наземная істота, калісьці выкінутая на бераг, — губляеш розум. Жаданне высільвацца, хістаючыся на самым ветры, каб цябе выпластала, здзёрла старую кару, нарасты, яшчаркай легчы потым на каменне, на сонцы, і адчуць жыватом, здавалася, ужо немагчымае: я... люблю... жыць...

Зноў счытваеш прыродны код сваякоў з вёскі Грыдзькі, — людзей надзіва шчырых да слёз і да смеху, да злосці і да дабраты.

Танцуючая Гуніла, ейная танюткая зграбная постаць не спыняецца на месцы, рухі лятучыя, галавой уперад, плашч ззаду, увесь час супраць ветру, выдае, што і нагамі не перабірае — проста нізка ляціць. Абедзве з'яўляюцца нечакана, кормяць госцю амаль з рук, як цяжкахворага, які нарэшце ачуньвае. З імі не сысціся ў дарозе, але струмень паветра зацягвае, і ўжо лёгка ляціш ззаду, а то і дурона перадкуеш, ніхто ні ад кога не залежыць, як у маленькім выраі.

Сталыя жанчыны?! Мы старэем толькі на вачах мужчын, аб іх мы не ўспамінаем, быццам нічога пра іх і не ведаем.

Горад кожны раз непазнавальны, новы. Можа, таму, што нехта амаль кожны дзень на вокнах выстаўляе і выстаўляе новыя цацкі: лялька, фарфоравы дракон, авечка, яшчэ лялька — наіўным дзіцячым парадкам, каб усё табе з вуліцы відалася, каб запрасіць цябе ў свой дзіцячы свет. А сам гаспадар, выдае, сядзіць на падлозе, як любяць сядзець дзеці, і моўчкі чакае, калі ты прыйдзеш да яго забаўляцца. З веку ў век новыя цацкі. На змроку запальваюцца свечкі, на змроку дамы паварочваюцца да мора, кожная свечка — маленькім маяком. Вокны не завешваюцца. Прастора дома бязмежна пашыраецца. Зоркі, поўня праз вакно, бы ў суседнім пакоі. Незнаёмец на вуліцы праплывае лятучым галандцам.

Мой дом-гатэль толькі дзеля таго, каб змяніць, як той казаў, барму*, але... што гэта? — унізе, бачу з другога паверха, ходзіць мужчына?! Пэўна, той, каго чакалі Гуніла з Эльзай, трымаючы нумар. Назіраю за ім даўжэй, чым трэба б — ён вельмі прыгожы. І раптоўнае ліхаманкавае пачуццё несумяшчальнасці: мне тут перашкодай усё, што можа адхіліць ад каменння, ад вады, ад сцен Сярэднявечча! Перашкаджала б нават знаёмая мова. Хацелася тут, на востраве, як нідзе болей і ніколі, зведаць волю, жыць не азіраючыся, не адчуваючы свайго полу, каб нават рукой не правесці па валасах, прыхарошваючыся. Дарэмна! Ён ужо насупраць, нешта гаворыць, перабірае мовы: ангельскую, нямецкую, шведскую, нарэшце, рускую, але я не разумею — я толькі чую блізка ягонае цела, моцнае, скрозь пакрытае чорным лішайнікам, — бывалы ўсходні чалавек. Адчуваю румянец на ўсю шчаку, як пры гарманальнай недастатковасці. Я здраджваю, я больш не веру сабе, сваім рухам, жэстам; напружана адводжу позірк, бы назіраючы за зграяй дзікіх галубоў, — у паветры правісае страчанае пяро. Мы ўдваіх, мы запертыя адзін у адным, ён засланяе мне свет. Я губляю сваю асобасць. Гуніла! Эльза! Дзе вы ёсць? Гуніла падыходзіць, нешта гаворыць, паставіўшы перад сабой на насок выцягнутую нагу, як у «Кармэн-сюіце». Крысо плашча расхінулася, прыгожае калена выступам-выклікам перад ім. Гуніла нагадвае падлетка, а зараз абазначыліся жаночыя лініі, пераменліва, дрыготка, няўжо таксама хвалюецца?! Эльза гэтым часам сядзела ў другім пакоі, у кутку, нешта чытаючы, устала з крэсла, як бы ўставала, стаміўшыся сядзець каля фантана, мармуровая скульптура. Не заўважыш, калі яна зрушылася з пастамента. Паўсюль цесна стаялі сталы, крэслы, яна ішла, не дакранаючыся ні да воднага прадмета. І шкляныя дзверы адчыніліся перад ёй самі, бы на роліках у супермаркеце.

Старая жанчына, праходзячы побач, раптоўна падабрала вісячае валлё падбароддзя, як тая індычка.

Усё навокал змянілася, падпарадкавалася з'яве, востра адчуўшы сваю прыроду.

Нашыя галасы, смех, гучаць чысцей, бы нарэшце пачулі абсалютны голас камертона. О, вядома, мы запрашаем яго паладнаваць! Мы ўжо на кухні! Мы толькі тое і рабілі ўсё жыццё,

* Барма — адзенне пастыра.

што гатавалі яму ежу! Мы адважваемся гатаваць для ўсходняга мужчыны?!

На нас накацілася старажытная няволя — мы падпарадкоўваемся гэтаму незнаёмцу.

Каштуем стравы з адной лыжкі, мы смяёмся, нам надзвычай весела, звіняць Гуніліны бранзалеты, па-дзіцячаму зробленыя з меднай спронжкі. Каторая гэта з нас была ўжо на абцасах?! Разамкнуліся вярыгі, мы выслабаніліся з пустэльні. Божа, на кухні няма люстэрка?! Вой, нешта гарыць! А можа, гэта пах дыму, сполахі злога вогнішча, на якім паліць Сярэднявечча сексуальна прываблівых жанчын?! Я быццам спрабую ўратавацца, накідваю на плечы вязаную хустку.

Паселі, сядзім, «скаваныя ланцугамі полу».

Ён спазняецца да стала. Ён спазніўся і не папрасіў прабачэння. Мы разгубіліся, мы стоўпіліся ў табун, мы, як у гарэме, адчулі, хто тут гаспадар.

— Не хапае кінзы. Я шукаў яе ва ўсіх крамах — няма! — стаяў, паціраў паміж пальцаў той звыклы, жаданы пах, церушыў нам у вочы — ён шукаў на выспе пах свайго агароду.

Першай апрытомнела Гуніла — устала, зазвінелі бранзалеты.

— Трэба памяняць ваду ў цюльпанах.

— Дзе памяняць ваду? — перапытала Эльза.

— У супе харчо... — адказала я.

Мы моцна смяёмся! Мы цешымся адна з адной! Грымнулі пад сталом скінутыя з ног туфлі на абцасах!

Мы ўжо адвучыліся баяцца мужчын.

І адкуль мне цяпер ведаць, чаму я надзіва свежая сёння і румяная, паўдня прастаяўшы на кухні. І ў якім выпадку я больш здраджваю сабе...

Па гэтым разе! Мы хутка губляемся, блудзячы па вуліцах Сярэднявечча. Па-ранейшаму трапляю ў гатэль па зорах — па самым высокім шпілі храма Дзевы Марыі.

Запыняе нават незнаёмы куст, падобны на баярышнік. Ужо на ім набрынялі пупышкі. І раптоўна зусім не вандроўніцкі сум: я не ўбачу ягоных кветак, не ўбачу, якім ён будзе летам, увосень. Не заплыву ў разводдзе дзікіх дэльфініумаў. Я не пражыву з востравам ягоных бясконцых стагоддзяў. Востраў, бы тваё неспадзяванае дзіця, непасрэднае, выпешчанае,

дзіўнае, з якім ты адчула сябе найбліжэй да сваёй чалавечай прыроды, да сваёй сутнасці.

У мяне поўныя жмені ўражанняў — поўны кубак-ахвярнік нясу перад сабой проста ў адчыненыя дзверы царквы. Сёння ўсе ідуць сюды слухаць арган.

А перад гэтым каб аніводнага музычнага гуку, нават птушынага спеву.

Рокат галасоў у царкве, як у марской ракавіне, пакладзенай у галовах на могілках. Першыя шквальныя гукі аргана голасам храма, урачыстым, патрабавальным шчырасці. О, як нязвыкла сэрцу боскае запытанне — слёзы за ўсё жыццё марскімі водамі забіліся ў горле, патрабуючы выйсця! Высока плылі люстры, перамяшчаліся ў плыні гукаў, бы па рацэ. Паварочвалася зямля, сонца перабірала вітражы на высокіх вокнах, складала святыя малюнкі. Юлёвымі пялёсткамі ўпала мне на рукі — урачыста спавіло вянцом адзіноты. На момант схаваліся былі на іх рудыя ўзроставыя плямы, «кветкі старасці», зараз яны смылелі, як стыгматы.

«На пасцелі маёй ноччу шукала я таго, каго любіць душа мая, шукала яго і не знайшла яго...» — пацерамі наўмя спевы цара Саламона.

Цяпер толькі засталося сысці на сваім беразе і адчайна адпіхнуць нагой човен — на самую сярэдзіну мора...

P.S. Готланд, Вісбю, — ледзь вымавіш у канцы, як прызнаешся наастатку, — назавеш чароўнае імя свайго кароткага кахання...

Я так сумую па моры, што ўсё часцей гляджу на неба.

ЗНАК НА ДАЛОНІ

Чулі ваду птушкі. Вунь качкі лятуць да ракі, свойскімі птушкамі, нізка, таропка, бы толькі што выпушчаныя з рук. Некаторыя тут і зімуюць. Чайкі над самым рачным брывом.

А я не чула раку, энергію ейных хваль, хаця таксама, як аказалася пазней, ляцела сюды вясной, да вады.

Новы дом, куды пераехала, якраз на самым беразе. Адкуль і куды цячэ рака, якая даўжыня, якая глыбіня? – хацелася распытацца ў суседзяў. Даўжыня? Трыццаць восем папугаяў! – адказвалі смеючыся. Па цяплу ўсплылі брыдоты, мутная вада калыхалася ў ночвах мураваных берагоў, спыняла крокі, спыняла зрок, як атручанае мёртвае цела. Ваду да вуснаў, ваду да вачэй, а гэта... не магу звыкнуцца нават седзячы дома, быццам увесь час за вокнамі неслі ў жалобе тапельца.

Ну, вядома, гарлачыкі тут не цвітуць, але паглядзі, які дом, вельмі прэстыжны, тут і багацейшая крама, цэнтр горада, чыста як, паглядзі! – забаўлялі сябры самаробнымі цацкамі. Мне ж мусова патрэбен круг чыстай вады, як выдры ўсё роўна. Тая селіцца толькі каля крыніцы. Тады заходзілі з другога боку, маўляў, тут жыве вядомая балерына, казалі, як пра дзівосную птушку, што звіла побач з людзьмі сваё гняздо. Балерына?! Гэтаксама выслабаняешся ад звыклага, будзённага, калі раптоўна ўбачыш чорнага бацяна... Ён спалохана падымаўся з лясного цеснага кустоўя, узлятаў цяжка, падхапіўшы вялікія крылы. Крылы сышліся ўверсе над галавой, бы аберуч прыхопленыя берагі дарагога, урачыстага адзення, – ззяла сполахам чорнае бліскучае пер'е, аж зялёным заносіла. І знік. На момант амаль страх ад блізкасці, ад прыгажосці. А потым хутчэй бегчы на тое месца, адкуль ён узляцеў, – павінна там нешта застацца, як пасля ўдару маланкі. Павінна быць нечым пазначана зямля, куды апускаюцца таямнічыя птушкі. А людзі?

Тады пакіньце мяне адну ў доме, каб анікога ў кватэры, мне трэба агледзецца, аббыцца. Восьмы паверх, зусім інакшы пласт паветра. Птушкі тут не спяваюць. Ужо недзе ў дарозе да нас берагавыя ластаўкі. А нехта ж загадаў спароць над аркамі дома іхнія леташнія гнёзды, маўляў, надта паскудзяць... Кажуць, ластаўкі напорыста будуюцца тут кожную вясну, можа, прымаючы дом за высокі бераг ракі?

Не, у мяне няма даверу да гэтага жытла.

Што табе ёсць, га? Ну як усё роўна падроблена! Ну, адкуль ты сама, бабка, прыехала? – каб хто запытаўся. Хіба можна параўнаць, успомніць?! – злаваліся сябры ў вочы.

Успомніць?! Карціць увесь час кінуць-рынуць усё і бегчы ў стары дом, бы там пакінуў уключаны прас. Выдаецца, што ў пакоях гарыць святло, праз ноч гарыць, праз дзень, а ты

запаліў яго, як было, з вечара, выходзячы ненадоўга, наказаўшы дому чакаць. Аніяк не адчыніць дзверы ў пад'езд, падымаючыся па сходках памяці. Домакіраўнік ужо неяк быў сказаў: а ці не замураваць вам іх, закласці цэглай — і з канцом! Маўляў, надакучыла рамантаваць. Падумаць, што дзеці шкодзяць, гойдаюцца на дзвярах, але ў доме амаль адны старыя людзі.

Стары дом на гары. Вецер смехам зачэпіць — і дзверы ўжо на адным гапліку, якраз каб бяздомнаму сабаку ўскочыць, пераначаваць. Зверху, па лесвіцы, чапляючыся рукамі і нагамі, як па павуцінні, спускаецца насустрач бабця: ліфт зноў не працуе. Аніяк не размінуцца па пацёмках са Змітраўнай, яна ўжо даўно памерла.

— Дзеўка, рука баліць у цябе, чула? Вазьмі во змылак, я нябожчыка ў вёсцы абмывала, памый балючае месца і кладзіся спаць. Назаўтра і не ўспомніш, што табе былося...

Мову ў мяне адымае адразу. Але і бяру і нясу да сябе напроці ночы, а потым кукую давідна — поўная хата пуду! Вецце ліпы, высвечанае ліхтаром, лапае па сценах, шукаючы, хто тут яшчэ жывы, халодны змылак лядашчай гурбай у пакоі.

І наогул, што скажа, тое і зробіш, калі чалавеку каля сотні гадоў.

Сядзіць Змітраўна за сцяной (побач кватэры), як той сфінкс, каб што ў ёй парушылася векам, адно толькі цела лушчыцца шалупіннем. «Стыдаюся выходзіць на вуліцу... Людзі глядзяя-яць, такіх старых у горадзе няма...» — жаліцца. Выскачыш з ванны на балкон распранутай павесіць бялізну, зловіць цябе чаплістым, амаль мужчынскім поглядам — і па плячах, і па грудзях. «Ты яшчэ такая маладая...» — скажа, дасць у руку на ўцеху поўную жменю, як семак, гадоў. «Што ў цябе гэтак зацвіло?» — убачыць кветку, і вуснамі, і рукой ківае, да сябе, каб бліжэй, каб злавіць і памацаць, як матыля.

У пакоі ейным на канапе, на стале, на крэслах ахапкамі рознакаляровая сподняя бялізна — трусы з карункамі, станікі. Волька, ейная дачка, бярэ ў рукі то адно, то другое, разглядае і так, і напроці святла, не стыдаецца чужога чалавека, быццам гэта дзіцячае, прасуе далонямі, любуецца. Не жыла жаночым жыццём, не пацешылася ні адзежай, ні ежай, век у халодным складзе, у штанах-ватовіках, у куфайцы. Век сярод грузчыкаў,

былых заключоннікаў, бамжоў, алкаголікаў. Нарэшце-такі пераапранаецца ў лёгенькае, у святочнае — скарацілі яе як пенсіянерку, ну і няхай сабе...

У снах Волька прыходзіць да мяне з кветкамі, што паклалі ёй у труну. Пераступіць парог і падае ніц, як было неаднойчы, калі вярталася з работы п'яная, не магла патрапіць ключом у свае дзверы. «Трэба кожнаму дагаджаць...», — скажа. Маўляў, таму наліе выпіць, гэтаму наліе і сама пакаштуецца. Некалі, уцёкшы з калгаса? пільнавалася сваёй работы розным строем, гарэла разам з мужыкамі. Нядаўна яшчэ быў укінуты ў маю паштовую скрынку квіток з атэлье на ейнае імя: «Платье шёлковое, 56 размер, в случае неявки заказ будет снят».

Можа, адзінае пісьмо па-расейску да іх дасланае, і то не дайшло, бо пісалі маім суседзям звычайна з вёскі.

— Чакай, з табой не сыдуся! — крычыць нехта ў цемры знізу.

Ніна?! Хачу схаваць твар, стрымаць слёзы і, як у сне, не магу ад яе адвярнуцца — абы толькі каторае імя ўспомніў. Перавязаная па руках, па нагах конскай папругай, Ніна жыве паланянкай, нявольніцай. Абчапаўшыся вандзэлкамі, сумкамі, поўнымі гаворкі, — а дзе што купіла, а што колькі каштуе, — звычайна затрымлівае на поўгадзіны, абы сустрэўся. «А мне сёння мужчына руку падаў у аўтобусе! — хваліцца. — у вас, сказаў, такая мова, такая дыкцыя, вы, пэўна, вучыцелька! Во як! Бо ў мяне вусны намаляваныя, у другі раён, на трактарны ў краму ездзіла!» Там яе ніхто не ведае. Тут усе бачаць, як жыве з п'яніцам, няма чаго харахорыцца. Трактарны — ейнае вылюддзе. Ніводнай сівой валасіны, і старасці ейнай не бачыш, паглядзеўшы ў вочы, юлёвыя, чыстыя, быццам і ўлетку і зімой прышпілены ў галаве букецік лясных братавак. І не дзеля прыгажосці. Гэтак бывае: укіне іх вецер дзе-небудзь у старым лесе і забудзецца. Ізноў Ніна жаліцца, мужык ейны напіўся, чапляўся сварыцца, істукан, кажа, гэты. Стары чалавек, нервовы, электрык, усё жыццё пад напружаннем — хачу неяк звесці гаворку на лепшае. А ён і малады, крычыць, такі істукан быў! Тады нашто за яго замуж ішла? Ага, адказвае, у інтэрнаце вясковыя дзеўкі да саракоўкі сядзяць і такога не маюць!

І я даўно без пары, і Волька, і Змітраўна, і бабця Манька, і бабця Тася, каторая развялася, у каторай муж памёр. Усіх нас пераважыла Ніна, як на гушкалцы вясковай, — яна замужам.

Ой, лягу ж я, лягу сама з сабою.
Белыя ручанькі пад галавою.

Голас шапаткі, старэчы. Да нас гэта Змітраўна спявае, бы на Нініным вяселлі. І не бітыя мы даўно, і каля дому не ганяныя. «А што мне, на такім істукане, поле араць у горадзе?!» — саскоквае з гушкалак Волька, нажыўшыся за міліцыянтам, той усё нагой дзверы адчыняў. І ўсе за ёй. Па тым разе, каб мы калі болей паспагадалі Ніне ў вочы! Па тым разе!

Ніколі быццам не званілі суседзі ў дзверы, яны і самі на замок не запіраліся, а тут — званок. Стаяць Волька з Тасяй, сукенкі святочныя, туфлі на босую нагу, на грудзях па брошцы. Тася высока падымае над галавой міску студня, потым павольна схіляецца як не да зямлі: гонар сталу! гонар хаце! гонар гаспадыні! Прыйшлі віншаваць з днём нараджэння. Поўныя пакоі святла, люстрамі зіхацяць брошкі! Па беражках талеркі дробныя кветкі па галубовым, бы на ваду спушчаны вянок — дзявоцкая варажба.

«Сядзець ці ісці?» — увесь век пытаецца ў сябе самой незамужняя баба.

Белую розу ўважаю,
Красную розу люблю.
Жоўтую розу зрываю
І пад нагамі тапчу.

Спявае бабця Тася. Гэта ўжо гарадскі раманс. Госпадзе, ну якая там ужо ружа, калі баба на восьмым дзесятку! Але калі хто і любіцца яшчэ ў нашым доме, то яна з дзядзькам Мішам. Дзядзька намнога маладзейшы, прыхадзяга. Жонка памерла, чалавек вараўны, п'е без меры. «Ні я яму буду варыць, ні цепліць! Во, ты прыходзіш, Волька, Змітраўна, Ніна, і ён хай прыйдзе, пасядзіць, як усе, і пойдзе дамоў...» — так было напачатку. Цяпер дзядзька часцей унаначках. Трашчыць шкло ў вокнах, сварацца — бабця Тася цвічыць, ваюе за п'янкі. А ён з каленя і з пакалення перабірае ўвесь ейны род за тое, што не хоча з ім распісвацца. «Мяне дзеці зненавідзелі з-за яго... Унук мой купальны надта мяне паважае (я яго малога купала), баба, кажа, дзяцей сваіх буду хрысціць, ты да нас прыходзь, хочаш

у суботу, хочаш у нядзелю, а дзядзьку з сабой не бяры, прыйдзеш? Не, пэўна, не прыйду... Як не бачу — маркотна, а як убачу праз вакно — ідзець! — ну каб мне хто дапамог не пусціць у хату, на дух, здэцца, не пераношу! Каб даўжэй пабыў дзе-небудзь, усё б абвеяла, абмерла — і забылася б на яго... І сварымся, і лаемся, але ж ёсць і накшыя словы. Вось і жывём...»

Хоць каму ў доме раскажа, не схаваецца ні з чым. Тася з тых жанчын, да якіх аніштo не прыкарэе, нішто іх не зблоціць. Выбрыдала ў замужжы ўсе топкія мясціны і цяпер ідзе па самай каламуці. У найлепшай сукенцы, ніколі каб сплакаўшыся ці склюпіўшыся, ніколі каб панчоха змаршчкамі, шалік раблёны, рэдкі на галаве ледзь трымаецца, ускінуты дзеля прыліку нават і маразамі. Ваюе ў поўнай форме, трымае ў доме жаночую абарону. «Каб ведала, што мяне не засудзяць, забіла б каторага за водку! Вот гляджу тэлевізар... Як убачу дзеўку ці бабу распусную, аж сама сябе не люблю! І я ж жанчына! Няўжо б гэта я за долары пайшла абы з кім гуляць?!» Муж Ніны быў неяк падкаціўся да яе, не трапіўшы па п'янцы ў свае дзверы. «Дай, чалавечак, пагляджу, чым ты гэтую работу рабіць будзеш. Расшпіліла кятурку, а там, як у дзіцяці, — яйчыкі мале-е-нькія. Ужо спраканалася, калі мужчына з языка не спускае начное дзела, то ўжо, лічы, калека!» І каб яна хоць пасмяялася з таго, — прафесійна так зазначыла, як, не раўнуючы, у прытоне.

Аніяк не магу злавіць, пазначыць словам ейную прывабнасць. Каля яе ўвесь час тая зманлівая таямнічая ціша, як у затоцы, куды ідуць на нераст рыбы, той прытулак на плячы, які шукае мужчына ўсё жыццё, адлучыўшыся ад маці.

На гэтым бы і скончыліся «палявыя даследаванні беларускага сексу», каб не бабця Манька: усё бачыць, усё чуе, анідай Божа! Наліў ёй нехта па злосці саляркі пад дзверы — яна і табе тую лужыну падгоніць. «Навошта ты мне гэта зрабіла?» — «А што, ты лепшая?» — адкажа. І сваё благое падзеліць напалам, і тваё. Дапільнуецца і прачытае тваю запіску, што пакінуў у дзвярах госцю, адлучыўшыся на хвіліну, і складзе сваю байку. Яе не любяць у доме за язык, жыве асобна. Муж Ніны, ідучы да сябе, мае моду выцерці ногі аб ейны дыванок пад дзвярыма. З нашых ніхто ёй большай шкоды не робіць. «Каб я так гаварыла пра людзей, то і ў сваю хату зайсці стыдалася б, не тое што да суседзяў», — злуецца Тася.

«Прыйшоў чалавек у хату, што ён сказаў? Нічога быццам і не сказаў! А ў мяне пасля яго палова красён адвалілася. Во, дзеўкі, языкі ёсць!» – дабавіць з даўнейшага Змітраўна.

Пераплятаецца суровая нітка з крамнай, гарадской, тчэцца мне сорак кашуль, як на вяселле.

І раптам даведваемся: бабця Манька выязджае. Куды? Да каго? Яе бура сагнала, страх, маўляў, людзей тутэйшых ужо баялася, перагаворваліся на пляцоўцы. Бачу, вынеслі ейныя рэчы. На снезе чорны жалезны ложак. Пруткі крыж-накрыж, як з голага галля – скінутае на зямлю гняздо птушкі. І яна сама выйшла, села, як не на высокі ягоны брыж, уся ў чорным. Поўны сквер чорнага варання. Гэты ложак, як дзіцячая твая калыска, даўно выкінутая на сметнік. А бабця Манька спала ў гэтай калысцы і цяпер...

– Не-не-не! Ты маладзейшая, ты не ведаеш: раней так не было, каб чалавек з сваёй хаты ўцякаў, як у вайну! Даўней так людзі паміж сабой не жылі! – выносіць усім нам прысуд Ніна.

І ніхто ёй не пярэчыць, і лягчэй робіцца на сэрцы ад ейнай адвагі ўзяць на сябе віну і нас усіх зрабіць вінавайцамі перад Манькай.

І я ўжо пакую кнігі, рэчы, пакінула самае неабходнае і дзіўлюся сама сабе, што з гэтым найменшым можна век абысціся, як тая бабця Манька.

Тася, бабця Тася, я ж пераязджаю на другую кватэру – паўтараю і паўтараю. Яна маўчыць, бы аніяк не магу дабудзіцца. Мы, пэўна, абедзве яшчэ чуем той грукат казённы, калі вывозілі, аслабанялі пасля Змітраўны і Волькі іхнюю кватэру, а хавалі іх, вядома, у вёсцы. Нават сабакі мае маўчалі. Трашчала шкло, і замкі з дзвярэй вынялі. Спората гняздо. Выходжу на балкон, бачу: іхні адчынены сярод зімы... і выпускаю далоў з рук шкляны слоік з капустай. «Якая сённяка вея-я-я...» Змітраўна вярнулася, як было звычайна, зімаваць у горад?!» Дзеўкі, сніцца... сад, куры скапалі... А ў мяне ж са-а-ад дык сад! Грушы, таўсты-ы-ыя, вялікія, во гэткія! І памерзлі... Чаму ж не, у горадзе весела, людзей поўна – анёльская жызня! А я сёння тут – заўтра ў іншы кут – бадзіня!»

Хоць ты на другі бок перавярніся, каб перабіць сон, – увесь час чую ейны голас.

Анёльская жызня... Нічога не куплена за адным разам. Калі гэта, то на тое ўжо не хапае грошай. Увесь час жывуць, выбачаючы на другую патрэбу, усё ўзамен набыта. Біблейскія людзі, адна жменя мукі і некалькі кропель алею. Па гэтым цяжкім часе бабці мае жылі быццам у змове: ага, багатымі мы ўжо не будзем, трэба жыць як набяжыць, нікому не зайздросцячы, ні з кога не спаганяючы. Выйшла была з нашага пад'езда багатая жанчына — у доме ўжо было скуплена некалькі кватэр пад офісы. Дарагая даха на ёй, шаўковая спадніца па пяты, стаіць, чакае таксоўку... Бабця Тася павольна так падышла да яе, сказала нешта, угледзеўшы нітку з-пад падала, і цішком, каб ніхто болей не заўважыў, адышлася. Жанчына падняла падол, як не зубамі адарвала брындзіну, агледзела сябе. Як перад люстэркам, прыгожа і непасрэдна. Бабця Тася стаяла наводдаль, задаволена перабірала вуснамі, па-свойску, шчодра любавалася чужым багаццем: хай, маўляў, на ўцеху ходзіць во тутака сярод нас з хатулямі. І каб ніводнай на ёй парушынкі!

І зноў на сходках лесвіцы ляжыць гваздзік з кароткім сцяблом, торгнешся, ледзь не наступіўшы ў цемры. Пэўна, той дзед з ніжняга паверха, даўно хварэе, ужо ён у лазню ездзіў з валіскай і ў ванну — з валіскай. А ўчора быў вайшаў на пляцоўку, каго бачыў, з тым і развітаўся, моўчкі, бо няма пэўнага слова для такой хвіліны.

Старыя выходзяць з гэтага дому на нягнуткіх нагах, з кіем у руцэ — па кветках.

Шырока займаюць дарогу, адпіхнуўшы перад сабой на пляцоўцы абедзве палавінкі дзвярэй.

Зноў на сметніку іхнія пажыткі: пашчапаная калодачка сячы мяса, абціснутая абручамі, драўляны крыжык — падстаўка для навагодняй ёлкі, жалезны ложак. Сядзіць, пэўна, на высокім брыжы да астатняга, скупа пільнуецца ўсяго гэтага чыясьці беражлівая душа. Асабістыя рэчы, а мне дык і ліпа пад маім акном, не тое што.

Яшчэ нехта не дачакаўся, як і я сама, пакуль адрамантуюць дзверы ў пад'ездзе, пакуль уключаць лямпачку, не падмятуць сквер перад домам, дзе не ступіць нагой — усюды смецце, друз разбітых бутэлек.

Пойдзем на вуліцу, пагуляем, — запросіць хто-небудзь з сяброўак. Ніколі не магла выслабаніць свае рукі ад чужой

работы, бы гэта ў маёй хаце ляда стаіць – не пераступіць, – якія тут гулі на шуметніку? Карцела закасаць рукавы – век сярод чужых недаробкаў у гэтым горадзе. Усе вуліцы твае, як казаў паэт, – адзін вялікі тупік.

Паеду на гатовае! На гэтай ускраіне горада не бачыш, а там тэатры, выставы, нарэшце, чыста – цэнтр. І Свіслач пад самымі вокнамі.

Бабця Тася, бабця Тася, я пераязджаю...

Яна паварочваецца да мяне тварам, падымае рукі, лап-лап па паветры, бы па вадзе, на глыбокім месцы:

– Дзе ты ёсць? я ж... аслепла... І святло ўжо не запальваю, нашто? Скора і я... дамоў...

Мы абедзве ў поцемках ад такой навізны.

Ні страху, ні адчаю ў голасе. Дзядзька Міша, той самы, кажа, прыходзіць, а як жа, газ запаліць, чай паставіць. Дай табе вазон падарую, герань, чырвоную? – пытаецца. Вось гэтая будзе чырвоным цвісці! Вазонаў процьма, адно зялёнае лісце, як здагадваецца? Яшчэ тут кожная рэч на памяці, сама ідзе ў рукі гаспадыні, толькі нічога не перастаўляйце, не рушце, не заблытайце іхнюю сувязь! Няма, бядуе, маслёнкі, чэшскае шкло, усім падабалася, пэўна, нехта з унукаў цішком забраў. Але ж яшчэ тут ніхто не памёр, каб пачынаць разбіраць, выносіць рэчы!

Яшчэ тут можна было б жыць, але паміраць... Хоць наастатку спэўніць тое, патаемнае, прыроднае, што не адбылося – аслабаніцца ад усяго зманлівага, чужога – вярнуцца ў вёску. Смерць справядлівейшая за жыццё.

Парушылася, прарвала плаціну, узровень чыстай вады, рэчышча чыстай мовы мялее на вагах. У сляпой Тасінай цемры бабці мае пярэваратнямі: то старымі бабрыхамі няўцямна гацяць запруду, каб не высмагла днішча, то берагавымі ластаўкамі зноў уюць сваё гняздо на ўскраіне.

Хачу выйсці са старога дома на гары – і вяртаюся, але па што?

– Я сённяка ўсенька парабіла, пліту вычысціла, аж галубовая! І ляльцы сукенку памыла, – загарадзіла дарогу Ніна.

Стаю, цешуся з яе найчысцейшай уцехай, як з дзіцяці, бавімся разам. Хачу зачыніць за сабой дзверы, а яны лёгка плывуць ад мяне ўбок: на адным гапліку, ветраюць туды-сюды, аніяк не злавіць.

— А я думаю сабе, і хто гэта мяне сёння пераседзеў у Тасі, — смяецца Змітраўна, гойдаючыся на паламаных дзвярах дуронай дзяўчынкай...

Аднойчы зімой па нейкай патрэбе наведаўшыся ў свой былы раён, захацелася ўбачыць стары дом. Снег, вея, падымаю вочы... а ён стаіць на пагорку... увесь ружовы. І не ад фарбы — садзілася, заходзіла тут МАЁ СОНЦА...

Новы дом не хінуўся да мяне, увесь час сядзіш настроіўшыся, прыбраўшы ўсё чыста, быццам нехта зараз прыйдзе правяраць дакументы, як на мытні ўсё роўна, ператрасаць рэчы. Не чуваць, каб хто гаварыў на роднай мове, хай бы сабе хоць і «з жабай у роце». Быццам выехаў не з ускраіны, а з краіны. Хоць ты бяры і тэрмінова тэлефануй, як, не раўнуючы, ваенным часам: цэнтр горада ўжо заняты чужынцамі! Хто гэтыя людзі, багата апранутыя, з іншамаркамі, можа, і паважаныя, і культурныя?!

— Але не нашым габэлькам габляваныя... — бабця Змітраўна і тут ёсць.

Найдабрэйшы сфінкс, нічога благога не маючы да людзей, адкінула маіх суседзяў, перабраўшы, быццам з кастрой каторы. Ці, можа, я сама дакладаюся гэтак, яе пасачыўшы?

Тэлефонны званок ці ўжо ў дзверы?

Тэлефанавала з вёскі Таня, пляменніца з Пастаў, распытвала. Я завучана гаварыла ёй аб прэстыжнасці новага дома, аб цэнтры горада, дзе выставы і тэатры, аб шырокіх чыстых вуліцах з ліхтарамі. А яна: а ці прывыкла ж ты?! Як не чуючы мяне, — аб самым галоўным, аб тым, што прывязвае душу, не маючы аніякай знешняй фактуры. А мая ж ты родзінка! — хоць ты загаласі. І не сустракаемся, і не перапісваемся — як здагадалася? На момант адчула моц нашага роду, шчыльнасць, дакладней, — магутнасць як у пушчавянскіх дрэў, якія магчыма прарэдзіць толькі бурай, выпаліць каторае толькі маланкай. На маім галлі сядзяць таямнічыя совы, поўнямі высвечваючы цемру (Соўчынам называлася нашая сяліба).

Павеяла гэткім палянскім ветрам, з усіх бакоў, спавівальным, бы стаіш увесь час на гары, на самым высокім месцы, і да цябе не даляцяць мітуслівыя, будзённыя гукі, чужая мова.

Данесліся званы з зарэчнай царквы ці касцёла. Хацелася спыніцца, павярнуцца на гукі тварам, бы нехта паклікаў цябе ўслед, назваў тваё імя.

Сустрэчны вецер пакрыў раку рабізною, яна развярнулася на вачах, сама пайшла да мяне, мелкімі хвалямі, у мой бок, дробнымі крокамі.

Назаўтра яна вынесла да берага тапельніка. Яго выцягнулі, паклалі на каменны брыж, як на вясковы ўслон, – бы ўжо памыўшы і прыбраўшы, чакалі машыну. І няўцямная трывога, невыразная віна, бы гэта табе, дзеля доказу, што мае шырыню і глыбіню, мае таямнічыя віры, русалак і вадзяных, што жывыя, рака наўмысна прынесла чалавека ў ахвяру.

Цяпер я бачыла раку лініяй свайго новага жыцця – усе ейныя выгіны, як на маёй далоні.

СЕМ БАГАВІЦ* ШЧАСЦЯ

Вось прыехала, ідзе, наблізіўшыся, мяняе крок, ступае драбней, дасціпней, зараз накіне на твар, як вуалетку з капелюша, нешта прывабнае.

Яна не ведае, што Франка бачыць яе праз акно. Сыплецца пылок ад забытай цыгарэты.

– Наста прыехала! Туся прыехала! – кідаецца ёй пад ногі старая нянька.

І яны ўжо абедзве прымаюць з Насціных рук ейную ману – усмешкі, прывітанні.

Праз якую хвіліну няня жаліцца: маўчыць Туся, маўчыць, няма гаворкі, на лыжку няма, як студня замкнёная, праз зубы калі што якое цэдзіць. Няня любіла яе, як ластаўку на волі, якую можна злавіць і палюбавацца. Франка кідаецца да шафы – трэба масціць, брукаваць, трэба цягнуць на грэблю паміж імі ўсё, што натрапіцца, складаць Тусі ў сумку, – павінен жа быць нейкі доказ іхняй роднасці! Што яшчэ? «Зялёны парасон?! – ускрыквае Туся. – Дзе ты яго купіла? Такі модны...» Нарэшце Франка чуе ейны голас, ейную радасць, хвалюючыся, запальвае цыгарэту. Яны кружляюць вакол Тусі, шчасліва гавораць усё па парадку, рукі няні рытуальна прыўзняты, яна

* У японскай міфалогіі ёсць сем багавіц шчасця, першая – расказвае дзіцяці казку, другая – гуляе з дзіцем у хованкі... і г. д.

амаль на дыбачках, выдаецца, прымярае на голаў Тусі вянок з кветак іхніх жаданняў: о, Туся яшчэ дзяўчынёха, яна яшчэ шмат чаго зразумее, палепшае, о, як ёй пасуе залаты бляск ідэалу!

Зараз Франка пакажа ёй, як у налецці расцвіла белая лілея, зараз, зараз...

— Туся спіць, аж слінька цячэ... — перапыняе няня.

З хаты на ганак, з ганка ў хату — і не зазірнула ў сад.

— Учора ты ёй сумку, шалік... сёння парасон, гальку... Чаму падарункі кожан дзень? Панядзелак, аўторак, серада... але ж нядзела на тыдні адна... Ты як адкупляешся ад нечага... — зморана гаворыць няня. — Ідзі да работы, зачыніся... Ідзі малюй...

Франка хадзіла па майстэрні ўзад-уперад. «Калышу на руках сваё гора...» — падумалася ўслых, па-бабску, па-вясковаму. Варта было чаго збедавацца, з яе спадалі прыдбаныя ў горадзе і адукаванасць, і свецкасць. Пэўна, варта хоць раз у дзяцінстве пачуць, як галосяць вясковыя жанчыны на могілках... Стаіць каторая, без слёз, прыслухоўваецца, твар святлее, раптам на вуснах амаль усмешка, бы нарэшце-такі пачула, дачакалася свайго голасу, той мовы, калі можна дазвацца і да жывога і да мёртвага. Асоўваецца на коленцы, каб бліжэй да зямлі, як на дарагім твары, гладзіць ейныя свежыя чорныя маршчыны...

І дастаткова. Здранцвееш, кроў у табе спыніцца, каб увабраць у сваю плынь гэтую жалобу, пераняць яе, як пераймаеш ва ўлонні матчына падабенства, самоту ейных вачэй. Праз гады, праз усё гарадское жыццё будзеш качацца па падлозе на самым высокім паверсе гарадскога дома, падымаць, склікаць радню.

Самае шчырае ў нас ад сялянскіх матак.

«У мяне ўжо ніколі не будзе дзіцяці...» — зноў амаль уголас. Але што яна дзеля Тусі яшчэ не зрабіла і што было не так?!

Няня шчэміцца ў дзверы:

— Няма, дзетка, паміж вамі клею. Але ж вы такія падобныя: абедзве цёмныя, валасы кучаравыя. І з твару можна памыліцца: хто дзе каторая ёсць, кім даводзіцца. Туся — як вылітая. Рэдка, каб так пляменніца з цёткай...

Добрая, мілая нянька, яна любіць параўноўваць, разглядаць твары, як на фотаздымках, блізка падносячы да вачэй. Падобныя... Няня, хутка вярнуся! Мы зараз жа едзем з Тусяй

павячэраць у «Ракаўскі бровар»! Але перш трэба патэлефанаваць, запрасіць разам сябровак, дзвюх сясцёр, абедзве адзінокія жанчыны, даўно бачыліся.

Усё будзе, як калісьці жадалася, як задумлялася: яна і дачка Туся, душа ў душу, побач! Адчуць (з кім жа яшчэ? усе астатнія ўжо ведаюць пра іхні разлад), забыцца, толькі гэта, як яно было павінна быць. Адчуць хоць праз ману, на людзях. Гэтую роднасць, парнасць. О, якая прыгожая! І ў інстытут паступіла? О! Няхай і Туся зазнае чужую радасць, гледзячы на іх, няхай убачыць свячэнне над сабой ад аднаго слова: дачка вядомай мастачкі! Мы падобныя, мы пазначаныя прыродай — гэта не выпадковасць! я адлюстроўваюся ў табе, маладой, бы гледзячы на сябе ў ваду, любуючыся сваім адбіткам, без маршчынак, без ценяў часу, — без шкадаванняў...

Вяртаецца на дачу адна, Туся застаецца ў горадзе. Доўга не прыбірае пакінутыя ёю рознакаляровыя паперкі ад цукерак на канапе, на акне, на стале. Быццам у доме поўна малых дзяцей. І на сцяне фотаздымак, калі Туся была яшчэ малая.

Што было не так?!

Пахаваўшы жонку, швагер штолета прывозіў з вёскі малую Насцю да Франкі. Укіне ў кватэру, як у кубел, — не згубіцца, і забываўся на яе. Хутка і ажаніўся зноў. Малая была падобна на хамячка, нават ззаду, калі адвернецца, бачны былі бухматыя шчокі, перацятыя хусткай. Наста, Настуся, Туся, — перабірала ейнае імя, шукаючы найласкавейшае. Чаму дзякуй не гаворыш, — пыталася Франка смеючыся, прыбіраючы посуд са стала. Во, адна каша, каб і суп быў, тады б сказала. Суп?! Ніколі ў ейным доме не сустракаліся запар дзве стравы. Муж удаўся ешчы, што падасі, тое і добра.

Супы, кампоты, пудзінгі, печыва, какоркі? О не! Дзіця ў ахапак — паехалі жыць на дачу, там тэрмінова была знойдзена добрая вясковая жанчына. Яна падбягала дапамагаць.

На дачы — мастачкі з Японіі. Во, іх за стол, а мне з-за пляча даеш есці?! А мне з-за пляча?! з-за пляча?! — адпіхвае Туся талеркі. Добра, што побач якраз не было перакладчыцы. Паслала ёй на ноч у другім пакоі. Я баюся адна спаць! — крычыць. Ну, добра, давай разбяромся, чаго ты баішся, каго? Абыходзіла пакой: вось гэта? — паказвала на шафу, на стол, на вялікі збан у кутку, на стары плецены куфэрак. «Во, во, яго баюся!»

Выносіла з пакоя, зачыняла дзверы, ішла да сябе ў майстэрню. Трэба сказаць няні, каб не расказвала ёй болей на ноч страшныя казкі, абавязкова трэба папярэдзіць...

Ноч. Ледзь гойдаецца квяцістая шаўковая фіранка на адчыненым акне. Круглатварая поўня ўжо ў пакоі японскай багавіцай Шчасця. Тая з сямі, што расказвае дзіцяці казкі... Сон морыць. Сон утомны, рознакаляровы. Хто гэта?! Маці... Яна спавівае Франчыны ножкі ў сваю начную кашулю, горне ў падол. Разнімае салодкія вусны: «Мачыха завяла дзяўчо ў лес і кінула там. Хто ў лесе, хто ў бары — прыйдзі да мяне ночку начаваць, — просіцца малая. — Я ў лесе, я ў бары, я прыйду да цябе ночку начаваць, — адзываецца мядзведзь». Сон цалуе абедзвюх у вочы. Голас маці хвалямі: то мацнеў, чуўся зусім блізка, то затухаў, зноў накочваўся, гойдаў яе, як на гушкалцы. «Прывёў мядзведзь да сябе ў логава, пачаў слаць пасцелю: рад палення, рад камення — і ступу наверх». Мулка пад бачком, яна скрозь сон закраталася. Каціся бліжэй, каціся да мяне, — горне маці. Яна бярэ Франку за ручку і ўжо разам, пабраўшыся, яны ідуць праз лес, разам да мядзведзя, разам заглядаюць у ягонае вушка, поўнае розных прысмакаў... А што далей? Далей маці ўстане, прыснуўшы дзіця, і будзе гатаваць у сагане абіраную бульбу з соллю, і ні скарыначкі, каб хаця пранашчыцца...

Франка падхапілася, няня! крычыць, да чаго гэта: яна зноў убачыла ў сне сваю маці-нябожчыцу, жывою... Ідзе да Тусі. Тая ўжо не спіць, вейкі ледзь сплюшчаны, погляд — як у птушаняці ў чужым гняздзе, зыркі. Пачынае весела гукаць да яе, забаўляць: «Не смяшы мяне, я не люблю, калі мяне раніцай смешаць». — «Чаму, Туся?» — «Я зайдуся... Мне вось тутака робіцца блага», — паказвае на грудкі.

Збянтэжана адыходзіцца: Божа, хто гэты чалавечак? Ніколі не задае пытанняў, нічым не цікавіцца. Іншы раз здавалася, што да яе не даходзяць гукі, пахі, святло, хацелася правесці рукой перад вачыма, каб упэўніцца, што вочы ейныя бачаць. Туся не хацела знаёміцца з навакольным светам, быццам ужо была ва ўсё пасвячоная.

Дзынькнула разбітая талерка, за ёй ляціць на падлогу кубак, ляпнулі дзверы — гукі выбухамі на ўвесь дом. Не, яна не накрычыць, але як растлумачыць, што разбіты збан стаяў

дзеля прыгажосці. «Навошта ён... ты ім не карысталася», — па-гаспадарску прыціскае Туся далонькай усё трапяткое, усё няўлоўнае.

Чыстая праўда, яна сама ўжо чуе толькі гэтыя разбуральныя гукі.

Ішла да сябе ў майстэрню — вярнуўшыся з Японіі, уражаная краінай, хацела намаляваць цыкл карцін. Садзілася ў крэсла, каб крыху засяродзіцца, галава раптоўна хінецца на плячо, нейкая незразумелая прыгнечанасць амаль на біялагічным узроўні, як у расліны. Ніякіх успамінаў, ніводнай краскі навокал, нават шуму жывой лістоты — пустое бадылле, аніякай апоры пад нагой — уся прастора цяпер быццам належыць малому дзіцяці.

Але ж трэба неяк размежавацца — яна пасадзіць Тусю маляваць у пакоі на другім паверсе. «Я не хачу тут быць!» — «Чаму?» — «Там ляжыць мёртвы матыль!»

— Няня, дзе ты?!

Глядзела на іх у садзе праз акно, здалёк. Позняе замуства, не мела сваіх дзяцей, марыла аб дзяўчынцы, аб дачцэ, чакала, быццам хадзіла цяжарная, быццам яшчэ быў час, забываючыся, што дзіця ўжо побач. Сем японскіх багавіц Шчасця абступаюць яе, і кожная з дзіцем. Адна з іх падхапіла доўгае кімано, прыбірае ўсё ў майстэрні з-пад ног, рассоўвае па кутках, каб не паваліцца, гуляючы ў хованкі. З завязанымі вачыма, знарочыста стаіўшыся, яна ходзіць узад-уперад, ловіць дзіця. Яна блізка чуе ягоны малочны пах, водар, ёй лёгка яго злавіць, як лёгка ў суцэльнай цемры дакрануцца да сваіх вуснаў. Але яна марудзіць. Яшчэ некалькі хвілін блазноты, каб пабыць з ім у адным узросце, у ягоным бязмежным часе — патрапіць яму. І вось яно ўжо злоўленае, цёплае, вісіць у цябе на руцэ, калоціцца птушанём, б'ецца ў сутонні тваіх каленяў. О, як доўга яны былі разлучаны ў сусвеце!..

Зрэдку, заўсёды неспадзявана наязджаў з вёскі швагер. Маўклівы, медзведзяваты мужчына ішоў па пакоях, як па полі, шырока расчыняў дзверы, шукаючы дачку. Хапаў яе, лавіў ручкі, ножкі, цалаваў усё па парадку. Туся, знямеўшы ў ягоных нязграбных ласках, хатульком спаўзала па жываце на падлогу.

Франка стаяла збоку, бянтэжылася, быццам не мела дазволу іх бачыць.

Швагер хутка ад'язджаў. «Ты мяне не шкадуеш!» — раптам расплачацца Туся. — «Я цябе шкадую, калі сцялю пасцелю, шкадую, калі вару табе кашу, калі мыю твае сукенкі...» Яна ўсё зробіць, усё, што патрэбна, але толькі каб не прыручыць да сябе моцна. Бо трэба на зіму вяртаць Тусю да бацькі з мачахай, у вёску — няня бабіць узімку сваіх унукаў, можа дапамагаць толькі ўлетку. «Чаму ты з намі не едзеш?» — пыталася Туся, ад'язджаючы. — «А што я там буду рабіць? у мяне ж тут праца», — «Паштаркай можна ці ў канторы, у краме...»

Развіталіся. Садзілася за пісьмовы стол, рыхтавалася да лекцый — і не магла пасля разабраць свой почырк. Бралася за нейкія недаробкі, нешта цыравала і дзівілася — гузікі прышыла з найніцы. Трэба было ад самага пачатку ўладкоўваць сваё звыклае жыццё. Вось нарэшце ўсё на сваім месцы, кожны прадмет. Нарэшце можна сесці на тэрасе, кубачак кавы з кардамонам, спакойна, нікому не трэба даваць заўвагі, не чуючы смаку за сталом: «Туся, не гойдайся, Туся, не чвякай, Туся... Туся... Туся...» Нарэшце можна жыць у свеце сваіх фантазій.

Толькі нейкая крыўда, як у дзіцяці, што яе не ўзялі ў вёску пагуляць у хованкі.

«Люблюлюблюлюблю», — пісала заўсёды Туся на паштоўках з вёскі, адным доўгім загадкавым словам.

Зіма, вясна, зноў лета. Вяртаючыся з працы, іншы раз і ў дом не заходзіла: няня, збірай Тусю. Садзілася ў «Шкоду» — на выставы, у музеі, на розныя святы, проста ў госці. Размовы, відовішчы, а застаўшыся адна, дзяўчынка садзілася і з году ў год выразала з паперы цюльпанчыкі. Хто яе навучыў?! «Туся, давай збяром кветкі, табе ў школе загадвалі зрабіць гербарый». — «Гэта дзяўчаты ў класе любяць матылёў, кветкі — ляп-ляп-ляп у кніжку. А я толькі калі лісцікі...»

І наогул, дзе гэта ўсё адбываецца? у чыім злым доме? «Туся, ты не памыла ногі нанач». — «Я раніцай ногі мыю». — «Ты зноў без шкарпэтак абулася», — «Толькі адну нагу без шкарпэткі», — адказвае скоранька, бы якая сараканожка. Перасцілае ложак, знаходзіць пад сенніком костачкі чарнасліву, паперкі ад цукерак. Туся?! «Гэта яшчэ ў залецці». Маніць спрытна, амаль весела, бы счытвае з гатовага. Нічога ў доме не схавана, не замкнёна, і сама Туся ўвесь час на вачах, разам. Дык тады што — ноччу?! Хаваючыся?! Смачней,

калі адна ласуецца? І ёй не гарчыць гэты смак адзіноты, быццам яшчэ не зведана сямейнае, няма тут чалавека, з кім хацелася б падзяліцца?!

Падводзілі нервы. Дом напаўнялі нейкія незнаёмыя дагэтуль гукі, шоргат таямнічага жыцця. Нехта нябачна падпільноўваў яе, каб счакаць, калі адвернецца спіной, гуляў з ёй у злыя гульні. Мышынымі гнёздамі ляжалі пад ложкам пакамячаныя паперкі ад цукерак, печыва. Ніколі не дазваляла сабе ўгневацца, накрычаць — ніколі.

А што калі прырода зла мае такія ж правы, як і дабро — дзеля раўнавагі? Дзеля цэласнасці свету? І трэба спакайней, збоку назіраць, як мастак, за ягонымі праявамі?

А што калі... І раптам расплакалася ўголас: «Туся, ты мне ўвесь час маніш! Я больш так не магу!» — «Ніколечкі не буду, цётачка Франка!» — заламала рукі, узмалілася, вочы поўныя пуду. Франка як знявечылася — так віняцца толькі перад чужымі, строгімі, няўмольнымі цёткамі.

Нянька падбягала, супакойвала:

— Не рві сваё сэрца, Туся, праўда, ужо ладная, але нічога не разумее, паглядзіш — яна паправіцца, палепшае.

Туся яшчэ і яшчэ абяцала, прылятала кожнае лета, прыкладалася, як пчала, да сухіх кветак і адлятала — ні з чым. Варта было даць Тусі заўвагу ці параду, «дык ты хочаш, каб усё па-твойму было?» — скажа і сама спужаецца.

А ці ведала яна, якое шчасце паўтарыць раптам жэст маці, ейнае слова, міміку, звычку? Гэта ўжо як сустрэча, неспадзявана напатканая ў падсвядомасці: як твар да твару, калі ты з малога, без яе, навобмацкі ходзіш сярод чужых...

Туся яшчэ пісала на паштоўках, на сурвэтках папяровых за сталом: люблюлюблюлюблю.

Ці не гуляе ўжо яна ў гэтае слова, усыпляючы цётку, здагадваючыся, што з гадамі ёй яно неабходней, як калісьці было неабходна самой Тусі ў дзяцінстве?

Не можа быць! О, яна яшчэ зразумее! — жанчыны кожан раз абступалі яе, цешылі сябе, луналі над ёй аж пад столлю — анёлы толькі давалі ходу.

А што калі Туся адчувала: любяць, але не яе, і ненавідзела тую, што як за ейнай спіной увесь час, якую яны бачаць у сваіх марах, якую чакаюць?!..

Зноў хадзіла па пакоі ўзад-уперад, узад-уперад... Перабірала сустрэчу з сяброўкамі ў «Ракаўскім бровары». Якраз насупраць за сталом сядзела там маладая маці з дзяўчынкай. Яна раз-порах абнімала малую, гладзіла ручкі, цалавала: «Мая ты прыгажуня... Мая ты панна...» Дзяўчо пазірала безуважна, амаль не дыхала, нічога не гаварыла, як у непрытомнасці. Беглы, кароткі погляд, нізкі лоб — усё ў ёй увабрана ў сябе, з той пароды, рэдка калі на ўдачу развіхнецца з гадамі, закрасуе. А маці надзявала ёй на шыю нізкі пацерак, чапляла бліскучыя абручыкі на галоўку, каб узрушыць ейны сон, пабудзіць. Ні на кога не звяртала ўвагі, як у трансе, бо, пэўна, падышоў такі момант, калі маці робіцца магам, чараўніцай. Яна лячыла сваё дзіця, яна яе замаўляла: ты прыгажуня, ты прыгажуня... Няўжо ведае, што яно непрыгожае?

Багавіцай шчасця пазірала навокал, уладарна прымушала ўсіх за сталом верыць у тое, аб чым гаварыла дачцэ.

Чаму ўвесь час гэта ўспамінаецца?

Тэлефонны званок перапыніў ейныя сумневы. «Мама!» — радасна, не вітаючыся, як наўздагон, ідучы ззаду, даганяючы на вячэрнім змроку. Франка маўчала. «Мама?!» — ужо сумняваючыся. На момант адчула тую таямнічую сувязь у голасе, тую танальнасць адносін, калі не існуе перашкодаў, не існуе адлегласці — заўсёды побач, бы яшчэ і пупавіна не адрэзана. Франка не прызнавалася.

«Мама, ты?» — зараз дагоніць, паверне за плячо, паглядзіць у твар... «Вы памыліліся», — адказала, пачуўшы свой прытворна-малады голас...

Толькі цяпер яна заўважыла на стале ляльку, падараваную ў Японіі. Збоку — быццам гуляе сама з сабою, а калі павянуць... На шчоках ружовае святло ад лямпы, як ад сонца на белым снезе, калі яно на самым захадзе. Сонны разрэз вачэй — лялька толькі прачнулася. Адна рука прыпадымалася, прымеркаваўшыся, каб легчы на тваё плячо, моцна абхапіць. І вочы ўжо прыспушчаныя, глядзіць перад сабой, дробныя крокі, ужо набліжаецца, несучы ў выцягнутых руках поўную чашу ўмольнага нясцерпнага жадання.

Лялька прасілася на рукі, ужо не адвядзеш погляд, будзеш забаўляцца, не спусціш на зямлю.

Бразнулі дзверы, як у канюшні.

– Туся?! Чаму не ў інстытуце?

– У нас сёння заняткі на лыжах. А мне бацінкі не падабралі – занадта малая нага...

Як у японкі, закутай у драўлянае сабо.

Туся пачціва нахілілася, ледзь дакранулася, каб прывітацца. Хутка і пайшла да сябе ў інтэрнат. І зноў прыхінулася. Бы да аправы абраза, падумалася, нават чула сухое шамаценне сваёй старэючай скуры.

Заняткі на лыжах? Колькі ж часу яна сядзіць, разглядае малюнкі на ляльчыным кімано, колер кожнай ніткі?

Няўжо зіма?!

Устала, пераступіла, як гурбу, самаробную белую хустку, што звалілася з плячэй пад ногі. Зараз толькі, пакуль не вярнуўся муж, кубачак кавы з кардамонам, а паху... быццам зацвіў міндаль.

Вунь галінка яго ўжо адбілася на нацягнутым палатне новай карціны.

Я СЯДЗЕЛА НАСУПРАЦЬ...

У акне раптоўна сцямнела, бы нехта з-за вугла падышоў да самай рамы, блізка, паніклівa, і не адступаў, аж у твары стала горача, як ад неспадзяванага чужога позірку. Адкуль хмара бралася, быццам і ветру не было, ужо вечар, якраз тая пара, калі цяжэе галава.

Выходзіш на панадворак сустракаць навальніцу. Спачатку голас, і не адразу пазнаеш, адкуль ён, чый, бо навокал адны дрэвы. Яшчэ і яшчэ раз, пабыўшы. А гэта старая яблыня, накрытая хваляй кароткага пераходнага дажджу, надламіўшыся, хілілася да зямлі. Хілілася павольна, асцярожна мацаючы дол галлём, каб ёй хаця ўдалося на апошнім часе паспець абаперціся, а не бразнуць, грымнуць. Памірала дрэва. Яшчэ некалькі хвілін краталася, прылёгшы, шапацела лісце, гартаючы малітоўнік. І я стаяла знерухомеўшы, прысутнічаючы на паніхідзе ў сваім «аліўкавым» садзе.

— Хрась, бразь — ненадоўга запрэжана, калі баба адна! Вось ужо і мужык патрэбен! Не ганарыся, кажы, калі прыйсці памагчы спарадкаваць яблыню. І дровы, бачу, непілаваныя.

Не адну бяду хмара прыгнала — за плотам стаяў Іллюк, і ён тут ёсць! Вясёлы заўсёды, як у сабакі, смех на зубах бегае. «Ганчак» завуць яго на вёсцы.

Толькі што бачыла — сядзеў на страсе, майструе нейкае збудаванне ў два паверхі, хляўчук не хляўчук, вёска трудную, згадкі строіць: што гэта можа быць? дзеля чаго? «Іллюк, бутэльку паставім, скажы, што робіш?» — ходзяць круга суседзі. Той не адзываецца, толькі смяецца.

— Ну дык што! Але ж я грашыма не бяру, як ведаеш, — загавэліў у кішэні жменю, і рублі, і сотні. — Не, мне паперкі не патрэбныя, на грошах сплю, мне глаўна выпіць! За пілоўку бяру тры бутэлькі, але калі цяперака такая водка дарагая, то я не карадзёр!

Замест «марадзёра», вядома. Мне не смешна з ягоных неалагізмаў. «Ты яму грошай дай, то ён другі раз ужо не пойдзе да цябе работу рабіць», — чую за спінай, як з царкоўных хораў, скаромныя галасы баб, што даўно жывуць у вёсцы без мужыкоў.

А над усім свежая навіна: прыбягала сёння Ядзя, Іллюкова жонка, да суседкі, у якой ён пілаваў дровы ды й заначаваў быў пад плотам, напіўшыся. «А ці ты не ведаеш, забылася на тое, як цяжка п'яніцу трымаць? Свайго прымаку выгнала і панадворак падмяла за ім, ягоны след! І не гарадскім венікам, а дзеркачом, каб не вярнуўся! А я ж во трымаю! Дык ты мне гэтак дапамагаеш, бачыш?!» — крычала.

Ядзя прыляцела, а Махначыха ўжо не прыляціць сварыцца, і не лётала.

Махначыха памерла ад «дасады», як лічаць на вёсцы, маўляў, сышлі яе вочы, каб не бачыць таго, што рабілася ў хаце. А такая ж добрая, каб калі хто ейныя благія словы пераказаў, сама сабе пеклавалася з п'яніцамі і дачкі не мела, каб падзяліцца. Вёска шчыра шкадавала, дзівілася, маўляў, ай, які парадак пакінула: у хаце, у агародзе, на панадворку! «Так у ахвоту астатнім днём хату прыбрала, дык мне і не на памяці, каб ёй гэтак калі хацелася работу рабіць», — успамінаў Махнач. Адчынілі бабы шафу, усё ў ёй відаць, што ляжыць, усё чыстае,

папрасаванае. «А мая ж ты мурашачка, а як я памру, дык ніхто толку не дойдзе!» – дакладаліся адна адной, галасы як з паднябення.

Баба сабе, мужык сабе. «Ай, бяды, – казаў, пахаваўшы, – збярэцца радня, буду пытацца, што мне рабіць. Што я без яе буду мучыцца? За адным разам! За аднымі дзвярыма пойдзем! Во, пайшла, кінула, пі, гуляй, абсікайся! Не, не буду жыць, мэнчыцца!» Гэта пакуль быў цвярозы. Вечарам, набраўшыся з сынам, ужо накшым строем: «Нашто мне тая баба? Ці я выпіў, ці перапіў, ніхто галавы не дурыць». Сам ад прыроды такі пячурнік, двух слоў не звяжа, руды, вусаты, а нап'ецца – разапнецца, у твары чырвоны, гаваркі робіцца, голас сіпаты – ён ужо зух, сам сабе падабаецца!

Махначыха ўжо не прыляціць сварыцца. І Лідзя Крулёва – не. Кульнула ўчора п'янага, як цэп, Круля з воза, сама завярнула каня, паехалі з ёй у лапнік. Гэта не араць, не баранаваць, не пілаваць, можна і без гарэлкі абысціся.

Ехалі, гаварылі, маўчалі. Калі едзеш на кані, ствараюцца доўгія паўзы-перамежкі ў гаворцы, запоўненыя стукам, перабораміконскіх капытоў, рыпеннем воза – усё наваколле ўступае ў тваю гаворку, у твае думкі. Магія запаволенай язды зближае, як западруку ідзеш пабраўшыся, шпацыруеш. Лёгенька мінаем альшэўнік, балотца, бы рукой ад вачэй адхінаеш старыя сосны, дубы.

– Як я ўсё люблю-ю, а коней найболей! я яму і яблычка, і бурачка, рукамі яго абстукаю па шыі, па баках! Но, но, ціш-ціш, нябойсь! – размаўляючы са мной, размаўляе і з канём.

Пагаварылі пра гаспадара:

– Ён мне ўжо не муж і не палюбоўнік, што казаць, аніякай начной работы, п'яніца. П'яніца і свечку ў царкве проста не паставіць. На трэці дзень даўмелася, хто ён ёсць. Пачну сварыцца за выпіўку, тады ён: ад цябе, кажа, ліха, быццам бы ўжо п'е з дасады на мяне, што трывожу, што волі не даю. Я яго шэсць разоў ці болей збірала, выганяла вон. Кашулі папрасаваныя, майткі складу ў сетку, усё, што нажыў, і сам быццам ужо зазбіраецца: адзін бацінак на назе, другі ў руцэ – і ходзіць па хаце, шукае, злуецца, бы я схавала. Доўга трымала яго на самым краёчку, пужала, што адпраўлю – не дапамагло. А потым раздумалася: ну і пойдзе, але ж і вернецца, хто яго такога

трымаць будзе, і мне самой навошта бадзялы кот — хай жыве! Другія бабы і такога не маюць... Іншы раз вяртаецца паўначой: адчыні! — крычыць — участковы ідзе! — гэта ягоныя жарты. Другая б у міліцыю і раз, і два, потым у ЛТП, а я маўчу. Што ты іх усіх ягоных таварышаў у сноп звяжаш і ўдасі міліцыянтам?! Судзьба. У мяне і першы такі быў, і дваццаты такі будзе. Дык гэты хоць не б'ецца, можа, калі раз у год, за дзесяць гадоў дзесяць разоў. Нервенны, звяглівы надта. Сусед, гэты калі і пакрычыць на жонку, дык жа можна сцярпець, бо мужчына, гаспадар. А мой... Доля такая... Трэба жыць... Ціш, Орлік, ціш-ш-ш. Во ручай праз дарогу, пэўна, конь піць хоча. Але што гэта мне сёння-ка снілася?.. Быццам іду замуж... вэлюм... а сукенка... чорная. За Круля... Што гэта я зноў за яго іду, сама сабе думаю, ён жа аніякай да мяне ласкі, увагі?.. Да чаго сон?..

Голас ейны такі ціхі, што плыткі ручай каля ног у каня чуецца мацней і выразней. Лідзя вялікая, што ўвышкі, тое і ўшыркі. Сцякае сонца па босых нагах. Такіх жанчын не перабіраюць: прыгожая яна ці не — не гавораць. Ад яе сыходзіць той спакой, моц, што і птушка ў непагадзь прыляціць да яе хавацца. Заўсёды ў нечым цёмным. «У мяне, — кажа, ніколі хлопцаў не было, адны мужчыны ці ўдаўцы». Заўсёды ў бяседзе садзілася за стол са сваім чалавекам на астатку, на краёчку, каб ніхто не згледзеў, як яна будзе забіраць у яго свежую чарку і выліваць у вазон ці на падлогу.

— Гады ляцелі, я іх не бачыла. Во ўчора: стаю, выжымаю бялізну, бачу: сядзіць, прыйшоўшы ад суседкі, дровы пілаваў. І раптам зваліўся з лавы, аніяк не магу падняць з падлогі. Якая цябе сучка спарадзіла на маю галоўку, кажу, не стрымаўшыся. Як ускочыць: а-а-а, ты маю мамку зняславіш?! Лідка, заб'ю, сам павешуся — у мяне даўно ўсё гатова, крычыць... Маці сваёй я ніколі не распавядала, як жыла за першым. І сястры не раскажу — сэрца парве. Во калі толькі табе прыйшлося... Дык да чаго мой сон?

Я стаю напроці кожнай замужняй бабы ў вёсцы пушчанскай дзікай лясінай, на якую скіраваны ўсе вясковыя перуны. Стаю, гляджу на ваду. Да чаго сон? Абы расказаў благі сон над вадой, і ён не збудзецца...

Не кляне, не бадзяне свайго мужыка, нічога ёй няма нясцерпнага, нічога невыноснага. Раздумляецца, сама сябе

супакойвае, маўляў, бывае і малая капейка і большая, а зварот маеш – усё гладка не прапівае. Не тое што ў суседзяў: ніколі яна не бачыла, каб калі ветралі ў іх на панадворку памытыя прасцірадлы, быццам і змены няма ні бялізны, ні адзежы, ні ежы. Кожны дзень сусед п'е, дзе бярэ?

Не, маўляў, ёй яшчэ жыць можна. Хай сабе Круль і п'яніца, але ніхто з баб ганьбы ёй у вочы не дасць. Уся няўпраўка ў вёсцы на ейную галаву. Што б яны без мужыкоў рабілі, каб Круль не піў, каб Іллюк не піў. Яны ж бы толькі сваю работу правілі, сваім жонкам дапамагалі. Хіба непітушчы мужык па чужых хатах ходзіць? Вунь ад Веркі ніколі нікуды Мішка не адыходзіўся, во толькі калі свінню закалоць пазавуць. І Пецька анікому, толькі сабе. А ейны і дровы, і сена, і нават таму ж Пецьку дошчачак нарабіў разам з Іллюком і як шаляваць хату паказалі. Хведарка мужык харошы, разумны, але таксама дзеля самога сябе.

Давялося самой Лідзі паспытаць бабскую долю адзіночкі, калі памерла свекрыва. Стаяла пад дажджом на вуліцы, прасіла з плачам, каб хто дол выкапаў на могілках. Крулю самому няволле такую работу рабіць па матцы. Ніхто не згаджаўся, ні Мішка, ні Пецька, ні Хведарка, адны алканаўты і дапамаглі.

Запар вёска косіць, запар возіць сена, салому, бо, можа, не здужае ў налецці ці пагода падвядзе – спрэс то старыя, то адзінокія бабы. Раз памог палена падняць, то і чарка. А ўвечары ідзе той памагаты з бабамі пасярэдзіне западрукі, калі ўдасці ў мінуту лучыць, дабегчы, адцягнуць яго ад стала. Едзе па вёсцы пустая павозка, павольна, без накірунку, ад плота да плота, спыніцца конь, ускубе каліва і зноў пайшоў. Адна павозка, другая, бы з вайны, вяртаюцца, бы пабітыя недзе ляжаць мужыкі. Хто зваліўся на дарозе, «начаставаўшыся» ў заробках, а каторы зарыўся ў салому і не відаць яго. Ціха на вуліцы, ні голасу, ні плачу. Ходзіць іншы раз Лідзя поўначчу за вёскай, факела запаліўшы, шукае свайго каня.

Здалёк відаць ейная адзінокая паходня.

Прывезлі лапнік, спыніліся, а Лідзя да мяне: ці ведаеш такую песню, надта яе ўлюбіла, пачуўшы, там во гэтак пяецца, маўляў, на адной травіне сіні і жоўты цвет, Іван-ды-Мар'я завецца. Я ж і злезці з воза не здужаю, не тое што песню

ўспомніць, наслухаўшыся пра мужыкоў-п'яніц за дарогу. Бы «сядзела насупраць іх, як сядзяць за сталом, і ў акне шукала іхнія мроі».

Апоўначы хадзіў па панадворку спалатнелы, як месяц, хворы на галаву Баравік. Убачыў мяне: а я думаў, што нікога няма, кажа. Залезшы ў якую хату, бярэ толькі пустыя бутэлькі і штонебудзь на закусь.

Іллюк пастукаўся, калі яшчэ і на небе вокны былі завешаны.

— Паўлітэрак на стол і з цябе досыць! Астатняе грашыма! Паўлітэрак не дзеля палудня, не, я працую на гарэлцы, каб праз кожныя паўгадзіны свежае каліва было ў роце! Тады і дзень, і ноч, і праз ноч буду працаваць, і не абы-як! Не кісне работа ў руках! Калі не вып'ю, слабы раблюся, нічогі!

Сам сухі, чорны, вясёлы. «Пласкагубцы, пласкагубцы, пласкагубцы», — гаворыць услых сам з сабою, каб утрымаць на памяці тое, што яму зараз найпільней патрэбна. Я надта не разбіраючыся, нашу ззаду за ім тыя абцугі, нажоўку, усё, што трапіцца, пільнуюся, дзе, што ён кінуў. Аніяк ад яго не адысціся, крычыць на ўвесь панадворак, абы не адазвалася, ідзе бліжэй — яму патрэбна не толькі чарка, але і субяседнік.

— Гэта электроніка! — паказвае на сваю сталярку. — Стамеска, стамеска... стамеска... У мяне ўся тэхніка на руках: і конь, і піла «Дружба»! Божа мой, чаго толькі не маю! Люблю работу рабіць, калі яна атрымліваецца, а атрымліваецца ў мяне ўсё! я быў бы ізабратацелем, каб некалі добра вучыўся, бо што здумаю, тое і раблю. Стамеска, стамеска...

Чыстая праўда, ніхто не скажа, што Іллюк хвалько. Учора як мае быць, а сёння раптам — свінні кочава, панадворак рыюць, трэба драціну ў лыч завесці. Абы ўдалося Іллюка зазваць, ужо шчасце, ён і карыта новае саб'е, і загарадку паправіць. Баба падлеткам ускочыць па драбіне на гарышча, канец кілбасы ў адной руцэ, бутэлька ў другой. Іллюк з напарнікам ідуць, смяюцца, як ад іх свінні ўцякалі. У хату гэты смех прынеслі, ужо насмяяўшыся, але дзеля прыліку яшчэ раз расказалі гаспадыні, каб з гэтым і за стол сесці, гаворку завязаць.

— А ўжо як насмяяўся, калі адзеў быў суседчыну сукенку, хустку завязаў, каб не ўпэцкацца ў сажу, і палез ёй комін чысціць! «Глядзіце! — крычалі бабы на вуліцы. — Старая

Мацеіха ў восемдзесят гадоў на страху ўзлезла і не трымаецца ні за што, ходзіць!» Нажоўка, нажоўка, нажоўка... Не-не, нашы мужыкі па полі, як той казаў, не валяюцца, яны сваю цану маюць. Во суседка без мужыка ўсё жыццё, а нехта ж браў, дык ёй усё, бачыш, алканаўты! Дзяўбе іншы раз касой на вуліцы каля дарогі, як забаўляецца, час бавіць, — можа хто пяройдзе, хоць будзе да каго загаварыць, бо пуста ў хаце. Як на ёй усё павысыхала, панасілася, кароткая спадніца, усё сваё дзявоцкае даношвае. Што, няпраўда? Шчаслівая мінута, калі ён, Іллюк, пашкадуе, воз сена прывязе. Пласкагубцы, пласкагубцы, пласкагубцы... Ага, трэба каня пачаставаць, такі конь удалы! Бывае так, што як заедзе на ім п'яны, што цвярозы не можа выехаць — і ўсё акуратна, у любыя вароты ўшчэміцца! Во як! І наогул, якая тут ужо з ім бяда, хай сабе ён і алканаўт?! Ніколі яго жонка Ядзя не раздзявала, не разувала, во толькі, можа, ваду з ботаў павылівае. Ніколі з хаты выгнаная не была. Нажоўка, нажоўка, нажоўка... Іншы раз прыйдзе дамоў, сям'я на ягоным ложку і ўдоўжкі і ўпоперкі — тэлевізар глядзяць. А яму і добра, што не заўважылі, які ён ёсць з «гасцей». У харошыя нявестчыны падушкі ўваліцца, у пуховыя, ніхто не зачэпіць, не пабудзіць, не насварыцца назаўтра, толькі жонка Ядзя: бацька, дзе ты быў? Дзе ты еў? Яна і тваражку, яна і маселка. Стамеска, стамеска... Учора, праўда, з нявесткай як не пабіўся. Зляпіў ён сабе помнік і агароджу, на дваіх, у помнік упісаў і Ядзю, схаваў дачасу. Нявестка, смеючыся: не вер каню ў дарозе, а жане дома. Ты, бацька, памрэш, а Ядзя твая яшчэ, можа, замуж выйсці і за харошага чалавека, яна ж, маўляў, маладзейшая, і з табой легчы не захоча. Паўдня ганяў яе з калом! Не, разам ужо не спяць, зняў бы штаны, а што далей рабіць — і не ведае. Па той раз! Абцугі, абцугі, абцугі...

Бутэлька гарэлкі апарожнена, на гэтым і скончылася «ўрачыстая» частка нашай сустрэчы. Іллюк стаў пасярод панадворка ды раптам як дасць нагой па станіне!

— Я такі нервенны, — кажа, звінаваціўшыся. — Як вып'ю, тады я пан, а пройдзе хмель — зноў раб. Па зямлі качаюся, так блага, край меры дай выпіць, трудную... Ніхто дома не ўгадае, што б мне хацелася рабіць: і тое і гэта не хачу. Сын во хлеў стары разбірае сённяка, а я ўцёк, сюды прыйшоў дапамагаць, бо на глыток водкі спадзяваўся. Як той казаў, у суседа бяседа, то

дома не работнік, бачыш. І ў маёй сям'і, пэўна, будуць гэтак успамінаць, як памру... Ядзя мая ішла з буракоў вуліцай, чуе — суседка сварыцца ўголас: а каб цябе! а каб цябе! На каго ты, пытаецца? На мужыка, адказвае! Маўляў, столькі пакінуў недаробак! Казала яму, каб загарадку з новых слупоў ставіў, дык не паслухаўся! І страха вунь! Шыферына паўзе, бо да старой дранкі прыбіта, паленаваўся дранку адкінуць, крычыць. Ядзя мая аж спужалася: а суседачка, а мілая, кажа да яе, ён жа не ў госці паехаў, ён жа памёр, не збіраўся ж паміраць! Во якія памінкі па мужыках-п'яніцах! Я ж такі па прыродзе падыходчывы, такі добры, і дзе яно дзяецца, у каго запытацца...

Пайду, кажа, уключу рухавіка, старая абмотка прапускае, фаза прабівае на корпус, дакрануся — токам ударыць, страсяне, ток дапамагае.

Вяртаўся ўжо весялейшы. Абцугі, абцугі, абцугі. Вунь рабая пайшла, разглядаецца, не, гэта двое людзей напроці лесу, у светлым. Нажоўка, нажоўка.

Хутка гэтыя двое, кінуўшы калгасны статак, зайшліся на панадворак. «Ідзі да кароў, ідзі!» — закрычаў Іллюк на старэйшага і рукамі махаў, паказваючы ў поле, і горлам трубіў. Камянём, кажа, у яго кінеш, тады адвернецца, маўляў, глухі начыста. Глушэц. І Круль, і Іллюк, і гэты маладзейшы — былыя механізатары, даўно звольненыя за п'янку, цяпер па чарзе пасуць кароў. Надта не шманаюць, маўляў, пакуль людзі, датуль і скот, хопіць ім работы. Хаця і тут, відаць, няма надта надзеі, адзін Глушэц трохі пільнуецца статку, круціць кароў на адным месцы, не чуючы іх вантробнага рыкання. Часцяком каровы прарываюць ягоную абарону, ідуць па полі, бразгаючы, крышачы рогі, цяжкім пешым войскам, нішчаць агароды за вёскай.

— Ты не наліваеш часам? — запытаўся госць. — Ну, бутэльку гарэлкі?! Мяшок морквы маю, морква плахамі, адна ў адну! — сеў па-сабачы на голую зямлю, чакае.

Іллюк мігае яму, маўляў, маўчы, тутака крадзенае не скупляюць, той толькі вушамі стрыжэ. Напарнік застаўся ў тым узросце, калі пачаў співацца. Усё яму здаецца, што ён яшчэ маладзёначак, цёткамі заве сваіх равесніц, затое і не жанаты. Трэба ж ісці, кажа, і, пабыўшы, зноў тое самае. Ужо яму пара прыйшла знайсці ў кустах схаваную гарэлку, калі не ўдалося

расстарацца на баку. І мне самой хоць ты па кустах шукай непакладзенае, хоць пазычай, але ж не сцерпець, каб Іллюк туліўся да станіны, каб трэсла яго, як зялёны мак.

Адразу павесялеў, убачыўшы свежую чарку.

— І што гэта ёсць? Бутэльку ў вёсцы вып'ю і хоць бы што! А ў горадзе чарніла пакаштую і ўжо хілюся. Не, я ў горадзе не жылец, я й сабаку гарадскому спагадаю, не тое што чалавеку. У вёсцы штодзень навіна. Во нядаўна Ядзя прынесла ў рэшаце курыцу з пісклюкамі, знайшла за чужым склепам. Сама па сабе выседзела, ніхто і не бачыў. На, кажа да мяне, глядзі! Маць тваю, не хачу і глядзець! Прывялася, злуюся, у канцы лета, не ў пару! Закапаю! Буду я тутака з імі няньчыцца! Халадамі! Пэўна ж усе белыя, кажу! Жонка нахіліла рэшата, курыца скацілася, паднялася, — як пасыплюцца з-пад скрылля пісклюкі! Ды ўсе то чорныя, то рабыя! Гляджу — мне і казаць няма чаго! А яна ж смагла, седзячы на яйках, а ніхто ж вадзіцы не падаў, а згаладаліся малыя! Нясі, кажу, тварог, яйкі вараныя! я люблю во такіх, пакуль падрастуць, сама такіх во! Пабажыся, што нікому не перадасі, скажу да чаго будую хляўчук у два паверхі. Козы маю, а каза ж горнае стварэнне. Дык каб ёй было весялей жыць сярод нас, палянцаў. А што я не люблю, каб запытаўся? Абы яно каторае закраталася. Водку, праўда, найболей... Без водкі не магу і з водкай доўга не пражыву... Напішы калі-небудзь. Жыве на вёсцы такі чалавек, усім дабро робіць, а яму аніхто... Напішы, а то памру і пазнатку не застанецца. Толькі во мае адзінокія бабы па другім разе аўдавеюць...

Адыходзячы дамоў, Іллюк, чула, пытаўся ў суседкі праз плот:

— Можа што дапамагчы?

Займаў чаргу ўжо на заўтра. А тая:

— А ці ўмееш ты капыты карове падразаць? Другі год заву Пецьку, не ідзе! Няма чым спадмануць, не п'е, зараза!

Абое засмяяліся.

Пацягнула з поля дымком, печанай бульбай, пэўна, пастухі сілкуюцца. І назаўтра ў лагу поўна дыму ад учарашняга непагашанага вогнішча. Ноччу падаюць зоркі, нехта варушыць гарачы прысак. Падхопішся, пачуўшы дым, соўгаешся па хаце, паглядаеш у вокны: можа, што дзе загарэлася? Светлыя слупы

за гародамі, бы падымаўся нечы патрывожаны магутны дух на кладоўі. Ці то вецер іх зрушваў з месца, ці яны самі перамяшчаліся, узад-уперад, узад-уперад. Два слупы, пэўна, мужчынскі і жаночы. То раптам аб'ядноўваліся ў адзін, то зноў разлучаліся, хадзілі ўборкі.

Бачыла Іллюка ўсё радзей. Казалі, што захварэў. «Вой, хворы! Ён учора сеў на ровар, ды па пяску! Так ехаў, як метэор! Пэўна ж, баба маладая, не ўходае работу разам з ёю, дык хворым прыкінуўся!» — жартавалі з яго. Казалі, што зрабіўся надта нервовы. Сустрэўшыся, напамінала яму пра станіну, яна стаіць на нашым панадворку ад той пары. Каза не абдзярэ, воўк не панясе, адказваў, хай стаіць.

А то ідзем неяк з сяброўкай дахаты, наламаўшы палыну за вёскай. Іллюк ляжаў перак дарогі. П'яны?! І не абысці, няма куды звярнуць. Зараз дасць па пятах матам, будзе кпіць, во, маўляў, няма чаго рабіць, поўзаюць тут. Тым больш, што зусім не вясковую патрэбу ганяеш, палын у вёсцы не збіраюць. І не хацелася бачыць яго ў такім стане.

Падыходзім — здраства, адказвае. Шапку зняў, лежачы: ці то змок, угрэўшыся, ці то і ўпраўду вітаўся па ўсіх правілах, як любіў звычайна. Галава мокрая, зялёная, як жалудок.

— Як здароўе, пытаецеся? Па гэтай жызні: якая жызня, такое і здароўе. Ляжаць магу, а хадзіць цяжка, усё баліць.

Раптам заўважаю: перад ім у траве, у пыле ляжыць кніжка.

— А што ж чытаеце?

— Казкі, — адказвае, адкінуў вокладку, глядзіць асалавелымі ад чытанкі вачыма.

Казкі?! Аж дух заняло ад неспадзяванасці. Раптам адчуванне надзвычайнай палёгкі, бы трапіў у ягоны казачны астральны свет. Адчуванне дасканалага імгнення, калі душа падымаецца над табой, а ты, амаль не дыхаючы, нема азіраешся, нічога не пазнаючы, ідзеш па вясковай дарозе, перабіраеш нагамі, як прывід. Пэўна, у такія хвіліны цябе ўжо аніхто не бачыць, які ты ёсць. І сам не памятаеш аніводнай недарэчнасці ў жыцці ні сваёй, ні чужой. Толькі вось гэта ў чалавеку на тваёй дарозе вартае ўвагі. Якое цудоўнае, якое неспадзяванае жыццё, як бы мы адзін аднаго ні калечылі.

Шчыміць уваччу, гарчыць на вуснах, пэўна, ад палыну...

АМАРЫЛІС

Завірусе на пагорку нічога не перашкаджала, як у стэпе: нікла да вокан, лапала па сценах, адчыняла слабыя казённыя запоры пад'ездаў, форткі, качалася марцовай коткай. Нейкая ейная гулёная разняволенасць перадавалася й чалавеку – другі дзень новага году, як на другі дзень вяселля, калі ўсе ўжо перазнаёміліся і разам пераначавалі. Ляпнула фортка, у пакой уварвалася паветра, свежае, набрынялае лясными гушчарамі, вецер зашчаміўся крысом у дзвярах, рэкнуў, вырваўся на пляцоўку – і я за ім, і тут ужо пах зімовай навальніцы. Апранаюся на хаду, пачуццё, што мяне ўспомнілі, за мной зайшліся, як было ў дзяцінстве, калі скачаныя ў снег дзеці гурбай увальваліся ў хату, што і дзверы не зачыніць. Куды ідзеш? па што? – абы з хаты! Шчанючку Марту за пазуху – і ходу!

Шаравой маланкай бліснуў ліхтар на слупе і згас. Завіруха сціхла, вея – завуць яе ў нашай вёсцы. А ні следу, цёмныя пячуры сумётаў, вуліца ляжала імшарай, наламанае галлё ў скверы скінутымі з дрэў птушынымі гнёздамі. З пагорка сумёты ішлі плыткімі хвалямі, бы на беразе ў час адліву мора.

Гэтую энергію патрэбна было сабраць, як ранішнюю расу сабе на твар.

Анікагуткі. Праўда, ля сметніцы зварухнулася жывая жаночая постаць, убачыўшы мяне, прытка абярнулася, як да знаёмай начніцы:

– Во! І нашто каторы, каб запытаўся, выразаў усё ў сярэдзіне? – трымала ў руках знойдзены абутак. – Харошыя ж боты, імпартныя!

Гідліва адкінула іх убок, выгаворвала некаму, наракаючы, маўляў, жывуць тут людзі, не адчуваючы пад сабой ейнага хісткага яруса, не ўлічваючы ейнай патрэбы. Разглядала мой норкавы паўбурносік увішным чаплістым позіркам, бы перавязвала мяне таўстой вяроўчынай, якой і сама была падперазаная. Пайшла далей перабіраць сметніцы, пайшла слабодным, упэўненым крокам – яна гаспадарыла тутака, пэўна, заўсёды. «З новым годам!» – крыкнула мне, адыходзячы. На момант я намацала пад нагой самую ніжнюю прыступку

лесвіцы і таксама, як і яна, не паслізнулася, прыняўшы за гонар ейную свойскасць.

Сустрэча з жабраком часта адкідвае мяне прэч, я перад ім гаспадыня-самазванка нават і тады, калі адчыняю яму катораму дзверы і ў сваім доме.

Мы абедзве збіралі гэтай ноччу тое, што было непатрэбна ўсім, хто моцна спаў, закалыханы веяй.

Баюся, што памылюся: крыху пабыўшы, пэўна, выйдзе перабіраць сметнікі баба Тася. Суберыць і адкінутае жабракамі — «арыстакратамі», перамые, папрасуе, зацыруе і складзе ў шафу — не сабе, бо жыве ў такім-сякім дастатку. «Парой будзе... раздам», — адказвае дачцэ (тая сварыцца, саромеецца матчыных выхадак), маўляў, прыдуць яшчэ цяжэйшыя часы, трэба некаму запасіцца на кожнага збадзялага.

Мне вусцішна пераняць ейны ясны зрок — няўжо спраўдзіцца? Цяжка сабе ўявіць бабу Тасю з рыззём у сваёй сям'і, але я яе разумею, амаль па-змоўніцку, бы недзе ў падсвядомай цемры таксама рыхтуюся да горшага, як чыясьці ахвяра. Матка найсвенша, каб запытаўся, хто толькі нас спарадзіў?

Колькі ўжо прайшло таго часу, пакуль мы тут «прымяралі» імпартовы абутак, мяне могуць спахапіцца дома, і шчанюк досыць накуляўся ў снезе. Але гэты навагодні «фэст» толькі распачынаўся: па снезе ішла жанчына, Начная Дама — далі ёй мянушку ў нашым доме. Рухалася, не гледзячы пад ногі — вызначаная, намацаная гадамі начная сцежка, яна заўсёды, казалі, гуляла па начах, імшары, пячуры снежныя ей не заміналі. На прыполе, замацаваныя жывулькай, маленькія камочкі ваты, — прыбрала сябе ялінкай, як у бясснежную зіму.

Папраўдзе, я яе амаль не бачыла, ейнае жытло на першым паверсе: вокны звонку застаўлены заўсёды дошкамі, завешаны посцілкамі. Аднойчы спатрэбілася зайсціся па сантэхніка, ён, падказалі, якраз нешта рамантаваў у ейнай кватэры. Завіхнутыя рыззём ножкі стала, крэсла, нават краны, стокі туга загорнутыя, як перацятыя. На вокнах байкавыя коўдры, каб аніякага шуму, гуку, голасу вады, дрэва, голасу чалавека. На падлозе, на канапе, паўсюль расчыненыя, як скарбонкі, ляжалі тоўстыя кніжкі. Яна старанна збірала свае думкі, старанна абараняла рэшткі розуму. Казалі, яна

згубіла ў вайну дзяцей. Я хутка сышла, адчуваючы недазвол гаспадыні гэта ўсё бачыць, затрымаць у адчыненых дзвярах варожы ей свет.

Стук малатка выдаваўся падземным, адбойным.

Цяпер яна ішла разняволена (хоць ты скрозь праваліся на месцы, каб хаця не перашкодзіць), пазірала на завешаныя сонныя вокны, спынялася, нешта там разглядаючы. За шыбамі стаялі вазоны з кветкамі і больш быццам нічога. Жанчына глядзела на іх, бы на жывыя істоты — краталіся вусны, лавіла хуткім позіркам нечыя няўлоўныя рухі. Магчыма ў гэтых кветках бачыла сваіх дзяцей, заўважала, як расце каторы, што расквітнела, што падрасло за дзень, за тыдзень, за год. Вунь ужо гарыць у цемры тугая пупышка амарыліса.

Агароджаныя ноччу ад людзей фіранкамі, кветкі належалі толькі ей.

Ад гэтай пары, спраканаўшыся, што Начная Дама ходзіць каля дому, зразумела, што ёй будуць належаць і мае сны.

Раптам цішыня накрыла з галавой, як капшуком. Шчанючка Марта віўкнула на руках, агрызнулася — ззаду даганяў чалавек з ратвейлерам. Я спынілася, каб даць дарогу, мой малы правакатар завурчаў яшчэ мацней. Сабака кінуўся да нас з брэхам, пачаў атакаваць круга.

— Забярыце сабаку! — закрычала я.

Мужчына стаяў нерухома, даючы волю свайму гадаванцу. Насунуты капшук на самыя вочы, глядзеў не мігаючы, зрок прыцэльны. Сабака раз-пораз падымаўся на заднія лапы, даставаў да плячэй.

— Забярыце сабаку... я... цяжарная...

Суха ў роце, перацяты на момант усе сувязі з улоннем, нам абоім не стае дыху. Толькі б дзіця не пачула майго здрадніцкага голасу, майго страху.

Ён забраў сабаку імгненна, пайшоў прэч, сагнуўшыся ўдвая, несучы, як цяжар, маю звестку свету. Ні муж, ні мае родныя яшчэ аб гэтым не ведалі. Страх і абраза: ён? першым?

Я яго пазнала: жыве побач у суседнім доме, заўсёды ходзіць, захінуўшы твар, рукі з кішэняў выпіраюць колам, шалупінне сланечніка на вуснах, на ветры ззаду. І я перад ім ужо быццам трымала на руках сваё дзіця, захінаючыся, прасіла літасці да сябе?!

Так, гэта ён, гэта ягоная галубятня ў скверы. Зрэдку стаяў, закінуўшы голаў, глядзеў уверх. Галубы, падняўшыся высока, амаль знерухомелі, бы знайшоўшы там апірышча, ледзь дасягальнае для зроку, тая вышыня, адкуль ніхто іх не можа спудзіць і нават свіст гаспадара пэўна таксама туды не далятаў. Ледзьве варушыліся празрыстыя трапяткія крылы, як на самым кончыку моцнага полымя-шаламя. Полымя гасла і галубы вярталіся. Іншы раз, падсвечаныя халодным сонечным промнем, птушкі ўверсе нагадвалі кволыя першыя кветкі, ледзьве падфарбаваныя вясновай цнотай. Галубы вярталіся.

І цяжка было адрозніць сярод свойскага вуркатання галубоў чалавечы голас.

Тады як гэтае відовішча спалучалася з маёй начной сустрэчай?

Што гэта: галубіны від спорту — не болей? прытулак здзічэлай душы? ці звычайны гандаль? Навошта яму было зневажаць, страшыць чалавека, якога нават не ведаеш? Хіба ўжо надышлі такія часы, калі кожны стаў самавыяўляцца як найгорш? Мы ўжо жывем сярод аб'яўленага злачынства? Ці можа гэта не па злосці, а проста адольвае хваравітае пачуццё безабароннасці? Выходзіць іншы чалавек на вуліцу са сваім вартавым сабакам без павадка, як з ружжом ці то дзеля абароны ці то дзеля нападу. Цяпер я ўжо прызвычаілася, жывучы на пагорку. Цяпер шукаю згоды не з гаспадаром, а з ягоным пестуном: знаёмлюся, дазнаўшыся мянушку, гукаю да яго каторага, нешта тлумачу, сівеючы ад страху. Чарнабровы нямецкі аўчар Акорд ужо не кідаецца з брэхам пад ногі. Сярэднеазіяцкі аўчар Рэй садзіцца наводдаль, пільнуе нас са шчанюком, як тых авечак. Каменныя лапы, сабраныя ў камок, выцягнутыя перад сабой, галава нерухомая, як у сфінкса, і такі жоўты пустэльны погляд, што ў мяне поўныя вочы жвіру. Мы дамовіліся з ім аб вечным маўчанні.

Умомант для мяне ўвесь свет стаў варожым: я цяжарная... мне могуць перашкодзіць... Ад напружання звінела паветра, быццам дрыжэлі шыбы ў вокнах. Я парадзіха... Я амаль багавіца... да мяне нельга нават дакранацца, не тое што. Страх з мяне выходзіў, як замарозка, слепа рухалася напрасткі, як тая Начная Дама. Мне пільна яшчэ раз убачыць твар свайго Страху, каб вызваліцца канчаткова — спужацца яшчэ раз

і авалодаць мужнасцю. Я ішла да ягонага пад'езду, хістаючыся, ён спусціць, нацкуе на мяне ратвейлера, ён... і ўявіць немагчыма, але я не хачу жыць побач, увесь век баючыся сустрэчы, не хачу пусціць у гэты свет яшчэ адну ахвяру!

Не ведаю ягонай кватэры, званю наўздагад, адчыняюць, не пытаючыся. Мужчына і жанчына на парозе, узбуджаныя, вясёлыя твары са свежымі сінякамі, паміж імі тая лёгкая згода, весялосць (якраз пасля бойкі), калі яшчэ ўдалося спыніцца, не забіцца да смерці. І ніхто з іх не можа папракнуць другога, пераважыць — п'юць разам, у кватэры пуста, як на завуголлі, нежылася прастора, нечалавечая. І яна ў нечым лёгкім, басанож, абое бы нейкія пералётныя птушкі, якія выпадкова тут зазімавалі. О, яны ведаюць галубятніка, а як жа! Ахвоча кідаюцца праводзіць, па-вясковаму, да самых «вароцейкаў», далікатна развітваюцца.

Няма сумневу, што гэта добрыя, даверлівыя людзі, якія зблудзілі ў свеце, зламаліся. Да іх рэдка звяртаюцца па дапамогу.

Стаю пад дзвярыма, раскалупанае гняздо замка. Адазваўся сабака (страх мае моцны пах), насцярожаныя крокі — нехта прынік да вочка, і не адчыняў, і не пытаўся, не выдаючы сябе, толькі чувалася цяжкая мужчынская здыхаўка. І я маўчала. Гэта быў момант, калі сама знаходзілася па той бок чалавечых адносін — я сама, пэўна, палохала, як тады, калі ў кватэру залезлі злодзеі. Месяц не магла зазірнуць у шафу, мярзотнае адчуванне, бы табе залезлі ў вантробы. Доўга пасля, абы надыходзіла ноч, без дай прычыны падхоплівалася, ішла крадучыся да вакна, узіралася ў вочка на дзвярах — пільнавала дом. І аднойчы раптам насупраць, блізка — вока! брыво з рудымі валасамі! я — з рыкам назад! Бяру сякеру, як на звера, буджу сямейнікаў — нікога няма, табе падалося, кажуць. А ў мяне лапаткі сышліся на спіне, я баялася людзей, доўга не было даверу да нікога, маўляў, ёсць гады, я ведаю. Доўга была на варце заўсёды. І калі на дачы выпадала начаваць адной, садзілася ля вакна, сядзела і глядзела ў цемру, мне пільна бачыць, чуць, каб быць гатовай абараніцца. Але на дачы быў накшы страх, з дамешкам незнаёмых гукаў прыроды, пужала ейная моц, навальнічныя зрухі. У горадзе баішся толькі чалавека. Ганебны, зневажальны стан, быццам няма даверу да самога сябе.

І цяпер яшчэ, калі доўга не знаходжу патрэбную рэч, кажу «ўкралі», хаця тады ніякай страты не панесла — злодзеям перашкодзілі суседзі.

За дзвярмі ўжо перагаворваліся, адчыніла жанчына, адхінуўшы назад сабаку, той агрызнуўся... Жанчына... цяжарная... на апошніх днях... гузік з халата на жываце пырснуў, пакаціўся мне пад ногі...

— Я ўсё ведаю, выбачайце. Пасля Афганістану з ім здараецца... Нараджу дзіця і ўсё мінецца... ён любіць дзяцей... выбачайце.

Сказала і вярнулася ў кватэру, да злога сабакі, да пакалечнага мужа.

Я таксама папрасіла мне прабачыць, пайшла дамоў, разважаючы, усё быццам разумеючы. Так, яго раздражняла тваё светаадчуванне: выйсці ноччу са шчанюком на руках, адной... ён, пэўна, помсціў, што ты, баба, не згубіла яшчэ тое, чым ён сам ужо не валодаў. Ён пужаў, ён усталёўваў свой свет жахаў, які набыў на вайне. Ён усё яшчэ «адстрэльваўся»... і трапіў у цябе...

Ён не здагадваўся, што кожная жанчына ад самай калыскі да самай смерці — «цяжарная», яна вякамі стварае вакол сябе зусім інакшы сусвет.

І нават «скіфскія бабы» ва ўкраінскім стэпе, якія можа таму і скамянелі целам, што паміж сабой і жонкай муж паклаў ваяўнічую стралу.

Ішоў снег, вялікі, бухматы, як упрыгожванне, дабультова, маруднай рукой: вось табе на ліхтар, вось табе на сметніцу, вось табе на берэт. Дамы стаялі, бы ў цукровай пудраванцы, не звязаныя сцежкамі, пераходамі, адасобленыя адзін ад аднаго, загорнутыя ў навагоднюю мішуру. Пад старой яблыняй, што засталася ад былога селішча, высвечваўся свежы след ад казінага капыта, поўны ружовага святла. Яшчэ чуваўся ў паветры гук бомаў, што пэўна калыхаліся на ейнай шыі.

Стаіць Калядная пара —
Бы Поўня пасярод двара!

— Дзе ты ходзіш? — падцяўшы вусны, сустрэў на парозе муж, яшчэ адзін малады хатні «ваяр». — Табе, бы лунаціку,

трэба скора будзе нанач мокры хаднічок класці, каб прачыналася...

У пакоі раптам усё напружана зазвінела. Тата (якраз гасцяваў у нас, прыехаўшы з вёскі) мякка адхіліў мужа, павёў на кухню, паставіў гарбату.

— Ці чуеш, да нас у вёску нядаўна дзік прыходзіў раніцай. Хадзіў па дварах, шукаў паляўнічага, хацеў разабрацца, бо парася было забіта ў лесе... А ў мяне ж усе хлявы, як на тое, былі парасчыняныя, няхай ж ба лучыў...

Я заснула за сталом. Я не чула: пэўна, тата шкадаваў, што не згледзеў, не злавіў, зачыніўшы дзверы ў хлеве, таго дзіка, шкадаваў, што не пакаштаваў дзічыны. Ён сядзеў ля маёй «калыскі». Мне снілася жанчына з першага паверху: у чорнай хустцы, вочы галубовыя, празрыстыя, без зрэнак, быццам глядзіш у вакно, на высокім месцы жывучы, проста ў небе. Яна ішла па вуліцы белым днём, мусіць, ёй палепшала. На вакне ўжо цвіў амарыліс, суквецце чатырох буйных бомаў у чатыры бакі свету. Амарыліс — імя прыгожай пастушкі з фантазіяў паэта Тэакрыта.

Амарыліс — адна з дачок Начной Дамы.

А вакол лёталі, вуркочучы, галубы: ці то смяяліся, ці то стагналі...

КУПІЦЬ ДОМ У ІТАЛІІ

На яе можна разлічваць,
Калі мы ні ў чым не ўпэўнены,
Але да ўсяго цікавыя.

Віслава Шымборска,
«Сёе-тое пра душу»

Горы з самалёта выглядалі толькі што крута замешанай рошчынай: творца апошні раз узбіў і рукі атрос — яшчэ відныя сляды пальцаў. «Перад тым як пакінуць самалёт (у выпадку аварыі), трэба зняць абутак на высокіх абцасах і сінтэтычныя панчохі», — трапілася на вочы інструкцыя аб тэхніцы бяспекі.

Як выявілася, і сышоўшы з таго самалёта – не тое што скочыўшы, – табе жадаецца хадзіць па гэтай зямлі басанож, як хадзілі калісьці паломнікі.

А пакуль мы з дачкой проста пакупнікі, мы прыляцелі купляць дом, вядома, не вілу Катэна кардынала Конці, палац з зямлёй у 3000 м^2 (была аб'ява ў часопісе «АД»). Пакуль я проста жанчына-развядзёнка, якая пахавала сваё каханне, і па мне, як па старадаўнім помніку адналюбства, цвітуць лішайнікі, асабліва па руках. Я старая птушка, якая ляціць у цёплую краіну, калі надыходзяць халады.

І, марачы з даўніны пра Італію, хвалююся, бы падчас сустрэчы з блізкім чалавекам, які ведаў мяне яшчэ ў маладосці.

Пакуль знаёмімся з Італіяй на самым інтымным узроўні: у акне кватэры, дзе мы спыніліся, вісіць, сохне сподняя бялізна, прасцірадлы, спушчаныя з вышэйшага паверху, сёння – з сінім брыжком, учора – з ружовым. Вялікі вецер адносіць на хвіліну «ветразі» ўбок, тады ўспамінаеш, што ты не на моры, а на зямлі, бачыш вуліцу, дамы і... таксама прасцірадлы.

– Спадзяюся, гэта не бытавы прэрафаэлізм, які ставіў сваёй мэтай адрадзіць шчырасць, цноту ранняга італьянскага мастацтва яшчэ да эпохі Рафаэля? – дачка мастацтвазнаўца, «ветразі» яе проста абураюць.

Раптам шугануў дождж. Наверсе забегалі, расчыняліся рамы, жанчыны здымалі бялізну, смяяліся. Што гэта было? Смех то знікаў у пакоях, то зноў з'яўляўся на вуліцы, то ўжо ў нас, пад столлю птушанём, – смех, як шчэбет. Жанчыны гулялі з дажджом, спяшаліся яго апярэдзіць. Яны цешыліся самі з сябе, з свайго спрыту.

Ізноў раз-пораз грукаюць дзверы, брэша сабака, летучы на выгул, бяжыць за ім гаспадар, насвіствaючы мелодыю арыі Рыгалета. І так кожную раніцу, калі яшчэ самы сон, у доме на лесвічнай пляцоўцы распачынаюцца вясёлыя ловы. «Дарыян!» – павітаўся ён пры сустрэчы і зноў засвістаў, бы на цвітучай галіне каля свайго гнязда, і зноў арыю Рыгалета. Так мы яго і называлі за вочы.

– Неверагодна! Трэба было спыніцца ў гатэлі! – у гэтым я з дачкой цалкам згодная.

Сёння ўдалося – нічога не вісела перад вачыма – разгледзець немаладую італьянку на балконе насупраць. Яна

звычайна сядала шыць упаўдні, калі сонца гуляла з ейным пярсцёнкам. Засяроджанасць, магчымая хіба ў цішы, калі не адчуваеш нават свайго дыхання, чужога позірку, — і гэта амаль на вуліцы, сярод гулу машын, галасоў?! Сочыць за сваімі пальцамі амаль на мяжы сузірання. Два-тры накіды перак і ўверх, і зноў два-тры накіды хуткім дзявочым жэстам. Шые ці вышывае, пераздымаючы малюнак? А мо дае мне знакі: тут Дом паўсюль, ты, чалавеча, нарэшце Дома. І каб ты ў гэтым пераканаўся, ёй пільна трэба перазняць вось гэтыя даўнейшыя строі.

Мы ўсё жыццё заглядаем італьянцам у твар, наведваючы музеі, але цяпер, калі б толькі жанчына ў балконнай раме падняла на мяне вочы, я зрабіла б выгляд, што не бачу яе, — я не адпавядаю ейнаму творчаму моманту, яшчэ тут не асвойталася. Ну проста catastrofe sociale! я амаль бачыла, як нехта здымаў з майго каменнага пляча хатуль клопату, той, што я і мае суродзічы заўсёды носяць з сабой, адрываў сіллю рукі з пасінелымі пазногцямі ад калымажкі, у якой кожны з нас валачэ гістарычны досвед: арышты, ссылкі, войны. І нічога не варта тое, што цяпер ты вядомая архітэктарка, нядаўняя жонка буйнога прадпрымальніка, бо ты нарадзілася ў зямлянцы і пра цябе было сказана ў маленстве: не сябруй з ёй, яна жабрачка. За мной сціпла цягнецца цугам мой сялянскі род, жывыя і мёртвыя, яны пільнуюць, каб надта далёка не адскочылася, не забылася на іхнія бядоты. На пытанне, што новага, адказваем спехам пра хваробы, няўдачы. Бо калі толькі каму пахвалюся, што маё дзіця здаровенькае, яно адразу захварэе, сказала неяк адна маладая прыяцелька.

Мы самі, дарослыя, не ўпэўненыя ні ў чым, і гэта перадаецца наветам малым безабаронным істотам.

І так спрэс. За ўсё гэта мы не любім адно аднаго, не давяраем: век замінаем самі сабе ў чэргах, у аўтобусах, на пляцоўках дому. Тым больш нам шкодзіць вясёлы брэх сабакі, чужыя прасцірадлы — як ганьба.

Кожны з нас у гэтым цывілізаваным свеце — кволае чалавечае дзіця: лёгка крыўдзімся, жалімся і гняўліва крыўдзім самі.

Балконная рама ўжо апусцела: пэўна, жанчыну паклікалі піць каву. Пэўна так разыходзяцца па сваіх справах ноччу

ў музеях жанчыны Рафаэля, Ларэнцэці — а хоць бы і грэбень у валасах паправіць перад люстэркам.

— Я яшчэ доўга буду цябе чакаць?

Дачка яшчэ не зразумела: тут нельга марна згубіць час, ён тут пражываецца без аскепкаў. А калі што і згубіцца, то нехта абавязкова падыме і... занясе ў музей. Вядома, мы спяшаемся, але наш гаспадар (у яго мы хочам купіць дом) тэрмінова мусіў ад'ехаць.

Час не губляецца. Ёсць сустрэчы, да якіх трэба рыхтавацца ўсё жыццё, чакаючы ў акне сусвету, — яны ўжо быццам адбыліся. Ёсць такія доўгачаканыя лісты — я іх ужо атрымліваю. Ёсць і краіны — Італія. Я ледзве вытрымліваю ейныя дысцыпліны, не кажучы пра дачку. Хоць тут няма патрэбы карыстацца накшай этыкай, чым тая, якую ведаеш з Бібліі.

Званы храмаў — напамінкам. На вуліцах — шчыльная людская плынь. Але пачуваецца надзіва бяспечна: ніхто нікога не зачэпіць, не піхне, быццам чуюць адзін аднаго па ультрагуку, як птушкі. З вуліцы на вуліцу, бы з пакою ў пакой, асядаючы адпачыць, пагаварыць на лавах, на прыступках, проста пад сцяной на зямлі — якраз час сыесты. І дождж скрылля не замочыць, бо дармавыя парасолькі ля кожнай крамы, гатэлю, кавярні. Ніводнага пахмурнага твару: пакутаваць, смуткаваць — разам з Богам; з братам — весяліцца, радавацца, што адпавядае запаветам святога Францішка з Асызы, апекуна гэтых людзей і гэтай зямлі. Збочыш няўцямна на маленькі панадворак, пачуўшы музыку, і ніколі не згадаеш, з якога акна гукі, бы фартэпіяна недзе проста ў кустах. І наогул, адчуванне, што ты трапіў на вясёлы баль, а сам прыехаў... У гарбузе, запрэжаным прусакамі. І ніяк не ўдаецца знайсці пэўны жэст, адпаведна апрануцца, бы пасля манаскага габіту. О Божа!

— Ты ўжо даўно не носіш гэткіх шырокіх спадніц! — спрабуе спыніць мяне дачка ў краме.

Не зважаю, яна не здагадваецца, што я паралельна жыву і ў нерэальным свеце, дзе нашу зусім накшыя ўборы — і неабавязкова набедраныя павязкі і скуры, што ёй лягчэй за ўсё ўявіць.

Стары, малады — мы не ведаем веку сваёй душы.

На вуліцах час ад часу з'яўляецца чалавек у інваліднай калымажцы, пасярод людской плыні, пасярод плыні машын. Заўсёды нечакана на гэтым балі, бо сэрца ўжо пільнуецца

толькі весялосці. Заўсёды з аднолькавым выразам твару, — паляруш? Упаўдні яму цяжка ўтрымаць галаву, яна звяла хіліцца на плячо, бы ад сонца, і чалавек спыняецца там, дзе яго сон заспеў, ледзь паспеўшы крыху ад'ехацца ўбок. Чыста апрануты, дагледжаны; нехта рупліва выпраўляе яго з дому, як з пакою ў пакой, да людзей, аслабаняе сабе рукі са спакойным сэрцам.

Ніхто тут не сумняваецца, што ён мае вартасць у боскіх вачах.

Чую, у кавярні хтосьці называе ягонае імя (Марчэла), і гаспадар спешна выходзіць на вуліцу, абслугоўвае. Скора вярнуўся і раптам заспяваў уголас, мелодыя незнаёмая, але пазнаеш, што гэта працяг той, што гучала ўвесь час унутры і нарэшце вырвалася з уздыхам.

Пакутаваць з Богам, з братам весяліцца.

Падыходзіць чарга і, пачуўшы «маю італьянскую», гаспадыня дае мне рэшту проста ў руку і загінае пальцы, каб не ўпусціла далоў, не згубіла, як малому дзіцяці. Буду потым прыходзіць сюды кожную раніцу, як па боскую ласку. І наогул тут не адчуваеш іншамоўя.

Тут недастаткова ведання мовы, як і недастаткова развагаў розуму, бо мае моц імгненнае ўражанне вока ці несвядомае адчуванне цела, што звычайна найважней пры сустрэчы з блізкім чалавекам.

Тут мне «перакладаюць» з італьянскай жабракі. Яны жывуць побач з статуямі святых, багіняў прыгажосці. На плошчах, на сходах храмаў — побач стварэнні чалавека і Бога. На твары жабрака годнасць асобы, ён не ізгой, гэта быццам тая святая беднасць, якую выбірае чалавек сам, як святы Францішак. Некаторыя маюць сабе сабаку, а то і болей, вунь і сучка са шчанятамі, акуратна захінутая пледам, каб не турбавалі турысты сваім подзівам, — маленькая гаспадарка. Хай сабе цяпло не ад агню, не ад ачагу, але цяпло жывой, даверлівай істоты стварае прытулак там, дзе б ты ні спыніўся на зямлі: дом там, дзе ты не адзінокі.

У католікаў сабака таксама мае душу — Францішак вярнуў да Хрыста не толькі зняверaных людзей, вярнуў і жывую прыроду.

Вунь жабрачка падмывае хвасты каля ручайка маленькага фантану сваім гадаванцам, іх чацвёра, — ранішні мацыён.

Цывілізацыя (турысты) глядзіць на іх сцішана, прагна, бы чакаючы сваёй чаргі недзе ў тропіках каля вадапою.

— Сеньёра! Падыміце голаў, я хачу бачыць ваш твар...

Але хіба я яшчэ не ведаю, не пазнаю Італію з твару?!

Сюды жабракоў Бог пусціў дзеля знаку, напамінку: кожны чалавек мае сэнс — святы Францішак, ходзячы па зямлі, нават на каменне ступаў з страхам і глыбокай пашанай, адчуваючы любоў да таго, хто назваў сябе каменем. Італія — гэта імгненне, тая прасветная гадзіна, калі нарэшце адпусціць цяжкая хвароба: вызваліўшыся ад болю, крыўды, бядотаў, звяртаешся да дрэва, да птушкі, да мора, маючыся вымавіць з палёгкай галоўныя словы, словы любові.

— А вось у Англіі...

— А ў Англіі, каб ты тое ведала, забаранілі галубоў на плошчы і звольнілі чалавека, які іх карміў! А Карэя скінула ракету каля Японіі і патлумачыла сваю нявіннасць тым, што ў гэтым месцы нейтральныя воды. Хіба ёсць нікім не заселеная вада? Як і лес ці поле?

О, менавіта тут будзе мой дом! Нарэшце ён спэўніцца! Зморана спыняюся, засынаю на хаду, як смоўж, быццам усё яно са мной.

Заходжуся ў храм, дачка застаецца на вуліцы. Цёмна, рознакаляровыя шкельцы вітражоў высокіх вокан ледзьве прапускаюць святло, гараць ахвярныя свечкі. Здагадваюся, што храм сёння адпачывае, але ж дзверы не на замку. Анікога, толькі пад паднябеннем галасамі птушак перагаворваліся анёлы. Кленчу, жагнаюся, рука цяжкая, бы ёю хто водзіць. «Ойчэ наш, ктуры ест...», — адчуваю, што вымаўляю знаёмыя словы зусім інакш, не па памяці, калі амаль губляеш сэнс слоў ад звыкласці, бегласці вымаўлення, гаворыш звычайна, хапатліва, ні да кога не звяртаючыся — не бачачы Бога перад сабой. Цяпер я быццам паўтарала словы за тым, хто стаяў побач, і, не ведаючы, што казаць далей, чакала голасу, каб тураваць.

Адчула, нарэшце, што тэкст, завучаны ў дзяцінстве, ёсць МАЛІТВАЙ.

Адыходзячы, заўважаю постаць у манаскім габіце. Але ж не было чуваць крокаў?! Выйшаўшы, чытаю: гэта касцёл святога Францішка.

Наведваемся сюды ў часе службы. Стары ксёндз сустракае сваіх парафіянаў у дзвярах. Вось вядзе дзяўчыну, праз увесь храм да лавы, выпусціў ейную руку наастатку, бы выпусціў птушку, ледзь прыўзняўшы ўверх, дзе болей паветра, прасторы, каб развінуліся крылы.

— Нам абавязкова трэба трапіць у Ватыкан!

— Ватыкан яшчэ пакуль не мая парафія... Я яшчэ толькі пацеры навучылася мовіць...

Я блазную? У Ватыкан трэба ісці не праз гандлёвыя шэрагі — у нас жа наўме купіць дом. Я яшчэ не намацала нагой таго намоленага шляху да Ватыкану, ён павінен пачынацца ад самага твайго парогу, адкуль ідзеш.

У кавярні, куды зайшліся выпіць эспрэса па-італьянску, дзяўчынка гаспадыні падносіць нам папяровую сурвэтку. На ёй флямастэрам нашыя партрэты — дзве скіфскія каменныя бабы! Мы смяемся разам, нарэшце разняволена, моцна, з нас цешыцца старая італійка насупраць, бы нарэшце ўдалося-такі зняць з гэтых нетутэйшых пахмурных істотаў нейкай невядомай моцы праклён. Яна нешта да нас гаворыць, чую шапаценне капяжу, няўлоўны дотык да маіх перасохлых вуснаў — мова вакол шумела вадаспадам.

Увечары плынь людская значна гусцее. Каля ўваходу ў кавярні, рэстарацыі запальваюцца свечкі, Марчэла далучаецца да ўсіх і едзе па вуліцы, быццам таксама шпацыруючы, крыху падняўшы голаў. Плынь запавольваецца. Людзі рухаюцца, як у вадавароце, пераходзяць адзін да аднаго, пакуль не знойдзецца супольная бяседа — па два, па тры, — ужо толькі спыніцца і размаўляць. Нехта раз-пораз віхне каля цябе на ровары, насвіствае начной птушкай — не зачэпіць.

Засынаючы, чуеш, як грукаюць дзверы, — пэўна, вярнуўся дамоў Рыгалета, і надзіва робіцца ўтульней у ложку і спакайней, як было ў дзяцінстве, калі старэйшыя ў сям'і клаліся спаць апошнімі, пільнуючыся, пакуль ты абаснеш.

Ёсць нейкая асаблівая інтымнасць нават тады, калі зазіраеш, расхінаючы лісце прымулы на падваконні, знаходзіш сонныя пупышкі кветак, скручаныя маленькімі зародкамі ва ўлонні. Калі няўцямна бярэшся паліваць гіяцынт, кветку дажджу, менавіта тады, калі за акном ідзе дождж.

Калі сядзеш у аўтобус разам з незнаёмымі людзьмі, што едуць у Вальтэру. Нарэшце паглядзець дом, ён паблізу Вальтэры.

Дарога ўвесь час пад гару, крутыя адхоны, ты ў паветры, толькі што не на самалёце, незнаёмае дагэтуль пачуццё ўзнёсласці, пэўна, як у часе клінічнай смерці. Тая пара вясны, калі ў садох падразаюць аліўкавыя дрэвы. Насустрач зусім блізка ляціць з мутой ручай, варочае камяні, бы шукаючы, як мы ў дзяцінстве, вягалаў. Але анівошта не можа мяне вярнуць назад, да былых зямных змыслаў.

Нарэшце спыніцца, нарэшце намацаць пад нагой токі гэтай зямлі, якія шукаюць выйсця ў шумлівых гаворках тутэйшых людзей, вырываюцца выбухамі смеху, гучаць мелодыяй!

Вунь той дом, на пагорку, паказвае гаспадар. Быццам блізка воку, але нас адносіць хваляй пагоркаў то ўбок, то ўніз. Дарога размыта дажджамі, няма следу, сюды можна дайсці толькі сэрцам. Дом з высокім каменным ганкам, зялёныя аканіцы, — Дом, да якога ішла ўсё сваё жыццё. Рухалася, як на інваліднай калымажцы, а мне, смеючыся, кідалі ў прыпол каменне — я з яго спрабавала скласці падмурак. Паказвалі пальцамі ў другі бок, калі губляла дарогу, блудзіла. Падвязвалі пустую кансерваваную бляшанку ззаду да кола, як паблажлівай істоце. «Праз якіх пару гадоў я буду стары дзед, дай мне пабыць яшчэ шчаслівым», — сказаў муж і пайшоў да маладой.

Дом у два паверхі, быццам чужыя сцены, ты іх не ўзводзіў, але яго яшчэ не пакінуў Бог. Выслізганыя парэнчы, старая мэбля, дзе-нідзе шчарбатая цэгла, толькі гэта ўжо як дэкор, сведка стагоддзяў — антык, яго не хаваюць пад слоем сучасных фарбаў, — як той казаў, чароўнасць расколіны.

Нарэшце збылася туга па старым доме! Цяпер толькі так: вечар, лямпа на доўгім дубовым стале і — гаварыць, гаварыць бясконца аб тым, што начны лівень змыў зямлю з карэння яшчэ сонных ружаў, што ў адным месцы цячэ страха. Замаркоціцца крыху і падумаць: а ці не напісаць ліст у Менск? Падняць медзяную жэзву, выпушчаную з рук былой гаспадыні, набраць вады, паставіць на агонь. Дома я ўсё гэта рабіла спешна, без густу, пужалася, што мала часу маю на тое, шкадуючы яго

на дробязі. Цяпер я вылечылася ад пуду, чым бы ні займалася: я гатую каву, я «выхоўваю сад», і не на французскі манер, – тут ён звычайна нязмушана пераходзіць да самой прыроды. Я распальваю камін – робіш работу, быццам чытаеш вершы. Кожны мой рух адбіваецца ў вечнасці, бы ў люстэрках. Нічога тут не губляецца – ты цяпер звычайная служыцелька свайго Храму Быцця, Дрэва, Каменя.

Засталося толькі выставіць на тэрасу крэслы, сесці на ровар (кошык замацаваць спераду ці ззаду?) і – па рыбу ў Вальтэру! Ці да мора, туды, дзе яно не ўпіраецца лобам у каменны парапет, як зачынены буйны звер, – да мора хочацца падысці блізка, ступіць у ягоны вільготны след у часе адліву.

На электрычцы – у Венецыю! З самага ранку, каб паспець дамоў завідна, як, бывала, з поля ці з лесу. Заглядаць у твары карыятыдаў, багіняў прыгажосці, – хто яны? у чым? што трэба? як? каб табой любаваліся? Падняць руку, закінуць за голаў, каб грудзі выглядалі гронкамі?! я не ведаю такіх таямніцаў, да мяне не дайшлі запаветы Творцы: сачыць, пераймаць прыгажосць лілеяў і птушак нябесных, чым кіруецца з дзяцінства кожная італьянка... Вярнуцца ў дом, поўня запаліць свой ліхтар, усю ноч пераносіць яго з пакою ў пакой. Агні няблізкіх селішчаў у гарах, на пагорках – ноччу яны ўсе ў небе, толькі што бліжэйшыя за зоры. Крыжавінне аконнай рамы ляжа каля босых ног. «Я выйму з вас сэрца каменнае і дам вам сэрца плоцкае...» – чую святога Францішка ў час пацераў. І не спаць пасля ютрані, каб паспець «прыпасці да кожнай меданоснай хвіліны быцця». Выйсці ў поле, ахвярна разаслаць на траве настольнік, пакласці дабультовую ежу, запрасіць птушак да столу і... пайсці дамоў, пакінуўшы «гасцей», каб не перашкаджаць – ахвяра хвалы.

– Мы купляем дом у правінцыі...

– У Італіі няма правінцыі! І наогул: Гётэ ані разу не быў у вялікім горадзе, каб не парушыць свайго светаадчування, свайго светапогляду.

– Я расчараваная...

– А я гатова тут вучыцца нават расчараванню.

– Ты амаль са мной не размаўляеш...

Не хочацца гаварыць, нешта абмяркоўваць, пражываеш гэтыя некалькі дзён, бы ўвесь час сцішана мовіш пацеры.

Дык што: калі табе без меры падабаецца вобраз жыцця, вобраз мыслення, прырода – можа, гэта ўжо і ёсць твая радзіма?!

Мы дамовіліся з гаспадаром, толькі што не разлічыліся. Вярталіся ў горад, дзе былі спыніліся, апошнім аўтобусам. Апошнім? – гэтае слова раптам вылучылася з астатніх, набыло развітальны сэнс, быццам ад'язджаеш назаўсёды. Адразу пазначыўся край твайго жыцця, далей ты ўжо будзеш жыць, быццам атрымаўшы страшнае заключэнне доктара – дні твае палічаныя. Апошні?! Але на прыпынку людзі, яны... сядаюць у аўтобус? Яны вяртаюцца ў Вальтэру? Неверагодна! – чорная, коўзкая дарога, стромкія адхоны і ноч! Доўга стаю, углядаюся ў твары, праводжу і... быццам вяртаюся разам з імі. Яшчэ ёсць надзея.

Ёсць асабістая повязь паміж тымі людзьмі, з якімі разам едзеш ДАМОЎ.

Святы Францішак будзе суправаджаць маю душу ўсё астатняе жыццё – і ўвесь час горнай дарогай...

Прыехаўшы ў Менск, я баялася свайго твару, жэсту: мяне могуць не зразумець на вуліцы. І не тое каб я «прыдбала мясцовыя характэрныя рысы», стала італьянкай, але гэтая гатоўнасць усміхнуцца, загаварыць, прывітацца, быццам мы ўсе запрошаныя ў госці і сустрэліся ў доме Гаспадара.

Часта стала сустракаць аднаго жабрака. За плячыма перацятыя вяроўкай папяровыя скруткі, кардонныя скрынкі, сабраныя на сметніках. Усё гэта тырчыць, кратаецца на ветры, бы скрылле, – лятучы жабрак?! І крочыць ён заўсёды павольна, навобмацкі. Сустракаю на адным і тым жа месцы, у адзін і той жа час, бы адлюстраванне з іншых зямель. Адважваюся даць яму крыху грошай. Ён спыніўся, ветраючы скрыллем, узрадаваўся. Стаім, смяёмся над гэтымі грашыма, абое разумеючы ў жыцці большае за іх і радыя ім як прычыне спаткацца – загаварыць, усміхнуцца, прывітацца...

Дасылаю тэлеграму ў Італію з адмоваю ад куплі. Уваходжу нарэшце ў свой ЧУЖЫ дом і спрабую жыць інакш, чым было дагэтуль. Адшукаць на дзедавым гарышчы куфры даўнейшыя, ручнікі, лубкі, латкі, церніцы. Тое, што зблоцілася праз маю нядбайнасць, узнавіць, перазняць, як у акне седзячы з іголкай. Падняць старое кола ад тарантаса і па ім згадваць поры году вечнасці.

Я не адракаюся ад самай маленькай чалавечай ролі, бо нам даецца плоцкае сэрца замест каменнага не толькі дзеля нас саміх.

Калі ж зрэдку выпадае ад'ехацца за мяжу і адчуць, што там таксама нешта ўразіла, прытрымліваю сэрца, не пускаю далей парогу, бо інакш, выдаецца, ужо буду любіць Італію не ўсёй душой.

Ляпаюць раз-пораз дзверы. На дзевятым паверсе, нада мной, новыя жыхары, новыя гукі — пэўна, нехта гуляе ў тэнісны мячык?! Гэта немагчыма! — ну проста псіхічнае атачэнне! Трэба пайсці пасварыцца! Пастукаць па батарэі! Але...

Але надзіва ўдаецца ўявіць, што гэта на маёй страсе проста гуляе дуронае кацяня...

ПАРТРЭТ НЕВЯДОМАЙ

Наталцы Бабінай

Шукаю таго,
кім быў
да пачатку часоў.
Ейтс

Зараз, як на тое, мне часцей стала трапляцца на вочы суседка. Выводзіць пагуляць сабаку. Ідзе, рукі ў рукавы, дзіцячымі крокамі, твар нерухомы, ідзе да копанкі ў скверы. Робіць круг каля мёртвай вады і вяртаецца. Рукі як сашчэпленыя жывасіллем, толькі што не за спінай, быццам зняволена ў гэты дом, зняволена ў адзіноту. І толькі аднойчы на відніцы, выпадкова зірнуўшы ў акно... яшчэ нідзе анікога, туман белым развіхнутым прасцірадлам і жанчына. Да яе шалёнымі скокамі ад радасці бег бадзялы белы сабака (ён тут даўно), крычаў чалавечым голасам нямка: а-ы, а-а-ы! Ён прабіваўся праз тоўшчу ейнага смутку. Два целы ў тумановай плыні пластаваліся адзін каля аднаго, гулячы. Яна карміла яго, лашчыла, прыгожа ўскідвала рукі, завязваючы ў вузел валасы, і ішла разам да мёртвай вады.

Да мёртвай вады, якая стаяла ў маім пакоі ў вялікім люстэрку.

Завесіць чорным, як у час пахавання, справіць, пабыўшы, гадавіну, успомніць адышоўшага ў іншы свет. А потым на адным разе перавярнуць настольнік на найніцу і зайграць на гармоніку, маўляў, жыццё прадаўжаецца.

Але ў маім доме не хаўтуры, а здрада. Сышлі сябры, голасна перагаворваючыся, гледзячы ў твар, смеючыся, як сыходзяць розныя жывыя істоты са зжытага мейсца, з голай зямлі. Яшчэ быццам чуваліся іхнія галасы ў пакоях, яшчэ бачу позіркі іхныя праз плячо, крокі... Нехта затрымаўся, не, вярнуўся за парасонам. Стукнуў вецер у вакно, зашапацела дрэва — зманлівыя гукі спагады. Яшчэ тэлефануюць, нешта дакляруючы, гуляюць словамі, як бывае ў гаворцы выпадковых сувязей.

Яшчэ быццам і кава не астыгла на стале. «Людзей добрых няма, людзі па масці скрозь благія! Гэта за савецкім часам нас усё запэўнівалі, што людзі харошыя, а як аказалася... Я і дзіцяці свайму так тлумачу, каб не спадзявалася ні на кога...» — раз-пораз успамінаецца сустрэча з суседкай па пляцоўцы. Бы каменем праз плот, калі ты ідзеш па вуліцы, расхрыстаны даверам. Каменем і па малой, пасля чаго і на вочы ейнай дачцы трапіць вусцішна, бы і ты сама на ейную дарогу зверам з цёмнага лесу выйшаўшы.

У доме кожная рэч шукае сабе субяседніка. А на вуліцы, дзе чужыя твары, вокны, здзіцянелае пачуццё, што нехта вялікі, дужы выпусціў тваю руку ў цесным натоўпе і знік. Не закрычаць, не паклікаць, бы ў трывожным сне, не перавярнуцца на другі бок, каб не сніліся жахі, — не перайначыцца на другое жыццё. Нехта мала знаёмы, як з натоўпу ўсё роўна, раіў: паплач! Слёз не было, вочы мялелі, высмагалі, балюча было глядзець на сонца. Схадзі ў тэатр! у тэатр?! Мяне спачатку трэба адцягнуць ад прорвы, выратуе хіба толькі нечы чысты зрух, без рэпетыцыі і спроб. Але...

У горадзе дождж, першы, вясновы. Дождж ціхі, шэптам, шэпт скрозь, каля ног, да самай зямлі, блізенька, уніклiва, незаўважны для чалавека — ні на твары, ні на адзенні — толькі быццам дазволена табе выпадкова пачуць шчырую гаворку паміж небам і зямлёй. А можа, да тых, хто пакінуў свет? Здалёк заўважаю незнаёмую жанчыну. Рухалася як па ветры,

сарваная з месца. Яе лёгка было заўважыць у натоўпе, мне цяпер знаёма гэтая лёгкасць у нагах, калі зямля цябе не трымае, бо зямля для радасці. Збочваю, іду насустрач, быццам і тая таксама ішла да мяне. Мне мусова бачыць ейны твар, твар згубленага чалавека, амаль самагубцы. Пакінуць свет?! Але каму? На каго? Ужо і дзяўчо суседчына жыве недавяркам, папярэджанае маткай: людзей добрых няма. Адняла надзею на лепшае, бы сіллю адарвала ад грудзей маё кволае немаўля. І хто я цяпер сама, не захінёная, не абароненая сяброўствам, любоўю. Маё імя?!

Пакінуць свет... Па мне, каталічцы, паставяць крыж ці камень з надпісам. Сумны мурог з суседняга кладоўя спаўзе на вочы. Каго папярэдзіць, што мне б дарала зусім інакшае. На этрускіх помніках з абпаленай гліны ў Вальтэры жанчына часцей трымае ў руках веер. «Смерць і бесклапотнасць, легкадумства, выкшталцонасць — смерць і гэты подых ветру, калі раптам асвяжае ўжо спячыя, нетутэйшыя твары» (Філіп Жакотэ). Перайсці ў другі свет нязмушана, без адчаю, іншы раз наведвацца па кладцы, зробленай на прыкладзіны, каб яшчэ і яшчэ пакаштаваць цудоўнага віна, пакінутага на Дзяды на стале сябрамі.

У доме анікога, акрамя сабакі, як у той жанчыны, што ходзіць удвух на выгул да мёртвай вады. Толькі іншы раз выпадкова натыкаюся на позірк — італьянец Ларэнца Коста, «Жаночы партрэт», пятнаццатае стагоддзе, сярэднявечча. Я часта адчувала прысутнасць у пакоі багатай дамы без імя, з палымянымі валасамі, тэракотавая сукня. Густа напудраваны твар, шыя, плечы. Толькі жывыя, рухомыя вочы, якія пэўна свяціліся і ў цемры. Рудзізна прабівалася праз пудру свячэннем свечкі. Фонам густы морак каменных скляпенняў, холад улоння і на ейным твары, прыгажосць быццам не развіхалася без сонечнага святла — цяжка было пазначыць ейны век.

Яна доўга звыкалася са мной. Варта было падысці, пачаць разглядаць, жанчына пужалася, пацеркі на шыі зрушваліся, беглі адна за адной, яна часта дыхала ад хвалявання. Скулы цямнелі, калі я доўга затрымлівалася ў ейным пакоі. Палохалася, калі я дакраналася да другога чалавека, калі мяне хто запэўніваў у дружбе ці любові, калі хто цалаваў рукі, развітваючыся. І толькі калі лашчыла сабаку, быццам супакойвалася.

Яна не мела даверу да людзей. Хацела мяне папярэдзіць?! Мы не супадалі, але я не схавала партрэт ад вачэй па невядомай мне сувязі з ім ці проста ўлічваючы мастацкую вартасць італьянскага майстра.

А цяпер нас было двое, недавяркамі, мы амаль не сустракаліся поглядамі, як два злачынцы. Два жаночыя партрэты, без імён, і без веераў, вядома. Мёртвая цішыня, і подых ветру не даходзіў, не асвяжаў нашыя нетутэйшыя твары.

Не памятаецца, каб пазванілі, каб я адчыняла дзверы, а на парозе стаяла маладая жанчына, з ёй мы выпадкова сустракаліся на выставах, амаль незнаёмая. Стаіць і азіраецца, як на прыпынку, быццам упэўніцца ёй трэба, ці туды трапіла. Здарожыўшыся, бы ішла пехатой, аслабаніла рукі ад вандзэлкаў. Толькі што ў берэце, а так дарала б зараз ёй хустку тугую развязаць на галаве, спусціць рагі, каб трохі ачухнуць, аж пара, выдаецца, ідзе і ветрыкам вясновым заносіць, як ад першай пралескі ў лесе.

Нахілілася, выкладае нешта з сумкі проста мне ў рукі. Ні хвіліны не бавячыся, адразу ў парозе, быццам толькі з гэтым і прыйшла і найпільнейшым: саланіну, какоркі крамныя, але рыхтык такія, што рабіла калісьці ў вёсцы суседка Гірына. Тлустыя, пахнючыя, уетыя, тыя, што на свята, рукамі качаныя, на вока пасыпаныя буйным цукрам, дзе болей, дзе меней. Тыя, што даваліся ў рукі, таксама ў парозе, калі ў хату атумысла прычыную ганяючы, зайдзішся, пачуўшы пах з коміна. Сморгнеш, атрымаўшы, за дзверы коткай, бы сцягнуўшы са стала. «Пачакай! На яшчэ малака!» — чую наўздагон. Мяне не затрымаць, — я ляту ў свет, несучы навуку нашай вёскі: лёгка папрасіць! лёгка ўзяць! лёгка аддаць!

Стаю, як тады, ля парога, прымаю ў рукі арэхі, яшчэ нешта, і яшчэ, поўны ахапак, прымаю надзіва моўчкі, скупа, прагна, — нічога ўзамен, хай сабе і на словах, каб нічога не збавіць сваімі падзякамі, не застацца ў даўгу.

Быццам яно і не табе, а на ахвярнік.

Вуліцы за вокнамі неспадзявана занесены ў красавіку пэўна апошнім сялетнім снегам. Толькі во адзіныя крокі на дарозе — сляды маёй госці. Праз увесь горад, ад ейнага дому да майго.

Прыходзіць неўзабаве і другі раз, распранаецца і складае адзежу ў парозе, як мокрую барму пасля дажджу, каля ног,

на падлогу. Прыносіць вязанку сухіх белых грыбоў, сабраных ейнай бабуляй у вёсцы, і слоік поліўкі з бобам, маўляў, Вялікі пост, якраз перад Вялікаднем, абавязкова трэба пакаштаваць. Свечкі ў поліўцы не стаялі, запраўленая толькі грыбамі, падманны пах посніцы, нішчымніцы. Трэба хоць лыжку памачыць у гэтае варыва, дапільнаваўшыся чаргі каля міскі сярод старэйшых, і ты ўжо выратаваны, табе даруюцца дзіцячыя грахі.

Скора і пайшла. У пакоях застаўся грыбны пах вясковай хаты, дух блізкай зямлі, дух блізкага старога чалавека, каля якога ты сядзіш, расцеш на адной грыбніцы. Асабліва ў кутку, на кухні, як пад ялінай усё роўна. Госця акурвала мяне даўнейшымі пахамі, як дымам травы-пералёту ад пужання, давала мне знакі, якімі было пазначана маё племя, племя вясёлых, дужых, шчырых людзей. Сустрэўшы свежага чалавека, успадабаўшы яго, мне заўсёды карціць запытацца: а ці спяваеш ты?

Я шукаю голас пеўчага чалавека, бы падбіраю ў касцельны хор, — у нас у вёсцы спявалі ўсе.

Звесткі адтуль, з нашай вёскі, быццам ішлі з дня ў дзень, з кожным прыходам госці. Мяне разварочвала тварам проці здрадаў, згубаў, як проці ветру. Вярталася памяць. Сніліся сны: то жыта ля дарогі, па якой хадзіла ў школу, то трава высокая, то чорная ралля, сырая, бы гэта ў маім доме паслана мне, не паслана нанач. І нават вясновы ручай з белай глінкай на дне, ён знікаў улетку, але яшчэ бег, цёк праз маю памяць.

І імя ягонае сярод імён маіх памерлых ужо аднавяскоўцаў.

Бачыцца ў снах усё ясна, да драбніцы, пэўна, каб хто ў тую каторую ноч запазніўся ў нашым полі, убачыў бы мяне, мой прывід. Днём таксама ўвачавідкі наматваю шоўк ручая на цэўку, тужэй і тужэй, і апынаюся ўмомант там, дзе ён пачынаўся. То раптам паўтараю бабулін жэст, маміну грымасу, бы адчуваю іхны дотык да сябе.

Гэта ўжо дзённыя сны.

А ці спяваеш ты? — пытаюся ў госці другім разам. Не, адказвае. Яна амаль і не размаўляе. Сядзіць насупраць, заўсёды адна і тая ж поза, вочы прыспушчаныя, маўчыць, бы прыходзіць да мяне на сеанс натуршчыцай. Аніякай касметыкі, толькі вось нетутэйшы міндалепадобны разрэз павек, як змаляваны з некага. Сустрэўшы такую жанчыну, і на вуліцы

нязмушана затрымаеш за плячо, каб падзівіцца, як спыняе нас іншы раз вышэйшая сіла, даруючы ясны зрок — здольнасць убачыць цуд. Павярнуць да сябе за плячо або самому зайсці з аднаго боку, з другога, каб не адсвечвала, як у музеі. Апранута ў нешта выпадковае, зусім не да твару, быццам і не сваё.

Пойдзем, кажа, да касцёла на ўсяночную, булкі пасвенцім. Я маўчу... Бо ў нас было во як: вёска чакала дзевак з усяночнай, каб пранашчыцца свянцонай соллю. Раз-пораз выходзілі з хаты, паглядалі ў той канец, адкуль вяртаюцца з храма. Нарэшце паказаліся, ідуць, лепей будзе сказаць, узыходзяць з-за пагорка, з дзесятак кіламетраў пехатой, хто і босы, ідуць не спяшаючыся, натоўпам, пагорак падымае іх на плечы вышэй і вышэй. Сціхае смех, гаворка. Развіхнушы натоўп у радок, ідуць ужо моўчкі, каб урачыста данесці тую радасную навіну ўваскрашэння.

Сама я састарэла ў гэтым горадзе ў вечных звадах — і ў дзеўкі не ўбралася, і ў бабы. І буду да скону выходзіць і глядзець, адкуль вяртаюцца з храма мае аднавяскоўцы.

У каго паміж Богам і чалавекам поп ці ксёндз, у мяне — мая вёска.

Тэлефануе, вымаўляе маё імя з акцэнтам, бы перакладае з іншай мовы: «р» з хуткім пераскокам, як праз раптоўную перашкоду на дарозе. Прыходзіць на Вялікдзень з свянцонай соллю, прыходзіць з дня ў дзень, ідзе, падымаецца з-за пагорка маіх згубаў, майго недаверу. Адкуль, праз каго ёй наказалі і хто ён, каб так дакладна ведаць, што я ў небяспецы? І чым, як мяне ратаваць? Мы амаль незнаёмыя. І яна намнога маладзейшая за ўвесь гэты брыдкі свет?! «Ты быццам паслана нейкім...» — вымаўляю назгад. «Мы ўсе адзін аднаму пасланыя...» — адказвае прарочыцай.

Сядзіць насупраць, вочы вузка да скроней абведзеныя сном няведання. Так цнатліва, не мігаючы, глядзяць на мяне здалёк мае вясковыя бабы. Так глядзяць з абразоў мадонны італьянца Пётры Ларэнцэці, у якога позірк святых, анёлаў і позірк чалавека мае аднолькавы сэнс. І нават маленькі Хрыстос на адным з ягоных абразоў адхінае покрыў на галаве маці, каб пацешыцца з ейнай прыгажосці.

А ты тут жывеш, выраблячыся, губіш сваю прыроду на іхніх вачах, — забываешся на іхнюю ахоўную пасаду.

Яшчэ пільней разглядаю сваю госцю, спяшаюся, бы яна сапраўды прыйшла да мяне на сеанс і, можа, на апошні. Пярсцёнак на ейнай руцэ... іянічны стыль... дзе я яго ўжо бачыла? Быццам ён увесь час навідавоку... на туалетным століку ці на паліцы ў ваннай, з маёй рукі?!

Я застаюся жыць. Мне вяртаецца імя. Жыць спачатку. Хаджу па дому, быццам атрымала спадчыну, разглядаюся, адчуваю нанова свой лад, па каслаўках усё бяру ў рукі, перакладаю, сумна цешуся. Шчыльнае цёплае гняздо, складзенае з веры ў маіх сяброў, умацаванае на доўгае жыццё, упрыгожанае найлепшымі спадзяваннямі, якія яны калісьці абуджалі. Цяпер яно да скону будзе перавіта маім даверам, няўцямным, але гэтага дастаткова.

Раптам заўважаю... пярсцёнак маёй госці... на руцэ дамы ў тэракотавай сукні?!

Мы ўсе адзін аднаму пасланыя некім. Нават калі гэта проста «Жаночы партрэт» у раме. І без імя.

ТЭРАРЫСТКА

Быць беларусам — проста работа.
Сяргей Дубавец

Выдавалася, што ляціш не ў самалёце Рым — Мінск. А сама па сабе, зграяй, — усё, што было лятучага ў лясах, на дрэвах, на дратах у горадзе, паднялося ў паветра. Дзвесце? трыста? інтэрнацкіх дзяцей вярталіся з адпачынку ў Італіі. Галасы калыхаліся ў цеснай прасторы, нешта зычнае, дзікаватае чулася ў іх, у адрозненне ад галасоў хатніх дзяцей. Рознагалосай хваляй мяне раптам адкінула, прыбіла да колішняга голага стала ў дзіцячым прытулку, якраз тая гаманкая хвіліна перад тым, як будуць дзяліць ежу. Я бачу свой лёс увочы і... стойваюся, каб ніхто не здагадаўся, што я таксама дзетдомаўка. Бо дзяўчаты адразу ж залезуць да мяне ў сумку. Перапэцкаюцца шмінкай, будуць прымяраць мой шалік, пантофлі, як гэта мы

рабілі, калі да нас прыязджаў хто з выпускнікоў. Будуць абнюхваць адзенне, водар дарослага жыцця.

Іншы раз прызнанне служыла паролем. Як тады... гуляючы з сабакам, раскідаю хлеб птушкам у скверы на старых кладах ля царквы Магдалены і адыходжуся. Азірнулася... Хлеб збіралі двое мужчын! Амаль у шоку вяртаюся. «Мы выйшлі з турмы... мы дзетдомаўскія», — кажуць. Дастаю грошы, доўга маруджуся, не магу патрапіць адчыніць кашалёк і раптам бачу напружаны чаплісты позірк: чалавек рыхтуецца драпежнікам выхапіць здабычу. На маім горле ўдушлівая рука нашага з ім супольнага лёсу, мы ўжо амаль бораемся, як толькі не качаемся па зямлі. «Я таксама дзетдомаўка...» — ледзьве прамаўляю, бы выходжу з бойкі, пільнуючы ягоны позірк. Чалавечыя змыслы прабіваюцца праз тоўшчу ягоных бядотаў. Мужчыны дзякуюць і адыходзяцца. Я нясу дамоў сваю цэлую галаву і пачуццё паразумення, якое рэдка паспытаеш з сытым чалавекам.

У салоне пацішэла. Раскрываюцца тэчкі, заплечнікі (дзеці адпачывалі ў сем'ях), дастаюцца, пераглядаюцца падарункі, жуйкі, цукеркі. Якраз перада мной дзяўчынка пад аксамітным берэтам, нязграбная, пульхная, фалангі слаба абазначаны, як у жабяняці, берэт дарослы, і парасолька ў руках з загнутым канцом таксама не дзіцячая. З тых дзяцей, якіх можна апрануць у што заўгодна. Яе заўсёды прыбіралі чужыя рукі, сама нічога не выбірала, не прасіла, для яе адзежа — гэта покрыва, як для святой. Спрабуе расчыніць парасон і, калі ўжо ўдасца, падымецца пад столь салона і хутка вернецца, бо тут ейныя першыя асабістыя рэчы. Берэт спаўзае на вочы, не даючы ходу, дзяўчо паслухмяна асядае глыбей у крэсла, запіхваючы ў рот жуйку. Павярнулася назад, да мяне тварам, нахілілася блізка, вочы стаячыя, як вада, — што ўкінеш, тое і будзе боўтацца, слінкі ад жуйкі зараз сцякуць у мой падол. Побач дзіця тузаюць ваніты. Нахіляецца выхавацелька, я пазнаю тую, што яшчэ ў аэрапорце казала: мы вязём дзяцей з абмежаванымі разумовымі здольнасцямі.

Я якраз пасярэдзіне гэтай групы.

Раптам з розных куткоў салона падымаюцца старэйшыя дзяўчаты, ідуць па праходзе, ідуць павольна, хістаючыся, сыходзяцца, абхапіўшы адна адну, складаюць галовы вянком — плачуць уголас. Што? Чаму? Іх, розных — можа, раней і не

сябравалі, — сашчапіла крэпкай моцай страшная бяда — адчужанасць.

Яны не хочуць вяртацца дамоў.

Выхавацелькі сядзелі асобна, размаўлялі, усміхаліся стомлена, жавалі жуйкі: а што, усе дзеці цэлыя, ніхто не згубіўся. Яны быццам і не здагадваліся, што чыніцца здрада, што шмат хто «застаўся» ў чужой краіне назаўсёды. Побач з выхавацелькамі іх дзеці, яны ўвесь час на матчыным воку, яны захінёныя ад спакусы. Але раз-пораз чулася і адтуль, і амаль з дакорам: «А мне купілі фотаапарат, вот! А мне новыя джынсы, вот! А мне...»

Мы ляцім, дзяўчаты разыходзіліся — папіць салодкай вады, пасядзець каля разапхнёнага ад падарункаў заплечніка. Ізноў сыходзіліся, ізноў плакалі, счапіўшыся, тварам уніз. Толькі што не звязвалі косаў, быццам збіраліся скочыць з самалёта самагубкамі і не разлучацца і пасля смерці.

Наш вырай не хацеў вяртацца. Знізу, з зямлі, самалёт пэўна нагадваў параненую птушку з мігатлівымі белымі крыламі.

Дзяўчо пад берэтам зноў нахіляецца да мяне яшчэ бліжэй, зараз дакранецца пальцамі да твару, каб апазнаць, але каго?! Левае паўшар'е ў маёй галаве таксама ўжо захінёнае зацьменнем. Спрабую занатаваць па звычцы ўбачанае, перачытваю і заўважаю, што запісваю без знакаў прыпынку. Зніклі нават коскі?! Дастаю жуйку, упіраюся нагамі ў пярэдняе крэсла, рэзка адкідваюся назад — разварочваю самалёт. Як лёгкі вазок на высокіх рысорах!

Разварочваю ў часе, каб пачаць гэты ваяж у Італію з самага пачатку, наноў.

Нам трэба адрэгуляваць аб'ектыў зроку. Паставіць унутраны голас, каб не сарвацца да плачу, вяртаючыся з гасцей.

Самалёт нахіліўся, зорны пыл пасыпаўся, як са страхі. Наўмысна раблю добрае кола, каб убачыць аўстралійскае ранча, куды сасланы памагатым пастуха авечак дуроны прынц Гары. Так, лічыць ангельская бабуля Лізавета, пазнаецца сапраўднае жыццё. Старэйшы Уільям сам паехаў у Чылі з кампаніяй нядобранадзейных падлеткаў, будуе масты, жыве ў інтэрнаце, дзяжурыць па кухні, гатуе бульбу з соллю, як у нас кажуць. І гэта перад тым, як, магчыма, неўзабаве прыйдзецца надзець на галаву карону! А нам навошта тое ранча? Мы не каралеўскія

ўнукі! Тут да месца будзе нагадаць: Генрых IV дазваляў лупцаваць нават каралеўскіх дзяцей — вопыт даўні, трывушчы калі што якое.

Сонца ўжо з другога боку, якраз з таго, як зафіксавана ў ячэйках нашае памяці, святло рассеянае, бы скрозь абажур, — мы дома! Мы яшчэ толькі рыхтуемся ў Італію.

Найперш трэба ўспомніць закінутыя на гарышчы навыкі суладдзя з прыродай. Мы ідзем туды, дзе яшчэ кратаюцца карані ссечаных дрэў, лічым на пнях колцы гадоў — знішчаны няспелыя лясы. Зямля слаба родзіць, бо ёй вочы гарэлкай залілі, жаляцца навокал людзі. Жаляцца звыкла, ім і тое рабое, і гэтае, і няхай сабе, маўляў, — не смяротнае. Мы пералічваем усіх птушак, усіх звяроў, шмат каго не далічваемся, патручаных, пабітых. І раптам знаходзім гняздоўе лебедзя-крыкуна — яго ў нас даўней не было. Гукі клявікордаў у нябеснай залі — гэта ягоны голас. Прырода ідзе да рук з даверам дзіцяці. Па дарозе вясковай сустракаем старую жанчыну. Зморaная, цела цяжкое, душыць здыхаўка, пара йдзе, курыцца ад самай косткі, нагрэтай на сонцы, як ад роснага каменя. На ейным панадворку, накіраваўшыся на аўтобус у горад, стаіць унук. Узрост каралеўскіх хлапцоў, стаіць, плача, не хоча заставацца ў бабы, а самая ж касавіца! Гавораць да яго, ушчуваюць, просяць, а ён павярнуў галаву ад двара, ад усіх, з якога боку ні зайдзіся — дасць азадкам. Шыя таўстая, наетая, хамут не ўздзенеш, рады не дасі — не завернеш.

Ідзём, схмысціўшыся, ў горад, несучы на ахвярным падносе нашу веру.

Скрозь чуваць чужая мова. Забіваюся ў куток, каб нешта па звычцы занатаваць, сцішана лаўлю галасы продкаў, мяркуюся ўступіць як у размову, уступіць, як у песню, стоячы дзенебудзь у полі пасля жніва. Серп ужо на плячы, колка босым нагам, а ты апантана сочыш за старымі жанчынамі, бы за варажбіткамі, каб дазнацца: ці тую ноту бярэш, даючы падгалосак, ці патрапіш далучыцца да іхных галасоў.

Сям-там узвышаюцца новабудоўлі на зруйнаваных могілках. Узрыты цяжкі дзірван. Металічны крыж устае з-пад каўша экскаватара, жагнае парушальнікаў вечнасці і зноў падае ніц, пад ногі, пад падмурак дому... Хопіць! Толькі не пужайцеся, кажу дзецям, трэба ведаць праўду — жыццё не мае замены.

А зараз мы паляцім у краіну, дзе ў пашане кожнае дрэва, кожны камень, дзе фантаны маюць святарнае дзеянне. Там яшчэ Цэзар забараняў рух колішняга транспарту пры дзённым святле, каб чуваліся галасы птушак, галасы травы, музыкаў. Там зямля да таго перапоўненая несмяротнымі, што наўдачу будзе лягчэй напаткаць Бога, чым чалавека. І гэта не рай — там працуюць з дня ў дзень, з веку ў век, каб быць італьянцамі. Мы будзем да іх прыглядацца, вучыцца, каб «заміж персідскага ўзору» выткаць дома свой свет. «У нас не выйдзе... Мы гэтак не здужаем...» — пачуліся галасы. Ну, гэта натуралёва пры нашай памяркоўнай ментальнасці!

Засталося толькі наастатку зайсціся да знаёмага мастака, ён жыве ў вёсцы, будуе ў сваім агародзе... аэрадром. А што калі і праўда насамрэч пляц ужо гатоў — тады нам будзе ямчэй адлятаць у Італію адгэтуль. Тым больш, што зусім побач мой вясковы дом.

Мастак стаяў з рыдлёўкай, скрозь разрытая зямля, канаўкі — і пазнатку няма на тое. Сам у лахманах, згаладалы, людзі смяяліся, дурніліся з яго. Ты высіліўся... трэба спыніцца, пэўна немагчыма аднаму зрабіць такую вялікую работу, ледзь прамаўляю, шкадуючы. «Не кажы так... Вусны маюць вялікую моц... Ты можаш мне нашкодзіць недаверам...» — адказвае.

Сонца зайшло, словы ягоныя свяціліся ў цемры — яны былі з Бібліі.

Якраз набліжалася калядная ноч. У прамежку паміж другой і пятай гадзінамі расчыняюцца нябёсы. У гэты час можна папрасіць Бога, каб дапамог нам адчуць сваю недасканаласць, перастаць апраўдваць сваю ляноту, свой хаос, пераадолець векавую нямогласць, каб здзейсніць мары. І няхай у зямлі нашых сэрцаў пусцяць карані парасткі Ягонай надзеі, маліліся святары.

Святы вечар! Самая пара калядаваць! Колкі бляск месяцу, трэск промняў пад нагамі і поўны рот смеху, голасу — гаварыць, крычаць пад вокнамі, нешта варожачы, прыкінуцца пярэваратнем. Бярэ рух, забірае цябе вясёлы, адчайны цуд паганства.

СВЕТ ВЯЧЭРНІ

«Ідзі, прыбірай, сустракай... вунь ужо радня мая збіраецца...» — сказаў Пётра да жонкі. Пётрыха зірнула ў вакно — ні на панадворку, ні на вуліцы анікога. Здагадалася: *адыходзіць*... У такі час мёртвыя сваякі наведваюцца ў госці... Утрапеўшы, адчула празрысты ад гневу позірк свекрыві, — ніколі не ўдавалася дагадзіць ёй пры жыцці, — кінулася падмятаць падлогу.

Прыехалі на пахаванне з горада дочкі, сын з унукамі. Сярэдні Лешак у хату не пайшоў і начаваў у суседзяў. Пабраў малых за рукі, чарадой падняліся, ідуць з дварышча. На вуліцы ізноў заварочваюцца, вяртаюцца, быццам пудзіць іх нехта, не дае асесці, як вераб'ям. Лешак адлучаецца, ідзе да лесу, да ракі, потым да старэйшай Алі — і за работу. І кашы ёй носіць з паранкай, і так усё чыста робіць — вось яму ўжо і паратунак, дарослы паратунак на гэтым свеце, як на млыне, удвух ужо круцяць цяжкія, няспынныя дзедавы жорны. Маладзенькая Аля ў куфайцы, туга перавязана галава белай хусткай, па-бабску, адскочылася якраз на тую адлегласць ад гора ў сям'і, на якую толькі сілы хапае, нораву ўхапіць з бабіных рук упушчаную работу.

Дзень ясны, кожная краска зайграла, заблішчэла астатнім святлом. Восень як з зямлі паднялася, з хворай пасцелі, на локцях крыху затрымалася, на адзін дзень, назаўтра ізноў адкінула голаў вунь на той пагорак каля лесу, шморгнула фіранкай — і зноў ні зіма, ні лета. Апоўдні малыя быццам абвыкліся з навіной і ўжо весялей брыдалі па гразі, будавалі канаўкі, папісквалі, трапіўшы на глыбокае. Зводдаль паглядалі на хату.

Там, пэўна ж, печ не цеплілася.

Ішлі бабы. Янька Ласёва наперадзе, Альжбета, Стэпка. Янька дык неяк стаіўшыся, сціснуўшы ў зложаных пад грудзьмі руках сваю заўсёдную весялосць, бы ад холаду — рукаво ў рукаво. Альжбета цяжкая, сырая ад хвароб розных, ледзь калывалася па дарозе, але давала сабе рады. Ніколі ні перад чым не выслугоўваецца, твар заўсёды спакойны, вусны скарыначкай.

Стэпка цыбатая, ідзе, бы гілюе, пужліва аглядаецца па баках, здаецца, зараз нечага спужаецца і паляціць у поле, высока падкідваючы запяткамі, лобам наперад, сілком сябе стрымліваючы, каб жа чаго лішняга не сказаць, каго не адпэйтаць, упомніўшы пазалеташні снег. Надта ахвочая і да слёз і да гвалту. Яшчэ ішлі бабы, вяртаючыся з бульбы дамоў. Адна крэпка збітая, не ўкалупнеш, цэлы дзень была нахіліўшыся, вочы назышшы, сплюснутыя, як у той бульбы-сямянкі. Спынілася напроці хаты, адышлася на крок, стала шырока, шырока паглядзела на сялібу, узіраючыся ў твар гаспадара: а што пакінуў, а ці ёсць тут упраўка мужчынская.

Аля ўжо выбірае, чысціць моркву, роўненька выкладае хвост да хваста, наўмысна пільнуецца парадку, каб не падняць галавы, каб нічога не бачыць, акрамя работы. Лешак ізноў пайшоў круга, рукі чапляліся то за тое, то за гэта, мые нешта каля студні, потым ліе малако з гарнушка кату ці сабаку, каб нікога не пакрыўдзіць у гэты дзень, хто сам да стала не падыходзіць. Жывая ягоная душа ўвесь час палохалася абыдзеннасці. І малыя адцураліся хаты. Ніхто не здагадаўся іх, гарадскіх, пазваць да сябе, пасадзіць на лаве каля дзеда — ну, баяцца, дзічацца, то і хай сабе, маўляў, і не трэба.

Ішла і Ганна, у блакітным швэдры, і хустка да колеру падабраная. Ганна прыціскала свае гады. Нешта ўсё лап-лап каля паясніцы, бы не даючы сабе даверу, што зняла фартух. Блісь-блісь па вокнах, не ўпэўнена, ці трэба ёй туды ісці, бо там можа сустрэцца з Янькай. Ганак высокі. Узыходзяць на яго, абапіраючыся на калена, не мяняючы нагу, як прыкульгваючы. Вось і сышліся, і Янька з Пётрыхай, і Ганна з Янькай. І кожная праз мужыка пасварыўшыся. І не перагаворацца каля труны. Бо канчаюцца, бабкі, нашыя маладыя дзялы, ужо нашыя мужыкі, равеснікі, у зямлю кладуцца. Сышліся, і толькі тут усё здалося такім далёкім, як праз вакно пабачанае, — і слёзы, і людская гаворка. Смерць і на тым свеце іх збярэ — на адных жа могілках ляжаць, — але, пэўна, ужо смаку такога там не будзе, як без солі ўсё роўна.

Сышліся бабы каля Пётры, калі сон ягоны яшчэ не набраў моцы.

Пётрыха ў халаце фланелевым, пантоплі на босую нагу, на галаве чорны карункавы шалік. Як перад невялічкім люстэр-

кам вясковым – толькі твар відзён, а так усё на ёй будзённае. Жалоба ўжо тая і знасілася на сабе – даўно Пётра хварэў, во толькі шалік гэты не завязвала, свежы. Стаіць, трымае ў руках свечку, няўцямна разламала на тры канцы, злажыла, раўнуе, як пальчыкі. Адзін кончык – Пётра, другі – яна сама, а паміж імі – Янька. І каля труны яна паміж імі. Не аббегчы полем, лесам, каб размінуцца, як было неаднойчы...

Ёсць мужыкі, што і жонцы харош, і палюбоўніцы харош. А то ж як вернецца ад Янькі, у сям'і месца няма. Калі дзеці былі малыя, то хоць усміхнешся, а так бы і не засмяялася ніколі. А Янька ходзіць каля ракі, спяваючы. Голас ціхі, быццам не звадлівы, нікому не хочацца далучацца – сама сябе весяліць, з'юхцішся за работай, спадніцу здымеш – і пранікам, пранікам па рацэ! Не адбяліць твару, не адмаладзіць гады, вада выслізгвае з рук яшчаркай па каменні, хаваецца ў траве. І рака ў той бок ішла, дзе Яньчына хата. Пранікам па спадніцы, па Яньчыным голасе! Выцішаецца ейная песня і з-пад каменя ляжачага, у хату вернешся – і там звініць. Вокны толькі бразь! – ціха, нарэшце. Голасам вады, голасам ветру, зыкам летняга поўдня – хто з мужчын да Янькі не дабяжыць ноччу, то хоць побач пастаіць, як пад ліпай цвітучай. Яшчэ ж і яна да вакна шыць не садзілася. А на свет ужо глядзела толькі праз шыбу, ні з кім не загаворваючы, ні да кога не дакранаючыся. Калі якую работу рабіла на панадворку, спінай да вуліцы адварочвалася. Гадамі ў хаце моўчкі жылі, Пётру слова да яе сказаць цяжэй, чым стог сена на сабе перанесці. А Янька гуляе круга сябе рукамі, ідучы па вёсцы: «Быў у мяне ды любы госцічак!» – пяе сама да сябе і на людзях. Біцца Пётра кідаўся. Крыжам падымала перад сабой малое дзіця, баранілася. Было, што два тыдні хадзіла чорная. І яна б Яньцы нешта зрабіла, каб у сабачую скуру ўбралася. Толькі хрась! – засекла курыцу, тая збадзялася, стала несціся ў суседзяў. І яна ўпрочкі?!

Лягчэй стала, грэх казаць, калі Пётру аблажыла хвароба. «Калі будзем моркву рваць? Чаму буракі не зносіш у склеп?» – запытаецца з ложка. Вой, якія гэта ёй палюбоўныя словы!.. Цяпер хай Янька пазнае. Людзі дзівяцца, дазнаўшыся, што ейны Лось начуе ў Ганны праз раку. А яна ходзіць і маўчыць: за яе, маўляў, адбывае кару. Вернецца, вернецца, усё благое чалавеку вяртаецца, добра ведае...

Янька стаіць насупраць. Бровы чорныя, хустка юлёвая пялёсткамі — захаладалы цвет, самы ранні, вясновы — увесь век адным строем. Сыходзіліся на ёй у старой вёсцы ўсе бабскія пакуты. А можа, ёй і не шкодзіць такая жызня? А можа, такім бабам і такія мужыкі? І Лось на гэтай жа, на аднолькавай з ёй вадзе замешаны? І праўда, Янька мірылася напачатку, маўляў, няхай ходзіць да Ганны, але ж і дамоў вяртаецца, работу робіць. «Мне яго швагра ўкінуў у хату, так і пажаніліся», — скажа смеючыся. Толькі голас ейны мяняўся. Што ні робіць, усё спявае. Ды раптам ускрыкне, паддасць сабе рызыкі:

Распракляты салавей,
То на ліпу, то на ель.
Распрыдурак мілы мой,
То з падругай, то са мной.

Ускрыкнула са стогнам — усім адкрылася ейнае балючае. Каторы год Лось начуе праз раку ў Ганны, а ёй усё быццам спяваецца. Не, не звыклася яна, яшчэ гэтая болька падае на голас, свежае яно, маладое: хочаш — у песню, хочаш — у прыпеўку. І не сорамам бабскім, а быццам дзеўку на вечарынах кінулі.

Можа, тады толькі бабы пазналі, што і Янька не сучка.

Ганна, хоць і старэйшая за ўсіх, але хустку на галаву завяжа толькі за вёскай, ідучы ў грыбы. Ды во сюды, да Пётры. Стаіць каторая баба побач з ёй і збочыць казырысты позірк, бо век людзям навіна, век смешкі, вясёлае яно, калі баба гуляе. Вясёлае?! А як той Лось пад ейным плотам ляжыць дзень п'яны? А то паставіць каня (падвозчыкам на ферме робіць) і пайшоў у хату, конь усю ночку чакае, усе бачаць, і ты сама, здаецца, як на выгане з ім ляжыш і галаву няма куды схаваць? Вясёлае? А смачна з'есці любіць! А выпіць каб было! Мая ты Янечка, ці ты мне выгадавала свайго маладзёначка? Ці ты яго вышанавала? Збадзяны, скачаны прыязджае, храпы ў змылінах, зарос мохам, поўсцю. Мэнчышся ты, мэнчуся і я! П'яніцу дзелім! Нікому не завідна, не зайздросна — адныя смешкі. Увесь бражны, потны, у руках трэба качаць ягонае прычындалле, калі ноччу прыхінецца. У дзеўках долі не было. Дзяўчаты за кавалерамі, за мужыкамі, а мае на вайне пабітыя. Маладыя падняліся — ужо мая пара сышла. Дадуць каня ў калгасе, а дзе ж чалавека да яго ўзяць? І кашу і бараную сама. Здарыцца, мужык прыйдзе

ў хату, паможа ці не, то і бяды, бо ты без мужа... Чаму ж не, бывае, што і Лось дроў прывязе, і гной вывезе на поле, мужчынская работа быццам і робіцца. Асядае на дно ганьба – нясеш есці, ходзіш лёгка. Выдаецца, што яно ўсё так, як і трэба. Бо хочацца не тое каб спаць удвух, а захінуцца за каго-небудзь. Усё ж нейкая і мне заслона... нясу, мая ты Янечка, перад сабой па вёсцы гэтую любоў, нясу, як дзіця, прыдбанае на баку, бахура. І ніколі ж яно ў пер'е не ўбярэцца, бо не ажэніцца на мне Лось, не зраўнуе ўсе плёткі, усе гаворкі, будзе хадзіць, брыдаць – ні мне, ні табе. І ніхто з людцаў не прывыкне, убачыўшы, як ягоны конь стаіць каля майго плота. Што сліна нясе, тое губа трасе.

Чуліся іхнія галасы толькі, можа, Пётру, а так ціхі шчэбет стаяў у хаце, слабка трашчаў агонь свечак, бы сухое скрылле злоўленага матыля.

Позняе каханне, як неспадзяванае летняе разводдзе пасля начнога ліўня, пасля начнога плачу. Вада ў рацэ мутная, як слёзы, па кроплі сабраная. Размыты дарогі, знесены кладкі, а ні следу, бы і не было дагэтуль жыцця твайго, любові іншай, толькі вось гэтае – сённяшнім днём. А ўсе спыніліся і глядзяць на ейныя берагі – бяды, маўляў, шкоды нароблена. І ніхто не прызнаецца, не скажа адзін аднаму, што хораша паглядзець, падзівіцца. І рацэ лягчэй пасля засухі.

Стоячы ў парозе, гаварылі смялей.

– Ён, Пётра, нядаўна во гэтак сядзіць пад хатай, чакае, пакуль я праз плот пералезу, паздароўкацца каб. А я, некалі мне было, шась – і адвярнулася. І бачыла – і адвярнулася! Во, думаю, вітацца тутака, не да вітання – цялушку ўпусцілі ў агарод... Во, бабкі, як трэба асцярожна з чалавекам...

– Бабы, я ж купіла боты ў цыганоў, што ўчора былі ў вёсцы. Дачка мая вусны надзьмула. А што, хіба я не зарабіла на іх? Нашто? – пытаецца. На смерць! Боты на смерць? Ага, смяюся, каб сухенька было прайсці з кладоўя ў вёску і ўзімку: хату нацепліць, ката са стала прагнаць... Вы ж усе ў горадзе, а як гэта, каб хата няцепленая стаяла...

– Што калі вайну ўшчыняць, нікога жывога не застанецца. Во буду ляжаць, ніхто мяне не пахавае. І што выгадаюць, каб спытаўся? Зямля апусцее – лес парасце, людзі пачэзнуць...

– Ці чулі? Баба бахура несла ў капу хаваць, дык за ёй усю дарогу град ішоў...

— Во як?!

— Я дык «пахвалюся». Нядаўна сын прывёз з горада сваім дзецям кош памідораў, унукі ў мяне ўсё лецейка. Дык каб адзін даў пакаштаваць. Дачка ніколі б так не зрабіла. Во як адных сыноў мець!

— Якое дзіва, што малы зносіць, што стары з'есць — адна тое, адна патрава. Мы ўжо і смаку таго не чуем...

— Бабкі — старасць... Трэба ж неяк адбыць, як радоўку за кароў у даждлівы дзень...

Нагаварыліся — дыму поўная галава.

Ціхенька, баючыся сцюжы, яны ўжо пераходзілі вялікую ваду, не шукаючы броду, — у другое жыццё і, быццам, развіталіся.

Ляцелі па небе птушкі ў чорным, напрасткі, як па калідоры, высока, галасы ледзь чуліся, даляталі ціхім плачам, птушкі-плакальшчыцы, якія суправаджаюць душу.

І быццам ад іх адлучыўшыся, да хаты падышлі дзве жанчыны. З белымі вузельчыкамі ў руках. Хусткі туга перацятыя, аж галовы набок звярнуліся, чырвоныя ў твары. Адна адной пільнуюцца, і самі росту аднолькавага, пэўна, у дзеўках разам былі, западруку хадзілі. Гэта ўжо саўсім даўнейшыя людзі, бы людзі другой веры — бедная радня Пётрыхі з ейнай далёкай вёскі. А ні слоўца не прамовілі, перачакаўшы шум увушшу, бы рой мошак, сталі маліцца. Прыйшлі, як зайшліся з вялікай дарогі, ідучы да святых — паломніцы.

Мужчыны яшчэ па відну не ідуць. Але вось і стары Жарт сунецца, рукі ў кішэнях, брыль на вочы, задраўшы галаву, цыгарэта ў зубах. Ідзе проста на хату, на гора. Ён нічога не баіцца, не асцерагаецца смерці — нядаўна пахаваў жонку. Дакурыў, кінуў пад бот, ледзь-ледзь затрымаўся перад вароцейкамі. Усё-ткі затрымаўся. Праз некаторы час ён прыйдзе да Пётрыхі ў сваты. Матка, скажа хораша, трэба нам разам дажываць. Я люблю бульбу есці, і скваркамі каб заскварыць, я такі бульбянік. Ці каб бульбы накрышыць і малаком забяліць. Маўляў, ведаю, што ты не любіш мадыравацца з ежай, але са мной мала бяды... Яна, вядома, зазлуецца, прагоніць: «А мой ты чалавечак! Які ты ўжо ёсць?! Мой сын падарвецца цягаць на могілкі нябожчыкаў!» Маўляў, нямоглы жаніх — бяда ў хату. Але на вёсцы пахваліцца: хацелася пагаварыць пра маладое дзела, пасмяяцца.

Лось ужо не на кані, як заўсёды было, каб напомніць гаспадару, што конь пры ім, во ён, спатрэбіцца яшчэ, ага – рыхтуйце пахмяліцца. Сёння і без каня пачастуюць. У плашчыку, бы дзяцючок, як толькі пала за палу закласці на спітых, высмаглых грудзях. Каленькі аж пад барадой, як бег. І ён тут! Стаяць мужыкі на панадворку, сышоўшыся, па трое, па пяцёра, гавораць зусім пра другое. Во, адпусціў нам Пётра свята сярод нядзелі, у сераду. Пакуль што якое, паселі на зэдлі, курацъ. Паселі і дзеці каля іх, сталі гуляць. Лешак садам, агародам – зноў у лес.

Выйшлі з хаты бабы, рупіла падрабляцца. Толькі зайшліся Янька са Стэпкай за хлявы, толькі крыху захінуліся – я-як далі ў языкі, бы зайгралі на гармоніку! Янька расшпілілася, абцёрла павярхоўныя слёзы, цвёрда пад нагамі, зноў пачула тую цёмную сілу ў сабе, што мяшала ўсё чыста, круціла пустыя жорны, учыняла свары, іграла на вуснах, смяялася ў вочы – бабская сіла кацілася пераходамі па вёсцы ад двара да двара, ад жывога да мёртвага. Тая сіла, што несла на карку і прыдбанае на баку дзіця, і чужога мужыка. А на Пётрысе што гэта за сукенка! А ў што Пётра абуты? Надта задзяшовыя пантоплі! І ніхто ж не галасіў: ні жонка, ні дочкі, уся іхняя парода – і бяда паўбяды! І Ганна тутака! Ходзіць, жалобу збірае, і яна жалосніца! Мыліся ў лазні, дык жа ў яе духоў зусім няма, палюбоўніца, грудзі – як дошка! Сама ў такім светлым швэдры прыйшла, ні чорта не кумекаецца! Бы яна ўжо тутака маладзёначак, маладая, Ласіха! Ха-ха-ха!.. Верка скажа і круць галавой убок, скажа, і зноў – круць для пэўнасці, бы кожны сказ з абзаца.

Бабы, хто чуў, натапырыліся: у якую шкоду цяпер Янька ўб'ецца?

Выйшла, пабыўшы, і Ганна. Стары Жарт адвярнуўся, доўга, уніклiва ўглядаўся ёй услед, як не пазнаўшы. Нешта ж ды ёсць у ёй, калі... Лось не толькі ганьбіў, але і падымаў ейную цану. Альжбета ззаду. Слізгата, нагу не змяніць, калок сабе агледзела ля хлева. Яна даўно без мужыка, а тутака яшчэ ёсць пазнатак на мужчынскую работу, ёсць такі-сякі заход. Але ёсць ужо і нейкае бяспраўе ўдовінага двара. Можа, во з гэтага кія і пачалося нядбайна разносіцца людзьмі, птушкамі, дажджамі гнаіцца. Слабадней і ад плота адвіхнеш, калі няма чым карову скіраваць, гонячы каля Пётрышынай хаты.

На небе, бы ў чалесніку, сажа загарэлася, пужлівымі іскрамі пабеглі адна за адной зоркі.

На другі дзень ужо адчынілі ганак ад вуліцы, выносілі складзеныя там валёнкі, кудзелю. Во як прыйшлося выходзіць з хаты, дзе і нага жывая не ступала, можа, ад самага вяселля. Свежае пілавінне снегам на панадворку, загадалі дзецям падмесці. А які ж харошы вянок прывезлі, каб Пётру хто сказаў! Чакалі бацюшку. Хто і не верыў у Бога, але што, хіба бацюшка пашкодзіць? Лешак стаяў на вуліцы, біў і біў запяткам камок зямлі на дарозе. Аля макаўкай свяцілася то тут, то там, то свінням есці, то трусам. Гнала перад сабой авечак, цялушку, карову. Яна адна трымалася, учапіўшыся за самы кончык бясконцага жыцця. Заўтра ўжо да яе далучацца і матка, і баба. А пакуль абы не згубіўся, не выслізнуў з рук.

Баб дык рух бярэ, а мужчыны — рукі ў кішэні, стаяць, кураць. З хаты выйшаў сын, падышоў да іх, папрасіў — трэба ўжо выносіць бацьку. Усе, хто быў, расступіліся, глядзелі на старэйшых: во яны, найбліжэйшыя ягоныя таварышы, во яны.

Мужчыны ўжо без шапак.

Раптам моцна заплакаў малы. Можа, што маці адпіхнула яго ад сябе, невідушча атрэсла рукі, заспяшалася стаць за труной побач з Пётрыхай. Малодшая, яна была найбліжэй да яе, нікому не хацела саступіць гэтую чорную чаргу.

Назаўтра адведаюць Пётру, пойдуць запытацца, як там яму начавалася.

З хаты напроці ўжо неслі і неслі цёплую ежу, закручаную ў ручнікі, каб не астыла, збівалі лавы. Пётрыха сустракала ўсіх у парозе, сярод сумнага карагоду. То пастаіць з кім-небудзь з баб, абняўшыся, углядаючыся, пагладзіць па шчацэ, то зноў пераходзіць ад аднаго да другога, працягнуўшы рукі, як у якімсьці жалобным танцы. І так ля кожнага свежага чалавека, а ўсё накшым строем, бы адпявала прыпеўку:

— Во, Ганначка, во мы з табой і зраўняліся, бачыш...

Сабраць, зняць першай гэтую жалобу. Як чорныя хусткі развязваюць, складаюць бабы каля яе і ідуць у хату ўжо смялей, вальней. Яна і сабе жалобу разводзіць — слабей вузел пад барадой, не так вусцішна. Фіранкі на адчыненых вокнах лопаюць белым кароткім скрыллем. Кружалкі перадумак маладзілі ейныя вочы. Ужо не проста стары гаспадар памёр,

а ейны да пары чалавек, мужчына, во толькі што адпусціў ейную руку, пайшоў, як каля веснічак усё жыццё стоячы, кахаючыся.

– Дзякуй, людцы, што прыйшлі за ягоны стол...

Аглядалася – увесь тутака ейны свет, камячыла беражок настольніка: трэба ж во першы раз адной сядзець сярод гасцей, шукаць гаворку.

Ягоны стол ад парога да покуця – полем, стэпам ягонае пустое месца каля яе.

Яшчэ тая вячэрняя пара, калі рана было класціся спаць, адвярнуўшыся да сцяны. Сон яшчэ не браў. Вялікая птушка так нізка вяртаецца на гняздо, над самай галавой ейны шоргат, хоць адхінайся ўбок – ці гэта яна пехатой, ці ты сам лётам.

Яшчэ мужчыны дакурвалі апошнюю цыгарэту.

ЧОРНЫ САГАН

На змроку штовечар праляталі над вёскай птушкі ў чорным, моўчкі, разважліва, толькі шоргат скрылля шоргатам адмысловага адзення, бы спяшаліся на вячэрнюю службу, пераходзячы нябесную плошчу, святары.

А сёння ляцелі гусі, якраз над Барбарынай хатай. Выбягаю на вуліцу паглядзець. І яна стаіць, бачу, у поцемках, стаіць нерухома.

– Гусей слухаеце? – пытаюся.

– Ага... а чые яны ёсць?

– Гэта ж дзікія гусі лятуць!

– Чаму так позна?

Кожнай вясной усе, хто ідзе ці стаіць, сагнуўшыся над работай, спыняюцца, разгінаюцца – гусі лятуць, да ўсіх лятуць, як у хату ўсё роўна, да кожнага, гэтаксама і праводзяць. Што ёй ёсць? – не глядзіць на неба, толькі тое, што на зямлі, галасы тыя, што побач, на панадворку, у хлеве, толькі гэта ўжо чуе? Толькі адныя турботы: ці ўсе тыя гусі вярнуліся ад ракі, ці прыйшла карова з пашы, толькі панадворак, загароджаны плотам, – увесь ейны свет?

Гусі крычаць, прарэзлівыя галасы пералёту над хатамі, лятуць доўгім шляхам, гляджу зайздросна, як у дзяцінстве, пад высокім рухавым мастом, на які табе забаронена ўзыходзіць.

Няўжо Барбара састарэла? Яшчэ нядаўна казала, што ўсе бабы, у каго ні запытаецца, ужо звязалі сабе вузел на смерць. А яна – не! яна не збіраецца! Дочкі прывезлі былі ёй сарафан з горада, то ўсю зімку парола і лета яшчэ, калі дождж, зноў садзілася пароць – не па модзе! ёй усё каб па таліі было! Ейная матка, нябожчыца, казала, апранула была сукенку смяротную, хустку завязала, падышла да люстэрка, глядзіцца: во, маўляў, каб і труна была гатова, можна было б прыкінуць, як яно будзе, – каб людзі не пужаліся, убачыўшы яе пасля смерці, каб хораша ляжаць, як спаць.

«Ці пазнаеш ты мяне?..» – раптам запытаецца сцішана вясной, калі я вярнуся на дачу з горада, перапужаўшы згадкай, як ёй цяжка зімавалася, губляючы прыгажосць.

Назаўтра, бачу, выйшла на ганак, стаіць, спусціла нагу на прыступку, бы басанож, у сцюдзёную ваду, мацае, ці глыбока, – не, не адважылася, пайшла назад, у хату, не, вярнулася, сама сабе веры не дае, і яшчэ раз пайшоўшы, вярнулася, і яшчэ раз. Потым камандавалася з дзецьмі (якраз былі прыехаўшы) з ганка: да каровы, у агарод, у сад. Толькі вечарам пайшла ў хату, несучы перад сабой спавітыя рукі, суровым матком ускіне яна свае сцежкі і на мае яшчэ відушчыя вочы, будзем разам разбіраць тое скрыпанае прадзіва, будзе сыпацца кастра і на мой прыпол, пакуль не сыдзе нітка.

Барбара аслепла... такая навіна... Не было аніякага пазнатку на тое, што цэлая сялянская эпоха будзе сыходзіць у нябыт менавіта з майго канца вёскі і гэтак скоранька, – ледзь сэрца ўтрымаеш. Па старым садзе, па агародзе, ад хаты да хлявоў, ад хлява да хаты, абшукаўшыся, любой пагодай, хустку толькі перавяжа, трэцяя хустка за паўдня, хада размеркаваная, павольная, бы з ваўчком-хліпаўкай па пацёмках, – рух маятніка. Калі, бронь Божа, яе не стане, у мяне ў хаце спыніцца гадзіннік, я пары не буду ведаць, як той наш дурнаваты Баравік: падыме ўгору палец, памерае неба ад сонца да лесу. Мне край меры, седзючы за пісьмовым сталом, трэба бачыць праз вакно цётку Барбару. Аніякая ні радня, але кожны чалавек набывае з гадамі магічны сэнс.

Неяк жа ўдалося дзецям угаварыць, павезлі Барбару ў больніцу, у горад, зачынілі дзверы на замок, наказалі суседзям, Мацейку з жонкай, глядзець скаціну. І след яшчэ цёплы, а алканаўты з суседняй вёскі паставілі ровары каля плоту, пайшлі ў сад. «Ці кіслыя яблыкі? — Кіслыя, кіслыя, укусіш і роту не зачыніш!» — перагаворваюцца, як у лесе. Вырваў нехта хвост морквы ад ракі, фасолю з карэннем вынеслі з канца ляхі. На што потым, вярнуўшыся з больніцы, Барбара скажа, маўляў, людзі на нешта благое варожаць, такога ж даўней ніколі не было, будзе дзецям казаць, каб запасіліся — пэўна, голад ідзе.

І наогул, абы чалавек з хаты, гняздо астывала. Варотцы адчынены, і тыя, што на вуліцу, і да хлявоў, выдуваецца цяпло, бы юшку ў чалесніку забыліся зачыніць, печ выцепліўшы. Бяда разлілася па панадворку разводдзем, перакуліла вёдры, сагаиы ляжаць на баку, куры шукаюць ежы. «А кы-ы-ыш!» — выдаецца, стаіць увушшу цалны дзень Барбарын голас. Сонца на захадзе асвяціла куткі падстрэшша, вокны, а выдавалася, што і яно ўжо не зайдзіцца сюды, калі дзверы на замку. Яшчэ тут ходзіць хвалямі нявыбрыданае мною моўнае рэчышча. «Вой, мута ў вадзе!» — выбірае Барбара парушша з вядра. Мута? — першы раз чую! Яна ўвесь час, усе тут у вёсцы, трымаюць мяне за руку, як на апошняй сваёй гадзіне, перадаючы таямніцы замоваў. І што гэта за кветкі ў ейным садзе, якраз жа няма ў каго папытацца, дробныя, балотныя, ніколі быццам дагэтуль іх тут і не было. Хаджу, збіраю, ідучы ад ракі, празрыста ад іх уваччу, бы глядзіш скрозь слёзы. Надвечар суседзі запалілі сухое лісце, дым стаяў аж у ейным садзе, кучаравіўся веснавым цветам на голым галлі. «Мой сад што сівы дзядок, захаладаў, няма развіцця цвету...» — казала Барбара яшчэ вясной.

Сад пераменлівы, мімалётны, як той сон пад раніцу.

Азіраешся на яе ўвесь час, затрымліваешся, бы на скрыжаванні пор году.

Ужо і карову Буру перад тым як весці з двара здаваць наважылі былі ў садзе, як той казаў, наастатак і яе запрасілі да столу — тут яшчэ поўна травы. Карова чырвоная, шырокая, галава камлём, падобная на вала, заносіць цёплым духам, духам хлева, аж мроіцца: ластаўкі віюцца ў рагах, сувоямі вісіць павучынне пад бэлькамі, котка белая сядзіць на сухім, чакае

вячэры, з лапы на лапу пераступае, як кацяня, топчучы матчына падбрушша, каб прыпусціла малако. Шуміць у даёнцы, пена аж пад дужку. «Вой, я багата – карова ацялілася! Мне без малака стол пусты, хата пустая!» – дакладаецца штогод Барбара. Кожан дзень святы вечар...

«Я б ніколі ад сваёй каровы мяса не еў», – скажа сусед, падпіхаючы Буру на машыну. Карова стала перад фурай на коленцы (ну не ўтрываць! я з двара сышла, каб не бачыць), ледзь узагналі з Барбарыным сынам. «Тата!» – спалохана закрычаў унук нейкім танклявым галаском, як высевак, пісклявым, прыціснутым да зямлі, ды на такім шырокім панадворку, на такім вясёлым месцы – ледзь пачуеш ягоны голас. Дзынькнула і абарвалася.

І тут пусты хлеў, і там, сыходзілі з вёскі малочныя каровы Млечным Шляхам. Вунь, снілася ўначы, цэлы статак на пагорку, скубе траву моўчкі, а ні галасоў пастухоў, а ні сабачча брэху – свежая, пэўна, паша, толькі што ўзышлі на райскі луг. А за імі, снілася ўначы, Барбара... Хоча завярнуць сваю назад, Бура без вяроўкі не ідзе. Сарвала хустку з галавы, закруціла за рогі, ідуць побач, блізка... карова незнарок уступіла на босую нагу... Барбара торгнулася, войкнула... Выпусціла хустку з рук...

І зэдлік назаўтра нехта знёс з хлява, як з-пад яе самой выхапіў у час дойкі, святым вечарам.

Прыехалі дзеці на выхадныя, ужо яны дачнікі, ужо хата на замку, сцюдзена, як у халоднай воседзі, парог лістом занесены. Хай сабе печ і халодная, але цяплей, калі кратаецца жывы чалавек. Нехта моцна засмяяўся на панадворку – і пазнатку няма на тое. Старэйшы ўнук і ў сені не зайшоўся, я, кажа, бабуліну тутака праграму выконваць не збіраюся, сеў у машыну, паехаў у горад. Хату не цеплілі, варылі ражкі на газавай пліце, пракідвалі маслам. Яшчэ разоў колькі прыязджалі без Барбары. Што знайшлі ў агародзе, у садзе, скінулі ў машыну, – і рук у зямлю ніхто не памачыў. У Мінску, казалі, ужо зацеплілі.

Раніцай, ледзьве згледзіш праз туман, стаіць прывідам белы конь на пагорку, голаў не хіліць, бы зацугляны, пад сядлом, пэўна, ноч на адным месцы быў наважаны – не рупіцца Мацейка перавязаць, конь і паўдні там.

Барбара вярнулася з больніцы. Не! болей яна ўжо туды не пойдзе, надта дарагія лекі, ды каб жа ведаў, што паможа, а то

за такую цяжкую жызню яшчэ і плаціць? Не! Стройцеся, яна ўжо будзе паміраць! – наказала і дзецям, і суседзям, і загадала печ цепліць. Лягла спаць не распранаючыся, накрылася сырой коўдрай, бы цяжкім дзірваном, а ўстаўшы хвалілася, што спала ў сваёй пасцелі, як перад Вялікаднем.

– Дзе наш вялікі кош? – запыталася ў дачок.

– Нашто ён табе, ён жа дзюравы.

– Папрашу Мацейку, каб зацыраваў, – памяць будзе.

– Дык жа Мацей яшчэ не памёр! – смяюцца.

– Памяць, што карову калісьці мела...

Загадала дочкам пашараваць, паскабліць самы вялікі саган. Няма каму варыць паранку – ні каровы, ні свінні, адныя куры, але ж гэткая патрэбная пасудзіна і не дзіравая, трэба прыхінуць, прыхаваць, ён, маўляў, яшчэ можа спатрэбіцца. Каму?! Можа і гарадскому ўнуку. А што, калі верабей нарадзіўся на стайні, дык ён ужо і жарабец?! А можа хто ўлепіцца за плуг, будзе жыць у вёсцы, усяляк бывае. Муж паміраў, ён ім і барану, і плуг, і калёсы, і сані, во як: каня ўзяў і куды схочаш паехаў. Хавала ночвы, карыты, а вялікі саган найпільнейшы.

Чорны саган на панадворку ляжаў на баку, як пасмалены вяпрук, да паўдня. Тады забразгалі дзверы, разгарэлася бойка.

– Ніхто маёй работы не хоча рабіць! – крычала Барбара.

– Мама! – узмалілася адна з дачок, старэйшая, паглядзі, якія ў мяне рукі, трэба заўтра ў банку паперы падпісваць, людзі прыйдуць!

Нашто ёй гэты саган?! у цёмнай варыўні, як у склепе фамільным, ужо стаялі дарагія ёй рэчы, вось толькі вялікі саган бадзяецца. Загадала цэглу вынесці ў паветку з чыстага ганку. Нашто чапаць? Бо як гэта будуць яе выносіць, праз чорны ганак нядобра.

– Нябось, вынесем, пад прыпечак не схаваем – шуткуе Мацейчыха.

– Што вы гэтак усё са мной гаворыце, ці я ўжо вам прыдурнела? Усё неяк смешкамі і смешкамі... – злавалася Барбара.

Накрычыць на дзяцей, а потым: ціп-ціп-ціп, зю-зю-зю, куры, гусі, котка, ёй ёсць да каго загаварыць, акрамя іх. А дзеці ўжо да вечара ходзяць надзьмуўшыся, мову не могуць развязаць са злосці.

Сыходзілі выхадныя дні, дзеці ад'язджалі ў горад. «Вой, я не дачакаюся, памру, вой, не дачакаюся!» — бедавала сярод тыдня. Я і сама ўжо пільнуюся аўтобуса.

— Скажу табе не ў адказ: а ці ж гэтак паміраюць?! — пераймае мяне на вуліцы Мацейчыха, маўляў, смерць не будзе пытацца, прыехалі дзеці ці не — брык! і ляжыш!

Шуткавала вёска з Барбарынай смерці, і сама яна крыху забаўлялася з ёй, страшыла дзяцей, суседзей. І звыклася. Загадвала прыглядзець месца побач з мужам на могілках. «Колькі там той зямлі трэба? Што гэта, лехі рабіць?!» — смяялася з Барбары Мацейчыха. Але гэтыя доўгія пярэбары і яе, маладзейшую, зачапілі:

— Быццам і ў вакно дагэтуль ніколі не глядзела — не было часу, а як Барбара захварэла... убачыла, што ўжо «прыехалі», трэба злазіць...

Але не паверыш. Ногі заўсёды ставіць шырока, рукі ў зямлі, бы век у баразне, век у яе полева па каленькі ў агародзе, і век ейны несыходны. Вочы блакітныя, колеру талай вады, боўтнеш, гледзячы недавяркам, скупянешся — і будзеш патураць ёй у гаворцы, бы нарэшце далучыўшыся да ейнай веры.

— І мае ж мінчукі дасталіся былі ў пятніцу, а прасіла, каб у суботу, — злуецца, распавядаючы. — Не ў пару прыехалі, мне толькі замінаць... Дык што, назад можа ехаць? — вылезла дачка з машыны. Як хочаце! — кажу. Пайшлі схмысціўшыся ў хату, паляглі, хто на ложку, хто на канапе — змары-ы-ліся! Яны толькі слова такое навучыліся казаць у горадзе. Гультаі! Нашто мне гэта? Хай дома адпачываюць!

— Дык і гэта ж іхны дом... — пярэчу спалохана.

Не, як аказалася, гэта толькі прытулак, зацішак, дзе можна пераначаваць, як у стозе сена, пераапрануцца з гарадскога ў блажэйшае — і да работы! І няхай толькі каторы забавіцца ў хаце ці ў садзе, зсочыць, згледзіць, маўляў, што ты маеш рабіць, калі ў зямлі не поркаешся. Пэўна, кажа Барбарынай нявестцы нешта ёсць, ці яна можа хворая? Чаму?! Бо, маўляў, сядзіць на лаўцы пад хатай і котку гладзіць. І вурыць сабе без меры на посцілку траву, накасіўшы ў садзе. Пачнеш спагадаць, а яна: калі чалавек укараніўшыся, яму што болей трэба: і падняць і панесці, яму меней шкодзіць, чым маладому. Стаім, абедзве смяёмся — век з мяне дурня зробіць. «З'еду зімой,

пабачыш, і не вярнуся, усю зіму буду ў дачок гуляць, хоць аддыхаюся!» — мацюкаецца Мацейка. Зноў яна смяецца, маўляў, ты мне зімой і не патрэбен, едзь сабе!

Работа і работа. Неяк жа было ўдалося дамовіцца з'ехацца да іх на гадавое свята. Зяць сеў за стол ужо п'яны і... адваліўся. Гаспадар падышоў, сабраў на відэлец скрылі каўбасы з бутэрбродаў (па-гарадско-о-му накроілі тутака!), пад'еў і пайшоў укасіць карове. Унук закапызіўся — спаць хачу! І святыя не дачакаліся, накуця седзючы. Дзеці, скажа неяк Мацейчыха, а ні я памятаю вашыя дні народзінаў, а ні я патраплю што купіць... Я вам на кожан дзень дам, што маю, а на свята выбачайце! Вечарам, бачу, ідзе, сама ўпрэўшы, чырвоная ў твары, бы верхам ехала, паганяючы і дачок, і зяцёў, і ўнукаў. Трэцюю сукенку, хваліцца, сёння змяніла, гэтакая спякота! Пачнеш ушчуваць: ты ж ба спакайней, дзеці забяспечаныя, добра ў горадзе зарабляюць. Не магу, злуецца, каб яно ў блот, у тлум сышло, тое, што можна спажыць! Тут яблыня скінула праз ноч салодкія яблыкі — трэба сабраць, паехалі ў лапнік, натрапілі на познія апёнкі. Салома аўсяная ляжыць за агародамі — трэба ўзяць, пакуль у стагі не звазілі, блізка ляжыць, як не ўзяць? Ды ўсё такое дармавое! І ніхто ў Каплічах не зсочыць яе, і не ўдасць, бо, маўляў, не да мяне яна ходзіць у агарод, і не да цябе, і не да каго другога. Яна ў калгаснае, — быццам і не злодзей! А тут, маеш, і свой мех ячменю з поля прапаў, знайшлі ў кустах, суседка, здагадаліся, схавала, каб потым па пацёмках сабе перанесці. Стаіць Мацейчыха з мужыком, ганьбяць злодзейку і смяюцца: во, маўляў, ужо і радасць, што знайшлі на разе, ужо, маўляў, ім і свежая навіна, добра, што ў сажалку побач не ўкінула, дастала б, высушыла — і тое самае! Каб яны хаця дзякаваць ёй не пайшлі за тое. Ляціць Мацейчыха, спяшаецца, рупіцца, час даганяючы, упушчаны ў лесе. І ў хустцы з галавы грыбы, і кош з коптарам, натрапіла, усе не сабрала. А каровы ўпаўдні прыйдуць, трэба пераняць. Колькі часу? Паспею! І зноў у лес. Збі яблык, збі — крычыць на мяне — яго, маўляў, восы з'ядуць! Ссыпае набытае ў місу ля парога, ляжаць на сонцы агуркі неспарадкаваныя, гарбузы. Дзе яна ўсё прыдбанае давядзе да толку, зносіць сама сабе пад ногі. Нямыты посуд на стале з пазаўчарашняга, хата нямецена. Ну і што? Хата пастаіць, нідзе не дзенецца, і наогул з гэтых убораў нічога не будзеш мець,

аніякага набытку з тае харашбы! Яна ўжо ўзаконьвала свой беспарадак, гармідар.

Пагода стаіць! Уся ейная ўлада і парада, хутка прыйдуць халады – дзверы зачыняць і ў лес, і ў поле.

Ідзіце, дзеткі, самі да аўтобуса, няма часу правесці, скажа на дачку з унучкай, напакаваўшы ім у сумкі сыроў, масла, малака, а яна ўжо пойдзе да суседа буракі церабіць, ён за тое каня дасць бульбу пераараць, у суботу зноў прыязджайце, няма чаго сядзець у горадзе на выхадныя! Паваліцца ўнучка на падлогу, будзе біцца, качацца, як ёй тут усё надакучыла, будзе крычаць. Быццам адкіне яе невядомая хвароба і невылечнае: жаданне ладу, строю, парадку, як смага, тое, што адчувала ў гэтай самай хаце, чым жыла прабабка. Яшчэ недзе на гарышчы ейныя ручнікі, посцілкі, у чатыры ніты, у восем, у дванаццаць, дымы, перабіранкі, знітаваныя на павучынне, там і кросны, і калаўрот, і прасніца. Яшчэ вісіць накуця ейны абраз, святы Мікола, на якога Мацейчыха звычайна кажа: анічога не памагае, толькі вецер у поле заварочвае на пажары. Ці можа ўгледзела ўнучка ў чужым вакне чужога дома, дзе і згода і шчасце, як там правілі службу анёлы? «Чаму да вас аніхто не заходзіцца, не прыязджае ў госці? Чаму ў вас так нявесела? Адна работа, з раніцы да вечара! Усё дзеля ежы, дзеля трыбуха!» – не сціхала.

Гэта кіны загранічныя вінаватыя, хрысціла яе Мацейчыха.

Унукі не прыязджалі, як зракліся. Толькі дурнаваты Баравік ходзіць па полі, па лесе, жаль наганяючы. «Мама! Мама!» – кліча, босы, галодны, у фуфайцы на голае цела, даўно жыве адзін. Тады Мацейчыха састроіць стол, пойдзе на могілкі запрасіць матку ў госці, каб тая паспрыяла, бо нешта благое ўбралася ў ейную сям'ю – згубілі пуцінку ў вёску ейныя ўнукі. Старэйшы, самы дарагі, ён з ейных любых рук есці браў, не тое што ўнучка, а дала была тварагу з місы пакаштаваць, свежага, пахнючага, дык збрыдзіўся, сам адкалупнуў сабе ў рот. Яна яшчэ памятае матчын парадак, вывурыць смецце з хаты хоць на той час, запаліць свечку, адчыніць нябожчыцы дзверы, запрашаючы да стала. Белая котка ўскочыць праз парог, а маці можа і не адважыцца, не пазнаўшы сваю хату: усё куплёнае, усё крамнае – чужое.

Рушнічкі мае бялявыя,
Ці мне вамі кусты накрываць.
Брусы мае шаўковыя,
Ці мне вамі межы засцілаць.

Цяпер Мацейчыха завязвае хустку цёмную, кашміроўку, бы сапраўды з кірмашу прыехаўшы ходзіць, і не пераапрануўшыся. Ужо яна тую хустку харошую адшкадавала сабе на будзен дзень. А то ж паказвала неяк, хвалілася, цэлы стос новых, зляжалых у шафе на паперыну, не чапала. Нешта ўсё яна ззаду і ззаду за мужыком апошнім часам.

— Я ўжо гэтак хаджу... — адкажа, як заўсёды смеючыся і з мяне, і з сябе. — Нябойсь, зараз абое не паміраюць, нехта адзін ды застанецца на хазяйстве! Толькі мне каб адразу памерці, у мяне мужнасці не хопіць доўга смерці чакаць, як тая Барбара. Мне дарала б увечары легчы спаць здаровай, а ўранні адысці. І каб у рай трапіць, па садзе хадзіць і ягады з куста есці!

А што, каб запытаўся, хіба ў раі не надакучыць без работы?

Пэўна і Мацейчыха загадае шараваць вялікага сагана ў спадчыну... Во той канец у скрыпаным суровым матку, што ўскінула мне на вочы Барбара.

Так жа няма часу марудзіць — вёска варажыла на благое. Прылятала на панадворак да Барбары скапа з лесу, забіла чорную курыцу, хацела панесці, не падняла, цяжкая курыца, асенняя. Скапа асцярожная, дзікая, перагаворваліся бабы, і каб так адважыцца, бы на пусты двор на зжытае месца.

— Вароны абступілі, як на могілках усё роўна! ужо я вазьму ружжо з шафы, пярну дык пярну, жывая не застанецца! — мацюкаецца на ўсю вуліцу Мацейка.

Круць — і ён у дзверы да Барбары. Мутныя люстэркі, пройдзеш побач — адбітак калыхнецца, як у стаячай вадзе. Мыша выбегла на сярэдзіну хаты і сядзіць сабе, пэўна, вечаруе разам з гаспадыняй.

— Была памерла і... аджыла, — цешыцца Барбара. — Харошы ясны дзень, то і стол бачу, і печ, сяджу, душкуюся. Весялей, калі ўключу тэлевізар. З пяток хвілін рамка відаць, а потым... свіран, платы, сабакі брэшуць... адно і тое выдаецца. Сяджу, не баюся — усё яно маё ўваччу, тое што трэба. Бывае выдасца — нешта вісіць перада мной, рукой завяду — нічога няма. Мацейка

быў зайшоўся, ведае, што я баюся грому, дык жартам як стукне па стале! – а ў мяне са страху цюкі саломы загарэліся сінім агнём, напужаў стары дурань. Як у сваёй хаце, то прывычная, а на вуліцы... Дарогі не бачу, яна мне не запамінаецца, як сцежка па жыце ўсё роўна, якую вецер ззаду за табой раўнуе, заварочвае след...

На адно лета такая сцежка кладзецца. Можа б і болей выходзіла на вуліцу, але яна не ведае, ці чыстую хустку завязала, ці тую спадніцу ўскінула. Сядзіць у хаце, як звон, згубіла, кажа, зіму і лета. Устанеш з лавы ісці дамоў, яна крыкне раптам, бы на дзяцей: пасядзіце! І кулачок са злосці прыцісне да сябе, маўляў, многа гаворкі мае, пасядзіце! Спынішся, як бы не спяшаўся, яна ўжо мела над табой тую ўладу, калі чалавек на апошняй гадзіне, яна ўжо быццам вымерыла і сваю адлегласць, і тваю. Як гэта, маўляў, часу няма пасядзець, раней такога не гаварылі! Цяперашнія людзі?! Ці чулі вы, каб чалавек сказаў, што ўсім задаволены? То яму трэба дзіван новы – бядуе, то машына даражэйшая, каб усё было што ў суседа! І Богу ніколі не падзякуе. Жызня, кажа, перайшла, адымі ў людзей работу, у іх і рукі адымуцца, нічога цяперашнія людзі не ўмеюць рабіць: ані прасці, ані ткаць, бо авечкі даўно звялі за калгасам, лён не сеюць, усё ўменне звялося. За работу, маўляў, трудадзень брыгадзір ставіў, за ступы, цэбры, вышыванкі пенсіі не далі б. І мода сышла на свойскае ўбранне, як зарвала. На ейнай памяці сцягваліся з ложка даматканыя посцілкі, макаткі са сцяны, выцінанкі, карункі, толькі каб куплёнае ў хаце. Гэта ўжо гонар, што гаспадыня грошы мае, можа купіць крамнае. І песень цяпер няма дзе ўзяць, не збіраюцца людзі ў бяседу, каб пагаварыць, паспяваць, патанчыць, як звязаныя, – усё ў тэлевізары перагаворана і перапета. Валя, кажаш, спявае? Яна наезджая, са свету, яна тут, у Каплічах, не радзілася, якія там ейныя песні!.. Сама Барбара нарэшце абдумалася, ды голас згубіла. Цяпер, кажа, жызню можна направіць толькі горам. Якім горам?! Вайной, адказвае...

Святло не палім, я амаль не бачу ў цемры Барбару, не бачу хату, бы сяджу на свежым пакінутым месцы, на халодным падмурку. Бо маю свой, паточаны часам камень, ён мне парогам, аб які ўсё жыццё спатыкаюся, – парогам разбуранага дому маіх бацькоў. І дзе б ні была ў свеце, іду найперш да

скляпенняў, руін, падмуркаў — я плакальніца па кожным... Няўжо маё племя ўсё запамятавала, не можа сабе рады даць і чакае ачышчэння знішчальным агнём?!

Святы Мікола, злітуйся, павярні вецер у поле...

— От буду паміна-а-аць, такая сёлета цёплая восень стаіць! Камары, чую, мак таўкуць, цёпла, травіца зялёная, на такую зялёную траву снег доўга не кладзецца... Каторую гэта сотню жывём?.. — ці то пытаецца мне ўслед, ці то разважае сама сабе.

Пах лісця, зямлі, бы пах бармы, што пастыр скінуў з плячэй на ганак, вярнуўшыся з пашы.

Цяпер толькі кожную раніцу паглядаю ў вакно, якраз насупраць ейная хата, пільную, як зязюльку ў гадзінніку.

Бачу: адчыненыя дзверы — раптам ёй блага зрабілася? Зайшлася ў хату. Барбара ляжыць на ложку, спіць, ну і няхай сабе. Пабыўшы, кажу ёй, што заходзілася.

— Не, я не спала... цябе бачыла, думала, што здань выдаецца ў пацёмках... І не азвалася...

Бачу, выйшла, узяла ля вушака вялікі кій, бы ў вялікую дарогу, ходзіць па садзе, па панадворку, туды-сюды, туды-сюды, як на раз'ездзе, ужо яна тутака доўга не затрымаецца, пужаюся сваёй згадкі, ужо яна *пойдзе*. А то раптам тыпае па памяці, забыўшыся на апірышча, зямля яе адцягвае. Ніколі не лічыла, колькі на тым ганку сходак, і цяпер палічыўшы, боўтне праз прыступку і зноў лічыць. Тарчыць свежы клок ваты ў фуфайцы з падранага пляча, бы яе птушкі на гняздо цягаюць.

— А кы-ы-ыш! А кы-ы-ыш! — ганяе і ганяе куры з агарода.

І вясну ганяла, і лета, і восень. Мацейчыха сабе крычыць, Каплічы разлягаюцца ад плоту да плоту, быццам тыя куры з неба прылятаюць, нябеснымі птушкамі, ім, маўляў, і рады не дасі. Не, каб адзін раз зсачыць, знайсці дзірку ў плоце і забіць назаўсёды, хоць перад смерцю, даруй Божа граху.

На вачах асядае хата, развалілася веранда. Зяці прыедуць, ходзяць, не зважаючы, маўляў, пакуль матка жывая, сякеру ў рукі не возьмуць, бо ёй усё роўна не патрапіш. Дык што гэта, яны чакаць яе будуць? Гэта ж не па часах, што адбыў пэўны тэрмін, як на працы, і ПАЙШОЎ. Колькі таго часу спатрэбіцца? Ці ўкладзецца каторы, даруй Божа, у сваё жыццё?

Вось, бачу, хадзіла па дровы печ цепліць, ад дрывотні праз увесь панадворак нясе перад сабой бярэмя вышэй галавы, бы

з лесу, бы выпадкова на іх натрапіўшы, – тут і відушчы дарогі не згледзіць. Штодня так. Не каб загадзя кош сплесці дзеля такой патрэбы. Посцілку з травой узаплечкі, карак мокры, зручныя дзедавы рэзгіні ўбок, бо ў іх меней травы лезе. Не разлічаны ўклад на доўгае жыццё, на старасць. Лапнула адну кансерваваную банку, другую, нешта з іх перасыпае, перакладае, і ў руку няма чаго свойскага ўзяць. Скрозь пустыя банкі з-пад кансерваў пад нагамі, быццам пасля адліву, прыгнаныя сюды, на вясковы панадворак, хвалямі гарадской цывілізацыі. Жывем не прызвычаіўшыся, бы дзеці, якія гуляюць у Дом. Анічога анідзе не пазначана, што тут даўней таксама людзі жылі. Няма той раніцы, не памятаецца, каб гэта ўстаў, а дзень ужо быццам складзены перад табой, дабультова, старанна, з веку ў век ён абстаўляўся знакамі побыту, знакамі ладу, строю, густу, – знакамі любові. Каб стаялі буднія дні ў чарзе, пільнуючыся свята. Нарэшце карціць некуды бегчы, кідаць адну работу, хапацца за другую, спяшаешся, бы жывеш адным днём, часова – вехаць саломы ўваччу загараецца. І пасля цябе самога нічога не застанецца, адныя кансерваваныя банкі.

Праўда, чорны саган, неўмірушчы, па-ранейшаму ляжыць на панадворку.

– Калі часнык будзеце садзіць? – пытаюся ў Барбары праз вуліцу.

– Калі?! А пасля цябе – адказвае скоранька, і ўпраўду не ведае, бы першую восень садзіць, і тут у яе не задапаможышся.

Душа толькі ззаду і ззаду ўвесь час, не можа дагнаць чалавека. Недзе ззаду ўвесь час дзеці, унукі, з хатулямі, вандзэлкамі на дарозе паміж вёскай і горадам, нічым не захінёныя, не абароненыя – ні звычаямі, ні абычаямі, і з зямлі сілы не бяруць – іх лёгка сурочыць, абы за парог – і мовы сваёй счураюцца.

Дакладаюся, як тая Барбара ці Мацейчыха, дакладаюся, а сама, выдаецца, ніколі не змагу ўзяць пэўную ноту, пакуль не знайду берасцяны рог майго дзеда Віталіка, ён наймаўся па вёсках на ўсё лета за пастыра.

Гэта не дудка, не ражок і не свісцёлка з кішэні. Рог абапіраўся раструбай у зямлю, голас арганічны, вантробны, бы каровы, склаўшы галовы, вядуць яго ад самага пачатку існавання, ад самага, як дзед казаў, капыта, – клічуць тую да сябе,

што згубілася ў лесе. І яна нарэшце выходзіць на голас, ківаючыся ўбакі, як пад музыку, не спяшаецца, раз-пораз рыкаючы ў адказ. І дзве і тры адлучацца, іхнае шэсце з лесу праз кустоўе, равы – напрасткі, бы па рачной плыні, бы яны нарэшце знайшлі выратавальны брод, плыткае месца, лыткі толькі ў малацэ. Упэўніўшыся, што вяроўка бытта ўжо закінута на рогі, дзед Віталік мяняў голас, далучаў гукі той першай веснавой раніцы, калі сонца іграе на Вялікдзень. Было, што і пастушка згубіцца, натрапіўшы на ягаднае месца...

І цяпер тое, што нацерушылася са жмені, з кішэні дзіравай ці згубілася, па-птушынаму знайсці і нацешыцца, бо найсмачнейшым наедкам было дастаць увечары з дзедавай торбы скачаныя ў махорку, у шылавінне яловае, кавалкі хлеба, сыру, какорку, тое што пакладзена было з раніцы гаспадыняй (чыя чарга карміць пастыра) і за дзень не спажыта – сваёй каровы ў Віталіка не было... Не спагнаць у радні нікому ўжо не патрэбную музыку, не дапільнаваліся, зшарылася недзе на гарышчы.

І сама я без яе губляюся іншы раз у горадзе, як тая пастушка...

ПАЯДЫНАК

Ластаўка памачыла скрылле
ў пахмурныя кругі па той бок свету...
Вірджынія Вульф

«Святочны кісель – гэта толькі першы цэд, і гарнушак каб быў новы», – павучае баба Міхаліна наезджую маладзіцу. І сама, як Бедная куцця, нешта прасявае на ганку, перабірае вузельчыкі, папсаваныя мышой. «Як сена, то і хмара!» – рупіцца з сынам на сенакос. «Лета прыйшло. Цалны дзень ідзеш і ідзеш, як вада ў рацэ. Калі доўга сплю, то выдаецца, што ў гасцёх заначавала...» – гэта ўжо папрок на мой запознены ранак. Угледзела мяне ў саде з кніжкай: «Ад аднаго класа можна пісаць умець!» – крыкнула праз плот. Але ж і праўда, калі паслухаць ейную гаворку. Іншы раз выдаецца, каб не Міхаліна, зялёнай

яшчаркай на камяні будзеш сядзець, пільнавацца цяпла, Лета, толькі па чырвоным лісці з асіны пазнаеш, што Восень ідзе — яна планавала «і свёнткі, і пёнткі», і пагоду, і пару году.

Баба Міхаліна жыве насупраць, хаця, як мяне паслухаць, дык выходзіць: уся вёска Душкава стаіць напроці. Ходзячы па сваім доме, каля вакна, дзе відаецца ейная сяліба, кожан раз зірнеш у той бок, бы цесна размінаючыся з самой гаспадыняй, з году ў год, з дня ў дзень — у тым самым месцы: а ці гарыць вакно: а ці ўстала? а куды гэта яна пайшла? па што? у чым? што робіць? Паварочваюся часцей няўцямна, механічна, у мяне ўжо скрыўлены пазваночнік у ейны бок, як у таго дрэва ў лясным гушчары, — выцінаецца, абмінаючы іншых, каб убачыць, ці высока сонца.

Апошнім разам, як прыехаўшы былі да яе сын з нявесткай, памру і памру, казала. Хацелася, каб нехта вяртаў ейныя думкі, пярэчыў, ужаліўшыся, але ўсе маўчалі, як не чулі, ці шуткавалі з яе, што горай за ўсё.

Злягла баба Міхаліна раптоўна. Заходзіліся суседкі, пыталіся: што гэта, да чаго баба ў падушкі ўвалілася?! Паляжу крыху, тлумачыла, а потым, як птушка: тая сядзіць, сядзіць, — пырх! і паляцела! І ў чалавека, маўляў, бывае такі час. Сама загадала свацці роднага брата пазваць з далёкай вёскі, адкуль была браная. Свацця злавалася: вясна сама ў пару ўвайшла, работы дачорта, пільніца, а гэта ж стары чалавек, яго трэба і прывезці і адвезці, дзе час браць на тое? Вось уляглася бабка і выбрыквае, нашто ён тутака? Міхаліна сціснула кулачок, стукнула па падушцы: «Гэта ж мой родны браток!» — крыкнула.

Пабыўшы, усе зразумелі, што захварэла Міхаліна з дасады і што анікога блізкага ў яе не было, акрамя таго братка. А блізкі чалавек перад смерцю тое самае, што і бацюшка, абы было з кім шчыра пагаварыць, каб Бог бачыў.

Каму катораму скажаш праўду: сыну? нявестцы? унукам?

Бывала, едзе сын з бацькам (той яшчэ быў жывы) з лесу — высякалі атожылле каля маладых елак — едуць павольна, сядзяць на возе, як у хаце на лаве, адпачываюць. Здаволіўшыся лесам, гаворкай паміж сабой, едуць, як з вялікай бяседы. Самі ў зялёным, бы хмелем абвітыя, глядзяць па баках зялёнымі праз цалны дзянёк у лесе вачыма, чыста лесавікі — далучаюцца да людзей... Мужыка прыдушыла дрэвам у буру. Сын

толькі скочыў з павозкі — і ў горад. Ажаніўся быццам нядаўна, а развёўся даўно — не да пары сабе ўзяў, б'е жонку, як нап'ецца. Жонка шалапайная, бадзялая, з Расіі, з дзецьмі ўзяў, як качку дзікую з качанятамі прынёс з балота. І не тое што б'е, а быццам увесь час адбіваецца ад яе, адбіваецца жорстка, дзіка — бароніцца. У груду склаўся быў. Але ўжо і сваё атожылле пайшло. Сын ейны, лічыла Міхаліна, лятучы, баялася яго затрымліваць з жаніцьбай, разап'ецца, разгуляецца, бо прыгожы. У нашым родзе, наказала, адзін раз кавалак адразаюць, давіся, але еш усю жызню, баялася разводу. Што з яго хацець — бацька саламяны, а дзіця залатое? Сын рос на расколінах, бо з мужыком блага жыла, і ў агародзе начавала, і ў садзе, каб ён хоць па п'янцы памыліўся ды сказаў да яе ласкавае слова.

Міхаліна са сваёй бядой на вёску не выходзіла, маўляў, суседзі, яны і сляпому пальцамі вочы сколюць. «Што ты ўсё пазычаеш, ты ж не гарэла?» — скажа ёй з папрокам каторая баба. Людзі мілыя, печ паліцца, а ў печы анічога! Перада мной не хавалася, я ёй чалавек з чужой невядомай стараны, нідзе мы з ёй не сустракаемся, а ні на жніве, а ні на касьбе, гэта тое самае, што ў цягніку едучы разгаварыцца з незнаёмцам. Я магла толькі слухаць яе, патрапляць, не беручы на свой голас ейны лёс, бо ў маім голасе не было той даўкай хрыпаты, якая нажываецца, ідучы за канём, шукаючы п'янага мужа па лесе, пільнуючыся цельнай каровы праз ноч, і Божа мой, чаго толькі напроці яе не паспытанага! я стаяла звычайна перад ёй калком, ні галля на мне, ні ліста: хаця б не парушыць ейную ці то гаворку, ці то песню.

А раніцай, узышоўшы ў лесе на паваленае бурай свежае дрэва, пацяжэе на момант, бы возьмеш на грудзі свежы сырэц, не паспеўшы адскочыцца — Міхалініны прывіды ценем ходзяць ззаду.

З сынам — не! Тады, можа, з унукам пагаварыць? Усе яны ў яе нейкія непаравыя, лічыць. Прыехаў быў у вёску з сябрамі провады ў армію сабе рабіць, ну добра. І хаты не падмёў, нікога з радні не пазваў, сабраў торбу — і ў лес, на шашлыкі. Што гэта за мода? Яна баба, яшчэ жывая, каб хоць дзеля яе туліліся, гэта ж ейнага роднага брацейкі дзяцей не паклікаў! Яна ж яшчэ жывая, крычала! Калі яны паспелі забыцца, згубіць раство, калі яна яшчэ на свеце пазначана? Пазначана, хто чый, хто

каму, катораму даводзіцца! Тады Міхаліна сазвала каго з вёскі на скорую руку, вынеслі сталы, селі ў садзе. Добра, што цёпла было, што пагода, што пакошана. А каб дождж? Да Бога з хаты пайшлі, у сад, па сённяшні дзень печ не беленая стаіць.

З унучкай? Спыніла была яе, згледзеўшы дзірку на гетрах, тая ўзяла іголку, зашывае на сабе. «Вазьмі што-небудзь у рот, каб розум не зашыць!» «А палец можна ўзяць?» — адказала сабе смеючыся, і ўвесь час так сколваецца.

Пра нявестку і гаворкі не мае.

Вот пабачыце вы яе цяпер у сваім Мінску, яна не паедзе болей туды зімаваць! Нявестка не разумее ейнай мовы, па дзесяць разоў наўмысна перапытвае. А калі пачуе, што сын з ёй гаворыць па-беларуску, баіцца, каб суседзі не чулі, ганьбы ёй не далі. Гэта не мова, кажа, а замова, сурокі, наветы, — ёй шкодзіць, і дзеці чуюць, нячыста па-расейску сталі гаварыць. Хоць ты ёй парай прыполам кашулі твар абцерці, наслухаўшыся свекрыві. Вось твая міска, вось твая лыжка, і не паблытай, адсадзіла яе нявестка ад стала, карміла асобна, як прыхадзягу якога, з вуліцы, са свету, — з невядомага ёй варожага свету. Тады Міхаліна, застаўшыся адна ў кватэры, узяла свой кій, вымерала ім шафу, потым дзверы, маўляў, як гэта яе будуць выносіць у труне, ці размінуцца? Але ж во нядаўна, распавядала мне, ужо лежачы ў ложку, чалавека хавалі, неяк жа вынеслі.

Баба Міхаліна ўвесь час то ззаду, то збоку, толькі языком прыцісне, войкнуўшы, калі я рассыплю ў лесе назбіраныя чарніцы, упушчу з рук соль, печ падцеплю позна. Азірнуся — анідзе анікога. Будзе вадзіць па сваіх сцежках, ніколі не возьме за руку, каб абвесці нячыстае месца, каб не трапіць у смутную гадзіну. Сустрэнешся іншы раз раніцай, прывітаешся, а яна змаўчыць, ага, здагадаешся, на дождж збіраецца, як той казаў, а мне хмара на ейнае вока, бы на ўсё неба. Прынясеш гасцінца, і дзякуй не скажа, «няхай сабе будзе...», прамовіць абыякава. Яе лічылі ў вёсцы і хітрай, і натурыстай, і зайздроснай... і ішлі да яе, як ні да кога болей, проста пагаварыць.

Так ідуць да вады.

Ехала здалёк жонка нейкага сваяка па мужы, далёкая пляменніца з дзіцём, яшчэ нехта з радні, ледзь апазнаны. Міхаліна кідала работу, садзілася, размаўляла. Абы сышлася з кім у вёсцы, дзе яна апынулася, менавіта тут і ў гэтую

хвіліну і нараджаецца ейная мова, б'е, іграе, вызваленая з-пад здзічэлага дзірвана маўчання, зацятай адзіноты. Словы знакамі прыналежнасці адзін аднаму, з кім бы ні сышлася, нейкая амаль метафізічная з'еднасць. А паслухаць збоку... гаворка іншы раз проста пра надвор'е.

Узыдзеш іншы раз якраз на той момант, калі яна адпраўляе нявестку ў горад, складае сумку. На стале ляжыць сыр, непамерна вялікі, шэры, крохкі, посны, крыху адхілены ражок марлёўкі:

— Тварог у адзін дзень, дальбог! Смятану зняла? Не, без смятаны малако і не кісне! Во які ён, што ўшыркі, што ўдоўжкі!

І над тым сырам крыжам, прастае яго, потым прыпадымае, як дзіцянё, падтрымліваючы абедзвюма рукамі, каб не зламаць пасярэдзіне.

Я амаль паўтараю за ёй, уводзячы ў вушы нявестцы, цешуся і са слоў ейных і рухаў, добра ведаючы, што Міхаліна сама ніколі лепшага не з'ела і не бачыла. Нявестка глядзіць на мяне, не разумеючы, доўга, стомлена, потым засмяецца, квола, нязвыкла, — твар бы засланы плачам.

Мяне адкідвала ейная стыхія бязвіннай сквапнасці, цемнашарнасць, я падымалася і зноў ішла да яе — пагаварыць. Яна сама і замаўляла мяне гаворкамі ад сваіх крыўдаў. Суразмернасць быцця закалыхвала, здаецца, ляжыш у драўляных ночвах замест калыскі, як немаўля, недзе на пачатку стагоддзяў, — і гаварыць яшчэ не ўмееш.

Нарэшце прыехаў браток. Каня не наважваў, вялізную барму скінуў з сябе проста на дарозе, ускалыхнуўшы панадворак аж да самай Міхаліны духам накшых мясцін, накшых дажджоў, снягоў, пасюкаў, не захінаючыся, зняў таўстую торбу, і ў хату. Скора і выйшаў, стаяў, лапаў па кішэнях, шукаючы курава, азіраўся, на сходках зачапіўся за вядро, яно пакацілася, адазваўшыся бубнам. Падняўся ў стрэме лёгка, конь скрануўся адразу, чалавек падаўся ўсім целам наперад, умомант зросшыся з сядлом, з канём, бы і не злазіў, а толькі во праехаў каля хаты. Паехаў ганец, павёз вестку на Міхалініну родзінку, вестку зямлі, вадзе, людзям, што яна памірае.

Дарога ягоная з пагорка на пагорак, лесам, полем разгортвалася тугім скруткам, у якім на старасвецкай мове сувязей паведамлялася: хто нарадзіўся, хто ажаніўся, хто і памёр.

А назаўтра што дык падалося: праехаў на кані каля Міхаліны чалавек. Ні капытоў не было чуваць, ні склыгання калёс, сам у зялёным, сядзеў нерухома пасярэдзіне вазка. Каля веснічак адсунуўся на край, аслабаняючы некаму месца, быццам па-змоўніцку выкрадаючы некага з хаты. Я пазнала Міхалінінага мужыка, якога ніколі не бачыла.

І сама падалася на панадворак з тым дзявочым спрытам, з тым забытым маладым жаданнем, калі была яшчэ дзяўчынёхай: выйсці замуж за лесніка, мець многа дзяцей і каня.

Пасля ад'езду братка ўсё як адмянілася. Цвіў бабін стары сад, да зямлі галлём. Зірнеш выпадкова, квецень на момант пахінецца ад погляду, як ад ветру белы дым, і спыніцца, варта толькі ўсвядоміць тое, што ўбачыў — усё навокал мяне ўжо цяперака на мяжы рэчаіснасці.

— У цябе быў дождж? — пытаецца сусед праз вуліцу. — Праўда быў? А ў нас не!

Перагаворваліся ў вёсцы пра тое, пра сёе, а трывога анікога ўжо не пакідала. Бы ўвесь час ходзіш па бабіным садзе да ракі, у лазню, ці ў лес, а браток той, ад'ехаўшы, павесіў касу на сук якраз над сцежкай, высока, стромка над галавой вісіць, як варожыць на твой лёс.

Хаця з касой смерць прыходзіць, пэўна, толькі на вайне, здымаючы маладыя галовы. Да старых яна ідзе, украдаючыся, укладаецца побач, жаліцца, што змерзла, хукае ў твар марозівам, нясуць ёй другую падушку, трэцюю, яшчэ коўдру, і варта сашчапіць рукі, каб паспавядацца блізкаму чалавеку ці памаліцца, мацуе іх абручом навечна. Што яна гаворыць? да каго? накрыць яшчэ? холадна? горача? піць? — перапытваюцца, наведваючы Міхаліну.

Мова знікала.

— Дзе спадніца зялёная? — запыталася раптам.

— Нашто яна табе?

— Найдзіце мне яе...

— Ці ты, памёршы, сама будзеш апранацца... знойдзем, знойдзем... парой яшчэ...

І быццам аніякіх знешніх знакаў урачыстасці прыходу смерці: ну памірае стары чалавек, дык жа ўсе там будзем, ніхто не ўратуецца.

Як раптам адчуваеш, што гэтая ўрачыстасць займаецца ўнутры цябе самога. Пасля прыезду братка пачалася, ішла быццам служба, кожны спавядаўся адзін аднаму. «Жывеш во... жывеш...» — паківае галавой сусед, вяртаючы нарэшце даўгі доўг. «А-я-яй, во як...» — адгукнецца ўголас сваім думкам суседка. З мяне здымаўся цяжкі покрыў крыўды: я павінна адпусціць віну сваім вінавайцам, падумалася. Ішоў час, людзі пыталіся пра Міхаліну адзін у аднаго, пальцам у той бок, вокам на ейну хату — пільнавала вёска тую хвіліну, каб нарэшце загаварыць, зажаліцца, уплакацца, бо жалю таго ўжо сабралася поўна, як вочка. Дзе б хто ні быў — у полі, у лесе — што б ні рабіў, мы ўсе былі з Міхалінай у ейнай дарозе: азіраліся вакол сябе, адшуквалі звыклыя рэчы, гукі, размаўлялі з наваколлем на мове развітання, выконвалі тое, што ёй было асабліва пільным. Сын у гарадской чыстай кашулі, — не пераапранаўся, бо трэба быць напагатове — перакідваў дровы ў паветку (гадамі моклі на дажджы), папраўляў плот. Нявестка садзіла капусту, аж тэтар ішоў, бабы наказалі, каб спяшалася: маўляў, калі свекрыва памрэ, нельга нічога садзіць, зямлю турбаваць, трывожыць з малой прычыны — дол будуць капаць.

Не ўсе здагадваліся, што такія старыя, як Міхаліна, гэтак скоранька не адыходзяць.

Якраз субота, цеплілі лазню, вада засталася гарачая, мне наказалі. Быццам і не хадзіла я да іх, а тут пайшла.

Выходзіла з лазні ўжо на змроку. Валасы простыя, змыта гарадская шмінка, гумовікі на босую нагу. Раптам трапляю ў Міхалінін след, спыняюся, не сваімі вачыма аглядаю ўсё навокал, бы першы раз бачу ці апошні. І ўсё каля мяне прыпынілася, нават рака, як на спатканні. «Я за гэты стол замуж ішла...» — узышлі на памяць Міхаліны вершаказы. За гэты лес, за гэты луг, за раку каля ног. Я сама тут адзіны раз належала мужчыну, лесніку, належала да астатку, пакуль з кораня не знялі, як тая вольха каля вады. Адзіны раз, нажыўшыся за ім, п'яніцам, гулякам, адчула, развітваючыся, бы сок бярозавы на вуснах, свае слёзы. Адзіны раз, трапіўшы ў Міхалінін след, я была ў поўнай згодзе з сабой. Стужкамі віліся скрозь галлё яблынь птушыныя дарогі. Зямля ляжала сопкая, лёгкая, бы з млына, — перабраная каранямі, паміж пальцаў перацёртая, цёплая. Малькі ў вадзе срэбнымі аскепкамі, «тут

каля кладкі я свой пярсцёнак упусціла, не знайшла», падказвае Міхаліна. Палова колца месяца зіхацела на самым донцы неба. Сад у белым, мне пасуе белае, я адчувала квецень на сваіх рукавах. Быццам вось-вось увайду ва ўрачыстую залу, і хочацца падняць рукі, апошні раз паправіць валасы перад люстэркам.

Ужо Міхаліна не гаварыла, ветрам адносіла ейны голас, ён то з'яўляўся, то знікаў, як зязюля з далёкага лесу. Палілі свечкі, звалі суседку памаліцца, былі моманты, што яна ўжо адыходзіла – і зноў па што якое вярталася. Якраз унучка была ўзышоўшы з аўтобуса на такі час, спужалася, далася з хаты, як не ў вакно, моцна закрычала. Была ў яе голасе тая нота старадаўняга галашэння, якой не хапала ў людской памяркоўнасці, у гэтай урачыстай цішы. І цяпер абы-хто моцна загаворыць, курыца, сакочучы, саскочыць з гнязда, нават голас пчалы, любы гук уплятаўся, доўжыў голас унучкі. Ці раптам дзеці закрычаць, гуляючы на вуліцы, іхныя дуроныя выкрыкі трывожылі найболей – ляціш да вакна, – пэўна, нашыя галасы ў адчаі падобныя да дзіцячых.

Чаканне галашэння. Мы ўсе ўжо былі запрошаны і быццам стаялі каля Міхалініных веснічак, быццам увесь час марудна падымаліся па сходках на ганак да яе.

І дровы былі спарадкаваны, і капуста пасаджана, падганялі работу і гэтым самым (аніяк не вымавіць) марудную Міхалініну смерць. Бо няма каму заставацца з маткай, трэба вяртацца ў горад на працу. Вось ужо нехта і засмяяўся на панадворку – урачыстасць, жалоба, споведзь маюць свае тэрміны – дух трэба перавесці, дух трэба змяніць, хоць ты юшку ў печы адчыняй.

Дзверы ў сенях былі ўвесь час расчыненыя, а то раптам нехта павольна, баючыся, каб не ляснуць, быццам пацягнуў за клямку, прычыніў, не прыціскаючы. Сын з нявесткай збянтэжана пераглянуліся: у хаце анікога, акрамя Міхаліны, і тая два тыдні не ўстае з ложка, пайшлі паглядзець.

Праз некалькі хвілін сын выйшаў, прыхінуўся шчакой да вушака, – хата была яшчэ цёплая.

Вось і лаву з лазні панеслі, тую, з якой я нядаўна злезла. Лава доўгая, шырокая, неслі па вузкай сцежцы, удвох, за два канцы, лава плыла, пагойдваючыся, праз белы сад, праз белы

свет, як на хвалях, ад аднаго берага да другога. Няўжо мыць нябожчыцу?! З маіх вачэй пасыпаўся чорны начны морак. Кінулася да шафы, перакідвала й перакідвала адзежу, аніяк не магла ўзбіцца на патрэбнае для такой цёмнай гадзіны, і ў Міхаліны ўжо не папытаешся. Станчэлі, сышлі мае быццам крэўныя сувязі са светам, сцялася вусце і майго жыцця, мяне, як атожылку, перасяклі лапатай, пакінулі на сваім слабым карані – слабка да ванітаў.

Ляцеў бусел над хатай, упусціў з дзюбы жабу на мой панадворак – і пачалося! Расхінуліся лясы, пагоркі – пустое голае месца пасля Міхаліны, выкачанае бязладдзем, сурочанае чужой мовай, я, казаў ейны сын, толькі з маткай размаўляю па-беларуску. «Смутку й смутку паляны». Маё гняздо побач з гнёздамі бусла, драздоў, каменнымі пакоямі жабаў, скляпеннямі кратоў, але я не ведаю іхняй мовы, як Міхаліна. Голас нейкай птушкі падаўся надзіва зычным, бы ў вялікім пустым доме: перад тым як зачыніць дзверы на замок, адыходзячы апошнім, нехта перапытваў, ці не застаўся тут хто выпадкова.

Хацелася аберуч перанесці сваё гняздо да маладога саду, але хіба ёсць такая зямля, дзе старыя людзі не паміраюць?

З раніцы пад'язджалі фурманкі, адна, другая, трэцяя, спынялі коней, не распрагаючы, ішлі ў хату, быццам трэба было ўпэўніцца, запытацца: ці праўда, а можа, яшчэ... а ці ў гэтай хаце яна, бо ўсё адмянілася навокал. Сонца стаяла, як зачыненае ў памяшканні, ніхто па ім свой час не вызначаў. Ішлі старыя бабы, крок размашысты, рашучы, кій натапураны, хусткі на чорнае не перавязаны, – няма калі жалобу насіць, яны і самі незадалёка ад Міхаліны, ад ейнай пары, толькі што во на сваіх нагах яшчэ пакуль. Круга па панадворку, асядалі на лаўцы пад вокнамі адпачыць, – ціхай хадой, нізкай зграяй. Падымаліся па сходках, пакінуўшы кій ля дзвярэй, зноў вярталіся халадацца, крокі за кожным разам усё цяжэйшыя, бы яны ідуць па гэтых Міхаліных сходках без перадыху цалны дзень. Вышэй і вышэй тыя чатыры незлічоныя.

Ужо быццам і пара труну прывезці, але сыну доўга не ўдавалася аформіць патрэбныя дзеля такой прычыны паперы. Нарэшце-такі даміна была прывезена, ды запазніўся бацюшка. Мужыкі выходзілі ў сад, лапалі па кішэнях, шукалі курава. Бабы некаторыя пайшлі дамоў, хату паглядзець – скрозь

у вёсцы алканаўты, каб не сцягнулі што добрае, дапільнаваўшыся. А мне выдавалася, Міхаліна сама запыняе і сына, і бацюшку, бавіцца, бо не з усім развіталася, не пра ўсё наказала. Я падрабіўшыся, памкнулася смецце вынесці, «нічога з хаты не вынось, каб у адну пуціну са мной не трапіць», спыняе мяне голас Міхаліны голасам неспадзяваных грымотаў — першая сёлета навальніца. Дрыготка рэкнулі, застоіўшыся за зіму, шырокія нябесныя вароты, — петлі захраслі, заіржавелі, — павольна расхінаюцца якраз над вёскай, бы перад паркай коней, разложыста, без маланкі і дажджу, з канца ў канец. Цяпер тых коней толькі ў восень распрагуць, паставяць на месца і зачыняць. І ніхто звычайна работы не кіне, ні чалавек, ні птушка на першым разе, толькі ўжо калі загрыміць крыху пабыўшы, — заблішчаць гарачыя падковы, завіхурацца хмары, — пойдуць да хаты, да гнязда, каб зняць адзежыну з плоту, комін засунуць.

Пах свежассечаных елачак на панадворку востра адазваўся водарам нябеснага ядлоўца, дымком свяшчэнных курэнняў.

Змыўся слязой апошні момант, калі нарэшце выносілі з хаты вечка труны, — убачылася тое, што было звычайна. Усе ўжо стаялі на панадворку, даючы дарогу Міхаліне. І яна... выйшла да людзей, з кіем, прыбраўшыся, як звычайна выходзіла да сынавай машыны ці да павозкі брацікa. Падбіраецца, абціскаючы свежыя фальбоны на спадніцы, правярае кішэні ў кофце, маўляў, чаго добрага ізноў на найніцу апранула — завешаныя чорным люстэркі ў хаце, не было куды паглядзецца. Азіраецца круга, усміхаецца, бы яна ўжо ў натоўпе, ужо бачыць у твар тых, да каго ехала, — ад самага парога на людзях.

Ні смутку, ні жалю — яна вернецца...

І пэўна не адной мне выдалася, як Міхаліна ішла ззаду за сваёй труной. Бо на другі дзень нявестка загадала вынесці пасцелю свекрыві і спаліць на скрыжаванні дарог. «Таких людей нужно с бубном хоронить, а не с батюшкой!» — сказала. Ніхто не перапытваў, чаму. Бабы, даведаўшыся, і не здрыгануліся, бы каменныя багавіцы, якім не шкодзіць ні агонь, ні вада. Добра, што хоць столь не загадала ўзарваць, каб свекрыва хутчэй адышла, пагаворвалі, маўляў, такая ўжо нічогая маладзіца, як укінутая ў людзі. І забыліся на тое.

Не перастаю звыкла ўзірацца ў цёмныя вокны – сонца ўсходзіць, сонца заходзіць, мне не хопіць свайго жыцця адвыкнуць.

Ні ценяў, ні зданяў, толькі раз апоўначы ў навальніцу кароткім позіркам бліскавіцы ўбачыш на ганку постаць Міхаліны і не спужаешся. Хата ейная надзіва не агорнута цішай маўчання смерці, хоць і пустуе, яна быццам пакінутая пасля вячэрняй малітвы капліца. Тут маліліся, каб град поля не пабіў, каб немец болей не прыйшоў, каб бура не заспела мужыка ў лесе – абы твар павярнуў да сонца, то і малітва, абы толькі ўдалося сцішыць у душы злосць, гнеў, – гэта ўжо і ёсць сувязь з Богам. Дом – храм Быцця.

Увесь час чую малітоўныя галасы з пустой Міхалінінай хаты і спрабую сама, на клірасе стоячы, ледзь чутна, падводкай: каб град поле не пабіў, каб немец болей не прыйшоў, каб мужыка бура ў лесе не заспела. І каб да самай смерці мову не адняло.

Ні смутку, ні жалю – яна вернецца...

✣ ✣

«ВОСЕНЬ МАЯ ДОЎГАЯ...»

навела

Мы рэдка бачымся, пільнуемся адна адной па тэлефоне.

Калі тэлефануе Н., я бачу, што яна перайшла на кухню, заціснуўшы рукой слухаўку да вуха, скрабе бульбу. Я ня ведаю, колькі той бульбы засталося, колькі часу мне адпушчана – спяшаюся гаварыць. Нешта буднае, нязначнае, і яна таксама. У мяне ад гаворкі поўная паляна шалупіння і дасады. Хаджу потым некаторы час пасля размовы, падхапіўшы падол, ня ведаючы, куды дзець, і заўсёды надзіва ўзбіваюся на кволае ўдзячнае суцяшэнне: табе падалі ў руку са стала, падзяліўшы на вялікую сям'ю, нешта цёплае, свежым пачастункам. У Н. трое малых дзяцей, яна кроіла свой дарагі час на ўсіх.

Тэлефануе Л., з майстэрні, там яна часцяком і начуе, седзячы ў фатэлі напроці пачатага габэлену. Проста явачны званок – Л. ня любіць размаўляць. «Што робіш?» – пытаюся. «Гатую два яйкі на вячэру», – адказвае. «О! у цябе госці?!» – ускрыкваю здзекліва. Абедзве голасна смяёмся, аж посуд адзываецца, бо звычайна яна абыходзіцца адным яйкам. Калісьці, закахаўшыся ў паэта, так і не пайшла замуж, жыве адна. У яе часта збіраліся. Яна ніколі не пераапраналася дзеля гасцей, быццам яшчэ ёй, гаспадыні, самая рупніца. Быццам яшчэ ня ўсе сабраліся. З году ў год адным строем-звычаем, яна прыслухоўвалася да сябе і разумела, што яшчэ ня ейная пара, як дрэва халоднай вясной з запозненым цветам. Падавала на стол, прысядала на тарцы на хвіліну-другую і зноў адлучалася па тое-сёе. У фартуху, як чалядніца, і так і заставалася ў ім да канца. Быццам для яе гасцей і не было зусім анікога, толькі заўсёды дубальтова накрыты стол. Стол чакання. У яе любілі бываць, але ніхто ня здолеў зняць чары вечнага кахання з мастачкі-папялушкі.

«Пакуль. – Пакуль», – на гэтым і скончылася наша тэлефоннае спатканне.

За дзень не нажабрую ўвагі сяброўак, а мне пільна трэба сёння пагаварыць. Нарэшце — Паўліна! Але я з ёй не пра сваё. Сёння свякрыва загадала зняць з ейнага пакою дзверы, каб скрозь усё бачыць, усіх нас дапільнавацца і камандавацца лежачы — яна зламала нагу, шыйку клуба. Дзверы ейныя ў памежных пакоях якраз у нашу спальню. Мы з мужам спрабавалі запярэчыць: «А што, у вас любоў?!» — зырка робіць яна канчатковы прысуд. Мы, як дзеці, хаваем вочы. Муж час ад часу боўтаецца з некім набаку, але вяртаецца, любячы есці з маіх рук. Гатую вячэру, кармлю, выношу судна, папраўляю коўдру (муж ужо спіць) і «сыходжу» з дому — мне патрэбна аддушына.

Паўліна заўсёды ў зоне доступу, я для яе таксама. Мы з ёй размаўляем, як у час коннай прагулкі верхам, у сядле, мяняліся пейзажы, поры году, выраслалі нашыя дзеці, а мы без перамен — гаварылі пра каханне. Яна заўсёды ў белым, я ледзьве паспявала зняць фартух і таксама нядрэнна трымалася ў сядле, нягледзячы на сямейныя мітрэнгі. Бо мы ўсе калісьці былі дзяўчынкамі, чыталі раманы, і, наагул, жаночае сэрца (доказ навукоўцаў) не старэе. Таму жанчыны і жывуць даўжэй. Паўліна заўсёды была ў некага закаханая. Ейны вецер прыносіў мне свежыя навіны з іншых зямель: розныя спа, хітрыкі касметолагаў, моды, і мне гэтага хапала.

Горад спаў. На сваіх «конях» мы ехалі амаль па пустых вуліцах, на святло чырвоных ліхтароў. «А ён? А ты?» — раз-пораз перапытваю аднымі вуснамі. Я не адразу ў цемры разглядзела трэцюю постаць з намі, постаць немаладой, прыгожай жанчыны.

Горад тады яшчэ ня ведаў, што Паўліна закахалася ў мастака. А ён? Яна прачынаецца, адчуўшы, што ён недзе блізка, за секунду да ягонага званка: «Я стаю каля твайго дому, выйдзі». Побач дачка, у суседнім пакоі спіць муж. Яна выходзіць, яе ніхто ня чуе ў сям'і, ніхто ня ведае ва ўсім доме, не пазнае, — гэтая містыка любові. Яны ідуць у майстэрню... ноч кахання... вяртаецца дамоў... яе ніхто не заўважыў, быццам апранута ў нейкае цудатворнае адзенне. І гэтых цудаў нельга пралічыць загадзя, нешта падрыхтаваць.

Прачнуцца, хутка зняць слухаўку, пакуль ніхто не пачуў... Жах! Быццам скрозь сон, скрозь ноч бачыш ягоныя рухі, ягоныя крокі да цябе. Покрыў ночы спадаў, днём сустракацца

было цяжэй. Вось яна ляціць з працы, восьмы паверх, бяз ліфта, божа, як на галготу, думаецца. І кожны раз амаль услых: калі я сустрэну ягоную жонку, я скажу... калі сустрэну мужа... Удзень яна адчувала сябе разведчыцай, ліхадзейкай; у адну хвіліну трэба было пралічыць усе неверагоднасці сустрэчаў. Ён дамалёўвае ейны партрэт. Ягоны позірк, як дотык, ён п'е расу з кожнай ейнай лагчынкі. Нешта гаворыць сам сабе: «Гм... які твар... так... прырода папрацавала...» Спыняўся і проста доўга глядзеў, як на нерухомую скульптуру: «Хачу бясконцага ўзірання, любавання тваім жэстам, сукняй, завушніцай... я ў люстэрку твайго твару...» Ён сваімі вуснамі прамаўляе словы цара Саламона? Гэта ён да яе?! Паўліна здранцвела пакідае фатэль, мармуровы пастамент. Нарэшце, нарэшце чуе тое, чаго даўно ня мае дома.

Заставалася б толькі сказаць мужу, каб па-сяброўску захаваць сям'ю: будзь цяпер да мяне асцярожным, я, маўляў, пакахала.

А муж? О, яна, як кацяня: прылашчыцца, нашкодзіць дома. На першым разе кідалася ставіць агуркі, ягады, усё-ўсё ўзрывалася. І на трэці год кінула, начыста, ніводнага слоіка! Ня ўмела гатаваць суп, разбіраць курыцу. Вучыцца? Вучыцца трэба танцаваць, а гатаваць ежу навучыць жыццё — гэта сямейны афарызм, які перайшоў яшчэ ад бабулі. «У цябе павінна быць дзве дошкі — для мяса і для рыбы, асобна», — патрабаваў муж, заўвага за заўвагай. Што? Дошкі? Такое гаварыць жанчыне нельга. Паўліна адчувала сябе, быццам прастойвае ў цёмным склепе, у запасніку музейным, гадамі, — аніякай увагі. Няўжо яно так і ёсць, як нехта казаў: жанчына замужняя — гэта вялікая дзіра, праз якую працягвае ўся тленнасць сусвету? З гадамі ўсё каменне на іхным сямейным шляху быццам бы ўжо перацерлася ў пыл. Толькі вось гэтыя начныя званкі. І дзённыя, калі падыходзіў да тэлефона муж, ішлі кароткія сігналы. Разбіты посуд, сваркі, разборкі. «Ну хоць маленькая выспа спакою павінна быць дома?!» — патрабаваў муж. «Ты так гаворыш, быццам нашая пасцель яшчэ не астыгла», — адказваю.

«Будзь да мяне асцярожным, я пакахала», — лунала ў доме, як мантра.

Я па-ранейшаму не магла разгледзець трэцюю наезніцу побач з намі. Толькі калі нашыя коні палахліва табуніліся, пераходзячы Свіслач, тады быццам нехта браў іх за аброць і вёў

далей, напрасткі — мы не шукалі броду. Цяпер я і сама ўжо адчувала сябе зданню. Паўліна гаварыла, не звяртаючы ўвагі, слухаючы ці не. Асабліва цяпер, калі яна загаварыла пра Васіліну... сваю маці.

Пра Васіліну хадзілі легенды. Яна запаміналася, варта было ёй адзін раз зайсціся ў булачную. Яна ніколі не была адна, побач заўсёды прыхільнікі прыгажосці: нехта падыходзіў абы запытацца час, нехта азіраўся, нехта саступаў дарогу. Ёй саступаў дарогу ўвесь горад. Калі яна пакахала іншага мужчыну, вядомага архітэктара, усе ім зайздросцілі. А можа так выдавалася толькі Паўліне? Маці вярталася дамоў з ружамі: курорты, чыесці патаемныя лецішчы, патаемныя фотаздымкі і... ружы, нават калі прыходзіла з працы. Жыццё маці супадала з раманамі, якімі зачытвалася дачка. Вось Паўліна заходзіць у ванны пакой, бачыць маці, яна прымае ванну, чытае вершы, услых. Паўліна, вуглаватае дзяўчо, яшчэ такое рабое яечка, разумее: перад ёй жанчына закаханая, і ціхенька выходзіць. Гэтага ніхто ў доме не вымаўляе ўголас, а яна разумее: гэта жыццё любові, і яго трэба ўсім абараняць. Ну ёсць моманты, вядома, ёсць, так... сям'я. А сям'я — гэта проста іхны дом, дзе муж, дзеці. Разумела, як дачка, а дачка заўсёды болей за маці разумела, як дарослая жанчына-зводніца. Або сяброўка-ахоўніца? Толькі аднойчы чула размову бацькоў: «Я ведаў, што твая прыгажосць ня можа належаць мне аднаму». Толькі аднойчы ён сказаў дарослым дачкам: «Ніводная з вас ня стала прыгажэйшай за маці...» Сказаў з такім вось вялікім мужчынскім задавальненнем. Паўліна памятала з дзяцінства і па сённяшні дзень гэтыя воклічы навокал: «О, Васіліна, ты нікольки не змянілася!» Жанчыны зайздросцілі, гаварылі супраць сваёй волі, бы адымаючы нешта прывабнае ад саміх сябе, і не маглі ўтрымацца. Паўліна сама чакала гэтых словаў. Вось дваццаць, трыццаць, сорак, але яна бачыла ў сабе перамены. Яна раўнавала маці да ейнай прыгажосці, да ейнага несканчонага жаночага поспеху.

І цяпер, вяртаючыся з майстэрні, Паўліна адчувала: нарэшце-такі, нарэшце яна стала побач з прыгажуняй маці, у яе таксама раман. Каханне, маўляў, у іх, прыгажунь, не сямейнае.

Так, мы заўсёды былі ўтрох на сваіх праменадах, з намі была Васіліна. І нават тады, калі, заляцеўшы да мяне на кубак кавы, Паўліна метадычна пераабувалася ў вітальні з ботаў

у шпількі, вядома, ня дзеля мяне. А можа і так, ёй быў наканаваны лёс прыгожай жанчыны: патрэба, жаданне падабацца ўвесь час, адлюстроўвацца ў чужых вачох, як у люстэрках.

Мы памянялі сваіх няўрымслівых коней, выязджалі ўсё радзей і радзей, ехалі цішэй, калі... калі Паўліна развялася з мужам, а ейны мастак, рыхтуючыся да выставы, пасадзіў у фатэль сваю жонку, маляваў Мадонну з дзіцём. Паўліна пакутавала, шукала, бачыла ягоныя рысы ў абліччы іншых мужчынаў. «Як ты сябе адчуваеш?» — пытаюся. «А што?» — палохалася яна, перапытваючы, маўляў, хіба яна дрэнна выглядае. У каторы раз памыляючыся, яна цяпер уваходзіла без дазволу ў чужыя сем'і, на кухні. Мужчыны кідалі мыць посуд, спускалі з рук дзяцей, унукаў, ішлі за ёй, неслі падарункі. Яны не валачыліся, не ішлі, а ўрачыста ступалі, я бачыла гэтае шэсце з самага пачатку іхняга шляху і да канца. Рэстарацыі, курорты, чужыя таямнічыя лецішчы і ружы. Але ўсе каханкі любілі есці з рук. Яны захоўвалі памяць пра свой дом і вярталіся да яго.

Касметолагі, розныя спа. Масаж, каб выглядаць хораша, натуральна, дорага. Забарона пытацца ў прыгожай жанчыны, як яна сябе адчувае.

Гэтай ноччу мы выехалі на нашых конях у буру. Раз-пораз ад штуршкоў ветру сігналілі машыны каля пад'езду, надаючы ночы трывожную ўрачыстасць. Вецер зрываўся, падаў на ваду вялікай драпежнай птушкай, хапаў раку, як жывую рыбіну, намагаўся падхапіць, адарваць ад рэчышча і ня мог, яна супраціўлялася, выгінаючыся, асляпляла луской. Ён шпурляў, біў яе аб парапет мосту, аб камяні на беразе, спрабуючы аглушыць.

Паўліна была нечым узрушана, гаварыла збіваючыся. Аказалася, сёння яна наведалася да бацькоў. Вяртаючыся з басейну, яна часта любіла заходзіцца. І на гэты раз, якраз нядзеля. Яшчэ раніца, і сястра з мужам тутака, вырашана было выпіць гарбаты з каньяком. І доўгая-доўгая, як заўсёды, размова, прыемная, сямейная. Нават ня ўспомніш пра што. Быў уключаны тэлевізар. «Во, якраз і Васілінін палюбоўнік тут!» — раптам сказаў бацька, убачыўшы ўсім вядомага архітэктара. Сказаў з такой гулёнай лёгкасцю... Паўліна выпусціла з рук поўны кілішак, быццам зламаліся пальцы, пасыпаліся пярсцёнкі. Палюбоўнік?! Палюбоўніца?! Хіба гэта так называецца?! Схамянуўшыся, усе загаварылі пра тое, што яна, Васіліна, заўсёды наставіць закусі,

няма дзе павярнуцца! А сама Васіліна? Каб табе слова, толькі ейныя вочы... калі яна чаго-небудзь пужаецца, вочы такія ясныя, бліскучыя. І Паўліна заўсёды шкадавала, што гэтага аніхто ня бачыць, што гэта вось-вось зараз і знікне, вось тут, седзячы за сямейным сталом. (З архітэктарам яна ўжо не сустракалася.) А бацька? Магла зваліцца і хрусталёвая люстра над сталом, посуд у буфеце — далоў! Увесь сямейны ўклад зрушыўся б, ператварыўся б у друз — брудным, надакучлівым бытам, каб гэтае слова было перамоўлена Васіліне раней. Толькі аднойчы дзеці чулі ад яго, выпадкова: «Я ня бачу цябе, Васіліна, за тваімі выхілкамі, як за густым лесам...» Толькі аднойчы. Ён не даваў ёй ганьбы, не дапускаў бязладдзя, каб захаваць сям'ю.

Сёння Паўліна за гэтай бацькавай быццам бы лёгкасцю адчула ўвесь цяжар.

На раніцу рака амаль ня рухалася, плынь ледзь заўважная, бліскі лускі дробнымі грабеньчыкамі, адпачывала. Вецер не асвежаваў яе-такі, не далася.

Мы сазвоньваліся ўсё радзей. Аднойчы Паўліна захацела наведацца. Якраз мая сям'я сабралася палуднаваць.

— Я на дыеце, прыеду крыху пазней, на гарбату, — папярэдзіла.

Я сумелася, у нас будзе мала часу:

— Я змагу з табой пагаварыць толькі за сталом. Сын падкінуў хворую ўнучку... і захварэў мой гулёны муж. Так што не гатую нічога скаромнага.

Паўліна доўга маўчала, а потым:

— Мне сніцца... я вярнулася дамоў, вярнулася такая вінаватая, а мне... зварылі кашы-аўсянкі... Ведаеш, каханне — гэта вялікае прабачэнне... я ўжо гатовая да такога во, як у цябе, паўсядзённага хлеба любові.

І не наведалася. Мы амаль згубіліся. Нашыя коні марнаваліся ў стайні. Час ад часу, калі засынае мая сям'я, іду на кухню. Стаўлю касету з запісам «Ліцвінаў». Запявае жанчына, голас пускае шырока, нязмушана, ёй заспяваць, як выгаварыцца. Яна на волі, на людзёх, увесь час на вачох жыве, на людзёх і ейная любоў, і дружба, і ейная прыгажосць.

Восень мая доўгая,
Доля мая горкая...

І раптам да яе далучаецца падгалосак, неяк бы здалёк, ледзьве быццам адважыўшыся далучыцца.

З кім я буду жыта жаць,
З кім вячэру вячэраць...

Падгалосак фонам. Выдаецца, сядзіць у бяседзе недзе з краю, жыве незаўважана, яна глядачка, яна заўсёды наводдаль ад усялякай палкасці, размоваў, плётак, — то лесам, то полем. Голас стрыманы, не распеты, сама знерухомеўшы. Спрабуе тураваць, неспадзявана для самой сябе падхоплівае песню, падхоплівае, бы вянчальны букет, кінуты нявестай у натоўп дзяўчат. Дзівячыся, трымае яго ў руках, і ўсе таксама дзівяцца, бо няма ёй за каго ісці.

А я сяду ўскрай стала,
Павячэраю сама.

Ужо іхныя галасы пераклічкай. І ледзьве ўчуеш яшчэ адзін, мужчынскі, быццам і не па сваёй ахвоце далучаны, а зведзены жалем. Хаця заўсёды знойдзецца ў бяседзе, хто схоча патрапіць прыгожай жанчыне, ці ў гаворцы, ці ў песні.

«Восень мая доўгая...» Ці чулі вы такую песню, пытаюся? Як звычайна пытаецца якая-небудзь самая галосная баба ў сяброўак, што сабраліся на сяло вечарам у нашай вёсцы Грыдзькі на Пастаўшчыне. І, пабыўшы, засяродзіўшыся, спрабуе ўзяць ноту, прыпамінаючы ўспадабаныя, мала знаёмыя яшчэ, а то і падбіраючы свае, словы...

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ
альбо АДЦЕННІ НАВАЛЬНІЦЫ

Ня веру ў рэальны свет.
Эмір Кустурыца

Ноччу дзіцячы страх сядзіць звычайна недзе ў кутку, падыходзіць да ложка, нахіляецца нізка — хоць ты рукамі бараніся. Тады я пакідаю дом (ведама, не на памяле!) яшчэ да таго,

як моцна засну — мне цесна ў цёмнай хаце, бы ў сарванай на кіпені начной кашулі.

Дастаткова ўявіць блізкі лес, дзе шчыруе маё знаёмае Савяня — яму раніцай маці Сава баіць казкі на два вушкі: спачатку на правае, потым на левае, пакуль тое не абасне. Лес спіць устоечкі, цені даўжэйшыя, чым днём, бярвеннямі перак сцежак. Але мая начная прастора вымяраецца ня крокамі, далей і далей, высвечваюцца штрых-пункцірамі ў цемры, як ад ліхтара, пагоркі, лагчыны, тыя мясціны, дзе сон качаецца па траве нават удзень, асабліва ўпаўдні. І тады нарэшце хатнія дзіцячыя страхі, страхі дарослыя: начныя злодзеі, наркаманы, што шукаюць сабе мак у гародах, застаюцца недзе далёка ўнізе, ледзь разгледзіш, ходзяць мірным статкам, ня лезучы ў шкоду.

Прачынаешся на досвітку. І некаторы час, не пазнаючы пакой, спрабуеш прыпомніць: а ці дамоў ты вярнулася? Паварочваешся да акна, быццам там на шкле застаўся след ад начных вандровак, піктаграма, як ад наведвання істоты з другой планеты дзе-небудзь на пшанічным полі на поўдні Англіі.

Але калі некалькі дзён запар адныя навальніцы, грымяць грымоты, то ўжо не заснеш, трэба пільнаваць хату. Дождж па сцежках ня ходзіць. Вада ўжо пацякла пад ляжачы камень. Заб'еш сёння ў гародзе кол, назаўтра ён ужо нахілены — торгнецца, як хлуд, зямля адпіхне яго сваім здаровым пругкім целам. Улучыць момант, саскочыць з ганку, бы з таварняка на кароткім прыпынку, набраць вады са студні і назад. Дом рухаецца. Хляпська, плёскат па сценах, хвалі ліўню ніяк не даюць рады прыбіцца да берагу. Вось-вось саслізнеш у раку побач, а можа, адразу і ў акіян. «Што кватэра ў горадзе! Гэта чатыры вуглы! А лецішча ў вёсцы — усе часткі сусвету!» — успамінаецца вокліч маладзенькага зяця. Божанька сварыцца, няволле жартаваць, пасміхаецца, жывучы па календары сваіх вясковых родзічаў. Бліскавіца на імгненне высвеціла асцё дрэў, хат, бы ўсё спалена да коміна, сыплецца прысак гарачы з-пад веек. Асцём стаіць у акне забітая перуном старая елка — мой дом яна ўжо не вартуе. Матка Боская то знікае, то зноў вяртаецца, садзіцца каля агню запаленай свечкі. Ходзіш ціха, ступаеш асцярожна, пад нагамі шкляны хруст небяспекі. «Людская агрэсія, фальш ужо вышэй столі, да неба падымаюцца... Не чакайце

з неба пагоды...» — прадракае слабы на розум сусед, але хіба няпраўда ягоная?

Ідэальны стан, спакой адчаю, як у старажытных грэкаў. У непагадзь грукатам у дзверы адзываецца сляпы вопыт маёй сям'і: забітая перуном родная сястра. Калі дзе-небудзь у Амерыцы ці ў Японіі смерч мае назву «Магдалена», «Кэры», ці «Фенікс», то нашая навальніца мне заўсёды мае імя «Гілена».

Дзень, ноч без навальніцы, сапраўды, бы ў хаце бяз свары. І ціша навокал, быццам нарэшце ўдалося адчыніць дзверы знутры, засыпаныя навальнічнай лавай.

Рыпнулі веснічкі, зайшлі дзеці... адзін... тры... дзесяць і болей. Ідуць у хату, іх шмат, тыя, што ня стоўпяцца, пасядуць на страсе каля коміну, там-сям летнімі апёнкамі, на клёне пад акном у шпакоўні. Нехта з іх ужо шчабеча ў маім вялікім кішэні фартуха. Усюды мокрыя сляды. Бы гэта выйшлі на бераг качаняты. Настаўніца дастае на стол пушку цукерак. «Якраз па цукерцы!» — крычыць нехта, палічыўшы. Мэта нашай сустрэчы — пагаварыць аб маёй новай кніжцы казак — губляецца, і пазнатку няма на тое, бо цукеркі ўжо на стале. Я лічу шклянкі, кубачкі, талеркі, мы каштуем пернікі, какоркі, п'ём салодкую ваду. На тарцы стала стаў маленькі завіхасты хлопчык, разлівае ўсім, камандуецца, ён вылушчыўся з натоўпу, як спелы боб — гэта ўжо наш бармен! Мы смяёмся, цешымся, гаворым пра ўсё разам, у мяне лёгкая галава, бы ў спелага вылушчанага сланечніка ў гародзе — птушкі яшчэ віруюць побач, але хутка адлятуць. Хвалі шчэбету ўжо б'юцца аб шкло вокан. Мы выходзім у сад і зноў вяртаемся. Стол пусцее. Не забыцца б падпісаць кожнаму кніжку.

Цяпер дзеці пакінулі дом. Ізноў ціша, ціша маўчання, як перад навальніцай, паветра празрыстае, аж гукае, галасы, бы ў пустым шкляным посудзе: самы блізкі дзынькне і адскочыцца. Да цябе даляціць толькі ягоны водгук — і не згадаеш, што гэта было, чый голас? да каго?

Ужо амаль на адыходзе нячутна падышоў, спусціўся анёлам ля ног малы хлопчык, ён дастаў з кішэні складзеную паперыну, працягваў яе мне. Настаўніца спрабавала апярэдзіць: «Што гэта?!» На лісце з сшытка ў шкляначку друкаванымі літарамі — «КАЦЯ». Літары вялікія, няроўныя, бы высечаныя кіркай на камені — старажытным пісьмовым знакам, а пэўней,

ахоўнымі рунамі. «Каця? Хто гэта?» — пытаюся, нічога не разумеючы. Нехта з дзяцей здагадліва засмяяўся і... сціх. Хлопчык не звярнуў увагі — нас тут было толькі двое — і паказаў рукой у бок акна, дзе сядзела... дзяўчо. Пакуль што гэта было чыстае кацяня, яно і не схамянулася. І ўвагі не дало, хрумкала какорку, але потым, а пэўней, ува ўсе вякі, яна, высвечаная промнем любові, з'явіцца на віньетках, на медальёнах, магчыма, у санэце. Чувалася, як рухаецца пад зямлёй крот, шукаючы юшку ў коміне. Урачыстая ціша, бы ў царкве, калі запальваюць свечку. Былі перакрыты на ўсім свеце хады, лабірынты фальшы, хітрыкаў, зману, шчыльна зачыніліся дзверы для ўсіх няўведзеных у таямніцы кахання: ішла невідочная служба — хлопчык спавядаўся. Заўсёды лічыла, што пісьменнік — адзінокі пастыр. Цяперака ў мяне быў цэлы прыход. Разамкнулася сэрца, разамкнуліся вусны. Хацелася прыкленчыць каля малога і, нарэшце, ПАГАВАРЫЦЬ, бы пачуўшы камертон, узяць пэўную ноту ў размове, якую даўно не ўдавалася ні з кім. Чысты ягоны голас, абраўшы музычную форму, падняўся пад купал столі. Даказана, што дзеці (усе!) нараджаюцца з абсалютным слыхам, з гадамі губляецца гэтая асаблівасць.

Нас толькі двое. Ты ведаеш, хлопчык, гэтай вясной не прачнулася ад зімы ў садзе мая кармінавая ружа, яе нават навальнічныя грымоты не пабудзілі. На ейным месцы цяпер узышоў мой смутак. Ты, вядома, паверыш, што час ад часу ў садзе з'яўляўся чалавек, падобны да гуманоіда: сам невялічкі, празрысты галубовы чэрап: «Ці выкапала ты белы тульпан?» — пытаецца, маўляў, цыбуліне да восені патрэбен стан спакою. Быццам ціхмяны і прыхілкі, кратае вуснамі, а голас магутны, патрабавальны, ідзе аднекуль зверху. Ён ніколі ня ходзіць у садзе сцежкамі. Спрабавала запыніць, але... але нават пылок з кветак не асыпаўся пасля дотыку ягоных ног. Ну чысты далай-лама, мастом, чоўнам ад аднаго берага да другога. Ахоўнікам усяго жывога на зямлі.

Я губляюся, сапраўды, у мяне доўга цвіў белы тульпан, неспадзяваны, бо я яго не заводзіла. Цвіў даўжэй за ўсіх. Белы кубак кветкі напаўняўся розным святлом з раніцы да вечара. Ноччу відаўся здалёк, бы балявaў у адзіноце, заседзеўшыся пасля гасцей, гаспадар. Апаноўвае тая збянтэжанасць, калі цябе, як малое дзіця, злавілі за руку. Ага, здагадваюся, тульпан

з другой невядомай планеты, бы з чужога саду, пэўна, звалілася цыбуліна зарападам. Тут над вёскай бывае такі зорны дождж, што вярнуўшыся з начнога саду ў хату, убачыш раптам, як у цемры запальваюцца, гараць на гадзінніку некаторы час стрэлкі. Дык вось нарэшце знаходжу тую цыбуліну ў зямлі і ўжо магу патэлефанаваць гуманоіду – у мяне ёсць ягоная крыптаграма. Ён называе тульпан «Белам імператарам».

Стан спакою... ты ня думаў пра смерць? я таксама ня думаю. Іншы раз мне выдаецца, што старыя людзі, якія нас пакідаюць, недзе побач, проста яны, выпусціўшы работу з рук, у стане спакою: дзе-небудзь у запечку адпачываюць ці ў акне сядзяць. Я чую іхныя галасы: «Куды, рабая? Куды, чорная?» Гляджу на вуліцу, у гарод, да ракі – кароў няма, анідзе, даўно няма, пустыя хлявы. А гэта мае бабы пільнуюцца, ганяюць, праганяюць хмары над маёй хатай, над маёй галавой. І над табой, хлопчык, таксама. Вёсачка меншае, мялее, бы востраў, што захлынаецца стыхіяй часу. Старыя бабы, кожная быццам узяла мяне за руку перад смерцю, перадаўшы сваю спрадвечную чаканку – напрасніцу. Я ўвесь час пільнуюся, узіраюся ў вокны, пачуўшы машыну: а ці хто дзе прыехаў? а да каго? а ці надоўга?

О, я вельмі любіла вясну ў вёсцы! Сонца! Мне даражэйшы ягоны цёплы імгненны дотык, а ня тое летняе сонца, калі яно ў абдымку з усімі з раніцы да вечара. А цяпер адчуванне, што жывеш на востраве, нават на крызе, асабліва ўвесну, калі не ўзарана зямля, улетку, калі ў гародах зацвітае палын. І сонца цяпер над вёскай цмянае, як скрозь шчыльны абажур. А гэтай ноччу ў навальніцу раптам гул самалёта. Палохаюся ад няўцямнага здзічэлага жадання адазвацца, каб заўважылі з неба – на зямлі ніводнага агню, няма на каго ў часе бяды спадзявацца з берагу.

Хаця час ад часу нехта і прыязджае з гораду: бабіны дзеці, унукі.

– Чаму даўно не заходзілася да мяне? – пытаюся ў маладой дзяўчыны.

– У цябе так многа кветак, я думала... нечым будзе дыхаць...

– У тваім садзе ўвесь час спявае салавей. Ён табе не перашкаджае?! – пытаецца другая.

– Салавей? Перашкаджае? Чаму?

— Ну... гэта такая незвычайная, асаблівая птушка... — адказвае.

Прыязджаюць мае былыя сябры, і ўсё неяк амаль заўсёды на змярканні, спяшаючыся, маўляў, па дарозе, на хвіліну. Адмаўляюцца зайсціся ў хату, пачаставацца ці проста на гарбату, адразу ідуць у сад. І раз, і другі. І трэці — адным строем. Я гуляю з імі па садзе. Кароткія наведванні. Я адчуваю сябе ціхім хворым, які мае дазвол доктара па сваім стане здароўя на сустрэчы ў садзе. Вось-вось мяне пакліча медсястра ў палату прыняць пігулкі. Я стараюся, сачу за сабой. Каб не сарвацца, не паказаць сваю прывязанасць да іх, стрымаць жаданне шчыра аб усім пагаварыць, — сіллю затрымаць гасцей даўжэй. Вядома, сябры здагадваюцца, што я верую, як і ты, у вечнае адкрытае сяброўства і каханне, верую ў несканчонае жыццё, а гэта мера не зямная, гэта мера нябесная, адказна несці ў сабе па жыцці вялікае пачуццё, нават калі яно да свайго сабакі. Здагадваюцца і пазбягаюць мяне, як небяспечнага хворага.

Я вельмі стараюся, бо мяне могуць болей не пусціць з палаты да іх у сад.

Бывае нехта з пісьменнікаў і заседзіцца. Гаворка адна і тая ж: крыўда на невядомасць, непрызнанне свайго таленту, той, маўляў, такі, гэты гэткі, але час, маўляў, усё высветліць, хто чаго варты, што застанецца пасля каторага, спадзеючыся, што пасля смерці менавіта ягоныя творы застануцца ў вякох. Карціць адказаць, даруй Божа: тады трэба паспяшацца памерці, каб хутчэй усім нам даведацца і аддаць павагу?!

Цяпер я сваіх сяброў і знаёмых, як рэдкі, дарагі гербарый, закладаю ў кнігі. Яшчэ я гавару з імі, спрабую быць шчырай — па тэлефоне, пры сустрэчах, — трачуся на ўсіх да апошняга, быццам злотымі, якіх ня маю. Я даўно жыву ў доўг...

Мы стаім адно супраць аднаго. Колькі прайшло стагоддзяў? Мы дарослыя, слухаем дзіцячы чысты голас, спрабуючы вярнуць сабе мову даверу, мову любові, якой калісьці так лёгка валодалі.

На развітанне ты просіш паслухаць вялікую марскую ракавіну на акне, рапана. Кажаш, што чуеш у ёй... пчалу. Пчалу?!

Дзеці пырхнулі і адляцелі. Іду ў сад, хаджу па іхных дробных птушыных сцежках. Баюся сабе прызнацца — мне хораша, хаця благоцце выступае сукровіцай скрозь тугую павязку.

Паступова пазбаўляюся болю, нарэшце я сама сабе свая, як кажуць мае бабы. Здзіраю пад ногі сваю адзежу, адно рыззё, прыкарэлае да цела, пераступаю, прымяраю лапу яліны на плячо, бы дарагое манто. «Адзінота — гэта кожны ваяр у страі, гэта кожная старажытная статуя ў мармуровай нішы», — о, гэта ўжо паэт! Вяртаюся, слухаю рапана і чую ня мора, хвалі, якія зносяць маю крыгу, чую... пчалу, галасы квітнеючых палёў, лугоў. Мы чуем, бачым тое, што ў нас ёсць.

Нарэшце выдалася светлая ноч. Сябры і знаёмыя высокім сузор'ем над хатай — значыцца, на пагоду.

Не будзіце мяне, навальніцы...

КАВЯРНЯ «СТАРЫ МЕНСК»

Што да мяне, то я тут на вуліцах пераступаю нават цені, і ня толькі цені людзей, але і гарадзкіх дрэў. І раптам, сустрэўшыся на скрыжаванні, Вольга запрашае нас з Франкай у кавярню. Я з торбамі, накупляла прагавіта, трапіўшы ў супермаркет, быццам ізноў вярнуся ў вёску, адкуль толькі прыехала (дэкрэтны адпачынак, усё лета гадавала там дзіця). І наагул, мы з Франкай скрозь вясковыя, мы ня ходзім па рэстаранах-кавярнях, ня маем такой звычкі. Мы ж з ёй, атрымаўшы калісьці «вид на жительство», не здавалі іспыт на менскі лад жыцця. Пераскокваю ўнутраную мяжу, згаджаюся. Франка цягнецца за мной.

Сяджу ў кавярні, раз-пораз кратаю нагой торбы пад сталом, ці яны яшчэ тут. Франка, бачу, насупраць дранцвее, застыгла, акругляе свае біблейскія вочы, потым дастае з валізкі шкляныя дзіцячыя пацеркі, зробленыя трэцяй — меншай дачкой, і, як ахоўны амулет, чапляе сабе на шыю, маўляў, уратуй нас Божа ад гэтай распусты, ня дай увайсці ў вялікі кошт. Я ведаю ейны тубыльскі ваяўнічы характар, і мяне гэта забаўляе, вызваляе ад нязвыкласці стану, я смялей разглядаюся, бы вылезшы з канапель.

Кавярня маленькая, на сценах выявы старых дамкоў, яны выцягваюцца пад столь, аб'ядноўваючыся ў мяне над галавой

пад агульнай страхой, расчыняюцца сляпыя вокны, адтуль вее варывам, печывам, кавай. Шыльды з надпісамі: аптэка доктара Жаўкуна, майстэрня гравёра Жаркевіча, незнаёмыя прозвішчы гаспадароў мінуўшчыны магічна заступаюць вочы, і я нарэшце забываюся пра свае торбы, з асалодай выпроставаю ногі, бы толькі што злезла з фурманкі, прывязаўшы ля кавярні каня. Я ў гасцях у старога гораду, як у старога чалавека, пра якога нічога ня ведаю, а ўжо сяджу за ягоным сталом, ужо ў мяне пытаюцца, што мне згатаваць, чым частаваць. «Можна ў вас паліць? Не?» — пытаюся. Тады я запальваю свечку на стале, каб бачыць жывыя водбліскі ў вачох Вольгі і Франкі, як у вокнах насупраць, бо ўжо сцямнела. Заўважаю каля ўваходу плецены куфэрак, у ім цёплыя пледы-апінанкі на той выпадак, калі каму-небудзь з нас стане зімна. Покрывам нябескім ахінуў спакой, той рэдкі спакой, калі наведваешся да старых людзей, якія ўжо анікуды не спяшаюцца.

Я толькі тут і зразумела, што ў гэтага сучаснага горада яшчэ жывая даўніна, жывыя ня толькі ягоныя дзяды.

Наведнікаў пакуль што мала. Маладзенькая гаспадыня сядзела за свабодным сталом і засяроджана, пільнуючыся ўзору, рабіла нешта на прутках. Вочка за вочка, і я сяджу, як маладая котка, укрыпаўшыся, скінуўшы на падлогу клубок. Той клубок несканчоны, коціцца аж да млына волата Мянеска, які перамолваў на сваіх жорнах ня зерне, а каменне. Ад яго і пачаўся радавод Менску? Нешта спрабую ўспомніць, тое, чаго і ня ведала, Вольга старанна разбірае маю крыпаніну, распавядае пра іншыя міты ўзнікнення гораду, яна гараджанка, замаўляе каву яшчэ і яшчэ, перагортвае падзеі і з'явы назад, бліжэй да нашага часу. Вось ужо мы ўсе разам у доме Ваньковічаў, спускаемся ў каменныя лёхі пад падлогаю, знаходзім белую мармуровую статую, але хто яна, ня ведае нават сама Вольга. У катэдры стаім каля капліцы з целам святога Фэліцыяна, рыцара і пакутніка, на сценах касцёлу цені Пятра I, Мазепы, цара Мікалая II, яны сюды наведваліся калісьці. Мікалай выдаўся маленькім, як па мне, дык проста сабе царок. У Свята-Духаўскім саборы нас абступаюць манашкі. Яны хрысцяцца, не пазнаючы ў нас жывых людзей — мы абсыпаныя пылам стагоддзяў. Што, напачатку гэта быў касцёл кляштара бэрнардзінак?! Перад намі ў кавярні ўжо варушыцца стол, бы ў час спірытызму.

Матка найсвентша! Мы з Франкай хаваем вочы, мы нічога гэтага ня ведаем — мы ня вывучылі ўрок і не здамо іспытаў. Я пачынаю разумець, што нас з Франкай цікавіць толькі горад сённяшні: гарачая вада, крамы, мы ня можам яшчэ нацешыцца выгоддзем, для нас спыніўся час. Спыніўся гадзіннік у горадзе, калі я прыехала, мне ўсё даспадобы, мне мусова патрэбна толькі тое, што бачу, тое і спажываю, спяшаюся спажыць. Мы святкуем сваю перамогу, што ўдалося абсталявацца ў горадзе, для нас кожны дзень — свята. Мы напінаемся, апрануўшыся з раніцы ў вячэрнія строі, размалёўваем твары, калываемся на абцасах каленькамі наперад, пятамі назад, са скуркі вымыкаемся, мяркуючы, што менавіта так мы здолеем быць падобнымі да гараджанак.

Але што дзіваваць? Калі ў мяне іншы раз нехта пытаецца: як я дасталася да гораду? дзе жыла? з кім? — я бунтуюся, я маўчу, бо не памятаю нават сваёй асабістай «даўніны», не памятаю тых гадоў, тых знакаў.

Я бегла, як гончая: ці мне палацы, ці памыйныя ямы, мне трэба было кожны дзень дабегчы да ночы, да прытулку — дзверы ў горадзе для мяне былі зачыненыя. Бегла па доўгіх калідорах інтэрнатаў, шукала прытулак на прыватных кватэрах, жывучы недзе за шафай, каб патрапіць хаця гаспадарам, сціснуцца, сцішыцца. Губляла свой след, свой нюх, спала на вадастокавых люках, яны не замярзаюць. Я сабака, узрост якога — адзін год за сем чалавечых гадоў.

Нас лёгка распазнаць. Некаторым вяскоўцам хутка ўжыўляецца «штучны» клапан у сэрца, і яно лёгка б'ецца ў гарадскім рытме. Маё сэрца адрыне, ня прыме. Мая кватэра на восьмым паверсе, грубастае маё карэнне ветрае, ня можа замацавацца ў глебе. Іншы раз выдаецца, што я ў горадзе як на заробках: нажыўшы ўсё тут, забяру заробленае і з'еду назад дамоў.

Што з нас дзіваваць?..

Вольга дапівала каторы ўжо кубак. За наш столік села старая жанчына. Каракулевая шапачка, каракулевы паўбурносік, ня тое што ўсё старое на ёй, даўнейшым строем, а лепей было б сказаць, зляжалася ў шапе — захаваліся вострыя плечыкі вешака, заламаныя складкі на крысе. Рухі няпэўныя, бы яе нехта ўзяў за руку і вадзіў сілком. Вольга раптам ажывілася,

страсянула кучарамі, чыста белая пані з каменных лёхаў пад мурам Ваньковічаў. Вольга адразу зразумела: жанчына прыйшла... прыйшла на паверку з сённяшнімі гараджанамі. Вольга загаварыла пра нешта нязначнае: надвор'е, смак кавы, які цяпер месяц, які год, якое стагоддзе, пра тое, што надавала аддуху пасля нашых «вандровак», — як пераслала настольнік. Мы бавілі час, мы адчулі ягоную асалоду пад языком.

Нарэшце разумею: кавярня — гэта маленькі асабісты тэатар; кавярня — гэта вылюддзе, кавярня «Стары Менск» — гэта маленькія госці ў вялікага гораду. І калі сюды ты зайдзешся адна, да цябе падсядзе старая жанчына, і ты ня будзеш адчуваць адзіноты...

У гораду ня сцёртыя з твару ўспаміны.

Мы развіталіся са старой, як з прыяцелькай. Вядома, яна яшчэ засталася, вядома, што ёй тут побач — яна з таго будынку, што на сцяне кавярні, дзе аптэка пана Жаўкуна.

Ідзем па вуліцы, якія харошыя машыны, думаю сабе, бы пра коней. Вольга прапануе пагуляць, але мы з Франкай спяшаемся дамоў. Я ня ўмею гуляць па горадзе: да непрыстойнасці зазіраю ў вочы кожнаму стрэчнаму, бунтуюся, не пазнаючы ані ў кім сваіх аднавяскоўцаў. Мы развітваемся. Вольга пайшла на свой прыпынак. Мы з Франкай стаялі, глядзелі ёй услед, і яшчэ раз, і яшчэ абарочваліся, ідучы ў свой бок. Вольга не азірнулася. Мы спыніліся, быццам баяліся згубіць яе ў натоўпе і хацелі хоць крыху затрымаць каля сябе, пабыць разам даўжэй. Яна не азірнулася — такіх поўны горад, такіх, як мы. Глядзелі ўслед, як праз плот, вечны плот. Мы, прыезджыя, нарэшце ўпершыню пазналі гаспадыню гораду і даўмеліся, што свае хатулі яшчэ і не развязвалі, зняўшы з плячэй: мы толькі вельмі спяшаліся ўскочыць, ушчаміцца ў дзверы, як бежанкі. Мы быццам яшчэ і не сустракаліся з Вольгай, нідзе і ніколі, і гэта стрэча будзе магчымая праз якіх сто гадоў майго жыцця ў горадзе, калі мы адчуем, што прыехалі сюды назаўсёды.

Азірніся на нас, Вольга, мы прывезлі з сабой тое, пра што і самі забыліся, прыехаўшы: мы прывезлі... Мову, Мову лясоў, палёў, зямлі. Мы прывезлі валачобныя калядныя песні... Мы маем падараваць гораду найкаштоўнейшы скарб...

Азірніся, Вольга...

САСКОЧЫЦЬ З РОВАРА І СПЫНІЦЦА

Нас пазнаёмілі ў музеі, амаль у дзвярах, калі я вярталася з выставы габеленаў. Там павінна была быць і мая праца, але... Пэўна, спадзеючыся на тое, што я амаль не тусуюся, запрасілі наведацца дзеля адчэпнага і забыліся. Прастаяўшы на выставе ў «запечку», я была ў такім стане, нібы ты запрошаны да ўрачыстага стала, а прыбора табе не паставілі.

Вядома, не да знаёмства, хай сабе гэта будзе і ангельская каралева.

— Ірына Жарнасек, пісьменніца... — І, пабыўшы, нехта дабавіў: — У яе сын святар...

Спыняюся, узрушанасць на мяжы раптоўнага аплучэння. Ёсць месцы на зямлі, куткі, рэчы, дастаткова ўбачыць штонебудзь зблізку ці здалёк, да прыкладу, дом над вадаспадам у Пенсільваніі на фотаздымку, і ты ВЕДАЕШ, што гэта тваё мае быць, тваё асабістае жытло. Дастаткова пачуць, што ў Італіі працуе закон: пакінеш свайго сабаку ў машыне, не ўключыўшы яму вентылятар, атрымаеш штраф пяцьсот даляраў, — адчуванне, што гэта твае землякі, і нават болей.

І ёсць сустрэчы.

І тады на выставе — амаль момант яснабачання. Я разміналася ў дзвярах са сваім лёсам: у мяне павінен быў быць сын святар, менавіта святар, хаця ніколі дагэтуль пра тое не думалася.

Тады і назаўсёды я пакідала выставу... цяжарнай, цяжарнай адкрыццём, суцешаная, быццам пазбавілася звыклага пачуцця няспэўненага ў жыцці.

Цяпер, ужо седзячы ў іншай залі, я разглядала пісьменніцу, пэўна, пільней за іншых. Ішла першая прэзентацыя ейнага раману пра трагічны лёс расіцкіх святароў-марыянаў: у вайну яны мелі шанец уратавацца ад агню, але ахвярна прынялі смерць разам з тысячай сваіх парафіянаў.

Яна стаяла перад заляй, хвіліну маўчала, пераводзячы дух, бы вось нарэшце тут, у залі, толькі і спынілася. Нарэшце-такі во дасталася да сталіцы з Наваполацку. Мне выдавалася, ішла пехатой, напрасткі па бязлюдных дарогах, мясцінах, не

просячыся ўнаначкі, спяшалася — несла сваю навіну. Засівераны твар, засівераныя валасы, на ёй несучасныя строі, спехам ускінутыя на плечы, быццам і пераапраналася недзе перад Менскам, цнатліва захінуўшыся. Гаварыла ціха, просценька, нязвыкла да выступаў, пра тое, як гадамі збірала матэрыял, выязджала, хадзіла па вёсках, сустракалася са сведкамі, якім удалося ўратавацца ад вялікага вогнішча.

Гарэлі свечкі каля партрэтаў росіцкіх пакутнікаў. Амаль шэптам чытаў маладзенькі дыякан урыўкі з раману, нязмушана, без муштроўкі рэпетыцый, вядома, бы дзеля сябе самога чыталася ўслых, спрабуючы лепей учытацца і зразумець. Гукі павольнай музыкі, ледзь чутна, то бліжэй, то далей, бы чыесці крокі, крокі таго, хто здымаў агаркі са свечак, падаваў на стол шклянку вады і сядаў на аслабанёнае крэсла каля мяне — не дачакаўшыся звыклага «відовішча», мая сяброўка пакінула залю. Выйшаў і знаёмы літаратурны крытык.

Вядома, гэта была літаратура не са знакам ПОСТ, што звычайна азначае «пасля Бога і пасля чалавека».

Асабісты, жывы голас хутчэй гучыць традыцыйна ў цяперашнім свеце.

Вядома, эфекту не было, хаця пісьменніца момантам намагалася натурыцца на гэта. І я сама, цураючыся рэлігійнага патасу, заставалася сядзець у залі дзеля павагі да тэмы вечара, ня болей.

Але калі потым сталі гаварыць маладыя святары, дыяканы Ордэну марыянаў... Адзін, другі, трэці... Яны выходзілі, з'яўляючыся, як з нябыту — адразу і не заўважыш, што яны побач з табой, бо ў цывільным, пазнаеш, убачыўшы белую каляратку пад чорным каўняром. Іх было шмат, як на невядомым дагэтуль нікому гадавым свяце. Пасля сваёй прамовы кожны падыходзіў да пісьменніцы, віншаваў. Яна шырока заводзіла руку, заламаўшы ў локці, моцна абдымала за шыю, быццам толькі тут нарэшце яны, ідучы кожны сваім шляхам, і сустрэліся, доўга ня бачыўшыся. Доўга, празорліва глядзела ў твар, намагаючыся ўбачыць у кожным ахвярнасць тых, пра каго апавядала ў рамане. Заводзіла руку, у гэтым руху было столькі звыклай жаночай адкрытасці і той жа таямніцы, нібы віталася з кожным не прылюдна, а на парозе свайго дому, на парозе сваёй вядомасці. Іх аб'ядноўвала нешта пераможнае над усім: гадамі

пошукі сведкаў, пошукі грошай на выданне твору, пошукі аднадумцаў, ахвярнасць дзеля справы сямейным спакоем і дабрабытам.

Цяпер яна ўжо абдымала ўсю залю, валодала мною. Сыпаліся на падлогу нашыя завушніцы і бранзалеты, бляклі фарбы на вуснах, румяны, бляклі дубальтовыя строі, абы хоць на момант адчуеш побач з ёй сваю належнасць да жаночай прыроды, да прыроды існасці.

Потым гэтай жа рукой яна, як міністрант або званар, будзе ціха разгойдваць звон у іншых касцёлах, аб чым прасіў перад смерцю адзін з расіцкіх ксяндзоў: «... азвані па нас, звон, пазвані, раскажы свету, як мы... каналі ў агні».

Столь казённага памяшкання расхінулася, вялікая жырандоля — копішчам зорак.

— Ну і як табе гэтае мерапрыемства? — запыталася на выхадзе адна знаёмая.

Мерапрыемства?! я маўчала... я ішла... з набажэнства.

Увесь час жыву спяшаючыся, таропка, і ў той жа час незадаволенасць, што ўпускаю раніцу, дзень, вечар, упускаю жыццё: згубы, здрады, пачуцці нязбыўнага, і той жа мой нядаўні «запечак» на выставе габеленаў. Цяпер мяне агортвала ціша спакою. Сціх вецер, дрэвы запаволілі свой гонкі рост, час запыніўся — усё наваколле падбірала хаду пад мае няроўныя, блытаныя крокі. Усё, з чым прыйшла, мяне нарэшце быццам выслухалі тутака ў зале — з Богам лёгка, ня трэба намагацца, даказваць, каб цябе зразумелі.

І няма быццам большага за шчымлівае жаданне, як, ускінуўшы на плечы нешта правінцыйна-цнатлівае, саскочыць з ровару і спыніцца ў Дубраве пад Менскам, напроці магілкі забітага немцамі святара (як тое дзяўчо перад нашай машынай — мы прыязджалі туды наведаць разбураны часам касцёл), перахрысціцца, прывітаўшыся, як яна, і далей, па вёсцы. Магілка надзіва прыбрана, дагледжана, бы свежая — заўсёды на памяці вяскоўцаў.

А што сын-святар? Магчыма, ім стане мой хроснік... Вельмі ўжо дасканалае дзіця трымала я перад хрысцільняй у Чырвоным касцёле, бы пераняла яго пацешыцца, забавіць з рук самой Дзевы Марыі, каб даць Ёй крыху аддухі.

ГЛІНЯНЫ ВЯЛЕС КАЛЯ МАЁЙ СТУДНІ

Былы муж прыехаў са сваёй Амерыкі неспадзявана. Мы сядзелі за сталом, насупраць адно аднаго.

– Я хачу вярнуцца... – сказаў.

Такой цішы ў маім доме яшчэ ніколі не было: калі не адчуваеш нават свайго дыхання, ціша змярцвення.

Стол, даўгі стол для вялікай сям'і, засланы белым настольнікам.

Муж сядзіць смутны, ён няшчасны, ён распавядае пра свой няўдалы раман, ён чакае, спадзяецца, што ягоная бяда стане супольнай, сямейнай бядой. Наша дачка, кажа, застаецца вучыцца за мяжой, ёй там падабаецца, вельмі падабаецца, я, маўляў, павінна згадзіцца: добра, што ён настояў забраць яе з сабой, ад'язджаючы, гэта, маўляў, для яе такі шанец уратавацца ад нашай быдловасці. Гаварыў, гаварыў...

Я ня чула, я здагадвалася па вуснах. Я даўно стаю каля зачыненых дзвярэй, яны зачыненыя ўва мне самой. Ён спяшаўся, перабіраў у руках «ключы». Мне не перадаваліся ні ягоны боль, ні цяпло.

Вярнуцца?!

Доўгі стол паміж намі, засланы белым, ён мне выдаваўся заснежаным. Замяло на ім усё начынне для кавы, сіверам з твараў. Заснежаным, як тое поле калісьці. Вярнуцца? я не ведаю дарогі назад. Тады, адразу пасля разводу, з суду пагнала машыну на лецішча. Вечар зімовы як мігнуць вокам перавярнуўся на другі бок – і адразу ноч. Матор заглох у замётах. Кінула машыну на дарозе, як цяжкі хатуль з плеч, і напрасткі праз поле, па цаліку. Мне трэба было як найдалей ад нашага дому, дзе яшчэ дзейнічалі мужавы замовы, прысягі, вечныя ловы любові і да апошняга надзея, што дачка з ім не паедзе. Ад таго места, дзе паранілі, знікнуць, заблытаць крывавы след, не баючыся, што па ім у полі можа знайсці цябе, учуць звер – самыя красы.

Снег правальваўся, месцамі па каленкі. Азірнулася, хацела вярнуцца, а следу не відно – ззаду ішла пазёмка. Поле ўвесь час перасцілалася нанова, змяняючы наваколле. Нечалавечым нюхам, зрокам здагадвалася, дзе тут маё жытло.

Ад парога, праз усю хату, адразу да Багародзіцы, матчынага абраза. Хацелася нешта ёй сказаць — яна падняла руку да вуснаў, запыніла. Так звычайна стаяць, збедаваўшыся, сялянкі на хаўтурах — замкнуць вусны, сцяць мову — знак маўчання. «Пакарміце Мурзу...» — патэлефанавала дамоў і заснула, ня цепліўшы, не распранаючыся, як у сабачай будцы, каб не абраз.

Назаўтрая, агледзеўшыся: чатыры сцяны, нізкая столь, страха на самыя вочы — гэта не работа! я буду тутака будаваць сапраўдны дом, той, пра які марылі, жывучы разам. Гэта будзе мой Элізіюм на гэтым свеце, дзе заўсёды пануе дзень. Душа мая для нараджэння зноў выбрала вось гэтае месца. Я старажытная пчала: парушыш соты, а яна, не зважаючы, надбудоўвае тое, на чым спыніла стыхія.

Парушаны мой падмурак, а я будую адразу «сёмы паверх»!

Трэба вярнуцца ў горад адно па сабаку.

Людзі дзівіліся: жарт — і мужык, і дачка з'ехалі за адным разам. І, пабыўшы: скора яна звыклася, вунь якую будоўлю распачала! Не, гэта ня звычка. Гэта калі ты забываешся, якой была ўчора. Ты быццам раптоўна зайшла ў цень, у свой уласны цень. Ты яшчэ некаторы час павернутая да блізкіх тварам, як да сонца хатняга, павернутая ўдзень, на змроку і ўначы. Выцягнутыя рукі ў адным кірунку з гадавымі колцамі павернутага да сонца дрэва. І раптам словы, позірк, рухі — усё звяла ніцее, пакуль на табе не аджыве атожылле, як на ствале пашкоджаным.

Зіма, лета, сонечнае святло, ягоны халодны прамень, як ад люстэрка, выцягнутага з кішэні: нехта высачыў цябе, гуляючы, і забыўся.

Вярнуцца?

Я прайшла ў адзіноце занадта вялікі шлях, намагаючыся на ўсё забыцца. Ішла праз гушчар, высякаючы сабе сцежку, як у джунглях, і яна за мной зарастала ўвачавідкі — я не патраплю вярнуцца. Удзень і ўначы чула галасы людзей, яны прысягалі адно аднаму на вечнае каханне, на сяброўства, успрымала іх, як спевы птушак. Ведала па сабе, што яны часцей прапануюць замест вечнага нешта ўзамен.

Але хіба можна даць чалавеку нешта ўзамен хлеба надзённага...

Гарадскія вуліцы звузіліся, як калідоры, цёмныя сцены з усіх бакоў шорамі на вачах. Вярталася сюды толькі па бу-

даўнічыя матэрыялы. Узіралася ў свой былы дом, бы ў чужыя вокны. Дом быў населены нашымі прывідамі, там быў схаваны наш нечаканы сямейны разлад. Я не гадавала дачку для Амерыкі, гэта мяне гняло найболей. Я не сурагатная матка. Чаму яна так лёгка ад'ехала?

Зазірнуць ва ўсе цёмныя куткі пакінутага дому, падняць масніцы, спусціцца ў падполак. Сабраць аскепкі церніцы матчынай, той пасудзіны, якую я выпусціла з рук, несучы перад сабой, жывучы ў сям'і.

...Нарадзілася дзіця, Дзям'яна. Дзіця быццам незапрошанае, як неспадзяваны верадлівы госць у доме. Мы перашкаджалі мужу. Ён вяртаецца стомлены, ён працуе бяз меры, каб сабраць грошы на сапраўдны дом, на машыну і, вядома, на прэстыжную школу. Ён зачыняецца. Ужо дачка стукае ў дзверы: тук-тук. «Хто там? я Дзям'яна!» — сама сабе адказвае і адыходзіцца. Муж глядзіць «навіны», дачка тук-тук па падлозе, як капыткамі, узад-уперад — зноў незадаволенасць. Ён праз паўгоду настояў, каб мы знайшлі няню, маўляў, мне самой ужо час станавіцца ў аглоблі, і так шмат грошай упушчана праз роды. Я не забавілася ў шчаслівай пары мацярынства, калі корміш цыцкай. Малако на працы бегла толькі што не па лытках, быў час нейкага дзікага несупыннага гону.

Адна, другая, няні не затрымліваліся. Я разміналася з каторай, прыйшоўшы, у вітальні, як са зменшчыцай на казённай працы.

Трэцяя, яна нарэшце размаўляе па-беларуску. Сваю мову маюць ручаі, дрэвы, дождж, птушкі, мову маюць і рэчы. А наш дом быў нямко, гэта я цяпер зразумела, катух бяз ладу і складу, будаўнічая пляцоўка. Дзіця — як на мяжы ў полі, пакуль мы, бацькі, «нажнём» на хлеб з ікрой. Стол, табурэт, зэдлік, чужая цётка побач і, як адкупнога, кожны дзень у руку новую цацку, цэлы пагорак цацак — і гэта ўся краіна дзяцінства. Мы, маўляў, будуем новае заможнае жыццё. Можна сказаць, новую вольную краіну, бо лічылі сябе шчырымі прыхільнікамі адраджэння. Былі, так сказаць, занятыя ў «падтанцоўках» нацыянальнага руху.

Трэцяя няня, яна з інтэрнату, яе памятаю найлепш. Цяпер цяжка сабе прызнацца, як мы з мужам абмяркоўвалі ейны прыход: а ці ня ўгоніць яна нас у кошт, калі будзе і палуднаваць

у нас. Апошняя часцяком прыводзіла да стала і свайго малога сына. А яе, і кожную з іх, трэба было прыняць інакш? Завесці ў дом, як на пасад, расказаць пра нашыя традыцыі сямейныя, дарагія звычкі, таямніцы. Бо ў кожным доме жывуць па сваім асабістым сонцы, у кожным, як на іншай планеце. Урачыста, даверліва перадаць на ейныя рукі сваё дзіця. Хіба дом гэта ня ўнутраная прастора гаспадара, не галоўны інстынкт?

Памятаю, тэлефаную часцяком ёй з працы, падыходзіць да тэлефона не адразу, быццам у нас трыццаць пакояў. Дзіця спіць, кажа. Тады чаму так марудзіць, чым займаецца?

Неяк выдалася, што мы былі з ёй дома разам. Нехта патэлефанаваў. Няня стаяла якраз каля апарата. Замест званка іграла музыка, Поль Марэа, таката, нядаўна прыдбалі такую «забаву». Я бачыла праз адчыненыя дзверы з кухні: няня не падымала трубку, яна стаяла, слухала. Кароткія гукі, тая музыка, якая ўзнікае ад дотыку блізкага чалавека, ад ягонага слова ці проста, калі адчыніш музычную скрыначку. Яна стаяла нерухома, спынены зрок, невысокая, зграбная, чыстая лялька. Зараз механічна, нягнутка падыме адну руку, другую, пратанчыць, зробіць паклоны і знікне. Скрыначка зачыніцца, мы зноў застанемся бяз няні.

Я застыгла з церніцай у руках, яшчэ матчынай, адзіная рэч, якая мела існую назву, магнэс. Адзіная з матчынага гнязда. А так ніводнага чарапка дзеля строю, дзеля ладу, забавы, каб спыніць, перавесці вочы ад пялюшак. Толькі во тэлефон, куплены выпадкова, і той цешыць толькі няньку.

Што гэта нам ёсць?

Такі дом лёгка пакінуць...

Мы жылі, як перасяленцы, на часовым прыпынку. Нас такіх шмат, несканчоны цягнік. Заўсёды здарожыўшыся, заўсёды пад цяжарам жыцця, нашыя дзеці не запамінаюць месца, дзе мы спыніліся, бо яно не абжываецца.

Я толькі зараз ірванула ручку стоп-крана, каб нарэшце пабудаваць дом.

Ужо я ваджу дачку ў дзіцячы садок. Зіма, я спяшаюся, як заўсёды. Я ляту. Яна падае з санак у снег. Камунальны завулак, ён спускаецца да ракі. Раптам дачка бачыць гэтую раку, вялікую ваду, яна знямела, яе туды як за руку пацягнула. Яна да ракі, я назад, да сябе, яна ізноў туды. Злуюся, хапаю, як

шчаня, на рукі. Дачка плача, плача ўсю дарогу, крычыць з нейкім дарослым жалем. Што было ў ейным балючым голасе? Быццам я рыдлёўкай секла, абсякаючы ейнае маладзенькае карэнне, ледзь пазначаны навык супадзення з прыродай, з местам на зямлі.

Усё гэта ўспамінаю, як злачынствы нейкія. Адзінае маё жаданне: калі яна наведаецца часам, легчы з ёй разам спаць. Спавіць яе сваімі думкамі, адпіхнуцца ад сучаснасці, як у чаўне ад чужога берагу, і плыць. Часта ў сне бачу вялікую ваду. Заўсёды дзікая, няўрымслівая, як звер, не стрыножаная парапетам, да яе лёгка падысці, ступіць у ейны вільготны след.

З усіх бакоў чую гаворку пра матчыну мову і рэдка пазнаю яе, як той казаў, у твар. Быццам каторы прамаўляе словы песні, ня ведаючы мелодыі ці ня маючы голасу. Быццам чалавек не нарадзіўся, а быў знойдзены ў капусце.

Сяджу з дачкой на бацькоўскім сходзе, слухаю класную кіраўніцу. Раптам заўважаю, што міжволі рухаю сківіцамі, бы пераціраючы пачутае, сілячыся праглынуць. Нешта сырое, як ня высушанае як мае быць на печы, зерне, засыпаю і засыпаю жменяю ў жорны. Выходжу, аж бакі баляць, як сказала б вясковая баба, праехаўшы ў пустой каламажцы па выбоінах даўнейшай брукаванкі, злезшы нарэшце далоў.

Яшчэ доўга словы кіраўніцы целяпаюцца, бразгацяць паражняком, набягаюць адно на адно. Цяпер толькі адныя лекі — здумаць нейкую прычыну зайсціся да Хрысціны, каб зняць сурокі. Па сённяшні дзень заходжу да яе, як да варажбіткі.

Хрысціна нешта гаворыць, я не заўсёды лаўлю, унікаю ў сэнс, хай выбачае, я слухаю музыку мовы. Той плыўкі гук веснавое вады з перакатам праз сустрэчныя камяні на дне, карэнне, вільготны шэпт пяску-плывуна, шоргат белага, сыпучага жвіру з далоняў ці пад нагамі — і зноў перакат. Я каля яе пастаю сцішана. Я да яе, як да лясного ручая ў горадзе. Карціць кожны раз запытацца: а што, каля цябе ў вёсцы таксама бегла вада? Кожны раз тое распазнаванне, тая дарагая згадка, бы раптам пачуў мелодыю з тваёй калыханкі.

У такія моманты адчуваю сябе амаль ва Ўэлзе, там пануе на ўзроўні з ангельскай валійская старажытная мова першых жыхароў Брытанскіх выспаў. Паўсюдна даўжэзныя назвы вёсак, адну з іх можна перакласці прыкладна так: «Месца

каля царквы, дзе б'е чырвоная крыніца і дзе каля пячоры над магілай расце рабінавы куст». Замест кароткай назвы сваёй вёскі я напісала б на шыльдзе каля дарогі: «Месца паміж дзвюма рэчкамі – Лычоўкай і Дубоўкай – і балацінай, дзе «водзіць» і ўдзень, месца на пагорку, адкуль відаецца, пільнуецца кожны свой чалавек, які сышоў ці з'ехаў адсюль, месца, дзе... маё сэрца». Царкоўем называюць поле побач, там наша сенажаць.

У такую вёску лёгка трапіць нават у стане амнезіі.

Рэчкі даўно выпрастала меліярацыя, ляжаць у равах, як нябожчыцы. Але іхныя галасы па сённяшні дзень дзынкаюць мне завушніцамі.

Падымаю слухаўку, чую то аднаго Андрэя, то другога (з «НН», зрэдку тэлефануюць, па справах, вядома), іхная скорагаворка што плыткая веснавая вада па каменні са стрыманым маладым смехам на заваротах. Нідзе не замарудзіўшыся, разбураючы межы, перашкоды, напрасткі – да вадаспаду ў вялікую ваду. Аж пырскі халодныя на маім твары. Размова скончылася – і сполах: пра што каторы гаварыў, ці патрапіла адказаць? Бо я слухала толькі музыку бягучай вады. Так гавораць у нашай вёсцы мужчыны. Ідуць заўсёды крыху наперадзе баб ці там касьба, ці малацьба, толькі голас адносіць. Ідзеш ззаду, як крутым высокім берагам гаваркой ракі – не сысціся і бліжэй не падысці.

А іншы раз чую ў скорагаворцы Андрэеў рытмічны перастук абцасаў, як у пасадоблі, вядома, з беларускім музычным акцэнтам: постаць з высока паднятымі грудзьмі, жорстка, нерухома пастаўлена галава – тыповы мужчынскі танец карыды. Жанчыне тутака толькі роль чырвонага плашча.

Ніхто з іх не выкладаў мову маёй дачцэ, і сама я гавару на трасянцы.

Хаджу вакол свайго былога жытла, зазіраю ў адно акно, у другое, трэцяе... На шкле скрозь марозныя святочныя малюнкі да зоркі Раства можна дакрануцца рукою. Калядкі. Калядкі, памятаецца, толькі на шкле...

Свята яшчэ няма, свята яшчэ ў дарозе, а дзеці ў ліцэі ўжо ладзяць сустрэчу, нешта накшталт спектаклю. Рыхтуецца святочны стол, гульні, падарункі. Усё адбывалася заўчасна, да прыходу вялікай госці, дзеля якой быццам усё і рабілася. Ніхто не чакаў ейнага прышэсця. Адным словам, проста спектакль

на тэму. Калі не ў пару, не ў назначаны вякамі час вадзіць карагод, гэта можа падзейнічаць нават на сонца, памятаецца, казалі ў вёсцы старыя людзі. Маўляў, нешта можа парушыцца ў навакольнай прыродзе. І ў чалавеку, вядома.

Дачка вярталася размагнічанай, як я калісьці з вечарынаў пад раніцу. Да часу, да пары разгортваліся падарункі, спешна, нервова, у спадзеве адно на той гасцінец, якога не каштавала, ня бачыла. Цяпер я разумею: яна шукала нейкай дзіцячай неспадзяванкі і не знаходзіла. Падсвядома адчувала: мяне верадзіла ейнае і маё асабістае несупадзенне з векавымі рытмамі. Я спрабавала нешта выправіць, ставіла дома ялінку, вядома, спяшаючыся, у самы апошні вечар. Я выконвала, падкрэслена выконвала рытуальную дзею, але без рэлігійнай веры, якая мусіла б звязаць рытуал з нашым штодзённым жыццём. І дзіця лічыла, што гэта проста чарговы спектакль, хатні тэатар, ня болей. Магнэз рытуалу ня меў сілы.

Свята ўжо хадзіла па горадзе, пад нашымі вокнамі, а мы ня чулі, каб адчыніць дзверы, упусціць яго ў дом — мы ўжо спалі. Стаяла на кухні пустая латка, у ёй я збіралася церці мак на малокі, варыць куццю, да апошняга збіралася. Але... нашыя калядкі толькі на марознай шыбе.

Мы з усяе моцы разгойдвалі наш дом — вось нашай планеты.

Сціралася тысячагадовая памяць роду.

Увечары на пляцоўцы пачула: калядавалі тры хлапчукі, спявалі святочнае. «Чаму на расейскай мове?» — запыталася. Дзеці разгубіліся, заспяшаліся да дзвярэй.

— Мяне бянтэжыць вашая ўпартая арыентацыя толькі на матчыну мову, не зважаючы тое, хто гаворыць і пра што. А на ёй ужо навучыліся размаўляць і сапраўдныя здраднікі, зламыснікі, — абурыўся муж надзіва сур'ёзна, быццам я ўзверадзіла яму нешта вельмі балючае. — З несвядомым чалавекам трэба працаваць, паводзіць сябе калі ты разумнейшай сябе лічыш за іншых, гэтаксама, як пастыр у царкве, на ўзроўні казані. Тым больш, што ён табе часцей невядомы — дыху ягонага не ведаеш. Тлумачыць трэба. Вы не адчуваеце свойскасці нацыянальнай. І маральныя, і палітычныя пытанні вырашаеце па-вясковаму: з каламі адзін на аднаго, вёска на вёску! Нельга так пагарджаць поглядамі тых, хто цябе не разумее, не згаджаецца з табой. Яны разлічваюцца за сваё непаразуменне вялікай

цаной, такой самай, як і ты, цаной свайго кароткага жыцця. Яны плацяць будучыняй сваіх дзяцей. Няўжо гэта ня доказ, што твой супраціўнік мае права на павагу, на спачуванне? Сварай, абразамі ты мне нічога не дакажаш! Не запэўніш, што твая пазіцыя больш вартая за маю, больш чалавечная, не! Гуманную ідэю ў народ павінны несці гуманісты, а не гуманоіды, якія запалохваюць нязвыклымі выхілкамі. Крэўныя толькі тыя, што размаўляюць па-беларуску, а астатнія — пасынкі? Матчына мова, калі яна сапраўды матчына, ня можа раз'яднаць сям'ю, маю на ўвазе нацыю! Як, скажы мне, я магу спадзявацца на тое, што калі ты пераможаш, твая ўлада будзе справядлівейшая? Калі так, дзе падстава? Усялякае зло, самае найменшае, учынак ці слова благое, абсалютнае, як сказаў нехта...

Я маўчала. Ці была я з ім згодная? Але... я здагадвалася, з кім ён спрачаецца. Ягоны лепшы сябра выступіў у газеце з артыкулам, дзе амаль гвалціў несвядомага, так сказаць, чытача, сваімі доказамі. Другі сябар, той пісаў па-расейску, сапраўды, як той пасынак, быў занядбаны на радзіме: уладай, што апазіцыянер, апазіцыяй — за мову. Іх было трое. Трэці ён сам. Ён пакутаваў: з кім? На чыім баку? Ён перажываў крызіс сэнсу. Адышоў ад усіх, хутка і ад'ехаў за мяжу.

Ня памятаецца, каб мы яшчэ калі-небудзь вярталіся да гэтай размовы. Мы рухаліся з большасцю гэткіх самых наежджых з вёсак гараджанаў. Мы яшчэ разам, і кожны раз, калі пільна трэба было ляцець з дачкой на вакацыях у вёску да бабулі, ляцець, як у вырай, мы, вядома ж — у Турцыю.

Мы заглядваліся на чужыя святы, хацелі патрапіць быць сучаснымі. Мы валодалі стратэгіяй выжывання, зусім ня ўмеючы проста жыць. Мы не вытрымлівалі сутыкнення з цывілізацыяй. З ужо наладжаным светам.

Туга, скруха, мне невядомы гэты стан — я вылечылася ад болю адразу, як толькі пачала сама будаваць дом.

«Вось гэта дык гаспад-а-р!» — чула, стоячы на падворку, галасы незнаёмых людзей, ішлі, гуляючы, каля маёй будоўлі. Хоць ты дагані і патлумач: тут ані блізка таго гаспадара! Гэта яшчэ тое сабе, а вось застацца ў доме без мужчыны, што без люстэрка: у мяне гадамі ўборы адным строем. Мне выдавалася: калі я здыму свой фартух, самому Богу давядзецца зачыніць сваю кузню.

Першы пакой, другі, трэці і адразу пусціць туды насельнікаў. Фікус! Італьянцы лічаць яго дрэвам жыцця, гэта праўда. Моцная карнявая сістэма ягоная сцягвала да сябе нават мае перадумкі, адчай. Шост пад столлю каля печы, кубел, скрыні з лазы — усё па памяці, навобмацак сярод звыклых па нашым часе новых бесхарактарных рэчаў. Менавіта найперш куфар. Стары, вялізны, ён стаяў, як саркафаг. Адчыні вечка — дыхаў у твар зямельным тлом, мая складзеная адзежа бы нечыя парэшткі. Там яшчэ жылі духі маіх продкаў. Заставалася толькі завязаць вузёл на апошні час, як рабілі жанчыны майго роду, і скласці тэстамэнт. Без прымусу, намовы і парады, пры сваёй памяці папрасіць зладзіць апошні прытулак, загадзя прыгледзеўшы месца, вядома, на пагорку, паміж Лычоўкай і Дубоўкай. Іншы раз выдавалася, я зачыняла цяжкое вечка куфра над сваёй галавой з поўным даверам да таго свету, якога ня мела на гэтым, і вярталася назад акрыяўшы. Я не баялася, не цуралася старасці, я прымярала ейныя ролі, як даўнейшыя сукенкі з крэпдэшыну.

Старая рэч робіць бясконцасць жыцця ўласнай, як сказаў нехта з геніяльных, вядома ж, мужчына.

Тэраса конча адкрытая, толькі што пад страхой. Заліе, занясе, дошкі пагніюць, ня раілі суседзі. А хацелася, каб так і было, каб хоць адзін «пакой» быў бяз вокан і дзвярэй, з даверам да дажджу, да сонца, да ветру. Няхай сабе і снег забрыдзе сюды, скруціцца, стуліцца белым мядзведзем пад ногі. Тут лёгка ўлавіць першы подых вясны ў твар. Ён асаблівы, гэта калі нехта да цябе раптам з блізкай гаворкай, шэптам. Толькі на адзін кароткі момант, потым вецер падымецца ўверх скапой, развіхнуўшы вялізнае скрылле, пабудзіць дрэвы. Усё навокал дыхае, пацягваецца, пазяхае: сёння якраз Саракі, сорак птушак прыляцела, адна з іх завітала на маю тэрасу.

Ідзеш, і раптам з галавы спаўзе хустка на плечы, як снег на пагорку, сама па сабе, — па цяпле.

«Ты плачаш?» — запытаецца мая сяброўка, пачуўшы мой дрыготкі голас па тэлефоне. Я выціраю вочы, я пярэчу, бо гэта ня слёзы. Гэта як на лісці, на траве, на камянях у самы шчыры ранішні час. А ў мяне ад гэтай самай шчырасці і колькі разоў на дзень, калі адчуваю сваю жывую душу. Жыць, жыць...

Вечарам неяк, выйшаўшы з Мурзай у лес, забавілася, вярталіся ў поўнай цемры. У вокнах гарэла святло. Здалёк дом быццам углядаўся ў наваколле пільным вокам. То, адышоўшы ад акна, святло цеплілася ціхім вогнішчам у каміне, адкідваючы чыесьці цені. «О, ужо ўсе дома!» — сэрца сарвалася на момант. Звычайны флэш-бэк — карцінкі з мінулага жыцця. А я проста забылася выключыць святло, адыходзячы.

Дом выкарыстаў гэта — дом прыкінуўся вясёлым упарадкаваным гняздом. Дом меў сваю волю, як я адчула пазней. І больш не выключала святло, патураючы яму, калі выходзіла вечарамі ў цемру.

Але сыходзіў ад мяне мой апошні сямейнік, старая Мурза, свайго заводу, сваёй гадоўлі, як кажуць. Сыходзіла з дому дзіўная істота. Ад першага дня, усе гады, кожны раз, кожны! Калі падыходзіш да яе, лашчыш, корміш, адчуванне імгненнага пачуцця, быццам удалося злавіць, патрымаць у руках рэдкую птушку, прыручаную толькі на момант. Толькі на момант таго захаплення, што яна табе належыць...

Ноч... Ні здумаць, каб распрануцца, кладуся ў адзежы. Бы я ўжо стала на дарогу нашае бяды, ужо ў дарозе, удзень і ўночы, ужо выправілася, і так да самага скону. Накрыцца карціць (дзіўлюся я з сябе) нечым старым, куфайку знайшла, нечым даўнім, звыклым. Да звыклага хочацца дакрануцца, да тых рэчаў, якія табе доўга служылі, былі ўвесь час побач. Каб было, дык матчынай, бацькавай адзежынай — рызы маіх святых, каб адцягнула ад галавы. Шукаю па хаце, збіраюся ў начную дарогу.

Я ня спраўлюся... трэба ж капаць копку... трэба каго паклікаць. Званок, чую голас блізкай сяброўкі, не паспяваю патлумачыць свой стан — яна спешна развітваецца, бы ўцякаючы ад нас. Адразу сцерліся на маёй дарозе ўсе дапаможныя знакі: я мушу ўсё сама зрабіць, у поўнай цемры, захаваць ад чужога вока. І толькі праз некалькі дзён яна зноў патэлефанавала. «Я спужалася, я ня ведала, што табе казаць, пакуль выпадкова не пачытала: у сабаку чалавек знаходзіць тое, чаго ня можа напаткаць у іншым чалавеку». У яе зусім іншая школа жыцця.

Мурза адыходзіла на канапе, у маіх нагах. Туман уваччу, бы нехта дыхаў у сцюдзёным пакоі на люстэрка. А потым, пахаваўшы, я яшчэ доўга спала на тым месцы, на канапе, датуль,

пакуль холад з пакою не сышоў, ня знікла імжа, каб не баяцца цемры, не баяцца смерці. Мяне сустрэнуць там усе тры мае сабакі... І сказаць сябрам, экстравагантна, па сённяшнім часе, у стылі хай-тэк: пахавайце мяне таксама без труны, я буду яшчэ доўга дыхаць праз поры зямлі, буду жыць, як жыве карэнне. І яны, зніякавеўшы, будуць смяяцца жорсткім смехам. Нечы патрывожаны дух ценем мільгане ўваччу, ценем аж з паўночнага Ўэлзу, XIII стагоддзя, постаць князя Лэвэліна, ён адзін з самых першых у вялікай жалобе паставіў помнік свайму сабаку Гелерту.

Толькі аднойчы дзынькнула шыба вакна ў пакоі, дзе мы спалі з новым шчанюком. Самае першае, звыклае: птушка начная? Нехта кінуў з вуліцы камянём? Потым яўкнула шчаня ў нагах, паднялося і перайшло на другое месца, азіраючыся. Мурза заўсёды спала менавіта там! Спакой сышоў раптоўна, як сон: так, гэта ня птушка і не камень у шыбіну, гэта быў гук расхінутай фіранкі з шклянымі пацеркамі... Мурза наведалася. Яна вярталася яшчэ раз, ёй нядоўга да нас ісці. Душы жывёлаў застаюцца там, дзе пахаваныя, запэўніваюць аўтары эзатэрычных пісанняў, а паводле меркавання будысцкіх настаўнікаў душы жывёлаў і людзей наагул прынцыпова нічым не адрозніваюцца.

Шчанючка пароды шэлці, астраўлянка, любіць станавіцца пярэднімі лапамі на вялікі камень на панадворку і доўга так стаяць, углядацца заўсёды ў адным напрамку. Пэўна, адсюль ёй бачацца родныя Шэтляндзкія астравы.

Мы з ёй былі вартыя адна адной.

Дом падабаўся маім гасцям. Яны наязджалі гуртам, разыходзіліся па пакоях, асядалі там-сям: на высокім куфры, у крэсле-гушкалцы, стомлена, асалавела пасля гораду, як птушкі пасля доўгага пералёту. Весела фатаграфаваліся, іншы раз я здымала сама. Доўга потым разглядаю, што выйшла, бы чытаю пасланні з тае пары.

І раптам вось гэты: мае маладыя сябры, жонка з мужам. Сядзяць у маім улюбёным крэсле. Яна прысела ля яго на поручні, ледзьве нахіліўшыся, ледзьве дакрануўшыся крылом да ягонага пляча. Быццам прысела ў апошні момант, зляцеўшы аднекуль зверху, анёлам-ахоўнікам. Ейная сукня, падол яшчэ аднесены хваляй паветра. Пярсцёнкі на руках – закальцаваная

рэдкая птушка. Твары іхныя, позы разняволеныя, хатнія, яны быццам у сваім доме, яны дома. І гэта не выпадковая хвіліна спакою – яны тут гаспадары, сядзяць, адпачываюць. Яны заўсёды былі тут і ніколі нікуды ня сыдуць. Дом мой іх выбраў сабе, затрымаў, пасадзіў.

Дом мне здрадзіў?!

Я ачахла, разумею, што будавала яго не для сябе адной? І гэты другі, ён існаваў тут побач увесь час, пакуль будавалася? Іншы раз шкодзіў, нечага дамагаўся – дамагаўся маёй рукі? Той гук незразумелы раней вечарамі, у кутку, дзе стаяла крэсла-гушкалка, ён цяпер нагадваў мне, бы нехта раз-пораз выбіваў попел з люлькі, муж ніколі з ёй не разлучаўся...

Вярнуцца?!

Муж цяпер сядзеў насупраць, ён чакаў адказу.

Дом стаіўся, пільнуючы мяне. Старыя рэчы перагаворваліся паміж сабой, бы старыя людзі, седзячы на прызбе. А то стаялі, сцішыўшыся, урачыста, даўнейшым пасагам. Толькі што выкупу ніхто не патрабаваў. І мне заставалася б толькі пераапрануцца хаця б у нешта лепшае, каб пачуць: «О, табе пасуе!..»

Хутка пераводжу размову. Колькі часу ляцець з Амерыкі? Дзе перасядка? Нешта пра надвор'е. Мы не перагарнулі аніводнай старонкі нашага жыццця, гаварылі абы пра што, толькі вецер ганялі туды-сюды. Раз-пораз ён перапытваў нейкія дробязі, забываючыся наразе. Уставаў з-за стала, хадзіў узад-уперад, хваліў дом, і зноў пра тое самае. Хвалюецца? Ці слухае ён мяне?

– Час ляціць хутка, – зазначае сам сабе, – вельмі хутка...

Хутка? А мне выдавалася: я стаю дрэвам у полі, дрэвам з незлічонымі гадамі, дрэвам без узросту, ад усходу да захаду, ад зімы да лета, не захінаючы голаў, поўнае вецце лёгкіх думак, як залётных птушак пералётным часам. І толькі адна балючая думка, ад поўдня да нашай поўначы гэтай вясной, каб які чалавек з ружжом не пераняў птаха ў дарозе да мяне, да майго гнязда. Як гэта «аператыўна» робіцца на Ўрале: забіта шмат – і аніводнага хворага, паведамляецца без спачування.

Ці бачыць муж мяне такой, якая я цяпер ёсць? Да каго ён хоча вярнуцца?

Ён раптоўна заспяшаўся, быццам аб усім ужо дамовіўшыся, звыкла запрасіў яшчэ гарбаты, знарочыста адкінуўся на

спінку крэсла, запаліў люльку. Ён стварaў моманты даўнейшага жыцця паміж намі.

Я, падаючы на стол, адчувала сябе, як у кавярні «бістро» дзе-небудзь пры дарозе.

Хутка і ад'ехаў.

Выйшла на панадворак, хадзіла па садзе. Вось і скончыўся мой жаночы век, думалася пільна. Глядзела сабе пад ногі, быццам недзе менавіта тут знаходзіўся пункт незвароту, як кажуць псіхолагі.

Нехта паклікаў. За плотам стаяў мужчына: мардаты, барада саламяная, увесь у гліне, у цэгле — чысты гліняны Вялес! Ледзь пазнала: будуецца недалёка, пад лесам, разводнік, казалі бабы. Здаецца, яшчэ недзе бачыла, так... у акрэсцінскім пастарунку, нас разам затрымалі на плошчы... Так, гэта ён.

Гліняны Вялес папрасіў вады. Адзін кубак, другі, трэці, знарочыста марудзіў. Хацела забраць вядро, ён запыніў:

— Я доўга буду піць, — сказаў, гледзячы ў вочы, грымнуў уладарна, аж, здалося, над домам, над садам да лесу — рэхам.

Божа... у чым я... у што апранута... як я выглядаю? — сполахам пранеслася ў думках, высвечаных да дна, бы маланкай, нечаканым першым громам. Хіба толькі ў люстэрку поўні я бачыла адбітак свайго твару, гадамі стоячы ноччу ў акне, углядаючыся. Твар невыразны, з мінай нязменнай вартаўніцы свайго зорнага дому.

У паўдні заўважыла, перад каменнай дарожкі ў садзе вільготны цень ад падземнага ручая.

Пэўна, ён змяніў сёння свой напрамак да мора, пайшоў праз мой сад. Запульсавала ягоная таямнічая вена зусім блізка...

РЭЛІГІЯ САДУ

Першы гром як навіна. Што б ні рабіў, кідаеш з рук, нешта хаваеш пад страху, зрываеш з вяроўкі ў садзе бялізну — і раптоўна спыняешся з ахапкам прасцірадлаў пад дажджом. Голас крохкі. Пярун, як разгневаны садоўнік, вырываў з коранем яшчэ маладое храскае сцябло маланкі і трушчыў яго праз калена.

Дождж буйны, з пераходамі, цёплы, як сок са сцябла, пырскамі ў твар.

Адчыняецца неба. Гром бомамі на званіцы. І цяперака мы ў вёсцы будзем часцей падымаць голаў да неба, каб не заліло, ня збіла градаўем, ня высушыла, не спаліла. І са страхам, і малітоўна, і веруючыя, і зняверaныя — адна парафія. І сам іншы чалавек не здагадаецца, што моліцца — сцішыўся, сцяўшыся.

І я тут у садзе з усімі разам.

Бомы званоў каля царквы Магдалены, зусім нядаўна, на Вялікдзень, таксама спынілася раптоўна, стаю, слухаю. Ідуць жанчыны майго веку, спыняюцца каля мяне. Так звычайна спыняецца каля цябе чалавек, калі яму выдасца, што ты нешта бачыш у небе і таксама падыме голаў. Ловім гукі, мы асыпаныя гукападам. Спадаюць то драбніцай, то буйна, зрэдку, пераходамі, бомы па стрэхах, па вокнах, коцяцца на зямлю, пад ногі, знікаюць у зямлі, будзяць — мы стаім якраз на былых старых могілках. Спыняецца на момант вада ў рацэ напроці царквы, далей яна ўжо ідзе пасвянцоная. Пабыўшы, мы разыходзімся, пакідаючы нашу маленькую стыхійную парафію. Жанчыны ўсміхаюцца, ідуць несучы таямніцу: уваскрашэнне мае быць, яно магчыма ўзапраўду. Яны ішлі без дарогі, быццам нанова шукалі сваё месца на зямлі ці прыпаміналі тое месца? Ці збіралі кветкі ў лесе, у садзе, якіх яшчэ не было.

Чаму я з імі не загаварыла, успамінаецца мне, яны ж былі такія лагодныя, ясныя? Хаця.. Хаця нашыя немаладыя людзі гэтага свету зусім накшыя...

Навальніца! Адчыніў дзверы ў хату, дом патыхне насустрач у твар сырызнай, ён дыхае навальніцай, быццам толькі што зачыніліся самі па сабе яшчэ ад зімы падвойныя вокны, як я ўвайшла. Срэбным пярсцёнкам стукае дождж па юшцы ў коміне. Дом сам пільнуецца пагоды. І абы толькі сонца, задыхае лёгка, заходзяць пад нагамі палавіцы, голасна, клавішамі старажытнай просценькай музыкі. Дом дыхае садам.

Дом шпакоўняй на дрэве.

Сонца, сонца напоўніцу. Але на зямлі нябесная прахалода — зацвілі яблыні. Ходзіш па садзе, як паміж бела-ружовымі аблокамі. Бусел ляціць высока ў небе, а я галаву прыгінаю, уцягваючы ў плечы, бы ён зусім побач, можа зачапіць мяне сваім цяжкім скрыллем. Птушкі прылятаюць вясной раней

за мяне, пэўна, з Афрыкі бліжэй да майго саду, чым з Мінску. Пасяліліся каля самага ганку, пад вокнамі ў ружычцы. Пільнуешся гнёздаў, бароніш ад сарокі, яно каторае амаль у тваіх жменях гадуецца.

А над усім на страсе грае вецер на тэлеантэне, як на растапыраным азяродзе ўсё роўна.

І наагул, усе вятры, якія ёсць, заходзяць сюды ў сад да мяне, збіраюцца, а потым ужо разлятаюцца па свеце. У адну хвіліну ўсё патаптана, бы ў момант прызямлення вялікага цяжкага цела. І ціша. Можна падумаць, што я адсюль даю ім напрамак, як уладарка вятроў. Адно каменне ляжыць набычыўшыся халодным ілбом, яно і мой лоб студзіць, супакойвае. Мне трэба цяпер перабраць габэлен саду нанова, па нітцы: па сцябліне, па кветцы, паспець да ночы — назаўтра мяркуюцца быць госці. Ледзь ад стомы згледзіш, а можа здасца: павучынне над сухім ручаём на захадзе сонца рознакаляровае, усходнім шоўкам, бы нейкая вясёлая багавіца, абрындаўшы крысо, праляцела над садам. А можа, развіхаецца з кокана начны матыль ці ядвабнік. Потым... потым мне б нарэшце рукі скласці, толькі ці ўдасца ўцячы ад работы. Каб хто рукі мае сома склаў на калені, сцішыў, супакоіў. І не тады, не на апошнім часе, калі на грудзях, уторкнуўшы абраз ці насоўку, а зараз, пры жыцці, пры садзе, пры вечары.

Садзіцца сонца, сумежваюцца ягоныя вейкі. Сутонне пакояў, ціша. Не паліце святло на змроку — я сяджу каля калыскі, пакуль сонца не засне. Не паліце святло. Бліжэй падступаюць да вокнаў дрэвы ў садзе, сумежваючыся ў мяне над галавой. Не паліце святло на змроку...

Сад. Мне ня хочацца зачыняцца ад яго нават на ноч, не адыходзіцца далёка ў снах.

Выходзіш раніцай на тэрасу, туман у садзе як тваё соннае вакно, таксама яшчэ забеленае фіранкай — з аднаго пакоя ў другі.

А вось і госці! Расчыніліся веснічкі, яны ідуць павольна, урачыста, працэсіяй, трымаюцца адзін ад аднаго пэўнай, счытанай, можа, недзе ў сярэднявеччы, адлегласці, хоць іх толькі чацвёра. Толькі што, даруй Божа, абраза ў руках не было, не, праўда, абраз быў, як потым аказалася — у падарунак. Тры жанчыны і з імі анёл Антык, як я яго заву за вочы, наш

анёл-ахоўнік. Постаць ягоная з апушчаным скрыллем, заўсёды павольна падымае на цябе вочы, можа сказаць ні да таго нешта грубае, брыдкае, сам таго не разумеючы, бы яго навучылі гэтага тут, на зямлі, благія людзі. Анёл Антык самы таленавіты сярод нас, яму выбачаецца. Да таго ж ён ахоўвае ўсіх, абы хто піскнуў па жыцці, ушчаміўшыся, асабліва адзінокіх жанчын.

— Ты... у галёшах?! — роспачна пужаецца адна з іх, Гілена.

Уся працэсія бунтуецца.

Вось табе і маеш! я ж быццам і рыхтавалася. Я добра ведала: яны прыязджаюць да мяне, адзінокай жанчыны, як да хворага, зрэдку наведацца. Яны кідаюць у горадзе свае справы, ахвяруючыся, і трэба, каб гэта было ўрачыста. Яны пільнуюцца моманту, калі Бог прыме іхнюю ахвяру, і дапаможа ў іхняй бядзе, яны таксама адзінокія, акрамя анёла Антыка. Маўляў, Бог будзе ім павінен, бо яны прыйшлі наведаць сірату, што ў перакладзе для веруючых — божае дзіця.

Заўсёды іхныя прыезды адным строем. Ведаю: жанчына без мужчыны — гэта астраўлянка. Яна далучаецца да людзей з асцярогай: доўга шукае закінутыя недзе вёслы, пакуль адважыцца адпіхнуць човен ад свайго берага, каб дастацца да мацерыка. Але ж... Працэсія рушыла ў сад, я засталася ў доме тое-сёе падстроіць, і як аплучэнне: апынулася ў чужых, незнаёмых памяшканнях, таксама... у гасцях. Хадзіць па сцяне, трымацца аберуч, каб ня віўкнуць, каб не асунуцца з крэсла, ужо седзячы за сталом, у тыя галёшы. Трэба патураць, бо незалюбяць тваёй вольнасці, увесь час утойваць, як нешта недарэчнае, смех, радасць ад сустрэчы. Я іх любіла, як яно ёсць, баялася вымкнуцца, каб не парушыць іхняга абраду. І ўсё ж пераадольваю сябе.

...і легкадумна выхінаюся з вакна,
Бы тое цікаўнае дзіця,
Што тры вякі назад
Згледзела тут караля...

Маю на ўвазе свайго госця ў садзе, мужчыну, вядома, клічу ўсіх да стала.

— Ратуйце! Ты тут у садзе апраджэсся за гэтай работай, выцягнеш ногі! — крычыць анёл Антык. — Дзіва што ў нас няма

вялікіх мастакоў, пісьменнікаў, яны ж усе дылетанты! Яму катораму кавалак зямлі – і ён прапаў! Гэта несур'ёзна!

– Я люблю жыць... – кажу, седзячы недзе ў куце.

– Якое тут жыццё ў вёсцы? Пагаварыць няма з кім! Ну, сёння пра буракі, ну, пра каларадскага жука, а назаўтра пра што?

І бясконцыя пытанні, папрокі.

Жанчыны маўчаць. Яна каторая размаўляе, як прыснуўшы на пяколку: гаворыць, а ў цябе адчуванне, што гэты голас з апачывальні, што і сам ты трапіў незнарок у чужую спальню і трэба толькі, як раяць варажбіткі, узяць за мезены палец, націснуць і пытацца, тады яна табе скажа, што думае. Нарэшце бяседзе ўдаецца ўзбіцца на Маркеса, пераклад ягонага раману ў «ARCHE».

– Трэба любіць сваё, – набожна зазначае нехта з іх.

– Маркес нікому не чужы, геніяльны творца счытвае ў нэасферы напрацаванае тваім і маім духам, ён належыць усяму чалавецтву, – не ўдаецца змоўчыць.

– А вось ты N чытала? Ягоныя ўспаміны? Вельмі цікава, – пытаюцца.

– Жыццё нашых «святых» сучаснікаў я не чытаю, акрамя Францыска з Асізы, – кажу знарочыста нахабна, крыўдзячы ўсіх з нататкамі, зацемкамі, аскепкамі, схамянуўшыся, абяцаю сабе, што болей я анішэп.

Пра што была гаворка далей, цяжка ўспомніць – ціха, урачыста, як заўсёды: выставы, літаратура. Тое-сёе, ага, вясна, маўляў, затрымалася сёлета на два тыдні. Загаварылі аб гэтым узрушана, усе разам, бо кожны ў гадох. Праўда, і ў мяне за садам нядаўна ўзаралі поле, быццам на пачатку вясны. Зямля перавярнулася на другі бок, адгарнуўшы некалькі старонак жыцця назад. І такая радасць пражыць тыя дні спачатку, нешта выправіць, паспець зрабіць тое, што ўпушчана, сказаць тое, што не сказана – пражыць даўжэй. А на самой справе проста ўзаралі пазней, каб пасеяць кукурузу на сілас, па цяплу яе сеюць. Мне дык калі нават сярод лета суседка развесіць у сваім садку сушыць белыя прасцірадлы, выдаецца, што сад зацвіў ізноў. Ейны мужык, пчаляр, у белым, ходзіць па садзе старэчымі, зыбучымі крокамі, каб ня ў ботах, дык як паміж аблокамі – ловіць рой.

Белы колер вясновага саду – колер душы, вызваленай ад цела, колер духу.

Пра што гаварылі? Толькі пасля. Як госці ад'едуць, буду перакідваць з далоні на далонь іхняе кожнае слова. Як гарачую бульбіну з агаркамі, выхапіўшы голымі рукамі з вуголля, пакуль не астыгну.

Мы размаўлялі, а Гілена сцішылася і раптам пачала спяваць, ледзь чутна, сама сабе, бы седзячы ў адзіноце каля вакна. Спрабавала то адну мелодыю, то другую, якую песню падабраць, толькі што не пыталася ў некага. У нас у вёсцы апявалася ўсё, што рабілася, што ў рукі бралася: серп ці іголка з ніткай, усё клалася на мелодыю. Цётка мая Марыля ў хаце шые, шые нешта грубае, дрэнна бачыць, шывок вялікі — цягне нітку, цягне голас, кончылася нітка, адкладае шкубок — і адразу сціхла. Пад акампанемент калаўроту звычайна адна тое: «Агонь зальеш вадою, любоў нічэм нільзя». Слухайце, дык гэта ж раманс!

Эпоху расейскага рамансу ў нашай заходняй вёсцы лягчэй пазначыць, усім вядома, чым гішпанскага, дзе той раманс і нарадзіўся. Пяюць мужчыны, нехта самы галосны выбіваецца, як макаў цвет на ветры сярод аднастайных званкоў. Адыходзячы ад мелодыі, пушчаючы голас ва ўсе бакі, клічучы, далучаючы ўсіх да сябе, збіраючы па полі, па лесе, у грыбах, па балаціне, у п'яніцах, па хатах — хто дзе ёсць. І ізноў роўненька з усімі, як ветрам яго пахінула да ўсіх.

Чаму зімачка, маразлівая,
Рана наступаеш...

І цяпер торгнешся, карціць адазвацца, пачуўшы голас Івана Кірчука, бы зблудзіўшы на балоце, надыхаўшыся п'янкога багульніку ў горадзе.

Гілена ціхенька спявала, падбіраючы голас, як у руках ніты рознакаляровыя, седзючы за кроснамі. Стукаў посуд — я ставіла на стол, нехта выпадкова зачапіў бомы на тэрасе, зваліўся відэлец — гукі, як з аркестровай ямы, ляпнулі дзверы вечкам раялю. Але, як той казаў, ніхто «на хорах» яшчэ не з'явіўся. Пакуль мелодыя не прыйшла з саду, камертонам. І Гілена падхапіла, узяла тую ноту, заспявала ўпэўнена, дзівячыся сама з сябе, дзівячы нас. Нехта паспрабаваў далучыцца, і ягоны голас паў долу.

І мне здавалася, што ўсе зразумелі на той момант, што наогул усё нашае жыццё — у садзе.

А маё дык найболей. Чаму ў галёшах, перапытвала я моўчкі, дакладалася анёлу Антыку. Дом — гэта проста сходкі ў сад. Я бачу работу, чую яе, мяне амаль клічуць да сябе — голас саду, ён патрабавальны. І калі што не ў парадку, у мяне ў самой збіваецца пульс. Сад квітнее, сад пануе — я слугую яму. Мне не паспець абуць нешта накшае, з спронжкамі й матузамі, акрамя галёшаў, я павінна ўскочыць у абутак абедзьвюма нагамі, на ляту. Тады ногі, як камлі дрэва — не сысці з месца, не ўцячы адсюль у горад, каб даць сабе аддуху. Мне няма часу чакаць, пакуль я памру, каб адпачыць — мне трэба рабіць работу. Смак працы, смак стомы, асесці на крэсла, калі заходзіць сонца, той жа цяжар у целе, як у прыліва да берага і адліва, і ў сонца — у адным рытме з уздыхамі вечаровай зямлі.

Іншы раз зайдзіцца да мяне чалавек, нешта гаворыць, а як аглухшы, я ня чую, адно наўмя, што стаю з ім, губляю час: а якраз жа планавала апырскаць белую ружу ад тлі і замарудзілася, і яшчэ нешта пільнае, і яшчэ. Я што, атрымліваю задавальненне толькі ад працы, палохаюся? Ружы перараслі мяне самую, заглушыўшы мае эмоцыі?

Затое сад ноччу, ягоныя цёмныя пакоі — гэта ўжо сад-палюбоўнік. Патаемна ад усіх прабіраюся да яго шуламянкай. Нашыя ўцехі — у мяне мокрая сукня ад расы.

Кажаш, няма з кім у вёсцы пагаварыць? Сад — чараўнік, зона тантрычных сілаў. Чуеш, як спявае Гілена? А твой першы прыезд да мяне з жонкай? «Я вам напішу», — сказаў ты раптам у садзе, ужо развітваючыся. Твая жанчына, заўсёды заклапочаная, бяз дай прычыны, як кнігаўка на лузе, пры гэтых словах да мяне быццам набрыняла прыгажосцю. Стаяла стромка, нерухома, высвечаная да пятак сонечным ліхтаром сярод шатаў цені — незнаёмай, неспазнанай намі ўсімі дагэтуль мармуровай багавіцай у канцы далёкай алеі. Такія твае словы, як трызненне, дарала сказаць толькі ў садзе, бо твае лісты хутка і скончыліся, калі надышла восень. А мне дык і зімой у горадзе: неспадзяваная сцюжа, гурбы да плячэй, арышты коннікаў Пагоні, здрады, роспач, — адзінае, што дазваляла яшчэ спадзявацца на змыслы ў свеце, гэта тое, што ружы ў садзе былі добра накрытыя ад маразоў.

Прырода нам здраджвае, злуешся ты, маўляў, ня варта так шчыраваць. Але нават пасля Чарнобылю (ня еш гэтага, ня пі, не выходзь на сонца) я да яе іду, хінуся, як да хворай маткі — адной лыжкай, з адной міскі. Бо я напоена малаком... раслін...

Алтай, ссылка, зямлянка, нарадзіўшы дзіця, маці не прыціснула да пустых грудзей, спусціла мяне на зямлю, як скінула, толькі што паслала сушэйшай саломы. Цяпер галоўнае выпаўзці наверх па склізкіх сходках, цягнуць у рот, каштаваць усё спарадку, набываючы з часам жывёльны інстынкт. Карэнне, зернюкі, атруціцца прывабным макавіннем дурману — аджыць; зашчаміцца на ноч паміж козамі (мы жылі з імі разам, адной сям'ёй), як абрасці поўсцю — холаду не пачуеш; парваць на сабе скуру, лезучы праз шыпшыну ў гарах, і запячы рубцы на сонцы. Навокал квітнеў сад — Алтай гэта суцэльны сад. Ён падымаўся ў горы, пераступаў шчыліны, разломы ў скалах, патокі вадаспадаў, ручаі, слаўся імхамі, малодзівам па каменні. Усё навокал буяе квеценню, фарбамі, звініць вясёлымі галасамі, і ніхто анікому не гатуе ў тым садзе адмысловай ежы. Я таксама не памятаю пачуцця голаду. Трапна зазначыў Юнг: дзіця валодае звышчалавечымі сіламі, яно прызначана на выжыванне — дарослыя маіх іспытаў не вытрымлівалі.

У пошуку цыбулін лілеі саранкі, дзікага чосніку зблудзіць у гарах і заўсёды знайсці нюхаўкай свой след — дамоў, бы цябе выводзяць за руку кусты, дрэвы, каменне. Памкнешся да людзей, да статку чалавечага, а бацька мясцовай дзяўчынкі, убачыўшы нас разам, скажа: «Не сябруй з ёй, яна пабірушка!» Як нагой, адкіне цябе ізноў на «пашу», бы жывёліну. Але мы ніколі не жабравалі. Зімой мы абміралі, як расліны, як дрэвы. Загінуўшых ад голаду не маглі пахаваць, немагчыма было дастаць да зямлі, яны ляжалі ў глыбокім снезе да вясны, як заспетыя стыхіяй чалавечай варожасці, злосці. А мы ў зямлянках яшчэ краталіся пад імі. Пэўна, таму не баюся могілак.

Усё адбывалася ў садзе.

Вясной (мы тады ўжо мелі дазвол жыць у горадзе, у падвале), вечарамі перад домам збіраўся жывы сасланы люд, самаволка, спявалі, танчылі пад гармонік. Ня памятаю твараў, вось толькі зіхаценне энергіі з адталага па вясне цела, сіпатыя галасы, як з запалу. Як скрыгат скарыстанага крэсіва: «На подолю бялы камень...»

Спачатку каторы адлучаецца ад натоўпу, ідзе на сярэдзіну, ходзіць па крузе павольна, вочы долу, ходзіць, мацае зямлю пад нагамі і раптам як выхапіць нож з кішэні, ускідваецца шылавата, выпростваецца — і ўжо над усім! Кроіў гэты свет, морак, чужыну смылючым адчаем. Потым гэтак жа раптоўна супакойваўся, закідваў рукі за голаў, ужо бы ён на нарах, у сне, ляцеў у танцы невідушча па крузе, лёгка, чыста. Жанчыны не адважваліся напачатку ўступіць у мужчынскі танец, пакуль ня выйдзе з нутра танцора ўвесь чад... Гэта была жудасная па сваёй прыгажосці «эстрада». Я вярталася, нагледзеўшыся, у падвал і спрабавала, вучылася адбіваць «дробі» (стэп). І цяпер умею. Жыць з астатніх сілаў, спаць класціся з закінутымі за голаў рукамі, хай сабе на нарах — кажуць... кажуць, што гэта звычка тых, каго моцна любілі ў дзяцінстве.

Усё адбывалася ў садзе.

Цвілі іберыс, наперстаўка, лілея саранка, жаркі, нязмушана, без чалавечай дапамогі, усё тое, што я зараз па каліву збіраю, разводжу ў сваім садзе. На халеру табе гэты напамін, я б і ў той бок не глянуў, дзе растуць тыя алтайскія кветкі, зазлаваўся б ты, і наогул, табе яшчэ анідзе, ты неяк казаў, не даводзілася бачыць такога стыхійнага саду, што праўда. Лес тут у мяне побач, ён падсяляе мне сваіх дзікуноў: чарнагалоўку, зуброўку, брызгліну, медуніцу, залётнік, розныя травы, падсылае сваіх птушак. Яны начуюць у садзе на лаўках. Я зараз моўчкі дакладаюся табе і самой сабе ўсё жыццё, высільваючыся ў гэтым садзе, сцягваючы з палёў калісьці раз'яднаныя камяні, складаючы з іх сухі ручай. Па ім вясной з гор бегла на Алтаі талая вада, а ў мяне ейны след высах. Толькі трэба ўспомніць, складаючы, намацаць месца кожнага каменя, як пад нагой у поцемках, каб стрымаць моц высокай вады. Праясніцца раптам лік каменя, выцягнутага з рова, і гэта ўжо бог Саду: прыжмурана адно невідушчае вока, скамэршчаны нос, ледзь прыўзнятае цяжкое падбароддзе, бы ад задавальнення ў хвіліну, калі распазнаюцца пахі кветак у паветры, іх поры цвіцення. Яшчэ вунь камень. Стары алтаец сядзіць каля пагорка, зморшкі бягуць па твары дробнымі хвалямі, зморшкі старых гор, згладжаных вадаспадам веснавой вады, як сляды замілавання. «Гэта пераклад на беларускую глебу з італьянскай», — кажу іншы раз таму-сяму з гасцей, ведучы на патыё — каменны дворык для

кавы, гарбаты. «Ты ведаеш італьянскі?» – перапытваюць няўцямна. Я ведаю італьянскі нагэтулькі, наколькі ведае яго мой сад, які ў італьянцаў нязмушана пераходзіць у лес, да натуры, не абмяжоўваючыся культурай. Ну, гэта ўжо варыяцыі маёй любові да Італіі. Чорны камень каля ганку, пэўна, ноччу спіць цяжка, хваравіта, бо раніцай хоць ты твар ягоны крысом абцірай – буйныя кроплі поту. Можна падумаць, што ён пераляцеў, жыляючыся, услед за мной, як у паданні недзе каля Цярэнскага мора: гара па паветры ўслед за манахам, які вярнуўся з падарожжаў. Гэты чорны камень памятае ўсё, пачынаючы ад стварэння зямлі.

Затокі юлёвыя дзікага чорнагаловіка, рамонкаў, затокі жаркоў, сцежкі камяністыя, сухія ручаі, цясніны – сон глыбокі, часцей сон павярхоўны, калі толькі задрэмлеш, калі яшчэ зусім не адышоў, на самым пераходзе ад бадзёрасці да сну. Хаджу з ліхтаром памяці ў руках, святло выхоплівае дрэвы, камяні, людзей, як здані. Мне мусова тут, у садзе. Прыпомніць, знайсці на смак, як у дзяцінстве, тыя расліны, дрэвы, таго, хто карміў, хто гадаваў. Тады, можа, удасца ўбачыць выявы родных – іхных твараў ня памятаю, аніводнага іхнага асабістага руху, толькі на фотаздымках. Назвала свайго сабаку Мурзай (бацькі так звалі сваю сучку, калі яшчэ жылі ў маёнтку), каб, вымаўляючы слова, дакрануцца вуснамі да гукаў, – перахапіць вокліч з ганку каторага з іх, пераняць сваё рэха ў лесе – бацька любіў паляваць, казалі. Гэтаксама, як нядаўна выпадкова пачутае слова «доню». Доню? – я напружылася, застрыгла вушамі, як сабака, які даўно згубіўся, мае новага гаспадара, і вось пачуў неспадзявана сваё сапраўднае імя, атрыманае яшчэ шчанюком. Што тут у гэтым слове, на чужой мове, здавалася б? Але вось гэтае «ю»... сцішыўшыся на канчатку пры вымаўленні быццам даўно знаёма... гэтае польскае Зосю, Чэсю, Марысю, хатняе, замілаванае, гэтае юлёвае «ю», захопленае ўсёй ніжняй губой, да сябе, западае адразу ў сэрца, каго клічаш. Да мяне так звярталіся, хіба?!

Мой характар, мой лёс залежыць ад смаку ягады кісліцы (дзікай парэчкі), ад горнага паветра, у шчылінах гор яго не адрозніць ад вадаспадаў, ад празрыстай вады ў каменных жменях. Той куток ува мне заўсёды, я адтуль гляджу на свет. І бачу... сад.

Ніхто мне, акрамя траў, дрэў, гор не засланяў даланёй вочы, каб не пашкодзіць сэрца, калі маці адсаджвала ад усіх, як шчанюка, ставіла міску з ежай на парозе ў зямлянцы, дагаджаючы пану бацьку? Самі елі на лавах, а я, уся ў струпах, укарэўшы, натурыста ізноў і ізноў шчамілася да іх, да сям'і, да чалавечага роду. Распавядаю табе, анёл Антык, пра гэта першаму, першы раз усведамляючы: вось чаму я заўжды галодная ў гасцях і пры гасцях — я не люблю есці за агульным сталом. Ніхто, акрамя траў, дрэў, гор, калі адзін за адным вымiралі, першым — бацька. Калі ўжо было дамоўлена аддаць мяне бяздзетным палякам (яны атрымалі дазвол пасля рэабілітацыі ад'ехаць у Польшчу) і ў апошні, самы апошні момант маці ім адмовіла. Бяз ласкі, без любові, можа, на астатнім зруху мацярынскага сэрца, скора і згасла, адгарнула мяне, як чапялой, ад панскага звання ў свой сялянскі кажух (яна была сялянка). Ніхто, акрамя траў, дрэў, камянёў, ня памятаецца, каб. Успамінаю бяз жалю за сябе і крыўды, нічога ніколі не аналізую — для мяне гэтыя сполахі памяці, як цудам ацалелыя ў вялікім вогнішчы, знойдзеныя на попелішчы дарагія іхныя рэчы, як доказ, што бацькі ў мяне ўсё ж такі былі. Мне ёсць на тое вышэйшая забарона.

Чаму я ў чорным, запытаўся ты неяк. Белае пасуе ўсім, чорнае толькі прыгожым, адказала табе, смеючыся. Але ж што тычыцца колераў, чорны мае трыста шэсцьдзясят адценняў. Ён паглынае святло нябескіх садоў.

...Здавалася, што яму хацелася,
каб увесь свет, уся шырыня бясконцых
прастораў, пачулі яго і
ўсё, што ёсць жывога на свеце,
зышлося да яго і глянула,
якою вялікаю
радасцю
ахоплены чалавек
ад сваёй адзіноты...

Гілена замаўчала. Я прасіла спяваць яшчэ і яшчэ.

Раптам яна надзьмула шчокі, пераклала мелодыю раманса на жалобны марш, быццам ідучы з духавым аркестрам за нябожчыкам.

– Не ўходи-и, бум-бум-бум! Побудь со мною-ю, бум-бум!

– Ня трэба, Гілена, ня трэба… – ледзьве прамаўляю.

Спыніце гэтыя хаўтуры ў маім садзе! Усе смяяліся, хаўтурныя бомы неспадзявана забаўлялі гасцей. Як зацменне – я ў поўнай цемры тое, што было ў руцэ ці пад нагамі, маланкава шпурляю ў іхны бок, спрабуючы таксама засмяяцца. Голас сціх. Мне толькі заставалася, шуткуючы, як у рэкламе, манерна прадзьмуць гарачы ствол «лявольвера». Але… але калі праяснілася, усе глядзелі на мяне моўчкі, зніякавеўшы: я трапіла ў самага слабага сярод нас, амаль разгубленага чалавека, у Гілену. У дзяўчынку, якая ўсё сваё дарослае жыццё глядзіць збоку праз дзверы ў дзіцячым садку, дзе працавала ейная маці, як тая песціць на руках чужое дзіця, зайздросціла яму – разлучыўшыся з мужам, маці, як змярцвела, ніколі яе не лашчыла. «Што ўва мне ня так?!» – запытальна глядзіць Гілена на людзей увесь свой век, на знаёмых і сяброў, не давяраючы ані ім, ані сабе. Лёгка абразіць, пакрыўдзіць чалавека, калі ў ягоных вачох заўсёды стаяць слёзы.

Я трапіла ў дзяўчынку, якая была і ўва мне самой – мяне таксама ня бралі на рукі. Тое ж дзяўчо, толькі з той розніцай, што ўсё жахлівае адбывалася ў садзе.

Ты не ратаваў мяне, анёл Антык, нават не паспрабаваў расшуткаваць. Усе заспяшаліся ад'язджаць. Я, вінячыся, кінулася ў сад, нарэзала ўсім па снапу рамонкаў у дарогу, сярпом, усё спарадку, як яны раслі. Гілена метадычна перабрала іх, галоўка да галоўкі, адкінуўшы дзікія травы, зёлкі, як мне дык самае гаючае і прыгожае, тое, што высцілала ўсе мае шчаслівыя выратавальныя сцежкі. Адрэзала доўгія сцябліны, бы ідучы… на гарадскія могілкі.

– Ты тутака паня… – скажа нехта з іх, з папрокам, амаль абразліва.

Я прыняла гэтыя словы з сумнай пагардай. Толькі каб гэтай пані ўдалося калі рукі скласці ці каб хто іх сома склаў на калені, сцішыў, супакоіў, каб думкі мае пераняў, як шалёных коней, паставіў у стайню.

Выйшлі, развітаўшыся, таксама працэсіяй, таксама моўчкі, не кратаючы ні рукамі, ні нагамі, як цені. Яны паедуць, яны пакінуць мяне ў доме, зачыняць мае дзверы звонку і ключ згубяць. Будзеш сядзець недзе ў кутку сцішана, труднаваць, што

не паспела сябе спыніць, век я іншы раз з людзьмі, бы з агнём, цеплячы печ: языкі полымя, як дотык, заўважаю толькі тады, калі ўжо на руцэ апёк, знак, і дзіўлюся, што не баліць мне на разе. Сядзіш, пакуль не дасіся ў захраслыя зверы бурай, ня выб'еш нагой на ўсю хляпу, бы ў старым пакінутым доме, каб засяліцца ў ім ізноў, нанова. Разглядаешся, ачомаўшыся: ага, тут яшчэ цэлыя вокны, яшчэ моцныя масніцы, ага, ёсць нават... сад?! І ўжо маркочуся: ці прыедуць яны ўсе калі да мяне болей...

Усялякай парой, заўсёды, буду сустракаць у садзе... Гілену, заўсёды на адным і тым жа месцы, як садовая скульптура. І цяпер ужо бачу яе з ганка. Стаіць, апусціўшы рукі сцяблінамі, спляла пальцы, вянком трымае іх перад сабой, бы зняла той вянок з галавы на якое язычніцкае свята, каб кінуць, варожачы, на ваду. Ззаду і перад ёй глыбокая плынь зеляніны саду. Вейкі змружаны, уся ў белым. Мы не размінёмся на сцежцы, я буду абыходзіць гэтае месца, бо ёй не падняць на мяне цяжкія мармуровыя павекі: яна чуе толькі сябе, сваё загаданае на вянок...

А сад задуменна шапацеў лістотай, перабіраючы, гартаючы, як ноты на пюпітры, рыхтуючыся да новых гасцей. Праўда, трэба клікаць, спяшацца, пакуль цвітуць брацяткі, маргарыткі, бо назаўтра сад можа быць як чарствы пірог. Сыходзіць веснавая пара, ужо хутка падымаецца новая хваля, высокая хваля белага пярэтруму — прыйдзе лета.

Паклічу да сябе самых улюбёных майму сэрцу сяброў — вялікае сямейства ружакветных, як я іх заву за вочы. Гаспадар сямейства будзе прыпамінаць, забыўшыся, як завуць майго сабаку, усе астравы Сяродземнага мора спарадку, бо бываюць тут зрэдку. Нарэшце назаве Сіцыліяй замест Мальты. Яны ўсе з машыны, як з адчыненага лятка пчолы — адразу ў сад. Кветкі гойдаюцца пад імі, пылок курыцца з-пад падэшваў. Штовосень ягоная жонка крыху здзічыўшыся, скасавурыўшы біблейныя вочы, каторы ўжо раз будзе пытацца: «Сядзіш тут, мерзнеш, чакаеш, пакуль ліст ападзе, каб згрэбсці, ехала б ты ўжо ў горад, да цяпла». Я таямніча прамаўчу, запалю яшчэ адну цыгарэту, напусціўшы вакол сябе дыму.

Я калі-небудзь ёй адкажу: гэтыя лісты... да мяне, іх трэба кожны разгарнуць, перачытаць і даць адказ... тэрмінова, да снегу...

ПАД'ЕЗД

Зімой у скверы па цаліку, абы крыху развіднелася, прадзе мелкі след бадзялы кот, прадзе бадзялы сабака і ейны след, чалавечы, глыбейшы — тры вяровачкі пераплятаюцца, слабка сучацца. Выспамі чарнеюць купкі дрэў, высока ўзнесеныя гнёзды яшчэ сонных чорных птушак. Завея пройдзе за імі ззаду, загарне сляды ў тугія скруткі, і так з дня ў дзень. Вяртаецца яна з сумкай пустых бутэлек, часта і паражняком, на твары заўсёды спакой, бы вяртаецца пасля ютрані, толькі што трэбніка ў руках не трымае.

Зняла з падолу кружалку дзядоўніку. Спынілася ў пад'ездзе каля батарэі, каб абагрэцца. У ейнай кватэры было выбітае акно, і аніяк не траплялася выкінутае на сметнік шкло. У пакойчыку толькі сцежка, абы прайсці сесці ці легчы, тут дажывалі свой век знойдзеныя старыя рэчы. Белы буфецік спінай да ложка, падціснуўшы бачкі, самаробны. Фарбы састарэлі, размытыя, бы дажджамі, там-сям на дзверцах юлёвыя плямы, як на камізэльцы ад чарніла. Поўна рознага посуду, з разводамі, расколінамі, і здзівіўся б, калі б не знайшоў тут адмысловых аксесуараў, да прыкладу, падстаўку для лыжкі, падносік менавіта для алівак ці пірон, графін для халоднага белага віна. Высокая кульгавая кансоль, скураны задуменны фатэль са збітымі каленькамі падлакотнікаў. Яна вярталася сюды, астылыя, аджыўшыя сваё рэчы ажывалі. На сухім выпетраным дрэве выступала смала-жывіца. Струменілася асаблівае цяпло, уласцівае толькі дрэву. Закраталася каліўе малюнку на шапе. Пакой напоўніўся ледзь улоўным хатнім чадам, водарам падгарэлай пахнючай скарыначкі на жывым агні, хоць гаспадыня яшчэ і з месца не скранулася.

Яна адчувала гэты маленькі дом, як чэслы свайго цела.

Накінула на плечы знойдзены сёння мужчынскі жакет, падкладка парваная, дзе чалавек руку соваў у кішэню, а так яшчэ добры. Але што во рабіць з сукенкай? Памерла маладая суседка, свякроў прынесла ейную сукенку, ня новая і не старая, сукенка і не патрэбная — чорны крэпдэшын у белыя кветкі, фальбонка на грудзях. Памерла ад страшнай хваробы, усю

адзежу, казалі, выкінула свякроў, усю падчыстую, і з сына, з жывога, усё зняла і выкінула. Але ж нельга чалавека пакрыўдзіць, ня ўзяць, не пажадаць царства нябеснага на разе. Да яе прыходзілі, яе ўспаміналі, калі ў чалавека здаралася бяда. І наагул, дзе яна калі разжывецца, падбіраючы бадзялых катоў, сабак. Патрымае каторага бадзіню, пакуль поўсць на ім не заблішчыць, і напытае яму гаспадара, і так бясконца. Яна быццам жыла паміж часовым і вечным, да неба ёй блізка, яно напроці, як праз вуліцу перайсці.

Ніхто ня ведаў ейнага імя.

Улетку, па цяплу, яна па-птушынаму і жыла недзе ў кустах, там часцей за ўсё яе ўбачыш, асабліва пасля якіх святаў, дзе балявалі гараджане. Трэба было старацца дзеля сваіх кватарантаў: два сабакі і два каты. Ды во з суседзяў нехта навёў: участковы запатрабаваў на іх «пашпарт». Для яе не існавала ні бязродных рэчаў, ні бязродных жывых істот. Хто навёў, каму перашкаджала? Іншы раз, стоячы ў чарзе, яна з цікавасцю ўзіраецца: што бяруць людзі, што яны, такія невясёлыя, злыя, ядуць, можа... сырое мяса?! А сама: бульба з кефірам штодзень, вось яна і паела, гэта ж першая яда. З году ў год у тым самым, у юлёвай ясёнцы, то зблізку, то здалёк у скверы, часцей на досвітку, бы прывід, той і стагоддзямі не пераапранаецца. Не заўважыш, што яно старое, з чужога пляча, калі пры сустрэчы прывітаецца, прыпыніўшыся, надаючы павагу і табе, і сабе самой, касуючы ўбоствы свету. «Такі буйны, такі цёплы дождж...» — скажа размінаючыся, як пра доўгачаканага госця, і неспадзявана для сябе самой кратанешся нязвыкла насустрач, як зашчабечаш. У яе на ўсё хапала часу: з гэтым прывітацца, з тым загаварыць, кампенсуючы нашае маўчанне паміж сабой. Жывём моўчкі, быццам бы ўжо ўсё адзін аднаму даўно сказалі. Мы стыдаліся, хавалі прыкметы свайго душэўнага жыцця.

Неяк на самыя красы, убачыўшы разам некалькі сабак, бяздомныя, пашкадавала я, ідучы побач з Жанчынай у юлёвым, як мы яе ў доме называлі. «Не, яны не бяздомныя, яны ў зграі...» — заўважыла задуменна, пэўна, адчуваючы ледзь улоўную гармонію паміж імі, быццам гэта высокая птушыная чарада.

Але каму яна перашкаджала?!

Наш дом як адстойнік. З'язджалі адсюль тыя, хто разбагацеў. Невялічкія кватэры засяляла домакіраўніцтва сваімі людзьмі. Пераязджалі сюды па абмене, хто ня здужаў сплаціць жыллё ў цэнтры. Старажылы лічоныя, хто з вопытам, хто з расчараваннем. А самы моцны праклён у нас: «Каб табе гарэлка смачнай зрабілася». Нехта спрабаваў заняцца бізнесам і вяртаўся, маўляў, я лепей пайду вартаўніком, як дакладаўся нападпітку Ян Свіцянка з чацвёртага паверху: «Мне пакажуць, што трэба вартаваць, і ўсё на гэтым. А з бізнесам я ні працаваць не магу, ні спаць спакойна — ні дня, ні ночы. І дзеля чаго? Буду выцінацца, духі вон, каб напяць французскую столь?! Зорнае неба, хваляцца багатыя, будзе ў кватэры?» Яго, вясковага чалавека, не спадманеш дэкорам. Вясной, як толькі снег сыдзе, ён бярэ матацыклетку і едзе ў лес, едзе адзін, у самую глыбіню, каб выкачацца там на зямлі, набыцца, наслухацца — і хопіць! Не, Свіцянку не залучыць у страшны сон узбагачэння. Ніколі, кажа, яшчэ ў маёй сям'і ў бліне дзіркі не было, можна жыць, маўляў, і не высільваючыся, не закладаючы душу. Зводку навін пачуеш ад бабуль на лаўцы каля пад'езду. Разбэсціліся, маўляў, людзі, меры ня ведаюць, усё каб смачнае на кожан дзень з'есці, як на свята. «І мне самой і прайніка хочацца, і яблычка, — спавядаецца завадатарка баба Зоня (пэўна, у маладосці — Зоя?), — ну, вазьму і куплю, а што тады праз нядзелю ела б?» Маладзец, хваліць прэзідэнта, ён яе падтрымлівае: усё ў нас добра, кажа прэзідэнт, усё ў нас добра, як у ейную руку яно, тое ягонае добрае. Спрабавалі бабці запыніць Аліну з другога паверху, распытвалі, пасміхаліся — Аліна ў нас адзіны прадстаўнік такога-сякога бізнесу. «Я вучуся, нічога не брыджуся. Куплю кінзу ў армян пучок за сем тысяч, а прадам за пятнаццаць! А што гэта, некрасіва? я не краду, я прадпрынімацель! Ніхто цяпер не гаворыць: будзем лепей працаваць, ніхто не закасвае рукавы да чыстай работы, усюды толькі і чую: тое прадаць, тое перакупіць. Я акунулася ў гэтую бурлівую плынь і не патанаю!» — ганарліва скажа кожнаму. Сама з валідолам ходзіць, бы курэц з папяросінай, уся ў рабацінні, як з малінніку.

«Святыя» ў нас не пераводзяцца.

Абы толькі якое савецкае свята, усе ў доме ведаем: сусед, франтавік, прасуецца, чысціцца з самай раніцы. Падыдзе да акна, пасцеліць газету на стол і чысціць на ёй абутак, абы не на

бацінку было. Капелюшы рознага колеру. Уцячэ з дому не паснедаўшы, умыкне, як падлетак. «Ганчак» – завуць яго ў сям'і. Ягоная маладая вера, ягоныя сцягі – ніхто яму не пярэчыў, не замінаў, не пасміхаўся.

Мала каму ўдавалася перамэнчыцца, змірыцца з гэтым новым часам. Нехта з мужчын піў. Смак бяды, можа, ён каторы вастрэй яе адчуваў, і гэтая гарката толькі віном і перабівалася і нічым болей. Калі і ўдавалася трохі зарабіць, карысці гэта вялікай не мела. «Ня піў, калі грошай не было, то нават разам іншы раз хадзілі па вуліцы, – распавяла неяк пра мужа, як пра суседа, Міхаліна з другога паверху. – Цяперака вяртаемся часцей паасобку, бо гэта так яму нязвыкла, каб разам з жонкай. Ані ў якім разе, каб побач! Шась убок, быццам у краму па хлеб, прынясе непатрэбную булку, чарствую, абы яму адлучыцца было – кумпанію ўсё шукае, каб дабавіць». Іншы раз познім вечарам сюды сыходзіліся «сябры», моцная гаворка, сварка, а то і бойка. Тады дом выдаваўся нічыйным, пустым, нават бяз прывідаў, бы звонку падпёрты калом, бо і сабаку ня зможаш прагуляць, не адважышся вывесці за дзверы.

Хто з дому навёў участковага на Жанчыну ў юлёвым? Мы разгаварыліся з жонкай мастака. Дом патаемна ганарыўся, што побач жывуць такія людзі.

І Яна нам не перашкаджае, а жыве якраз жа за сцяной. Я рада, што ў яе няма ні тэлевізара, ні халадзільніка, ні нават радыё. Адна лямпачка на ўсю кватэру. Не, мы нічога да яе ня маем... Мяне іншае турбуе. Згадзіцеся, у доме склаўся такі кантынгент... Нашая дачка выходзіць замуж... Мы вырашылі, каб жаніх перад вяселлем прыехаў яе забіраць з дому маёй маці... Там прыстойней, там не лунае дух беднасці ў пад'ездзе... І наастатку яна прыветна развіталася, знакамітая ўсмешка на твары, мастак часта маляваў жонку, лёгка пайшла, прытрымліваючы ад ветру знакаміты капялюш.

Я ня мела на той час нічога ёй адказаць, ня мела што здумаць. І толькі раптам, як ад грукату ў сцяну, пэўней, штуршка ў човен. Калі пачынаецца бура, а ты задрамала на дне, разамлеўшы, і не адчуваеш, што цябе зносіць некуды ўніз, па цячэнні, ужо і берагу не відаць. Хацелася гаварыць услых, крычаць. Тут, у гэтым доме, у ягоным улонні яна нарадзіла трох дачок! Тут віюцца іхныя сны, мроі! Вы хочаце ўзяць чужы дом

напракат, вы можаце здрадзіць сваім дарагім успамінам?! І няўжо вы не здагадваліся, што вы тут сярод нас не проста сабе жывяце, а сымбалізуеце духоўныя каштоўнасці? Гавару сама сабе ўголас, крычы, каго хочаш, крычы, якая сцяна, каторая сцяна цябе пачуе.

Перапыняе мяне нейкі стук аб вугал, енк чалавечы? Сабачы? Хапаю вялікі кухонны нож, бягу ўніз бараніць дом ад гвалту, ад вечных тутака зборак, разборак, баронячыся сама ад зняслаўя. Ляпаю дзвярыма пад'езду як наймацней, бы са мной сотня ваярак, а каля дому анікога. Вяртаюся, пераможна, павольна падымаюся па сходках, бы пад цяжарам даспехаў, са смехам разглядаючы вялікі нож, быццам мне хто яго толькі што ўклаў у руку. Адчуваю нязведаную дагэтуль магію месца. Толькі б, бронь Божа, нікога не сустрэць у такім ваяўнічым аблачэнні.

Назаўтра дом затрымцеў, замітусіўся, заляпалі дзверы, ліфт, і да пад'езду пад'ехала шэсць матацыклаў, шэсць маладых мужчын, як на конях. Я пазнала жаніха старэйшай дачкі мастака, з ім дружкі. Няўжо перадумалі арандаваць чужы пад'езд?! Якраз субота. Усе заспяшаліся на вуліцу.

Нявесты яшчэ не было, але час ня доўжыўся. Стаяў Ян Свіцянка, пэўна, пасля ночы, ня спаўшы, вочы прыспушчаны, рукі склаў на грудзях, рыхтуючыся стаяць во гэтак, як укапаўшыся, пакуль ня ўбачыць тут нешта яму патрэбнае, асабістае. Аліна затрымалася, бегучы, пэўна, з кірмашу, нешта прамаўляла сама сабе аднымі вуснамі і яўна хвалявалася, бы пратаргаваўшыся. Двое суседзяў нападпітку з раніцы, як звычайна, палілі стоячы ўбаку, адзін аднаго ўшчуваючы, абы каторы загаворыць мацней. Побач Міхаліна з мужам, той спрабаваў далучыцца да мужчын, Міхаліна трымала за крысо, робячы выгляд, што шуткуе з ім.

Дарожка, засыпаная пялёсткамі, вілася да парога, як у садзе.

Выйшла і Жанчына ў юлёвым, сукенка чорная ў белыя кветкі, фальбонкі на грудзях, сукенка маладой нябожчыцы з нашага пад'езду. Надарыўся, бачыш, выпадак прыбрацца. Азірнулася і саступіла ўбок, прытрымліваючы некаму дзверы.

Ішла нявеста ў белым. «Глядзі, глядзі, глядзі...» — ветрыкам разнесла шэпт у натоўпе, бы ўбачылі выяву ў цёмным праёме

пад'езду, як на схіле пясчанага кар'еру пад Крычавам. Нявеста затрымалася на сходках, вітаючыся з усімі, голаў схіліла да пляча ў нейкай невытлумачальнай боскай згодзе з тым, што з ёй тут адбываецца. Ахінула спакоем тых, хто тут з нас згубіўся, адчувае сябе ў чужым часе, ня могучы прыстасавацца да новых формаў жыцця. І тых, хто разумее, што новы час часцей працуе не на аднаўленне, а на разбурэнне і жыве ў згодзе з сабой па запаветах святой беднасці, па запавеце радавання, каб скруха не пераадолела, не засланіла сабой усё падчыстую, створанае Богам. Навошта мы гэтак мітусімся і марнасловім, зайздросцім і лянуемся жыць... Нехта з нас успомніў свае высокія памкненні, нехта і самыя палкія пачуцці.

Успомніць — гэта яшчэ раз перажыць, што мінулася.

І толькі калі нявеста ад'ехала, заспрачаліся: адны казалі, што яна села ў аўтамабіль, прыбраны вянкамі, другія — да жаніха на матацыкл. У адным не было рознагалосся: такой прыгожай нявесты яшчэ аніхто ў Менску ня бачыў.

Мне дык выдавалася, я нават упэўненая: нявеста ад'ехала на белым кані, па вуліцы, як па алеі, алеі дамоў.

Ад той пары наша старая хрушчоўка за некалькі хвілін змяніла сваю біяграфію: цяпер гэта ўжо быццам палац самай прыгожай у горадзе нявесты, палац з брамай неўміручасці замест змрочнага пад'езду.

МАКІ ДЛЯ НЯФРЭТ

Ад самай раніцы, як толькі нарэшце прыехала на лецішча, дзень перазапаўняўся патаемным сэнсам.

Пэўней сказаць, не прыехала, а прыляцела. Вясна пачалася рана, я заспяшалася звязваць клункі, валізкі, і раптам палі халады. І не паспеўшы ад'ехаць па цяпле, я, як у паветры ўвесь той час — сома бы на шляху доўгага пералёту, хоць яшчэ і з месца была не скрануўшыся. Цяпер рупіла хутчэй узяцца за работу. Ці я з хаты, ці я ў хату — усё яшчэ ў вузлах ля парогу. Не разгледзіцца, хто дзе на вёсцы, не падымаючы галавы ад зямлі, пакуль, як той казаў, — «кросны не пастаўленыя».

Але як было не загаварыць, убачыўшы суседа Мар'яна?

— Як зімавалася? — быццам звычайны такі пароль тых, хто жыве зімой у горадзе.

— Спаў апрануўшыся... з сабакамі разам... хата свіціцца, лядоўня, ня хата... я і ўлетку сплю ў адзежы. Ты распранешся, ляжаш, расслабішся, а д'ябал ужо тут! Падыдзе, украдаючыся, да цябе, цёпленькага, і спакусу падсуне пад нос. А я ваяр Хрыста — р-раз! і на нагах! і ў страі! Мяне не спадманеш!

Стаіць гэты ваяр, абшушкаўшыся, твар нерухомы, застылы, на галаве па самае брыво цёплая панчоха, завязаная на цемені гарбузовай завяззю. Няма мне калі яму патураць, няма калі, кажу.

— Няма калі?! Ніколі не кажы гэтага, не падманвай нікога... Можа ня быць хлеба, солі, запалак, але гэта часовы недахоп. Часу ў чалавека неабмежавана — вечнасць...

Мяне бы злавілі за руку, затрымалі, з надарванага пачка сыплецца семя радысы мне пад ногі, на дарогу. Стаю асалавеўшы, аж вушы заклала, бы дала нырца ў бясконцую раку часу. Адпусціў боль няздзейсненага, боль сквапнасці, боль згуб, боль зайздрасці — вызваленне ад усяго матэрыяльнага, тленнага. Сэрца пульсавала, як на гіпнатычным сэансе.

Ледзьве пачула: ён смяяўся. Смех, застаялы ў грудзях, вырываўся балотным бульканнем, бы я наступіла нагой на слабкае месца, зацягнутае цемя багавіння, у рудую ваду, патрывожыла балотны дух, самога Багніка. Смяяўся, рабіў і рабіў яшчэ заходы, каб адсмяяцца, як надыхацца. «Вар'ят» — апамятавалася я канчаткова, шкадуючы, што во нечым жа сарвала ягоныя слабыя зашчапы.

Ён не любіў дачнікаў. Яны, дачнікі, лічыў, нічога каштоўнага ня зробяць на зямлі, гэта, маўляў, спрэс атручаныя людзі. Сцены ў горадзе, мэбля, фарбы, газ выдзяляюць атруту, людзі спяць у кватэрах — усё гэта ўздзейнічае на соннага чалавека, ім галовы баляць. Прыедуць у вёску, порк-порк і назад, у горад, — яны ўжо ў наркатычнай залежнасці ад гарадскога чаду. Іх нізавошта ня вернеш у пустыя бацькоўскія хаты. Во, паглядзі, казаў неяк, што робіць палкоўнік на сваім бацькоўскім «лецішчы», — заўсёдны ягоны доказ чалавечай абыякавасці. Зямля тут, маўляў, укладалася, шукаючы супакой, вякамі, а ён паадразаў ейныя пагоркі-смочкі, абкарнаў ейнае жывое

цела, выпрастаў, як ссечанае дрэва, гэблікам, думаеш, рабіў пляц для гольфу? Не, у яго ў галаве ня звіліны, а паралельныя прамыя, як на пляцдарме.

Пачуўшы голас гаспадара, з-за пагорку выйшлі да яго козы, наперадзе казёл Пярун. Казёл не ішоў, яго зямля выносіла на сабе хваляй, як які пірацкі човен: нерухомая галава з расахатымі рагамі маскай, чорныя козы ззаду чорнымі рабынямі, мелка перабіраючы нагамі, цесна адна да адной, бы закальцаваныя цэпам. Мне б хутчэй скончыць гэтае спатканне (баюся Перуна, ніколі ня ведаеш, калі ў яго ўскіпіць злосць), а Мар'ян бавіўся ўвачавідкі. Ён напытваў сабе сякую-такую работу. Я паабяцала даведацца ў суседкі Надзі, потым яму наказаць. Няма часу хадзіць па хатах, праўда, але ж трэба нешта здумляць. Надзя звычайна ня любіць наймаць. Яна раўнавала чужога чалавека да сваёй зямлі, да сваёй работы, яна з ёй у цесным звязе, нікога каб трэцяга пасярод. А сіл бракуе. Карова будзе з дня на дзень цяліцца, гной з хлява ня выцягнуты, жаліцца. Можа б, Мар'яна паклікаць? Не, не, яна ў свой хлеў бадзялага чалавека ня пусціць, крычыць. Быццам гэта ў сям'ю, дзіўлюся. Абціскае вакол сябе сямейную коўдру, толькі што ня лежачы ў ложку, зняможаная, старая. Зімой не заробкі — няма заробку наагул. Вясной — Мар'ян падбіраў вывернутую з дзежак капусту каля склепаў, перакіслую, склізкую, мёрзлую бульбу, пустыя, палавыя агуркі. І гэтым быццам мерку ўсім паказваў, чым ён можа абысціся за сталом, і разлічваліся ўсім, чым сабе нягожым, што нічога не каштавала, але перападала і харошае. Ніколі ня дзякаваў, лічыў, што ўсё паслана Богам, а людзі толькі выконваюць ягоны загад. Ня брыдзіўся калі-нікалі зайсціся і на сметніцу ў лесе і, як удалы грыбнік, знайсці там тое, чаго другі і ня ўбачыць. Часцяком наведваліся да яго вяскоўцы то па жалезны прэнт да плоту, то па юшку да печы — у яго быў цэлы склад знаходак, выдумляў з жалеззя розныя інсталяцыі.

Памог амаль задарма — дурны, рыбы, рака побач, ня ловіць — дурны. У грыбы ня ходзіць, лес каля ганку — дурны. І агарод ня садзіць. Ён вельмі заняты, тлумачыў усім.

З самай раніцы, выпіўшы гарачай, калі нават і салодкай, вады, падперазаўшыся вяроўчынай, ішоў у лес разам з козамі. Ніколі ня браў на іх палку ў руку ці каб ішоў ззаду з гільканнем, падганяючы. Ішлі ўсе разам. Здалёк нахіленая ягоная постаць,

галава, убраная ў плечы, размераная хада, толькі па адзежы і пазнаеш, што ў статку чалавек. Сабакі ззаду. У лесе па грыбах раптам трапіш на іхны след, казліны дух стаіць клубам, густым роем, як з зямлі, падымаецца і падымаецца з патрывожанага кочава. Ён чысціў лес, козы заўсёды пасвіліся побач. Падразаў атожылле, каб відаліся камлі, адкідваў крывыя галіны, робячы сілуэт дрэва скульптурным, бы трапным ударам пэндзля. Вымяраў перспектыву на цаўё сякеры, групіраваў купкамі, сямейкамі, каб не знарочыста было, як у рэгулярным парку, а захоўваліся лясныя зрухі самой прыроды. Абыходзіў круга кожнае дрэва, зблізку, здалёк, неба змяняла колер, неба гасла, з дня ў дзень — новы малюнак. «Людзі будуць тут гуляць...» — казаў, калі хто пытаўся, што ён тут робіць і навошта.

Але ніхто гуляць не прыходзіў. Тады стаў слаць праз рэчку кладкі, каб можна было трапіць у ягоны міт самым кароткім шляхам. Унутраным зрокам ён бачыў тут дзівосныя прысады, паляны залётніку, ветраніцы, майніку, шыпшыны, асеннюю брызгліну марыў распаўсюдзіць уздоўж рэчышча, брызгліна чырвонай бранзалеткай на вузкай, як запясце, рацэ. «Я цяжка раблю... мне сілы трэба...» — патрабавальна глядзеў людзям у вочы, маўляў, дзеля сілы трэба добра пад'есці. Бы яны яго нанялі на гэтую цяжкую работу і павінныя яму дапамагчы ўсім чым.

Вецер у лесе, павярхоўны, бы з мора, хвалямі, закалыхваў, супакойваў. Мар'ян засынаў стоячы, як конь, спаўзаў на зямлю, сабакі ўкладаліся па зімовай звычцы побач. Сон у лесе чуйны, сон не чалавечы, расчыняў пашчы, высалопліваў языкі. Сонца паварочвала да іх галаву, і яны ўсе сагравaліся. Іх мог разбудзіць толькі голад. Маладзейшы сабака прачынаўся, цалаваў гаспадара, злізваючы на ягоным падбароддзі слінкі, як сочыва, і ён падхопліваўся. Асалавела азіраўся, ізноў за сякеру, за лапату, каб здзейсніць тое, што снілася. Лета — поўдзень году.

І зноў чакаў. Каго?! Праўда, неяк палкоўнік прыводзіў сваіх гарадскіх гасцей, каб іх пацешыць, забавіць, што гэты дурань робіць, тыя пыталіся назвы дрэў, кветак, бы прыляцеўшы з іншай планеты. Ён ня мог даўмецца, што людзі ў вёсцы ня ходзяць у лес на шпацыр, а толькі па патрэбе: грыбы, ягады, лясіна да плоту. Былі хвіліны, калі ён кідаў свае прылады, дзе яго спыніў адчай, ішоў да вады, вымываўся, пераапранаўся,

намерваючыся з'ехаць куды-небудзь, дзе яго зразумеюць. Маўляў, тут людзі прызямлёныя сваімі спадзяваннямі, думкамі толькі на прыбытак, іншы свет ім невядомы. Углядаўся ў люстэрка на самога сябе, украдаючыся, быццам на чужога чалавека з-за пляча. Ад чыстай халоднай вады лягчэй не рабілася. Гэтую зямлю не змыеш нічым, яна прыкарэла ня толькі да ягонай адзежы — ён ужо пусціў у яе свае карані.

Ізноў пераапранаўся. Толькі вырваўся з грудзей смех, смех з усхліпам, дробны, дзіцячы, як ад казытання.

Хто ён такі ёсць?

Мы жылі амаль побач. А я звычайна збіралася да яго наведацца, як у вялікую дарогу, бы сыходзіла з дому назаўсёды, адракаючыся ад свайго клопату, сыходзіла, знясіліўшыся будзённасцю. Сваёй нікому тут не патрэбнай, напорыстай працай ён, дзіва што, усяляў у душу раўнавагу, пачуцці нейкай малавядомай сярод людзей згоды з лесам, з вадой, з зямлёй — праца без заробку, нават без падзякі, една тое, дурны і дурны. Сякерай, рыдлёўкай знішчаў як не ва ўсім свеце пераборкі паміж сваім і чужым. І аніводнай на твары змаршчынкі — ён працаваў у ахвоту.

Ручай ляснога ветру струменіў па вуліцы да старых дубоў, дзе жыў Мар'ян, ягоная хата апошняя ў вёсцы, заўсёды неяк збянтэжаная ад чужога вока, бы заспеў яе голай, бяз вопраткі. На панадворку нагу не пераставіць — казінае стойбішча да самага парогу, Пярун будзіў гаспадара рогам у дзверы. Пастукаеш, Мар'ян выйдзе, ніколі не запрашаючы ў пакоі. Ён зачыніўшыся заўсёды і ўдзень, у ім асцярожнасць звера. Ён можа сысці, пакінуць нару, калі які чалавек забрыдзе, выявіць, што ён тут жыве. І цяпер выйшаў не адразу, неяк галавой уперад, сагнуўшыся ў дзве столкі. Аказалася, Пярун ударыў, і ня першы ж раз.

— Нядобра гэта, каб свая скаціна кідалася на гаспадара, — кажу, — трэба з ім нешта рабіць.

— Ён ведае, за што збіў, і я ведаю, гэта сям'я, — адказвае памяркоўна. — Трэба яму трэнажор змайстраваць, каб сілу сваю дзікую мог скінуць, не магу пакуль здумаць з чаго, як...

Сабакі з хаты кулем праз дзірку ў парозе, кідаюцца лашчыцца, чуюць, што прынесла нешта з'есці. Мар'ян бярэ з рук пакункі, як ахвяру, ня дзякуючы. Я часта паміж імі, Мар'янам

і ягоным Богам. Дамовіліся, што падыдзе часам, дапаможа адрамантаваць мне столь у склепе, і яшчэ, кажу, напытала яму заробак: старая бабка прасіла перакапаць лехі*.

Наастатку, пакідаючы гэтае «свяцілішча», спрабую давесці яму, што якраз жа самая пара што-небудзь пасеяць у зямлю, найперш – бульбу.

– Сад, агарод – гэта сезонная творчасць, дзеля сябе самога...

Маўляў, трэба працаваць дзеля вечнасці.

Ах, дайце спокуй! у мяне самой цяпер няма анічога, акрамя кавалка зямлі. Трапіўшы пад скарачэнне (усё жыццё будавала масты), я, інжынерка з чырвоным дыпломам, доўга шукала працу. У каторы раз па аб'яве прыходзіла на перамову, мяне, сталую жанчыну, як не распілоўвалі напалову, лічачы колцы ўзросту, бы на дрэве, абыякава праводзілі, абшукваючы вачыма, па сухіх сцёгнах, і адмаўлялі. Дарэмна старалася, каб не заўважылі, што кульгаю (пасля аўтамабільнай аварыі), замест кія хадзіла з парасонам. Мне раілі заняцца бізнесам, адчыніць шапік на стадыёне, але мне замінаў мой чырвоны дыплом. Там трэба было хітраваць, спадманваць, гандляваць чужым, я ж, савецкая выдатніца, умела прадаць толькі сваю працу, тое, што зроблена сваімі рукамі... у мяне цяпер анічога, акрамя сотак, жыццё толькі дзеля сябе самой, ня болей. Кожную вясну раблю перасядкі, кампаную расліны, кветкі, кампаную колеры, пільнуючыся бесперапыннага квітнення да позняй восені. Зямля мяне выратавала ад роспачы, ад вар'яцтва. Я быццам ужо згадзілася са сваім лёсам выгнанай дачкі, атрымлівала іншы раз нават асалоду ў сваім зацішку.

Але вось гэты чалавек побач. Ён не запасіўся на зіму, не шукаў сабе выгодаў, хлеба няма, кажа, часцей хлеба, ці запалак, ці газы. Каля яго ахінаў той спакой, якога часта не ставала ў маім садзе-агародзе. Бы пасля спёкі паўднёвай, здарожыўшыся, ступіш у цень перавесці дух, здыхацца каб.

Быццам ішла дагэтуль па пустэльні.

Або ў навальніцу, у непагадзь скочыш на ганак, сядзеш – нічога нарэшце цябе не турбуе, ня рупіць, і раптам адчуванне: я так даўно не была дома, проста так, бяз працы ў руках, не пасядзела з ім, з Домам. Мне рэдка ўдаецца пажыць у ахвоту, бяз дай прычыны.

* грады (дыял.)

Дом — месца маёй душы.

Ужо я развітвалася, ён раптам папрасіў пастаяць, пайшоў у хату, выносячы адтуль карціну. Паварочвае палатно тварам... макі... шмат макаў. У мяне круціцца галава, гледзячы на іх — макі не стаяць нерухома нават у вазе. Створкі бутонаў лопаюцца, вызваляючы скрутак, скамечаны, тонкі, як з папіруснай паперы, ён разгладжваецца на вачах. Вецер вуснамі дакранаецца, абрывае пялёсткі, а там, на заднім плане, макі ў зацішку, дыхаюць, кратаючыся, полымем свечак, ласосевая афарбоўка, васкавы налёт на лісцях. Мак-самасейка, можа, недзе на маўрытанскіх газонах, можа высока на альпійскім лузе. Горача, паветра мроівам, паветра пчаліным роем. Гром бокам, полем, па прасёлачнай дарозе, гром вечаровы, крохкі, бы проста цукар крышаць шчыпцамі да гарбаты. Колькі ж часу я тут стаяла, адыходзілася, ізноў вярталася?!

— Хто мастак? — пытаюся.

— Ня ведаю... ня памятаю... — адказвае і ідзе з карцінай у хату.

Я ніколі не пыталася ў яго пра мінулае, быццам дамовіўшыся не пытацца, ні пра маё, ні пра ягонае. Мы тут абое ў чужой вёсцы, як замужам па другім разе таксама за развядзёнкам. І сама вёска ні ў кога з нас не цікавіцца: хто мы? адкуль? з якой прычыны тут маемся?

Зрэдку да яго прыязджала жанчына. Выходзіла з машыны, ішла лёгкім юнацкім крокам, чорныя пакручастыя валасы раз-пораз адкідвала рукой з ілба, бы ўвесь час ішла па ветры. Было нешта іншаземнае ў ейнай амаль дзікай прыгажосці. Такой жанчыне сустрэчны мужчына мог усклікнуць: «О, Італія! Неба над табою!» Другі — абазваць жыдоўкай. Твар не асвечаны ні позіркам, ні ўсмешкай, вытанчаны скульптурна, бы з даўно згубленых запаснікаў нашай памяці, нерухомы, на ім толькі блікі, цені лістоты дрэў, а можа, цені аблок? Выходзіла з машыны як са «скорай дапамогі», абцяжараная таямнічым абавязкам, спяшаючыся, ні на кога ня гледзячы, і гэтак жа хутка вярталася, ад'язджала.

Пасля ейнага візіту яму прыкметна горшала. Якраз я неяк была трапіўшы на такі момант. Мар'ян смяяўся, ходзячы па панадворку, спыніўся, стаў дапытвацца: «Ты бачыла ейныя завушніцы-скарабэі?! Бачыла?!» Якія завушніцы? у каго? Гаварыў

блытана, дробнымі словамі, я нічога не разумела. Спяшаўся выгаварыцца, як выпаліць нейкае балючае месца ўнутры. Збівалася пена на вуснах: «Ты бачыла? бачыла? Яна ад'ехала?» — крадучыся пазіраў на вуліцу. Хто? Тая чорная жанчына?

Вядома, ад'ехала, бо я сама нарэшце вярнулася да змыслаў — рэдка якая жанчына не адчувала сябе, сваё цела побач з ёй проста балванкай, нарыхтоўкай без апрацоўкі, ня болей. Але ж аніякіх на ёй завушніц не было?! Якая паміж сувязь? Ён блюзніў, любоўна дакранаючыся да дрэва ля ганку, гладзіў вушак, кідаўся да Перуна, нешта яму нашэптваў і раз-пораз паглядаў на дарогу ўслед чорнай жанчыны. Яны што, каханкі з ёй? Палохаюся згадкі. Дзічуся згадкі.

Аднойчы ён неяк прыйшоў без маёй на тое просьбы, быццам ён сёння свабодны, можа калі што якое дапамагчы, гаварыў, пастукаўшы ў вакно. Я якраз бегла да студні, спяшалася, выцягнула вядро, падняла вочы... На ім расшпіленая кашуля да самага пупа, распрацаванае, пругкае цела, ключыцы, рэбры блішчэлі, як у даспехах, сівы дым пошасці курыўся кучарамі на грудзях, цвілі вусны. Стаіць нязвыкла блізка. Дух Перуна даўкі, нясцерпна — ферамоны звера, які пачуў твой жывёльны дух полу ў час любоўных ловаў. Страх, агіда... падымаю з вечка студні поўнае вядро, узліваю на яго, быццам незнарок, ускрыкваю, выбачаюся. Ён не зварухнуўся, а круп сухі! Кентаўр няшчасны, злуюся пра сябе, ізноў маланкава кідаю вядро ў студню, цэп грыміць, бы гатова тут бараніцца вадой, зямлёй у вочы, ускідваючы капытамі. Сёння мне, кажу, на дзіва абыякава, нічога ня трэба і бягу ў хату, маўляў, печ паліцца, зачыняюся, доўга пасля таго не наведваючыся да таго кентаўра, хоць была пільніца. Зачыняюся і нарэшце даю сабе волю. Выгаворвала ўслых на ўсю хату ўсім мужыкам, свайму былому мужу, ад якога незлічона мусіла вяртацца з таго замужжа і нарэшце вярнулася. Цяпер стаю, як на скрыжаванні, нікім не захінёная, не абароненая. І наастатку во гэты... кентаўр! І прыкрае, бабскае: няўжо я яшчэ жанчына пасля ўсяго, калі ён так?!

Не, яна, іншапланетная істота і Мар'ян?! Не, гэта немагчыма! «Ты бачыла на ёй завушніцы-скарабэі, бачыла?!» — несцішона паўтараў і паўтараў. Мне было ні то сысці, ні то застацца з ім. Раптам абсеў, паглядзеў на мяне пільна, бы нарэшце пазнаючы: «Гэта была... Няфрэт...» Няфрэт... Няфрэт... так звалі

Нефярціці... Што ён гаворыць? я ўжо зведала ягоныя астранамічныя асацыяцыі, калі ён, прыйшоўшы – а я прала бялізну – сказаў, каб не развешвала сушыць на панадворку, бо, маўляў, сёння прачнулася Этна, пыл, попел у паветры. Час, адлегласць спрэс не далей плоту, а то й парогу. Але, як аказалася, Няфрэт не фантазія. Мар'ян гаварыў на дзіва чыста, упершыню. Няфрэт – так звалі чорную жанчыну мастакі, ягоныя сябры. Гэта вельмі дарагая жанчына, казаў, яна любіць раскошу, паездкі за мяжу, падарункі. А ён не зарабляў, працаваў шмат, але пейзажы не куплялі, маўляў, такі цяпер гламурны час, мастацтва на ўзроўні рамяства. Яны кахаліся. На дзень ейнага нараджэння ён сказаў: «Прабач, я нічога табе ня здолею падараваць, акрамя... «Макаў», толькі што закончыў маляваць...» Яна засмяялася ў вочы і ў той жа вечар яе бачылі з бізнесменам. Хутка выйшла замуж. А ён сам кінуў майстэрню, горад, з'ехаў сюды, у вёску. Так, яна зрэдку наязджае да яго, іншы раз жаліцца: багаты муж шмат грошай пакідае ў казіно і сама сябе разводзіць, маўляў, ягоныя сябры ездзяць на паляванне ў Афрыку, таксама дарагая забава, дык хай сабе, затое муж удома...

На гэты момант ён успомніў усё. Потым твар знерухомеў, ніводнай грымасы, бы заліты воскам – ён вяртаўся да сябе сённяшняга.

Аказалася, лес – гэта цяпер ягоная зялёная студыя?! Жалюзі з дажджу развешвалі пераборкі паміж заламі. З раніцы да вечара змяняліся адценні дрэва, каменя, прырода, як старыя майстры, не разбаўляла фарбы, накладала адну на другую. І кожны дзень як новае палатно. Малевіч першым адмовіўся ад рам для карцін, Мар'ян, пэўна, тут быў другі за ім. Для мастака важная менавіта заваёва прасторы, і ён яе нарэшце меў. Хай сабе пакуль што размясціўся ня тое, каб у неартавым месцы, сюды заходзілі дзікі, ласі, вецер. Самае страшнае быць невядомым, непатрэбным, але... але ён спадзяваўся. Святло ў ягонай майстэрні і наагул залежыць ад тэмпературы, ад пары дня, пары году. Святло залежыць ад самога мастака. У пяць гадзін раніцы – ты адзін чалавек, спазніўся, у восем устанеш – ужо зусім іншы, казаў неяк. Другім разам наракаеш на надвор'е восеньскае, маўляў, хмарна, маркотна. А мне, кажа, адна птушка калі праляціць – і неба ўжо здаецца абжытым.

Я ўсё часцей атрымлівала задавальненне, як і ўсе ў вёсцы, ад таго, што ўзышло, што вырасла. І калі ўдалося выбраць бульбу да дажджоў, а Мар'ян перакапаў агарод, паспытала невядомую дагэтуль уцеху і зразумела: гэтым можна жыць, гэтага дастаткова, каб болей, то і сэрца ня вытрывае. Нешта з гароду добра збывалася багатым дачнікам, тыя анічога не вырошчвалі, такія-сякія і здабыткі быццам. Недалёка жыў чалавек, які марыў пра вечнасць як пра ўласны дом. А можа, сапраўды, дом творчага чалавека зусім не на зямлі?..

І адзін год, і другі, і трэці. Толькі аднойчы, прыехаўшы вясной на лецішча, пачула навіну: Мар'яну пагоршала.

Яму як ветрам нарвала, казалі, за тры дні запар якраз тады быў вялікі вецер. «Што ты мне прынесла? — крычаў ён на старую суседку. — Я так цяжка раблю, а ты мяне шалупіннем корміш!» Ён крычаў на свайго Бога за тое, што не дадаў яму, крычаў на старую бабу — пасрэдніцу паміж імі, за адным разам. Казалі, цяпер ён абы крок ступіў, дапамог каму што якое, патрабуе разлічыцца па вышэйшым разрадзе, як той казаў. І нагул, рэдка дапамагае — цяпер ён малюе... малюе голых жанчын, казалі бабы, дасціпна прыплюснуўшы вочы. Усю зімку маляваў, з хаты не выходзіў на свет. Яму пагоршала, маўляў, пагоршала, чым было.

Утрапеўшы стаю, слухаю і разумею: ён проста цяпер стаў падобны да нас, ён паздаравеў. Чорная жанчына напытала яму купцоў. А як жа, прыязджалі на інамарках, куплялі, не таргуючыся. Складаў грошы, маўляў, будзе будавацца, сабе дом і галерэю.

Я згубіла нават свой посах.

Мы рэдка сустракаліся, я болей не заходзілася да яго наведвацца. Але ягоная прысутнасць адчувалася нават сярод белага дня і цёмнай ночы. Быццам у садку анікога, раптам адлучыўся цень ад дрэва, ідзе па сцежцы, намацаў нешта на зямлі, нахіліўся, спыніўшыся — ён меў моду зайсціся, падняць яблык. Ён зачыняўся ў шуфлядзе буфета, і я аніяк не магла адчыніць, тузалася з ім. Ноччу мышы маскаталі*, гойсалі па столі з дробным, здушаным смехам — рыхтык ягоным строем. Ён усхліпваў агеньчыкам у ліхтары і гас. Ён гойдаўся на гірах гадзінніка ў вітальні, яны бразгалі аб падлогу і падымаліся

* дробна пастуквалі, шыбуршэлі (дыял.)

ізноў — стрэлкі рухаліся ў адваротны бок. Губляла і губляла некалькі разоў на дзень пярсцёнак з рукі і кожны раз знаходзіла, бы іх у мяне было незлічона, як у егіпецкай царыцы — ізноў ён на памяці. І нават калі бачыла Мар'яна здалёк, за ім ззаду ішло цэлае зборышча начных істот...

Хадзіла ўборкі* восень з зімою, зіма з вясною. Сады не зацвілі. Толькі аднойчы глянула ў вакно, а там: пасмамі зачапіўся за галлё яблынь дым. Тая дымачка, як напачатку цвіцення, калі толькі пупышкі пачалі лопацца. Ён зрэдку яшчэ чысціў лес, паліў вялікае вогнішча.

Яшчэ іншы раз за ім прывідам ішло хлапчаня. Стаптаныя чаравікі, босы палец тырчэў парасткам. Ён трымаў абедзьвюма рукамі захіненую крысом каптаніка клетку з птушкай, можа, апошняй на свеце. Чым далей іхныя постаці то зліваліся, то ішлі побач, ня ведаючы межаў паміж зямлёй і небам, не адчуваючы межаў часу.

Толькі вымавіцца ўслед ім адно трапяткое слова — дзіця...

Удасца добра прадаць лішкі бульбы, тое-сёе з агароду, я выкуплю ў яго «Макі», вядома, калі да гэтага часу не падаражэе хлеб з малаком...

МАПА НА ДАЛОНІ

КАЛЯДНАЕ

Вовачка

Ён тэлефануе на мабільны, што вось ідзе з дачкой каля майго дома, што хоча павітацца — мне трэба падысці да вакна.

Восьмы паверх, заўсёды пужаюся, што не адразу разгледжу, дзе яны стаяць, ужо махаю адной рукой, бегучы па пакоях з кухні, у другой жэзва для кавы. А мне было (такі выдаўся нерухомы час) — не адарваць ногі ад зямлі.

Яны стаяць блізка адно да аднаго, як з аднаго кораня, закінуўшы галовы, падняўшы твары, стаяць... у белым, як

* дужалася, барукалася (дыял.)

прывіды, каб не ранак, і ледзь здагадваюся: гэта сёння святочны, веснавы, маёвы дзень. І ў мяне на вачах прарастаюць ваконныя рамы, першая клейкая лістота гаёвая. Керамічная птушка на падваконні дастае з-пад крыла керамічную свістульку. Божа, яшчэ ні людзей, ні руху. А яны ўжо прыбраліся са сваімі бяссоннымі начамі, адчаем і перамогамі бясконцымі, каб не спазніцца, далучыцца да ўсіх.

Мне здаецца: так ходзіць па горадзе Бог, пасадзіўшы пад храмам жабракоў, іх часта бачу ў скверы каля Магдаліны. Яны сядзяць на поручнях лавак, у радок, па-птушынаму, ловячы свежае паветра пасля падвальных сырых начэй, ловячы сонца. Гаворка ціхая, ранішняя, амаль табе катораму малазнаёмая, калі ты маеш свой дом.

Бог выпускае са скляпенняў згубленых, бяздомных істотаў, выводзіць Валодзю з дачкой калекай, дзень у дзень.

Іншы раз я баюся зазірнуць ёй у вочы, убачыць, не разглядзеўшы, вар'яцтва — а ў яе высокая місія.

Вовачка зусім сівы, галава крыху ўскінута, бы ўвесь час углядаецца ўгору, нехта яму падае знакі — ідзе далей. У гаворцы не заўсёды ўдзельнічае, адзываецца аднымі выклічнікамі, — засяроджана нешта мацуецца ўнутры, парушанае людзьмі, і нечакана раптам гаваркі, як ручай, весела перасковаючы праз паленне, каменне, свае звыклыя перашкоды, смех лёгкі, такуючы. Смех вызвалення.

Ім іншы раз бабулі ў пераходах метро дораць рукаўкі, шкарпэткі — за што? За тое, што седзячы з пруткамі дзень-ноч, крыпаючы вочка ўлева, вочка ўправа, ды й з накідам, слепішся, слепнеш, і раптам з'ява: чыста Святы Дух! Дораць за напамінак: вера патрабуе нашага сэрца.

Добрай раніцы, мой маёвы горад. Стаўлю жэзву на пліту, мне едка ў вачах, слёзы градам, бы ад дыму, бы я на гарачым вуголлі гатую сабе каву, раскашую.

Бы ў гасцях...

Андрук

Лязг старога ліфта, лязг жалеззя цяжкога, і ні ў якім разе, што падымаешся ўверх — так спускаюцца ў шахты шрэк. Ужо бачыш скібы, слаі глебы праз шкло: зямля. Пясок, гліна.

Гліна мае памяць.

Дзверы расчыняюцца.

Калідор, бы вясковыя сенцы на некалькі катухоў разбіты. Дзверы цвікамі прымацаваныя, і зайсці ў свой катух можна толькі хіба з абцугамі і зноў за сабой забіць, абавязкова. Тут калісьці жыў сабака, кажа Хрысціна, паказваючы ўбок, і я чую ягоны голас, ён усім надакучаў.

Мне адчыняюць дзверы падвойныя, бы вечка чамадана, куфра, кубла.

Зайшоўшы ў пакой, час можна не заўважыць. Ён стаіць тут з вешаком, каб вас спыніць каля сябе, затрымаць надоўга, можа, назаўсёды, хоча павесіць вашу вопратку, можа ўдасца вам запамятаваць, дзе яна пакінута. Я не распранаюся. Ён так і стаіць.

Шоргат скрылля — прыляцелі галубы (адчынены балкон), можна спадзявацца, што гэты пакой жывы. Шырокі ложак пасярод, птушкі злятаюцца, на жалезных брыжах і начуюць. Такая старая пасцеля, дарала б яе ўбачыць і на сметніку ці ў садзе, што звычайна ў дзявочых снах.

Хрысціна тут не гаспадыня, прыходзіць і адыходзіць, калінікалі. А можа залятае праз балкон разам з галубамі. Ступае босай нагой на ложак — гандолу, разам з гаспадаром вяслуюць да другога берага сваёй маладосці. Ніхто не ведае пра ейныя справы, занятак, на ейным заблытаным птушыным шляху кожны чалавек — паляўнічы.

Тут на вачах стаіць валізка, папяровы карабок, перавязаны матузом, даўно стаяць, рэчы памерлага ў другім горадзе, у другой сям'і бацькі гаспадара. Вось ён, толькі прыехаў сюды, вярнуўся, ён недзе тут, несумненна, вітае ў пакоі пах старэчай адзежы, і ты запавольваеш рухі, крокі, як звычайна каля старых людзей.

Каля вакна на плячо фатэля накінута калісьці матчына футра з краля, фатэль брычкай, утульным вазком, які спыніўся ў часе і нехта во сыйшоў, прыехаўшы, ён у доме, на некаторы час, на спатканне — з кім? — бо конь запрэжаны каля ганка, мне так думаецца.

Калі не стала маці, малады гаспадар нічога не скрануў з мейсца, нічога новага не набываў — ён жыў сярод старых рэчаў. З старымі рэчамі. На сцяне адляцела шпаклёўка, у мяне

пад нагамі храбусціць друз, хаця гэта немагчыма — гаспадар кожны дзень здымае пыл, ажыўляе рэчы, успаміны.

Гэты дом можна было б скласці ў кніжку, як рэдкі цвяток, а потым праз гады выпадкова знайсці — ён не згубіць свой дзіўны пах.

Ён мог быць маім, куды зводжу, купляючы на кірмашах камусьці непатрэбнае, але яшчэ жывое. Мне неабходны старыя рэчы, хай сабе і чужыя — каб мой дом меў біяграфію, гісторыю. Меў свае ўспаміны. У мяне ад бацькоўскага дома ані трэскі.

Пра што мы гаварылі? А хіба гаварылі?

Тут яшчэ жывуць другія галасы, гукі, іншыя словы, падняўшыся пад столь, нячутна ападуць далоў з папяровым шоргатам ад ветру з балкона.

Як я сюды трапіла? Хіба мяне хто запрашаў, рыхтаваў пачастунак? На стале тое, што засталося ад снядання, а можа ад учарашняга — памінальны стол, які пакідаюць, яго нельга прыбіраць на ноч...

Калі з пагорка ад Магдаліны спусціцца па сходках уніз і праз трамвайныя рэйкі, якраз напроці, праз нізкую брамку — гэты дом. Я вяртаюся сюды і вяртаюся, гаспадары і не здагадваюцца. Саджуся ў фатэль, на плечы ягоныя старыя накінута старое футра, фатэль брычкай, вазком, запрэжаны маім жарабцом Ірысам.

І да касцёла!

Казалі ў Грыдзьках, за польскім часам Ірыс меў на выставах узнагароды. Конь у яблыкі, казалі...

Аліна

«Што гэта табе ёсць? Маша звалілася з лесвіцы, а ты дзе быў, не падтрымаў? — Яна паляцела не ўніз, а ўверх...» — перагаворваліся потым мае мужчыны.

Праўда, уверсе, у небе таксама шмат перашкод: грузалле, гарачая пудраванка вулканаў, як пасля пікнікоў грэчаскіх багоў, сонечныя промні лазерам — не пераржаргаць, і самалёты, расклад іх рухаў не паспела даведацца — можна сутыкнуцца.

Зямля раптам вельмі блізка, як не наскрозь, касцьмі склаўшыся, ляжыш — і першае: вось яна табе, твая бяда. Некалькі сходак, такая малая адлегласць ад ранейшага звыклага

стану. Імгненне матэрыялізавалася і шмякнулася побач, аніяк нельга аднавіць у памяці: як гэта адбылося? Трэба ўстаць... анікога... трэба скласці шкілет, завінціць, як было, не пераблытаць левае з правым... анікога... не да смеху... анікога бліжэй начной кашулі і дзень, і два, і болей.

Тэлефон: я еду, збяры адзежу, я памыю, а што з ежы? Забяру цябе памыцца... не можаш? я ўсё зраблю...

Крэўны дотык, нечаканы, запамятаваны, як згублены ключ ад роднага дому, ад усяго чалавечага роду.

Знак супакою.

Працягваю руку, адчыняю захраслыя дзверы, каб упусціць анёлаў.

Яны ўсе спарадку падобныя да Аліны: нізенькія, бухматыя, у камізэльках, перабіраюць ножкамі, спяшаюцца.

Яна спяшаецца заўсёды: некага там пабіў муж п'яны, — трэба адвезці ў другі горад да маці, пакуль свара ўсціхне; некаму зёлкі, лекі, абаранкі для ўцехі, некаму ласку боскую. Сядзіць сама за рулём, падымае рукі, раскрывае далоні чашамі, замаўкае, толькі кратае вуснамі, трымае рукі так, пакуль не пацяжэюць. Ледзьве-ледзь прыпадымае крылы, заводзіць матор. Сонм анёлаў за ёю, дарожны патруль, пэўна, хрысціцца, калі ўмее: няўжо, маўляў, гэта ад учарашняга не прайшло? чад у галаве?

Я яе зусім мала ведаю, зусім. Дзе яна жыве, таксама. А праўда, дзе жывуць анёлы? Пэўна, на званіцы, каб першымі ведаць, чуць, што дзе адбываецца, каб паспець.

Аліна часцей у дарозе, можа і ноччу, уключыўшы, каб не заснуць, джаз, або «на далёкай Амазонцы не бываю ніколі».

Хаця для анёлаў не праблема туды дастацца, абы ахвота.

***

Па радзімых плямах, па радзімках апазнаю нанова гэты амаль чужы горад, амаль незнаёмы горад, з якім іншы раз начыста губляю сувязь, губляюся, не разумеючы, дзе я, з кім.

Тады шукаю знакі на ягонай мапе, як на сваёй далоні: Вовачка — блакітным, Андрук — юлёвым, Аліна... — нябесным. Потым рака, цэрквы, касцёлы, сінагога, менавіта сінагога старая. Зімой з ейнага коміна на марозе ішоў пахнючы дым.

Тады яшчэ Хрыстос цепліў дровамі...

БАГАВІЦЫ ЛЮБОВІ

Сонечнае кола

Маўчанне маладой жанчыны, бы спакой пані на партрэце ў дарагой раме насупраць.

Змяняла позу незаўважна, голаў павярнуўшы, з ценю на сонца пераходзячы.

Твар на памежжы звыкласці і прыгажосці залежаў ад асвятлення неба, ад ЯГОНАГА позірку, які яшчэ адчувала.

Зняла капялюш, і ён ужо за рамай, чужы, выпадкова некім пакінуты.

Гаварылі пра ЯГО, успаміналі дробязі, пілі каву, лёгка быццам пераходзілі на іншае — гасцявалі, прыехаўшы з горада. Не заўважалі слёз у ейных вачах, стаячыя слёзы — вокны пакінутага дома.

Раку за руку калісьці прывялі мужыкі, пусцілі праз вёску. Рэчка перабівала, уплятаючыся ў галасы. Гаварылі, гаварылі аб усім, раз-пораз чуваўся то плёскат, то бульканне ў вузкае горла бутэлькі паляўнічага ці пастуха, сцюдзёная вада з горным норавам, бы скочыўшы сюды са скалы. Праз вёску, блізка. Як праз хату, праз сад.

Гаварылі, гаварылі. Палкая размова на другім беразе сухім трэскам, а потым — спеў, падобны на галашэнне: кароткія, аднатонныя паўторы, бы абрываючы сябе за крысо, і без пакуты, як замова на ваду. Каму голас належаў? Са старых жанчын у вёсцы толькі хворая на галаву баба Зося.

Маладая жанчына расплакалася як не ўголас, раптоўна, бы дзіця, якое стрымлівалася доўга... ад крыўды. На ўсё жывое навокал. Здзічэўшы ад гора, высцілала, укладала побач з ІМ коней, зброю, усе фарбы, скарбы мастака, і сама наастатку.

Ужо адышлі ўсе памінкі, дзевяць, сорак дзён, успаміны, спагады, лягчэй не ставала.

Будзь прагавітай на гора як і на шчасце, не спадзявайся на помач, ні з кім не дзялі, яно толькі тваё, скажа самая старэйшая з іх, а можа падумалася кожнай немаладой жанчыне за сталом, што перабіралі свае радасці, беды, гора, як на ружанцы.

«У мяне маё» — падумала адна з іх, першая жонка мастака, яна папраўляла малодшай валасы, здымала і здымала ўсе дні побач чорныя покрывы, усцілаючы імі сад, поле да лесу, смутак чэзнуў, як туман, была вясна, рух, галасы ішлі ад зямлі, увысь, як дзіцячы спеў у час ютрані. Хавала свой жаль у малодшай на плячы па-мацярынску. Адышла ад стала на хвіліну, скочыла ў човен шамана, адплывала, таксама адчуваючы, што ЁН побач. І як ніхто разумеў: можна плысці супраць цячэння, не вяслуючы.

І яшчэ адна жанчына, крыху ўбаку на рагу стала, пачуўшы мужчынскія галасы на вуліцы, прыпадымалася, бы на кані, намацвала нагой стрэмя, лавіла, адзывалася на голас, як на паляўнічы ражок вечных ловаў. Хто ёй? каторы? калі? скажа, акрамя ЯГО, што яна падобна на французанку, ягоную трэцюю жонку ў Францыі.

Іхны час ляцеў, мінаў. Старэйшая заўсёды меркавалася сесці бліжэй да вакна.

Жанчыны, яны ўсе ішлі па высахлым рэчышчы сваіх жарсцяў.

Ён аддаляўся ад іх на сонечным ровары з адным колам (адзін з няздумана дзіўных праектаў перамяшчэння, руху ў небе), губляў залатыя спіцы.

Жанчыны падымалі іх, ушпільваючы сабе ў валасы.

Адна чыркнула бліскучым аўтографам маланкі... Генюсь Хацкевіч.

Прычасце

Ідучы каля Юзэфінай хаты, азірнешся, быццам спатыкнуўшыся — анікога. Хоць ідзі і пакліч, пашукай, дзе яна: можа, на печы, ці на ложку, ці накуця, як абразок — яна недзе тут. Тут, у хаце, цяпер усё па-другому, анічога ейнага, засланяе сабой на момант уваход гараджанка, якая здымае хату на лета.

Але вось яно — вакно, міжволі паварочваешся, глядзіш, пэўна, часцей за ўсё вунь туды, каб пазнаць, хто там ідзе па вуліцы: кот прыходзіць пад раніцу, трэба ўпусціць у хату, і цяпер во пад дзвярыма. А якое надвор'е? А ці высока яшчэ сонца? Тут настоенае, аблюбаванае старой гаспадыняй мейсца, тут яшчэ цёпла найболей.

Тут хочацца даўжэй пастаяць, бы Юзэфа побач.

Вось тая лава, неяк давялося зазірнуць у хату, нешта папытацца. Лезла з печы, каціласа, спяшалася, і не патрывожылі мы яе, не бойцеся — быццам нас чакала. У хаце даўно такі нечапаны парадак. Ужо баба Юзэфа хадзіла, жыла, скарачаючы свае сцежкі ў наваколлі і ў хаце, паступова пакідаючы тое-сёе на сваім мейсцы, не чапаючы рэчы, хай сабе і патрэбныя наразе, адыходзіла з хаты памаленьку, нічым і моцна пільным не карыстаючыся.

І цяпер ейны цень, каб нікога не патрывожыць, можа слізгануць па сцяне — галінкай яблыні.

І яна во па гэтай лаве рукой раз-пораз, запрашаючы сесці, дзьмухала на яе, хукала, месцячы мне, сцелючы, як дзікаму кацяняці, паказваючы, дзе ягоны, нарэшце, дом — ён тут.

А то было машына наша захрасла якраз напроці бабы Юзэфы. Яна, нічога ўжо не чуючы, пільнавалася жыцця адным вокам, ішла да нас, несла дошку пад кола, быццам адламаўшы яе ад стала ці ад дзвярэй у хаце. Несла, прыціснуўшы да грудзей, несла, пэўна, моцна беражонае, жывучы без мужыка, каб у плоце загарадзіць дзірку ад курэй ці так што якое.

Мы тады хутка вылезлі на дарогу, яна засталася стаяць і глядзела ўслед. Туга павязана хустка на галаве, і ўся яна, як спавітая, ва ўсё, што мела, на холадзе, нерухома стаяла, непарушная ў сваёй шчырасці.

Назаўтра едучы, аніякай выбоіны на гэтым мейсцы і не было, можа, мне атумысла была яна патрэбна, гэтая сустрэча, каб маё сэрца памякчэла?

Даехаўшы да свайго лецішча, спынілася і, адпусціўшыся на ўсё благое паміж намі, набрала твой нумар.

Надзя, пытаюся ў суседкі, а што баба Юзэфа, якая яна? Найлепшая самая, адказвае, найхарошчая.

Яна, каторая можа стаяць ля любой дарогі з ягадамі ці грыбамі, быццам дзеля прыліку гэты продаж. І мне не мусова патрэбна, а я купляю, спыняюся, каб нешта ўзяць з ейных рук, загаварыць — як прычасце, прычасце да лесу, да поля, прычасце любові.

Сама баба Надзя, што мяне дзівіць да пуду, ідзе па грыбы дык па грыбы, няхай немаведама якое надвор'е. Дождж,

дрэвы палошчуцца, як на плыні рачной, бы па самым дне, ідзе запаволена, не захінаючыся (які гэта ёй дождж!), вада скочваецца з твару, як з яблыка.

Жыве ў маім канцы. То неяк прыбегла пад ганак наказаць: ласіха з дзіцем за мастом, скарэй! Бегла, была паваліўшыся, уся ў гразі.

Я за ёй не паспяваю, у мяне адна думка, каб хаця тая ласіха не схавалася ў лесе, каб не дарэмна яна бегла па мяне, несучы лепшую палову свайго свету на ўцеху другому чалавеку.

Дзе, каму перайшлі ейныя зрухі, хто пераняў ейнае дыханне?

Скрозь сон іншы раз чую нейкія гукі ў начным небе, бы тачку нехта цягне, такі звыклы рух; гукі, як на зямлі, пэўна, і там каторая з нашых баб таксама ўпрогшыся ў работу, – усё на сабе.

Цяпер баба Надзя нічога не робіць, ледзьве дасталася ў той канец да Юзэфы, абедзьве ў плач – так даўно бачыліся. Сядзіць на панадворку, высока сядзіць на вялікім камені, ажаргаўшы яго, як свой помнік, даруй, Божа, на кладах, не даецца смерці, сварыцца з мужыком абы за што якое, спаганяючы маладое каханне – ён таму каханню варты не меў.

Адхінае хустку-валёнку, заводзіць за вуха, каб лепш чувалася: куды ён пайшоў? Ці бачыла ты яго? Дзе гэта ён? Пытаецца без патрэбы, абы той з вачэй. Нашто ён табе? Злуюся, няхай бы сама ціхенька без нерваў пасядзела, адпачыла. Хачу хоць цяпер памерці разам, кажа, маўляў, гэтых амураў у вёсцы! невыводныя век, асабліва іх поўна ў вішанні, як пчол, поўна. А ёй мужык у хаце цяпер – гэта, як той казаў, унутраны вораг, не паварочвайся да яго спінай.

Каб пагаварыць пра каханне, папытацца каго, ніхто без жартаў не адкажа, як з пазыкай звяртаешся перад вялікім святам. Але ж во і прагаварылася: разам памерці. Букет, бачыш, ён паставіў на верандзе, стары чалавек. Гэта насцярожвае, што праўда, то праўда.

За плотам міргнула яркая хустка суседкі, век у яе грэбень чырвоны, век у ахвоце.

Ідзе баба Надзя дробнымі крокамі, на дарозе, абы каго ўбачыла, яшчэ пушчэй прыпускае, каб заспець чалавека,

пагаварыць. Пра што б сама не распавядала, ніводнага ў ейнай гаворцы слова ўчарашняга ці чужога.

Але яшчэ будзе час, яшчэ мы нагаворымся, яшчэ мы ўсе нікуды не дзенемся і ніколі.

Мы хаваемся, абы ўбачылі яе: няма часу, няма! Разбягаемся, бокам усё, бокам, быццам не бачачы, што яна спяшаецца да нас, бокам, з прыглядкай у ейную старану, дзе жыве.

Яна ловіць нас, бы пулянят, збірае ў прыпол, нясе, высыпае сабе на веранду, зачыняе дзверы, каб не ўцяклі — каб нарэшце-такі нагаварыцца.

Мы не даемся, шчэмімся паміж ейных нягнуткіх ног, растапырыўшы скрылле пісклюкамі, аж пыл ідзе.

Мы не верым у смерць, у старасць. А тут яна, старасць, падышла раптоўна, ходзіць па вуліцы, твар быццам знаёмы. Цурайся не цурайся, а ад яе сыходзіць статычная хваля, як ад гліны, яна супадае з нашым маладым целам.

Іхныя адыходзіны вятрамі выхалоджваюць і маё жытло, быццам доўга-доўга ішла і ісці яшчэ спора, і вось заначавала ў чужым, пакінутым доме.

Адыходзяць без аркестра, без музыкаў, ціха, некалькі, адна-дзве таварышак ззаду. Мужыка ледзь знойдуць жывога, каб каторай ейны цяжкі крыж у рукі даць несці. І без галашэння, быццам ужо і па пары адысці.

І гэта ўсё?!

І раптам голас, вядома, мужчынскі: мужаў? палюбоўніка? Адтуль, дзе можна яшчэ сустрэцца? Хоць ты вазьмі і падымі голаў.

Заспяваў айцец Мікалай з Заслаўя. Спеў нечуваны на зямлі, з паднябесся. Спеў пад купалам неба, як у храме, дзе лес, поле, хаты, сады. Жыццё хай сабе і просценькае, адразу набыло высокі сэнс, веліч.

Жыццё, як дар.

Паступова ў ім пачуеш і спеў старога Венечкі, калі пасвіў кароў, сам сабе спяваў, а голас зычны, чысты, наскрозь поле.

Ці спеў у хаце маёй цёці Марылькі, калі нешта зашывала, латала вялізнай іголкай, шывок за шыўком, шырока, марудна, яны быццам клаліся на музыку, слова за словам, што ўзыдуць на памяць, пакуль не скончыцца нітка.

Пагалоска ад зямлі, з лесу: ідзе хваля грыбная — апёнкі!

Будзённыя галасы, галасы суцяшэння.

І памерці, пачуўшы, ах, Божа мой, гэта як проста шчыльна прыціснуць, зачыніць за сабой дзверы, у сцюжу, вядома.

Ужо і Стасіну хату ейныя дзеці абставілі ад сонечнага боку, якраз як знарочыста, бітым шыферам, усім чым непатрэбным, толькі што дзверы яшчэ не падпёртыя звонку, кажу ёй, жартуючы.

А я не бачу, дзівіцца, нахіляецца, падымае з-пад ног, каб нечым рукі заняць, дубчык лёгенькі, бы веснавая птушка ў дзюбу. Зараз узляціць на дрэва будаваць сабе гняздо, сонечнае з усіх бакоў, сухое, без платоў і загародак. Да Паўліка, мужа, нядаўна ездзіла на клады, наведалася, кажа. Гаварыла пра яго, гаварыла, шчэпала на грудзях, перабірала пальцамі, нешта папраўляючы, бы толькі што пераапранулася нават дзеля гаворкі нашай пра яго, не тое што.

І я бачу адразу — неяк была ўзышоўшы нечакана: яны сядзяць насупраць адно аднаго, на чыстым стале яблык. Во, кажа Стася, першы яблык ад маладзенькай яблыні, дачакаліся, будзем каштаваць. Сядзяць амаль урачыста. І мяне пасадзілі побач і рэжуць яблык ужо на тры долечкі.

Я заўсёды мела сабе ад іх добрую долю радасці, долю любові.

Зверху аднекуль голас сініцы. Птушка ледзьве дакранала-ся смычком, спрабуючы, ці настроена тут, як было пры старым гаспадары, на вясковы лад.

Стася ў маладосці вучылася іграць на скрыпцы.

Ці яны, дзеці, пра яе гэтага не ведалі, ці ім не на памяці, што маюць побач пеўчую душу...

Адна за адной, як на кані ў тарантасе, едучы разам на буракі ці бульбу, знікаюць мае багавіцы любові з вачэй вунь там, дзе вуліца, хістаючыся, паварочвае ўбок.

І, здаецца, вечарам вернуцца, як было дагэтуль.

Галасы далей і далей. Толькі крылатыя белыя хусткі яшчэ відаюцца. Ужо не разгледзець, хто там лейцамі кіруе, пэўна ж Бог.

Дарога выбеленая, шырокая; пакацілася за імі па ёй маё сонца.

Дождж ноччу праз адчыненае вакно зусім блізка, ляжыш у ложку, як пад дрэвам, дождж ціхі, роўны, бы плач палёгкі. Толькі невядома, на якім ты свеце, адно больш пэўна, што ў раі.

Ці плачаце вы ў сне, не памятаючы раніцай, што вам бачылася?..

Рымскі сняданак

Сяброўкі, вярнуўшыся з Рыма, наперабой распавядаюць пра атэль прыватны, Калізей, форум Аўгуста, шопінг, аксесуары са скуры пад пітона, выставу Вяцолі, любімца моды і арта, гэта праект Джоні, які ўключае ў экспазіцыю працы самавучак, нікому не вядомых аўтараў — ён называе мастацтвам усё, што заўгодна. Вядома, ягоную «світу» мадэлек, як калісьці знакамітых рымлянак, іх не суправаджае цэлы статак асліц, каб было абмаладзіцца ў свежых малочных ваннах, але...

Але што падаюць у Рыме на сняданак?

Мне хочацца зайсці ў Рым чалядніцай, палюбоўніцай на досвітку з кубкам эспрэса. Жабрачкай з сабакамі, як тая, што падмывала ім хвасты каля калонкі на вуліцы, не звяртаючы ўвагі на здзіўленых, зніякавелых на момант японак і нас, былі праездам. Толькі на момант, сумеўшыся, мы ўсе разам зразумелі, што Рым для яе не прытулак, не скляпенне, дзе яна з сабакамі, можа, начавала.

Рым — гэта ейны ДОМ.

Хачу, спяшаючыся, як калісьці, за свежымі кручонікамі, бегчы па вузкім тратуары і яшчэ, і яшчэ раз азірнуцца на маладога мужчыну, з якім разміналася блізка, цесна, быццам ледзьве здолела выпырхнуць з ягоных ранішніх абдымкаў...

Мне пільна трэба на гэтым сённяшнім часе, як на змроку, дастацца да Маці Божай з дзіцем у базіліцы Санта Марыя Маджорэ, такая яна вясковая на здымку, блізкая, быццам калісьці ўжо бачыліся.

Дык што цяпер падаюць у Рыме на сняданак?

Рым, я прыняла тваю любоўную атруту, трымаючы кубак абедзвюмя рукамі, бы на ранку сваёй маладосці...

ВЫШЫВАНКІ

Вечная вясна

Квеценню абсыпаюць голае галлё вербалозаў, сядзяць каля Магдаліны ў ейных нагах, пад плотам царкоўным немаладыя жанчыны. Раніцай, яшчэ холад бярэ, цісне за руку незнаёмцам, толькі што не пытаецца: «Ці не зарана, мае жанчынкі, памянялі сані на калёсы?»

Вёсны, вёсны. Усё лічонае: пяць пялёсткаў ружовых, сярэдзінка жоўтым — і на галінку жывую, не асыпяцца ў падол, не звянуць, калі не прадасі, гэта не маладосць. Толькі ў адной бабулі букет без кветак папяровых, — тавар — жывыя каткі на вярбе, ледзь зацярушаныя першым сонечным пылком.

Як праз парог пераступіць, адразу трапляю па гэтым холадзе вясновым да дваюрадных сясцёр, і двойчы родных, і тройчы, і бясконца, ужо аўдавеўшых, немаладых. Скарэй, скарэй, я вас здыму, не трэба строіцца, апошні кадр! Але дзе? у якім мейсцы, каб жа аблюбаваным?

Сад! У пустым яшчэ садзе ўтрох, у нечым будзённым, шэрым. Леташняя трава сівой поўсцю. Такія рухавыя заўсёды, век ім няма часу, а тут не спяшаючыся падыйшлі, каб патрапіць, лучыць у такую рэдкую хвіліну часу. Што выпала — любілі здымацца.

І можна здагадацца, што ў садзе вясна па тым, як сёстры падышлі да яблыні; дрэва, пэўна, прачнулася — яны чулі: па-жаноцку, цнатліва, плячо да ягонага пляча, сталі, быццам ужо настроіліся здымацца, абцерлі вусны, наламаўшы здзіўленае брыво — згадзіліся застацца ў маёй вечнасці, як стой, у тым самым, будзённым, у чым да каровы, ці да свіней, нічога адмысловага — з даверам.

Але што ў рукі? Што ў рукі ўзяць?

Наламала каторая з іх некалькі галінак з коцікамі каля хлявоў дзеля прыгажосці, вядома: да валасоў ці да твару, да сачыка, да паўбурносіка, коцікі з-пад снегу, маразоў, з-пад доўгай зімы, як за пазухай каторай з сясцёр беражоныя.

І наогул, нязвыкла без нічога ў руках, ці каб быццам дзеля забавы, каб выдавалася, што час бавіцца.

Дрэва ці куст, ці кветка – за галінку трымацца, як дзіця за руку.

Толькі праз гады, разглядаючы здымкі, заўважыла, утрапеўшы: сёстры перадавалі букет адна адной, калі я пераключала новы кадр.

Мая ты вербачка...

Эскіз да партрэта

Святлане Кліменценка

Атрымліваю паштоўку. Почырк буйны, з кучарамі, бы лістота дрэва.

Як звычайна, «в первых строках...» – падае мне пад ногі першы... другі... трэці жоўты ліст, цэлы тэкст, што прыйшла восень. Тэкст з вензелямі – ужо падарунак. Словы падабраныя, як упрыгожанні, дарагія, калі пішуць навечна, рыхтык. Як пішуць на помніках. І ў канцы: «Прабач, пасля ўдару рука слаба служыць!»

Святлана?!

Я ледзьве пазнаю... успамінаю хутка... у мяне хустка на плячах, раблёная, вядома. Дзяўчына з Пушчы. Яна ідзе ззаду, збоку, яна круга, выратавальнае кола рук ейных, уперад, уперад да рэдактара ў кабінет, да Андрэя Коласа. Што гэта ёсць? Я, надзіва, не губляюся: вясковая настаўніца, дачка польскага асадніка, адразу ў сталічную газету, орган ЦК?! Колас прыняў з ейных рук у рукі, як на пасад.

Так яно і было: мы ў газеце, як замужам, дзень – ноч, дзень – ноч, і па любосці, як кажуць.

Перад гэтым «пасадам» у рэдактара спачатку было высокае крэсла трактара.

Разводдзе, туман умінаўся пад калёсамі, як коўдра, ці можа гэта ўжо аблокі? Зямлі не відаць, калёс таксама, толькі гэты «пасад» – высокае сядло, і над усім. Пільна трэба дастацца да даяркі, кандыдата ў дэпутаты – першая камандзіроўка.

Яна ўзяла мой матэрыял і перапісала, стрэсла з шырокай сваёй спадніцы на падлогу, як шалупакі, мае начныя, пасля паездкі, журналізмы. Ёй хацелася прышпіліць даярцы ў валасы

дзьмухавец, і каб кожны абзац пачынаўся гучным акордам. Я не бачыла там на мейсцы дзьмухаўцоў, там наогул не было колераў, гукаў, акрамя трактара з высокім сядлом, не было ценяў, акрамя майго, як прывід.

Асабліва вандроўка назад: мяне падабраў на Мінск дальнабойшчык, аўтобусаў ужо не было. «Спявай, а то засну» — застагнаў у дарозе. Два смяротнікі, ноч, і «товарищ, не в силах я вахту держать...». На развітанне пацісну́ў руку, маўляў, ну вось і «адкачагарылі» разам. Вось аб кім хацелася напісаць і аб трактарысце.

Святлана пачала здалёк, бліжэй і бліжэй. Бы музыка на вадзе, і стаіш, абліты святлом поўні, човен срэбны, мандаліна, і мовы не чутно, бо гэта не аб маім нарысе, а музычнае шоў.

Заўсёды некага носіць на руках, апякае, захапляецца ў рэдакцыі, на вуліцы, у камандзіроўцы. Хустка-крыпанка спадае з галавы ад вечных памкненняў, і наогул — у высшых сферах хустка не ў модзе, там звычайна лаўровы вянок або німб. Век камусьці нясе ўцеху, ці спагаду, спяшаецца, вітаецца здалёк, ужо побач, ва ўсёй постаці нешта мацярынскае, вечнае, усміхаецца, ніколі, каб ёй здрадзіў голас, сарваўся на крык, на свару. Быццам яна жыве напрэч адарваная ад карэнняў быцця: нястачаў, бедаў, скрухі.

Ідучы па калідоры рэдакцыі, доўгім, вузкім, галаву не павярнуць, як воўк, раптам чуеш з ейнага кабінета голас, смех, шчэбет, спынішся, пастаіш, як у сусветнай прыбіральні, таксама ўсміхнешся і пойдзеш далей, не адразу адрозніш, што запазычана, што тваё, калі спрабуеш быць добрым да ўсіх спарадку і па-боску.

Апошнія хвіліны, вось-вось падымецца фіранка занавесу на сцэне. Не, занавес не падымецца, бо яе яшчэ няма.

Амаль заўсёды заходзіць у залу (любую!) спазніўшыся, як гаспадыня, якая, можа, сустракала важнага госця, а можа, трапіўся бадзялы кот ці сабака, і з ім не ўдалося хутка развітацца. Азірае ўсіх вяльможна, так ідуць пад апладысменты, павольна, уборыста, маўляў, усё добра, усё абавязкова адбудзецца, чаго чакаеш. «О, гэта нехта з вядомых!» — і супакойваюцца.

Яе мала хто ведае, як не ведаем імёны добрых анёлаў ці так каго яшчэ. Заўсёды прычасана, сціпла, вытрымана ў стылі

актрысаў нямога кіно ці каралевы англійскай, ці, можа, проста прыбраўшыся на сеанс да мастака, каб закончыць замоўлены партрэт.

Яна несла ў залу перад сабой у абедзвюх руках настрой, як самае галоўнае блюда на гэты святочны час.

Не шукае вачыма знаёмых, таварышаў, сяброўак, проста пануе, святкуе з тым, хто трапіцца побач, каб усім хапіла ўвагі, як каралева. Гаворыць, не саступаючы ніводнаму «замежніку», і толькі па-беларуску, перамяжаючы гаворку кароткім смехам, бы такуючы — запрашае ў сумоўе.

Не здрадзіш,
не згубіш
мову, на якой любіш.

Ніхто асабліва не дамагаўся ейнага сяброўства, зычлівасці, аніхто і не сумняваўся — яна побач, заўсёды. Яе кідалі ў бядзе, забываліся на яе — яна будзе там, на тым мейсцы, дзе ты быў шчаслівы, гэта магчыма, будзьце ўпэўненыя. Побач з ёй адчуваеш сябе нашмат маладзейшым, і справа не ў гадах, проста ты не дарос яшчэ да ейнага стану, правілаў жыцця, да ейных галоўных змыслаў.

Яна ідзе па зале, як па садзе, у якім ніколі не бывае ценяў, ніколі не хавае вачэй — яна ўсіх любіць. І ледзьве ўмоўнае чаканне на твары, чаканне чарговага цікавага героя для газеты.

Ледзь знаходжу даўно запамятаваны нумар ейнага тэлефона.

— Прывітанне! Колькі цяпер часу? у мяне спыніўся гадзіннік, а мне трэба ў рэдакцыю...

Мой самы ўлюбёны час, калі лета, ты сядзіш у садзе, п'еш гарбату. Тонка звініць сухое паветра, бы зярняты ў спелай макавай галоўцы; поўны бутон ружы, цельца цяжкае, цёплае, цэлая прыгаршча, бы злоўленае птушаня; дымны дух пахнючага тытуню; замецены сцежкі сухім лістом, хаця да восені далекавата.

Спякота.

І голас далёкай навальніцы, бы лёгкая трывога...

Габелен

Андрусю Горвату

Ідзе з аўтобуса, як дзяўчо: заплечнік, рукі вісяць, уходаўшыся. Набліжаючыся да хаты, паскорвае крокі, ужо яна як не бяжыць, бачыць здалёк сваю работу, немач пакінутага жытла. Бяжыць. Спыняецца раптоўна, углядаецца, бы з цемры, не зводзячы вачэй з вокан, углядаецца, як у твар.

Маё лецішча насупраць, бачу Тамару з вакна. Я да Бога: «Божа, памажы ты ёй, Божа шчыры, памажы...» Іншы раз, каб толькі дзверы яна ў сваёй хаце адчыніла, яна мне быццам толькі дзеля самой хаты.

Наведваецца з горада і малодшая сястра, і брат. І раптам іх ужо і няма, зачынена хата. Не бачна было, не чувалася, каб збіраліся, складалі на падворку торбы, і нязвыкла, каб разам.

Так узлятаюць птушкі, вялікія птахі, займаючы, асеўшы, вялікую прастору.

Пасля іх доўга пустуе луг, поле.

Ноччу пакінутая хата асядала, падбіраючы пад сябе сходкі, бы босыя ногі пад спадніцу. Стары плот рэкне, нахіліўшыся да дрэва, утрымаецца, задрамаўшы на вахце — стары вартаўнік з надламанай кавялой. Начныя гукі, з падполка, з гарышча, цвік зварухнуўся, сцяўся, як хлуд, у дошцы, мыш, размінаючыся з пацуком, зачапіла хвастом семя чарнакораня і ходу ў падмурак.

Ападаюць на зямлю пад ногі празрыстымі матыльковымі скрыльцамі карунковыя дошчачкі, аздоба веранды.

Вось-вось напятая нітка, апошняя сувязь з вёскай, пырсне, парваўшыся, і мне па вачах драціной.

Няўжо і Тамара, якая вырошчвае яблыню з зернюка, пакіне вёску?!

Мяне, жывучы напроці, цешыць ейная крыклівая гаворка, незласлівыя сваркі з сястрой. Голас гілёвы, то тут, то там, то ў небе. Па тэлефоне ён няўпэўнены, скамячаны, бы з кішэні, яго трэба яшчэ доўга мяць у руках, хукаць, сагравацъ сваім дыханнем, качаць, бы цырубалку, свістульку з гліны.

Малодшая раз-пораз ідзе ў сад, пад яблыню, шукае яблык, падыме, абатрэ аб крысо швэдра, круціць у руцэ — з якога боку лепей укусіць? Асалода расцякаецца, капае далоў, яна ўскідвае

цёмнае брыво, дзівіцца смаку плода, быццам толькі што першы раз пакаштавала, стоячы побач з Адамам пад райскім дрэвам.

Тамара болей за работай, а то спыніцца ў садзе ці ў агародзе, нічога не робячы, каб набыцца тут, насілкавацца, вачыма, жыватом. Бягом і бягом, спяшаецца заспець пагоду, матчына цяпло. Яна яго яшчэ адчувае.

Іншы раз толькі прыехаўшы, і заплечнік не зняла, глядзіць, як тут, што без яе нарабілася, градам, ветрам, дажджом, шукае вінавайцаў, углядаецца нізка, бы яны, сляды, ёсць, недзе тут, пахаваўшыся.

Высвецілася праз хмары вось толькі гэтая пляма на панадворку. Сёстры выходзяць на сонца, чуюць яго ці седзячы за швейнай машынкай, ці з пруткамі, ці гатуючы ежу, выходзяць на ганак, як на ляток, асядаюць на сходкі, пераступіўшы парог. Гэтак і на дождж. І сонца, і вецер, і дождж прыходзяць да хаты, да іх — вёска амаль пустая.

Малодшая, рукі на каленях, глядзіць перад сабой, нерухома, доўга, села асобна, спіной да спіны хаты. Яны ўсе яшчэ, як дзеці, туляцца да хаты, а яна нядужа, яна, як стары чалавек, ёй патрэбна помач.

Ізноў іхнія галасы, крыкі, як у птушак — у час гнездавання. Конь Орлік сарваўся, ланцуг ззаду, ляціць па вёсцы, стук капытоў стэпам, пыл ці дым успамінаў. Каня таго ні збыць, ні трымаць, брат пакідае яго ў суседняй вёсцы да выхадных. Звычайна ідуць дамоў напрацаваныя, ёкае селязёнка, і чалавек хакае, дыхаючы — упрогшыся абодва. А то рыхтык выява: конь вядзе гаспадара, трымае, цягне гужам назад, да зямлі, і па зямлі. Той і не ўпіраецца, моўчкі, пакутліва, бы ранены гарадской спакусай, адна нага яшчэ ў стрэмені.

Конь памятае дарогу дамоў лепей.

Тамара ўскочыла з агарода на ганак — дождж! Рукі развяла, трымаецца за касякі дзвярэй, распята, аслабанёна, і сястра побач. Ужо ім нічога не рупіць: дождж, ну і добра! Ая-яй, сена змочыць! Ая-яй, бульбы не ўкапана — ужо гэта іх не турбуе. Гэтай вясной яна клінок зямлі запусціла, ляжыць, дзіка ўтравеўшы.

Стаяць у дзвярной раме, дождж, дзверы з шырокім налічнікам, як з акладам. Дождж цёплы, у гэтых водах, як па мне, дык нараджаецца гарадскі чалавек, мне амаль малазнаёмы,

не згадаць, якім ён будзе. Стаяць такія свойскія, усё тут іхняе: і хата, і зямля, і рэчка побач, і лес.

І шалупакі яечка яшчэ пад нагамі, з якога вылупіліся.

Увечары Тамара, адыходзячы на аўтобус: «Усё! Кіну! Хай зарастае! Во малодшая наша ў горадзе: ідзе з Камароўкі, бульбачка ў пакеціку, букецік у руцэ! І харашо! І я не буду ірвацца болей!»

Работу ў горадзе няцяжкую мелі. Гэта, як той казаў, каб толькі дабыцца да апоўдня, як было кароў пасучы, чаргу адбываючы, а пасля палудня, абы сонца павярнула, ужо скора і дамоў.

Ходзіць па садзе, па полі, па завулках старая жанчына — ВОСЕНЬ, адхінуўшы хустку са слабага вуха: ці пяюць тут людзі жніўную? Ці чуваецца тут мова?

Сад. Сад яшчэ трымае ліст. Яблыні, жоўтай рэддзю ахутаны галовы. Сад у задуменні. Сад у маім вакне, не пераліснуць старонку да зімы.

Вецер яшчэ лёгкі, сухі, перабірае кожны ліст, не чапляецца за вугал хаты, не скавыча.

Тамара выйшла з дачкой, вытрасаюць посцілкі, расцягваюць, прастаючы, памытую ў шклянкі, туга трымаюцца за абодва канцы. Тамара адкінулася назад, цяжэйшая, перацягвае дачку, раз-пораз, важка, усім целам правісае, усміхаючыся, бы на мужчынскай руцэ, у танцы, галаву набок, гледзячы ўніз, ці не завысока паднялася спадніца.

Час запавольваецца, дранцвее, спыняецца.

Габелен! Ад ганка да хлявоў!

На сходках спынілася малодшая сястра, трэцяя постаць, стаіць быццам блізка, а твару не відно, у цяньку жыве.

Ужо яна ў садзе сярод дрэў, прысадзістыя, постаці старых яблынь каржакаватыя, пераходзяць з мейсца на мейсца, мяняюцца невыводнай прыгажосцю, моцай.

Да кроснаў! Уток... прапускаю ўточную нітку... авечча воўна... дабаўляю срэбную... не, залатую... раскрыпаць зляжалы ў куфры маток, заціснуўшы знойдзены кончык вуснамі, як залаты радок «і тчэ, забыўшыся, рука, цвяток радзімы васілька».

Мільфлёр! Бёрда ад сябе, бёрда на сябе! Чоўнік выслізвае з рук яшчаркай — яны ўсе зноў скрануліся, як ад ветру, выткане цяжкае палатно.

Тамара пацяжэла, памажнела, прывёзшы ў хату дачку з дзецьмі, быццам яна ўжо займае больш мейсца на зямлі, ідзе шырока, усіх вядзе за рукі, побач, і за плячыма, ашчалепіўшыся за шыю, унучка.

Козы суседскія ўлезлі ў агарод, яна закрычала з сілай, моцай сямейніцы, з моцай сваёй бальшыні ў хаце. Ужо ёсць ёй з кім абгаварыць суседа за патраву, злосцю насілкавацца, каб нават і не здароўкацца потым з нядзелю.

Спеліцца ў ёй, як на сонцы: крыкам, лямантам – і зноў усё добра.

Сонца поўдня перакулілася праз страху, асвяціла ганак. Дачка бягом з місай, якраз вада нагрэлася і высушыць лёгка, дзіцячае адзенне марлёвачкай з даёнкі, пахне малодзівам.

Малодшая выйшла, хуценька тут і села на прыступку, падабрала ногі пад спадніцу – рэжа яблыкі пасушыць, спяшаецца, каб заспець кароткае асенняе сонца.

Тамара туды-сюды, блісне вачыма маланкай сярод яснага дня – спаліць! Вось дачка, маўляў, нічога не памагае, а скора назад, у Маскву, сядзіць дзень-ноч, вяжа і вяжа швэдру, крыпаецца і крыпаецца, моўчкі, ні да кога не гаворачы, а трэба збірацца, дома б скончыла!

Тая спяшаецца ўплесці, увязаць і сваю дзіцячую сваволю ля маткі, і гукі хаты, і пахі, і матчын голас, зык, крык, разлічаны на вялікую адлегласць, на лес, на поле, звязаць з галасамі сваіх дзяцей, моцным вузлом, да высокай актавы роднасці. Спяшалася.

Перад самым ад'ездам, ужо і хату зачынілі, Тамара, уся гарачая ў твары, схапіла ўнучку падпаху – і на воз! Якраз брат бульбу выбіраў, ехаў, унука – на каня верхам запіхнула!

У гэты дзень яна ім печ цепліла, адмыслова, хаця яшчэ і цёпла, каб паглядзелі на жывы агонь у хаце – ГНЯЗДО АГНЮ, каб ведалі смак варыва, каб раскаштаваліся... а можа яшчэ яно..., а можа..., а хто ведае наперад...

І мне было няволле пакідаць радавое мейсца ў пошуках любові большай за тваё сэрца, цёця Марыля, у якой гадавалася...

ПАЭЗІЯ

ЛЕДЗЬ ЗДУЖАЮ
РАСПЛЕСЦІ
САНДАЛІ
І КОСЫ,
МАРАЧЫ ПРА СОН

Габрыэль Містраль

* * *

Рыфму
трэба доўга
чакаць,
чакаць, як пагоду,
а то, спяшаючыся,
абшукваць
свае і чужыя
кішэні,
свае і чужыя
шуфляды.
Не люблю
рыфмаваць.
З любога
куплета
хочацца
выцягнуць
нітку,
на якую ён
нанізаны,
з апошніх радкоў —
і паглядзець
на пацеркі-словы,
як яны перада мной,
рассыпаўшыся,
лягуць,
бы варожачы
на Каляды.

* * *

Нехта ноччу
абшукваў
мой дом,
паліла запалкі
маланка,
гром, не асцерагаючыся,
шоргаў шуфлядамі
ў камодзе,
перасоўваў
скрыні,
кублы —
нехта ноччу шукаў
мае таямніцы.
Ніхто
не звярнуў
на мяне ўвагі,
убачыўшы,
што я ўстала
і выйшла
на ганак.
Я зразумела:
нічога
мне не належыць,
нават маё цела,
калі я
праз ноч,
праз гады
лячу
да цябе.

* * *

Н. Б.

Збіраешся наведацца,
збіраешся заехаць,
як заўсёды,
калі будзе па дарозе,

каб было за адным разам,
за адным скрыпам
дзвярэй,
каб у хату
не напусціць
прахалоды,
і табе не здагадацца,
што дзверы мае
расчынены
і ўначы,
і холад усю ноч
лічыць масніцы,
і мне, бы ў казцы,
сніцца:
ты навязваеш каля ганка
каня,
а я аніяк не магу
ў цемры
знайсці апранаху,
спадніцу,
каб выбегчы
насустрач.
Стаю на ганку
і планую
пракласці
вакол сябе
кальцавую дарогу,
каб ніхто не мінуў,
і нават тады,
калі будзеш
вяртацца
дамоў,
трапіш найперш
да мяне.
Ці ведаеш,
якое глухое
месца
мне адведзена
табой

на зямлі?
Яно па дарозе
да тваёй адзіноты...

* * *

Тарасю

Раніцай
мой трохгадовы
хроснік
праспяваў мне
песню.
Я не зразумела
ані слоўца.
Так магла
праспяваць
ручная
птушка.
Так спявалі
анёлы,
калі мне
выбіралі
імя —
Марыя.
Мне боязна
выпускаць цябе
з рук
у свет.

НЯДЗЕЛЬНЫ КІРМАШ

Дзяўчынка
не бегла,
не ішла,
яна, як зламаны
зялёны конік
у траве,

перамяшчалася
і без суправаджэння.
Боязна
злавіць
ейны позірк,
але нікому
і не карцела,
бо вакол горада
адцвілі нарэшце
паземкі
і яна, бы з кошыка,
з лесу
на асфальт
скочыла
і не здужала
выпрастаць
ножкі.
Азіраюся,
натоўп не сышоўся
за ейнай
спіной —
паветра было
разрэджана.
Далёка
мне відаецца
ейная постаць:
то набліжаецца,
то адыходзіцца,
быццам, час ад часу
абміраючы,
я бачу
свайго двайніка.

* * *

Ён пражыць на сонцы
сваё старое
адзенне,

а потым, апрануўшыся,
чуе,
што праменні
пахнуць
сланечнікам.
Шапкай з галавы
п'е ваду
з мелкага ручая.
Сушыць
лішку хлеба
на заўтрашні
дзень.
Ні кала,
ні двара,
а кожнаму
стрэчнаму кажа:
«Прамаўляйце
ўголас
свае жаданні,
жадайце
неабмежаванага,
і неверагоднага,
прамаўляйце
ўголас —
і яны збудуцца».
Ці не мае
начныя пацеры
ён меў на ўвазе,
калі я прашу,
каб пачуў
мяне
чалавек
насупраць.

* * *

Па што я ішла?
Доўгія чужыя

сені,
бяруся за клямку,
як за руку,
ступаю ў змроку
не свамі нагамі.
Мяне пераймае
прахалода
з адчыненых дзвярэй
варыўні,
ледзь высвечваецца
акраец
жорнаў,
яны скрануліся,
цяпер мне не спыніцца.
Я не здужаю
іх зрушыць сама —
я зусім яшчэ малая.
Жменю—
у жорны,
жменю —
у рот,
мука церушыцца
пазёмкай,
вецер вакол
кругамі,
вецер мацнее,
вецер віецца
слупамі,
да столі,
як смерч.
Я не магу
спыніць
пустыя жорны.
...Адчыняюцца дзверы
ў хаце,
трэба сказаць
гаспадыні,
па што я
прыйшла.

па дарагія ўспаміны:
быццам еду
з сёстрамі
з млына
на конях,
напудраваўшыся
вальцам,
і кветка ў валасах.
«Асадніцкія дзеўкі...
старэйшая Уладзя,
а тая — Гілена...
і сынок Бронік
ужо ў дзяцюкі ўбіраецца...
а самую меншую
як завуць?» —
пытаюцца людзі
адзін у аднаго.
У мяне яшчэ
не было імя,
я яшчэ
не нарадзілася.
Круцяцца
пустыя
жорны.

* * *

Дзілінь-дзілінь,
раз-пораз
голас салаўя ў садзе,
бы нехта ўстаў
раней за мяне,
памешвае цукар
у шклянцы
з гарбатай.
Раней за мяне
прыляцелі
лясныя птушкі

па зярняты,
колер пер'я
водбліскамі
першага сонечнага
промня.
Раней за мяне
зразумеўшы
ў гэтую раніцу,
нехта даў мне знаць,
што я шчаслівая.
Раней за мяне.
А ці клаўся
гэтай ноччу
Божанька спаць?!

* * *

Я. Жабацінскай

Зноў і зноў вяртаюся
да тваіх вершаў,
такое пачуццё,
калі заходзіш
у пакой,
дзе спяць
мае дзеці,
млосна,
цесна робіцца,
не здыхацца,
быццам у мяне
поўныя
грудзі
малака.

* * *

Ваду са студні
ў вядро,

з вядра ў саган,
у кубак,
ваду ў жменю,
з раніцы да вечара,
закасаўшы рукавы,
не шкадуючы
часу,
я выконваю
нейкі старадаўні
рытуал.
Намачыўшы падол,
змыць стому,
сцерці з твару
чужы
позірк.
З дня ў дзень.
Ужо забываюся,
што раблю,
што павінна рабіць,
тады вяртаюся,
іду на тое
месца,
дзе нарадзілася
патрэба,
і знаходжу яе,
ужо вылупленай з лускі.
Ужо блытаю гукі,
не пазнаю
самае звыклае,
быццам яны даходзяць
да мяне праз тысячу
светавых гадоў,
быццам я ўжо
не тут,
а на другім баку
рэчаіснасці.
Плачу ад крыўды,
непаразумення
і зноў бягу

на чалавечы голас,
выціраючы слёзы,
бы пырскі свайго
хатняга
вадаспаду.
Вада са студні,
у вядро,
у саган,
у кубак,
у жменю;
прыезджы чалавек
сказаў:
«Мая вада бы з-пад каменя,
з таго месца,
дзе пачынаецца
рака».

* * *

Крохкі
гром
цукровымі
драбамі
па маёй
страсе
і мне
пад ногі –
поўныя кішэні,
поўныя жмені
салодкага лета.

* * *

Ул. Арлову

Вашая паэзія
прабегла па лісці
ў маім садзе,

пасля
след ейнага
высокага
абцаса
я заўважыла
на сухім пяску,
як ад кропляў
буйнога
дажджу;
скруцілася коткай
з вавёрчыным хвастом
у мяне на пеляне
і змусіла
патэлефанаваць
у дзверы
вашага парцалянавага
дома.
Каторая гадзіна?
У вас увесь час
гарыць
бурштынавае
вакно.

ВЫЯВА МАЦІ

На яго паказваюць
пальцам,
называюць дурным
замест
наймення.
Ён наезджы ў вёсцы,
чужы,
у чужой,
кінутай хаце,
у вопратцы
з чужога
пляча,
чый ён,

адкуль —
ніхто не пытаецца.
Толькі калі да яго
прыязджае
наведаць маці,
вёска
на некаторы момант
ачахне,
згледзеўшы ў ім
чалавека.
Яна ідзе
па вуліцы,
разглядаецца:
хто тут з ейным
сынам,
што за людзі,
пільнуючы
кожны позірк,
кожны
камень
на дарозе.
Вяскоўцы
хаваюць вочы,
не адзін успомніць,
што не дадаў
дурню
за працу, наняўшы.
Пад ейнай
аховай уся вёска,
як аслабанёная
ад дзікай
уцехі
з чужога
гора.
На некаторы час.
Стаю,
гляджу на яе
з вакна
свайго дома,

як з вакна
сірочага прытулку,
ад мяне
ўцякае
дарослы
розум,
бы толькі што
кінулі ў свет
і ніколі
не наведаюць —
ужо добра знаю.
Намацваю
на сваёй шыі
абразок
Вострабрамскай.

ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ

Раніца,
амаль спрасоння
заводжу руку,
адхінаю
на вакне
фіранку.
Пад вакном
у гэты момант
распускалася
кветка
ўсходняга маку.
Нашыя рухі
супалі?!
Жанчыне лёгка
адчуць сябе
багавіцай,
нарадзіўшы дзіця,
ці проста —
адхінаючы фіранку.
Развіхаецца

раніца
па знаку
з майго
вакна.

* * *

Нежывое птушаня
на сцежцы,
у лесе,
не разглядала,
якой птушкі,
бы не было
на тое дазволу —
яго апазнала
раней за мяне
смерць.
Я спазнілася
на месца
здарэння.
А так хацелася
запытацца:
«Чыё ты ёсць?»
Як пытаюцца
ў дзяцей
у нашай вёсцы,
сыскваючы
сабе радство
да сёмага калена,
да сёмага
каленца —
салаўя.

* * *

Ноч без зор,
цемра.

Сляпыя вокны
хаты
адымаюць мой
зрок,
не заплюшчыць вочы
ад незразумелага
начнога страху.
І раптам,
як развязалі
на мне
вяроўчыну,
выслабанілася,
успомніўшы:
гэтай ноччу
спіць у старога
суседа
ягоны госць —
гадавалы праўнук.
Спіць сярод нас
малое дзіця,
яно не ведае
страху.
Бог недзе
побач.

МАТЧЫН ДОЎГ

Пісьмовы стол,
тэлефонныя размовы,
потым цыраваць
панчохі,
прынесці вады,
гатаваць ежу,
не здымаючы з морквы
маладую скурку,
потым зрабіць
нешта ў садзе,
але абавязкова

каб напрацавацца
да змору,
як разлічыцца з некім
да астатняга,
аддаць вялікі
доўг.
А можа патрэба
належыць,
належыць зямлі
да знямогі,
да асалоды
пад языком.
Як выратавальны
валідол?
Мой стомлены
шчасцем
дзень.

* * *

Ноч.
Спусціцца
з верхняга пакоя
ўніз,
няўцямна,
без патрэбы,
як скрозь сон
да хворага
дзіцяці,
прайсці басанож,
не паліць
святло,
каб не патрывожыць,
каб упэўніцца,
што зямля
спіць.

НЕЗЯМНАЯ ЖАНЧЫНА

Н. Б.

«Табе гадоў
з чатырнаццаць,
не болей,
як маёй старэйшай
дачцэ» —
кажаш ты смеючыся
ў вочы.
Я ніколі табе не пярэчу,
не прашу тлумачэння,
толькі мне адразу
нешта пачне замінаць
быць з табой шчырай.
Я адлучаюся
ад усіх,
бягу, намацваючы
нагой цвёрдую
выспу,
ускрыкваю ў сне,
трапляючы ў рудое
вока балота,
пераскокваю
з купіны на купіну,
атрасаючы
ружовыя капыты
ад рудзізны і цвілі.
Мой узрост спыніўся,
калі дарослыя
адбілі мяне
ад майго племя, пастрыглі нагола
і, як ягня,
пусцілі да чужой атары,
на чужую пашу.
Як ягня,
а дзяўчынку трэба ўвесь час
весці за руку.
Можа таму

я не захацела
мець дзіця
ад чалавека,
ува мне яшчэ не нарадзілася
зямная жанчына.
Мне чатырнаццаць?
Ты памыляешся,
мне менш,
я ў той пары,
калі просіш
Вострабрамскую,
бы строгую маці,
каб дазволіла
ўзяць у хату
бадзялага
шчанюка.
І толькі гэта...
Мне менш.

* * *

Дождж праліўны
праліўся незнарок,
праліўся з вядра,
а можа, з начовак,
калі я прала бялізну.
Дождж праліўны,
шкло на вокнах
спаўзае шкельцамі,
вадзянымі пліскамі,
дом скрануўся
перагружаным
паромам,
ужо насядае на плот,
трашчаць перавяслы,
шум у галаве,
як у дрэва.
Дождж праліўся,

нехта зноў
не ўгледзеў ваду,
як калісьці.
А пасля ліўня
зямля не магла
здыхацца,
падымалася цёплая
пара клубамі
з гарачага ўлоння,
вось-вось пачуеш
усхліп уцехі.
Ціша, бы на голым
поплаве —
на зямі засталіся
толькі я
і пустая вёска.
Нахіляюся, каб
падняць
з долу ліст
з вершам
і перапісаць яго
нанова.
«Дождж праліўны,
а ты без апранахі!
Ляці ў хату!» —
клічуць мяне
з дому і клічуць.
Я, як бусліха,
магу вярнуцца
ў гняздо
толькі супраць
ветру.

* * *

Аксане

Яна гаварыла
пра нашых знаёмых,

і самы
нягожы
чалавек
меў у яе
чалавечую пасаду,
меў ахову
анёла.
І нават самы брыдкі,
стоячы ад усіх
наводдаль,
прыцягваў
да сябе таямніцай.
Стаю сярод іх,
разглядаюся,
нікога
не пазнаючы,
бы яна паклала
мне ў руку
з боскай
шчодрасцю
каардынаты
невядомых дагэтуль
зорак,
да якіх
будзе найбліжэй —
агародамі.

* * *

Дождж цёплы,
як луг,
як шчолак,
вымылі
бярозы
косы,
вымылі
дубы
кучары.

З раніцы
да вечара,
з вечара
да рання.
У людзей — баня,
у Бога — лазня.

* * *

Калі ты ўздрыгваеш,
пачуўшы стук
яблыка
аб зямлю
ў садзе,
калі, гледзячы
ў люстэрка,
ты не пазнаеш сябе,
бы стоячы
на беразе
каламутнай
вады,
калі выходзіш на ганак
у споднім
і дзівішся
свайму голасу:
«Якая ноч!»
Гэта яшчэ
не старасць.
Вярніся ў дом,
сабяры на падлозе
іголкі-шаршаткі,
выцягні ніты
з месячнага
прадзіва
і пераліцуй
сваю сукню —
ты яшчэ паспееш
пабачыць

на досвітку
самы дзівосны
сон.
Коціцца на зямлю
яблык
з райскага
саду.

* * *

Калі здараецца
непрыемнасць
альбо бяда,
мяне найболей
засмучае тое,
што ў мяне
няма
для таго
ці іншага
выпадку
адпаведнай сукні.
І нават
калі памерці.
Але ў чым?!

* * *

Плачу па табе,
жывой,
як дождж
над вясновым ручаём,
які ўжо высах,
яшчэ гавару да цябе,
не чуючы
свайго
голасу,
і твой голас

мяне абмінае,
бы я перашкодай
на тваёй
дарозе,
каменем,
пад якім
схаваныя
сакрэты,
сакрэты нашага
раздору.
Я плачу
па табе
моўчкі.

АНЁЛ

Вользе

Восень.
Мы з ёй прымяралі
сукні ў краме,
мы мімаходзь
гаварылі пра тое,
ці ёсць ужо
ў сучасным,
раўнапраўным свеце
такое паняцце:
«мяне кінуў муж»,
пэўней будзе
цяпер казаць:
«разышліся».
Восень.
Мы з ёй трапілі,
бы незнарок,
у той час,
час развітання
з дарослымі
дзецьмі,
са сваімі

мужамі.
Мужчыны хочуць
пражыць
на зямлі запар
яшчэ адно
жыццё
з маладой жонкай,
а нам хіба
толькі верыць
у загробнае?
Раўнапраўны свет?!
Але я чыстых
сялянскіх крывёў —
аброць праз плячо
і гатова шукаць яго,
як каня
ў полі, галасіць,
даць у званы,
што звялі са двара,
што ўкралі.
Я не дзіўлюся:
яна не называе
свайго
ані здраднікам,
ані нягодай,
яна скідае
адну сукенку,
другую,
трэцюю,
стаіць у адной
гальцы,
кволая шыя,
цнатліва
свяціліся
галубовым
ключыцы,
як у дзеўчынёхі
на прадвесні,
і з гэтага ўсяго

яшчэ была павінна
развіхнуцца
жанчына.
Яна дзівіцца з самой сябе,
стоячы перад люстэркам,
бы толькі што
вызваліўшыся
ад сонных абдымкаў,
яшчэ і смуга не сышла,
як чыйсьці цень.
Ён спаў у яе
на грудзях,
абдымаючы,
захінаючы,
як анёл,
і толькі што
адляцеў —
у вырай,
калі наступіла восень.
Восень.
У мяне яшчэ ніколі
не было
столькі
ўбораў.

* * *

Жанчыны
майго племя
не ходзяць глядзець
на сакуру,
на вішню
ў ружовым,
яны перапытваюць
адна
ў адной,
ці зацвіла
ў гародзе

бульба,
ганяюць
свежую навіну.
Дробная кветка
без паху,
не маючы прыгажосці,
толькі сваім
з'яўленнем
вабіць увагу,
абяцае
ружовую завязь
паспешкі.
Я іду
табе напярэймы,
павязаўшы хустку
нізка на вочы,
і ты мяне не пазнаеш.
Я пытаюся,
ці зацвіла
ў цябе бульба,
і толькі тады
ты, гараджанка,
успомніла,
што маеш сабе
сястрыцу.
Заўсёды старэйшую
нават тады,
калі табе
толькі накажуць
пра мае
народзіны.

СВЕДКА

Валянціне

Прачытаўшы
ейныя версэты,
адразу хочацца

ёй
патэлефанаваць,
каб пачуць
голас,
што жывая,
быццам
угледзеў
у цемры
чалавека
над абрывам
і страх — можа ты
быў апошні,
хто яго
бачыў.

* * *

На тваім
пахавальным
Пагорку
напёрстка
расцвіла.
Неспадзяваная тут,
бо я яе
не садзіла.
Цяпер нарэшце
ведаю,
Якія твае
ўлюблёныя
кветкі.

* * *

Да майго берага
хваляй ветру
прыгнала
не на чоўне,
не на пароме —

прыгнала
тапельца,
ссечанае
перуном дрэва,
з якога я зрабіла
парог
у сваёй хаце,
адзіны
абарончы рубеж
паміж
сённяшнім днём
і мінулым
часам,
паміж
злачынствам
і верай.
А сама
і дома
не начую,
увесь час
у дарозе,
у дарозе
да людзей.

* * *

Я начую з навальніцай,
пералічваю
вокны ў хаце,
маланка вышывае
на пяльцах
неба,
залатыя ніты
ў мяне
на каленях,
я маток
ёй трымаю.
Спрабую наважыцца

на бліскавіцу,
ужо не праглынуць
густую сліну,
бы я спражылася
на лясны
арэх,
і цяжка згадаць,
пра што будзе
апошняя
мая думка,
і каму
наказаць.
Назаўтра я
дзіву даюся:
расцвіла
ў пакрышаным бурай
садзе
лілея –
«Аклахома Сіці».
Завозная кветка,
з краіны смерчаў,
дачакалася
сваёй пагоды
ў маім садзе.
Мы склалі
галовы,
абедзве
на чужыне.

* * *

Адкуль гэтая
ўсходняя
жанчына?
Села насупраць,
ахінуўшыся
даўгім шалікам –
кокан

шаўкапрада.
Шоўк спадае
да падлогі,
сонца выглядае
то з-за аднаго
пляча,
то з-за другога.
Апякаючы вусны,
не магу патрапіць
з гаворкай,
пралітае віно
на настольніку —
кветкамі.
Маё скрылле
пасыпана
попелам.
Маё гняздо
з шэрага
каменя,
а да мяне ў вакно
заляцела
райская птушка.
Глядзіць на мяне,
не мігаючы,
круглым
вокам.
Я драпежніца,
але ў мяне
ў шапе
ўжо ёсць
падобнае
пудзіла.
Жанчына
порстка
адыходзіць,
пакідаючы
па сабе
кароткі, зіхоткі
след.

Быў час
метэорнага
дажджу.

ПУСТАЯ ХАТА

Спынілася кола,
спушчаны лейцы,
спушчаны з рук
пярсцёнкі,
як у ваду.
Тады з-пад сырога
падполка
праз адчыненыя
дзверы
пустой хаты
насупраць
цемра выходзіць.
Хата дыхае цяжка,
усю ноч,
бы ў твар.
Не заснеш,
калі ўжо сусед
дзед Пётра
спіць з кіем
у ложку,
ногі не слухаюцца
і ў снах.
Баба Надзя
даўно есць
на краёчку стала,
перакусвае сухамяць,
як у дарозе,
спадзяючыся папалуднаваць,
дастаўшыся
на МЕСТА.
Не заснеш,
калі кожную хвіліну,

скрануўшыся
з месца,
вёска адыходзіць
ад зямнога
берага.
Пад раніцу,
пазяхнуўшы,
дзверы зачыняцца.
Адыдзецца, знікне
былая гаспадыня
баба Шура,
стаяла ўсю ноч,
гледзячы
на сваю пустую
хату здаля,
з-за плоту,
быццам баючыся
зайсціся.
Быццам на гэтым свеце
Страшней за той.
«А з кім хата
застанецца?» —
пытаецца дзіця,
калі я ад'язджаю
з лецішча на зіму ў горад.

* * *

За мной
увесь час ідзе,
сочыць
дзяўчына-сіротка.
Маміна
раблёная хустка
на грудзях
крыж-накрыж,
погляд
птушыны,

з галінкі на галінку,
сабе пад ногі,
шукаючы ягадзіну,
дзічок
ці згублены з неба
зярнюк.
Мы не разлучаемся,
калі яна ідзе
па высокім мосце
без поручняў
праз горную раку
на руднік
па хлеб.
Вецер зносіць,
Кідае аб каменне,
тады яна
апускаецца
на каленкі,
учэпіста
паўзе
яшчаркай,
сочыцца слязьмі,
потам у зямлю,
крычыць,
вецер
глытае
ейны голас.
Я не чую.
Смыляць,
гояцца
абсіканыя,
здзёртыя да крыві
ногі.
Не магу ўспомніць,
як яна здужала
вярнуцца
адна
назад.
Зямля

не паслізнулася,
не скінула
яе ў раку.
О, гэтая палёгка,
заўсёды
неспадзяваная,
без дай прычыны,
што ты жывы!
Я ў яе ўвесь час
на вачах:
пужае
цёмнымі кутамі
ў хаце.
А варта сесці
за стол,
змушвае ўстаць
і несці кавалак
бадзяламу сабаку
пад вакном
ці чалавеку.
Яна выпрошвае
ў мяне
для першага стрэчнага
аддаць яму
з пляча
маю ўлюбёную
сукню.
Я пярэчу:
у мяне ўжо
сівая галава
ад расчаравання.
«Людзі жывуць
зусім інакш...
Ты іх не пільнуйся...» —
скажа.
Быццам мы з ёй
накшай генерацыі,
генерацыі
выгнаных з

ДОМУ,
не вадой,
не агнём,
не бурай
выгнаных,
сасланых
другім
чалавекам.
Яна, як бацька,
гаворыць
па-польску...
Блытаюся ад радасці,
спяшаюся,
аніяк не магу
раскрыпаць
тугі вузел
мамінай хусткі
на грудзях,
каб сабраць у яе,
натрапіўшы,
дзікія яблыкі
па сцежцы
ў нашым лесе.

* * *

Рассцілае па зямлі
прасцірадлы –
белым цветам;
укладае сына спаць
пад яблыняй,
абы ад ветру;
пускае басанож,
каб выпрастаць
пасля горада
ступню;
збірае ў жменю
расу,

амываючы яму
вочы;
абсыпае рабаціннем
лілеяў-пачканосаў.
Малы пераходзіць
з рук на рукі
родзічаў;
кожны ціскае яго,
лепіць
свае сялянскія
выявы —
вунь ужо і спінка,
як у касца,
выгінаецца.
яна прадзе яму
казку.
Сыходзяць
каляровыя ніты
кароткага лета,
хутка ад'язджаць
назад,
у горад.
За ім ззаду,
бы за пастушком,
са старой вёскі
зводзілі апошнюю
карову
і вяроўку
на рогі
закруцілі.
Горад прыме яго
за чужака.
Укладала маці
сына спаць
пад яблыняй...

СТАРАЯ СУСЕДКА

Прыходзіш у мой сад,
заўважаеш толькі
сухі сук бэзу,
замораную пупышку
ружы,
зламанае бурай
дрэва.
Мяне ахоплівае
страх,
калі ты ізноў
ідзеш да мяне.
Нічога не пытаешся,
нічога не просіш,
ходзіш кругамі,
шукаючы ў маім
садзе
знакі сваёй
смерці.
Каб папярэдзіць
мяне здаля.
Ты пужаеш
атумысла,
каб я нядоўга
плакала па табе.
Ты прыходзіш
развітацца...

* * *

Вользе

Набіраю твой нумар,
чую паланез.
Паланез расчыняе
вокны,
матылямі выносіць
вецер

фіранкі,
нехта ў белым
спрабуе пратанчыць
па зале.
Паланез праз
стагоддзе,
як з дня ўчарашняга.
Ты нарэшце
бярэш мабільнік
і кажаш мне,
што сыходзіш
за ІМ,
з балючага месца,
каб павялічыць
адлегласць між вамі,
каб не даходзілі
да цябе чуткі.
Паланез тваёй любові
затапляе вуліцы,
плошчы,
затрымліваецца
ў цесных падворках
старога Менска.
Ты адыходзіш ад дому
далей і далей.
І нарэшце каханне
спадае,
як паводка,
ужо бачна
зямля.
Я набіраю твой нумар —
паланез!
Я хачу цябе папярэдзіць:
па зямлі ходзяць
не ў пуантах,
як ты любіш,
а ў звычайным
абутку.
Ты нарэшце просіш мяне

патрымаць твае
авоські,
каб пратанчыць
некалькі па
на лесвічнай пляцоўцы
свайго дома.
Паланез!
Ты вярнулася...

* * *

Начная навальніца,
гром перакатамі,
дрыготка
ў ложку,
бы едзеш
калясьмі
і веры не даеш,
што дарогай,
што свая падушка
і воз
не чужы.
Раніцай агледзішся,
дастаўшыся
на места:
на сходках ганка
яловы пылок,
бы на прыступках
фурманкі.
Грамнічная дарога
была лесам.

* * *

Ты вярнулася ў вёску,
прывезла дамоў
сваю няўдачу,

і, у хату не заходзячы,
села на ганку,
яблык у руку,
нікому нічога
не кажучы,
ні з кім не раячыся.
Вось тут, на сходках,
на гэтым месцы
і нідзе болей
адседзіцца,
адстоіцца
твая няўдача
раней, чым
нехта выйдзе
запытацца,
як справы,
раней, чым
з яблыка пасыпяцца
чорныя зярняты.
І за парог хаты
яна перайсці
не паспее.
Увесь час падымаюся
па сходках
разбуранага
бацькоўскага дома
ў Соўчыне,
намерваючыся
сесці на ганку
і згрызці
свой горкі яблык,
не адважваючыся
зайсціся і сказаць:
«Я не прывяла вам
сына...».

* * *

На раздарожжы
лета на восень
спынілася
сонца.
І я сама
ніводнай сцежкі
не бачу,
нікуды
сабе не спяшаю
і нават новае
выбраць магу
імя,
пакуль не падзьме
сівер
і дрэва не стане
празрыстым.
Далёкі
погляд.

* * *

Ты пакінуў
наш дом.
Толькі хто мне
параіць
каваля,
каб разняў
нашыя
пярсцёнкі...

* * *

Развесіць бялізну
паміж лесам
і полем,

пабыўшы,
сабраць у прасцірадлы
сонечныя
промні,
ахапкамі
знесці ў хату
наўлечкі,
набітыя пер'ем
белых аблокаў.
Мне і парог
пераступаць
не трэба,
каб трапіць
у іншыя сферы,
абы ўдалося
знайсці час
выжаць бялізну.
Але што было
забыцца
дабавіць да ўсяго
напарстак
фарбы
алтайскай
брунэры...

* * *

Сёння ноччу
наш падземны
ручай
змяніў
напрамак.
Раніцй
на сцежцы
ў садзе
ўбачыла
ягоны
вільготны

цень.
Перакіну
ручнік
з пляча
на плячо.

* * *

Поле.
Хваляй асенніх
усходаў
вынесены
мне на вочы
малады пагорак.
Малочная зеляніна
на загрыўку.

* * *

Зрэзалі старое дрэва,
грымнула,
звалілася
і заціхла.
А можа гук
аддаліўся,
бо ноччу
вяртаўся
сухотным кашлем.
Мялее дно
памяці.
Нехта ўвесь час
быў побач,
нават спаў
стоячы,
як каля калыскі.

* * *

Калі пішацца
тэкст?
Калі цэлы дзень,
а то і год
ходзіш з цыгарэтай
згаслай
і нехта раптам
запальвае
сярніка,
за твой стол
побач
сядае,
і размова
толькі між намі,
як зараз.
Зноў нікога.
ледзь чутны
пах
дымоў
вячэрніх.

* * *

Божа,
мой Божа,
дзе цябе
болей,
як не ў гэтым
полі.
Ці ў маім
садзе...

* * *

У колькі нітоў
тчэцца

дождж?
Ці хопіць
яму
прадзіва
на ўсю ноч,
да раніцы,
каб пабыць
са мной
побач?

* * *

Іслачка, рэчка
я прыйшла да цябе,
прымкнула
прытокамі
сваёй гаворкі
заходняй —
перакатамі
па дробных
каменнях,
сваім плачам —
у тваіх берагах
не стоўпіцца,
сваім
дуроным
смехам.
Змываю ў табе
свае гады.
Запомні
мяне
маладой.

ВЕЧНАСЦЬ

Калі зацвітуць
белыя канваліі —

я ў белым.
Калі зацвіце
юлёвым
лясная кампанула –
я ў юлёвым.
У час позніх
дзікіх юргіняў –
я ў жоўтым.
Зімой перакіну
ўсе сукенкі
спарадку,
ні на чым
не спынюся,
бы ветрам сарваўшы
ўвесь цвет,
адшукаю
колер
тэракоты,
колер
гарачай зямлі,
каб бясконца
пачаць
усё спарадку.
Зацвітуць белыя канваліі –
я ізноў
у белым.

* * *

Ноч цямнейшая
за дзень.
Але заначавала
пчолка
ў маёй хаце.
Упляла ў валасы
залатыя
ніты,
нагадала водар

залатых
лугоў.
Залатой
эмблемай
на маіх
нахілёных
харугвах.
Назаўтра
быў мядовы
Спас.

ХАТА ЛЯ РАКІ

Хата мяне
дзічылася,
не прымала.
Удалося знайсці
ў садзе,
перакопваючы
зямлю,
ключы
гаспадара былога.
Навідавоку паклала,
з рукі ў руку
перакідваю,
спрабуючы адчыніць
старыя дзверы.
Скрыпяць іржавыя
петлі,
клямка нікому
не паддаецца,
захрасшы
ад таго часу,
калі гаспадар
пакінуў хату
назаўсёды.
Тады я пайшла
да ракі побач.

Рака маскатала
па каменнях,
халодныя ключы
перабірала,
у кішэнях затокаў
хавала
і зноў даставала:
яна падбірала іх
да мяне.

Я першы раз
дома
заначавала.

* * *

Я з ганка
на ганак,
з ганка
на ганак.
Дождж пераходамі
адбягаў да лесу
і зноў вяртаўся,
іграў на вадастокавым
аргане,
сціхаў,
заслухаўшыся самога
сябе,
заходзіў у мой сад
з аднаго боку,
з другога.
З ганка
на ганак,
зноў і зноў узбягаю,
злуюся.
І толькі ўвечары,
застаўшыся
ў самоце,

мяне цешыла
адна згадка:
дождж гуляў
са мной
у хованкі.
Мы забаўляліся.

* * *

Ноччу бачылася
з сёстрамі.
У новых сукенках
абедзве,
ні жывой парушынкі
і ў летніх
напроці зімы.
«Чаму не вітаецеся?»
«Нічога
не пытайся», — адказалі,
не падыходзячы
да мяне блізка.
«Нічога не пытайся», —
паўтаралі
па-змоўніцку.
Раніцай прачнулася,
да мяне
з радасным брэхам
кінуўся
мой сабака.
Хіба я сама
адлучалася
ад гэтага свету,
наведваючы
сясцёр?!
Людзі мараць
памерці
ў сне.

* * *

Лясныя травы
ў маім садзе,
дрымота лесу
ў маёй хаце,
ноччу прыходзяць
лясныя страхі,
доўгія цені
ад свечкі
на сценах,
голаў да столі
вяршыняй дрэва.
І нават калі
стукне-грукне
чалавек,
выдаецца:
стары корань
прыпоўз да ганка,
і мне не скрануцца
з месца,
карэннем прыросшы
да ранку.
Павук накіне
карункі
на мае рукі.
Пабудзіце мяне,
птушкі.

* * *

Па нашым гасцінцы,
дзе старыя
ліпы,
брычка ляцела:
бацька з сёстрамі
з Соўчына
да касцёла.
Хваляй пылу

мяне адхінула,
вочы зацерушыла.
Коні не спыніліся,
ніхто мяне
не пазнаў —
я ўжо старэйшая
за ўсіх.
Снілася брычка,
коні былі ў яблыкі.

* * *

Сполах першай
сустрэчы:
ледзь патраплю
ў пальчатку,
ледзь запомню
імя.
Толькі момант —
і мы ізноў
будзённасці
на пачатку.
Сполах першай
сустрэчы...

* * *

Вясковыя мужчыны
грузілі на воз
бярвенне,
сплёўвалі
салёны пот,
коні не стаялі
на месцы,
лес ляжаў,
не падымаўся,
падстаўлялі

плячо,
крышылася
костка.
Ніхто з іх
не быў мне
ні братам,
ні мужам,
а я ўкладала іх
перак свайго
ложка,
як дзяцей-блізнят,
спавівала мройнымі
снамі,
замаўляла знакі
сякеры.
Гэтыя мужчыны
калісьці па бярвяне
разабралі
сабе на патрэбы
мой дом.
Другія з-за мяжы
далучылі да маіх
сотак
чужыя землі,
паланянак
прывялі мне
ў служанкі,
потым пабралі
самых прыгожых
у жоны.
Сярод іх быў
мой бацька.
Я голаў хіну
да сялянскага
роду,
а рука вышывае
шоўкам.
Вясковыя мужчыны
вазілі лес.

* * *

Жыццё цяжкае,
складанае,
несправядловае,
жыццё хуткае,
лятучае.
Гляджу, узіраюся
кожны дзень
на клён
пад вокнамі:
як мне паспець
запомніць яго,
каб лучыць,
каб вярнуцца
сюды
праз райскія
веснічкі
яшчэ раз.
Да вас.

* * *

Устаць у вёсцы
давідна —
тое самае,
што зазірнуць
за гарызонт.

* * *

Рэчка,
памутнела
тваё вока,
узлавалася
на доўгія дажджы,
на нізкія берагі,

на мяне —
я прыйшла
развітацца
да вясны,
каб вярнуцца
ў твае купелі
басанож.

* * *

Ізноў паміж намі
непаразуменне,
дробязь — не дробязь —
амаль як няўменне
трымаць відэлец
замест нажа,
выцягнутага з кішэні
сцізорыка,
з якім ніколі
не разлучаешся.
не пытайся болей,
як маюся —
я сыходжу.
Сыходжу са сваімі
ганаровымі
багавіцамі,
старымі абарончымі
камяніцамі,
вежамі
нашых сустрэч,
каналамі
і мастамі
між намі.
Я сыходжу,
як Венецыя,
па сходках каменных
уніз, у ваду.
Пустая гандола.

* * *

Крык дзікіх гусей
у небе
спыняе
зямная дарога
абрываецца
на ганку
лёгкая птушыная
адзінота
жаданне
далучыцца.

* * *

Яне Галай, аўтару малюнкаў

Ты бярэш
вугаль,
малюеш на маіх
тэкстах,
малюнкі ўзнікаюць
раней
за наскальныя.
Бо табе
толькі
год з паловай
ад пачатку
твайго веку.

* * *

Прахалода
дзень мой
ачах
на змроку
як пры свячах
укленчу.

ВЕРУЮ Ў СЭРЦА МАЁ...
Габрыэль Містраль

* * *

Нерухомае
чучала
пад столлю,
вылучаюцца
сонечныя бліскі
рознага колеру
з пер'я грудкі
даўно забітай
птушкі,
сезон палявання
на мяне
адкрыты
ад пачатку
веку.

* * *

Зімовы дзень
такі маленькі
ад усходу
да захаду
на маіх каленьках
верацяном,
рук не аслабаніць,
вачэй не спусціць,
прадучы
завідном

нітку
часу,
яшчэ танчэйшую
за леташнюю.

СВЯТАЯ БЕДНАСЦЬ

Іду да жабракоў
ля царквы
прычашчацца,
каб не забыцца,
як падораная
луста хлеба
наскрозь
свіціцца,
як пахне
начлег
саламяны
ў хлеве,
да старой
жабрачкі,
бы да Святой
Дзевы,
іду прычашчацца.
Спяшаюся,
каб не застацца
без мінулага,
якое мне даражэй
за будучае.

СВЕДКА

Цябе не здзівіць
ні голад
калі, заначаваўшы
ў чужым
хлеве,

дыхаючы адным
паветрам,
чула ты цёплыя
вантробы
жывёлы,
таксама галоднай;
ні шалупінне
сваёй скуры
на мерзлай жалезіне
клямкі,
ні скляпенне
зямлянкі,
калі з улоння
маці
адразу трапляеш
ва ўлонне
зямлі;
ані памерлыя,
што ляжалі
на нашым даху
да вясны,
за глыбокім снегам
не дастацца
долу;
мы пад імі зімой
абміралі, як дрэвы,
і, як дрэвы, пачыналі
жыць толькі вясной,
калі каму ўдавалася
размінуцца
з нябожчыкам.
Цябе нічога не дзівіць,
цябе пужае,
што ты сведка
ўсяго гэтага,
і сведка
жывая...

* * *

Накладаеш
крыжык
на грудзі,
ідзеш
у царкву,
невідушча
мінаючы
жабрака,
да цябе,
як да Бога,
ягоная
працягнутая
рука.

* * *

Вечар,
здымаю з сябе
адзежу,
рукамі
простаю
на ёй зморшчкі,
заломы,
такая напрацаваная
сукня,
столькі ў ёй маёй
стомы,
я ўвайшла
ў зямлю па плечы,
вечар,
не змыць цяжар
працы,
ні сцюдзёнай
вадой,
ні варам,
не магу адхінуцца

ад зямлі
ні плячом,
ні тварам.
О, гэта перад сном
амаль палюбоўныя
рэчы!
Вечар.

* * *

Дзень — ноч,
дзень — ноч —
арэлі
часу
гойдаюцца
ў паветры,
год
бавяць.

* * *

Усё часцей
я адтуль гляджу
на сённяшні
дзень
з цемры
болю
і не пазнаю
мясцовасць,
хіба раней
жыла
пад наркозам?
Дыханне маё
цяпер
на люстэрку
ля вуснаў
ледзь пазначана,

я не шукаю,
што мела,
што страчана:
з цемры болю
нічога болей,
толькі б вазон
з вакна
ў Соўчыне,
з разрабаванай
бацькавай
хаты.
Развяжыце
вочы мне,
я б хацела
ўбачыць таго,
хто з вас
не вінен
у найменшай
злосці,
якая хваляй
дзень у дзень
жыцці
нашы
зносіць.

ЗВОН

Далёкі звон
царквы
голасам
кропель
цяжкіх
з вядра
ў студню
неба страсае,
дзікіх
галубоў
галасамі

глухімі,
людзі спрабуюць
дазвацца
да Бога,
стаю з усімі,
гатова збегчы,
пакуль не адчыніліся
ягоныя дзверы,
як у дзяцінстве
раптам зразумеўшы:
мая бяда
ад усіх
найменшая.

* * *

Прагна жыву,
прагавіта,
нават бядой
не хачу
дзяліцца,
бы ў пару
кахання —
увесь дзень,
як на світанні.

* * *

Мяла панадворак,
мяла завулак
разоў сорак
у некалькі
столак
і болей
венікам
заводзіла
аж з-за лесу,

аж за чужыя
крэсы,
а людзі мяне
міналі.
Прыйшоў раніцай
пад веснічкі
жабрак,
і не адзін —
з Богам,
нарэшце,
прывялася
мая дарога.

ЦНОТА

Рассохлася бойка,
пасыпаліся абручы
пярсцёнкамі,
дровы сышлі,
надвор'е, што
ў хаце,
што звонку,
не прасіла суседа,
нікога не наймала
сама
мала-памалу,
як хустку паправіць
на сівой галаве,
калком падпірала
сцяну,
яшчэ трохі бачыла,
але павідну
сыходзіла ў цемру
разам з хатай,
казалі, бачыла яна
дзіцем,
як гвалцілі дзевачак
у вайну

каты,
мужчынскай руцэ
не давярала,
нават дотыку
да сцяны,
да сябе,
каб не запаліла,
каб не прыгадала
сабе каханне...

* * *

Вялікая птушка
кругамі
лунала
высока,
сачу за ёй
пільна,
доўга,
крок за крокам,
вялікая птушка
лунала.
О, як мала
хады,
як чалавеку
зямлі
мала.
І тады
збавеннем
прыходзіць
натхненне.

* * *

На чужыне
мяняла наўлечку
на падоранай

падушцы
ад сястрыцы,
качала ў руках,
на ветры
гушкала,
прыляцела
птушка,
злавіла
пёрка з падушкі
і панесла будаваць
мой дом;
толькі я не буду
ведаць,
дзе ён ёсць,
на якім дрэве
мая крэва,
мая радзіма,
хаця я ніколі
сярод дрэў
не гублялася,
не блудзіла.

* * *

Бура, лівень,
гром вадаспадам,
і раптам –
ціша,
усе гукі
змясціліся,
бы ў вушку
мядзведжым,
адзін
шывок,
другі,
трэці –
птушка за птушкай
нізка

дамоў
праляцела,
пагоду цыруючы;
і я таксама ў буру
тут затрымалася,
да свайго гнязда
не даляцеўшы.

* * *

Жыццё —
гэта смага,
калі натолішся,
жвір гоніць
крыніца,
пясок
трашчыць
на зубах
і ўжо ведаеш,
што не нап'ешся.

* * *

Мець цябе,
як успамін
дарала б,
каб не была
ўсё жыццё
на памяці
сустрэча,
старонку
заламаў
вясновы
вецер
у маім
лёсе.

* * *

Не здужаю
адна
падняць з зямлі,
перакінуць
праз сябе
за плечы
свае ўспаміны.
«Я памалюся
за цябе», —
сказала мне
жабрачка ля царквы.
Яна бліжэй
да Бога,
вунь ейная дарога,
па якой і я сама
хадзіла
ў маленстве.
Яна ўбачыла:
я не знасіла яшчэ
жабрацкага
рыззя,
яно падысподам
майго дарагога
адзення;
і след босы
на снезе
побач з сабачым,
птушыным,
вядома,
мой.

* * *

Палову пярсцёнка
былой гаспадыні
знайшла

на новай
сялібе,
палова
кавалка
хлеба,
палова
акрайца
зямлі,
другая палова –
месяцам
срэбным,
каб бачылі
вочы
работу
і ў ночы.

* * *

Ад хаты
за вярсту
люблю спыніцца
пры дарозе,
не тое што
ў знямозе
коні сталі,
кола ў возе
расхістала.
Я тут сярод
людзей
здалёка,
на свет
гляджу
нязвыклым
вокам,
вяртаюся
дамоў
усё жыццё,
а вы і веры

не дасцё,
што кубак кавы
пры дарозе
дасць сілы,
забыццё
і спын
на момант.

РАДЗІМКА

Разуваюся
зноў і зноў
перайсці
спрабую
руччы халодныя
з родных Грыдзек.
Мне трэба трапіць
у Чарты,
што за лесам,
і вяртаюся.
Струмені
тугія
ногі
сціскаюць,
кожны раз
дно
глыбей
апускаецца,
вузламі
на шыі
травы берагавыя,
гарлачык
жоўты
вынырвае,
вужакай
пільнуе.
«Чыя ты ёсць?» —
пытаецца лесавік,

зязюльчыным
смехам
смеючыся.
Вяртаюся.
Не то што да горада
не дастаўшыся,
а нават да другой
вёскі.
Сон спраўдзіўся:
душа ніколі
не пакідала
Грыдзек
ля Соўчына.

* * *

На момант
трапіла ў самую
сярэдзіну
лета,
зачэрпнула
цёплай гліны,
як мёду
густога,
з глыбінь
зямлі,
гукамі
карыны
вярнулася
памяць.

ЛЯНДРЫНКА

Ледзь ад зямлі
адскочыла,
пасу кароў,
пастыр мяне

пільнуе,
каб не ўплакалася,
каб не згубілася,
ранак,
ногі чырвонымі
ракамі,
сонца таксама
на кукішках побач
мяне забаўляе,
ніхто не здагадваецца:
у мяне
заўсёды
пад языком
ляндрынка
ўцехі.

* * *

Смолка
расцвіла
ля маёй хаты,
малінковыя
дробныя
кветкі –
весткай,
як ты да мяне
дасталася?
Якім ветрам?
Ніколі не чула,
каб сіноптыкі
папярэджвалі
містраль
з вёскі
Грыдзькі
Ці з Соўчына.

* * *

Незнаёмага
чалавека
з маёй стараны
па гаворцы
пазнаю.
Я яму пажалюся,
як нікому болей,
распавяду,
сваё жыццё,
як благі
сон
над вадой
бягучай,
нарэшце,
пушчу
душу
на волю
і не пашкадую,
мяне ён уратуе
ад знямення
на чужыне —
і ад самой сябе.

* * *

Не падыходзьце
блізка
да людзей
адзінокіх
дзеля прыліку,
час ад часу;
яны чакаюць
не палёгкі,
а збавення;
яны жывуць
на нежылых
мейсцах:

на паддашку,
на страсе,
ля коміна,
каб бачыць
здалёк –
да іх, нарэшце,
ідуць,
і назаўсёды.

МЕСЯЦ ДАЖДЖОЎ

Доўгія дажджы,
хата
прашыта
наскрозь,
як будан,
пакрыты
яловымі
лапамі,
аніяк у рукаў
мокры
не трапіць,
з самага
ранку
адзежа
мокрымі
шатамі,
басанож
пастушкай
іду
за ягнятамі
дзён.

* * *

Распаліла
агонь

у печы
сярод лета,
не адыходжуся
ад яго далёка
нават
на ганак,
лаўлю
вуснамі
іскры.
Даўно
ў мяне
не было
палкіх
гасцей
у хаце.

СОЎЧЫНА

Тут мне дом,
не толькі зямля
плотам абнесена,
тут мне
дом
і ў Грыдзькаўскім полі,
і ў Пятрагскім лесе,
у Жуках,
у Ваўках,
у Чартах
і Навасёлках,
дарогу дамоў
складу ў чатыры
столкі,
пакрою на кавалачкі,
каб было карацей
дастацца.
Папрасіце мяне,
вербы, ліпы,
заначаваць

застацца,
запрасіце
павячэраць
дзікай ягадай
каля рэчкі
Лычоўкі.
Пасцяліце мне
пасцелю
з багатак і чорнагалоўкі.
«Усё ў мяне добра,
Божанька», — скажу,
павярнуўшыся на
другі бок тварам
да Соўчына, дзе яшчэ
не астыглі мае
падмуркі.

УСПОМНІЦЬ

Спыняюся
пад чугуначным
мастом,
калі ідзе цягнік,
і крычу,
каб ніхто
не пачуў;
нясцерпна
раптам
прагаваруся
і замаўчу —
ніхто
ніколі
не спытаўся:
«А што далей?»

ВЕЧНЫ ДЗЕНЬ

Дзень адплывае
ад нябеснага
берага
на ружовым
чаўне
да маёй хаты,
ружовае
разводдзе,
паспець
вылецець
праз адчыненае
вакно,
як з лятка,
захапіўшы
з сабой
матчын
серп,
і дамоў вярнуцца,
каб толькі
пераапрануцца,
развязаўшы
смяротны
вузел
з кубла.

* * *

Ты дзівішся,
не разумееш,
чаму я злоснікаў
сваіх
не вінавачу,
сама сабе
плачу,
а іначай —
табе тлумачу —

каб не здолела
забывацца,
ні на кога не трымаць
злосці,
я б не паставіла
свой дом
побач
з жыллём
чалавечым —
мне помсціць
няма чым.

* * *

Маладыя
буслы
падняліся
спрабуючы
скрылле
перад дарогай
далёкай
глыбока
ў сэрцы
зайшло
развітанне
не выцягнуць
стрэмку
да вясны.

БОЖАЕ ДЗІЦЯ

Закалыханае
ветрам,
ніхто не мінаў
калыску,
ні чалавек,
ні птушка,

байкі баялі
на два
вушкі,
сонца зазірала
ў вочы
блізка.
Пад небам,
як пад столлю,
наважалі
бацькі
калыску.

ЛЮБІЦЕЛЬКА АБСЕНТА

Ты кажаш:
жыццё
кароткае,
жыві,
не звяртай
увагі,
ад кожнай хвіліны
атрымлівай
асалоду.
А я другога заводу,
пэўна, «сваёй гадоўлі»,
без аніякай прагі
да бесклапотнага
жыцця,
без асцярогі,
блізка падыходжу
да кожнага.
Хаця
хмялею
ад крыўды
без азлаблення.
Ты кажаш:
гэта маё няўменне
людзей выбіраць,

жыць няўменне.
Мне звыкла:
адно каменне,
я, як авечка ў пустэльні,
сівым палыном
задаволіцца.
Такая сваволіца,
такая ўдаліца –
не залежыць
ад шчасця.

ВЕРАСЕНЬ

моцна спала,
не чула:
сёння ноччу
павукі ставілі
кросны,
карункі
плялі,
для немаладых
жанчын
восень
вэлюм
рыхтуе;
сыйду з хаты,
каб не заспела,
на ганку запынюся,
на гады азірнуся
і застануся.

* * *

Што дзяцей не маю –
не шкадую,
я па іх сумую,
яны пакінулі

маю дзявочую
мару,
пайшлі
з дому,
перакінуліся
ў птушак,
дрэвы,
звяроў,
людзей.
Я сумую па іх,
калі птушаняты
гняздо
пакідаюць,
калі звер
трапляе ў пастку,
калі дрэва
заламае
навальніца,
калі чалавек
не бачыць у ва мне
сябра;
ніколі
ў маім доме
не пустуе
калыска любові.

ЧЫСТЫ ДЗЕНЬ

Не размаўляйце
са мной
на самым ранку:
ціша,
як на малітве,
птушыныя
хоры,
сонца
скора
вынясе

харугвы
з-за пагорка,
апошняя зорка
ўжо ў маіх
кішэнях,
яшчэ аніякіх
планаў,
рашэнняў,
чысты дзень.

ГОРАД-ГАРАЖ

Мутная вада
ў рацэ
быццам на маёй
руцэ
ейная тонкая
чорная вена
голас смяротны
звера
сірэнай
аўтамабільнай
на вуліцах пад маімі
вокнамі
паветра завесай
дыму
павучыння
валокнамі
б'ю хвастом
рыбінай
задыхаюся
на беразе
атручаная
да чалавека
я не прыручаная.

* * *

Нясу ваду
са студні,
заводжу сярпом,
жнучы,
раўняю зямлю
рукамі
вясной,
сцялю зярнятам
пасцелю,
каб аніводнага
рубчыка
мулкага,
паўтараю
мацярынскія
рухі,
сустракаюцца,
дакранаюцца
нашыя
рукі,
бачу на сваім
твары
рысы
тваёй
вечнай
стомы,
ты ўглядаешся
ў мяне:
ці лоўка
трымаю
серп,
ці не завысока
жну на небе
зоры.

СВЕТ ВЕЧАРОВЫ

О, позні
цвет
юлёвы!
Мне колер
твой
пасуе,
як быццам
пражыла я
да паловы,
толькі да паловы
дня,
яшчэ парой
будзе.

ДЗЯДЫ

Пакінуўшы стол
непрыбраным,
легла спаць,
забыўшыся пагасіць
памінальную свечку.
Асядала ноч,
закапціўшы шкло
на вокнах,
нехта бразнуў
кубкам,
піў ваду,
нехта здымаў
агарак,
дзьмухаючы на пальцы,
хісткія цені
да столі,
шэпт ціхі
галасамі галубоў
дзікіх
адзін да аднаго

на поўную грудку;
гэтай ноччу
я чула,
пра што гавораць
у раі.

* * *

Побач з ноччу,
побач з ложкам
пастаўлю крэсла
пустое
для анёла-ахоўніка,
здыму
агарак
з поўні,
каб не хліпала,
свяціла
роўненька,
мы абое з ім
заснём
на начной
варце.

* * *

Вользе Б.

Гаворым,
падбіраеш
да мяне
словы,
бы перабіраючы
ружанец,
з табой я заўсёды
быць лепшай
маю шанец,
ты дорыш мне

сукню
на выраст,
як у дзяцінстве
сірочым.

АСАДНІЦЫ

«Год нараджэння невядомы...»
(з біяграфічных звестак)

Падалом захінула,
хусткай з плеч
апінанкай
у шклянкі,
зямлёй прыкапала
ў зямлянцы,
каб голасу
не падаць,
сама сабе даланёй
рот закрыла;
ніхто не заўважыў
майго нараджэння,
не паставіў
нумар
сасланай
польскай
асадніцы;
ты заспяшалася,
пакінула
самасейкай,
мама,
я тваё чацвёртае
дзіця;
пастаў мне,
канваір,
чарговы
нумар,
каб побач з бацькамі,
нумар на вуха

(асаднікаў вывозілі
на Алтай у вагонах
для скаціны),
ён мне будзе
замест дарагой
завушніцы.

* * *

Час пік,
набіты тралейбус
скранаецца з мейсца,
як ад берага.
Нехта квола заенчыў
і сціх узверадам;
нехта дарэмна
спрабуе прайсці
да дзвярэй;
асыпаецца пудра
пылком лілеяў,
твар у твар,
не падняць
веяў,
не прызнацца
стомленаму люду,
што еду,
бы на прагулачным
параходзе,
ніадкуль
і нікуды;
што ўспамінаць
буду
нечае плячо,
шырэйшае за гарызонт,
нічый парфум
KENZO,
свой згублены парасон.
Выпадковая

блізкасць,
бы каляровы
сон.
Час пік.
Дазвольце
выйсці.

* * *

На некалькі хвілін
зіма прыходзіла
у госці,
без холаду і злосці
замест кагосьці,
каго чакала,
слупамі па зямлі
і па вадзе.
Я ёй дзвярэй
не адчыняла.
На некалькі хвілін,
і не відаць нідзе
слядоў зімовых.
І толькі ў маіх
пакоях
снег ідзе.
Каму сказаць:
па мне пагодка —
жыву
вясёлым
зімародкам.

* * *

Н. Б.

«Трэба ж неяк
зіму
пераседзець» —

у нашай вёсцы
кажуць.
І мяне ў гарадской
кватэры
клопат
вярэдзіць:
ці хопіць дроў
на халады,
ці не трэба было б
схадзіць
у лес
у карчы,
як у ягады,
каб налушчыць
смаляк
на распалку,
коўзаюся
з крэсла ў крэсла,
як з ляжанкі
на печы,
не астыглай
змалку,
спускаю маток
сваіх перадумак
на каленькі,
дзень
маленькі,
не ўвяду
нітку
ў вушка
шаршаткі,
каб пакласці
новую латку
на наша
з табой
сваяцтва.
Трэба ж неяк
зіму пераседзець,
якая доўжыцца
ад вясны.

АЛТАЙ

Вользе С.

Жменю
каменьчыкаў,
колераў
розных,
прынесла
мне ў падарунак,
бачу іх
праз слёзы,
як на празрыстым
дне
азёрным.
Яшма, онікс,
агат, крышталь
горны —
слязьмі шчасця
багоў
над маім
лёсам.

ЗАВЕЯ Ў ГОРАДЗЕ

Н. Б.

Снег па каленькі,
як з вёскі
ў вёску,
ідзём па вуліцы
і гон, знаёмы
з дзяцінства,
нас падганяе,
вея да ног
туліцца.
Мінаем
машыны,
людзей
мінаем,

на гараджан
не азіраемся,
быццам спяшаемся
вярнуцца
завідна
ў сваю вёску,
куды можна
дастацца
толькі
па цаліку.
Ужо жывыя
дымы
відаюцца.

ДА АДЗІГІТРЫІ

Нагледзелася
Ты на нас,
на мой
сялянскі
род
жалобны,
і я наастатку
нічым
Цябе не ўсцешу,
хіба толькі што
іншы раз
пераняць
Твой доўгі
пагляд
мне ўдаецца
і быць шчырай
са сваімі
злоснікамі.

ГОД БЫКА

Іду, аглядаюся
на год стары,
шкада
разлучацца,
яшчэ не ўмею
мякка паслацца,
каб мякка
ўпасці,
каб сесці,
спыніцца
і рукі
скласці;
аглядаюся
на год стары,
як на дарадцу,
а новы,
такі малады,
ці ўдасца
патрапіць яму
давідна
хаця б прынесці
са студні
вядро вады
і не абліцца,
а месяц рагаты
дуроным
бычком
свіціцца.

* * *

Мароз адваліўся,
задрамаў
ці забыўся
пастукаць
кіем

у мае дзверы,
намаляваць
на вокнах
крывулькі,
як на паперы
малюе
малое дзіця.
Руччы!
Па вуліцах
ходзяць
рыбы
без знакаў
прыпынку,
мне б данесці
ў гняздо
сухую галінку,
вясна
не мінецца,
дрэва да дрэва
хінецца,
мароз
адваліўся,
бо ты мне
сасніўся
хаця...

БЛІЗНЯТАМ О. і А.

З чаго пачынаюцца
нашы сустрэчы?
Звон кубкаў,
выбар гатунку
гарбаты,
яшчэ далёка
да змроку,
раптам нехта
распнуты
на ваконнай

раме,
а гэта — вечар.
Ён, як цыркач,
запальвае
святло
бенгальскімі
агнямі
ўздоўж ракі,
мне здаецца:
я іх за сталом
кармлю з рукі,
мы лёгка
перадаем
адна адной
ключы
ад сваіх таямніцаў,
мы губляем
з прычосак ад стомы
шпількі і грэбні,
пераходзім
уброд
усе цяжкія
падзеі.
Несканчонай
здаецца ночы
дзея.
О цуд!
Мой абраз
у кутку
маладзее!
О цуд!
І ніхто з нас
не хоча даць веры,
што гэта ўжо
наступны
дзень,
што гэта днее.

* * *

«У памяшканні часовага ўтрымання на Гурскага, 42, каля сотні сабак і 70 катоў, гэта намнога больш, чым дазволена нарматывамі. Вы можаце падараваць жыццё вернаму сябру...»

Дыктар паўтарае
па радыё
з раніцы да вечара
і асабліва ў час
папалудні,
калі казыча
нюх
мяса на грылі,
дымком
абверчана.
А мне знаёмы
і пах
жабрацтва
на алтайскай
рудні.
Дыктар вяртае
мяне ў цёмны
куток
зямлянкі
да пустой місы,
я хаваю
сабачыя вочы
ад стрэчных
на вуліцы —
хто з аб'яўленых
ста
да чалавека
прытуліцца,
хто з іх удзячна
дакранецца
вільготнай

пысай.
Я падціскаю
хвост
у цёмным
пад'ездзе,
бо ведаю:
жыццё маё
чалавечае
так і не ўдалося,
калі я і заўтра
з гэтай аб'явай
паснедаю
пад страхам
смерці
на Старажоўскай, 8.

АДЧАЙ

На кончыку
нажа
дабаўце мне
солі
на кончыку
нажа
не болей
і я адразу
перакінуся
ў саляны слуп.

* * *

Не загаварыць,
не замовіць,
голасу
не падаць,
слоў
не скласці,

мне цяпер,
відаць,
толькі жменяй
зямлю
да грудзей
прыкласці,
каб сцішыць
жаль.

СНЕЖАНЬ

Белы снег —
усё набела
перапісаць,
набела пераж ыць,
пачаць усім
даражыць,
жыць нанова,
з першага
слова,
знікае нават
імя,
бо дазвацца да мяне
немагчыма
ад раніцы
да паўдня.
А ўвечары
на малітве
другімі вачыма
ўбачыла
запрэжанага каня,
мама ў труне
на санях,
ледзь пазначаны
палазоў
след —
мой шлях
у белы

свет...
Здымак стары...
тады я ўбачыць
хацела
толькі вось гэта:
і птушка ўзляцела –
на белым
свеце
жыць
набела.

КАЛЯДНАЕ

Нацярушце
пад настольнік
сена,
прывядзіце ў хату
авечку,
запаліце ціхую
свечку
і падкіньце ў шчыток
палена.
Свет наш –
хлеў,
невялічкі
і цесны,
уюцца ластаўкі
ў падстрэшшы,
калыханку спявайце,
песню,
не саромцеся скласці
вершык –
Хрыстос нарадзіўся!

ГАЛАШЭННЕ

Дам у голас:
няма каму
распавесці,
няма з кім
падзяліцца
жалем,
тады я яшчэ
старанней
зграбу
з зямлі
усё сваё гора,
каб нікому яно
не засталося,
каб яно ні ў кога
не завялося,
зграбу чысценька
да драбіначкі
з зямлі,
як з талеркі
астатняй
скрыначкай,
і да смаку.

МАМА

Не памятаю,
каб калі ў маім маленстве
мы йшлі
побач,
ці каб са мной
ты за руку
вялася.
Я трапіла ў твой
след
халодны,
занесены

алтайскімі
буранамі,
праз гады;
ты нарэшце
павярнула да мяне
свой твар,
няўжо толькі цяпер
я адужала
сіроцтва,
стала дарослай,
бо ты мне раптам
перадала
паднесці
сваю мацярынскую
ношку,
цяжар страты
нашага роду;
ці ўдасца мне
цяпер, калі перавязаць
набела
чорную хустку,
але затое я сцішана
патаемна
ад усіх жывых
сядаю за даўгі
стол, бачу цябе,
бацьку, сясцёр, брата,
як бывае, калі проста
разглядаеш стары,
незнаёмы здымак
і неспадзявана
знаходзіш
падабенства,
нарэшце
далучыўшыся
да сям'і.

У ЖДАНОВІЧАХ

Н. Б.

Зіма. Выходзіш
сустракаць,
у нешта ўступіўшы
на босую нагу,
бы толькі што
саскочыўшы
з гарачага пяколка.
І я, быццам праз ноч,
сюды,
на самым ранку,
калі яшчэ і вокны
захінены
малочнымі фіранкамі,
бы туманамі.
Цяжкія вароты
адчыняеш,
яны шырока
адплываюць,
бы ты руку заводзіш
для абдымкаў.
Гаворка сыплецца
пра ўсё спарадку
і ў дом заходзім
не адразу,
ідзем наведаць
маладыя
дрэвы,
усіх насельнікаў,
і вербу казіную
найперш.
Спахапіўшыся,
бачу ў сваёй руцэ
з віном
фужэр танюткі —
зламаным лядаком
празрыстым

са страхі.
Іншы раз мне здаецца,
што мы як двайнюкі,
з аднаго вясковага
дзяцінства,
нашая калыска-зыбаўка
пад столлю
нябёсаў.
І нас аніяк не дабудзяцца
гарадскія
пеўні.

СЯБРАМ

Ваша зімовае
цяпло,
ледзь сонца
блісне,
ледзь шыба
ў вакне
замураваная
адтае,
я забываюся
на халады,
ляту,
вітаю
ваш кароткі
век
цяпла
жывога;
і зноў зімовая
аблога,
і зноў — нікога,
крамя Бога,
што замнога
для шчасця.

* * *

Спаткала
камень
вялікі,
яшчэ ўчора
яго не бачыла
на гэтым мейсцы.
«Як ты тут
апынуўся?» —
пытаюся.
«Я з падмурка
храма,
які ты ўсё жыццё
падымаеш...»

* * *

Нашу ў кішэні
з сабой
увесь час,
як ключы,
ад усіх бед
і здрад
вось гэтыя словы:
зло ніколі
не можа быць
справядловым.

* * *

Сустрэўшыся
пасля доўгага
часу
растання,
заўсёды спрабую
спачатку

перайсці паміж намі
бурлівы ручай
нашых бед,
несупадзенняў;
не спяшай мяне,
калі я на самай
сярэдзіне
не дастаю
нагамі
да дна
крыўды,
бо мы не ведаем
выратавальных
слоў;
калі ад'язджаеш
з нашага дому,
мае сцены
ў руінах
самоты.

ЛЯЛЬКІ БАЛАШ – МАЕ СЁСТРЫ

(пасля наведвання галерэі «Ў»)

Тры лялькі:
панны, панначкі,
паненкі-сялянкі,
падол, прыхоплены
жывулькай,
на санках,
якраз па маім
завулку
памяці;
такая вея
часу,
такі буран алтайскі,
такія замяці,
ні галасоў,

ні смеху,
нерухомыя
постаці,
толькі рэха
майго плачу;
я бачу,
як санкі
з пагорка
пераязджаюць
мяжу
на той свет
і... выкульваюся
ў снег, вяртаюся
іду назад,
пад гару,
адна.

* * *

Белыя галубы
анёламі
ля ног жабрачкі
ў падземцы
сцюжа
сюды б
дроў сухіх
бярэмца
сярэднявечнае
полымя
апякае мяне
знутры
скляпенне
метро
гатычнай рамай
Ларэнца
вакол майго
алтара
памяці.

* * *

Я сабе нагледзела
кінуты дом
на пагорку;
ісці да яго
палявой сцежкай,
дарогай калясьмі,
праз ноч,
дастацца на золку,
гады не лічыць, –
сесці адпачыць;
я тут ахвяравалася
жыць,
не прагнаўшы
нават мышку
са стала.

«СОНЦАВАРОТ»

АД САМОТЫ ЗАЎСЁДЫ ВЕЕ САДАМ...
Гарсіа Лорка

* * *

Мне самым
лепшым
вершам –
гусіны
пералёт
у два
радкі,
аўтографам
на небе
не ад рукі –
ад скрылля.

БУДНІ ДЗЕНЬ

Ранішні туман,
акраек свету
адразу за агародамі;
доўга ляціць
вядро
ў студню
і не вяртаецца,
дужаецца
са мною;
кручу калаўрот,
ускідваючыся
ўсім целам,
змяшчаючы з месца
зямную

вось;
мокрым падалом
абціраю
заспаныя вочы
зямлі;
рыпнуўшы дзвярыма,
соладка ў твар
хлеў
пазяхае;
здзьмухваю туман
пенай
з кубка сырадою;
з лесу,
з поля,
з-за мора
клічуць снедаць,
аднімаю засланку ў печы
па бліны-наліснікі;
коціцца
гарачым сонцам
мая бясконцасць.

СОНЦАВАРОТ

Рыпнула
кола
на снезе
побач,
цяжка,
здарожыўшыся
па свеце,
быццам я на кані
ў тарантасе,
перасесці
забыўшыся
ў сані.
Не пільнуюся часу.

* * *

Ціша
птушкі садзяцца
на ноч
у куст
бэзу
цёплай
ноччу
няма бяздомных
людзей на свеце.

СЁСТРЫ ВЫШЫВАЛІ ШОЎКАМ…

Не мерала
Ночны лівень
вёдрамі
сонца
сярпом
падняло
збітыя травы
каслаўку
за каслаўкай
выпалю
пустазелле
ў садзе
да шаўковай
травы
гладдзю
як на макатках
маіх сясцёр.

І МНЕ ДАРАВАЛАСЯ…

Ветрам ганяла
дзверы ў вясковым
касцёле,

лопалі скрыллем
патрывожаныя
анёлы,
хрысцілі дзіця,
бацькі
ў стане бязважкасці,
узнёсшыся
пад дах,
віталіся са святымі;
мой бацька,
вызваліўшыся
ад маёй рукі,
выходзіць з касцёла
і ніколі не вяртаецца
да мяне.
«Дзякуй яму
толькі за тое,
што ён калісьці
прывёў мяне сюды,
не кінуў на вуліцы»,
прамаўляю, мне здаецца,
уголас,
даруючы яму здраду;
голуб белы,
як слова з боскіх вуснаў,
ляціць ад алтара
проста да мяне,
голуб прымірэння
ў маёй сям'і.
Хрысцілі дзіця,
расчыняліся
змрочныя таямнічыя
спавядніцы...

ЗАСЛАЎЕ

Сёння касцёл
зачынены,

а мне патрэбна,
як да рукі,
хаця дакрануцца
да сцяны,
мураваным
плячом
да майго пляча;
абшукалася
я ключа,
дому не маючы,
нікога не дакараючы,
пакуль сюды
дасталася.
Побач з жабрачкай
на зямлі паслалася.

ПЯРУН*

Усё з рук
валіцца
мне не ўправіцца
скласці ў прыпол
самае дарагое
вынесці з хаты
думаю на благое
баюся Перуна
як грознага
мужа
з далёкай
дарогі
якраз з таго боку
хмара
куды ты пайшоў
і яшчэ не вярнуўся
ўсё неба
ў аблозе
ужо ягоныя збітыя

* Пярун – бог неба, тут і далей у спасылках імёны старажытных багоў.

кучары
мне на лоб
звісаюць
горача дыхае
сцены страсае
сквапна спрабую
прыпомніць
ягоныя зрэдку
любоўныя
словы
пах ялейны
па хаце
пах ядловы
быццам ужо
запаліла?!
Скінуць з сябе
палаючую
сукню
ляцець
насустрач
пакуль дзвярыма
не грукнуў
востры нож
забыцца
выкінуць
на ганак
і ранак.

* * *

У чарговы раз
накладаю
шывок
за шыўком
на нашу сварку
свячу сама сабе
свечкай-агаркам
пераступаю

паваленае
бервяно
грому
сярод хаты
адныя латы
на мне
і на табе
адныя латы
жывем незабедна
і незабагата
латы ў тры
столкі
толькі б у сена
не ўпусціла
я з рук
іголку.

* * *

Гром далёкі
расахаты
драбкамі
ад цукровай
галоўкі
да гарбаты
нехта там пытаецца
ці не пара
вячэраць...

* * *

Па начах
лязо
маланкі
па вачах
безабаронна
ў адказ

я думаю
пра вас
сябры
пры доме
пры маім
двары
пры садзе
найхутчэй
ад думак
не лягчэй
мой дом
ачах
лязо
маланкі
па начах.

* * *

Спякота,
сонца
зусім блізка,
і нават ноччу
не застывае
на сподку
поўдні
смала-жывіца;
да Спасу
сад
яблыкі
атрасае.
Скарацела
лета,
а я яшчэ
і голасу пеўчага
не змяніла.

ЦЁЦЯ

Марыльцы

Навальніца
перабірае,
перасыпае
бярвенне ў хаце.
«Прачніся,
устань, дзетка,
накінь сукенку...»
Я не магу патрапіць
у рукавы,
вісну перавяскам
на тваёй руцэ.
І цяпер у навальніцу,
спаць кладучыся,
не распранаюся
вартаўніцай
сваіх успамінаў,
якіх нарваў
вецер:
ускочыць,
запаліць
тваю грамнічную
свечку,
калі боль, адчай
Перуном
набліжаецца
да маёй галавы.
І бура сціхае.

* * *

Грымоты
перуны
жыву
каля нейкай
буйнай
нябеснай

шашы
коцяцца
дзень і ноч
бліскучыя
колцы
калясніцы
і невядома
ці скіруецца
фурман.

* * *

Уладзіміру Арлову

Ваш зборнік
на століку
каля майго ложка;
ноччу
я пэўна трымаю
вас за руку,
каб перайсці
з рыфмы
дня
ў сон
белага
верша.

* * *

Наранку
касец
атрасае
росы,
карацее
падол
майго квяцістага
лугу,
увечары

ломіць мне,
круціць
у запясці,
бы аніяк
не магу
вызваліцца
ад абдымкаў.

* * *

Увайшла
ў мой гарадскі
дом
маміна
сялянская
радня.
«Чаму печ
не цеплена?
Чаму каровы
не ўпільнавалася?
Чаму наша сяліба
ў вёсцы
пустуе?».
Выцягну
шаўковую
нітку
са свайго падала,
увяду
ў тонкае
вушка,
вышыю
цёплую
хату
і хлеў,
поўны скаціны,
як зачыніць дзверы.
Толькі ці падобна
атрымаецца,

ці дасць мне
радня
веры?

ПАМІЖ СТАРОНКАМІ ЖЫЦЦЯ

Алесю

Твой радок
неспадзяваны
ці некалькі
радкоў
бы пялёстак
празрысты
закладзены
калісьці
паміж старонкамі
ў кнізе,
якую даўно
не брала
ў рукі.

* * *

Вецер салёны
ад слёз
чую мора
сціскаю
ракавінай
далонь
хаваючы ад усіх
перліну
жалю.

БЯССОННЕ

Поўня
савіным вокам
зазірнула
ў маё дупло,
выграбла
гарачае вуголле,
зачыніла
юшку;
усю ноч
я за пяльцамі,
нацягнуўшы
вышыванку
срэбрам
на ваконную
раму.

СПАДЧЫНА

У горадзе новым
на Старажоўцы
думкамі
прасочваюся
скрозь скарынку
зямлі,
вадой — кропля
за кропляй
да таго бруку
старога,
зняможана
спынюся ля парога
Менска былога,
я павінна была атрымаць
гэты горад
у спадчыну.
Не маючы даверу,
горад не адчыняе
мне дзверы,

бо я прашуся
на чужой
мове.

* * *

Лепшыя сукні
выцягнуўшы з шафы,
апранаю ўсіх
у свае ўборы,
выпраўляю
на вуліцу,
сама іду
ззаду
ў нечым даўнейшым —
я найстарэйшая
гейша;
без напарстка
накалола пальцы,
твар мой
то сіверам,
то закальцам
пацягнуты
ў залежнасці
ад пораў года,
пільнавацца
пагоды
не выпадае,
і не пільнуйся,
ідзі па зямлі,
як па небе,
разуйся!
Жыві,
любуйся
сабой
сённяшняй,
тутэйшай —
я найстарэйшая
гейша.

КАМАРОЎКА

Ты стаіш насупраць,
глядзіш, бы здалля,
знерухомеўшы,
садовай скульптурай
ля Камароўкі,
глядзіш і не бачыш
на мне квяцістай
кашміроўкі,
ватоўкі-плюшаўкі –
маёй абноўкі;
трапіўшы ў гушчу
кірмаша,
я перакідваюся
ў цыганку
з самага малку;
ты мной забаўляешся,
цябе забаўляе,
чым я тут у тлуме
душу
наталяю;
на кірмашы
мне кожны чалавек,
бы з кубла лазовага,
вылезшы,
у прыпол, у кашы
складае, нагледзеўшы,
аблюбаванае,
дарагое
і таннае,
я толькі што, як цыганка,
не працягваю руку,
вачыма збіраю
фарбы і смакі
і адыходжуся,
як адпадаю
ад ручая,
напіўшыся

пасля
смагі;
бліскавіцы
розных гаворак
сполахамі ў маіх вачах,
бы на крыжавых сцежках.
О, мне гэтыя
хітрыкі,
смешкі
з-за прылаўка
адзін да аднаго,
гуканні,
як на вясновым
ранні –
гуканне вясны.
Наталка!
Пастаім яшчэ крыху,
памарудзім,
покі не нацешуся...

СТАРАСЦЬ

Прыходзіць
старая суседка,
заўсёды
нечакана,
ідзе павольна
кульгаючы,
бы моцна
ўходаўшыся,
бы здалёк;
стаю ў квітнеючым
садзе;
як моргнуць
вокам,
вось-вось
склыгануць
перад ёй

дзверы часу;
гэтаксама
прыйдзе па мяне
старасць;
суседка
жыве
праз вуліцу.

ПЕРШАРОДНАСЦЬ

Лугі, пералескі,
палеткі, пагоркі,
дрэвы, травы,
кветкі
бачу,
чапаць
не хачу,
анічога
дабавіць,
перайначыць,
каб не зблытаць,
бы на золку,
калі свет
ад Бога яшчэ
не парушаны,
нічога
рукамі,
рыдлёўкай,
малёўкай,
а кветку
на падол
перасадзіць
хацела —
упусціла
іголку.

* * *

Поле,
рух шаўковы
адценняў
на захадзе,
пад маладой
зелянінай,
як пад тканінай,
зямля
дыхае.
Сонца спяшаецца
сесці
завідна.

БЯССОННЕ

Шолах вуснаў
перасохлых
у начной цемры
шэпчуцца
сцены,
сон аблачынай
белай
на момант —
і знік,
чыста ўваччу,
як у паўдні,
гадзіна
першая,
другая,
трэцяя,
сну ані,
каліва ані,
стоцьма
лячу,
ледзь удаецца
затрымацца,
павярнуцца

тварам
да першага сонца —
і сон!
і снілася:
каля ложка,
у прытулку,
нарэшце, злая
начная
нянька
змянілася.

* * *

Н. Б.

Ты прыходзіш
у мой сад
пазней
за ўсіх,
пазней
за сонца,
схаванае
на ноч
у птушыных
гнёздах;
лятучыя
мышы
не аслепнуць
ад нашай
«бліскучай»
размовы,
бо ўжо заплюшчыліся
на ноч
стакроткі
над маёй
галавой.

* * *

Рукой не віхнуць,
з месца
не скрануцца –
птушка зрабіла
гняздо
ў ружачцы
ля самага ганка,
мне паболела
клопату
на маім
сёмым
небе.

* * *

У тваім доме
я не ступіла
далей
вітальні,
адыходзячы,
шчыльна
зачыняю
за сабой
дзверы,
каб ты не пачула
мой плач
палёгкі –
нарэшце
мы
разышліся.

ЛЯСНАЯ ПТУШКА

У маім садзе
крыжадзюб-яловік

завёўся,
ноту
высокага
лесу
дадаў,
спяваючы:
глыбіні
небу,
вышыні
дому –
мой саборны
яблыневы
свет.

* * *

Некалькі тваіх
крыўдных слоў
вяслую ўначы
перабіраю
вуснамі
рукамі
чапляю
адно да другога
і зноў
спачатку
валкам
прасую
узад – уперад
ужо выпрастала
заломы
злучнікаў
канчаткі
коткай
залізваю
балючае
месца
расстання.

ЛАДА*

Стане ў садзе,
знерухомеўшы
ад хараства;
на панадворку
спыніцца,
пераплятаючы
дзявочы каснік,
рукі аркамі,
углядаецца
ў люстэрка
наваколля;
ідзе па вуліцы,
займаючы
палову
дарогі,
шырока
ставіць
нягнуткія
ногі,
набрынялыя
болем,
(доля...)
«кульгавая», —
падумаеш
услед;
а з твару...
ясны погляд
перапыніць
квяцістым
спакоем,
і не паспееш
заўважыць
калецтва;
«Мамачка-яблыня», —
завуць яе
дзеці.

* Лада — багіня жыватворчасці, любові, прыгажосці.

МАЛЬТА

Ты блытаеш
мае крокі,
ледзь размінаемся,
кругамі
вакол мяне,
даверам
ахінаеш,
кармлю
з рукі,
радасна
пераймаеш
маіх сяброў,
якія даўно
здрадзілі,
і я па-сабачы
гляджу
ім услед,
хоць яны
побач.

ІСЛАЧ

Трава-сенажатка
вёску абступіла,
паверсе пайшла,
бы на бязродных
кладах;
ніхто не ратуецца,
стаю на ўзмежку
здзічэлай
ажынай,
і мне не даруецца,
што рукі
не падлажыла.

МОРА

В. Сазыкінай

Заўсёды
ў дарозе,
прыходзіш
ці адыходзіш,
бачу цябе
часцей
на гарызонце,
некага
за сабой
зводзіш,
нават
не пытаючыся
імя.
У час адліву
мора
пакідае мне
перлавіцу.

«СОН» ПІКАСО

Няма большай
асалоды,
як вярнуўшыся
з космасу
ці агарода,
на хвіліну
прысеўшы,
заснуць
у самой сябе
на плячы.

НОЧ

Аніводнага агню
не відаць,

хто ў лесе,
хто ў бары,
прыдзі да мяне
ночку начаваць;
мядзведзь
адазваўся,
ля парога
паслаўся:
рад каменння,
рад палення,
прынёс жменю
сініх ягад,
як слёз
натхнення.

* * *

Людзі
бачаць:
выполваю
макрыцу,
жну,
сенажатку
кашу,
а я падбіраю
словы.

* * *

Ты правіў з ёй
сваё вяселле,
а мой вэлюм
дзявочы
за дрэвы
чапляўся
і цвіў у іхніх
кронах,
шыпшынай

вянок адзіноты
калоўся;
ты правіш
сваё вяселле
кожную вясну,
калі сады
зацвітаюць;
мне голаў
заламвае
цяжар
белай квецені.

* * *

кожны раз
ад самых вытокаў,
ад самай першай
сустрэчы
адыходжу
ад цябе,
сыходжу
і сысці
не ўдаецца –
сэрца аб бераг
б'ецца,
хваляй
хвалююся
каля твайго
зачыненага дому,
вадой несканчонай,
ракой невядомай,
якая ахінае твой
невядомы
востраў.

«ДЗЯЎЧЫНА З ГРЭБНЕМ» МАЛЕВІЧА

Чашу лён
па лугах
рассцілаю
сасмягшы
атрасаю
ў жменю
росы
цяжкую руку
падымаю
закладаю
драўляны
грэбень
сабе ў косы
за кросны
сядаю
да сонца
тку
бясконцасць.

* * *

Хаджу каля
люстэрка,
як каля вады
глыбокай,
углядаюся ў цемру,
пільнуюся,
каб не саслізнуць
са свайго высокага
берагу
часу.

МЕЙСЦА СІЛЫ

«Сцяна» паміж
нашым полем
і Перавозніцкім;
рэчкі Дубоўка
з Лычоўкай
плыткія
амаль аберуч
з Грыдзькамі;
клады праз дарогу
напроці майго Соўчына;
сляды ля Пятраг
воўчыны;
ля гасцінца
гнёзды кнігаўкі
на балоце;
сліньку глытаю,
слодыч у роце,
намацаўшы,
як праз гарадскі сон,
сваю крэўную
геаграфію.

ВЯЛЕС*

Няма нічога
больш праўдзівага
на свеце,
калі ты сеўшы
ў садзе
адпачыць,
адчуеш каля ног
на варце
свайго сабаку,
даўно памерлага,
здарожанага

* Вялес — бог падземнага свету, ахоўнік багацця і хатніх істотаў.

за тваім жыццём;
і можна
ўсе стагоддзі
пралічыць,
а сэнс
не зменіцца.

МАК УСХОДНІ

Адлучыўшыся
ад астатніх,
саслізнуўшы,
як са сподка,
цяжкі пялёстак маку
ляцеў да долу;
шаўковы
шолах,
гук
лаўлю,
здранцвеўшы,
які чуюць
толькі памерлыя
ў зямлі.

* * *

Высокія дымы
горада
вясковым
Акропалем
на ранку
пад самым небам;
снег белатвары
ад марозу,
як хлопчык,
заружавеўся;
мне сёння,

бы ў цёплай гурбе,
нічога не трэба,
толькі карціць
патрэба
ад самага малку
раку перайсці
па тонкім лёдзе
ўслед
за падлеткам.

* * *

Ад подыху цёплай
зямлі
запацелі ягады
старога
ядлоўца;
перабіраю
ягоныя юлёвыя
пацеркі —
шукаю патрэбнае
слоўца,
пакуль клубіцца
верас
нізкім
дымам
і грэе рукі
старое вогнішча
сонца.
Мне гэты ўзлесак
узмежкам
паміж
восенню
і зімой.

* * *

Мы разышліся,
а калі за стол
вячэраць
сядаю,
заўсёды бачу
напроці
крэсла
пустое,
хоць іншы раз
ад гасцей
няма дзе
і яблыку
ўпасці.

* * *

Ішла да цябе,
склаўшы рукі,
быццам трымала
перад сабой
у жмені,
ратуючы,
выпаўшае
з гнязда
птушанё.

* * *

На восьмым
паверсе
кожную раніцу
прачынаешся,
бы нешта з ночы
ўкрадзена,
бы след

чужы
да самай
дрывотні
на снезе
ўбачыла;
няўжо сыходзяць
у мяне
дровы
сярод зімы?!

* * *

Яе жаноцкасць
таямніцай
на грудзях
прыхавана,
бы ў галубкі
пад крылом
калісьці недасланае
маё пісьмо
кахання.

ЛЁЛЯ*

Яшчэ нічога
не сказана,
толькі падбіраюцца
словы
расслаблена,
аднымі вуснамі;
капяжы
напрадвесні;
нехта да слёз
салодкіх
пазяхае
пад маімі вокнамі,

* Лёля — багіня вясны.

спрабуючы
скласці
шлюбную песню.

САХАРА

Прыйшоўшы,
заўсёды
спыняешся
ў вітальні,
вочы долу,
гонячы пыл
сухавеем,
як перад навальніцай;
я ўжо не спадзяюся
і нават не сніцца –
ясныя адносіны
паміж намі;
сустрэчы – здарэнні,
твае кветкі Сахары
каменнем,
тваё чорнае
апярэнне.

ВЕЯ

Расчэсвала
грэбенем
драўляным,
рэдкім,
густым,
разбірала
на каслаўкі,
у дзве рукі
вытрасаючы,
як кастру
з кудзелі;

расставіла
трапло ў горадзе,
бы ў лазні
вясковай –
уверх – уніз,
уверх – уніз:
зрэб'е на анучы,
кужаль
на абновы;
завешвала
мае вокны
звонку,
ледзь даносіўся
шоргат
па шкле
танюткі,
невадам
тонкім
вылавіла
мае думкі,
жаданні,
пакінуўшы
толькі здранцвенне –
неверагоднай з'явы
найменне –
ВЕЯ,
так завуць завею
ў маіх Грыдзьках.

ТЫМ, ХТО ЖЫВЕ Ў ВЁСЦЫ

Толькі крыўднае слова
адно да вас,
толькі слова,
нямала – нямнога,
а такі агарнуў
мяне сум,
як зямная аблога,

быццам я пасварылася
з Богам.
Мне няволле
і пальцам
кіўнуць
у ваш бок.

* * *

Мне дастаткова
малюткі схіл
намацаць
пад нагой,
раней не заўважаны
ў гэтым месцы
ля ракі,
бы толькі што
зямля
на коленцы
прысела
да вады,
мне дастаткова,
і я табе паверу
да астатняга.

* * *

Поўня
кішэнным ліхтарыкам
высвеціла,
знайшла
згубленую шпільку
з валасоў
на падлозе,
пярсцёнка срэбнага
палову
праз шыбу

пакінутай
хаты;
пярсцёнак
маладзіком
схавала
за шчаку.

* * *

Пустая
суседская
хата
поўны хлеў
ластавак
а чалавек
перапытвае
і перапытвае
дарогу
дамоў.

ІСЛАЧ

Твой подых
у твар
забіраешся
пад адзежу
вылузваеш
як рыбіну
заварочваешся
выгінаешся
каля маёй хаты
і я паварочваю
голаў за табой
трапляючы
ў плынь
каб на ранку
намацаўшы

днішча
ложка
ці смяротнага ложа
выслізнуць стронгай
адчуўшы
тваю прахалоду.

* * *

Не кажыце
мне з раніцы
нічога благога,
не дакладайце
аніякіх благіх
звестак —
у мяне на ўсходзе
сонца
яшчэ цемечка
не заросшы.

* * *

Скрыпічны ключ
суседскага гуся
гняздо
дразда
амаль пад пахай
мне неба
дахам
ад дажджу
і снегу
і дзежка
шчасця
з лыжкай
страху
што не пачую
чалавека крокі

не адчыню
яму дзвярэй
наўмысна.

ВОСЕНЬСКІ АБЫДЗЕНЬ

Узарана
зямля,
на момант
адчынілася,
як на Вялікдзень,
неба;
чэрствая
скарыначка
ужо назаўтра;
чарствее
твар.

* * *

Івану

Развітаўшыся,
ты спыніўся
і доўга
здаля
сад аглядаў.
«Каб жа запомніць...» —
сказаў,
быццам стоячы
на беразе мора.
Я не ведаю
абсягаў
сваёй уласнасці.

ПАДАРУНКІ БАГОЎ

Жадалася заўсёды,
ды не здаралася
прыдбаць:
на лецішчы куст
дзікай
ружы
ля парога
сам узнёсся
з зернюка,
бы нехта ведаў,
што падараваць.
І нават белы
дом
на Свіслачы,
бы «дом над вадаспадам»
Фрэнка Райта
ў марах
быў зачаты.
І адзіноты
шаты падарункам,
бо мроілася
вечнае каханне.

* * *

Саджу чоснік,
уваходжу ў пазыку:
прашу ў суседа
пілавінне,
каб яго захінуць
ад маразоў;
зношу зямлю
з кратовых каптуроў
пад флоксы;
здымаю каліну
ў абедзве рукі,

падперазаўшыся
дзягай,
павесіўшы
перад сабой
вядро,
як сяўбянку;
саджу цюльпаны,
высцілаючы донца
пяском і попелам.
Агледзелася —
вакол мяне
ў садзе
камяні
пастарэлі.

* * *

Сустрэла цябе
неспадзявана,
цешуся,
бы зайшла
ў пакой,
дзе яшчэ гарэла дагэтуль
забытая мною
свечка.

* * *

Раптоўная
зіма,
як пераслаць
настольнік;
накрухмаленых
кутасоў
шоргат.
Зямля
святкуе,

хаваючы
след звера
ад чалавека.

ПАХ КАРЫЦЫ

Усё лета,
пакуль мяне
не было,
ў маіх пакоях
сонца
балявала:
пасыпаныя карыцай рэчы,
пакінутыя
іерогліфы
свечак
пакручастых;
спрабую перакласці
твой палкі
погляд
на сваю цнатлівую
мову.

ДЗЯВОЯ*

Даўнейшы фотаздымак:
нават травы
не відаць,
не тое што дрэўца
ў полі,
і нехта ж здагадаўся
паслаць маладым
пад ногі
посцілку ў шклянкі –
на долю.
На ёй цёмная сукенка

* Дзявоя – багіня цнатлівасці.

з каўняром гафтаваным
і вэлюм, як з неба,
спадае на плечы,
ляжыць воблакам
пад нагамі.
Іх абоіх маладзіць
толькі ейны сціплы
ўбор вясельны;
нечапаная,
з астатняга прыбраная,
з астатняй
перад зімкай
прыгажосцю,
постаць ледзь нахілёная
не да яго
і не да кагосьці,
а толькі што
разагнуўшыся
ад работы,
шчыры позірк:
«Я адважылася,
Божа...»
Ён ледзь дакранаецца
да ейнай павіслай
рукі,
ён ужо чуе
ейны сполах
ДЗЕВЫ.
А ззаду такое
голае
поле
і яны бы першыя
людзі
на зямлі —
АДАМ і ЕВА.

* * *

Мой час
пахвалёны —
каменнем
уніз
з абрыва,
поўныя пантоплі
жвіру.

БЕЗАБАРОННАСЦЬ

Праз ноч расцвіў
гіяцынт
на вакне:
кветка дажджу,
кветка памерлых;
таропка
на момант
захінаю
яго даланёй
ад свету,
як свечку
ад ветру.

* * *

Дастала
з дна ракі
два камяні,
прынесла ў сад,
паклала
на сонцы;
адзін пацяплеў
і сагрэўся,
другі быў
халодны,
прыйшлося

адвезці
донны камень
на ягонае
мейсца,
пакуль рака
не прыйшла
за ім сама
разводдзем.

* * *

Лаўлю
погляды
вясковых людзей
лаўлю
начныя агні
ў хатах
іх усё менее
жменямі
большае зорак
на небе.

ЗІМОВАЕ

Кароткі дзень
спаўзае сувоем,
футрам зімовым,
скінутым
у вітальні
з плеч,
крок запаволены —
мне ўжо непатрэбны
такі доўгі
вечар,
бы не па росту
падараваная
дарагая рэч.

ШЧАДРЭЦ*

(Каля карціны Валянціны Шоба)

I
Не спалася каралю
ноччу светлай,
скраў месяц,
схаваў
пад пахай;
пусцілі вясёлыя
калядоўнікі
ў поцемках
кола
аж пад мае
веснічкі;
каб не заседзелася,
не забавілася
у... бабцях –
я павярнула кола
ў зваротную
дарогу часу,
маладзеючы.

II
Месяц
то ў маёй
стайні,
спушчаныя
вочы,
то высока ў небе,
трасучы грывай,
асыпае
мне на валасы
залатую
салому;
тулюся
пад ягоным

* Шчадрэц – бог весялосці, бяседы, святаў.

падбрушшам,
падціснуўшы
каленькі
пад самае падбароддзе;
па ягоных бліскучых
слядах
ідзе ноч у юлёвым.

III
Поўня — гэта
калі мы
разам
стачылі
галовы
блізка
вярнуўшыся
адно да аднаго
па халодным
прыску
зорак.

IV
Месяц з ліхтаром,
хустка-апінанка
ў шклянкі
на ягоных плячах
сузор'ем,
дзе гарыць
і маё вакно.

V
Зімовы дзень
на змроку —
сінім па беламу,
гусцеюць
начныя цені,
след ад саней
па небе
летуценны —

якраз да маёй
хаты;
ужо склыганулі
варотцы
губным гармонікам,
не здумаць,
куды паставіць
коніка;
толькі адхінуць
фіраначку —
месяц просіцца
ўнаначкі.

VI
Месяцовы карабель
строіцца
падвезці
да зоркі бліжэйшай
астролага,
той уссадзіў
мне на каленькі
свайго катка
дуронага,
не скінуць з пеляны
да раніцы
калядную
ўцеху.

VII
Сонца ў вянку
з сухіх
траў,
сыплецца
на зямлю
спелае зерне,
вось-вось яно
на лета
паверне,
тварам да нас
на далёкай

дарозе;
гусіная лапка
на снезе...

НАЧНОЕ

Ілбом да шкла
на вакне,
як да халоднай
вады
на рацэ;
расшчапіць
замок
на руцэ,
прымацаванай
цэпам да берага;
па пяску
дном
шырокай
падэшвай
лодкі;
адбіцца ліхтаром
і не патануць
у тваёй
абыякавасці.

ДАЎНЕЙШАЕ СВЯТА

Яшчэ яно
не ў доме,
яшчэ яно
бы ў падстрэшшы
сялянскай хаты
птушынымі галасамі
наранку;
яшчэ яно на вакне
танюткай выцінанкай,

праз якую спрабуе
зазірнуць сонца;
яшчэ яно дзіцем
бавіцца на каленьках
маёй пра-прабабкі;
яна падыме яго
падпашкі
і пераставіць
праз мой парог.
Свята — гэта прыход
у дом
незнаёмага дзіцяці.

ЯРЫЛА*

Апошні дзень
такі зімовы.
А мне каб толькі
не забыцца
з кішэні выпусціць
шпака,
арэшніку
прымерыць завушніцы,
успомніць каб,
каторая рака
раней за ўсіх
кранаецца,
бо трэба дабудзіцца,
пастукаўшы
па тоўстым лёдзе,
бы ў шыбу,
адкрыць ваду.
Я з тых,
хто кожны год
вясну пільнуе.
Каб з лёгкай
матчынай рукі

* Ярыла — бог вясновай пладавітасці і любові.

пакласці ў глебу
зернюкі.

* * *

Хрысціне

Ішла да цябе
з пустымі рукамі;
а назад ідучы,
не было мне ў што
пакласці
твае падарункі,
якімі абсыпала
багавіцай.
Тады я зняла
са сваёй галавы
хустку жалобную,
бы натрапіўшы
неспадзявана
на лясной сцежцы
на баравікі.

* * *

Коціцца
шаўковы
клубок
сонца,
злаўлю
пачатак
ніткі,
наматаю
сабе
на цэўку.
Вечар.

КАРА*

Сварымся,
бунтуем,
забываючыся наразе,
што стала прычынай
разладдзя,
да белай гарачкі
сябруем;
стаўлю кветкі
ў вазе,
чакаючы
сустрэчы,
дарэчы,
трэба прыняць
са стала
вострыя рэчы.

* * *

Маўчанне
каменя
побач з намі
змястоўней
нашае
размовы.
О, слова
ловы!

* Кара – бог вайны.

«ГНЯЗДО АГНЮ»

...МНЕ ДАРОГУ АСВЯТЛЯЮЦЬ НЕ ДУМКІ,
А ВІШНІ...

Філіп Жакотэ

ПОЎНЯ

За ўсё сваё жыццё
не здолела
сабраць
пярліны
на зямлі
сарваныя
табой калісьці
з маёй шыі
незнарок
адна з іх
найбуйнейшая
скацілася
за небасхіл.

* * *

Сярод начы
усхапіцца
закрыць
акно
расчыненае
бурай
так я твае «зацьменні»
хацела б
зносіць
на свечцы
закапціўшы

шкла
аскепак
без роспачы
і крыўды
глядзець
у цёмны твар.

* * *

Памерці каб
як маліліся
ў старым Рыме
з палёгкаю
на вуснах
пазбавіцца
ад усяго чужога
як пераапрануцца
ў сваё
на кожны дзень
адзенне
пусты зімовы
стол
засланы белым
на памінках.

* * *

Рэдка
бываю
з домам
вось так пасядзець
склаўшы
рукі
прыпамінаючы сон
ні з кім не гаворачы
на вуснах
маўчанне
як згода
на пацалунак.

СІРОТЫ

Зноў і зноў у снах
пакідаю
дом казённы
без мэблі
й фіранак
мы ўсе ў чорным
адзін за адным
жывым ручаём
расхінаюцца
людзі
хто з нас
дабяжыць
да вялікай вады...

* * *

Зямля
пустазеллем
зацягнута,
як вада
стаячая,
у гародзе
прарасла
цэўка
матычкі,
уторнутая
калісьці
да часу;
хата суседкі –
пусты
вулей,
залятаюць
сюды ейныя
дзеці
дзікімі
пчоламі.

А неба ніколі
не пустуе.

* * *

Свой прытулак
дзіцячы
наведваю ў снах,
дзверы
адчыняю:
дзве дзяўчынкі
ў нашым пакоі...
мае колішнія
сяброўкі?!
Губляюся,
лапаю па кішэнях,
я не прынесла
ім цукерак,
не ведаючы,
што яны яшчэ тут
так і не сталі
дарослымі...

У ЧАКАННІ ЛІСТА

Ноччу
фіранку
адхінула
поўня
праз шыбу
лягла на падлогу
пад ногі
белым лістом
паміж намі
час
звеставання.

ДЗІЦЯ

Яне

Ты малюеш зімой
сонца,
а побач — трое ягоных
дзяцей.
Сонечна!
Малюеш лецішча
з празрыстымі сценамі,
людзі ў хаце,
і ніхто не хаваецца.
Малюеш дом без страхі,
страха,
як забыты капялюш
у вітальні,
на наступнай старонцы.
Мне сонечна!
Мне замнога
сонца!
Я ўбачыла,
дзе ты жывеш.

АКТ ПАКУТЫ

Саскочылі начныя зашчапы,
расхінаю снягі на вуліцах,
аніводнага светлага твару ў натоўпе насустрач,
незнаёмая жанчына з позіркам усходнім
вітаецца: «Добрай раніцы!»
Я не ведаю ейнага паролю,
вітаецца са старым чалавекам на кіёчку,
і ён яе не разумее, сумеўшыся,
вось толькі нездаровы сусед
ідзе насустрач
з года ў год у тым самым, у чорным,
іншы раз у высокай шапцы з брылём
чыгуначніка з паблажлівым тварам
кожную раніцу робіць абход,

сцеражучы шляхі нашы,
вітаецца аднымі вуснамі,
як у шчыльным натоўпе
вітаюцца здаля,
са знаёмцам,
да якога падыйсці бліжэй немагчыма.
Ніхто яму не адказвае...
Усходняя жанчына наведвала
наш горад сярод зімы
з далёкай галактыкі «Шчаслівых».
Я ішла па снезе... у сабо.

* * *

Дзве плыні
ля царквы:
адна ў браму,
з брамы —
другая;
жабрака,
як валун
на дарозе —
мінаюць,
ніхто не спыняецца.

ЖАБРАК

Ён просіць у мяне
на квіток,
каб ад'ехаць
дамоў
у Стоўбцы,
каторы год
запар,
бо я даю яму на тое
без даверу
меней,

чым яму патрэбна
на дарогу.
І ён аніяк не можа
ад'ехаць.

ВЯСНА НА 22-м ПАВЕРСЕ БІБЛІЯТЭКІ

Спаўзае па шкле
на сонцы лядак
зляжалай
зімовай
хмарай
талая вада
амаль па твары
аблізваю на вуснах
вясновую
слодыч.

ІСЛАЧ

Праз ноч
наранку
расцвілі ў садзе
стакроткі
вышыванкай
у поцемках
снавалася
ў некалькі нітоў
а на святле
ніводнага
вузельчыка
у Бога
не ўбачыш.

* * *

Паваленая
бурай
яблыня
старая,
як на кій,
на галлё
абапіралася.
У гэтым садзе
неба
бліжэй
да ейнай галавы
нахілялася —
яна цвіла.

* * *

За вакном —
уверх — уніз,
уверх — уніз —
рабіцу
птушыную
мне на вочы
вечар
накідвае.

* * *

Апоўначы
спыняюцца
падземныя
млыны,
крычу скрозь сон,
пачуўшы
ўсхліп
упаўшага
з гнязда

малога
птушаняці.
На свеце
не бывае
поўнай
цішыні.

* * *

Адсунула
фіранкі
начны
матыль
на вокнах
склаў
сваё скрылле
ранак.

* * *

Стук у дзверы
ў вокны
з нябёсаў
першы
гром
выбягаю
кучаравым
анёлам
малады
клён
ля ганка.

ГНЯЗДО АГНЮ

Не браўся
агонь
да дроваў
сырых

я яго ў далонях
пакачаю
пахукаю
зраблю
пеўніка
з грэбнем
чырвоным
пасаджу
на сырэц.

ВЯСНА НА ЛЕТА

Галіны дрэў
празрыстыя
наскрозь,
не далічыцца
птушак у вершалінах,
абы адклала
пэндзаль
на хвіліну
і вось ужо блукаю
разам з імі
ў шатах
лета.

ПОЛЬСКАЙ ЦЁТЦЫ ФРАНУСІ

Мой спакой
толькі ў тваіх руках,
на старым фотаздымку,
складзеных
на каленях,
адна далонь на другую,
адна адну супакойваючы,
адна адну захінаючы,
крыж-накрыж пераплецены
вянком.

Вянок працы
штодзённай,
вянок любові,
вянок на крыж,
вянок у сне, пад галавой —
вянок спакою.
Рукі твае,
цётка Франуся,
я не ўмею
так доўга
трымаць на каленях
хвіліну часу.

* * *

Загавару
ваду ў рацэ,
наваражу
на дарогах у полі,
як на тваёй руцэ,
збяру да іголкі
пад тваімі нагамі
ўсё шылавінне;
ахвярую
на тваё імя
жабракам
усё, што вінна
і не вінна.
А не здолею
разгадаць
тваёй таямніцы.

* * *

Збіраю
сляды
нашых сустрэч.
Яны абрываюцца

на прыступках
маёй стромкай
адзіноты.

* * *

Блукаю
ў пацёмках
дня,
пакуль не злоўлена
імгненне –
адзін радок,
а быццам бы
здабыў
агонь,
агонь
натхнення.

ВЕЧАРОВЫЯ ЦЕНІ

У тваім абліччы
цень
майго мужа,
асабліва ўвечары
на захадзе
сонца,
калі бачу
на небе
тры далягляды:
дзяцінства,
маладосці
старасці

* * *

Азірніцеся,
калі мой дом
пакідаеце.

Я гляджу
вам услед
на дарозе
да той пары,
пакуль вы ізноў
не завітаеце.
І да часу.

* * *

Будуе
птушка
гняздо
блізка
амаль
у далонях
пліска.

МАЛЬТА

Ідзеш
па маім следзе,
нават калі
я сама
губляю
дарогу,
ты ведаеш,
дзе я.

* * *

Пасля дажджу
вільготны
сад
я плаваю
ў тваіх затоках
мераю
нагой

самае глыбокае
мейсца,
я яшчэ пераходжу
ўброд
уборыстае
лета.

* * *

Пасля сіесты
падняцца
з фатэля,
абапіраючыся
на пагорак
за агародамі;
не адразу трапіць
у пантоплю,
яна выслізвае
з-пад ног
чоўнікам,
спушчаным
на ваду;
дробнымі
крокамі
па прыску
поўдня
перайсці
хату...
І гарэзлівая
дзявочая
радасць,
бы ўдалося
перабегчы
з лазні
без адзежы
і ніхто
не ўбачыў!

* * *

Зняць граблі
з пляча,
павесіць
на плячо
яблыні
старой,
да сонца
рукой
падаць –
час
вечар
вітаць.

МАЕ НАШЧАДКІ

З птушанятамі
сталавацца
пад акно
з лесу
крыжадзюбіха
прывяла –
паказвае,
дзе я жыву.

* * *

Летнія ўборы
здымаю,
зачыняю
грымотныя дзверы
шафы –
сад саспяліў
насенне
для наступнай
вясны.
Лаўлю

босай нагой
дажджлівага
дня
плывучы
ганак.

* * *

Па сценах
бляск маланак
у цемры
бы напроці люстэркаў
спыняюся
пасярод пакоя
і не паспяваю
сябе разгледзець
страхам
спапялёная
высокай
пагрозы
неба...
Жменя попелу
ад мяне
ўчарашняй
пасля нашай з вамі
сустрэчы.

ГРЫДЗЬКІ

О свежыя дымы
вёсак
пакінутых
мне вочы
выядаюць!
Абраз са сцяны
здыму,
абыйду з ім

вакол сваіх Грыдзек,
каб павярнуць
вецер новы,
які зносіць
у горад
на асфальт
няспелае насенне.

* * *

Раніцай
вечарніца
на ганку —
ледзь жывое
лятучае
мышаня;
увесь дзень
хаджу з падлётам
на ягоных чорных
бездапаможных
скрыллях.

НАЧНАЯ НАВАЛЬНІЦА

Бог сварыцца —
я маўчу,
бізуны
лічу,
заснуць
хачу —
баюся вочы
заплюшчыць;
мне ўжо гэтай
ноччу
залатыя арэхі
лушчыць,
перабіраць

у цемры
макавае
зерне,
пакуль наранку
пастух
пугай
вецер у другі бок
паверне.

НАЧЛЕЖНАЕ

Бліскавіца-маланка
па небе ходзіць
запальвае
свечак агаркі
капае
ладан
на яловыя лапы
пад вокнамі.
Заснуць, гіляючы,
як на начлезе
коней пасучы.

СПЁКА

Юлёвы
чад –
цвіце
чорнагалоўка,
віецца
па зямлі,
як па падлозе;
па-чорнаму
зацепліла
мне лазню
лета.

СВОЙ ЧУЖЫ ДОМ

Дачнікі
ад'язджаюць
у горад
пустуе
вёска
з домам
застаюся
сам-насам
як з чалавекам
якому раптам
не стала
даверу.

* * *

Кажаш,
японскі
сад
строю?!
Камяні
тутэйшыя
складзены
мною,
іерогліфы
пераводжу
ў словы
на сваю мову.
Сама
стаю
ў садзе
скіфскай
бабай,
якая кладзе
на ложак
ружжо
паміж
мужам
і
сабою.

* * *

Маланка
абвугленым
дрэвам
падала
ніцма.
Перуном
забітая
старая елка
не скранулася
з мейсца.

НАРАДЗІЦЦА Ў ГРУДНІ*

Юлёвы промень
уплятаецца
ў валасы.
Я не адрозніваю
галасы
птушак,
якія збіраюцца
ў вырай,
не стану
на іхняй дарозе,
не завярну
ад восені
на вясну,
спыняюся,
упусіўшы работу
з рук,
прысну, стоячы,
як дрэва.
Асенняя сочыцца
залева
сівым вэлюмам
сівой дзевы,
ззаду за ёй нясу

* Грудзень (польскае) – снежань.

шлейф
аж да першага
грудня.

СЯМ'Я

Усе ўжо тут,
цёплы
пясок,
а я запазнілася,
мейсца
шукаю
лёгка,
без суму,
быццам спрабую прысесці
да столу;
ішла
на клады,
а трапіла
да сваіх
на бяседу.

СТУДНЯ

Дзічэе яблыня,
калі сыходзіць
чалавек;
зрываю
самы горкі
яблык;
гляджу
у студню нашу –
не выбрана вада
па вечка,
жывое
вока
ўглядаецца ў мяне,

пазнаючы
ці не пазнаючы,
тут б'юцца
і мае ключы;
вакол дзірван
і панадворак
травой зарос,
як лесам.
Нікога.
Спрэс.
А вось жа ўдалося
ўбачыцца...

* * *

Адсырэла
адзежа
ад начнога
дыхання
хаты;
выціраю
рукой
лоб каменя
ля ганку;
крык гусей
паваротам
ключа
ў маіх захраслых дзвярах.

* * *

Без патрэбы й жадання
сустракаемся,
вы не мінаеце
мой дом,
быццам мяне, як на разводдзі,
немагчыма
аб'ехаць.

* * *

Зімовую
самоту
дасылае
сад асенні
напроці ў раме ваконнай,
не кратаецца
ліст,
мастак
кастрычнік —
ні чалавек,
ні птах;
я пэндзаль заламаны
трымаю
ў руках,
падняўшы з долу
галінку
яблыні.

* * *

Сыходзіць
ноч
сабраўшы
ўсіх ваўкоў
з усіх вуглоў
і на апошнім прыпынку
дастала з-за шчакі
месяца ляндрынку
пах мяты
пад раніцу
ў садах.

* * *

Не нашу
а толькі час ад часу

перабіраю на каленях
пацеркі
пярсцёнкі
зноў выпускаю
з рук
праменні
каменняў
на зямлю
хаваю ў гарах
на марскім дне
пакуль не ўзнікне
жаданне
кахання.

* * *

Густы калючы
дождж
дробным
шрыфтам
па шкле
раптоўна,
не паспяваю
счытаць
чыесьці пісьмёны,
на ганку
па вуснах ветру
разумею,
што
восень.

* * *

Якая раскоша
зірнуўшы
ў цёмнае вакно
кароткі страх дзіцячы
паспытаць

і не працяць
начную коўдру
хмар
і блізкі лес знаёмы
і рака
як успамін
чужы
і пагасіць святло
рог хмары
нацягнуўшы на сябе
таксама знікнуць
расслабіцца
ва ўлонні
бо ведаць
што яшчэ не спяць
насупраць
яны сягоння
бульбу выбіралі
апошнюю
мяшкі лічылі
заломваючы пальцы
асалавеўшы ад трудоў
няспешна
гаварылі
марудзілі вячэраць
каб доўжылася
вольная хвіліна
сядзелі побач
што даўно не выпадала
бы ў катуху
вячэра гатавалася
вядома бульба
ДАКОПІНЫ
такі маленькі баль...
адзінае вакно
у вёсцы
дзе яшчэ жывуць
заснуць раней за іх
заснуць

як у дзяцінстве
пад шоргат векавога
калаўрота...

* * *

маці Кавалёва

У сваю вёску
з горада
прыходжу
паломніцай,
як у Меку,
не адрозніваючы
Бога
ад чалавека.
Якога веку
мая вера?
Сама я
якога веку?
Калі вядуць аднаго з іх
на смерць,
на здзекі,
невымоўны
сполах,
як бліскавіца.
Я кожнаму
здрадніку,
забойцу,
злодзею —
сястра,
па-вясковаму —
сястрыца.

* * *

У начны пакой —
раптоўнае

юлёвае святло!
у адно вакно
гляджу,
у другое:
змяніліся пейзажы,
і рух
нячутны,
бы слізгаеш з кутка
па павуцінні
ўніз;
і як адважыцца
мне хату адчыніць,
каб выйсці
і спыніць
жахлівую вандроўню?
Свяціла
поўня...

* * *

Галаву да падушкі,
ды аніяк рукі да сну
не скласці —
перавяжыце
жытнім перавяслам,
пакуль поўня
не згасла.

* * *

Баўлю
час,
бы забаўляю
малое дзіця,
чужую дзяўчынку,
выпадкова сустрэўшыся
на прыпынку.

* * *

Сціхлі грымоты,
бы на дарозе
спыніліся
пустыя калёсы;
конь
распрэжаны
маланкай
капытоў
паблісквае;
засынаю, седзячы
стомленым
вазніцай,
сціхла навальніца.

БЯССОННЕ

Мулкі ложак,
дрыготкі сон,
быццам еду праз ноч
на кані,
лейцы спусціўшы
на кірмаш даўнейшы;
цэдзіцца
ранак малочны
з маёй даёнкі;
ні драбінкі
салодкага сну
да ранішняй
гарбаты.

ЗНОЎ БЯССОННЕ

Сон паваліў
упокат
маіх дзяцей
развязаў

паясы
маіх мужоў
мяне пакінуў
вартаваць
авечку
якой я не далічылася.

* * *

Калі вецер
заходзіць
на веранду,
скрыпнуўшы
дзвярыма,
ён кагосьці прапускае
наперад,
ён не адзін.
Так заходзіць
трывога.

* * *

Лівень
дабег за мной
да самага ганку
гляджу
ў вакно
пільнуюся
таго незнаёмца
хто недзе
ў дарозе
пехатой
ці на возе
не спускаю
вачэй
бура сціхне
хутчэй.

* * *

Душная
ноч
сцялюся
на падлозе
ад сцяны да сцяны
як на пароме
плёскат
сноў
плыву
цераз Іслач
якую карова пераходзіць
у брод
і кладку
перакідвае бабёр
праз ноч
натыкаюся на плот
паварочваю
на поўнач
каб астудзіць
далоні
паклаўшы
на лоб
поўні.

* * *

Госці
ад'ехалі
задрамаўшы
аселі
фатэлі
астываў
стол
непрыбраны
фортка
шоргнула
празрыстым

крылом
з рук з вуснаў
здзьмухваю
амаль хатніх
вос
бы пякучыя
словы
якіх не сказала
на развітанне.

* * *

Кажаш, я акрылёная,
а крылы мае —
бялізна, яна лопае пад ветрам
на вяроўцы
ад панадворку да лесу;
нябёсы мае —
столь у хаце,
памытая перад Вялікаднем;
лётаю я ў сне,
крыху ўзнімаючыся
над плотам,
і доўга мяркуюся,
дзе б прыпыніцца,
каб не трапіць
на гострую штакеціну...
і прачынаюся...
да работы.
Я хачу ў вырай.

* * *

Леаніду Галубовічу

О, ваша пахвала!
Няхай цяпер
заўжды

забавай будзе
той патаемны
смех
услед,
калі надзену
сукню
швом наверх,
на найніцу,
і выйду
ў людзі.

ДОЎГАЧАКАНАЕ

Чорныя
лапіны на снезе
бы нарэшце
вясна
пасе на пагорку
свае рабыя
каровы
цёплыя
кроплі
дажджу
ловіш
вуснамі
немаўляці.

* * *

Вячэрніх люстэркаў
замглёнасць
твае растанні
твае вяртанні
як у буру
расчыненыя дзверы
нашага дому
бы ты ўжо ізноў

у новай
дарозе
куды
да каго
на чыім парозе
ўжо назаўжды
і праз гады
стрымайся
пры нашай выпадковай
сустрэчы
і не скажы
што мяне не пазнаць.

* * *

Снег
падае
і растае
ўвачавідкі
прачнулася
зямля
мне сэрца
адпусціла.

* * *

Асенняя павута-кудзеля
не залатое руно
выпала верацяно
з рук
стук па падлозе
ці стук у дзверы
два запозненыя кавалеры
на конях белых
адзін — святая «Пагоня»
другі расеец
таксама дарагі

дзве мае рукі
два берагі
плыву пасярэдзіне
ракой
напаю коней
вадой
намілуюся ў тросніку
у явары
кожнаму любасцяў
нагавару
перакатамі па каменнях
саб'ю калені
ўкленчыўшы каля грэблі
спынюся
дзівам дзіўлюся
што скора –
мора.

СТАРЫЯ МОГІЛКІ

Дымна
зазімак
упаў
на траву
праз ноч
нехта надыхаў
у бараду
не падымаючы
воч
ад Талмуда.

ПЕРШАЯ ВЕЯ

Восеньскі фартух
перавязаўшы,
рукой увішнай
на дарогу,

бы на стол кухонны,
сыпанула
чыстага снегу —
ані парушынкі
ў маім воку,
кружалкамі
на панадворку,
на ганку,
каб раскачаць
сувоі цеста
на баль зімовы.
Віхор
басанож
дарогу перабег,
у прыполку несучы
вугольчык
ад суседзяў
расцепліць печ.
Іду, крадучыся,
коткай бадзялай,
баюся
наследаваць.

* * *

Нешта за нечым
спяшаюся
з пакою ў пакой
за рэчы
па дарозе
чапляюся
звон
друз
на падлозе
быццам я праз акно
заляцела
і не магу знайсці
вылет.

НАТХНЕННЕ

Першы снег,
бы асыпаўся
цвет
старых яблынь у садзе,
і хаты слабое дыханне
на вокнах марозных,
і хмарна з раніцы,
калі здаецца,
што ўжо позна
нешта пачынаць,
і золка,
пакуль з-пад гурбы
папяровай
пад сталом пісьмовым
не пырхне натхненне
перапёлкай.

* * *

О, сад,
твой кожны ліст —
старонка
дзённіка майго
начнога...

* * *

Перабіраць
зямлю
голымі
рукамі
карэннем адчуваць
вільгаць
вясновую
забыцца

на чалавечую мову
і прарасці нарэшце
пасля горада
нанова
і толькі тады
пачынаецца
вечнае
жытво
найбольш за ўсё на свеце
злуюся
калі за работай
упадзе
закасанае
рукаво.

ВЯСНОВАЕ

Леаніду Галубовічу

Сыйшла
рупніца,
спала ў грудзях,
як спадае
вада
на разводдзе;
павольна хаджу
на водмелі,
пакідаючы
след
птушыны.
Сыйшла
пільніца,
саджуся за стол,
пішу вам ліст:
літарамі
вялікімі,
радкі

барознамі,
бы свежая ралля,
якія прыйдзецца
вам чытаць,
бы басанож
ходзячы
за бараной.
Калі вы таксама
ўжо ўсё пасадзілі.

* * *

Зрушыўся
захістаўся
туман
чую звон
буйных
кропель
набліжаецца
сонца.

* * *

Згарэла
ў вёсцы
хата
пахне
агаркам
грамнічнай
свечкі
сажа
на маіх пальцах.

НЯДЗЕЛЬКА

Далоў скінуць
з плеч
боскія лейцы,
да ракі пайсці,
ваду несці
дамоў
няспешна,
як рака,
не думаючы,
ці не заплытка,
ці не заглыбка.

ПІВОНЯ ЎХІЛЁНАЯ (МАР'ІН КОРАНЬ)

Сярод дня
хаджу
як па цёмных
пакоях
знаёмыя рэчы
намацваю
рукой
дзверы
шукаю
спрабую
выйсці
знайсці
згубленае
падняць з зямлі
яно ўжо недзе
ўзышло.

ЛІВЕНЬ

Суша
дождж

сыйшоў
на зямлю
ледзь чутна
невымоўна
быццам мы разам з ім
нахіліся
да работы.

* * *

Зарапад
у маім садзе
сяджу
ля Млечнага Шляху
яблыкамі
таргую.

ШЧАСЦЕ

Сярод белага дня
за работай
ці проста ў дарозе,
пешкам,
на тарантасе,
на возе,
у садзе брыдаючы –
раптоўная
радасць,
бы Бог
падымае
падпашкі
высока,
як у дзяцінстве
малых
падымаюць
з уцехай.

* * *

Зморaны спёкай
сад
з рэшата
сонца
птушкі
лушчаць
пражанае зерне
мне ў пеляну.

* * *

Вечнасці
запаволены
крок
не азірнуцца
на дзень учарашні
на пазалеташні год
мне на каленькі
ускочыць сядзе
здзічэлы кот
словы
забудуцца
шэпт нетутэйшага
ветру ля скроні
нарэшце
збаўленне
вызваленне
з палону
маленькага жыцця.

* * *

Наранку
шпакі
маладыя

пакінулі
гнёзды
прысеўшы
на рубчык страхі
прыпынкам
для птушак
у небе
мой дом.

* * *

Я ўжо больш
не чакала
сяброў
тады да хаты
блізка
як на бязлюднае
мейсца
прыйшоў
звер
я не спужалася
бо я ў ім не шукала
падабенства
да чалавека.

* * *

Макі
ў маім садзе
пад ветрам
вынеслі хваляй
успамін
алтайскі
дзікія кветкі
ссыльнага
мейсца
я з тых

адкуль ідуць
пехатой
усё жыццё
бясконцасць
не мае адлегласці.

КАМЕНЬ СТРАЛЬЦА

На кірмашы
выпадкова
каменьчык
бяру
ў далоні
забілася
ягонае
сэрца
як у згубленага
птушаняці
і сціхла
сагрэўшыся
названы
сапфірам.

* * *

А. М.

Часта плачаш,
сумная
зязюля
кукуе
яшчэ болей;
шчаслівыя хвіліны
тваёй шчырасці,
калі слёзы
на волі

НЯМА АДЗІНОТЫ

Ноччу ў цёмным
пакоі
раптоўны
ўздых
палёгкі
ці паветраны
пацалунак
пасланы
з далоні —
лопнула
пупышка
амарыліса.

ТВАЯ СТЫХІЯ

Заўсёды
павярнуўшыся
да цябе
зрокам
усёй істотай
калі ты побач
пільнуюся
тваіх рухаў
слоў
бы жывучы
паблізу
небяспечнага
мейсца
займаецца
мой трывожны
дзень
магчыма
наш стары дом
над вадаспадам
з абламанымі
поручнямі

тэрасы
над пеннай
вадой.

* * *

Сад патрабуе
маёй адзіноты
як за пяльцамі
седзячы
падбіраецца
нітка
на ранішняе
неба
гледзячы
і да вячэрняй
самоты
сад — гэта не работа
але калі знойдзеце
мяне ў баразне
паміж зямлёй
і небам
не замарудзьце
яшчэ цёплыя
рукі
на грудзях
скласці
каб хоць крышачку
адпачыць на зямлі.
Як украсці.

* * *

У полі,
у садзе
ці на ганку
кожан вечар,

здаецца,
размінаецца
са мной
усходняя
незнаёмая
жанчына,
ветрае
расшытым
падалом
шалік праз плячо
ад лесу, да лесу,
твар рукавом
засланяе;
гляджу ўслед
падымаю ейны
згублены
каснік ружовы
на далягляцдзе,
туга наматваю
сабе на палец,
прастаючы,
як у дзяцінстве,
каб назаўтра
ўплесці сабе ў валасы.
Сонца садзіцца.

* * *

Пётру Варанецкаму

Не ўдалося выбраць,
дзе нарадзіцца,
цяпер выбірае, дзе хоча
памерці;
«У садзе...», —
пчаляр стары кажа,
на два кіі
абапіраецца
сярод яблынь

асенніх.
Цяжкія сукі
апірышчы
гнуць.

* * *

З маёй рукі
зярняты
прарастаюць
цяжка,
бо я ніколі
не была
цяжарнай;
а сёння
дрэўца
цень,
пасеянага
ветрам,
увайшоў
у мой дом,
бы пасынак лясны,
ці, можа, хрэснік...

* * *

Л. Р.

Голас
заўсёды
быццам толькі што
пераплыла
ад Волаха
да Старажоўкі
човен прывязала
голас
калі толькі што разагнулася
рукамі прасуючы

скамечаную
спадніцу
«Добры дзень»
прывезла з таго берага
дзе немаладыя жанчыны ўпэўнены
ў мужавай
вернасці
голас
о мне ніколі не паспытаць
твайго супакою
тваёй ленасці
расслаблена
гаварыць
пра ўсё спарадку
толькі не пра каханне.

* * *

Дзень
бы побач
чужы цень
ноч
поўныя вёдры
дажджу
без дна
колькі яшчэ чакаць
да відна
мне кожны ранак
найлепшая
навіна.

* * *

Аніякага жалю
плачу
замовы
галоўнае

скласці ў печы
дровы
каб запаліць
ад аднаго
сярніка
ля хаты
рака
амаль побач
блізка
Іслач
існасць
чыстай вады
за агародамі
поля
ўзараныя
рады
свежыя радкі
тваіх тэкстаў
белая птушка
ў небе
божай нявестай
скрылле
распластаўшы
дзень толькі ўстаўшы
здымае далоў
начное
з плеч
галоўнае
расцепліць
печ.

* * *

Промень пад столлю
перакладзінай
даўнейшай бэлькай
ружовая пудра
ранка

па шчацэ сцяны
бы па свежых
баранках
голас птушкі
за вокнамі
непазнаны
яшчэ прасцірадлы
пялюшкамі
не прыбраны
па пакоях
прайшоў
павітухі
гарбаты
цень
дом вясковы
нараджаецца
кожны дзень.

* * *

Вясна, лецішча,
праз вуліцу
напроці
хата пустая,
толькі знаёмае
дрэва
для вока
прытулак,
ночвы,
прыбітыя да ганку
прыбоем часу,
мохам пацягнуты
дах,
птах?!
ля коміна
птах!
хто? адкуль?
на якой мове?

пошчакам
сыпяцца ягоныя
словы,
і без перакладу
вядома:
абое
мы даляцелі
да дому!

ХУТАР

Хрысціне

З хаты адыходзіла наша
цётачка Зуня
старэйшая гаспадыня...
а так сад цвіце
стаю адна
яшчэ ў сярэдзіне
веку
рана-позна
мая чарга
і нікога ззаду
ноччу сава закалыхвала
ўшчувала ненароджанае
маё дзіця
будзіла тое пра што
пазбягаеш думаць
а так сад цвіце
выпушчу з рук вяроўку –
кароўку
адвяжу сабачку на волю
ў лес у поле
хату за мной не замыкайце
хай хата дух зменіць
ад зімы на вясну
па дрэвах пастукайце
пабудзіце

калі буду сама адыходзіць...
а так сад цвіце
тады я схапіла
кош бульбы дымкай з печы
з расткамі
перад сабой нясу
ног не бачу
бы парадзіха
пад лапату садзіла
абы ў зямлю нешта
пакласці
каб не пуставала
каб не спыніцца ў бядзе
надоўга не застацца
цёмна ўваччу
намацаць пацягнуць
за ражок
покрыў
жалобны
над хутарам
як чорную хустку
з галавы...
а так сад цвіце
зязюлін дала ўголас
зусім побач кувае
не пытаюся пра гады
не загадваю
мне яшчэ доўга тут
кукаваць
жаль бярэ
а так сад цвіце
люблю як зязюля кувае
люблю свой жаль
сад цвіце ружовым
пабыўшы белым
дзявоцкім цветам...

* * *

Збегчы
з ганку,
спыніцца,
сцягнуць
блюзку
праз галаву
і, як з берага
ў ваду, –
да работы!
Ахвота!

* * *

Сівыя гады
не вёсны
пастаўлю
на зіму
кросны
сяду
на парозе
пільнуюся
каб не звесці
агонь
у вёсцы...

«ТВАРАМ ДА ЗІМЫ»

БАЯЎСЯ: ВОЧЫ СЛАБНУЦЬ – ЧЫТАЦЬ НЕ ЗМАГУ
ПАМЯЦЬ ТРАЧУ – ПІСАЦЬ НЕ ПАТРАПЛЮ
ДРЫЖАЎ ЯК АБОРА ЯКУЮ ВЕЦЕР КАЛЫША –
ДЗЯКУЮ ПАНЕ БОЖА ШТО ЛАПУ МНЕ ДАЎ
САБАКА ЯКІ КНІГ НЕ ЧЫТАЕ І ВЕРШАЎ НЕ ПІША.

Ян ТВАРДОЎСКІ

* * *

Вясна вады
дарогу
адпусціла
цяпер дамоў
як і да сэрца
толькі пехатой
ці калясьмі.

* * *

Нахіляю
галіну
клёна
да вакна
каб і ўначы
сплючы
быць бліжэй.

НАТХНЕННЕ

Не тыя алоўкі
не тая папера
быццам стаю
ля сцяны

на вечарынах у вёсцы
усе пабраліся
ў пары
майго няма
кавалера
і раптам гармонік –
музыка
сфераў!

ЧОРНЫ ДЗЕНЬ

Так позна
спазнаць
вашу здраду
як з урачыстай
вячэрай
спазніцца
калі ўжо тваё
сонца садзіцца
і не дасі рады
у што апрануцца
на гэтым часе
апошнім.

* * *

Дождж
увайшоў
у ахвоту
маршам
за вокнамі
знікла самота
начніцай
распяўшыся
на ваконнай
раме
быццам не ўхаце

«ТВАРАМ ДА ЗІМЫ»

БАЯЎСЯ: ВОЧЫ СЛАБНУЦЬ – ЧЫТАЦЬ НЕ ЗМАГУ
ПАМЯЦЬ ТРАЧУ – ПІСАЦЬ НЕ ПАТРАПЛЮ
ДРЫЖАЎ ЯК АБОРА ЯКУЮ ВЕЦЕР КАЛЫША –
ДЗЯКУЮ ПАНЕ БОЖА ШТО ЛАПУ МНЕ ДАЎ
САБАКА ЯКІ КНІГ НЕ ЧЫТАЕ І ВЕРШАЎ НЕ ПІША.

Ян ТВАРДОЎСКІ

* * *

Вясна вады
дарогу
адпусціла
цяпер дамоў
як і да сэрца
толькі пехатой
ці калясьмі.

* * *

Нахіляю
галіну
клёна
да вакна
каб і ўначы
сплючы
быць бліжэй.

НАТХНЕННЕ

Не тыя алоўкі
не тая папера
быццам стаю
ля сцяны

на вечарынах у вёсцы
усе пабраліся
ў пары
майго няма
кавалера
і раптам гармонік –
музыка
сфераў!

ЧОРНЫ ДЗЕНЬ

Так позна
спазнаць
вашу здраду
як з урачыстай
вячэрай
спазніцца
калі ўжо тваё
сонца садзіцца
і не дасі рады
у што апрануцца
на гэтым часе
апошнім.

* * *

Дождж
увайшоў
у ахвоту
маршам
за вокнамі
знікла самота
начніцай
распяўшыся
на ваконнай
раме
быццам не ўхаце

начую
а ў аркестровай
яме.

ПРЫЧАСЦЕ

Успомніла
забытае
слова
вясковае
услых
вымаўляю
аплатка
на языку.

* * *

Шалаш пастушкі —
мая хата
сядзіш пад страхой
а хвост мокры
не спутала
не ўтрымала
на мейсцы
дуроную карову
сцадзіла на зямлю
і сабе ў прыпол
тугімі
струменямі
цёплым сырадоем
дождж.

* * *

Перастаў
прыходзіць
да мяне

жабрак
іншы раз
вельмі дакучаў
стукаючы
ў дзверы
наранку
і я раптоўна
пабяднела.

АДЛЮСТРАВАННЕ

Ляціш насустрач
да чалавека
як да Бога
спяшаешся
прымаючы
бліскучае
чужое вакно
за неба
і разбіваешся
не каюся
бо чыста
забываюся
і зноў ляціш.

* * *

Сонцаварот
ад маіх варотцаў
паварот
да зімы
тварам
дзень
будні
не затрымацца
з бабамі
нават ля студні.

* * *

Паляўнічы
стрэл
на балоце
ўспуджана
птушка
пакуль бачу
яе ў небе
ляту побач
нас лёгка
пераблытаць.

* * *

Насільна скончыць
жыццё
ці жыць насільна
чыя душа
болей вінна
маркотны чалавек
не скажа
чый грэх
пераважыць
радуйся сэрца.

ПЕЧ

У горадзе раптоўная
гарачая вясна
пасля дажджу
запахла
печчу
гарачым каменнем
цэглай апечанай
калі не ўпільнуешся
пабяжыць

з катла
на агонь
бы з качарэжніка
парасон
у мяне ў руцэ
увесь бераг Нямігі
ў малацэ
і я яшчэ недаростак
я яшчэ й не падлетак
рукамі абдымаю
печ
амаль мяркуюся
коткай
ускочыць на пяколак
вярнуўшыся са школы
ўзімку за вёрст пяць
спаць...
спаць
у запечку
як за плячыма
печ — радзімачка
печ — Айчына.

* * *

Даўно не чапляла
завушніцы
на мне аніводнага
знаку
прывабнасці
ў люстэрка
ўглядаюся —
не адбіваюся
увайшла
ў свой цень
поўдзень!
а думала — вечар.

* * *

Хваля
пагоркаў
ідзе
ад лесу
бліжэй
і бліжэй
ніцма
на зямлю
ўпасці
каб у плынь
натхнення
папасці.

ЖЫЦЦЁ НАВЫПЕРАДКІ

Калі ты не склала
дровы ў печ
назаўтра
не прынесла
вады
са студні
ты не маеш
будучыні
а толькі марудныя
будні.

* * *

«Гады падыйшлі», —
кажаш, паслухмяна
складаючы
чорны
клунак;
а мне яны падыходзяць
цестам

у дзяжы,
п'янею
ад паху
саспелай
рашчыны,
кладу на апалы
ліст кляновы,
распальваю
печ
на золку
серніком астатнім,
зачыняю
засланку
за сонцам
увечары;
гады падыходзяць
вясковым
разводдзем:
той бераг,
дзе ты,
яшчэ далей
адплывае.

АТАРА

Біліся казлы —
малады і стары,
малады перамагаў,
атара расступілася,
нерухома стаяла,
страхам скаваная;
стары казёл
на зямлю паваліўся,
голаў закінуўшы,
бы ад цяжару
сваіх рогаў прыгожых,
яшчэ і яшчэ падымаўся,
і зноў яго адкідваў

прыбой
маладой злосці;
мужчына стаяў,
глядзеў на бойку,
ягоная жанчына
кінулася разнімаць:
«Гэта прырода...
няхай дужаюцца...» —
запярэчыў.
Жанчына зразумела:
ён з гэтай жа
атары.

* * *

Спрэчкі
паміж намі
з дня ў дзень
як папярэчкі
ўздоўж
маёй вясковай
вуліцы
не здымуць
маю асаду
твае ружы
з чужога
саду.

* * *

Збіраю
зоры
што ноччу
ўпалі
кожная
мае імя
згаслыя
агні

пакінутых
хатаў
Юзэфа...
Надзя...
Шурачка...

БЯССОННЕ

Раніцай
запацелі
вокны
ноччу
дыхае
хата
глыбей.

* * *

Дымнае
асенняе
сонца
вешаліны лесу
паліць
жалуды
пражыць
на мяжы
гарбузом
ляжа
закоціцца
да вясны
пад услон.

‘

* * *

Благі настрой,
не даўмецца

з якой прычыны,
пакуль не пераклала
тры камяні
ў садзе,
з якіх ладзіла
ракарый.
Перабрала іх,
як каралі
на сваёй шыі.
Каторы з іх
ураўнаважыў
мой свет?

НОВЫ ЧАЛАВЕК

Юлечцы

Не ў моры бурштынавым,
не ў гарах сапфіраў,
а на стаптанай
звярамі, коньмі, людзьмі
вясковай дарозе,
шукаючы сабе талісман,
падняць каменьчык
і не адкінуць за плячо,
не ўпадабаўшы,
а пакласці на тое ж мейсца,
бы ў ягонае гняздо,
дзе жыў,
нахіліцца,
спусціць далоў,
як дзіця
гадавалае
з найменнем юлёвым
гэта зрабіла,
РЫТУАЛЬНА,
каб не скрануць,
не пабунтаваць
сусвет.

* * *

Нізкая трава
падэшвай пад нагой
і раптам ейны моцны
выкінуты колас
бы моцны голас
дае мне шанец
павагу
боскую
адчуць
да ўсяго
што спеліць зернюкі
жыцця
і саступіць
мурашцы
на лясной дарозе
і адмяніць пазначаны
канец
сусвету
парой яшчэ яно
ў знямозе
цягнуць да хаты
бервяно

НОЧВЫ, НАЧОЎКІ

З-за якога мора
выплылі з варыўні
ночвы, начоўкі,
пагойдваюцца ў маёй памяці,
поўныя вугроў жывых:
паскамі, папругамі, дзягамі —
бляск невідонай мужчынскай
збруі;
зімой валіла з іх
пара вантробная —
вепрука разбіралі,
па баках бабы стаялі

з вялікімі нажамі,
бы з вёсламі ў крыві,
як піраткі з поўначы,
косы туга перавязаўшы,
вузлом, аніякай гамонкі,
засяроджана вяслуюць
пад КАЛЯДЫ
у адведкі да Багародзіцы;
прывёўшы дамоў, як не за руку,
народжанае на жніве дзіця,
налівалі ў ночвы вады гарачай,
не даючы веры сваім рукам,
спрабуючы, як не вуснамі,
жменяй чэрпалі,
палівалі раўчуком,
з плёскатам, з гаворкай лясной
галубінымі галасамі;
моцны сон, каб жа не заспаць
дзіця
побач з сабою на ложку,
ночвы выносілі з варыўні
«на ваду»,
ужо яны на вяроўках —
канатах карабельных,
на жардзіне
пад бэлькай,
гушкалка ад сцяны да сцяны,
ад берага да берага...
Самыя маленькія,
(касцяк таўчы),
бяру іх на рукі,
няньчу
сваё дзяцінства...

* * *

Не тую ежу гатуеш,
не тую касу

купіла
пад ногі ёй
кінуў
і адвярнуўся
паклала на ноч лязо
паміж ім і сабой
вочы прыжмурыла
бабай скіфскай
табун дзікі
праляцеў блізка
твар гразёй
апырскаў
стрэлаў
бліскі
ледзь паспела
адхінуцца...
памяць...
памяць кахання
павінна
прачнуцца.

ЛЁС

Цалны дзень як наважаная
да работы на вяроўку
увечары аб зямлю кінула
ахапак недаробкаў
як у хляве
нагой дзверы зачыніла
хата астыгла
навылет пустая
толькі сабака вітае
такая непамыснасць
і сон не ішоў
«усё ў цябе адбылося»...
раптам прамаўляю
не сваімі вуснамі
не сваімі думкамі

вестку нехта прынёс да ложка
толькі што не арханёл
у руках з лілеяй
нехта недзе падлічваў
памнажаў адымаў
усё адбылося што нарачона
дакляравана адпушчана.
вінна... пры нараджэнні...
агарнуў спакой
час спыніўся
птушка доўга вышыню набірала
каб выпрастаўшы скрылле
натолена
ў небе
нерухома
затрымацца
ад захаплення...

* * *

Зімовы горад
нязвыклае
крокаў рыпенне
мароз
нетутэйшы
ідзеш
бы па месяцы
срэбным
знаёмца ніводнага
як на зямлі.

* * *

Пад дажджом
лепей пад ліўнем
ісці
і ісці

і сама не ўбачыш
што даўно
плачаш.

КУБЕЛ

У сенцах
падперазаўшыся
паскам лазовым
кубел сядзіць
вусы ў муцэ
мыша на руцэ
сячэ зерне
з хаты
ў хату
склыгаюць дзверы
ніхто
галавы
не паверне
толькі
сляпое вакенца
міргне
і не паверыш
раніцай
устаўшы
што кубел той
госцем у сне
а не ў кладоўцы
у сенцах
на восьмым паверсе
на Старажоўцы.

* * *

Старая спынілася
стаяла на двух мыліцах
а потым рушыла пайшла

па сходках
на чатырох
уверх
Які ейны век?!
А колькі дасцё?
як выклік
мне маладзейшай
яна запытала
о гэтае вечнае жаночае
спадзяванне
што на чужых вачах
ты павінна выглядаць
лепш
ускінуўшы
свой мокры хвост
адно асцё
бы дарагую футру
на плячо
я пайшла шпарчэй
а колькі дасцё?!

* * *

Мой сад
у нас з табой
адно дыханне
губляю
фарбы
лісце
вяртаюся
ізноў...
Мой ліст
апошні
перапішы
наноў...

ЗІМАРОДАК

Сама я тут
не прарасла
мяне не цяжка
з мейсца
зрушыць
калі б не сад
спяваю
на птушыны
лад
зіму
вітаю
не адлятаю.

* * *

Яшчэ ні цвету
ні лістоты
сонечная
пякотка
спякота
вясна
падносіць
да вуснаў
пусты
гляк
у гарадское
вакно
раптам
заляцеў
зялёны
скразняк
няўжо?
якая пара?!
крыгай
ад берага
адлучыцца

адпіхнуцца
спаліўшы
зімовыя
строі
пераапрануцца
але ў што?
а як?
і вечка
куфра
га-ак! па пальцах
а вышыванка
яшчэ на пяльцах.

* * *

Яшчэ не захінёна
травой высокай
твар падалом
ад сурокаў
буралом
ламачча
пералом
жэрдзя
платоў
поручняў ганка
не падняцца
не ўзыйсці
па сходках
у пакінуты
дом
і я тут не тутэйшая
амаль бежанка
бяглянка
я толькі спяю вёсцы
калыханку
прылягу на брыжок
прысну
да ранку
каб прачнуцца

на золку...
ахвярніцай.

* * *

Два берагі
сыйдуцца
калі абмялее
рака
раўчук
па вясне
прабяжыць
рукой
перацяты
хаця ты мне
не ўспамінай...

* * *

Сон ўпаўдні
калі сонца
спыняецца
пад вакном
праменняў
перазвон
сад
наліваецца
віном
па самыя
карані.

* * *

Не курапатка
не зязюля
на вёсцы пяюлля

голас сцелецца
нізка
да зямлі
да вады
крыламі
блізка
пераплятаецца
з травамі
з каласамі
галасамі
не адрозніш
ад птушынага
шчабятання
покі сонца
не ўстане
начная птушка.

* * *

На золку
заспець
ледзь чутны
шоргат
ноч
скрозь сон
складае
свой покрыў –
парасон
атрасаючы
на зямлю
росы...
і жыць.

* * *

У садзе
салавей

разгойдвае
бомчыкі
вясёлы
званар
вясны.

* * *

Цёплы дождж
чакаў каля ганка
мы не спяшаліся
ішлі пешкам
па дарозе
па стрэхах
з галінкі
на галінку
шапталіся
пад вокнамі
і на старых кладах
былі
прамокла да зямлі
як ад усцешных слёз.

СТАРАЯ ВЁСКА

Упушчана
з рук
верацяно
часу
а маладзік
па пагодзе
як даўней
сярпом
заводзіць
і падаюць
спелыя
зоры
ў яселькі

дзень
праясніцца
яшчэ праясніцца.

СТАРОЕ ГНЯЗДО

Птушкі ўжо ў садзе
а я сюды пехатой ішла
вярталася
на прыцемках перадумак сваіх
начавала ў дарозе
падымалася
несучы наперавес на плячы
успаміны пажыткі
наймалася пастушкай
сагравалася пад бокам у атары
піла талую ваду ў лугах
каб вярнуўшыся ў пакінутую
вёску
дух зямлі здзічэлай
як свечка мяне не задзьмуў
«Яна прыляцела» —
першым заўважыў мяне шпак
мы на адной галіне сядзелі
сушылі скрылле.

* * *

Варажба
поўня
глядзіцца
ў люстэрка
маладзік
маладзіць.

ВЕЧНАЯ ВЯСНА

Раптоўна спыніцца
пад дзвярыма ў сад
каб не спалохаць птушку
да вушака
як да марскога рапана
ілбом да шыбы
спіной да гарачай печы
вухам да падушкі
перазвоны ўсюды
птушкі
салаўі
валоўнікамі
каля ганка
музыкамі
пяюць
табе дзяўчынёсе
велічальную
і саромеешся выйсці
пад дзвярыма стаіўшыся
нязвыкла ружавеючы...
вечная вясна.

* * *

Аксане

Дзень
дажджлівы
выплача
твае слёзы
навальніца
з пагрозай
паківае
пальцам
як на малое
дзіця
хаця

мы яшчэ праўда
дзеці
гнёзды нашы
ў вецці
схаваныя
ад людзей...

* * *

Додж заўсёды
ідзе ад лесу
напрасткі
да хаты
сівы
калматы
асенні
просіцца праз страху
ў сені
стукае ў вакно
паглядзіш
нікога не відно
а пэўна адно
што сумам заносіць
як паштар вясковы
кіне праз плот
ліст кляновы
і зноў на ровар
і ходу
маўляў, вам ВОСЕНЬ
сапсаваў пагоду
варта сабак
спусціць.

* * *

Дзень
будні

хата
як хата
ўбачыла бусел
ляціць —
і ўжо свята.

ПІЛЬНІЦА

Ноч
сплю
трава
расце
праца
пад вакном
стаіць
піць
смага
піць
прагна
порстка
перакуліўшы
глечыкі
напарсткі
разам з пчалой
людцаў
рой
сокам
лета
ўпіцца
пільніца.

* * *

Птушка
ўдарылася
ў вакно
ўпала

я ўскрыкнула
даляцець
да самага
твайго
сэрца
і памерці.

* * *

Спыніцца
сустрэўшыся
з дрэвам
вітаць
лес далёкі
поле
аблокі
спыніцца
на гэтым свеце
мне не нажыцца.

* * *

Зярнюк
лёну
прыклеіўся
да далоні
як да зямлі
рукі
памятаюць
рамёствы.

УЧАРАШНІ ДЗЕНЬ

Лівень
вяслом
вяслуе

вадаспадам
імчыць
сённяшні дзень
можна не лічыць
ён размыты па шкле
запацелых вокан
прапаў
мільгнуў
вокам
каторы ўжо дзень
пагоду пільную
я так хацела
наведаць у садзе
ружу
старую
назаўтра
азірнуўшыся
назад:
О цуд!
О! Ліўня
вадаспад!

* * *

Рэчка —
павітуха
абмыла
ногі
рукі
ўсе ейныя ручаі
прылукі
вуграмі
віюцца
поўная міса
крыжыкам
нацельным
павісла
Іслач.

* * *

Усход сонца
усход колераў
бясконцы
твае гаючыя
фарбы
лілея.

* * *

Камень
кінуў
у неба
бы ў вакно
суседу
ён вярнуўся
птушкай
на плячо.

* * *

Не здрадзіш
не згубіш
мову
на якой
любіш.

ГРЫДЗЬКАЎСКІ ДЗЯДОЎНІК

Мой палюбоўнік
стары дзядоўнік
чапляецца нахабна
за прыпол
казыча вусамі
босыя ногі
высланы

мне лапухамі
дол
палюбоўны
ў нашай пакінутай
вёсцы
ні ён каторы бацька
ні я яму матка
а ўзыйшло зярнятка
і на чужыне
прывезенае
з Грыдзек
у прыполе
адзінае
невыводнае
роднае.

* * *

Памятае дрэва
калі яно было
малое
спушчанае з рук
на зямлю
каторае з іх
я найболей
люблю
не скажаш
яны ўсе на памяці
гадаванцамі
яшчэ не дрэўцамі
і нават не флянцамі
проста прачнулася
зярнятка
і не пазнаць
дзе нос
дзе пятка
і як яго пазваць
каб прывесці

дадому з лесу
пасадзіць
пазначыць
свае крэсы
а пад вакном ЁН –
клён.

ДОДНІЦА

Ад брыжа да брыжа
верацяном
аніяк не ссучыць
сну
нітку
хаджу па хаце
як па вадзе плыткай
шукаю
манету з адбіткам
поўні
ўчора ці сёння
не ўспомніць
каторая гадзіна
жорны
млына
перацерлі
канву
змыслаў
ды нарэшце
выспа
калі сказаць лепш
некалькі сходак
сесці на ганку
як аса
на мядовы
сподак
і напісаць
верш
«додніца».

МОЙ АБРАЗОК

Марыльцы

Пярун
грымоты
зачыняю
вокны
дзверы
і нават вароты
хаджу як калісьці
за табой ззаду
трымаюся за спадніцу
праз гады
твой голас
«не пужайся...
заплюшчвай вочкі...
навальніца...»
на ложак побач
слыхам чую
прыляжаш
і зноў да вакна
ці не запаліла
бяду пільнуеш
ты заўсёды са мной
у навальніцу
прыходзіш
начуеш
ніколі
не бываю адна
да відна.

* * *

Падыйшла
успомніўшы
што не заўважыла
ці цвіла
старая

яблыня
буду вінна
калі яблык
не завяжацца
а можа яна першая
ў маім садзе
з кім я ўжо
развіталася...

УСЁ СА МНОЙ

Дзіцячы ўсхліп
вады,
калі бліжэй да рэчкі
падыйшла,
пылком ялін
забелена
у кубку,
куст дзічкі
ружавее
дробным цветам,
бы выйшаўшы
на ганак саду;
на момант
палову майго свету
блакітам
заняло,
сустрэўшыся
вачыма
з незабудкай;
спыніцца,
азірнуцца
у знямозе:
нікога я не страціла
ў дарозе.
Усе са мной.

* * *

Прыйшла
развітацца
з маладымі таполямі
спілаванымі
каля ўкраінскага
пасольства
ляжалі
яшчэ цёплае
цела
птушкі ў чорным
на зямлю
апалі
не хаджу
на пахаванні
людзей.

* * *

Адчыніў вецер
варотцы,
ні упусціць каго,
а ні выпусціць;
доўга стаю,
не зачыняючы,
пакуль на небе
поўнае
сонца;
сякеры
рэдкі стук
у канцы вёскі
прымаеш
за дзятла
рахункі,
ён часцей наведваецца,
чым чалавек;
не хочацца

пусціць
па свеце
пагалоскі:
век мой супадае
з векам
пакінутай вёскі.

ІСЛАЧ

Памятае рака
калі была шырокай
раўчукі-прытокі
ўбокі
зыркае вока
крыніцы
і цяпер у мяне
пад падлогай
у хаце
месяц рагаты
плыў
з берага
да берага
ўсю ноч
мне не заснуць
не спусціць воч
пакуль рака
ўсе быліцы свае
пераскажа
потым малым дзіцем
у плыткае рэчышча
ляжа
на раніцу
яна ўжо выбранніца
спяшаецца
далучыцца
да Нёмана.

* * *

Пасля ліўня
рака
сама ішла
па мосце
перабірала
бярвення
косці
ішла ва ўвесь
рост
прамывала
зямлі
зрок
я бачыла
ейны выток.

* * *

Шуміць галоўка,
бы поўная макавага зерня,
куды мае думкі
сёння вецер паверне.
З бядой устану,
з бядой пагаджуся,
як з сяброўкай,
падперажуся вяроўкай,
абшушкаюся
па-бабску,
у твары
вясковая
краска.
Ужо бяда
не на сэрцы,
а толькі побач,
блізка,
закалышу
ў калысцы,

з вечара
да відна,
абы не адна.
Якога яшчэ мне
ражна!

* * *

Асенняя
ноч
ходзіць
навобмацкі
толькі пад раніцу
намацае
ў кішэні
мядзяк
халоднага
сонца.

* * *

Начаваць
начую,
а калі ў небе
грымоты
пачую
выбягаю
ў поле
каб адазвацца
мне тваёй жонкаю
не назвацца
сустрэча
асвяцілася
бліскавіцай
ці спіцца табе
ці сніцца.

* * *

З хаты ў хату
у сад ці прысад
хаджу
з дня ў дзень
высока
руку заводжу
ад сонечнага
клубка
выцягваю
нітку
ўсё што нядобра
няхораша
брыдка
цырую
кладучы
сабе на калені
а людское
непаразуменне
як жабрацкае
адзенне
лата на лаце.

ЯСЕНЬ

Старыя
напроці
абое
цяжка
доўга
звыкла
хварэюць
над хатай
цёмны
ясень
бы каторы з іх
сам сабе

пасадзіў
на кладах
дрэва
ў смутку.

* * *

Доўга
ляцела
па небе
зорка
пакуль
не згасла
а я не паспела
загадаць
жаданне.

* * *

Хаваю крыўду
і забываюся
дзе схавана
месяц шукае
згаслыя
зоры
перабірае
падушкі аблокаў
у мяне пад галавой
бунтуе
сны.

* * *

Абы святло
пагасла
хата

заплюшчвае
вочы
патрэсквае
косткамі
шафа старая
паліцы
на ноч укладаюцца
раніцай знойдзеш
цвік на падлозе
бы жаночую
шпільку
з галавы
хата жывая.

* * *

Жыццё
кароткае
няма часу
звыклыя
словы
анікому
крыўды
анікому
вымовы
што мы
паспяшаліся
разыйсціся
каб не памерці
ў адзін
дзень.

* * *

Здымаю
спелы
яблык

цёплы
вільготны
плод
дрэва
мае рукі
старэйшыя
за мяне
як у павітухі.

* * *

Спыніцца
ў садзе
камень ляжа
ля ног
агароджа –
мой парог
як у старажытнай
статуі
якой сніцца
лясны мурог
квяцісты луг
поле
воля.

* * *

Вецер
з ракі
гэта позні госць
які
памятае
коміны
старога
Траецкага
і шчэміцца
сіллю

ў выцяжкі
Старажоўкі
адкуль
чые
ягоныя галасы
згубленыя
на Татарскіх
агародах
даўнейшыя часы
склаў у свістульку
ўходаў
гудзе то гуллівым
дзіцем
то параходам
то Імшу служыць
у рызе
на Нямізе
вецер
са Свіслачы.

ГАРАДСКІ СУСЕД

Сустракаемся
выпадкова
некалькі
звыклых
словаў
адно аднаму
бы з кішэні
далоў
пад ногі
птушкам
некалькі
зернюкоў
прывітанне
і да пабачэння
нашы адносіны
не маюць

назвы
не маюць
наймення.

* * *

Калі мой сабака
бяжыць наперадзе
і ўвесь час азіраецца
ці я знямогшыся
паспяваю
ўцехі
не схаваю
я ведаю
мы ў дарозе
ўтрох
побач анёл
а можа і Бог.

* * *

Дзень зімовы
дзень
самы маленькі
скок улева
скок управа
скок убок
і на каленькі
пацеры
мовіць.

* * *

Юрлівы
віхор
бяжыць па дарозе

як кацяня
за клубком
снегу
ўсяго ком
на ўвесь горад
зімовы
юрлівы
час —
імгненняў
ловы.

* * *

Чакаць шпакоў
адчыненыя
вокны
дзверы
і дрэў
навюткія
шпалеры
і крокусаў
дзяркатыя
пагляды
на дыбачках
убок шпакоўні
паглядаем
як быццам голасу
не маем
у бусла запытацца
якой парой
шпакам
вяртацца.

* * *

Калі надоўга
пакідаеш

дом
ён быццам бы табой
забыты
і сам без памяці
і ўспаміны
ў падполлі
закапаны
зайшла
спынілася
стаю
адчужаныя
рэчы
бы твар забыты
і толькі скура
на сцяне
яшчэ жыла
мяне ўспомніў
звер
забіты.

КРЭДА

Аніякай крыўды
жалю
кпінаў
нікому
вярнуцца
ад людзей
да самога сябе
як са школы
дадому
не здрадзіўшы
пакінутым
ні кату
ні сабаку
бы блудная дачка
бы небарака.

* * *

Адчыняем захраслыя
дзверы хаты
табе пахне скрухай
пакінутым светам
нежылым
духам
а я пераймаю
подых зямлі
бы немаўляці
дыханне
маці
блізка
шчака да шчакі
заходжу ў хату
бы залятаюць вясной
у сваю шпакоўню
шпакі
як вяртаецца сонца
кожнае ранне
не пакідаючы
гэты балючы
свет
мне найболей дарае
заўсёды
да твару
юлёвы цвет
колер вечнасці.

* * *

Размінаюся
з табой
размінуцца
не заўсёды
ўдаецца
сэрца

яшчэ б'ецца
здзіўляюся
а можа проста
птушка
стукнула
ў шыбу...

ПРАДВЕСНЕ

Калі яшчэ бы блюзнячы
скрозь сон –
чыесьці гукі
ад зямлі
і рухі
пахі
калі празрыста
ў вершалінах
падобныя яны
на гнёзды
птахаў
і сонца ўстае
з-за лесу
з-пад цёмнага
брыва
на момант
і рассмяецца
само сабе
бы родны твар
пазнала
капрызнае
дзіця
тады за рукі
нехта падымае
з ложка
які стаіць
у полі на пагорку
жалезныя брыжы
а мо палок

сяннік пад бокам
пад галавой
аблокі
...так напрадвесні
бачыцца у снах.

* * *

Чаму ты ў чорным?
пытаюцца людзі
я абагараваюся новым агнём
сама сабе раскладаю вогнішча
а калі на галавешцы згасне
апошні пялёстак касача
я бяру вугаль
і на скале малюю сябе...

ПАКІНУЦЬ СЯБЕ ТУТ

Перад тым як пісаць гэтае пасляслоўе, я вырашыў перачытаць напісанае мной пра М. Вайцяшонак раней. Яго аказалася даволі шмат. Але высновы тых маіх колішніх разважанняў я не стаў ні рэвізаваць, ні пераглядваць. Яны падаліся мне і з сённяшняга дня крытычна ўзважанымі, справядлівымі і дастаткова аб'ектыўнымі. Тым больш, што і мае прадчуванні пра выхад аўтара за межы празаічнага класічнага канону з часам таксама апраўдаліся. Бо — свет вялікі, а чалавеку усё адно хочацца сябе ў ім знайсці. І Вайцяшонак — шукае...

Падсвядома за ўсёй яе творчасцю стаіць біяграфічнае, звязанае з высылкай сям'і беларускай сялянкі і польскага афіцэра-асадніка ў 1940 годзе на халодны Алтай, у студзёна-люты Змяінагорск, дзе пад снежным смяротным саванам і па сёння засталіся ляжаць бацькі, а яе, Марыю, з сястрой Уладзяй напачатку 50-х, у рэшце рэшт, выпатрабавала цётка Марыля да сябе ў вёску Грыдзькі, што на Пастаўшчыне...

З нараджэння (1 снежня 1940) яе спадчыннае гняздо было парушана, а само жыццё загнанае натуральна пад зямлю, у алтайскія халодныя зямлянкі, таму ўся істота яе млела ад нажаданага сонца і святла, радзімнасці і бацькаўшчыны...

У пастаяннага чытача твораў М. Вайцяшонак можа скласціся ўражанне, што мінулае як бы трымае яе за руку, нераўнуючы як малое дзіцё, і вядзе-вяртае да таго «раскіданага гнязда», адкуль вывелася яе родавая памяць, і ўжо апераная, — выпала і, не разбіўшыся, на кволым крыле ўзляцела... Там было холадна, голадна і страшна, і ўсе былі там пакутнікамі. Як ні дзіўна, але вядома, што нярэдка няшчасце і гора збліжаюць людзей мацней і надзейней, чым дабрабыт і будзённыя радасці існавання. Больш за тое, перажытыя нягоды і помняцца нам асабліва ярка і пранізліва цягам усяго нашага жыцця. Найперш падчас новых выпрабаванняў лёсу: а мы ж у свой час і не такое адольвалі.

Што ж, чалавечы характар гартуецца не толькі на высокім агні, а і на непамысным марозе. Таму зразумелыя наступныя радкі паэткі:

Спяшаюся,
каб не застацца
без мінулага,
якое мне даражэй
за будучае.

Ведаючы «рэпрэсаваную» біяграфію паэткі, гэтыя радкі ўспрымаеш не як страшную гістарычную памятку, а як памяць цэлага пакалення. Не – як жывую частку цэлага замардаванага, загіблага і знішчанага пакалення. Беларускія «спалячаныя» асаднікі падпадалі пад катэгорыю няўгодных і небяспечных людзей для савецкай ідэалагічнай машыны. Цынічнае «исцеление Сибирью» – вось што ім было наканавана. У тым ліку і бацькам Марыі і ёй самой, *тамашняй* па нараджэнні. Так, так, беларусы нараджаліся і ў той тадышняй жудаснай рускай Сібіры!

Пасля ўжо – у Беларусі – было ўсё, як ва ўсіх: школа, універсітэт, журналісцкая праца, а неўзабаве і літаратурная творчасць...

Такая вось біяграфічная канва наўсцяж творчага шляху. Зрэшты і з творчасцю ў Марыі таксама не ўсё проста...

Да ўсяго яшчэ дзіўна, што найчасцей, чым бліжэй ты з аўтарам – тым далей ад пісьменніка. Чамусьці так падумалася, прыпамінаючы свае былыя літаратурныя захапленні, яшчэ не зацененыя жывымі імёнамі тых ці іншых літаратараў. Бывалі, вядома, і адваротныя выпадкі, калі блізкасць, нечакана для абодвух, высвечвала тую патаемную глыбіню творцы, якой ён і сам не заўважаў. Безумоўна, пісьменнікі пішуць найперш сябе – тое, што яны найлепш ведаюць, але дарэшты так і не могуць вызнаць. Пра гэта аднойчы добра сказаў Флабэр: «Мадам Бавары – гэта я». Аднак мадам Бавары – гэта не ўвесь Флабэр...

І сёння, калі яна сядзіць, рэдка разняволеная, у садзе сваім, «па-*марына*цвятаеўску», смуглая ў цёмным, з чорным муштуком на адлёце рукі з пахуча-хмельным дымком нянаскай цыгарэты, і кажа мне пры людзях голасам бывалай вясковай нявінніцы: «Лёня, ну навошта вы перад светам мяне выстаўляеце?.. Я зусім не такая як ёсць... Ніхто не ведае чалавека...»

Пішу: Марыя, а думаю: Марта, гукаю: Маша, а адклікаецца: Мурза... Гэта я пра аповед «Ханна Мурза», а па сутнасці — пра яе ДОМ з ВОКНАМІ Ў САД, які *не запаліць нават пярун, бо ён з галубамі пад страхою*... Гэта аповед пра сабачую сям'ю — сучку Марту і аднаго з пяці яе шчанюкоў — Ханну Мурзу — што застанецца жыць з ёй да самага яе скону... Гэта і чалавечая гісторыя пра тое, што не патрапляе ў аналы агульнай гісторыі чалавецтва альбо заціраецца хуткаплынным часам... Пра тое, як Чалавек захацеў знайсці гармонію з прыродай, а Прырода — з чалавекам...

Не памятаю ўжо, якую навелу Марыі Вайцяшонак упершыню выхапіла маё вока з безлічы бясконца аднастайных тэкстаў сучаснай літаратуры, каб гэтак жалюча запомніць яе самую... Адчуванне няўвіднага нерва людской неўладкаванасці, дысгармоніі і ненармальнасці — адна з праяў яе мастацкага таленту. Але яшчэ нешта большае за талент выяўляецца ў паўсядзённай унутранай неабходнасці мастака быць сатворцам і сааўтарам тых знакавых дзей зямнога жыцця, якія выкрышталізоўваюць у чалавеку (і ў самім мастаку таксама) *чалавечнае*, адухаўляючы і «па кроплі выціскаючы з яго раба», кажучы класічна...

Марыя Вайцяшонак, бы выключэнне з агульнапрынятых правілаў у сучаснай жаночай прозе, з апошніх сілаў трымаецца за сваю, ужо амаль міфалагічную, нацыянальную самасць і за сваё месца ў кантэксце найноўшай беларускай... мовы і літаратуры. Не, не, я не *абмовіўся*. Менавіта так. Мовы і літаратуры. Нездарма ў сусветнай літаратурнай крытыцы наяўнасць уласнага стылю лічыцца пазнакай таленту. І такі талент у Марыі Вайцяшонак навідавоку. Ён напрацаваны вопытам душы і плоці, ужо даўно пазнавальны, але неаднастайны, бо неардынарныя праявы зямнога бытавання змушаюць яе ўтомнае сэрца час ад часу змяняць, здавалася б, урэшце і назаўсёды наладжаны рытм жыцця, а значыць, і свой асабісты пісьменніцкі почырк. Можа каго перасмыкне пры ўпамінанні «жаночай прозы» ў наш феміністычны час (паверыце ці не, але ў творах пісьменніцы ані адзін, нават самы лядачы, сабака, насуперак беларускай граматыцы, пакуль яшчэ не *займеў* мужчынскага роду), аднак той, хто чытаў прозу Марыі Вайцяшонак, безумоўна, стане на мой бок, паколькі больш значнай выявы жаночых і мацярынскіх вобразаў — самой метафорыкі чалавечага роду, калі ёсць Мужчына і Жанчына і няма праблематыкі юрлівага грэхападзення, а толькі інстынктыўны пожад бессмяротнасці

чалавечага духу — наўрад ці адшукаецца сёння ў нашай літаратуры...

А вось вобразы *моцнага* полу ў прозе Марыі Вайцяшонак як бы «наўмысля» *паслабляюцца*; і таму скрозь іншаполыя «героі» яе — мужыкі майстравітыя, нярэдка нават з боскім талентам пры сабе, які яны ні на што «распыльваюць», бы той сухі сыпучы пясок пад нагамі на скрушным шляху свайго жыцця — не сказаць, што адмоўныя, а нейкім чынам «музейныя», а мо нават і міфічныя... хоць вось жа, й кроку не ступіш, каб імі не «пахла»... Гэта — і майстравіты вясковы «ганчак»-апоек Іллюк, і «нічога не маючы за душой, адна во каса-літоўка ў руках і кароўка ў хляве», стары Макавей, і дурны Імполік, якому «адняло розум пасля смерці маладой жонкі»... але, быццам перапрашаючы ў чытача за вырак сваіх герояў, дадае Марыя Вайцяшонак да створаных ёю вобразаў і азнаку іх чалавечага першастварэння: «*...хіба сцежкі вар'ята і мастака не ідуць побач?..*»

Такія вось калізіі яе прозы адносна «моцнага» і «слабага» ў Чалавеку. Як зазначае яна сама, цытуючы некага ва ўсё тым жа аповедзе «Востраў»: «...сядзім, «скаваныя ланцугамі полу»...

Як чалавек, як жанчына, як пісьменніца, у рэшце рэшт, Марыя Вайцяшонак не можа не заўважаць звужанасці нацыянальнага і духоўнага Шляху, якім, перасільваючы нягоды і цяжкасці, намагаецца йсці яе народ услед за сваімі павадырамі, апосталамі і прарокамі...

«Душа толькі ззаду і ззаду ўвесь час, не можа дагнаць чалавека. Недзе ззаду ўвесь час дзеці, унукі, з хатулямі, з вандзэлкамі на дарозе паміж вёскай і горадам, нічым не захінёныя, не абароненыя — ні звычаямі, ні абычаямі, і з зямлі сілы не бяруць — іх лёгка сурочыць, абы за парог — і мовы сваёй счураюцца.»

Як быць і што дзеяць у падобнай сітуацыі? Калі шчыра, то наўпрост падобнымі грамадска-палітычнымі пытаннямі Марыя Вайцяшонак не заклапочаная. Але падсвядома яны турбуюць і яе, як захавальніцу свайго роду, літаратара-духоўніка і летапісца... Бо для каго тады выводзіць на звечарэлай шэрай паперы цёмным атрамантам кірылічную вязь з літар, слоў, сказаў, сноў, аповедаў і прадчуванняў? Каму — сёння, а тым больш — заўтра і пасляза ўтра? Як не згубіць, зберагчы і звесці да адзінства і гармоніі хоць тое духоўнае і нацыянальна-культурнае багацце народа, што яшчэ дарэшты не разбэрсалася, не разбілася на разрозненыя аскепкі, не раскралася і не сышло ў нябыт?..

А якія каларытныя народныя вобразы і характары вылузваюцца з-пад пяра Марыі Вайцяшонак! Вось, скажам, чытаю ў навеле (ці то абразку) «Прычасце»:

«У хаце даўно такі нечапаны парадак».

Альбо гэты візуальна-каларытны фрагмент: «*І яна во па гэтай лаве рукой раз-пораз, запрашаючы сесьці дзьмухала на яе, хукала, месцячы мне, сцелючы, як дзікаму кацяняці, паказваючы дзе ягоны нарэшце дом — ён тут. А то было машына наша захрасла якраз напроці бабы Юзэфы. Яна нічога ўжо не чуючы, пільнавалася жыцця адным вокам, ішла да нас, несла дошку пад кола, быццам адламаўшы яе ад стала ці ад дзвярэй у хаце. Несла, прыціснуўшы да грудзей, несла, пэўна, моцна беражонае, жывучы без мужыка, каб у плоце загарадзіць дзірку ад курэй ці так што якое. Мы тады хутка вылезлі на дарогу, яна засталася стаяць і глядзела ўслед. Туга павязана хустка на галаве, і ўся яна, як спавітая, ва ўсё, што мела, на холадзе, нерухома стаяла, непарушная ў сваёй шчырасці.*»

І там жа — такое, што і ў паэзіі рэдка калі сустрэнеш: «*...ідзе запаволена, не захінаючыся, (які гэта ёй дождж!) вада скочваецца з твару, як з яблыка*».

Вельмі добра, душэўна. Свой стыль у Марыі, свая родна-народная мова, свой правапіс... Арыгінальная, самабытная пісьменніца... Як на маю думку, то такіх творцаў у нашай літаратуры трэба зберагаць і ахоўваць. Як нацыянальную каштоўнасць.

Нельга, вядома, не адзначыць і своеасаблівасць яе стылю і мовы, на чым пакуль мала хто з крытыкаў акцэнтаваў чытацкую ўвагу. Але перачытайце лепшую навелістыку Івана Пташнікава, альбо хоць гэты абзац з аповеду Марыі Вайцяшонак «Чорны саган» і вы амаль візуальна ўбачыце напісаную аўтарам карціну: «*Карова чырвоная, шырокая, галава камлём, падобна да вала, заносіць цёплым духам, духам хлева, аж мроіцца: ластаўкі віюцца ў рагах, сувоямі вісіць павучынне пад бэлькамі, котка белая сядзіць на сухім, чакае вячэры, з лапы на лапу пераступае, як кацяня, топчучы матчына падбрушша, каб прыпусціла малако. Шуміць у даёнцы, пена аж пад дужку*». Безумоўна, арыгінальны стыль, які вызначае творчую пазнавальнасць аўтара, нікому не «падае з неба на галаву», як Богам дадзены талент, а нажываецца альбо, калі хочаце, натруджваецца — сукаецца, як тая нітка на цэўку, каб потым выплыць чаўнаком сярод асновы жыцця... А мілагучная, выпешчаная на вуснах

нашчадкаў «мова пастаўшчыны»! Гэта ж які трэба мець унутраны слых, каб захоўваць гэты нацыянальны цуд у спратах душы сваёй, хаваючы пад языком для запаветнага часу, пасярод моўкнасці беларускай і гвалтам прышчэпленага чужамоўя — тут, дзе «*не разлічаны ўклад на доўгае жыццё, на старасць. Лапнула адну кансерваваную бляшанку, другую, нешта з іх перасыпае, перакладае, і ў руку няма чаго свойскага ўзяць: ні дзяжы, ні латкі, ні ступы, ні глечыка. Жывем не прызвычаіўшыся, бы дзеці, што гуляюць у дом. Анічога анідзе не пазначана, што тут даўней людзі жылі, Няма той раніцы, не памятаецца, каб гэта ўстаў, а дзень ужо быццам складзены перад табой, дабультова, старанна, з веку ў век ён абстаўляўся знакамі быту, знакамі ладу, строю, густу — знакамі любові, каб стаялі буднія дні ў чарзе, пільнуючы свята. Нарэшце карціць некуды бегчы, кідаць адну работу, хапацца за другую, спяшаешся, бо жывеш адным днём, часова — вехцем саломы ў вочы. І пасля цябе самога нічога не застаецца, адныя кансерваваныя бляшанкі ды слоікі*»...

Увогуле, што да самой навелістыкі пісьменніцы, то яна амаль бесфактурная, бессюжэтная і бесп*адзейная*, але не бесп*адзеўная*, больш за тое, як бы ў супрацьвагу папярэдняму — важка-змястоўная, быццам ёмкі гаспадарчы спажытак у руках жанчыны, натомленай далёкай і звілістай дарогай. Сцежка альбо «пуцяводная ніць» кожнага «старазапаветнага» аповеду Марыі Вайцяшонак пралягае праз вяршыню чалавечага сэрца, што высіцца над прадоннем непамыснай людской душы, бо зямное-туташняе, як наканаваны Богам цяжар зямнога быцця, схіляе чалавека ніц і ў працы і ў маленні, аблягаючы яго скрозь, апроч прадушыны Неба...

Магчыма таму ў кваціcты вянок яе беларускай прозы так арганічна ўплятаюцца сонечныя заморскія міфалагічныя галіны і голькі іншых народаў і насельнікаў. Марыя любіць гэты свет і яго людзей («Востраў», «Купіць дом»).

Аднак час ад часу, здараліся ў яе тэкстах своеасаблівыя «паветраныя ямы», у якія не раз і не два цягам аповеду абрынаўся чытацкі дух. І ўвогуле пераважная большасць створанага М. Вайцяшонак своеасаблівай настальгічнай аўрай «насілася» над чалавечай душой, як біблейскі «дух над цёмнай безданню». Панацэяй для аўтара ў такой безвыходнай сітуацыі магла стацца толькі паэзія, гэта значыць, больш гарманічны і адносна ўпарадкаваны літаратурны тэкст, які часова прымірае і зводзіць

асобныя словы ў агульны і адпаведны змест. Не канкрэтызуючы тыя ці іншыя факты і дзеі жыцця, а развінаючы праз іх асабовую неардынарную і арыгінальную думку. Прасцей кажучы, аўтар прагнуў выказаць «невымоўнае». Паспытаць «першаку» не дзеля ап'янення, а дзеля моцнага праяснення перажытага. Кажучы словамі М. Вайцяшонак: «*Павярнуцца на другі бок тварам // да Соўчына, дзе яшчэ // не астыглі мае // падмуркі*».

І вось недзе пасярод зімы 2008 года яна мне раптам паведамляе: запісваю вершы. Не, гэта ўжо мяне не здзівіла, хутчэй нават узрадавала. Але і занепакоіла тут жа: а як жа яе арыгінальная, ні на чыю іншую непадобная і непадробная проза, хоць і яна ў пэўным сэнсе была для яе творчасцю лірычнай... Аднак чытаючы верлібры М. Вайцяшонак, трывога адпадае, бо ў нечым сутнасным яны ёсць ні чым іншым, як квінтэсенцыяй яе прозы... Можна дапусціць, што менавіта шырокая плынь гэтай прозы пэўным чынам «падмывала і размывала» аснову яе творчага празаічнага русла, што і сталася прычынай збудавання своеасаблівай плаціны, каб сабраць разрознены лірычны паток у адно цэлае ды абрынуць яго ўсёй моцай на лопасці турбіны-душы, і такім чынам выпрацаваць такую энергетычную магутнасць, якая запаліць агонь у чытацкіх сэрцах... Адным словам, заманулася выказаць сябе коратка і ёмка, але ярка і ўзвышана. А калі б яшчэ чытач папярэдне ведаў біяграфію М. Вайцяшонак, то яе вершы (на аголеным нерве) успрымаліся б ім з большай доляй натуральнасці... Але ж зазвычай невялікае кола чытачоў беларускай паэзіі ведаюць пра сваіх паэтаў больш, чым тыя ведаюць пра чытачоў, і з гэтай прычыны ў некаторых выпадках метафарычныя асацыяцыі *растаемніваюцца*. А гэта не на карысць самой паэзіі. І ўсё ж, каб пранікнуцца вобразнасцю вершаў М. Вайцяшонак, трэба ведаць яе жыццё і быць абазнаным у яе празаічнай творчасці – менавіта адтуль, з таго «*сора*» р а с т у ц ь вершы пісьменніцы. А тое, што вырошчваць *кветкі паэзіі* яна ўмее, і вобразна, і натуральна, – сумненняў няма. Нездарма кажуць, што Паэзія – гэта біяграфія душы...

Паэтычны стыль М. Вайцяшонак – асобная тэма гаворкі. Мала сказаць: ён арыгінальны; трэба абавязкова ўдакладніць, што *асабовы*. Старэйшым людзям лёгка можна патлумачыць *гэта* колішняй савецкай калектывізацыяй, мусовым стварэннем калгасаў, куды заганялі ўсю галечу з усёй іх беднай сялянскаю гаспадаркай і патрабавалі жыць па пэўных

псеўдакамуністычных правілах і законах... Аднак знаходзіліся настолькі самасныя і ўпартыя, якіх проста немагчыма было ўгаварыць альбо загнаць туды сілай. Іх называлі аднаасобнікамі... у іх быў не калектыўны, а свой асобны (у тым ліку і духоўны) лад жыцця і гаспадарання... Прыкладна такі стыль пісьма ў Марыі Вайцяшонак, у адрозненне ад мноства пісьменніцка-саюзных сучасных літаратараў, у вершах ён перацярпеў, скажам так, перыяд лаканізацыі. І падчас творчага азарэння набывае класічныя ўзоры паэтычнага мастацтва.

Вядома, творцу, каб пераадолець зямную коснасць жыцця, яго цёмны спод, трэба прыўзняць над сабой цяжар уласнай душы. Трэба прызнацца перад Усім, што ты ёсць такі як ёсць, аднак хочаш быць іншым. Такім, якім хоча цябе мець не толькі гэты, але і той свет. Марыя даводзіць чытачу з'яўленне сваіх вершаў. Маўляў, яна не хоча «*абшукваць свае і чужыя кішэні, свае і чужыя шуфляды*», каб пазычаць рыфмы ды іншае паэтычнае начынне... Таму яна піша свабодным вершам — верлібрам, перабіраючы «пацеркі-словы», што «*рассыпаўшыся, лягуць, бы варожачы*»... Не думаю, што аўтар гэтым самым наўмысна пазбягае цяжкай працы па агранцы верша. Хутчэй за ўсё, яна пазбягае змушанай правільнасці пісьма, тады як душэўныя і духоўныя памкненні не ўкладваюцца ў класічную метрыку жанра, прагна шукаючы вызвалення з закратаваных строф... Рваны фізічны і псіхалагічны зрух радка і пачуццяў стварае натуральную візію чалавечага лёсу, канкрэтнай жаночай долі, адзіноты, удаўства ад роду... Падчас адна неардынарна выбудаваная фраза стварае парадаксальную метафару: «*Ноч цямнейшая // за дзень*»... Альбо ў словах, звернутых да рэчкі Іслач, дзе паэтка пражывае свае леты: «*Змываю ў табе свае гады. Запомні мяне маладой*»... Агулам у вершаваных зборніках Марыі Вайцяшонак насеяна шмат квітнеючых паэтычных вобразаў. Калі, скажам, нечаканы правобраз хлеба бачыцца праз «*акраец жорнаў*», а поруч «*сляпыя вокны хаты // адымаюць твой зрок*», і ты «*сціраеш з твару чужы позірк*»... Чытаючы яе творы заўсёды здзіўляешся яе аўтарскай метафары, якая, высока не ўзлятаючы, мосціцца непадалёк ад яе напрацаваных рук... Найперш здзіўляешся, а пасля ўжо раздумваешся, разгадваеш жыццёвыя высновы гэтых яе паэтычных тропаў. Бо ўсе словы паэткі пераніцаваны яе чалавечым вопытам, і так традыцыйна-ўзорна складзены адно пры адным, што ты пачынаеш ім верыць і канчаткова давярацца. Верлібр,

дарэчы, у М. Вайцяшонак арыгінальны, ён у яе як бы мае форму вертыкалі. Радок пераважна аднаслоўны. Але дзякуючы *павышанай* нагрузцы на слова, яно, звязваючыся з папярэднім ці наступным, утварае шматлікія сэнсы і асацыяцыі...

Будуе
птушка
гняздо
блізка
амаль
у далонях
пліска.

Кожнае яе нутраное, перажытае-перадуманае слова, як жыта перамолатае на муку, выходзячы вонкі, — да прыроды і чалавека, бродзіць-закісае на дражджах паўсядзённага жыцця ды падымаецца пышным цестам для караваю на чаканае свята Паэзіі... Так вось напішаш — і, здаецца, што так яно і ёсць. Бо ты — аўтар. Табе нешта такое ведама, што пакуль няведама астатнім. Але, нарэшце, нацешыўшыся сваёй *таямніцай*, адкрыешся і адпусціш яе да другіх... Няхай здарыцца свята душы і ў іх. А ты ўжо вышукваеш-вымройваеш усёй сваёй істотай новыя запаветныя адкрыцці, заблытваючыся ў каранях пракаветных слоў і выслоўяў...

А частае ўжыванне народнай мовы ў яе вершах можна прымаць, калі не за своеасаблівую праяву аўтарскага паэтычнага стылю, то за ўстойлівасць літаратурнай манеры, а можа нават за ўпартасць характару і вернасць бацькоўскім караням.

(«*Дарала б*» (хацела б); «*пад столлю, // наважалі //* (падвешвалі, навязвалі) *бацькі // калыску*»; «*...каб налушчыць // смаляк //* (смалякоў, нашчапаць) *на распалку*», «*...зло ніколі // не можа быць // справядловым*» (справядлівым) і г. д.

Можна заўважыць, што адны і тыя ж вобразы ў творах М. Вайцяшонак могуць пераходзіць з верша ў верш, дапаўняючы і дадаючы глыбіню і філасафічнасць зместу ўсяго твора ці асобнай метафары, дэталізуючы карціну ўвогуле. Найчасцей гэта здараецца ў паэтцы з такімі паняткамі, як *час, сонца, вада, цень*... Па сутнасці — гэта складнікі вечнасці зямнога і чалавечага існавання, дзе нараджэнне і смерць, як змена эвалюцыйнай квадры ўсяго Сусветнага працэсу.

Таму кожны паэтычны зборнік М. Вайцяшонак узводзіцца, як зруб, і паступова ўладжваецца, як дом. Безумоўна, у ім ёсць і шараговыя рэчы, але, дзіўным чынам, яны не выпадаюць з агульнай будовы, больш за тое, іх нельга назваць неабавязковымі, паколькі яны закладзены ў фундамент кніжкі, у яе сцены, перакрыцці, кроквы, ашалёўку, комін, дымаход... Няхай нават замест гожага ганка ў ім просты парог – палявы альбо лясны вялікі пашчэрблены і нацёрты нагамі камень... Бо толькі паэт ведае, што

маўчанне
каменя
побач з намі
змястоўней
нашае
размовы.

Яна зноў і зноў праходзіць зваротным шляхам свайго жыцця, нераўнуючы як быццам гэта ёсць для яе своеасаблівай пілігрымкай да святых месцаў. «*Басаногі // пастушкай // іду // за ягнятамі // дзён*» (...) «*вакол майго // алтара // памяці*». Старонячыся людской мітусні і публічнасці, М. Вайцяшонак прыходзіць да самой сябе, каб пакінуць людзям той агонь, які не дае ачахнуць людскому жыццю:

Сівыя гады
не вёсны
пастаўлю
на зіму
кросны
сяду
на парозе
пільнуюся
каб не звесці
агонь
у вёсцы...

Не памыліўшыся, пра творчасць М. Вайцяшонак можна сказаць словамі Б. Пастэрнака: «*здесь дышит почва и судьба*». Глыбокая народнасць, прыродная, генная (тут і паганства і сучасныя

хрысціянскія матывы і ўласная каталіцкая сутнасць) і элементы фальклору і традыцыі — усё гэта гарманічна пасуе да яе вершаў і вобразнасці. Можна дадаць сюды і яе натуральную пераемнасць нацыянальнага вобраза жыцця. Тым больш, што поруч з утомным святлом хрысціянства ў яе творчасці неадступна рушыць супакойна-прахалодны цень паганства (вершы «Ярыла», «Пярун», «Кара», «Вялес», «Цёця», «Лада», «Лёля», «Дзявоя»). Тут дзіўнасці няма, бо творчасць Вайцяшонак адпачатку гадавалася ў пялюшках глыбокай родавай повязі.

Трэба адзначыць, што нярэдка ў яе творах адчуваецца ці то стылёвы, ці то фармальны, а то і светаўспрымальны штрышок-штуршок знаных папярэднікаў, што адметна, замежных: Габрыэлы Містраль, Гарсія Лоркі, Філіпа Жакотэ, Яна Твардоўскага (эпіграфы з іх твораў яна выносіць на покуць-зачын усіх сваіх кніжак). Гэта радуе, бо традыцыйна-класічную нашу спадчыну мы ўжо занасілі на сабе, нібы сялянскую кашулю, натуральна да дзірак... Калі казаць пра творчую блізкасць да аўтарскіх школ і накірункаў — і тэматычных, і стылявых, і філасофска-псіхалагічных — то тут я паставіў бы Марыю ў адзін невялікі шэраг да такіх нашых выбітных сучасных паэтаў, як Алесь Разанаў, Валянціна Аксак, Надзея Артымовіч. Усе яны не маюць пэўнай грамадска-нацыянальнай акрэсленасці і ідэйнай зацыкленасці ў сваёй вершаванай творчасці, але ўсіх іх выдае адметная паэтычная манера ў мастацкім самавыяўленні. Напэўна, прачытаўшы колькі вершаў названых творцаў, прыхільнікі беларускай паэзіі без асаблівай напругі і боязі памыліцца назавуць імёны іх аўтараў. А гэта ўжо пазнака таленту. І тут нельга абысці арыгінальную асабовасць гэтых творцаў. Іх характары, лінію паводзін, чалавечую і грамадзянскую годнасць...

Любы чалавек для Марыі не толькі знаёмы, спадарожнік, сябра, а — *супольнік* жыцця. Пад высокім Небам у людзях не было і няма ніякай розніцы — усе пайшлі з аднаго. Таму і самаадчуванне наша выяўляецца ў нас як *чалавекаспачуванне* (сочувствие, па-руску кажучы). Вось верш цалкам:

Ціша
птушкі садзяцца
на ноч
у куст
бэзу

цёплай
ноччу
няма бяздомных
людзей на свеце.

Марыя любіць *сваю* зямлю, бо і сама з зямлі, бо і сама зямная. З ёю лёгка гаварыць, яе займальна слухаць. Для мяне яе словы, вершы, кнігі — гэта працяг недасказанага-недаслуханага-недачутага... І хоць надзённае зацягвае ў свой нерат, Марыя памятае сваю нядаўнюю волю...

ў люстэрка
ўглядаюся —
не адбіваюся
увайшла
ў свой цень
поўдзень!
а думала — вечар.

Безумоўна, адчуванне часу, што пераследуе нас, не пакідае нам вялікіх ілюзій для аптымізму, але і не заганяе ў цёмны кут беспрасветнасці. Дзякуючы зробленаму і створанаму, мы маем своеасаблівую індульгенцыю — быць зразуметымі і помнымі сваімі наступнікамі.

І Марыя, наперакор усяму, застаецца тут з намі — *тварам да зімы* — і як можа доўжыць свой зямны шлях — там, дзе наканавана... Бо:

Не здрадзіш
не згубіш
мову
на якой
любіш.

Гэтак піша і так выяўляецца мне цудоўны чалавек, прыгожая жанчына, адмысловы творца Марыя Вайцяшонак. Вазьміце гэтую яе кнігу, зазірніце за вокладку яе жыцця...

Леанід ГАЛУБОВІЧ

ЗМЕСТ

История одного детства
(*автобиографический монолог Марии Вайтешонок — из книги Светланы Алексиевич «Время Second Hand»*) 5

ПРОЗА

«Сад нявіннасці»

Два гады да вясны 17
Месячная камея 24
Ад халоднага боку сонца 33
Каціўся пярсцёнак 52
Асеннія птахі 58
Сухія навальніцы 65
Сад нявіннасці 74
Коні 83
На плывуне 92
Ханна Мурза 97
На зялёным чаўне Харона 106
Азярод 117

Трыпціх
Дом на захадзе дня 124
Дом над лесам 135
Дом вокнамі ў сад 146

«Кола»

Сведка 164
Мы з аднаго поля 175
Кола 183
Востраў 191
Знак на далоні 200
Сем багавіц шчасця 210
Я сядзела насупраць 218

Амарыліс 228
Купіць дом у Італіі 234
Партрэт невядомай 244
Тэрарыстка 250

Трыпціх
Свет вячэрні 255
Чорны саган 263
Паядынак 275

✣✣✣

«Восень мая доўгая...» 286
Прэзентацыя або Адценні навальніцы 292
Кавярня «Стары Менск» 298
Саскочыць з ровара і спыніцца 302
Гліняны Вялес каля маёй студні 305
Рэлігія саду 317
Пад'езд 330
Макі для Няфрэт 335
Мапа на далоні 345
Вышыванкі 357

ПАЭЗІЯ

«Серпень» 367
«Асадніца» 423
«Сонцаварот» 473
«Гняздо агню» 524
«Тварам да зімы» 577

ПАСЛЯСЛОЎЕ

Пакінуць сябе тут
(*Леанід Галубовіч пра творчасць Марыі Вацяшонак*) 625

Маё святое сямейства – цётка Марыля і дзядзька Віталій Жукі.
Вёска Грыцькі на Пастаўшчыне

Вечная дарога дамоў

Бацька
Антон Вайцяшонак,
польскі асаднік

Бацька, мама Вольга і старэйшая сястра Уладзя хаваюць сваю дачку Лёню, якую забіў пярун у семнадцаць гадоў. Побач магіла брата Браніслава, ён памёр у 15 год. Уся мая сям'я тут, на могілках



Бацькава радня – мая стрыечная сястра Лёня з сям'ёй. Польшча

Зноў бацькава радня – ягоная сястра Франуся з дачкой. Мая любімая цётка, хаця я яе ні разу не бачыла, ведаю толькі, што вучылася на жаночых курсах у Вільні пры кляштары

А гэта ўжо маміна радня. Яна – сялянскага роду.
Дзядзька Стах з сям'ёй. Вёска Грыцькі

Касцёл св. Антонія ў Паставах, дзе вянчаліся мама з бацькам
і хрысцілі ўсіх сваіх дзяцей. Адна я нарадзілася ў ссылцы

Мама Вольга ў ссылцы. Польскі пасёлак, Алтайскі край

Старэйшая сястра Уладзя і я хаваем маму ў ссылцы. Горад Змеінагорск, Алтайскі край. Мне, пэўна, 6 гадоў. А бацькі ўжо з намі не было. Хутка ад'язджаем да цёткі Марылі ў Беларусь у вёску Грыцькі. Мы ўжо реабілітаваныя

Цётка Марыля

Ракаў.
Дзіцячы дом.
З сяброўкамі



Вясковая настаўніца ў вёсцы Боркі на Пружаншчыне.
Тут і мая школка

Настаўніца рускай мовы і літаратуры ў вёсцы Дунілавічы на Пастаўшчыне

У піянерскім рэспубліканскім лагеры "Зубраня" для адароных дзяцей, Нарач

Карэспандэнт "Сельскай газеты"

Я, карэспандэнт "Сельскай газеты" са Святланай Алексіевіч
на лецішчы Іслач пад Мінскам

За сваім рабочым сталом у часопісе "Неман", аддзел публіцыстыкі

Мая першая фотавыстава ў Чырвоным касцёле, Мінск

Любімае лецішча ў вёсцы Іслач. З сябрамі

Літаратурна-мастацкае выданне 12+

Марыя Вайцяшонак

АЛЬБОМ ДЛЯ ЦЁТКІ МАРЫЛІ
Выбраныя творы

Рэдактар Леанід Галубовіч
Вокладка Ігар Корзун
Карэктар Лойка В. І.

Выдавец "Logvino literatūros namai"
J. Savickio g. 4, LT-01108 Vilnius
lohvinau.by

Надрукавана ў АВ "Spauda"
Laisvės pr. 60, LT-05120, Vilnius, Lietuva

Марыя Вайцяшонак

(Вайцяшонак Марыя Антонаўна, 1 снежня 1940 года) – вядомая пісьменніца і паэтка (сябра СБП з 1990 года) з'яўляецца аўтарам дзесяці кніг публіцыстыкі, казак для дзяцей, мастацкай прозы і паэзіі: "Сярод блізкіх людзей", "Жанчына каля люстэрка", "Сад нявіннасці", "Кола", "Каму расказваюць казкі на два вушкі"; "Серпень", "Асадніца", "Сонцаварот", "Гняздо агню", "Тварам да зімы".

Гэтая кніга выбраных твораў ёсць зборам лепшых узораў яе арыгінальнай прозы і паэзіі. Чытач знойдзе тут душэўны прытул і спагаду, а таксама злагаду і людскую гасціннасць – крэўную памяць бацькаўшчыны. Своеасаблівы і натхнёны голас Марыі ўзвысіць і зачаруе вас. І вы станеце апантаным прыхільнікам яе творчасці.

9 786098 213584

МАРЫЯ
ВАЙЦЯШОНАК

АЛЬБОМ ДЛЯ ЦЕТКІ МАРЫЛІ